**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны”**

**М. М. МЯЗГА**

# ГІСТОРЫЯ КРАІН АЗІІ І АФРЫКІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

***Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь
у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў
гістарычных спецыяльнасцей устаноў, якія
забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі***

**Гомель 2007**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

УДК 950 + 960 (075.8)
ББК 63.3(5)63 + 63.3(6)63 Я 73
М 99

**Рэцэнзенты:**
кафедра новай і навейшай гісторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта; Пятроўская А. В., дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна, кандыдат гістарычных навук, дацэнт; ад тэрміналагічнай камісіі: Кулеш Г. У., дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат філалагічных навук.

Рэкамендавана да выдання навукова-метадычным саветам УА ”Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны”, пратакол № 9 ад 25 мая 2005 г.

Мязга, М. М.
М 99 Гісторыя краін Азіі і Афрыкі пасля другой сусветнай Вайны: вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ / М. М. Мязга; Мін–ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны ун-т імя Ф. Скарыны.– Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007.– 307 с.

ISBN 978 – 985 439 – 225 – 7

Вучэбна-метадычны комплекс дазваляе арганізаваць работу студэнтаў па самастойным вывучэнні матэрыялу. Гэта забяспечваецца наяўнасцю ў выданні заданняў для самастойнай работы, спіса неабходнай літаратуры для іх выканання і метадычных рэкамендацый. Змешчаныя ў вучэбна-метадычным комплексе заданні могуць выкарыстоўвацца ў якасці пытанняў пры правядзенні практычных заняткаў.

УДК 950 + 960 (075.8)
ББК 63.3(5)63 + 63.3(6)63 Я 73

ISBN 978 – 985 439 – 225 – 7

© Мязга, М. М. 2007
©УА”ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2007

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УСТУП

Вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) ахоплівае перыяд гісторыі краін Азіі і Афрыкі, які пачаўся пасля другой сусветнай вайны. Ён насычаны важнымі падзеямі і складанымі гістарычнымі працэсамі ў гісторыі краін рэгіёна. Рухнулі каланіяльныя імперыі вядучых індустрыяльных дзяржаў. Маладыя незалежныя краіны Азіі і Афрыкі сутыкнуліся з праблемай выбару шляху развіцця. У рэальным гістарычным працэсе рэалізаваліся розныя варыянты гэтага выбару: капіталізм, марксісцка-ленінская мадэль сацыялізму, нацыянальны сацыялізм. У той жа час, у развіцці краін рэгіёна, незалежна ад выбранага шляху развіцця, меліся агульныя рысы. Яны звязаны з панаваннем у гэтых краінах на момант заваявання незалежнасці адносін, якія характэрны для традыцыйнага грамадства. Таму праблема мадэрнізацыі стала галоўнай для грамадскага развіцця афра-азіяцкіх краін пасля заваявання незалежнасці. Гэта праблема з'яўляецца цэнтральнай пры вывучэнні гісторыі краін Азіі і Афрыкі ў другой палове XX – пачатку XXI ст., і ёй удзелена асноўная ўвага ў выданні.

ВМК дазваляе студэнтам засвоіць значную частку вучэбнага матэрыялу праз самастойную работу. Ён пабудаваны па модульнаму прынцыпу. Пры фарміраванні вучэбных модуляў (ВМ) аўтар кіраваўся перш за ўсё агульнасцю шляхоў развіцця пэўных краін, што звязана ў першую чаргу з іх прыналежнасцю да той ці іншай цывілізацыі. Улічваўся таксама геаграфічны фактар і агульнасць гістарычнага лёсу. Акрамя таго, прыходзілася ўлічваць хаця б прыблізную раўнамернасць размеркавання матэрыялу паміж модулямі. Вывучэнне кожнага модуля пачынаецца з вызначэння яго месца ў вучэбным курсе, мэт яго вывучэння. Студэнт з самага пачатку павінен усвядоміць, які аб'ём ведаў і ўменняў ён павінен засвоіць у выніку вывучэння модуля. Уключаны ў склад модуля тэкст лекцыі ўтрымлівае мінімальны аб'ём матэрыялу, які павінен быць засвоены кожным студэнтам. Гэты ж матэрыял дазваляе студэнту выпрацаваць падыходы, якіх трэба прытрымлівацца пры далейшай самастойнай вучэбнай працы. Паглыбленне ведаў ажыццяўляецца праз самастойную працу студэнтаў. Модулі ў межах ВМК разбіты на вучэбныя элементы (ВЭ). Яны нацэльваюць студэнтаў на вывучэнне канкрэтных тэм у рамках модуля. Спачатку вызначаецца канкрэтны набор ведаў і ўменняў, якімі павінен авалодаць студэнт у працэсе вывучэння ВЭ. Далей студэнт працуе над асноўнымі пытаннямі, якія ўключае ВЭ. Каб справіцца з пытаннем, трэба выканаць некалькі вучэбных заданняў. У гэтым сту-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дэнту дапаможа рэкамендаваная да кожнага пытання літаратура і метадычныя ўказанні. Аўтар імкнуўся праз кароткія каментарыі дапамагчы студэнтам лепш разабрацца ў рэкамендуемай для самастойнай работы навуковай літаратуры. Пры гэтым студэнты арыентуюцца на дасягненні сучаснай гістарыяграфіі. Шэраг вучэбных заданняў, якія ўтрымлівае ВМК, маюць на ўвазе работу з гістарычнымі дакументамі. Такім чынам, ВМК у пэўнай ступені выконвае і ролю хрэстаматыі і дазваляе студэнтам набыць навыкі працы з гістарычнымі крыніцамі. Пытанні, якія ўтрымлівае кожны ВЭ, могуць выкарыстоўвацца ў якасці пытанняў да практычных заняткаў. Пры завяршэнні вывучэння кожнага ВЭ студэнт мае магчымасць праверыць свае веды з дапамогаю пытанняў для самакантролю. Завяршаецца вывучэнне модуля выкананнем кантрольных заданняў.

ВМК прадназначаны для студэнтаў-гісторыкаў як дзённай, так і завочнай формы навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ВМ-1. ЗАВАЯВАННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ АФРА-АЗІЯЦКІМІ КРАІНАМІ І АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ЎСХОДНІХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВЭ-0. УВОДЗІНЫ

***Спачатку пазнаёмцеся з інфармацыяй аб модулі ў цэлым.***

Гэты модуль прысвечаны вывучэнню асноўных тэндэнцый гістарычнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны. У яго аснове ляжыць праблема заваявання незалежнасці і пошуку шляхоў мадэрнізацыі традыцыйнага ўсходняга грамадства.

***Месца і значэнне модуля ў сістэме курса.***

Вывучэнне дадзенага модуля дазваляе атрымаць веды па гісторыі Усходу ў другой палове XX ст. – пачатку XXI ст. на абагульняючым узроўні. Яны з'яўляюцца падмуркам для вывучэння гісторыі асобных цывілізацый і краін.

***Мэта вывучэння модуля:***

- ведаць прычыны, перадумовы, асноўныя этапы распаду каланіяльнай сістэмы пасля другой сусветнай вайны;
- умець характарызаваць асноўныя шляхі развіцця краін Усходу пасля заваявання незалежнасці;
- умець прадэманстраваць на канкрэтных прыкладах адрозненні і агульнае ў сацыяльна-эканамічных мадэлях развіцця, якія абралі афра-азіяцкія краіны;
- вызначыць характэрныя рысы ідэйна-палітычнага развіцця краін Усходу.

***Гэты модуль уключае наступныя вучэбныя элементы:***

ВЭ-0. Уводзіны.

ВЭ-1. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху пасля другой сусветнай вайны і распад каланіяльнай сістэмы.

ВЭ-2. Характэрныя рысы палітычнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-3. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю.

***Аб змесце модуля.***

***Ключавая праблема:*** традыцыяналізм і мадэрнізацыя ў гістарычным развіцці краін Усходу пасля другой сусветнай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Вырашыць гэтую праблему - азначае зразумець сутнасць працэсу мадэрнізацыі традыцыйнага грамадства як перанясенне на Усход адносін, якія характэрны для заходняй цывілізацыі. Для пераадолення адсталасці краіны Усходу, як правіла, выбралі гэтак званую даганяючую мадэль развіцця. Яе мэта заключалася ў ператварэнні краін Азіі і Афрыкі ў індустрыяльна развітыя праз фарсіраванае развіццё цяжкай прамысловасці пры вырашальнай ролі дзяржавы.*

***Вядучая ідэя:*** краіны Усходу пасля другой сусветнай вайны шукалі розныя шляхі мадэрнізацыі традыцыйнага грамадства з мэтай пераадолення адсталасці, пры гэтым праяўляліся рэгіянальныя асаблівасці сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і духоўнага развіцця.

***Асноўныя паняцці:***

Дэкаланізацыя, нацыянальна-вызваленчы рух, мадэрнізацыя, сацыялістычная арыентацыя, “даганяючае развіццё”, “нацыянальны сацыялізм”, міжэтнічныя канфлікты, трабалызм, Рух недалучэння, крызіс развіцця, неакаланіялізм.

*Вы павінны асэнсаваць значэнне пералічаных паняццяў і ўмець звязаць іх з канкрэтна-гістарычным матэрыялам.*

## УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ

1. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху пасля другой сусветнай вайны і распад каланіяльнай сістэмы.
2. Характэрныя рысы ідэйна-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны.

1. На жыццё каланіяльных краін вялікі адбітак наклала другая сусветная вайна, яе вынікі. З самага яе пачатку народы калоній пачалі патрабаваць незалежнасці. Асноўная маса калоній належала дзяржавам антыгітлераўскай кааліцыі. Урады Англіі, Францыі заяўлялі аб гатоўнасці пайсці на саступкі калоніям, але пры гэтым абмеркаванне пытання аб прадастаўленні самакіравання ці незалежнасці калоніям адкладалася да канца вайны. Такая пазіцыя выклікала незадавальненне нацыянальна-палітычных сіл калоній. Сітуацыю, якая склалася, спарабавалі выкарыстаць фашысцкія дзяржавы. Яны выступалі з дэмагагічнымі лозунгамі вызвалення каланіяльных народаў, праз сваю агентуру спрабавалі актывізаваць у час вайны антыкаланіяльны рух на Усходзе. Для фашысцкага блоку гэта была спроба аслабіць сваіх праціўнікаў у вайне. Асабліва актыўную палітыку ў гэтым кірунку праводзіла Японія. Прыкрываючыся лозунгамі стварэння “зоны су-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

меснага працвітання ва Усходняй Азіі”, японцы на першым этапе вайны змаглі заваяваць сімпатыі некаторай часткі ўдзельнікаў нацыянальнага руху. Японія пайшла на фармальнае абвяшчэнне незалежнасці некаторых акупіраваных дзяржаў. У гэтых абставінах заходнія дэмакратыі павінны былі прымаць меры, каб падарваць уплыў фашысцкіх дзяржаў на народы калоній. Адзіны сродак зрабіць гэта заключаўся ў тым, каб паставіць у парадак дня пытанне аб прадастаўленні незалежнасці, ці, па крайняй меры, самакіравання калоніям. Яшчэ ў 1943 г. Францыя пайшла на прызнанне незалежнасці Сірыі і Лівана. Англія праяўляла гатоўнасць адмовіцца ад мандата на Палесціну і Іарданію, абяцала адразу пасля вайны прадаставіць незалежнасць Індыі.

Заваяванню калоніямі незалежнасці спрыяла і тая грамадска-палітычная атмасфера, якая склалася ў свеце пасля заканчэння другой сусветнай вайны. На планеце ўзнялася дэмакратычная хваля, рэзка ўзмацніўся ўплыў дэмакратычных ідэй. Цяпер большасць краін-метраполій інакш глядзела на лёс калоній, усё больш асэнсоўваючы неабходнасць прадастаўлення іх народам права незалежна вырашаць свой лёс. Правячыя колы метраполій вымушаны былі ўлічваць настроі грамадства сваіх дзяржаў. У свеце ў выніку другой сусветнай вайны пазіцыі тых краін, якія мелі вялікія каланіяльныя ўладанні, былі аслаблены – Англіі, Францыі, Галандыі. Дамінуючае становішча ў свеце занялі ЗША і СССР, якія не былі зацікаўлены ў захаванні каланіяльнай сістэмы. ЗША разлічвалі, што атрыманне калоніямі незалежнасці дасць ім магчымасць заняць пануючае становішча на рынках новых незалежных дзяржаў. СССР спадзяваўся ўсталяваць у атрымаўшых незалежнасць краінах пракамуністычныя рэжымы і ўключыць іх у сферу свайго ўплыву. Змяніліся прыярытэты эканамічнага развіцця. Раней экамічны патэнцыял дзяржавы вызначаўся велічынёю падуладнай тэрыторыі, наяўнасцю карысных выкапняў. Гэта стымулявала захоп калоній. Ва ўмовах НТР роля названых фактараў у развіцці эканомікі зменшылася. Узровень эканамічнага развіцця краіны цяпер залежаў у першую чаргу ад яе магчымасцей ствараць і выкарыстоўваць найноўшыя тэхналогіі. У абмен на прамысловыя тавары, якія вырабляюцца на аснове гэтых тэхналогій, можна было без праблем атрымаць неабходную сыравіну. Трэба ўлічваць і тое, што існавалі калоніі, якія прыносілі метраполіі не прыбытак, а страты. Так што эканамічная мэтазгоднасць захавання калоній рэзка зменшылася. Тое самае можна сказаць і пра стратэгічную значнасць калоній ва ўмовах з'яўлення новых відаў зброі. Наяўнасць калоній для ўтрыма-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ння той ці іншай краінай статуса вялікай дзяржавы рэзка зменшылася, і метраполіі пачалі праяўляць меншую зацікаўленасць у іх захаванні.

Другая сусветная вайна мела і яшчэ адно важнае наступства, якое дапамагло ўзмацненню нацыянальна-вызваленчага руху. Тысячы і тысячы жыхароў калоній былі прызваны ў англійскую, французскую і іншыя арміі. Гэтыя людзі ўбачылі жыццё ў Еўропе, акунуліся ў атмасферу роўнасці, атрымалі ўяўленне аб дэмакратычных каштоўнасцях. Пасля вайны былыя салдаты вярнуліся ў афра-азіяцкія краіны і прынеслі з сабою ідэі свабоды, роўнасці, што паўплывала на актывізацыю барацьбы за нацыянальнае вызваленне.

Важныя змены адбыліся ў час другой сусветнай вайны ў сацыяльна-эканамічнай структуры шэрагу калоній. У час вайны ўзрасла патрэба ваюючых краін у сыравіне, якая пастаўлялася калоніямі. Гэта садзейнічала развіццю тут горназдабываючай прамысловасці. Узрасла вытворчасць і ў апрацоўчай прамысловасці. Гэта было звязана з тым, што, па-першае, рэзка зменшыўся прыток прамысловых тавараў з метраполій у калоніі. Па-другое, прамысловасць некаторых краін Усходу атрымала ваенныя заказы. У выніку зменаў, якія адбыліся ў прамысловасці, змянілася і сацыяльная структура грамадства. Узраслі колькасць і сіла нацыянальнай буржуазіі. Яна ўсё больш адчувала сябе дастаткова моцнай, каб уступіць у барацьбу з каланіяльным рэжымам і замежным капіталам за палітычную ўладу і эканамічнае панаванне. Да такой барацьбы нацыянальную буржуазію падштурхоўвала логіка развіцця капіталізму ў калоніях. Чым больш ён развіваўся, а ў час другой сусветнай вайны быў зроблены ў гэтай справе значны крок наперад, тым больш ён адчуваў перашкоды на сваім шляху, якія ствараліся каланіяльнай адміністрацыяй і замежным капіталам. Так што ў нацыянальнай буржуазіі былі важныя прычыны імкнуцца да заваявання незалежнасці сваіх краін. Высокая ступень арганізаванасці, палітычнай і агульнай культуры дазвалялі ёй арганізаваць і ўзначаліць масавы нацыянальна-вызваленчы рух. Важнае значэнне для яго разгортвання меў рост колькасці і арганізаванасці рабочага класа ў сувязі з развіццём капіталізму. Рабочыя разам з дробнабуржуазнымі слаямі горада і з сялянствам склалі масавую базу нацыянальна-вызваленчага руху. Супярэчнасці, звязаныя з развіццём нацыянальнага капіталізму, сталі галоўнай прычынай рэзкай актывізацыі барацьбы за нацыянальнае вызваленне ў найбольш развітых у эканамічным плане калоніях – Індыі, Алжыры, Інданезіі. Менавіта тут нацыянальная буржуазія і рабочы клас адыгралі вырашальную ролю ў заваяванні незалежнасці. У менш развітых краінах роля эканамічнага фактару была менш

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

значнай, і ўзрастала роля іншых, перш за ўсё палітычных фактараў. На вядучыя пазіцыі ў нацыянальна-вызваленчым руху ў іх выходзілі інтэлігенцыя, дробнабуржуазныя колы. У некаторых калоніях, напрыклад, у зоне Персідскага заліва, на чале нацыянальна-вызваленчага руху стаяла феадальная і рода-племянная арыстакратыя.

У першыя пасляваенныя гады працэс дэкаланізацыі ахапіў рэгіёны Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі. Гэта тлумачыцца тым, што тут быў дасягнуты найбольш высокі ўзровень развіцця капіталізму сярод каланіяльных краін і супярэчнасці паміж нацыянальнай буржуазіяй і замежным капіталам дасягнулі найбольшай вастрыні, сфарміравалася палітычная эліта, якая прэтэндавала на ўладу. Пазіцыі каланізатараў у рэгіёне былі аслаблены ў час другой сусветнай вайны. Адразу пасля завяршэння вайны назіраўся рэзкі ўздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Індыі, і англічане, у адпаведнасці з абавязацельствамі, якія яны ўзялі яшчэ ў час вайны, вымушаны былі пайсці на саступкі. Першапачаткова мелася на ўвазе, што адзінства Індыі будзе захавана. Але ва ўмовах, калі пачаліся індуска-мусульманскія сутыкненні, англійскія ўлады пайшлі на падзел Індыі па рэлігійнай прыкмеце. 14 і 15 жніўня 1947 г. былі абвешчаны дамініёны Пакістан і Індыйскі Саюз. Заваяванне незалежнасці Індыяй дало вялікі штуршок працэсу распаду каланіяльнай сістэмы ў свеце. Нацыянальная рэвалюцыя ў Індыі, якая грунтуючася на ідэалогіі гандзізму, у цэлым мела мірны характар. Мірным шляхам атрымала незалежнасць 4 студзеня 1948 г. Бірма.

Шэрагу краін Паўднёва-Усходняй Азіі давялося весці працяглую ўзброеную барацьбу за сваю незалежнасць. Інданезія абвясціла сваю незалежнасць яшчэ ў жніўні 1945 г., але яна вымушана была весці доўгую вайну супраць галандскіх каланізатараў. Толькі ў 1949 г. Галандыя згадзілася прызнаць незалежнасць Інданезіі. Таксама ў жніўні 1945 г. была абвешчана незалежнасць В'етнама. Аднак Францыя не прызнала незалежнасць гэтай краіны і пачала каланіяльную вайну. Толькі па Жэнеўскіх пагадненнях 1954 г. Францыя прызнала суверэнітэт В'етнама, а таксама Лаоса і Камбоджы. Англійская калонія Малайя заваявала незалежнасць у жніўні 1957 г. у выніку доўгай партызанскай вайны.

У Афрыцы, дзе сацыяльна-эканамічныя структуры былі больш адсталымі, працэс дэкаланізацыі пачаўся пазней, чым у Азіі, і працякаў больш павольна. Больш высокага ўзроўню эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця дасягнулі арабскія краіны паўночнай часткі кантыненту. Яны і разгарнулі першымі актыўную барацьбу за незалеж-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

насць. Туніс і Марока заваявалі незалежнасць ужо ў 1956 г. Прычым Францыя не звярталася да сілы, каб падавіць тут нацыянальна-вызваленчы рух. Тое ж можна сказаць і пра англійскую палітыку ў дачыненні да Судана, які таксама мірным шляхам у 1956 г. атрымаў незалежнасць. Інакш развіваліся падзеі ў Алжыры. Імкненне гэтай краіны да незалежнасці сустрэла моцнае супраціўленне з боку Францыі. Алжыр - гэта найстарэйшая французская калонія, і ў свядомасці французаў усталяваўся пункт гледжання на Алжыр як на неад'емную частку Францыі. У Алжыры мелася вялікая колькасць французскіх пасяленцаў, якія рашуча выступалі супраць прадастаўлення гэтай краіне незалежнасці. У выніку алжырскаму народу з 1954 па 1962 г. давялося весці антыкаланіяльную вайну, каб дасягнуць незалежнасці.

У другой палове 50-х гг. працэс дэкаланізацыі ахапіў і краіны Паўднёвай і Трапічнай Афрыкі. Першай у гэтым раёне ў 1957 г. незалежнасць заваявала англійская калонія Залаты Бераг, якая пачаланазывацца Гана. Прызнанне незалежнасці Ганы выклікала ланцужковую рэакцыю, якая прывяла да распаду англійскай, французскай і бельгійскай каланіяльных імперый у Афрыцы. У 1958 г. па ініцыятыве Ш.дэ-Голя ў калоніях Францыі быў праведзены рэферэндум па пытаннях: ці хоча насельніцтва калоній заставацца ў складзе міждзяржаўнага аб'яднання, дзе Францыя будзе адыгрываць вядучую ролю, але былыя калоніі будуць мець шырокае самакіраванне (Французскі саюз), ці калоніі жадаюць атрымаць поўную незалежнасць. З усіх калоній толькі насельніцтва Гвінеі выказалася за поўную незалежнасць. Нягледзячы на такія вынікі рэферэндуму, распад каланіяльнай імперыі Францыі ішоў у канцы 50-х - першай палове 60-х гг. хуткімі тэмпамі, як і англійскай. Вырашальнае значэнне меў 1960 г., абвешчаны ААН годам Афрыкі. У гэтым годзе незалежнасць атрымалі 17 былых калоній. У цэлым, да канца 60-х гг. абсалютная большасць афрыканскіх краін, якія складалі англійскую, французскую і бельгійскую каланіяльныя імперыі, атрымалі незалежнасць.

Шляхі дасягнення незалежнасці краінамі Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі былі рознымі. Большасць з іх вызвалілася дзякуючы масавым дзеянням насельніцтва, але, як правіла, гэтыя масавыя дзеянні не пераходзілі ва ўзброеныя сутыкненні. Да шырокамаштабных ваенных дзеянняў справа дайшла ў Кеніі. Тут каланіяльныя ўлады маглі абапірацца на шматлікіх еўрапейскіх перасяленцаў. Апошнія не хацелі аддзялення Кеніі ад Англіі, што і абумовіла тут моцнае супраціўленне нацыянальна-вызваленчаму руху. Да ваеннага супрацьстаяння справа дайшла і ў Бельгійскім Конга (пасля заваявання незалежнасці – Заір).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Бельгія паспрабавала адарваць ад Заіра багатую мінеральнымі рэсурсамі правінцыю Катанга і накіравала сюды ваенныя сілы. Бельгійцам удалося справакаваць грамадзянскую вайну ў Заіры. У выніку быў звергнуты лева-радыкальны ўрад Патрыса Лумумбы, які быў забіты. Нягледзячы на ўсе ўзрушэнні, Заір захаваў тэрытарыяльную цэласнасць, і ў краіне ўсталявалася дыктатура прэзідэнта Мабуту.

У канцы 60-х гг. толькі Партугалія яшчэ поўнасцю захавала сваю каланіяльную імперыю, якая ўключала Мазамбік, Анголу, Гвінею-Бісау, астравы Зялёнага Мыса. Праўда, цяпер яны афіцыйна лічыліся не калоніямі, а заморскімі тэрыторыямі. Гэта былі адсталыя ў сацыяльна-эканамічным і палітычным плане краіны. Нацыянальна-вызваленчы рух тут стаў набіраць сілу пазней, чым у калоніях іншых дзяржаў. Кіраўнікамі нацыянальна-вызваленчага руху ў гэтых калоніях сталі прадстаўнікі інтэлігенцыі, якія вучыліся ў Партугаліі. Яны лічылі, што шлях да незалежнасці ляжыць праз партызанскую вайну. У пачатку 60-х гг. у партугальскіх калоніях партызанскія атрады разгарнулі ваенныя дзеянні супраць каланізатараў, але дабіцца вялікіх поспехаў яны не змаглі. Партызанскі рух быў расколаты на некалькі плыняў. Вырашальнае значэнне для заваявання незалежнасці партугальскімі калоніямі мела дэмакратычная рэвалюцыя, якая адбылася ў гэтай краіне ў 1974 г. Дэмакратычны ўрад Партугаліі пайшоў на прызнанне незалежнасці Анголы, Мазамбіка, астравоў Зялёнага Мыса (1975). Гвінея-Бісау атрымала незалежнасць раней, у 1973 г.

З другой паловы 70-х гг. пачаўся заключны этап дэкаланізацыі Афрыкі. У 1975 г. Францыя была вымушана прадаставіць незалежнасць Каморскім астравам, а Англія ў 1976 г. - Сейшэльскім астравам. У тым жа 1976 г. Іспанія адмовілася ад сваіх правоў на Заходнюю Сахару, а ў 1977 г. Францыя прадаставіла незалежнасць сваёй апошняй калоніі на Афрыканскім кантыненце – Джыбуці.

Своеасаблівым быў шлях да незалежнасці англійскай Паўднёвай Радэзіі. У гэтай краіне жыло каля 200000 еўрапейскіх перасяленцаў і 8,8 млн. афрыканцаў. Белыя канцэнтравалі ў сваіх руках усю паўнату ўлады і эканамічныя рычагі. У 1965 г. белыя перасяленцы абвясцілі незалежнасць Паўднёвай Радэзіі ад Англіі. Яны былі ўстрывожаны тым, што метраполія можа пайсці на саступкі афрыканцам і вырашылі ўзяць лёс Паўднёвай Радэзіі ў свае рукі, каб захаваць сваё абсалютнае панаванне ў краіне. Англія не прызнала гэтай сепаратнай акцыі, але нічога не зрабіла для падаўлення мяцяжу. У такіх умовах афрыканскае насельніцтва разгарнула ўзброеную барацьбу супраць расісцкага рэжыму белай меншасці. Ні адзін з бакоў не дасягнуў рашаючай пе-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рамогі, і ў канцы 70-х гг. пачаліся перамовы паміж паўстанцамі і ўладаю. На аснове дасягнутага кампрамісу ў лютым 1980 г. адбыліся ўсеагульныя дэмакратычныя выбары ў парламент рэспублікі Зімбабве, як зараз называецца Паўднёвая Радэзія, пасля чаго яе незалежнасць атрымала міжнароднае прызнанне.

Апошняй на Афрыканскім кантыненце незалежнасць заваявала Намібія, якой валодала пасля першай сусветнай войны Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка. Рух за незалежнасць пачаўся ў Намібіі ў канцы 60-х гг. Яго вялі партызанскія атрады Народнай арганізацыі Паўднёва-Заходняй Афрыкі (СВАПО), якая атрымлівала вялікую падтрымку ад суседніх краін. Вялікую ролю ў вырашэнні намібійскай праблемы адыграла ААН. Пад яе эгідай у 1988 г. пачаліся шматбаковыя перамовы па ўрэгуляванні канфлікту ў Паўднёва-Заходняй Афрыцы. Яны завяршыліся пагадненнем аб прадастаўленні незалежнасці Намібіі і вывадзе з яе тэрыторыі паўднёваафрыканскіх войскаў. У сакавіку 1990 г. была абвешчана незалежнасць Намібіі. Такім чынам, працэс дэкаланізацыі ў Афрыцы завяршыўся. Яшчэ ў 1963 г. незалежныя краіны Афрыкі стварылі Арганізацыю Афрыканскага Адзінства, якая адыграла важную ролю ў працэсе дэкаланізацыі, падтрымліваючы нацыянальна-вызваленчы руху і ўмацоўваючы пазіцыі маладых афрыканскіх краін на міжнароднай арэне.

Прадаставіўшы палітычную незалежнасць былым калоніям, заходнія дзяржавы імкнуліся захаваць свой уплыў у маладых незалежных краінах. Гэтаму павінна была служыць і ўжо згаданая ідэя стварэння саюзу Францыі і яе былых калоній. Першапачаткова прадугледжвалася, што ўдзельнікі саюзу не атрымаюць поўнай незалежнасці. Аднак, калі ў пачатку 60-х гг. тыя калоніі, якія на рэферэндуме 1958 г. падтрымалі ідэю саюза, пачалі аб'яўляць аб поўнай незалежнасці, яго канцэпцыя была перагледжана. Адносіны ў рамках саюза будаваліся на аснове двухбаковых дагавораў Францыі з яе былымі калоніямі. На тэрыторыі былых калоній заставаліся французскія войскі і базы. Кіраўніком саюза лічыцца прэзідэнт Францыі. Перыядычна лідэры краін саюза збіраюцца на нарады.

Жыццяздольнай аказалася ідэя стварэння Брытанскай садружнасці нацый, якая пачала трактавацца як "свабодная асацыяцыя суверэнных незалежных дзяржаў". Англія, вядома, іграе вядучую ролю ў садружнасці, але фармальна захоўваецца прынцып поўнай самастойнасці і роўнасці ўдзельнікаў садружнасці. Яе кіраўніком з'яўляецца англійская каралева. Кіраўнікі дзяржаў садружнасці перыядычна збіраюцца на канферэнцыі. Стварэнню і Французскага саюза, і Брытанскай са-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дружнасці спрыяла тое, што не толькі метраполіі імкнуліся захаваць свае пазіцыі ў былых калоніях, але і новыя незалежныя дзяржавы лічылі для сябе карысным захаваць сувязі з былымі метраполіямі. Вопыт падказваў, што іх разрыў вядзе да пагаршэння эканамічнага становішча, тармозіць культурнае, сацыяльна-палітычнае развіццё.

2. Краіны, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, знаходзіліся на розных ступенях эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця. У адных маладых дзяржавах капіталізм на момант заваявання незалежнасці ўжо стаў вядучым сацыяльна-эканамічным укладам. Гэта Індыя, Інданезія, краіны Магрыбу. У другіх панавалі дакапіталістычныя адносіны – Эфіопія, дзяржавы Аравійскага паўвострава. У шэрагу краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі пераважалі яшчэ дакласавыя, патрыярхальныя адносіны. У залежнасці ад узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця розныя сацыяльна-палітычныя сілы ўзначалілі нацыянальна-вызваленчы рух, а затым узялі палітычную ўладу і вызначылі выбар шляхоў іх развіцця. У развітых краінах, як правіла, нацыянальная буржуазія, часам у саюзе з феадаламі, брала ўладу, і краіна ішла па капіталістычным шляху развіцця, хаця былі і выключэнні. З-за палітычных перш за ўсё прычын некаторыя з адносна развітых краін абралі некапіталістычны шлях развіцця. Напрыклад, Інданезія, Алжыр. Тут у сувязі з жорсткай палітыкай метраполій, якія развязалі каланіяльныя войны, адбылася радыкалізацыя нацыянальна-вызваленчага руху, узмацніліся тыя сілы, якія выступалі за радыкальныя рэформы, у тым ліку і сацыялістычныя па характары. Рэвалюцыйныя інтэлігенты, дробнабуржуазныя рэвалюцыянеры, якія прыйшлі да ўлады ў больш адсталых краінах, часта знаходзіліся пад моцным уплывам радыкальных ідэй і накіроўвалі свае краіны па шляху “сацыялістычнай арыентацыі”. Яны бачылі ў ёй найбольш надзейны шлях хуткага пераадолення сацыяльна-эканамічнай адсталасці. Капіталізм жа пасля шматгадовага каланіяльнага панавання прыраўноўваўся да каланіялізму, ад якога так доўга пакутавалі народы Азіі і Афрыкі. Як правіла, лідэры былых калоній, абвяшчаючы будаўніцтва сацыялізму, імкнуліся пазбегнуць савецкай мадэлі і гаварылі аб сацыялізме нацыянальным, які прадстаўляўся ў выглядзе "трэцяга шляху" развіцця. Нацыянальны сацыялізм меў на ўвазе спалучэнне ідэй роўнасці, узятых з марксізму, з аналагічнымі ідэямі, якія ўтрымлівалі рэлігіі, традыцыі ўсходняга грамадства.

У “сацыялістычнай арыентацыі” па часе можна вылучыць дзве хвалі. Першая адносіцца да 60-х гг. У гэты час па шляху сацыялістычнай арыентацыі ішлі многія арабскія краіны: Егіпет, Алжыр, Сірыя, Ірак, а

таксама Бірма, Гвінея, Танзанія, Самалі. У 70-я гг. многія з названых краін ужо парвалі з “сацыялістычнай арыентацыяй” (Егіпет, Танзанія, Самалі). Аднак з'явілася цэлая група новых краін, якія выбралі некапіталістычны шлях развіцця: Ангола, Мазамбік, Конга, Бенін, Эфіопія. Гэта была другая хваля “сацыялістычнай арыентацыі”. Асаблівасць грамадскага развіцця краін другой хвалі заключалася ў тым, што яны адышлі ад канцэпцыі нацыянальнага сацыялізму і ўсё больш арыентаваліся на марксісцка-ленінскі сацыялізм. Адпаведна, існавалі істотныя адрозненні паміж краінамі першай і другой хвалі ў праводзімых сацыяльна-эканамічных пераўтварэннях і створанай сацыяльна-палітычнай сістэме. У краінах другой хвалі быў адкінуты тэзіс аб "сацыялістычным характары" ісламу і іншых рэлігій, што пастаянна падкрэслівалася прадстаўнікамі нацыянальнага сацыялізму. Пануючай ідэалогіяй у грамадстве павінен быў стаць марксізм-ленінізм, месца для рэлігійнай ідэалогіі не заставалася. Адкінулі прыхільнікі савецкай мадэлі сацыялізму ў афра-азіяцкіх краінах і тэзіс аб уліку і выкарыстанні нацыянальных асаблівасцей пры будаўніцтве сацыялізму. Лідэры краін “сацыялістычнай арыентацыі” другой хвалі заяўлялі, што існуюць агульныя, навукова ўсталяваныя прынцыпы будаўніцтва сацыялізму, якія неабходна прымяняць у кожнай краіне. На чале краін першай хвалі 60-х гг. стаялі, як правіла, нацыянальныя лідэры і нацыяналістычныя партыі, якія і праводзілі ў жыццё канцэпцыю нацыянальнага сацыялізму. У гэтых краінах усталяваліся аўтарытарныя рэжымы. Калі ў 70-я гг. група краін абвясціла, што іх мэта - марксісцкая мадэль сацыялізму, то ў іх пачалося стварэнне марксісцка-ленінскіх партый: Кангалезская партыя працы, Партыя народнай рэвалюцыі Беніна, Народны рух за вызваленне Анголы, Рабочая партыя Эфіопіі, Фронт вызвалення Мазамбіка. Калі партыі, якія ў свой час узначальвалі будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму, абапіраліся ў асноўным на дробнабуржуазныя пласты грамадства, то марксісцка-ленінскія абвясцілі сябе пралетарскімі. Сам пралетарыят, якога ў многіх краінах другой хвалі практычна не было, абвяшчаўся "авангардам грамадства". Яго партыя павінна была выконваць ролю вядучай сілы ў справе будаўніцтва сацыялізму.

Для краін як першай, так і другой хвалі “сацыялістычнай арыентацыі” характэрна ў цэлым аднолькавая мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця. Галоўная ўвага надавалася развіццю дзяржаўнага сектара. Ён разглядаўся як аснова эканомікі, і менавіта за кошт дзяржаўнай гаспадаркі разлічвалі маладыя краіны пераадолець сваю адсталасць. Правячыя рэжымы ў краінах першай хвалі, якія будавалі нацыяналь-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ны сацыялізм, дапускалі існаванне невялікага прыватнага "неэксплуататарскага" сектара ў эканоміцы. Краіны ж, што ў 70-я гг. узялі ў якасці ўзору савецкую мадэль развіцця, вялі справу да поўнай манаполіі дзяржаўнай уласнасці. У гэтых краінах былі больш радыкальнымі і аграрныя пераўтварэнні. Каапераванне сельскай гаспадаркі мела месца і ў краінах з нацыянальным сацыялізмам, але тут яно было адносна абмежаваным. У краінах другой хвалі быў узяты курс на поўнае каапераванне сялянства. Для краін як першай, так і другой хвалі характэрна выцясненне замежнага капіталу. Краіны “сацыялістычнай арыентацыі”, асабліва другой хвалі, атрымалі ад СССР вялікую разнапланавую дапамогу. Менавіта жаданне яе атрымання падштурхоўвала кіраўнікоў шэрагу краін Азіі і Афрыкі абвяшчаць курс на будаўніцтва сацыялізму. Неабходна адзначыць, што савецкая дапамога накіроўвалася нават такім адкрыта адыёзным рэжымам, як Аміна ва Угандзе ці Бакаса ў Цэнтральна- Афрыканскай Рэспубліцы.

Да канца 80-х гг. амаль усе краіны “сацыялістычнай арыентацыі” адмовіліся ад яе. Гэта было звязана з дзвюма асноўнымі прычынамі. Па-першае, да гэтага часу паказала сваю неэфектыўнасць створаная ў гэтых краінах дзяржаўная эканоміка. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні, якія праводзіліся, прывялі да вострых канфліктаў у грамадстве і канчаткова разбурылі эканоміку. У выніку, асноўная маса краін, якія ішлі па шляху “сацыялістычнай арыентацыі”, апынулася  ў ліку самых адсталых краін свету. Па-другое, у  канцы 80-х гг. практычна спынілася дапамога з боку СССР, што для краін са-цыялістычнай арыентацыі таксама стала важным матывам, каб шукаць новыя шляхі развіцця.

Большасць краін Усходу, што атрымалі незалежнасць, пайшлі па капіталістычным шляху развіцця. Як высветлілася, гэты кірунак таксама не забяспечваў хуткае пераадоленне адсталасці і не пазбаўляў краіны, якія сталі на шлях развіцця, ад эканамічнай і палітычнай залежнасці. Краіны Захаду імкнуліся захаваць свае пазіцыі ў былых калоніях, але цяпер асноўны ўпор рабіўся на захаванне эканамічнай залежнасці маладых краін. Гэтая палітыка атрымала назву неакаланіялізм. Яна ўяўляла з сябе сістэму эканамічнай эксплуатацыі і палітычнай залежнасці краін, якія сталі на шлях развіцця, ад індустрыяльна развітых дзяржаў. Эканамічная эксплуатацыя праявілася, папершае, у тым, што большасць краін Азіі і Афрыкі заставаліся аграрна-сыравіннымі прыдаткамі прамысловага Захаду. Як правіла, былыя калоніі захавалі монакультурны характар сваёй гаспадаркі. Эканамічны стан маладых краін цалкам залежаў ад збыту на сусветных рынках



РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аднаго ці некалькіх відаў сыравіны. Вялікай праблемай для краін, якія сталі на шлях развіцця, былі нажніцы цэн. На сусветных рынках суадносіны паміж цэнамі на сыравіну і прамысловыя тавары ўвесь час мяняліся на карысць апошніх, што было крайне не выгадна для развіваючыхся краін і прыносіла вялікі прыбытак кампаніям індустрыяльных дзяржаў. Краіны Азіі і Афрыкі аказаліся ў ролі буйных даўжнікоў, што яшчэ больш узмацніла іх залежнасць ад Захаду.

Перапрацоўчая прамысловасць у краінах Азіі і Афрыкі амаль адсутнічала, і яны апынуліся ў поўнай залежнасці ад увозу гатовых прамысловых вырабаў. Узмацнялася эканамічная залежнасць афра-азіяцкіх краін ад Захаду і ў сувязі з пранікненнем у рэгіён ТНК. Яны ўзялі пад свой кантроль практычна ўвесь знешні гандаль краін, якія сталі на шлях развіцця: рыс, каўчук, нафта – 70%, волава – 80%, жалезная руда, баксіты – каля 100%. Гэта дало магчымасць ТНК усталёўваць выгадныя для сябе цэны, якія часта не адпавядаюць інтарэсам афра-азіяцкіх краін. ТНК стварылі свае філіялы ў рэгіёне і выкарыстоўваюць танную рабочую сілу і прыродныя рэсурсы для атрымання высокіх прыбыткаў. Але неабходна адзначыць і станоўчыя моманты дзейнасці ТНК у маладых краінах: капіталаўкладанні, стварэнне шэрагу прадпрыемстваў, якія атрымалі новыя тэхналогіі.

У ваенна-палітычным плане захаванне залежнасцці праявілася ў тым, што пад эгідай вядучых краін Захаду ў "трэцім свеце" была створана сістэма ваенных саюзаў, ваенных баз. Палітыка неакаланіялізму выклікалася не толькі імкненнем краін Захаду захаваць свае пазіцыі ў былых калоніях. Яе правядзенню спрыяла сітуацыя, якая склалася ў афра-азіяцкіх краінах. Пасля дэкаланізацыі ў краінах Усходу не аказалася фінансавых сродкаў, кваліфікаваных кадраў, інфраструктуры, каб забяспечыць высокія тэмпы развіцця. Палітычная нестабільнасць, мілітарызм, беднасць, адсутнасць традыцыі высокапрадукцыйнай працы, перавага кланавых інтарэсаў над агульнанацыянальнымі таксама спрыялі ўмацаванню неакаланіяльнай залежнасці.

## ВЭ-1. УЗДЫМ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І РАСПАД КАЛАНІЯЛЬНАЙ СІСТЭМЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць*:**

- храналагічныя рамкі распаду каланіяльнай сістэмы;



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- асноўныя этапы распаду каланіяльнай сістэмы;

- асноўныя ідэйна-палітычныя плыні нацыянальна-вызваленчага руху;

- прычыны і перадумовы распаду каланіяльнай сістэмы.

***Умець*:**

- даць характарыстыку ўзроўню сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця афра-азіяцкіх краін на момант заканчэння другой сусветнай вайны;

- вызначыць шляхі заваявання незалежнасці краінамі Усходу;

- вызначыць рухаючыя сілы нацыяльна-вызваленчага пасля другой сусветнай вайны.

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-1*.**

1. Прычыны і перадумовы распаду каланіяльнай сістэмы.
2. Асноўныя этапы распаду каланіяльнай сістэмы і шляхі заваявання незалежнасці афра-азіяцкімі краінамі.
3. Рухаючыя сілы і ідэйна-палітычныя кірункі нацыянальна-вызваленчага руху.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** Другая сусветная вайна аказала істотны ўплыў на сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў каланіяльных краінах, што спрыяла выспяванню перадумоў і прычын уздыму нацыянальна-вызваленчага руху і паскорыла заваяванне незалежнасці афра-азіяцкімі краінамі.

*Падумайце, як звязана выспяванне ўмоў для заваявання незалежнасці з працэсам капіталістычнай мадэрнізацыі і вынікамі другой сусветнай вайны?*

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока. В 2 т. – М., 2001. – Т.2.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX в. В 3.ч. Под ред. Родригеса А.М. – М., 2001. – Ч.2.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні*:**

- дайце характарыстыку зменам у сацыяльна-эканамічным развіцці краін Усходу да сярэдзіны XX ст., улічваючы рэгіянальныя асаблівасці;

- прааналізуйце, які ўплыў на ідэйна-палітычнае развіццё краін Усходу аказала другая сусветная вайна;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- вызначце, якія змены адбыліся ў сацыяльнай структуры афра-азіяцкіх краін да сярэдзіны XX ст. у кантэксце фарміравання сацыяльнай базы нацыянальных рэвалюцый;

- пакажыце, што ў выніку другой сусветнай вайны на міжнароднай арэне былі аслаблены пазіцыі краін і палітычных сіл, якія выступалі за захаванне каланіяльных імперый;

- прачытайце наступны тэкст і адкажыце на пытанне: укараненне якіх новых прынцыпаў у жыццё міжнароднай супольнасці спрыяла заваяванню незалежнасці афра-азіяцкімі краінамі?

"Дэкларацыя Генеральнай Асамблеі ААН аб прадастаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам

14 снежня 1960 г.

1. Падначаленне народаў замежнаму прыгнёту і панаванню і іх эксплуатацыя з'яўляецца адмаўленнем асноўных правоў чалавека, супярэчыць Статуту ААН і перашкаджае развіццю супрацоўніцтва і ўсталяванню міру ва ўсім свеце;

2. Усе народы маюць права на самавызначэнне; у выніку гэтага права яны свабодна ўсталёўваюць свой палітычны статус і ажыццяўляюць сваё эканамічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё." (Хрестоматия по новейшей истории. 1945-1965. В 2 ч. - М., 1966. – Ч.2 - С.102 –103.)

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** па шэрагу прычын, звязаных з ходам і вынікамі другой сусветнай вайны, а таксама асаблівасцямі сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця, працэс дэкаланізацыі пачаўся з раёнаў Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі, а затым распаўсюдзіўся на іншыя рэгіёны.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру*:**

Васильев Л.С. История Востока. В 2 т. – М., 2001. – Т.2.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX в. В 3 ч. Под ред. Родригеса А.М. – М., 2001. – Ч.2.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прасачыце пачатак распаду каланіяльнай сістэмы з рэгіёна Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі;

- пакажыце, што гэта звязана з адносна высокім узроўнем эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця некаторых калоній і з вынікамі другой сусветнай вайны для рэгіёна;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Прааналізуйце, наколькі адносна высокім быў узровень развіцця капіталізму ў Індыі. Як вы думаеце, які ўплыў на трываласць пазіцый каланізатараў у Азіі аказала палітыка Японіі ў час другой сусветнай вайны. Чаму партугальская каланіяльная імперыя захавалася даўжэй за іншыя?*

- прасачыце распад французскай, брытанскай, бельгійскай, партугальскай каланіяльных імперый у Афрыцы;
- падумайце, чаму асабліва складаным і працяглым быў шлях да незалежнасці Зімбабве і Намібіі;
- выдзеліце групы краін, якія прыйшлі да незалежнасці мірным шляхам, а якія праз узброеную барацьбу. Чым была абумоўлена розніца ў шляхах заваявання незалежнасці?

*Параўнайце, якія каланіяльныя дзяржавы і чаму больш актыўна звярталіся да ўзброенай сілы, каб захаваць свае калоніі.*

### Парадак вывучэння трэцяга пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у розных краінах Усходу розныя сацыяльна-палітычныя сілы адыгралі галоўную ролю ў нацыянальна-вызваленчым руху, што, разам з геапалітычным фактарам, у многім абумовіла разнастайнасць абраных гэтымі краінамі шляхоў развіцця, але пры гэтым у іх развіцці мелася і шмат агульнага.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру*:**

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX в. В 3 ч. Под ред. Родригеса А.М. – М., 2001. – Ч.2.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце характэрныя рысы сацыяльнай структуры афра-азіяцкіх краін у сярэдзіне XXст.;

*Вазьміце для гэтага краіны, якія маюць розныя ступені сацыяльна-эканамічнага развіцця.*

- прааналізуйце сацыяльны склад нацыянальна-вызваленчага руху на Усходзе ў сярэдзіне XX ст.;
- укажыце асноўныя ідэйна-палітычныя плыні ў нацыянальна-вызваленчым руху пасля другой сусветнай вайны;
- прааналізуйце, якія фактары вызначылі прыход да кіраўніцтва нацыянальна-вызваленчым рухам у розных краінах тых ці іншых сацыяльна-палітычных сіл.

*Для вырашэння гэтай задачы звярніце ўвагу на характар палітыкі каланіяльных уладаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Самакантроль па ВЭ-1.**

1. Назавіце асноўныя прычыны і перадумовы распаду каланіяльнай сістэмы.

2. Прасачыце па карце, як распаўсюджвалася хваля дэкаланізацыі па розных рэгіёнах свету.

3. Якія сацыяльныя групы выступілі ў якасці рухаючых сіл нацыянальна-вызваленчага руху розных краінах?

## ВЭ-2. ХАРАКТЭРНЫЯ РЫСЫ ПАЛІТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІН УСХОДУ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- асаблівасці палітычнай сістэмы краін Усходу: агульныя моманты і своеасаблівасць іх праяўлення ў асобных краінах;
- найважнейшыя палітычныя партыі, франты, рухі і іх ідэйную скіраванасць;
- краіны, якія выбралі сацыялістычны, капіталістычны шляхі развіцця, "сацыялістычную арыентацыю", "нацыянальны сацыялізм";

***умець:***

- вызначыць сутнасць розных палітычных мадэляў, характэрных для краін, якія сталі на шлях развіцця;
- растлумачыць прычыны схільнасці краін Усходу да аўтарытарызму і таталітарызму;
- вызначыць этапы палітычнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны;
- прааналізаваць сутнасць такой з'явы, як неакаланіялізм;
- даць характарыстыку паняццям "сацыялістычная арыентацыя", "нацыянальны сацыялізм".

*Звярніце ўвагу, што гэтыя паняцці характарызуюцца шмат якімі агульнымі прыкметамі*

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-2:***

1. Пошукі мадэлі грамадскага развіцця і дыферэнцыяцыя краін Усходу па абраных шляхах развіцця.

2. Палітычныя партыі і рухі, іх ідэалогія.

3. Палітычная нестабільнасць у краінах Усходу. Зменлівасць палітычных рэжымаў.

4. Схільнасць краін Усходу да аўтарытарызму і таталітарызму.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання*:** краіны Усходу пасля заваявання незалежнасці выбралі розныя шляхі развіцця: капіталізм, марксісцка-ленінскі сацыялізм, нацыянальны сацыялізм. Выбар кожнага з іх быў абумоўлены цэлым комплексам як унутраных, так і знешнепалітычных прычын.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру*:**

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX в. В 3 ч. Под ред. Родригеса А.М. – М., 2001. – Ч.2.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце групы маладых незалежных краін у адпаведнасці з выбранымі імі шляхамі развіцця;

*Звярніце ўвагу, што выбар шляхоў развіцця быў абумоўлены тэндэнцыямі сусветнага развіцця, спадчынай каланіялізму, рэлігійна-цывілізацыйнай традыцыяй.*

- падумайце, чым абумоўлены выбар многімі афра-азіяцкімі краінамі сацыялізму і “сацыялістычнай арыентацыі” ў якасці шляху развіцця?

*Звярніце ўвагу на характарыстыку Л.С. Васільевым такіх катэгорый, як “вакуум улады” і “поле ідэйна-палітычнай напружанасці” і іх ролю ў ажыццяўленні выбару.*

- дайце агульную характарыстыку канцэпцыі “нацыянальнага сацыялізму” ў краінах Усходу;

- вызначце, якая роля рэлігійна-цывілізацыйнага фактару і знешняга ідэйна-палітычнага ўздзеяння ў выбары шляхоў развіцця афра-азіяцкімі краінамі.

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у краінах Азіі і Афрыкі склалася сістэма разнастайных палітычных партый і рухаў, якія істотна адрозніваліся ў залежнасці ад праводзімай палітыкі і ідэалогіі і абапіраліся на традыцыйную сацыяльную структуру ўсходняга грамадства.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. – С.474-476, 526-545

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. - М., 2001. – Ч.2. - Гл.1.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні*:**

- пазнаёмцеся з тыпамі палітычных партый Усходу ў залежнасці ад іх ідэалогіі і палітыкі;

- вызначце, што з сябе ўяўлялі "авангардныя партыі" ў афра-азіяцкіх краінах;

*Каб даць характарыстыку "авангардных партый", можна звярнуцца да гісторыі кіруючых партый асобных краін: КНР, Эфіопіі 70-х – 80-х гг., Сірыі 60-х – 80-х гг., Гвінеі 60-х – 70-х гг. і інш.*

- ахарактарызуйце ідэалогіі, на якіх будавалі сваю палітыку кіруючыя партыі краін "сацыялістычнай арыентацыі" і "нацыянальнага сацыялізму".

*Пры выкананні гэтага задання можна звярнуцца да гісторыі асобных краін "сацыялістычнай арыентацыі" і "нацыянальнага сацыялізму".*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** палітычнае жыццё краін Усходу вызначалася нестабільнасцю, што было абумоўлена перш за ўсё характэрнымі рысамі цывілізацыйнага фундаменту краін рэгіёна, асаблівасцямі працэсу дзяржаваўтварэння і знешнім ідэйна-палітычным уздзеяннем.

*Успомніце, як фарміраваліся межы краін Азіі і Афрыкі. Падумайце, наколькі можна гаварыць аб завершанасці працэсу ўтварэння нацый на Усходзе. Падумайце, як на палітычныя працэсы ўплывае захаванне патэрналісцкіх адносін, кланава-племянных структур.*

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру*:**

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. - Гл.1.

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. – С.474-476.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- пакажыце, што поліэтнічны склад насельніцтва многіх краін Усходу ёсць адна з прычын унутранай нестабільнасці;

- прасачыце, як цывілізацыйны фундамент усходніх грамадстваў, наяўнасць сацыяльных структур традыцыйнага грамадства ўплываюць на палітычную сітуацыю ў краінах Азіі і Афрыкі;

- вызначце, у чым спецыфіка фарміравання партыйна-палітычных структур у краінах Усходу і асаблівасці партыйна-палітычнай барацьбы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Гэтая спецыфіка перш за ўсё звязана з асаблівасцямі рэлігійна-цывілізацыйнага базісу і захаваннем элементаў традыцыйнай сацыяльнай структуры.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання*:** у палітычным жыцці краін Усходу пасля заваявання незалежнасці назіраецца дамінаванне аўтарытарнай і таталітарнай тэндэнцый.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. Гл.1.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- успомніце, чым характарызуюцца аўтарытарныя і таталітарныя палітычныя рэжымы;
- назавіце канкрэтныя прыклады існавання аўтарытарных і таталітарных рэжымаў у краінах Усходу;
- высветліце прычыны развіцця аўтарытарнай і таталітарнай тэндэнцый у афра-азіяцкіх краінах;

*Найбольш яскравымі прыкладамі таталітарных рэжымаў з'яўляюцца сацыялістычныя краіны Азіі (КНР, КНДР і інш.). Аўтарытарныя рэжымы былі характэрны для многіх краін Усходу як сацыялістычнага (Эфіопія, Сірыя), так і капіталістычнага шляху развіцця (Заір, Паўднёвая Карэя). Падумайце, чаму шматпартыйнасць і парламенцкая дэмакратыя заходняга ўзору з такімі цяжкасцямі прыжываецца ў афра-азіяцкіх краінах.*

- падумайце, якую ролю ў станаўленні і існаванні аўтарытарных і таталітарных рэжымаў на Усходзе адыгрывалі авангардныя палітычныя партыі, армія.

*Звярніце ўвагу, што армія на Усходзе практычна адзіная дзяржаўная структура, якая характарызуецца інстытуцыйным адзінствам і адсутнасцю сацыяльных і этна-рэлігійных супярэчнасцей.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Самакантроль па ВЭ-2.**

1. Успомніце, якія краіны Усходу ў другой палове XX ст. выбралі капіталістычны шлях развіцця, якія сацыялістычны і якія "сацыялістычную арыентацыю".
2. Якія найважнейшыя ідэйна-палітычныя плыні склаліся на Усходзе пасля дэкаланізацыі?

3. Якія адметныя рысы характарызуюць палітычныя рэжымы краін Азіі і Афрыкі?

## ВЭ-3. АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІН УСХОДУ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- дзве асноўныя тэндэнцыі ў развіцці эканомікі афра-азіяцкіх краін: умацаванне эканамічнай незалежнасці і інтэрнацыяналізацыя эканомік маладых незалежных краін;
- групы афра-азіяцкіх краін у залежнасці ад абранай эканамічнай мадэлі і тэмпаў развіцця;
- сутнасць мадэлі “даганяючага развіцця”;
- як праяўляецца неакаланіялізм у эканамічнай сферы;

***умець:***

- ахарактарызаваць асноўныя этапы сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны;
- вызначыць прычыны эканамічнай адсталасці краін Усходу;
- прааналізаваць асаблівасці сацыяльнай структуры ўсходніх грамадстваў на сучасным этапе развіцця;
- паказаць аднабаковасць эканамічнага развіцця большасці краін Усходу.

***Асноўныя пытанні да вывучэння ВЭ-3:***

1. Мадэль даганяючага развіцця афра-азіяцкіх краін пасля заваявання незалежнасці;
2. Рэгіянальная і галіновая нераўнамернасць у развіцці эканомік краін Усходу;
3. Адставанне афра-азіяцкіх краін ад высокаразвітых дзяржаў па ўзроўню эканамічнага развіцця;
4. Супярэчнасці ў развіцці сацыяльнай структуры грамадстваў усходніх краін.

### Парадак вывучэння першага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** мадэль даганяючага развіцця была ўспрынята афра-азіяцкімі краінамі як спроба хутка пераадолець эканамічную адсталасць праз фарсіраваную індустрыялізацыю пры вырашальнай ролі дзяржавы ў эканамічным развіцці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. – С.484-489.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. - Ч.2.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- усвядоміце, што пасля заваявання незалежнасці краіны Усходу бачылі сваю галоўную задачу ў пераадоленні адсталасці праз фарсіраваную індустрыялізацыю;

*Звярніце ўвагу, што краіны Азіі і Афрыкі ў рамках гэтай мадэлі дабіліся значнага росту прамысловай вытворчасці, але на экстэнсіўнай аснове і старой тэхнічнай і тэхналагічнай базе.*

- высветліце, чаму ва ўмовах даганяючага развіцця дзяржава ператвараецца ў галоўны суб'ект эканамічных адносін;
- прааналізуйце, якіх вынікаў дасягнулі краіны Усходу ў рамках даганяючага развіцця;
- высветліце, наколькі даганяючая мадэль развіцця ўмацоўвала эканамічную самастойнасць краін Усходу, ці спрыяла інтэрнацыяналізацыі іх эканомік.

*Падумайце, у чым праяўляўся неакаланіялізм у эканамічнай сферы.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** неабходна зразумець, што для эканамічнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны характэрна нераўнамернасць, якая праяўляецца як у адносінах да розных краін і рэгіёнаў, так і асобных галін эканомікі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Мельянцев В.А. Экономический рост в развивающихся странах: достижения, контрасты и парадоксы//Восток. – 2001. – №1. – С.69-83.

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. Гл.15.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. - Ч.2. - Гл.1.

Эльянава А. Глобализация и расслоение развивающихся стран // МЭ и МО.– 2000.– № 6.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- падзяліце краіны Усходу на групы ў залежнасці ад узроўню і тэмпаў іх эканамічнага развіцця пасля заваявання незалежнасці;

*Падумайце, якую ролю ў тэмпах развіцця розных краін і рэгіёнаў адыграў рэлігійна-цывілізацыйны фундамент.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- пакажыце, якія галіны эканомікі ў афра-азіяцкіх краінах развіваліся найбольш паспяхова;

*Для гэтага параўнайце ролю ў эканоміцы афра-азіяцкіх краін горназдабываючай і апрацоўчай прамысловасці, сферы паслуг, сельскай гаспадаркі.*

- падумайце, у чым праяўляецца аднабокасць эканамічнага развіцця ўсходніх краін.

*Звярніце ўвагу, што ў розных галінах эканомікі доля краін, якія сталі на шлях развіцця, у сусветнай вытворчасці істотна адрозніваецца.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у апошнія дзесяцігоддзі застаецца і нават нарастае разрыў ва ўзроўнях сацыяльна-эканамічнага развіцця паміж краінамі Усходу і індустрыяльнымі дзяржавамі Захаду і Японіяй.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. - Гл.15.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. – М., 2001. - Ч.2. - Гл.1.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прасачыце на канкрэтным матэрыяле, як мянялася доля афра-азіяцкіх краін у сусветнай вытворчасці, як суадносіцца вытворчасць і нацыянальны даход у маладых незалежных краінах і развітых краінах у разліку на душу насельніцтва;
- падумайце, у якіх сферах эканамічнага жыцця і чаму нарастае адставанне краін, якія сталі на шлях развіцця;
- дайце характарыстыку палітыкі неакаланіялізму і ролі ТНК у эканоміцы маладых незалежных краін.

*Ці можна ўздзеянне ТНК на эканоміку гэтых краін характарызаваць толькі як станоўчае ці адмоўнае?*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання*:** ва ўмовах мадэрнізацыі ўсходняга грамадства ідзе фарміраванне сучаснай сацыяльнай структуры, але гэты працэс мае шэраг спецыфічных рыс, якія абумоўлены спецыфікай традыцыйных афра-азіяцкіх цывілізацый.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. - Гл.15.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. – М., 2001. - Ч.2. - Гл.1.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- высветліце прычыны незавершанасці ўтварэння нацый у краінах Азіі і Афрыкі;

*Успомніце, як фарміраваліся тэрыторыі многіх афра-азіяцкіх краін.*

- устанавіце, у чым праяўлялася супярэчлівасць працэсу ўтварэння сучаснай сацыяльнай структуры ва ўсходніх краінах;

*Падумайце, якія віды сацыяльных адносін і сацыяльных структур дамінуюць у краінах Усходу.*

- выдзеліце асноўныя страты сучасных грамадстваў краін Усходу.

**Самакантроль па ВЭ-2.**

1. Ахарактарызуйце дзве асноўныя тэндэнцыі развіцця эканомік усходніх краін пасля другой сусветнай вайны.
2. Назавіце прычыны эканамічнага адставання краін, якія сталі на шлях развіцця.
3. Назавіце групы краін Усходу ў залежнасці ад узроўню іх эканамічнага развіцця.
4. Якія фактары вызначалі асаблівасці сацыяльнага развіцця краін Усходу?

## ВЭ-К. ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ ПА МОДУЛЮ

***Кантрольныя заданні:***

*Перш чым прыступіць да выканання кантрольных заданняў, успомніце, якія мэты ставіліся пры вывучэнні модуля, якая яго вядучая ідэя, якія асноўныя паняцці неабходна было засвоіць. Калі вы не ўпэўнены, што пастаўленыя задачы вырашаны, звярніцеся да той літаратуры, якая рэкамендавалася пры вывучэнні ВЭ модуля.*

1. Пералічыце перадумовы распаду каланіяльнай сістэмы пасля другой сусветнай вайны.
2. У найбольш развітых у сацыяльна-эканамічным плане краінах Усходу кіруючай сацыяльнай сілай нацыянальна-вызваленчага руху з'яўлялася ________________________________.
3. З якога рэгіёна пачаўся распад каланіяльнай сістэмы пасля другой сусветнай вайны?

а) Паўночная Афрыка; б) Паўднёвая і Трапічная Афрыка; в) Паўднёвая і Паўднёва-Усходняя Азія; г) Акіянія.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4. Працэс дэкаланізацыі на Усходзе ў асноўным завяршыўся:

а) у пачатку 1960-х гг.; б) у пачатку 1970-х гг.; в) у сярэдзіне 70-х гг.; г) у сярэдзіне 80-х гг.

*Растлумачце чаму?*

5. Зыходзячы са шляху заваявання незалежнасці, якая краіна лішняя ў гэтым лагічным радзе:

а) Гана; б) Гвінея (Канакры); в) Інданезія; г) Індыя.

6. Якая краіна не мела патрэбы змагацца за незалежнасць пасля другой сусветнай вайны?

а) Алжыр; б) Егіпет; в) Сінгапур; г) Бірма.

7. Распад каланіяльнай сістэмы ў Трапічнай і Паўднёвай Афрыцы пачаўся з заваявання незалежнасці:

а) Залатым Берагам (Гана); б) Сінегалам; в) Угандай; г) Кеніяй.

*Успомніце, у якім годзе гэта адбылося.*

8. Завяршэнне дэкаланізацыі ў Афрыцы звязана з заваяваннем незалежнасці:

а) Зімбабве; б) Намібіяй; в) Анголай; г) Танзаніяй.

*Чаму шлях гэтай краіны да незалежнасці быў такі працяглы?*

9.Суаднясіце пералічаныя краіны з выбраным імі шляхам развіцця:

| | |
|---|---|
| Ангола ( з сяр.70-х гг.) | капіталістычны |
| Сірыя (з 60-х гг.) | |
| Нігерыя (з 60-х гг.) | сацыялістычны |
| Егіпет (50-–60-я гг.) | сацыялістычная арыентацыя |
| В’етнам ( з 50-х гг.) | |
| Эфіопія (з сяр 70-х гг.) | нацыянальны сацыялізм |

*Выбар зрабіце з дапамогай стрэлак.*

10.Пасля заваявання незалежнасці ў палітычным жыцці краін Усходу пераважалі тэндэнцыі да:

а)шматпартыйнасці; б)аўтарытарызму; в)нестабільнасці; г)парламентарызму; д) аднапартыйнасці.

11. Суаднясіце пералічаныя палітычныя партыі і рухі з пэўнай ідэалогіяй:

| | |
|---|---|
| Нацыянальная партыя Інданезіі | нацыянальны сацыялізм |
| Партыя працоўных В’етнама. | |
| Фронт вызвалення Мазамбіка. | марксізм-ленінізм |
| Працоўная партыя Карэі. | |



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Выбар зрабіце з дапамогай стрэлак.*

12. Вызначце, у чым спецыфіка нацыянальнага сацыялізму ў параўнанні з марксісцка-ленінскім?

13 Назавіце характэрныя рысы эканамічнага развіцця краін Усходу на наступных этапах:

а) 60-я – 70-я гг.; б) 80-я гг.; в) з пачатку 90-х гг.

*Звярніце ўвагу на тэмпы росту, прыярытэты, ролю дзяржавы, ступень адкрытасці і лібералізацыі эканомікі.*

14. У залежнасці ад узроўню эканамічнага развіцця назавіце краіну, якая лішняя ў лагічным радзе:

1) Рэспубліка Карэя; 2) Сінгапур; 3) Бірма; 4) Тайвань.

*Растлумачце выбар. Да якой групы краін адносяцца тры астатнія?*

1. Выберыце, што не з’яўляецца характэрнай рысай даганяючага развіцця:

1) паскоранае развіццё цяжкай прамысловасці; 2) палітыка этатызму; 3) адкрытасць эканомікі; 4) абмежаванне дзейнасці замежнага капіталу.

2. У чым станоўчыя і адмоўныя бакі дзейнасці ТНК у краінах, якія сталі на шлях развіцця?

*Ці ведаеце вы, што такое ТНК?*

3. Аднабаковасць эканамічнага развіцця краін Усходу праявілася ў дамінаванні ____________________________ галін.

4. Назавіце не менш трох прычын эканамічнай адсталасці маладых незалежных краін.

*Гэтыя прычыны можна знайсці ў розных сферах грамадскага жыцця*

5. Што не характэрна для сацыяльнай структуры краін Усходу:

1) поліэтнічнасць; 2) рэзкі падзел на класы; 3) незавершанасць ўтварэння класаў; 4) перавага кланава-патэрналісцкіх адносін.

6. Размясціце краіны ў храналагічным парадку атрымання імі незалежнасці: Гвінея (Канакры), Пакістан, Ангола, Алжыр.

21. Суаднясіце калоніі з метраполіямі:

| | |
|---|---|
| Бірма | Англія |
| В’етнам | Францыя |
| Марока | Галандыя |
| Кенія | Партугалія |
| Інданезія | |

*Выбар зрабіце з дапамогай стрэлак.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ВМ-2. САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ АЗІІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВЭ-О. УВОДЗІНЫ

***Прыступаючы да вывучэння гэтага модуля, праверце свае веды па наступных пытаннях:***

1.Якой была палітычная сітуацыя ў Кітаі на момант заканчэння другой сусветнай вайны?

2.Якую мадэль развіцця выбрала Манголія ў міжваенны час?

3.Як змянілася становішча Карэі ў апошнія тыдні другой сусветнай вайны?

4.Якія палітычныя сілы ўзначалілі барацьбу народаў Французскага Індакітая за нацыянальнае вызваленне ў час другой сусветнай вайны?

*Звярніце увагу на тое, што палітыка японскіх акупацыйных улад паспрыяла ўзмацненню імкнення да незалежнасці.*

*Калі вы правільна адказалі на пастаўленыя пытанні, можаце пераходзіць да вывучэння модуля. У адваротным выпадку па дапаможніку Л. С. Васільева "История Востока" і падручніку "Новейшая история стран Азии и Африки. XX век"., ч.1, паўтарыце гісторыю адпаведных краін у першы перыяд найноўшай гісторыі.*

***Інфармацыя аб модулі ў цэлым:***

Гэты модуль прысвечаны вывучэнню гісторыі краін Азіі, якія пасля другой сусветнай вайны выбралі сацыялістычны шлях развіцця: Кітай, КНДР, В`етнам, Лаос, Камбоджа і МНР (яна яшчэ ў 20-я гг. XX ст. пачала рух да сацыялізму). У яго аснове ляжыць праблема станаўлення «рэальнага сацыялізму» у названых краінах, яго крызісу і пошуку шляхоў рэфармавання сацыялізму.

***Месца і значэнне модуля ў сістэме курса:***

Вывучэнне дадзенага модуля дазваляе атрымаць веды аб асноўных тэндэнцыях развіцця краін Азіі, якія пасля другой сусветнай вайны рухаліся па шляху сацыялізму, які ўяўляў сабою адзін з варыянтаў мадэрнізацыі традыцыйнага грамадства.

***Мэты вывучэння модуля:***

- выявіць прычыны, якія абумовілі выбар шэрагам краін Азіі сацыялістычнага шляху развіцця;
- ведаць асноўныя этапы будаўніцтва сацыялізму ў Кітаі, МНР, КНДР, В'етнаме, Лаосе, Камбоджы;
- ахарактарызаваць спецыфіку сацыялістычнай мадэлі ў розных краінах;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- прааналізаваць прычыны крызісу «рэальнага сацыялізму» ў азіяцкіх краінах;
- паказаць шляхі рэфармавання сацыялізму ў розных азіяцкіх краінах;

***Гэты модуль уключае наступныя вучэбныя элементы:***

ВЭ-0. Уводзіны.

ВЭ-1. Сацыялістычны эксперымент у Кітаі (1949 - 1970-я гг.).

ВЭ-2. Рэфармаванне сацыялізму ў Кітаі з канца 1970-х гг.

ВЭ-3. Будаўніцтва сацыялізму ў Манголіі, КНДР, В'етнаме, Лаосе і Камбоджы. Яго крызіс і рэфармаванне.

ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю.

***Аб змесце модуля:***

***Ключавая праблема:*** марксісцка-ленінская мадэль сацыялізму на Усходзе: узнікненне, развіццё, крызіс, рэфармаванне.

*Вывучаючы гэтую праблему, неабходна зыходзіць з таго, што сацыялістычны выбар быў у многім абумоўлены знешнімі фактарамі. У цывілізацыйным фундаменце ўсходніх краін адны элементы спрыялі ўсталяванню марксісцка-ленінскай мадэлі сацыялізму,а іншыя аказаліся з ёй несумяшчальнымі, што і стала вырашальным фактарам краху "рэальнага сацыялізму".*

***Вядучая ідэя:*** станаўленне "рэальнага сацыялізму" на Усходзе адбылося ў тых краінах, дзе моцным было адпаведнае знешняе ўздзеянне, якое супала з наяўнасцю ў цывілізацыйным фундаменце значных калектывісцкіх традыцый. Аднак сацыялізм не змог у сучасных умовах паспяхова вырашыць задачу мадэрнізацыі азіяцкіх краін, што пры страце знешняй падтрымкі прывяло да яго крызісу і краху.

***Асноўныя паняцці:*** марксісцка-ленінская мадэль сацыялізму ("рэальны сацыялізм"), "новая дэмакратыя", "дыктатура народу", "культурная рэвалюцыя", мааізм, сацыялізм з кітайскай спецыфікай, таталітарны рэжым, вайна супраціўлення в'етнамскага народа, "рэжым чырвоных кхмераў", ідэалогія "чучхе".

*Вы павінны не толькі ведаць значэнне гэтых паняццяў, а і ўмець звязаць іх з канкрэтным гістарычным працэсам.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ

1. КНР на пачатковым этапе будаўніцтва сацыялізму.
2. Культурная рэвалюцыя ў Кітаі.
3. КНР у эпоху эканамічных рэформаў.
4. Сацыялістычны эксперымент у Манголіі, КНДР і краінах Індакітая.

1. У Кітаі пасля заканчэння другой сусветнай вайны існавалі два магутныя цэнтры сілы – Камуністычная партыя Кітая (КПК) і Гаміньдан. Кожны з бакоў імкнуўся да ўсталявання сваёй улады на ўсёй тэрыторыі краіны. Дасягнуць гэтага можна было ў тых умовах толькі з дапамогай грамадзянскай вайны. У красавіку-ліпені 1945 г. адбыўся 7 з’езд КПК. Ён абвясціў курс на заваяванне КПК усёй паўнаты ўлады ў Кітаі. У прынятых на ім дакументах будучая рэвалюцыя была названа буржуазна-дэмакратычнай. У выніку яе ў Кітаі намячалася пабуда-ваць грамадства, якое атрымала назву “новая дэмакратыя” ці “дыкта-тура народа“. Галоўнымі сацыяльнымі сіламі гэтага грамадства бачы-ліся сялянства, рабочы клас і нацыянальная буржуазія. Заяўлялася, што ў выніку рэвалюцыі будзе расчышчаны шлях для развіцця капі-талізму.

Восенню 1945 г. – вясной 1946 г. КПК і Гаміньдан правялі серыю перамоў. У выніку 10 студзеня 1946 г. было падпісана пагадненне аб скліканні Палітычнай кансультацыйнай канферэнцыі з удзелам прадстаўнікоў розных партый. На гэтай канферэнцыі КПК правяла рашэнне аб стварэнні часовага кааліцыйнага ўрада – Дзяржаўнага Савета. У ім 20 месцаў з 40 павінна было належаць КПК і блізкім да яе палітычным сілам. Чан Кайшы не пагадзіўся з такім развіццём падзей і, абапіраючыся на падтрымку ЗША, узяў курс на ваеннае вырашэнне пытання аб уладзе. У выніку з сярэдзіны 1946 г. у Кітаі пачалася шырокамаштабная грамадзянская вайна паміж КПК і Гаміньданам. Абодва бакі сваёй палітыкай, якая была накіравана на ўсталяванне паўнаўладдзя аднаго з іх, нежаданнем ісці на кампрамісы ў інтарэсах усёй нацыі, прывялі краіну да вайны. Развязванню вайны ў Кітаі спрыяла набіраўшае сілу супрацьстаянне паміж СССР і ЗША, якія імкнуліся ўмацаваць ва ўладзе ў гэтай краіне лаяльныя да Масквы ці Вашынгтона палітычныя сілы.

На першым этапе вайны з лета 1946 г. да лета 1947 г. армія Гаміньдана атрымала шэраг перамог і заняла многія раёны, якія раней кантраляваліся КПК. Аднак нават у гэты час, калі войскі Чан Кайшы

вялі наступальныя аперацыі, праявілася іх слабасць. За 1946 г. з арміі Гаміньдана дызерціравала каля 1 млн. чалавек. Шэраг генералаў – мясцовых мілітарыстаў ігнаравалі загады Чан Кайшы. У выніку аперацый, ажыццёўленых у ліпені-верасні 1947 г. войскі КПК занялі многія раёны ў Паўночна-Усходнім, Паўночным і Цэнтраль-ным Кітаі з агульным насельніцтвам каля 120 млн. чалавек. Узніклі ўмовы для пераходу Народна-Вызваленчай Арміі Кітая (НВАК) у агульнае наступленне.

Перамогі НВАК у некалькіх буйных бітвах восенню 1948 – вясной 1949 г. прывялі да заняцця ёю ўсяго Паўночнага і Цэнтральнага Кітая і стварылі неабходныя перадумовы для фарсіравання Янцзы і завяршэння разгрому гаміньданаўскіх войскаў. Ваенныя няўдачы Гаміньдана прывялі да яго крызісу. Чан Кайшы абвясціў аб сваёй адстаўцы. Гаміньдан заявіў аб згодзе пачаць перамовы з КПК. Але яны закончыліся няўдачай. Пасля атрыманых перамог КПК дамагалася перадачы ёй усёй паўнаты ўлады. Гаміньдан на гэта не пайшоў. 21 красавіка 1949 г. НВАК пачала аперацыю па фарсіраванні Янцзы. Да сярэдзіны 1950 г. баявыя дзеянні ў асноўным былі завершаны. Рэшткі гаміньданаўскіх войскаў адышлі на Тайвань.

Найбольш вострым сацыяльна-эканамічным пытаннем у Кітаі ў той час было аграрнае. Гаміньдан не рашыўся нанесці ўдар па памешчыцкаму землеўладанню. КПК ж у пачатку 1946 г. перайшла да палітыкі канфіскацыі памешчыцкіх зямель і надзялення імі сялянства. Яна заявіла, што яе мэта – раўнамернае размеркаванне зямлі паміж усімі вясковымі жыхарамі. Такая палітыка дазволіла КПК заваяваць сімпатыі большасці сялян. Важнае значэнне для зыходу вайны мела тое, што супраць рэжыму Чан Кайшы выступіла значная частка нацыянальнай буржуазіі. У Кітаі быў створаны вялікі дзяржаўны сектар. Ім распараджаўся моцны дзяржаўна-бюракратычны апарат. Сфарміраваўся вузкі слой бюракратычнага капіталу, які заняў пануючае становішча ў эканоміцы краіны. Большасць жа нацыянальнай буржуазіі, якая не была цесна звязана з дзяржаўным апаратам, аказалася на перыферыі эканамічнага жыцця. Яна пастаянна сутыкалася з абмежаваннем эканамічнай свабоды з боку гаміньданаўскіх уладаў, з нераўнапраўнай канкурэнцыяй з боку бюракратычнага капіталу. Ва ўдзячнасць за дапамогу ЗША Чан Кайшы значна знізіў мытныя тарыфы, і кітайскі рынак запоўнілі амерыканскія тавары. Такая палітыка падрывала кітайскую прамысловасць. Усё гэта штурхала многіх прадстаўнікоў нацыянальнай буржуазіі ў апазіцыю да ўрада Чан Кайшы. Да таго ж, кіраўніцтва КПК пастаянна падкрэслівала, што рэвалюцыя ў Кі-

таі не мае сацыялістычнага характару. У сакавіку 1949 г. адбыўся 2 Пленум ЦК КПК 7-га склікання. У дакладзе, з якім выступіў Мао Цзэдун, гаварылася, што для пераходу да сацыялістычнага этапа рэвалю-цыі ў Кітаі спатрэбяцца дзесяцігоддзі. На працягу іх Кітай будзе раз-вівацца трэцім шляхам ва ўмовах гэтак званай "новай дэмакратыі", ці "дыктатуры народу", пад якой мелася на ўвазе сумесная ўлада розных класаў, уключаючы нацыянальную буржуазію. Тым самым камуністы прыцягвалі яе на свой бок. Сацыяльная база рэжыму Чан Кайшы аказалася крайне вузкай, што, перш за ўсё, і прадвызначыла яго паражэнне ў грамадзянскай вайне.

У верасні 1949 г. у Пекіне сабраўся Народны палітычны кансультацыйны савет. У яго ўваходзілі прадстаўнікі розных партый і класаў. Але кіруючае становішча займала КПК. Савет абраў Цэнтральны народны ўрад на чале з Мао Цзэдунам. 1 кастрычніка 1949 г. была абвешчана Кітайская Народная Рэспубліка (КНР). Кіруючай сілай краіны стала КПК. Але існавалі і іншыя палітычныя партыі і арганізацыі, і рэвалюцыя пакуль не выйшла за буржуазна-дэмакратычныя рамкі. Часовая канстытуцыя 1949 г. абвясціла Кітай "дзяржавай новай дэмакратыі". Дзяржаўная ўлада характарызавалася як дэмакратычная дыктатура народу, гэта значыць улада народна-дэмакратычнага адзінага фронту рабочага класа, сялянства, дробнай буржуазіі, нацыянальнай буржуазіі і іншых патрыятычных дэмакратычных элементаў. Пры гэтым мелася на ўвазе, што кіруючую ролю рабочага класа ў сістэме "новай дэмакратыі" павінна ажыццявіць КПК. Цэнтральны народны ўрад КНР у той час быў яшчэ кааліцыйным органам. Часовая канстытуцыя вызначала асноўныя кірункі і сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У ёй гаварылася, што КНР павінна ахоўваць грамадскую ўласнасць дзяржавы і ўласнаць кааператываў, абараняць эканамічныя інтарэсы і прыватную ўласнасць рабочых і сялян, дробнай і нацыянальнай буржуазіі, развіваць народную гаспадарку "новай дэмакратыі" і ўпэўненаператвараць краіну з сельскагаспадарчай у індустрыяльную. Такім чынам, праграма дзеянняў КПК была арыентавана на развіццё ў Кітаі шматукладнай эканомікі і ажыццяўленне індустрыялізацыі. Яна мела буржуазна-дэмакратычны характар.

У першыя 2-3 гады існавання КНР вялікія намаганні КПК накіравала на пераадоленне феадальных перажыткаў у сацыяльна-эканамічнай сферы, перш за ўсё на правядзенне аграрнай рэформы. Закон аб зямельнай рэформе, які ўступіў у сілу 30 чэрвеня 1950 г., меў на мэце поўную ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і памешчыкаў як класа, ураўняльнае надзяленне зямлёй сялян. Аграрная рэформа су-

праваджалася вострымі сацыяльнымі канфліктамі. На супраціўленне памешчыкаў улады адказалі стварэннем сеткі надзвычайных судоў і трыбуналаў, з дапамогай якіх многія памешчыкі былі фізічна зніш-чаны. У рамках вырашэння агульнадэмакратычных задач адбылася ліквідацыя бюракратычнага і замежнага капіталу. У выніку дзяржаў-ны сектар заняў ключавыя пазіцыі ў прамысловасці. Ён быў абве-шчаны галоўнай матэрыяльнай базай рэспублікі. Уласнасць дробнай і нацыянальнай буржуазіі была пастаўлена пад дзяржаўны кантроль. Наступленне на інтарэсы нацыянальнай буржуазіі выклікала супра-ціўленне з яе боку. Каб зламаць супрацьдзеянне праціўнікаў паглыб-лення пераўтварэнняў, у канцы 1951 – пачатку 1952 г. была разгор-нута рэпрэсіўная кампанія па барацьбе супраць «трох зол» і «пяці зол». Крокі, якія ажыццяўляліся ва ўнутранай палітыцы на мяжы 1951-1952 гг., азначалі адыход КПК ад ажыццяўляемай палітыкі “но-вай дэмакратыі” праз адзіны дэмакратычны фронт і пачатак пераходу ад буржуазна-дэмакратычнага да сацыялістычнага этапа рэвалюцыі. У гэты ж час ужо ідзе працэс фарміравання культу асобы Мао Цзэдуна. У 1951 г. да 30-годдзя КПК былі выдадзены «Выбраныя творы Мао Цзэдуна» і “Гісторыя партыі», у якой гісторыя КПК і кітайскай рэва-люцыі прадстаўляліся праз прызму велізарных асабістых заслуг Мао Цзэдуна.

У снежні 1953 г. ЦК КПК зацвердзіў праграмны дакумент «Зма-гацца за мабілізацыю ўсіх сіл для ператварэння нашай краіны ў вя-лікую сацыялістычную дзяржаву». У ім была намечана генеральная лінія КПК адносна шляхоў, метадаў, тэрмінаў будаўніцтва сацыялізму ў Кітаі. Генеральная лінія прадугледжвала вырашэнне дзвюх узаема-звязаных задач: індустрыялізацыя краіны; усталяванне сацыяліс-тычных вытворчых адносін ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі на працягу трох пяцігодак. Сацыялістычнае будаўніцтва ў Кітаі намяча-лася ажыццяўляць у цесным саюзе і пры падтрымцы СССР. Па сут-насці, Генеральная лінія партыі мела на ўвазе перанясенне ў Кітай са-вецкай мадэлі сацыялізму. Пачатак будаўніцтва сацыялізму быў азна-менаваны зменамі ў дзяржаўна-палітычнай сістэме. 13 студеня 1953 г. была прынята пастанова аб скліканні Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў (УСНП) і мясцовых сходаў. Выбары былі няроўныя, шматступеньчатыя. Сесія УСНП 20 верасня 1954 г. прыняла кансты-туцыю краіны. Канстытуцыя юрыдычна замацавала курс на будаўніц-тва сацыялізму. Яна ставіла ў якасці задач на пераходны перыяд пра-вядзенне індустрыялізацыі, сацыялістычнае пераўтварэнне сельскай гаспадаркі, прамысловасці, гандлю. КНР вызначалася як дзяржава

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“народнай дэмакратыі”, улада ў якой належыць народу ў асобе УСНП. УСНП абвяшчаўся адзіным заканадаўчым органам. Канстытуцыя ўводзіла пасаду старшыні КНР, які меў даволі шырокія паўнамоцтвы.

У 1953-1957 гг. КНР ажыццявіла першы пяцігадовы план. Упор быў зроблены на развіццё цяжкай прамысловасці. Першыя гады пяцігодкі, у многім дзякуючы дапамозе СССР, далі значны прырост прамысловай прадукцыі. Адначасова з індустрыялізацыяй ішло наступленне на прыватны сектар. У 1953-1954 гг. было прынята шэраг пастаноў, якія ўстанаўлівалі дзяржаўныя манаполіі на найважнейшыя віды харчовых тавараў, сыравіну, што паставіла прыватніка ў поўную залежнасць ад дзяржавы. Да канца 1955 г. быў ліквідаваны прыватны аптовы гандаль. Доля прыватнага рознічнага гандлю была зведзена да 17,5%. У прамысловасці ўсе прыватныя прадпрыемствы з колькасцю работнікаў ад 500 і больш былі ператвораны ў прыватна-дзяржаўныя. У дробнай і саматужнай прамысловасці пачаўся працэс каапеpавання. На вёсцы адбыўся пераход да вытворчай кааперацыі.

Рост вытворчасці ў першыя гады пяцігодкі даў падставу Мао Цзэдуну паставіць пытанне аб паскарэнні будаўніцтва сацыялізму ў Кітаі. Ён падверг крытыцы Генеральную лінію 1953 г. і заявіў аб магчымасці пабудаваць сацыялізм у Кітаі да 1959 г. Рэальнасць імклівага рыўка ў сацыялізм ён абгрунтоўваў асаблівай рэвалюцыйнасцю кітайцаў. Мао гаварыў пра неабходнасць рухацца да сацыялізму ўласным кітайскім шляхам. У адпаведнасці з гэтымі ўстаноўкамі ў Кітаі на працягу 8-9 месяцаў было праведзена суцэльнае каапераванне сельскай гаспадаркі на аснове ўраўняльных прынцыпаў. Да ліпеня 1956 г. Прыватны сектар у прамысловасці быў поўнасцю ліквідаваны. Такім чынам, першапачатковы план будаўніцтва сацыялізму, разлічаны на тры пяцігодкі быў адкінуты. Але спробы Мао Цзэдуна насуперак эканамічным законам зрабіць рэзкі скачок у змяненні эканамічных адносін і развіцці прадукцыйных сіл ужо ў 1956 г. прывялі да катастрафічных наступстваў для эканомікі і рэзкага падзення ўзроўню жыцця насельніцтва.

У такіх умовах у верасні 1956 г. сабраўся 8 з’езд КПК. Правал ініцыяванай Мао Цзэдунам спробы фарсіраваць будаўніцтва сацыялізму выклікаў моцную крытыку ў яго бок на з’ездзе. З’езд пацвердзіў правільнасць Генеральнай лініі 1953 г. Было заяўлена, у прыватнасці ў дакладзе Дэн Сяопіна, аб неабходнасці прытрымлівацца калектыўных прынцыпаў кіраўніцтва ў партыі, праводзіць курс, накіраваны супраць праслаўлення некаторых асоб з партыйнага кіраўніцтва. З’езд выклю-

РЕПОЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

чыў са статута КПК тэзіс аб ідэях Мао Цзэдуна як тэарэтычнай аснове дзейнасці партыі. Такім чынам, адбылося аслабленне пазіцый Мао Цзэдуна ў кіраўніцтве партыі і дзяржавы. Але летам-восенню 1957 г. Мао разгарнуў кампанію рэпрэсій супраць сваіх палітычных праціўнікаў.

Пленум ЦК КПК, які адбыўся з 20 верасня па 3 кастрычніка 1957 г., адобрыў ідэю Мао аб паскораным будаўніцтве сацыялізму і заклікаў адмовіцца ад абсалютызацыі савецкага вопыту. Гэта была санкцыя на “вялікі скачок”. Мао разлічваў, што Кітай, які будзе рухацца сваім адмысловым курсам, зможа праз 5-7 год абагнаць ЗША і СССР і стаць вядучай прамысловай дзяржавай свету. У маі 1958 г. адбылася другая сесія 8-га з’езда КПК, на якой быў афармлены пераход да “вялікага скачка”. Прыняты на ёй план другой пяцігодкі прадугледжваў павелічэнне выпуску прамысловай прадукцыі ў 6,5 разоў, а сельскагаспадарчай – у 2,5. Імклівы рост прамысловасці планавалася забяспечыць за кошт спалучэння развіцця ключавых галін цяжкай прамысловасці, якія цэнтралізавана фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту і стварэння вялізарнай колькасці напаўсаматужных прадпрыемстваў у вёсках і пры розных установах, якія павіны былі базіравацца на выкарыстанні мясцовай сыравіны і прымітыўнай ручной працы. Увогуле, прырост вытворчасці намячалася дасягнуць дзякуючы рэзкаму павелічэнню долі жывой некваліфікаванай працы, праз шырокае выкарыстанне метадаў прымусу. У рамках “вялікага скачка” праводзілася палітыка апоры на ўласныя сілы. Вынікам яе павінна было стаць стварэнне цалкам самазабяспечваемых адміністрацыйна-гаспадарчых адзінак у маштабах камун, паветаў і цэлых правінцый. Гэта рабілася дзеля таго, каб забяспечыць канцэнтрацыю цэнтралізаваных дзяржаўных сродкаў на ўзмоцненае нарошчванне ваеннна-эканамічнага патэнцыялу. Ператварэнне Кітая ў вялікую ваенную дзяржаву з’яўлялася найважнейшай задачай “вялікага скачка”. Павінна была ствараца новая сацыяльна-эканамічная і палітычная структуры грамадства. Кітай ператвараўся ў адзіную ваенізаваную камуну, у якой усюды – у вёсцы, у горадзе, у партыі, у арміі – ажыццяўлялася б сістэма натуральнага ўраўняльнага забеспячэння таварамі першай неабходнасці.

З мая 1958 г. кіраўніцтва КНР пачало правядзенне палітыкі трох чырвоных сцягоў: новая генеральная лінія КПК, “вялікі скачок”, народныя камуны. З пачатку “вялікага скачка” адзіная сістэма планавання і кіравання эканомікай была разбурана. У жніўні 1958 г. быў абвешчаны пераход ад сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

да народных камун, у якіх ліквідавалася любая асабістая ўласнасць сялян, адбылася адмова ад прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленасці, была ўведзена татальная ўраўнілаўка. Народная камуна з’яўлялася адначасова гаспадарчай, адміністрацыйнай, ваеннай адзінкай. Адсутнасць матэрыяльных стымулаў вяла да зніжэння прадукцыйнасці працы. Да таго ж, сяляне былі знясілены інтэнсіўнай прымусовай працай і хранічным недаяданнем у выніку бясплатнага харчавання ў грамадскіх сталовых. Літаральна за тры месяцы запасы харчавання для іх былі вычарпаны. Ужо да канца 1958 г. стаў відавочны правал палітыкі народных камун і “вялікага скачка”. Аднак Мао Цзэдун імкнуўся працягваць яе і ў 1959 - 1960 гг.

2. У пачатку 60-х гг. кіраўніцтвам КПК было прызнана цяжкае становішча ў сельскай гаспадарцы, лёгкай прамысловасці, з забеспячэннем насельніцтва спажывецкімі таварамі. Прынятыя меры па ўпарадкаванню эканомікі ўключалі рэарганізацыю камун у кааператывы, рэзкае згортванне капітальнага будаўніцтва. Сельская гаспадарка была абвешчана асновай эканомікі. Каб дасягнуць павышэння якасці прадукцыі і росту прадукцыйнасці працы, часткова быў адноўлены прынцып аплаты працы, сялянам дазволілі мець сваю невялікую гаспадарку. Але па-ранейшаму дасягненне эканамічнага росту звязвалася перш за ўсё з экстэнсіўным выкарыстаннем велізарных танных працоўных рэсурсаў і прымусовых мер уздзеяння. Эканамічнае развіццё краіны было падначалена мэце стварэння магутнага ваеннага патэнцыялу. Ваенны сектар быў пастаўлены ў прывілеяванае становішча, і яму даставалася асноўная маса матэрыяльных рэсурсаў і кваліфікаваных кадраў. Краіна, значная частка насельніцтва якой галадала, у 1964 г. правяла выпрабаванне атамнай бомбы. Адбылася ваенізацыя партыйнага і грамадскага жыцця. Прадстаўнічыя органы цалкам страцілі сваю функцыю.

Правал “вялікага скачка”, а таксама ваенізацыя партыйнага жыцця выклікалі рост апазіцыі Мао Цзэдуну сярод часткі партыйнага кіраўніцтва. Найбольш значную ролю сярод апазіцыянераў адыгрываў старшыня КНР Лю Шаацы. Ён і шматлікія высокапастаўленыя партыйныя функцыянеры, што падтрымалі яго, заклікалі вярнуцца да вопыту першай пяцігодкі і на яго аснове развіваць эканоміку. Апазіцыя стварыла пэўную пагрозу кіруючаму становішчу Мао Цзэдуна ў партыі. І ўсё ж ёй не ўдалося павесці за сабой большасць як кадравых работнікаў, так і радавых членаў КПК. Разам з тым, нарастанне крытыкі, незадавальненне ўнутры партыі прывялі Мао Цзэдуна да высновы, што далейшае развіццё гэтых працэсаў можа прывесці да страты ім

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кіруючага становішча ў партыі і краіне. Да 1965 г. ў КПК склаліся дзве супрацьстаячыя групоўкі: Мао Цзэдуна і Лю Шаацы. Яны разыходзіліся адносна шляхоў будаўніцтва сацыялізму. Лю Шаацы выступаў за рух да сацыялізму на аснове вопыту СССР і абапіраючыся на дапамогу сацыялістычных краін. Мао Цзэдун лічыў магчымым выкарыстаць спецыфічныя ўмовы Кітая, каб у найкарацейшы час зрабіць рывок да камунізму, абапіраючыся на ўласныя сілы Кітая. Група Лю Шаацы прызнавала кіруючую ролю КПСС у сусветным камуністычным руху, а мааісты лічылі, што гэтую ролю павінна адыгрываць КПК на чале з Мао Цзэдунам.

Каб разграміць апазіцыю, Мао Цзэдун выступіў з ідэяй "вялікай пралетарскай культурнай рэвалюцыі". Фактычна пад гэтай назвай хаваўся палітычны пераварот у партыі і дзяржаве, мэта якога заключалася ў ліквідацыі палітычных праціўнікаў, ва ўсталяванні паўнаўладдзя Мао Цзэдуна праз ваенна-бюракратычную дыктатуру. "Культурная рэвалюцыя" павінна была замацаваць мааісцкі курс ва ўнутранай і знешняй палітыцы Кітая, зрабіць мааізм пануючай ідэалогіяй кітайскага грамадства. Асаблівасць гэтага перавароту заключалася ў тым, што яго арганізавалі кіруючыя дзеячы КПК і мэта яго была не ў захопе ўлады, а ў яе захаванні. "Культурная рэвалюцыя" пачалася як дыскусія аб п'есе члена Пекінскага гаркома КПК У Ханя "Разжалаванне Хай Жуя". У кастрычніку 1965 г. У Хань быў аб'яўлены Мао Цзэдунам прадстаўніком сіл, якія дамагаюцца аднаўлення ўлады кулакоў і памешчыкаў. Услед за У Ханем рэпрэсіі абрушыліся на начальніка генштаба Ло Жуйцына. Ужо пачатковыя крокі "культурнай рэвалюцыі" паказалі, што Мао Цзэдун імкнецца ў першую чаргу да ліквідацыі апазіцыі ў партапараце і ўсталявання поўнага кантролю над арміяй. Вясною 1966 г. была створана група па справах "культурнай рэвалюцыі" на чале з Цзянь Цін. Галоўная яе задача – палітычная і ідэалагічная апрацоўка ваеннаслужачых у духу мааізму. Трэба зазначыць, што яшчэ напярэдадні "культурнай рэвалюцыі" мааісты мелі трывалыя пазіцыі ў арміі. Пасаду міністра абароны займаў верны паплечнік Мао – Лінь Бяо. У маі 1966 г. у Пекін былі ўведзены дадатковыя вайсковыя часткі, і Мао пайшоў на арышт Пекінскага гаркома і аддзела прапаганды ЦК КПК. 16 мая 1966 г. была прынята закрытая інструкцыя аб разгортванні "культурнай рэвалюцыі". У гэты ж час верныя Мао Цзэдуну людзі з яго асабістай гвардыі рыхтавалі са студэнтаў і навучэнцаў атрады хунвэйбінаў (чырвоных ахоўнікаў). Яны павінны былі адыграць ролю галоўнай ударнай сілы ў справе разгрому партыйных органаў, дзе была моцная апазіцыя Мао Цзэ-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дуну. 25 мая 1966 г. у Пекінскім універсітэце з’явілася дацзыбао, якая заклікала моладзь разграміць рэктарат і партком. Па загаду Мао яна была перадрукавана “Жэньмінь жыбао”, перададзена па радыё. Гэта стала сігналам для разгортвання тэрору з боку хунвэйбінаў супраць праціўнікаў Мао ў партыйнам апараце і супраць інтэлігенцыі.

Лю Шааці запатрабаваў склікання пленума ЦК КПК. Аднак на пленуме, які праходзіў з 1 па 12 жніўня 1966 г. перамогу атрымалі мааісты. Была праведзена рэарганізацыя ў вышэйшым партыйным кіраўніцтве. Замест пяці намеснікаў старшыні ЦК КПК застаўся толькі адзін – Лінь Бяо. Функцыі сакратарыяту ЦК былі фактычна перададзены групе па справах “культурнай рэвалюцыі”. У час работы пленума 5 жніўня 1966 г. Мао вывесіў дацзыбао “Агонь па штабах”. У ёй ён абвінаваціў “некаторых кіруючых таварышаў у цэнтры і на месцах” у “ажыццяўленні дыктатуры буржуазіі” і ў спробе “падавіць бурны рух культурнай рэвалюцыі”. Мао заклікаў граміць цэнтральныя і мясцовыя партыйныя камітэты як “буржуазныя штабы”. Пленум яго падтрымаў, і разгарнуўся наступ хунвэйбінаў на парткомы. Хунвэйбіны былі кінуты таксама на барацьбу супраць сусветнай і класічнай кітайскай культуры. Летам 1966 г. у Пекіне запалалі вогнішчы з кніг. Тым самым расчышчаўся шлях для ідэй Мао Цзэдуна, якія павінны былі авалодаць розумам кітайцаў. Восенню 1966 г. мааісты пачалі з маладых рабочых фарміраваць атрады цзаафаняў (бунтароў), каб узмацніць націск на парткамы. Але і кадравыя партыйныя работнікі, што былі ў апазіцыі да Мао Цзэдуна, пачалі фарміраваць атрады з рабочых і аказваць супрацьдзеянне хунвэйбінам і цзаофаням. У такіх умовах Мао зрабіў галоўную стаўку на армію. У пачатку студзеня 1967 г. атрады хунвэйбінаў і цзаафаняў пры падтрымцы арміі авалодалі будынкамі гаркома партыі і народнага камітэта Шанхая. Мао Цзэдун назваў гэта “захопам улады” і заклікаў усю краіну ўзяць прыклад з Шанхая. Вырашальная роля ў “захопе ўлады” адводзілася арміі. У якасці новых органаў улады ўтвараліся рэўкомы. Было абвешчана, што яны ствараюцца на аснове спалучэння трох бакоў: цзаафаняў, ваенных і рэвалюцыйных кадравых работнікаў.

Працэс стварэння рэўкомаў сустракаў даволі моцнае супраціўленне. Камандуючыя шэрагу ваенных акруг выступілі ў абарону мясцовых партыйных і дзяржаўных органаў. Мааісты спрабавалі прыцягнуць на свой бок кадравых партыйных работнікаў і тым самым аслабіць супраціўленне “культурнай рэвалюцыі”. Дзеля гэтага Мао заявіў аб намеры склікаць IX з’езд партыі. Але ён намячаў на будучым з’ездзе не кампраміс са сваімі палітычнымі праціўнікамі, а карэнную рэ-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

арганізацыю партыі. Падбор надзейных дэлегатаў павінны былі ажыццявіць рэўкомы. Таму ў красавіку-маі 1968 г. пачалася чыстка рэўкомаў. Вырашэнне гэтай задачы Мао Цзэдун усклаў на армію. Было прызнана неабходным выдаліць з палітычнай арэны хунвэйбінаў і цзаафаняў. Яны ўжо выканалі сваю задачу па разгрому партыйных і дзяржаўных структур і толькі ўносілі хаос у жыццё краіны. Цяпер у рэўкомах пануючыя пазіцыі занялі ваенныя.

Мао Цзэдун палічыў магчымым пайсці на скліканне IX з'езду КПК, які адбыўся 1-24 красавіка 1969 г. У палітычнай справаздачы, з якой выступіў Лінь Бяо, і ў новым статуце КПК мааізм абвяшчаўся новым, найвышэйшым этапам у развіцці марксізму. Ідэі Мао Цзэдуна абвяшчаліся тэарэтычнай асновай усёй дзейнасці КПК. Згодна з гэтымі ідэ-ямі, пабудова сацыялізму ў Кітаі, як і ва ўсім свеце, ставілася ў залеж-насць ад канчатковага знішчэння імперыялізму. У адпаведнасці з гэтым, перад краінай ставілася задача рыхтавацца да вайны. У гэтай вайне Кітаю трэба змагацца на два фронты: супраць ЗША і сацыялімперыялізму – СССР. Рыхтуючыся да вайны, КПК павінна была праводзіць у жыццё ўстаноўку на ажыццяўленне перманентнай рэвалюцыі, канцэнтравацца на пытаннях класавай барацьбы. Статут партыі замацаваў рэжым асабістай дыктатуры Мао Цзэдуна ў партыі. Старшыня ЦК КПК канцэнтраваў у сваіх руках кіраўніцтва не толькі партыяй, але і ўрадам, і арміяй. Пераважную большасць новага складу ЦК склалі вылучэнцы часоў "культурнай рэвалюцыі" асабіста адданыя Мао. IX з'езд унёс глыбокія змены ў ідэалогію і арганізацыйныя прынцыпы КПК. Гэта дае падставу гаварыць аб ім як аб устаноўчым з'ездзе новай мааісцкай партыі.

У выніку "культурнай рэвалюцыі" у Кітаі ў 1969 г. усталяваўся палітычны рэжым, які ў гістарыяграфіі атрымаў назву ваенна-бюракратычнага. Ранейшая дзяржаўна-палітычная структура, якая ўключала партыйна-дзяржаўны аппарат, прафсаюзы, камсамол і іншыя грамадска-палітычныя арганізацыі, якія знаходзіліся пад эгідай КПК, была разбурана. На першы план у палітычным жыцці выйшла армія. Менавіта ваенныя склалі аснову новых органаў улады – рэўкомаў, як вытворчых, так і тэрытарыяльных. У выніку "культурнай рэвалюцыі" быў усталяваны рэжым ваеннага кантролю за вытворчасцю і размеркаваннем, пануючымі сталі прымусовыя формы арганізацыі працы. Замест пракуратуры і судоў былі створаны аб'яднаныя карныя структуры – "органы дыктатуры".

Пасля 9 з'езда КПК барацьба ў яе кіраўніцтве працягвалася, але ўжо як барацьба груповак сярод мааістаў. Адна з іх – артадаксальныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мааісты (Цзянь Цін, Кан Шэн, Чэнь Бода). Яны лічылі, што партыя павінна канцэнтраваць свае намаганні на пытаннях палітычнай барацьбы, падрыхтоўкі да вайны, а праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця адсоўваліся імі на другі план. Другую групоўку, мааістаў-прагматыкаў, узначальваў Чжоу Эньлай. Ён лічыў, што трэба зменшыць вастрыню палітычнай барацьбы і больш увагі надаваць вырашэнню сацыяльна-эканамічных праблем, аднаўленню нармальнага кіравання эканомікай, развіццю гандлёва-эканамічных сувязей з Захадам. Барацьба артадоксаў і прагматыкаў знайшла адлюстраванне ў рашэннях 10 з‘езда КПК (жнівень 1973 г.). У дакладзе Ван Хунвэня гучала думка аб неабходнасці працягу вострай класавай барацьбы і перыядычнага паўтарэння "культурнай рэвалюцыі". Прыняты новы статут партыі арыентаваў яе на падрыхтоўку да вайны перш за ўсё з "сацыял-імперыялізмам". Чжоу Эньлай у сваім дакладзе нічога не сказаў аб заканамерным характары "культурнай рэвалюцыі" і яе дасягненнях, а акцэнтаваў увагу на эканамічных задачах партыі, на распрацоўцы перспектыўных планаў эканамічнага развіцця. У студзені 1975 г. Адзін з лідэраў прагматыкаў – Дэн Сяопін, які быў рэабілітаваны на 10 з‘ездзе, заняў пасаду намесніка старшыні ЦК КПК.

13 студзеня 1975 г., пасля 10-гадовага перапынку, сабралася сесія УСНП. Яна прыняла новую канстытуцыю, якая юрыдычна замацавала некаторыя вынікі "культурнай рэвалюцыі". Старшыня ЦК КПК па ёй з'яўляўся і вярхоўным галоўнакамандуючым НВАК. Усе калегіяльныя органы ваеннага кіраўніцтва ліквідаваліся. Законы маглі прымацца толькі па прадстаўленню ЦК КПК, які ўзначальваў Мао. Канстытуцыя легалізавала ў якасці органаў улады створаныя ў час "культурнай рэвалюцыі" рэвалюцыйныя камітэты і судовую сістэму. Судаводства канцэнтравалася ў руках органаў бяспекі, якія кантраляваліся рэвалюцыйнымі камітэтамі. Такім чынам, канстытуцыя 1975 г. узаконіла ваенна-бюракратычную дыктатуру і рэжым асабістай улады Мао Цзэдуна. 9 верасня 1976 г. памёр Мао Цзэдун. Прыняцце канстытуцыі 1975 г. і смерць Мао Цзэдуна знаменавалі сабою завяршэнне "культурнай рэвалюцыі". У выніку яе ў краіне сфарміравалася мадэль грамадства, якую можна назваць "казарменным сацыялізмам". Для яго характэрны таталітарны ваенна-бюракратычны рэжым са строгай іерархіяй улады на чале з правадыром. Галоўнай апорай рэжыму была армія, і ўсё жыццё грамадства перабудоўвалася на ваенны ўзор. Сацыяльнай базай мааісцкай дыктатуры з'яўляліся маргінальныя слаі, нізкакваліфікаваныя рабочыя, найбяднейшае сялянства. Яны былі задаволены ўраўняльнымі прынцыпамі, што насаджаліся мааістамі.


РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

“Культурная рэвалюцыя” значна запаволіла эканамічнае развіццё Кітая. Было афіцыйна аб’яўлена, што краіна ў сваім эканамічным развіцці адстала на 20 гадоў. Вытворчасць зерня на душу насельніцтва была на ўзроўні 1955 г. Смерць Мао спрыяла абвастрэнню барацьбы сярод партыйнага кіраўніцтва. У кастрычніку 1976 г. была адхілена ад улады група верных паслядоўнікаў Мао на чале з Цзянь Цін – “банда чатырох”. На іх усклалі адказнасць за рэпрэсіі часоў “культурнай рэвалюцыі” і крызіснае становішча эканомікі. У шэрагі партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва зноў вярнуўся Дэн Сяопін, які па загаду Мао ў красавіку 1976 г. быў пазбаўлены ўсіх пасад. Гэта ўмацавала пазіцыі прагматыкаў. Тым не менш, старшыня ЦК КПК і дзяржсавета Хуа Гафэн аб’явіў аб працягу курсу Мао Цзэдуна.

11 з’езд КПК (жнівень 1977 г.) прадэманстраваў, што артадаксальныя мааісты ўсё ж здавалі свае пазіцыі. З аднаго боку на ім гучала ўзвялічванне Мао Цзэдуна, але, з другога боку, былі рашуча асуджаны паплечнікі Мао часоў “культурнай рэвалюцыі” – гэтак званая “банда чатырох”. З’езд надаў вялікую ўвагу вырашэнню пытанняў эканамічнага развіцця. Была пастаўлена задача ажыццяўлення “чатырох мадэрнізацый” – прамысловасці, сельскай гаспадаркі, арміі, навукі і тэхнікі. З’езд адмовіўся ад мааісцкай дактрыны перманентнай рэвалюцыі, ад прыярытэтаў класавай барацьбы. Партыя пераарыентава-лася ў сваёй дзейнасці на сацыяльна-эканамічную сферу. Пачалася чыстка партыі ад прыхільнікаў “банды чатырох”. У кіруючыя органы партыі, абраныя на з’ездзе, увайшлі многія кадравыя работнікі, якія падвергліся рэпрэсіям у час “культурнай рэвалюцыі”. Фактычна ра-шэнні з’езда азначалі пачатак адыходу КПК ад ідэалогіі артадак-сальнага мааізму. Гэтая тэндэнцыя атрымала развіццё ў рашэннях сесіі УСНП, што адбывалася 26 лютага – 5 сакавіка 1978 г. Многія яе рашэнні пярэчылі ідэйным пастулатам Мао Цзэдуна. Яна абвясціла важнейшай задачай правядзенне мадэрнізацыі эканомікі. Была адноў-лена дзяржаўна-палітычная структура, што існавала да “культурнай рэвалюцыі”. Зноў пачалі працаваць міністэрствы, камітэты, упраўлен-ні, якія кіравалі эканомікай, аднавілі дзейнасць прадстаўнічыя органы ўлады, пракуратуры і суды, прафсаюзы, камсамол і іншыя грамадска-палітычныя арганізацыі.

Гэты паварот быў абумоўлены тым, што тэорыя і практыка мааізму ў 70-я гг. уступілі ў глыбокі крызіс. Сам Мао Цзэдун называў сваю тэорыю кітаізаваным марксізмам, які ўлічвае спецыфіку Кітая. Мао лічыў, што для Кітая непрымальны тэзіс аб кіруючай ролі рабочага класа ў сацыялістычнай рэвалюцыі. Сацыяльная структура грамадства

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абумовіла тое, што кіруючай сілай кітайскай рэвалюцыі павінна стаць сялянства. Зыходзячы з тэзіса аб кіруючай ролі сялянства ў рэвалюцыі, Мао рабіў стаўку на рэвалюцыйную вайну, базай якой павінны стаць сельскія раёны. Абапіраючыся на іх, рэвалюцыйныя войскі будуць паступова пашыраць кантралюемую тэрыторыю, пакуль не ўстановяць кантроль над усёй краінай. Усе намаганні партыі накіроўваліся на вырашэнне пытанняў, звязаных з вядзеннем вайны. Пасля перамогі рэвалюцыі ў Кітаі павінен усталявацца “рэжым новай дэмакратыі”, ва ўмовах якой улада будзе належаць сялянству, рабочаму класу, дробнай і нацыянальнай буржуазіі. Найважнейшым элементам ідэалогіі маазізму з’яўляўся нацыяналізм. Адсюль асаблівы ўпор Мао Цзэдуна на кітайскую спецыфіку, імкненне апярэдзіць іншыя краіны ў справе будаўніцтва сацыялізму і камунізму. Кітайская традыцыя стагоддзямі прапаведавала, што Паднябесная – гэта цэнтр сусвету, а астатнія народы – варвары, якія значна адсталі ад кітайцаў у сваім развіцці. Мао і яго прыхільнікі на аснове ідэі кітаецэнтрызму лічылі, што Кітай павінен стаць лідэрам сацыялістычнага лагеру, а Мао – правадыром сусветнага камуністычнага руху. Дасягнуць гэтага можна было праз фарсіраванае будаўніцтва сацыялізму і паскораныя тэмпы эканамічнага развіцця. Сацыялізм, які збіраліся будаваць мааісты, быў прымітыўным, ураўняльным, казарменным. Мааісты цалкам адвяргалі матэрыяльныя стымулы для развіцця эканомікі і рабілі стаўку выключна на рэпрэсіўныя метады. Тэрор стаў найважнейшым інструментам мааісцкай палітыкі. Будаўніцтва сацыялізму, згодна з Мао, павінна ўяўляць сабою перманентную рэвалюцыю. Партыя накіроўвае свае намаганні на вядзенне класавай барацьбы. Мао Цзэдун лічыў, што ў ходзе будаўніцтва сацыялізму ідзе пастаяннае змаганне паміж буржуазнай і сацыялістычнай тэндэнцыямі. Ён указваў, што пасля заваявання ўлады, адбываецца абуржуажванне партыйных работнікаў, таму неабходны перыядычныя чысткі, у ходзе якіх знішчаецца буржуазія, якая пастаянна адраджаецца. У будаўніцтве сацыялізму і ў правядзенні палітыкі класавай барацьбы галоўная роля адводзілася арміі. Мао лічыў армейскую арганізацыю ўзорам для ўсяго грамадства. Увесь Кітай павінен быў ператварыцца ў адну вялікую казарму. Мао звязваў пабудову сацыялізму ў Кітаі з разгромам сусветнага імперыялізму і новага рэвізіянізму (СССР) і разглядаў сусветную вайну як рухальную сілу рэвалюцыйнага працэсу. Для маазізму характэрны антыінтэлектуалізм, нянавісць да інтэлігенцыі. Мао неаднаразова заяўляў, што ўся інтэлігенцыя гатова ісці па шляху рэвізіянізму і таму

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ёй патрэбна хунвэйбінская чыстка. У цэлым тэорыю маазму можна звесці да наступных асноўных пастулатаў:

- у грамадстве заўсёды існуюць вострыя супярэчнасці і па меры руху да сацыялізму іх вастрыня ўзрастае, адзіным сродкам вырашэння супярэчнасцей з'яўляецца насілле;
- партызанская вайна і сялянская рэвалюцыя як спосаб захопу ўлады;
- стратэгія скачка, камунізацыі ў найкарацейшы тэрмін, "культурная рэвалюцыя" як шляхі будаўніцтва сацыялізму і камунізму;
- казарменны ўраўняльны сацыялізм як увасабленне новага грамадства;
- асабістая дыктатура правадыра з апорай на армію;
- непазбежнасць сусветнай вайны і разгортванне грамадзянскай вайны ў іншых краінах як шлях да перамогі сусветнай рэвалюцыі.

3. У снежні 1978 г. Пленум ЦК КПК абвясціў курс на карэннае рэфармаванне эканомікі Кітая. На ім было сказана аб "культурнай рэвалюцыі" як аб няправільнай палітыцы і прынята рашэнне аб пераносе цэнтра дзейнасці партыі і дзяржавы з пытанняў класавай барацьбы на эканамічнае будаўніцтва. У якасці цэнтральнай ставіцца задача ажыццяўлення "чатырох мадэрнізацый". Было прынята вельмі важнае рашэнне аб рэабілітацыі ахвяр "культурнай рэвалюцыі", якое закранула каля 30 млн. чалавек. Новы курс атрымаў канчатковае афармленне на 12 з'ездзе КПК, які адбыўся ў 1982 г. Ён паставіў задачу да 2000 г. у 4 разы павялічыць вытворчасць прамысловай прадукцыі, што дазволіла б КНР увайсці ў лік развітых індустрыяльных дзяржаў. Адбылася адмова ад практыкі пажыццёвага заняцця партыйных і дзяржаўных пасад, вяртанне да калектыўнага кіраўніцтва, быў асуджаны культ асобы Мао Цзэдуна.

Сутнасць распачаўшыхся рэформаў заключалася перш за ўсё ў вяртанні да матэрыяльнай зацікаўленнасці работніка, у рашучым адыходзе ад прынцыпу "агульнага катла". Першы этап рэформаў 1978 – 1983 гг. можна вызначыць як падрыхтоўчы. Гэта быў час упарадкавання эканомікі і важных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы. Асновай яе развіцця сталі арэнда і сямейны падрад. У канцы 1981 – пачатку 1982 г. буйныя сельскагаспадарчыя брыгады былі распушчаны, а асноўнымі вытворчымі адзінкамі сталі сем'і, якія гаспадарылі на арандуемай у кааператываў зямлі. Пасля таго, як сям'я выконвала дзяржаўны заказ і разлічвалася з кааператывам за арэнду зямлі, яна магла свабодна распараджацца рэшткамі прадукцыі, рэалізоўваючы яе на рынку. У выніку адбылася легалізацыя прыватнага гандлю.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У адпаведнасці з рашэннем УСНП у маі 1984 г. рэформа пачала актыўна праводзіцца і ў горадзе. Кіраўніцтву дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў было прадастаўлена права арганізоўваць дадатковую вытворчасць прадукцыі і свабодна прадаваць яе на рынку, у тым ліку, выходзіць і на знешнія рынкі. Дырэктар прадпрыемства мог самастойна вызначаць цэны на звышпланавую прадукцыю. Каб сабраць сродкі для развіцця вытворчасці, прадпрыемствы атрымалі права выпускаць акцыі. Роля дзяржаўнага плана і дзяржаўнага рэгулявання эканомікі была рэзка зменшана. Адначасова з рэфармаваннем дзяржаўнага сектара пачалося станаўленне шматукладнай эканомікі за кошт развіцця кааператыўнага, індывідуальнага, прыватнага сектараў. Але гэты працэс спачатку ішоў павольна. У 1988 г. на прыватны сектар прыпадала толькі 2,1% прамысловай вытворчасці. Адным з важных элементаў рэформаў стаў курс на прыцягненне замежных інвестыцый. Для гэтага, галоўным чынам у прыморскіх гарадах і правінцыях, ствараліся свабодныя эканамічныя зоны. У іх замежныя інвестары атрымлівалі шматлікія льготы ў справе падаткаабкладання, ажыццяўленні экспартна-імпартных аперацый, вывазе прыбытку. Аднак у першае дзесяцігоддзе рэформаў не прыходзіцца гаварыць аб шырокім прытоку ў Кітай замежных інвестыцый. Яны склалі толькі 28 млрд. долараў, і ў асноўным гэта былі сродкі кітайцаў, якія жылі за мяжой. У 80-я гг. Кітай захаваў імпартазамяшчальную мадэль эканомікі. Рэформы прывялі да рэзкага павышэння тэмпаў эканамічнага росту. У 1984 г. у Кітаі быў атрыманы рэкордны ўраджай рысу ў 400 млн. т., што дазволіла ў асноўным вырашыць харчовую праблему. Прырост прамысловай вытворчасці ў 1979 – 1988 гг. склаў 12 – 18% у год. Значна павысіўся ўзровень жыцця кітайцаў, рынак быў насычаны асноўнымі таварамі.

З пачаткам эканамічных рэформаў у Кітаі захавалася манаполія КПК на палітычную ўладу, аднапартыйная дыктатура. У такой сітуацыі ход рэформаў у вялікай ступені залежаў ад працэсаў, якія адбываліся ў кіруючай партыі. 12 з’езд КПК прыняў рашэнне аб упарадкаванні ў партыі. Як паказвалі сацыялагічныя даследаванні, спачатку толькі 20% работнікаў партыйнага апарата падтрымалі курс на рэформы. Патрэбна было дабіцца адзінства поглядаў у партыі на аснове прызнання неабходнасці ажыццяўлення “сацыялістычнай мадэрнізацыі” і правесці яе чыстку ад прыхільнікаў палітыкі “культурнай рэвалюцыі”. Мерапрыемствы па рэарганізацыі партыі актывізаваліся ў 1984 г., калі рэформы былі распаўсюджаны на горад. Партыйнае кіраўніцтва паставіла перад партыяй дзве задачы. Па-першае, актыўна



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

заняцца ліквідацыяй перашкод на шляху правядзення рэформаў. Па-другое, разгарнуць актыўную барацьбу супраць шматлікіх злоўжыванняў, якія шырока распаўсюдзіліся сярод работнікаў партыйнага і дзяржаўнага апарату. Пачатак станаўлення рынкавых адносін ва ўмовах адсутнасці дэмакратычнага кантролю грамадства за ўладаю давалі магчымасць апаратчыкам хутка ўзбагачацца праз атрыманне хабару, стварэнне фірм пад сваім кіраўніцтвам ці кіраўніцтвам сваякоў. Шматлікія злоўжыванні ў асяроддзі партыйных і дзяржаўных работнікаў выклікалі вялікае незадавальненне ў грамадстве. Гэтыя з'явы пачалі абазначаць тэрмінам "асноўны няправільны стыль", і КПК надавала шмат увагі барацьбе з ім, але вырашыць гэтую праблему ў той час не змагла.

У КПК адбываліся важныя кадравыя перамены. У кіруючыя органы пачалі прыцягвацца прадстаўнікі інтэлігенцыі. Вялікая ўвага надавалася павышэнню адукацыйнага ўзроўню партыйных работнікаў, бо нават у 1986 г. толькі 20% з іх мелі вышэйшую ці сярэднюю адукацыю. Адначасова ішоў працэс амаладжэння партыйных кадраў. У верасні 1985 г. адбылася ўсекітайская партыйная канферэнцыя, на якой КПК падвяла вынікі палітыкі ўпарадкавання. Практычна ўсе прадстаўнікі старой мааісцкай гвардыі былі адпраўлены ў адстаўку. На канферэнцыі было абвешчана, што мэтай партыі з'яўляецца пабудова сацыялізму з кітайскай спецыфікай. У такім грамадстве кіруючай сілай павінен выступаць рабочы клас. КПК, як яго авангард, уяўляе з сябе цэнтральную палітычную сілу, якая ўзначальвае сацыялістычную мадэрнізацыю.

У снежні 1986 – студзені 1987 г. у шэрагу гарадоў Кітая прайшлі дэманстрацыі, удзельнікі якіх (у асноўным – студэнты і інтэлігенцыя) патрабавалі дэмакратызацыі палітычнай сістэмы краіны. Гэтая ідэйная плынь атрымала з боку КПК назву "буржуазны лібералізм". Ён быў асуджаны ЦК КПК як пагроза сацыялізму ў Кітаі. Разам з тым, у партыйных дакументах падкрэслівалася, што барацьба з "буржуазным лібералізмам" не азначае адыход партыі ад палітыкі рэформаў. У студзені 1987 г. пасаду генеральнага сакратара ЦК КПК заняў Чжао Цзыян. Ён быў вядомы як актыўны прыхільнік палітыкі рэформаў. Яго абранне азначала канчатковае паражэнне ў партыі тых, хто выступаў за пераарыентацыю партыі на пытанні класавай барацьбы. Восенню 1987 г. адбыўся 13 з'езд КПК, на якім было аб'яўлена аб завяршэнні кампаніі па ўпарадкаванні партыі. Ён пацвердзіў курс на будаўніцтва сацыялізму з кітайскай спецыфікай і падкрэсліў, што рэфармаванне эканомікі краіны адбываецца ў рамках сацыялізму, КПК па-раней-

шаму з'яўляецца кіруючай сілай кітайскага грамадства, а палітычная рэформа ў бліжэйшы час можа мець толькі абмежаваны характар.

К канцу першага дзесяцігоддзя рэформаў у кітайскім грамадстве назбіралася шмат супярэчнасцей. Не ўдалося вырашыць дэмаграфічную праблему, і, нягледзячы на значныя поспехі сельскай гаспадаркі, рост насельніцтва апярэджваў рост вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Таварнасць сямейных гаспадарак была невысокая. За гады рэформаў амаль у 1,5 разы вырас бюракратычны апарат, які быў падвержаны моцнай карупцыі. У 1988 – 1989 гг. у Кітаі назіраўся даволі прыкметны рост цэн (25,5% з сярэдзіны 1988 да сярэдзіны 1989 г.). Да 16,2% вырас у 1988 г. незадаволены попыт. У гэты час стала складвацца сітуацыя, калі вынікі рэформаў пачалі значна адставаць ад чаканняў, якія яны парадзілі ў свядомасці кітайцаў. Грамадства ўсё больш распадалася на дзве часткі. Адна расчароўвалася ў рэформах, і ў ёй на-растала настальгія па часах "агульнага катла", калі меўся хоць невялі-кі, але стабільны даход. Другая лічыла, што нарастанне праблем звя-зана з тармажэннем рэформаў і абвінавачвала ў гэтым КПК, якая пра-цягвала захоўваць манаполію на ўладу. Выйсце бачылася ў дэмак-ратызацыі палітычнай сітэмы.

З канца 1988 г. незадавальненне дыктатурай КПК вылілася ў масавыя маніфестацыі, якія дасягнулі сваёй кульмінацыі летам 1989 г. У кіраўніцтве КПК узніклі вострыя спрэчкі аб адносінах да гэтага руху. Яны завяршыліся на пленуме ЦК КПК 23 – 24 чэрвеня 1989 г. Адстаўкай генеральнага сакратара ЦК КПК Чжао Цзыяна. Яго абвінавацілі ў падтрымцы беспарадкаў і спробе раскалоць партыю. Перавагу ў КПК атрымалі прыхільнікі сілавога вырашэння крызісу на чале з новым генеральным сакратаром Цзян Цзэмінем. У Пекін былі ўведзены войскі, якія жорстка расправіліся з удзельнікамі выступленняў.

Рэпрэсіўныя дзеянні кіраўніцтва КПК мелі грунтоўную сацыяльную падтрымку. Калі ў канцы 70-х гг. практычна ўсе сацыяльныя групы кітайскага грамадства былі зацікаўлены ў абнаўленні, то па меры развіцця рэформаў выявілася, што да глыбокіх пераўтварэнняў здольны толькі адносна вузкі слой. Для большасці насельніцтва была характэрна пазіцыя пасіўнага чакання. У 1986 г. па выніках сацыялагічнага апытання 41,6% жыхароў гарадоў палічылі для сябе пажаданным уклад жыцця, пры якім меўся хоць і нізкі, але стабільны даход і не было рызыкі страціць працу. Толькі 20,4% заявілі аб гатоўнасці рызыкаваць часовай стратай працы пры ўмове атрымання высокіх даходаў. Таму невыпадкова радыкалізацыя рэформаў сустракала супраціўленне значнай часткі насельніцтва, а менавіта яе патрабавалі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўдзельнікі выступленняў за дэмакратызацыю ў 1988 – 1989 гг. Гэтую кансерватыўную сацыяльную масу склала большасць рабочых нізкай кваліфікацыі, многія сяляне, якія не змаглі прыстасавацца да ўмоў рынку. Узначаліў яе партыйна-дзяржаўны апарат, які баяўся страціць уладу ў выпадку паглыблення рэформаў. Хаця ў кіраўніцтве партыі і знайшліся сілы, якія змаглі разгарнуць рэформы, пераважная большасць партыйных работнікаў гатова была падтрымліваць рэформы толькі да таго часу, пакуль яны не стваралі пагрозу манаполіі КПК на ўладу. За іх радыкалізацыю выступала перш за ўсё інтэлігенцыя, а таксама тыя слаі грамадства, якія найбольш выйгралі ад рэформаў – прадпрымальнікі, высокакваліфікаваныя рабочыя і служачыя. Яны звязвалі паглыбленне рэформаў у эканоміцы з дэмакратызацыяй палітычнай сферы. Але гэтыя слаі былі яшчэ ў меншасці, і кіраўніцтва КПК, якое ўзяло курс на сілавое падаўленне дэмакратычнага руху, магло разлічваць на падтрымку кансерватыўнай большасці грамадства.

Грамадска-палітычны крызіс 1988 - 1989 гг. выклікаў значныя наступствы для развіцця Кітая. Быў нанесены моцны ўдар па тых сілах, якія выступалі за дэмакратызацыю краіны. Пануючае становішча КПК у палітычнай сістэме краіны яшчэ больш умацавалася. У сувязі з падаўленнем дэмакратычнага руху выказваліся меркаванні аб згортванні і эканамічных рэформаў. Вышэйшае кіраўніцтва КПК паспяшалася развеяць гэтыя апасенні, заявіўшы аб нязменнасці курса на рэфармаванне эканомікі. Разам з тым, самі метады вырашэння крызісу, перамены ў кіраўніцтве КПК прадвызначылі сур'ёзныя перамены ў яе палітычным курсе. Пленум ЦК КПК, які прайшоў у лістападзе 1989 г., вызначыў тры гады на стабілізацыю сітуацыі ў эканоміцы. Цэнтральным элементам эканамічнай палітыкі ў той момант стала барацьба з інфляцыяй праз скарачэнне грашовай эмісіі. Было абвешчана аб недапушчэнні размывання дзяржаўнай уласнасці. Уводзілася часовая забарона на стварэнне новых акцыянерных таварыстваў. З ліпеня 1989 г. пачалася ўсекітайская рэвізія прыватных прадпрыемстваў, у выніку чаго іх колькасць прыкметна скарацілася (колькасць занятых у прыватным сектары к канцу 1989 г. зменшылася на 15,7%).

У палітычнай сферы прасочваецца імкненне КПК абаперціся на найменш актыўную частку насельніцтва і абмежаваць фарміраванне новых сацыяльных слаёў. Адраджаюцца некаторыя партыйныя лозунгі, якія выклікалі асацыяцыю з 70-мі гг. Зноў загучалі заклікі вучыцца на ідэях Мао Цзэдуна, якія з'яўляюцца ўвасабленнем калектыўнай мудрасці партыі. Першараднае значэнне пачало надавацца вядзенню ідэалагічнай працы, асабліва сярод моладзі і інтэлігенцыі. Партыя бы-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ла падвергнута чыстцы ад тых, хто падтрымаў патрабаванні дэмакратызацыі ў 1989 г. У палітычным жыцці краіны цэнтральнае месца заняла барацьба з "буржуазным лібералізмам". У той жа час былі адменены многія прывілеі для партыйных работнікаў, узмацнілася барацьба са злоўжываннямі і карупцыяй.

Перыяд тармажэння рэформаў закончыўся ў 1992 г., бо яно адмоўна адбілася на тэмпах эканамічнага росту Кітая. Акрамя таго, кіраўніцтва КНР вымушана было лічыцца з урокамі падзення камуністычных рэжымаў ва Усходняй Еўропе. Вясной 1992 г. лідэр кітайскіх камуністаў і архітэктар рэформаў Дэн Сяопін ажыццявіў працяглую паездку па краіне. Па яе выніках ён выступіў з праграмнай прамовай, у якой абвясціў курс на радыкалізацыю эканамічных рэформаў. Пры гэтым ён падкрэсліў, што сацыялізм цалкам суадносіцца з рынкавай эканомікай, на шлях будаўніцтва якой становіцца Кітай, аднак уся паўната ўлады павінна заставацца ў руках КПК. Курс на пераход да рынкавай эканомікі замацаваў 14 з'езд КПК, які праходзіў у кастрычніку 1992 г. У яго рашэннях гаварылася пра неабходнасць заахвочваць прыватны капітал, ствараць сумесныя з замежным капіталам прадпрыемствы. Было аб'яўлена аб неабходнасці больш рашуча вызваляць эканоміку з-пад кантролю дзяржавы. Ствараемая эканамічная мадэль атрымала назву "сацыялістычная рынкавая эканоміка". З'езд пе-равыбраў на пасаду генеральнага сакратара Цзян Цзэміня.

У 90-я гг. ХХ ст. Кітай дасягнуў значных поспехаў у развіцці эканомікі. Ужо да 1995 г. ён павялічыў аб'ём ВУП у 4 разы ў параўнанні з 1980 г. Эканамічны ўздым ахапіў як прамысловасць, так і сельскую гаспадарку, імкліва развівалася сфера паслуг, турызм. У 1995 г. Кітай наведала 46 млн. турыстаў, і даход гэтай галіны склаў 9 млрд. долараў. Колькасць занятых у сферы паслуг за гады рэформаў вырасла ў 3,7 разы. За 90-я гг. значна, прыкладна ў два разы, узраслі рэальныя да-ходы кітайцаў. З пачаткам новага этапа рэформаў Кітай ажыццяўляе пераход ад імпартазамяшчальнай да экспартаарыентаванай эканамічнай мадэлі. Кітайская эканоміка ўсё больш уцягваецца ў сістэму сусветнай гаспадаркі. У 1996 г. у рамках кампаніі па ўпарадкаванні знешнеэканамічнай дзейнасці сярэдні імпартны тарыф быў зніжаны з 36 да 23%, былі адменены ліцэнзіі на імпарт 176 таварных груп. Па аб'ёму экспарту Кітай у сярэдзіне 90-х гг. выходзіць на 11 месца ў свеце. З 1992 па 1997 г. экспарт краіны вырас у 2,2 разы, а імпарт – у 1,8 разы пры пастаянным станоўчым знешнегандлёвым сальда. Але, нягледзячы на імклівае развіццё знешнеэканамічных сувязей, у канцы 90-х гг. больш за 90% прыросту



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ВУП дасягалася за кошт росту спажывання на ўнутраным рынку. Гэта яшчэ адно сведчанне росту даходаў кітайцаў.

У гэты час дзяржава цалкам адмаўляецца ад рэгулявання эканамічнай дзейнасці на мікраўзроўні. Яе намаганні канцэнтруюцца на распрацоўцы стратэгічных праграм развіцця, на ажыццяўленні комплекснай каардынацыі эканамічных працэсаў. Адбывалася скарачэнне долі дзяржаўнага сектара. У прамысловасці яна к канцу 90-х гг. складала 43%, у гандлі – толькі 20%. Прычым недзяржаўны сектар забяспечваў 84% прыросту вытворчасці ў прамысловасці. Адным з цэнтральных пунктаў эканамічнай палітыкі КНР з'яўлялася прыцягненне замежных інвестыцый. Тут былі дасягнуты значныя поспехі. У 1998 г. іх аб'ём склаў 260 млрд. долараў, было створана 270 тыс. сумесных прадпрыемстваў, на якіх было занята 17 млн. чалавек. Дзяржаўная палітыка па гэтым пытанні будавалася такім чынам, што замежны капітал у Кітаі накіроўваўся галоўным чынам на стварэнне вытворчых прадпрыемстываў і яго дзейнасць знаходзілася пад кантролем дзяржавы. У эканоміцы Кітая хапае і нявырашаных праблем. Захоўваецца вялікі разрыў у развіцці перадавых усходніх правінцый і адсталых заходніх. Галоўная праблема – імклівы рост насельніцтва. Ужо ў 1995 г. яно склала 1,2 млрд. чалавек, у 2004 – 1,3 млрд. У сельскай гаспадарцы панавалі дробныя сямейныя гаспадаркі, якія мелі вельмі нізкі ўзровень таварнасці, і вытворчасць харчавання не паспявала за ростам насельніцтва. У краіне вельмі востра стаяла праблема занятасці.

У 1997 г. памёр ініцыятар рэформаў у Кітаі Дэн Сяопін. Але гэта ўжо не магло паўплываць на іх ход. Курс на працяг рэформаў пацвердзіў 15 з'езд КПК у верасні 1997 г. Ён намеціў падваенне ВУП Кітая ў наступныя 10 гадоў. Пры гэтым прызнавалася, што да таго часу развіццё Кітая ішло экстэнсіўным шляхам, а многія дзяржаўныя прадпрыемствы з'яўляліся стратнымі. Каля паловы кітайцаў былі заняты ў сельскай гаспадарцы. Каб павысіць эфектыўнасць эканомікі, з'езд намеціў правядзенне акцыянавання дзяржаўных прадпрыемстваў, ажыццяўленне ў дачыненні да іх працэдуры банкруцтва. Але пры гэтым падкрэслівалася, што кантрольны пакет акцый павінен заставацца ў руках дзяржавы, і дзяржаўны сектар павінен па-ранейшаму адыгрываць кіруючую і кантралюючую функцыю ў эканоміцы. Захаванне неэфектыўных буйных дзяржаўных прадпрыемстваў тлумачыцца тым, што іх прыватызацыя прывядзе да росту і так вялікага беспрацоўя. У другой палове 90-х гг. Кітай праводзіць эканамічную палітыку, якую даследчыкі называюць палітыкай дазіраванага лібералізму і дазіраванага пратэкцыянізму. У яе рамках дзяржава адмовілася

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ад рэгулявання сацыяльна-эканамічных працэсаў на мікраўзроўні, але працягвае ажыццяўляць актыўны кантроль на макраўзроўні ў сферы фінансаў, мытных тарыфаў, інфраструктуры. Прызнаннем рынкавага характару кітайскай эканомікі стала прыняцце краіны ў 2002 г. у Сусветную гандлёвую арганізацыю.

2002 – 2003 гг. азнаменаваліся значнымі пераменамі ў кіраўніцтве КПК і КНР. 16 з’езд партыі, які адбыўся восенню 2002 г., прыняў адстаўку Цзян Цзыміня з пасады генеральнага сакратара ЦК КПК і абраў на гэтую пасаду Ху Цзіньтао. Вясной наступнага года Ху Цзіньтао змяніў Цзянь Цзыміня і на пасадзе старшыні КНР. Такім чынам, да ўлады ў КНР прыйшло “чацвёртае пакаленне кіраўнікоў”, прадстаўнікі якога фарміраваліся як палітыкі ва ўмовах рэформаў.

У час рэформаў істотным чынам змянілася і знешняя палітыка Кітая. Ён адмовіўся ад мааісцкага курса на экспарт рэвалюцыі і падрыхтоўку да вайны. У аснову знешняй плітыкі былі пакладзены прагматызм і эканамічныя інтарэсы краіны. Кітай пачаў праводзіць палітыку роўнай аддаленасці як ад СССР (Расіі), так і ад ЗША, маючы роўныя і стабільныя адносіны з імі. Пры гэтым палітычныя інтарэсы штурхаюць Кітай у большай ступені да супрацоўніцтва з Расіяй, каб супрацьстаяць фарміраванню аднапалярнага свету, заснаванага на дамінаванні ЗША. У той жа час ЗША з’яўляюцца найважнешым эканамічным партнёрам Кітая, і гэта абумоўлівае імкненне кіраўніцтва КНР падтрымліваць добрыя адносіны і з гэтай краінай. Для КНР важнай з’яўлялася праблема дасягнення тэрытарыяльнага ўз’яднання краіны. У 1997 г. да Кітая быў далучаны Ганконг, а ў 1999 г. – былая партугальская калонія Макао. Для вырашэння тайваньскай праблемы урад КНР прапанаваў мадэль “адна краіна – дзве сістэмы”. Яна прадугледжвала далучэнне Тайваня да КНР пры захаванні на востраве існуючага грамадскага ладу.

4. Будаўніцтва сацыялізму ў Манголіі вялося выключна за кошт савецкай дапамогі. 56% прамысловай прадукцыі выпускалася на прадпрыемствах, пабудаваных з дапамогаю СССР. Ён закупляў вялікую колькасць мангольскіх тавараў, якія нельга было рэалізаваць на сусветным рынку. За кошт СССР МНР забяспечвала свае патрэбы ў машынах і абсталяванні на 90%, у нафтапрадуктах на 100%. З сярэдзіны 80-х гг. савецкая дапамога змяншаецца. Да канца 80-х гг., нягледзячы на рост эканамічных цяжкасцей, Мангольская Народна-Рэвалюцыйная партыя (МНРП) устрымлівалася ад рэформаў. Праўда, XIX з'езд МНРП у 1986 г. заявіў аб барацьбе з дэфармацыяй сацыя-

лізму. Была сказана праўда аб кульце асобы Чэйбалсана, аб рэпрэсіях 30-40 гг.

Крах камуністычных рэжымаў у Еўропе прывёў да крызісу ўлады ў Манголіі. У красавіку 1990 г. прайшоў надзвычайны з'езд МНРП. Было адпраўлена ў адстаўку старое кіраўніцтва і абвешчана аб правядзенні свабодных выбараў. Яшчэ да з'езду быў адменены артыкул канстытуцыі аб кіруючай ролі МНРП у грамадстве. У 1990 г. прайшлі першыя дэмакратычныя выбары народнага хурала і прэзідэнта. Перамагла на іх МНРП, прэзідэнтам стаў яе новы кіраўнік Пунсалмагійн Ачырбат. З 1990 г. пачынаюцца значныя змены ў эканоміцы. Да рэформаў урад Ачырбата штурхалі надзвычай складаныя сацыяльна-эканамічныя праблемы, спыненне савецкай дапамогі. З 1993 г. Адбылася радыкалізацыя рэформаў. Пачала праводзіцца распрацаваная МВФ праграма структурнай перабудовы эканомікі. Яе ажыццяўленне першапачаткова выклікала рост цэн і інфляцыі. Але ўжо ў 1995 г. інфляцыя знізілася да 56%, нацыянальны даход вырас на 7,3%, выпуск прамысловай прадукцыі на 20,7%, знешні гандаль – на 40%. Нягледзячы на поспехі, дасягнутыя ў рэфармаванні эканомікі, Манголія знаходзіцца толькі ў пачатку шляху па пераадоленні эканамічнай адсталасці. У другой палове 90-х гг. каля чвэрці насельніцтва яшчэ жыло ніжэй за рысу беднасці.

Паралельна з правядзеннем рынкавых рэформаў ажыццяўляўся пераход да парламенцкай дэмакратыі. У 1992 г. уступіла ў сілу новая канстытуцыя. Краіна афіцыйна пачала называцца Манголіяй. Яна абвяшчалася прававой дзяржавай са шматпартыйнай сістэмай і рынкавай эканомікай. У якасці мэты абвяшчалася будаўніцтва «гуманнага, грамадзянскага, дэмакратычнага грамадства». У гэтым жа годзе прайшлі ўсеагульныя выбары, на якіх перамог апазіцыйны Дэмакратычны саюз. З яго праўленнем звязана радыкалізацыя рэформаў у 1993 г. Лібералізацыя эканомікі спачатку суправаджалася зніжэннем узроўню жыцця значнай часткі насельніцтва. Аднак у сярэдзіне 90-х гг. абазначыліся і пэўныя станоўчыя змены ў эканоміцы. Гэта дазво-ліла Дэмакратычнаму фронту зноў перамагчы на парламенцкіх выба-рах 1996 г. і прэзідэнцкіх 1997 г. Прэзідэнтам быў абраны Н.Багабан-дзі. Далейшае правядзенне рынкавых рэформаў не суправаджалася іс-тотным павышэннем узроўню жыцця насельніцтва. Гэта прывяло да расчаравання палітыкай Дэмакратычнага фронту і да яго паражэння на парламенцкіх выбарах 1999 г. і прэзідэнцкіх 2000 г. Да ўлады вяр-нулася МНРП. У Манголіі склалася двухпартыйная

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сістэма з удзелам Дэмакратычнага фронту і МНРП, усталявалася парламенцкая дэ-макратыя і рынкавая эканоміка.

На поўначы Карэі пасля другой сусветнай вайны ўсталявалася асабістая дыктатура Кім Ір Сена, які ўзначальваў Працоўную партыю Карэі (ППК), камуністычную па свёй ідэалогіі. Яна стала правячай у Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы (КНДР) і ўзначаліла будаўніцтва сацыялізму. На поўдні Карэі ўсталяваўся капіталістычны лад. У 1950 г. паміж дзвюма Карэямі ўспыхнула вайна, якая закончылася толькі ў 1953 г. Яна замацавала раскол Карэі і нанесла велізарны ўрон КНДР. Гэты час увайшоў у гісторыю як эпоха чучхе. Асноўны момант ідэалогіі чучхе заключаецца ў тым, што будаўніцтва карэйскага сацыялізму ажыццяўляецца за кошт уласных сіл. У гэтай краіне сталінская мадэль бюракратычнага сацыялізму знайшла найбольш поўнае ўвасабленне. У эканамічным плане краіна праводзіла палітыку на ізаляцыю эканомікі ад знешняга свету, у тым ліку і ад сацыялістычных краін. У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі эканоміка КНДР дасягнула пэўных поспехаў. Развіццё прамысловасці ў многім абапіралася на індустрыяльную базу, закладзеную яшчэ японцамі ў каланіяльны час. Эканамічным поспехам садзейнічала высокая культура працы карэйцаў, жорсткая дысцыпліна, канцэнтрацыя рэсурсаў у руках дзяржавы, энтузіязм насельніцтва. У пачатку 80-х гг. магчымасці экстэнсіўнага развіцця эканомікі былі вычарпаны. Пад ціскам эканамічных праблем правячы рэжым вымушаны быў рабіць крокі па адкрыцці эканомікі краіны. У 1984 г. былі прыняты праграма развіцця эканомікі і закон аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў. Аднак сумесныя прадпрыемствы стваралiся толькі этнічнымі карэйцамі і знаходзіліся пад жорсткім кантролем дзяржавы. Таму іх колькасць не перавышала 100. Эканамічнае становішча працягвала пагаршацца. З сярэдзіны 90-х гг. КНДР сутыкнулася з вялікімі харчовымі праблемамі. Толькі міжнародная дапамога дазволіла пазбегнуць голаду. Сітуацыя ў эканоміцы ўскладнялася тым, што супраць краіны ў 90-я гг. ЗША і іх саюзнікі ўвялі эканамічныя санкцыі. Гэта было звязана з адмовай КНДР дапускаць праверкі МАГАТЭ на свае ядзерные аб'екты.

Улада ў КНДР непадзельна належала Кім Ір Сену. Тэорыя карэйскага сацыялізму прадугледжвала пераход улады ад правадыра да яго пераемніка па спадчыне. Таму ўжо даўно сын Кім Ір Сена Кім Чэн Ір быў абвешчаны наступнікам бацькі. Смерць Кім Ір Сена ў 1994 г. нічога не змяніла ў жыцці краіны. Кім Чэн Ір працягнуў ранейшую палітыку. Некалькі разоў пачыналіся перамовы КНДР з Рэспублікай Карэяй. У 2000 г. адбылася нават сустрэча лідэраў дзвюх краін. Але

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

затым адносіны паміж імі зноў рэзка абвастрыліся з-за нежадання КНДР адмовіцца ад сваіх ядзерных праграм.

У выніку Жнівеньскай рэвалюцыі 1945 г. Камуністычная партыя Індакітая (КПІ) захапіла ўладу на поўначы В'етнама і абвясціла тут утварэнне Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам (ДРВ). На поўдні В'етнама восенню 1945 г. высадзіліся французскія войскі, і Францыя паспрабавала вярнуць уладу над сваёй калоніяй. Пасля правалу перамоў з урадам ДРВ на чале з Хо Шы Мінам яна пачала каланіяльную вайну. Яна закончылася толькі ў 1954 г. паражэннем Францыі і падпісаннем Жэнеўскіх пагадненняў. У адпаведнасці з імі Францыя прызнавала незалежнасць В'етнама, Лаоса і Камбоджы. У Паўночным В'етнаме ўлада заставалася ў руках камуністаў (КПІ была перайменавана ў Партыю працоўных В'етнама (ППВ)), а ў Паўднёвы В'етнам адводзіліся французскія войскі, і тут улада была ў руках урада імператара Бао Дая. Пагадненні намячалі правядзенне ўсеагульных выбараў і стварэнне агульнав'етнамскага ўрада.

Пакуль ішла вайна супраць Францыі, урад Хо Шы Міна імкнуўся праводзіць палітыку яднання ўсіх нацыянальна-патрыятычных сіл і ўстрымліваўся ад правядзення сацыялістычных пераўтварэнняў. З заканчэннем вайны ў ДРВ усталявалася адкрытая аднапартыйная дыктатура ППВ і пачалося будаўніцтва сацыялізму. На поўдні В'етнама ў 1955 г. была абвешчана Рэспубліка В'етнам, якая пачала развівацца па капіталістычным шляху. У канцы 50-х гг. кіраўніцтва ППВ адначасова з будаўніцтвам сацыялізму на поўначы краіны абвясціла курс на зняржэнне паўднёвав'етнамскага ўрада Дзінь З'ема і на ўсталяванне і ў гэтай частцы краіны камуністычнага рэжыму. Вынікам такога рашэння стала распальванне ў Рэспубліцы В'етнам партызанскай вайны, якую ўзначаліў створаны камуністамі ў 1960 г. Нацыянальны Фронт Вызвалення Паўднёвага В'етнама (НФВПВ). Росту партызанскага руху спрыяла палітыка паўднёвав’етнамскага ўрада. Ён нічога не зрабіў для вырашэння найважнейшага аграрнага пытання, дапусціў пранікненне на ключавыя пазіцыі ў эканоміцы замежнага капіталу ва ўрон нацыянальным інтарэсам. Імкненне ЗША не дапусціць распаўсюджвання камунізму на Паўднёвы В'етнам прывяло да таго, што яны ўсё больш уцягваліся ў в'етнамскі канфлікт, які ў перыяд з 1965 па 1973 г. выліўся для іх у буйнамаштабную вайну з удзелам у ёй 500-тысячнай амерыканскай арміі і пераносам ваенных дзеянняў на тэрыторыю ДРВ. Аднак падавіць камуністычны партызанскі рух на поўдні В'етнама так і не ўдалося, і ў 1973 г. ЗША прызналі правал сваёй агрэсіі і пайшлі на падпісанне Парыжскіх мірных пагадненняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Яны прадугледжвалі спыненне ваенных дзеянняў, вывад амерыканскіх войскаў з В'етнама і мірнае аб'яднанне краіны. Пасля таго, як ЗША вывелі свае войскі, рэгулярная армія ДРВ і партызаны Паўднёвага В'етнама перайшлі ў генеральнае наступленне супраць урада Рэспублікі В'етнам. Яно завяршылася 30 красавіка 1975 г. узяццем яе сталіцы Сайгона і аб'яднаннем В'етнама пад уладай камуністаў.

Пасля аб'яднання краіны быў узяты курс на сацыялістычныя пераўтварэнні ў Паўднёвым В'етнаме. Прыватная ўласнасць была ліквідавана. Да сярэдзіны 80-х гг. большасць сялян Паўднёвага В'етнама была аб'яднана ў кааператывы. Пачалося перасяленне ў вёску гарадскога насельніцтва. Нягледзячы на некаторыя поспехі, эканоміка краіны была неэфектыўнай. З сярэдзіны 70-х гг. была спынена дапамога з боку Кітая. У пачатку 1979 г. успыхнула в'етнама-кітайская вайна, якая цягнулася каля месяца. В'етнам уцягнуўся ў камбаджыйскі канфлікт. У сярэдзіне 80-х гг. значна змяншаецца савецкая дапамога В'етнаму. Эканамічныя цяжкасці ў некалькі завуаліраванай форме былі прызнаны на 4 з'ездзе КПВ у снежні 1986 г. На ім больш гаварылася аб поспехах, аднак, было відавочна, што эканоміка неэфектыўная, і, калі поспехі і былі, то ў многім за кошт знешняй дапамогі. Асабліва шмат праблем сабралася ў развіцці сельскай гаспадаркі. Краіна перажывала вялікія цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва прадуктамі харчавання. Указаўшы на дапушчаныя ў ходзе будаўніцтва сацыялізму памылкі, 4 з'езд КПВ аб'явіў курс на рэфармаванне эканомікі. Раней упор рабіўся на развіццё цяжкай прамысловасці. Пасля з'езду КПВ адмовілася ад будаўніцтва амаль 400 буйных прадпрыемстваў. Урад В'етнама асноўную ўвагу накіраваў на вырашэнне харчовай праблемы, забеспячэнне рынку спажывецкімі таварамі і прыцягненне інвестыцый. Быў аб'яўлены курс на стварэнне шматукладнай эканомікі: дзяржаўны, кааператыўны, дробнатаварны, прыватнакапіталістычны і дзяржаўна-капіталістычны сектары. У дзяржаўным сектары былі ўведзены гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Сяляне атрымалі права самастойна арганізоўваць вытворчасць на арандуемай у кааператываў зямлі і рэалізоўваць сваю прадукцыю. Забеспячэнне харчаваннем у канцы 80-х гг. значна палепшылася. Новы этап эканамічных рэформаў пачаўся ў В'етнаме ў 1989 г. Іх асноўным элементам стаў пераход ад адміністрацыйнай да рынкавай сістэмы цэнаўтварэння. Першапачаткова лібералізацыя цэн прывяла да іх росту. Але ўжо ў канцы 1989 г. інфляцыя знізілася да 2-3% у месяц. Многія буйныя дзяржаўныя прадпрыемствы сталі стратнымі, але ўрад не рашаўся на іх закрыццё. У краіне і без таго было вялікае беспрацоўе, многія в'ет-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

намцы імкнуліся выехаць за мяжу ў пошуках заробкаў. З пачатку 90-х гг. у краіну актыўна пайшлі замежныя інвестыцыі. Ужо ў 1992 г. яны склалі 5,3 млрд. долараў. Японія аказала В'етнаму дапамогу ў памеры 3,2 млрд. долараў. Для прыцягнення замежных інвестыцый у В'етнаме ствараліся экспартныя зоны, самай буйной з якіх стала Сайгонская. Тэмпы росту валавога ўнутранага прадукту склалі ў пачатку і сярэ-дзіне 90-х гг. 7-8% у год.

Рэформы ў эканоміцы не прывялі да прыкметных зменаў у палітычнай сферы. У 1986 г. памёр шматгадовы кіраўнік Камуністычнй партыі В'етнама Ле Зуан. Новае кіраўніцтва прызнала неабходнасць правядзення эканамічных рэформаў, аднак заявіла аб прадаўжэнні будаўніцтва сацыялізму. Падкрэслівалася, што прыватны сектар будзе дзейнічаць у В'етнаме на працягу доўгага часу, але яго дзейнасць усё ж разглядалася як часовая саступка. Кіраўніцтва партыі заявіла, што абнаўленне В'етнама ідзе на аснове марксізму-ленінізму і выказвалася супраць ідэйна-палітычнага плюралізму. Прэса разглядалася выключна як інструмент партыйнай прапаганды. Гэтая пазіцыя была адлюстравана, у прыватнасці, у рашэннях пленума ЦК КПВ у жніўні 1989 г. У 1991 г. адбыўся 7 з'езд КПВ, які пацвердзіў курс “доі мой” (палітыка абнаўлення). Пры гэтым падкрэслівалася, што рэформы павінны праводзіцца асцярожна. КПВ пацвердзіла адмову ад пераходу да шматпартыйнасці. 8 з'езд КПВ у 1996 г. назваў у якасці мэты палітыкі абнаўлення будаўніцтва ў В'етнаме рыначнага сацыялізму. Ён запланаваў тэмпы эканамічнага росту ў 10-12% у год і ператварэнне В'етнама да 2020 г. у развітую індустрыяльную краіну. Усходнеазіяцкі фінансавы крызіс значна паўплываў на эканоміку В'етнама. Тэмпы эканамічнага росту ў 1998 г. знізіліся да 3 – 3,5%. Прэм'ер-міністр краіны Фан Ван Кхай заявіў у верасні 1999 г., што эканоміка краіны знаходзіцца ў фазе спаду, перажывае фінансавы крызіс. У гэты ж час за-тармазіліся эканамічныя рэформы. Але ўжо з канца 1999 г. эканаміч-нае развіццё зноў паскорылася.

Істотна змянілася знешняя палітыка В'етнама. Адбылася нармалізацыя адносін з суседзямі, што дазволіла значна скараціць армію (да 572 тыс.) і ваенныя выдаткі. У канцы 90-х гг. гандлёвы абарот В'етнама з былымі сацыялістычнымі краінамі зменшыўся ў 10 разоў. Асноўнымі эканамічнымі партнёрамі В'етнама сталі Японія, Францыя, а таксама краіны Паўднёва-Усходняй Азіі. У 1995 г. В'етнам быў прыняты ў Асацыяцыю Краін Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН). На мяжы стагоддзяў, нягледзячы на поспехі эканамічных рэформаў, В'етнам заставаўся беднай краінай. 75% насельніцтва было занята ў сельскай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гаспадарцы. Пры гэтым у краіне захавалася аднапартыйная аўтарытарная сістэма. На выбарах летам 2002 г. на пасаду прэзідэнта быў абраны кандыдат ад КПВ Чан Дзік Ліонг. Але рэальная ўлада канцэнтруецца ў руках генеральнага сакратара ЦК КПВ Нонг Дык Маня. 24 чэрвеня 2006 г. аб сваёй адстаўцы заявілі тры кіраўніка В’етнама: прэзідэнат Чан Дзік Ліонг, прэм’ер-міністр Фан Ван Кхай, старшыня парламента Нгуен Ван Ан. Афіцыйна было абвешчана, што адстаўка была выклікана неабходнасцю амаладжэння кіруючых кадраў.

Пасля доўгай грамадзянскай вайны 2 снежня 1975 г. была абвешчана Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка (ЛНДР). Улада аказалася ў руках Народна-рэвалюцыйнай партыі Лаоса (ЛНДП), якая стаяла на камуністычных пазіцыях і абвясціла курс на будаўніцтва сацыялізму. У выніку ў сярэдзіне 80-х гг. дзяржаўны сектар у эканоміцы склаў 90%, 53% сялян аб'ядналі ў кааператывы. Аднак спроба перавесці эканоміку на сацыялістычныя рэйкі закончылася няўдачай. Сельская гаспадарка засталася натуральнай. У ёй было занята 80% насельніцтва, яна давала 75% нацыянальнага даходу. Правядзенне калектывізацыі яшчэ больш падарвала вытворчасць. Поўным абсурдам была спроба будаваць прамысловыя гіганты, калі прамысловасць у краіне знаходзілася ў пачатковай форме. Вельмі нізкай заставалася насычанасць таварнага рынку. Амаль усе тавары строга лімітаваліся. Зарплата толькі на 10% выдавалася грашыма, астатняя – у натуральнай форме.

Нарастаўшыя эканамічныя цяжкасці паставілі перад уладаю пытанне аб рэформах. На IV з'ездзе НДПЛ у лістападзе 1986 г. размова больш ішла аб поспехах у будаўніцтве сацыялізму. І ўсё ж былі названы і памылкі: суб'ектывізм, забяганне наперад пры нацыяналізацыі і калектывізацыі. Прызнавалася, што дзяржава не можа яшчэ эфектыўна кіраваць нацыяналізаванымі прадпрыемствамі. Узніклі праблемы ў міжнацыянальных адносінах. З'езд аб'явіў неабходным стварэнне шматукладнай эканомікі ў краіне, але названая мера разглядалася як часовая, абумоўленая нізкім узроўнем прадукцыйных сіл. Па меры іх росту павінна ўтварыцца эканоміка з адным укладам – сацыялістычным. Пасля IV з'езду былі рэарганізаваны кааператывы. Асноўнай вытворчай адзінкай стала сялянская сям'я. Пачаў развівацца прыватны гандаль. У прамысловасці пайшоў працэс утварэння прыватных прадпрыемстваў. У 1988 г. было прынята рашэнне аб утварэнні сумесных прадпрыемстваў. У фінансавай сферы ўзніклі прыватныя банкі, усталяваліся ў асноўным рынкавыя цэны. У 90-я гг. рынкавыя рэформы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прадоўжыліся. Дзякуючы ім, Лаос дасягнуў пэўнага росту эканомікі і даходаў насельніцтва, але застаўся яшчэ слабаразвітай краінай.

У палітычнай сферы заставалася манаполія НРПЛ на ўладу. Яна падкрэслівае сваю вернасць марксізму-ленінізму і заяўляе аб працягу будаўніцтва сацыялізму. Працэс дэмакратызацыі звёўся да дэклaравання пераходу ад дыктатуры пралетарыяту да народнай дэмакратыі, што нічога не змяніла па сутнасці. Канстытуцыя 1991 г. зафіксавала, што НРПЛ з'яўляецца кіруючым ядром палітычнай сістэмы. У 1992 г. памёр шматгадовы кіраўнік Лаоса К. Фамвіхан. Кіраўніком партыі і краіны стаў К. Сіпхандон. У знешняй палітыцы Лаос супрацоўнічае са "стратэгічнымі партнёрамі": В'етнамам, КНР, КНДР, Кубай. Аднак, пры гэтым ён выказвае зацікаўленасць у развіцці эканамічных адносін з Японіяй, ЗША, Расіяй, Францыяй, краінамі Паўднёва-Усходняй Азіі. У 1995 г. Лаос быў прыняты ў АСЕАН.

У красавіку 1975 г. пасля працяглай грамадзянскай вайны ўладу ў Камбоджы захапілі "чырвоныя кхмеры" – узброеныя атрады Камуністычнай партыі Камбоджы (КПК). Яе кіраўнік Пол Пот заявіў аб намеры ў найкарацейшы тэрмін ажыццявіць "100% сацыялістычную рэвалюцыю" і пабудаваць бяскласавае грамадства. Ён пераняў з мааізму ідэю "вялікага скачка" і "культурнай рэвалюцыі". Яго ідэалогія засноўвалася на рэзка адмоўным стаўленні да спажывецкага грамадства. Для КПК было характэрна непрыняцце гарадской культуры. Камбаджыйская вёска глядзела на горад як на месца, дзе жывуць карумпіраваныя чыноўнікі і палітыкі, дзе канцэнтруецца ўсё зло і дзе знікаюць бясследна вынікі сялянскай працы. "Чырвоныя кхмеры" дзейнічалі ў сельскай мясцовасці і пераанялі нянавісць да горада. Узяўшы ўладу, палпотаўцы прыступілі да ажыццяўлення "скачка ў камунізм" і знішчэння ўсяго, што было звязана з мінулым. Пачалося масавае высяленне людзей з гарадоў у сельскую мясцовасць. Тут утвараліся «народныя камуны», у якіх адбывалася поўнае абагульненне ўласнасці аж да асабістых рэчаў. Прамысловасць, гандаль, таварна-грашовыя адносіны былі цалкам ліквідаваны. Уся уласнасць перайшла ў рукі дзяржавы. Правядзенне гэтых мерапрыемстваў суправаджалася страшным тэрорам. Яго першымі ахвярамі сталі чыноўнікі, ваеннаслужачыя старога рэжыму, будыйскія манахі, інтэлігенцыя. Пол Пот вылучыў тэзіс, што для будаўніцтва "светлай будучыні" у Камбоджы неабходны "адзін мільён абраных людзей". За гады праўлення "чырвоных кхмераў" было знішчана 1,2 млн. чалавек. У студзені 1976 г. была ўведзена новая канстытуцыя. Краіна перайменоўвалася ў Дэмакратычную Рэспубліку Кампучыю. Пол Пот заняў пасаду прэм'ер-

міністра, яго намеснікам і міністрам замежных спраў стаў Іенг Сары. У сакавіку 1976 г. прайшлі выбары ў вышэйшы прадстаўнічы орган – Сход народных прадстаўнікоў. Ён правёў адзінае паседжанне ў красавіку 1976 г., на якім была прынята фармальная адстаўка кіраўніка дзяржавы прынца Нарадома Сіянука.

На міжнароднай арэне бліжэйшым саюзнікам Кампучыі стала КНР, галоўным ворагам – В'етнам. Разрыў Пол Пота з в'етнамскімі камуністамі адбыўся яшчэ ў 1973-1975 гг. Яго не задаволіла імкненне апошніх утварыць федэрацыю сацыялістычных краін Індакітая. Гэта перакрэсліла б амбіцыі Пол Пота. Паступова паміж В'етнамам і Кампучыяй разгарэлася пагранічная вайна. У снежні 1978 г. в'етнамская армія пачала шырокамаштабнае наступленне супраць рэжыму Пол Пота і звергла яго.

Новым лідэрам краіны стаў Хенг Самрын. У 1981 г. была створана Народна-Рэвалюцыйная партыя Кампучыі (НРПК) як правячая партыя. Яна заявіла аб будаўніцтве сацыялізму ў Кампучыі. Канстытуцыя 1981 г. юрыдычна зацвердзіла кіруючую ролю НРПК у грамадстве. У гэты час краіна была ахоплена грамадзянскай вайной. "Чырвоныя кхмеры" разгарнулі барацьбу супраць урада Хенг Самрына і в'етнамскіх войскаў, якія яго падтрымлівалі. У якасці самастойных палітычных сіл выступалі прыхільнікі Н.Сіянука і генерала Лон Нола. Толькі ў канцы 80-х гг. намецілася тэндэнцыя да мірнага ўрэгулявання. У 1989 г. у канстытуцыю былі ўнесены папраўкі, якія прадугледжвалі аднаўленне манархіі і адмову ад сацыялістычнага шляху развіцця. У гэтым жа годзе з Кампучыі былі выведзены в'етнамскія войскі. У 1990 г. НРПК была перайменавана ў Народную Партыю Камбоджы, а Народная Рэспубліка Кампучыя – у Дзяржаву Камбоджа. Супрацьстаячыя палітычныя сілы ў 1991 г. падпісалі Дагавор аб урэгуляванні ў Камбоджы. Усеагульныя выбары намячаліся на 1993 г. Да гэтага моманту ўлада перадавалася Вышэйшаму нацыянальнаму савету на чале з Н. Сіянукам. Для падтрымання міру ў краіну ўводзіліся войскі ААН.

На ўсеагульных выбарах вясной 1993 г. перамогу атрымала Раялісцкая партыя прыхільнікаў Н.Сіянука на чале з яго сынам Ранарытам Сіянукам. Зусім няшмат ёй прайграла НПК, якую ўзначаліў Хун Сен. Каб забяспечыць адзінства ў грамадстве, было вырашана прызначыць двух прэм'ер-міністраў: першым стаў Р. Сіянук, другім – Хун Сен. Восенню таго ж года ўступіла ў дзеянне новая канстытуцыя, якая зацвердзіла аднаўленне манархіі. Н. Сіянук афіцыйна стаў каралём Камбоджы. "Чырвоныя кхмеры" адмовіліся прызнаць вынікі выбараў і прадоўжылі ўзброеную барацьбу. У 2000 г. было паведамлена аб

смерці Пол Пота, пасля чаго гэтая барацьба спынілася. У 1997 г. Хун Сен шляхам дзяржаўнага перавароту зрабіў спробу захапіць усю паўнату ўлады. Але яго дзеянні сустрэлі рэзкае асуджэнне як на міжнароднай арэне, так і ўнутры краіны. Ён быў вымушаны адступіць. Усеагульныя выбары ў 1998 г. стабілізавалі сітуацыю ў краіне. Прызнаннем гэтага стала прыняцце Камбоджы ў АСЕАН у 1999 г.

## ВЭ-1. САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ У КІТАІ (1940-1970-я ГГ.)

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- храналагічныя рамкі асноўных этапаў гісторыі сацыялістычнага Кітая: грамадзянскай вайны, "новай дэмакратыі", першай пяцігодкі, "вялікага скачка", "культурнай рэвалюцыі";
- калі адбываліся 7, 8, 9 з'езды КПК і іх найважнейшыя рашэнні;
- асноўныя палажэнні мааісцкай ідэалогіі;
- мэты і вынікі "вялікага скачка" і "культурнай рэвалюцыі".

***умець:***

- вызначыць прычыны перамогі КПК у грамадзянскай вайне;
- ахарактарызаваць рэжым "новай дэмакратыі";
- даць характарыстыку дзвюм плыням у КПК у 40-60-я гг.

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-1:***

1. Грамадзянская вайна 1946-1949 гг. і абвяшчэнне КНР.
2. Рэжым "новай дэмакратыі".
3. "Генеральная лінія" 1953 г. і пачатак будаўніцтва сацыялізму.
4. Палітыка "трох чырвоных сцягоў" і яе наступствы.
5. "Культурная рэвалюцыя".

### Парадак вывучэння першага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** грамадзянская вайна 1946-1949 гг., якая закончылася перамогай КПК, уяўляла з сябе спецыфічную форму сацыялістычнай рэвалюцыі ў Кітаі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру*:**

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3-х ч. – М.,2001. - Ч.2. - С. 130-133.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Гэты падручнік дазваляе азнаёміцца з асноўнымі перадумовамі ўзнікнення грамадзянскай вайны, яе этапамі, уплывам знешняга фактару на яе ўзнікненне і ход.*

КНР. Краткий исторический очерк. - М., 1980. - С. 14-22

*Названая манаграфія дазваляе вывучыць прычыны перамогі КПК у грамадзянскай вайне і высветліць характар рэвалюцыі*

История Китая. Под редакцией Меликсетова. - М., 1998. - Гл.17.

*У гэтай манаграфіі вызначаны шматлікія прычыны вайны, гэты глыбокі аналіз крызісу рэжыму Гаміньдана і палітыкі КПК у час вайны.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце палітычную сітуацыю, якая склалася ў Кітаі на момант заканчэння другой сусветнай вайны;

*Звярніце ўвагу на наяўнасць двух цэнтраў сілы, на палітычную лінію КПК і Гаміньдана пасля заканчэння другой сусветнай вайны.*

- высветліце прычыны, якія прывялі да ўзнікнення грамадзянскай вайны;

*Зыходзьце з таго, што і КПК, і Гаміньдан імкнуліся да ўсталявання сваёй непадзельнай улады над усім Кітаем. Высветліце, як унутраныя, так і знешнія фактары, якія прывялі да грамадзянскай вайны.*

- прасачыце асноўныя этапы грамадзянскай вайны;
- высветліце, якія прычыны крызісу рэжыму Гаміньдана, у чым ён праявіўся;

*Звярніце ўвагу на імклівае звужэнне сацыяльнай базы Гаміньдана з прычыны ігнаравання кіруючай вярхушкай інтарэсаў розных пластоў грамадства.*

- прааналізуйце палітыку КПК у час грамадзянскай вайны;

*Выканаўшы два апошнія вучэбныя заданні, вызначце:1) у чым прычыны перамогі КПК у грамадзянскай вайне; 2) як КПК вызначала ў той час характар рэвалюцыі.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнатнасць пытання:*** рэжым "новай дэмакратыі" ёсць пераходны перыяд у гісторыі КНР на шляху да будаўніцтва сацыялізму і ўвасабленне на практыцы аднаго з пастулатаў мааізма.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

КНР. Краткий исторический очерк.- М., 1980. - Гл. 2.

*У гэтай манаграфіі "новая дэмакратыя" трактуецца як буржуазна-дэмакратычны этап рэвалюцыі.*

История Китая. - М., 1998. - Гл. 18.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2.

*У названных выданнях дадзена ацэнка "новай дэмакратыі" як пераходнаму рэжыму, пры якім ствараліся перадумовы для будаўніцтва сацыялізму. У "Истории Китая» глыбока прааналізаваны ход аграрнай рэформы 1950-1953 гг.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце тэарэтычныя асновы рэжыму "новай дэмакратыі";
- ахарактарызуйце аграрную рэформу 1950-1953 гг. Выкарыстайце для гэтага фрагмент з аграрнага закона ад 30 чэрвеня 1950 г.: "Памешчыцкая ўласнасць на зямлю, заснаваная на феадальнай эксплуатацыі, адмяняецца і ўсталёўваецца сялянская ўласнасць на зямлю, каб вызваліць прадукцыйныя сілы ў сельскай гаспадарцы, развіць сельскагаспадарчую вытворчасць і пракласці шлях для індустрыялізацыі "новага Кітая".(КНР. Краткий исторический очерк. - С.27).

*Звярніце ўвагу, што маючы ў цэлым буржуазна-дэмакратычны характар, аграрная рэформа пачала паступова выходзіць за яго межы.*

- вызначце адметныя рысы пераўтварэнняў у прамысловасці;

*Заўважце, за кошт якой уласнасці ў той час адбывалася фарміраванне дзяржаўнага сектара ў прамысловасці. Падумайце, ці можна ўжо гаварыць аб сацыялістычным характары пераўтварэнняў.*

- прааналізуйце асаблівасці дзяржаўна-палітычнай сістэмы ва ўмовах «новай дэмакратыі».

*Неабходна паказаць, што пры фармальным захаванні шматпартыйнасці ў краіне фактычна ўжо ўсталявалася дыктатура КПК з апорай на армію*

## Парадак вывучэння трэцяга пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у гады першай пяцігодкі была зроблена спроба перанесці ў Кітай савецкую мадэль сацыялізму з апорай на дапамогу СССР пры адносна памяркоўных тэмпах сацыялістычнага будаўніцтва.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

КНР. Краткий исторический очерк. - М., 1980. - Гл.3.

История Китая. - М.,1998. - Гл. 18.

*У дадзеных работах паказаны прычыны пераходу КНР ад "новай дэмакратыі" да будаўніцтва сацыялізму. Пры гэтым акцэнтуецца ўвага на тое, што яно вялося з апорай на дапамогу СССР.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч. 2.

*Гэтае выданне ўтрымлівае галоўным чынам апісанне найважнейшых палітычных падзей і змен у дзяржаўнай сістэме ў сувязі з пераходам да сацыялістычнага этапа рэвалюцыі.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- дайце характарыстыку "генеральнай лініі" на будаўніцтва сацыялізму 1953 г.;

*Неабходна звярнуць увагу на два моманты: 1)адносна памяркоўныя тэмпы пераўтварэнняў; 2)пераймание вопыту СССР;*

- прааналізуйце асноўныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў гады першай пяцігодкі.

*Яны традыцыйныя для савецкай мадэлі сацыялізму: кааперавание сельскай гаспадаркі, індустрыялізацыя;*

На аснове аналізу наступнага тэксту вызначце прыярытэты эканамічнага развіцця Кітая ў час першай пяцігодкі.

З прамовы Мао Цзэдуна 25 красавіка 1957 г.: "Цяжкая прамысловасць з'яўляецца галоўным звяном нашага будаўніцтва. Пераважнае развіццё вырабу сродкаў вытворчасці – справа ўжо вырашаная. Аднак ні ў якім разе нельга ў сувязі з гэтым упускаць з-пад увагі вытворчасць сродкаў існавання перш за ўсё зерня ... Ці значыць гэта, што ўпор на цяжкую прамысловасць ужо не робіцца? Не, упор усё ж робіцца, цяжкай прамысловасці па-ранейшаму адводзіцца галоўнае месца ў нашых капіталаўкладаннях. Тым не менш трэба некалькі павялічыць удзельную вагу ўкладанняў у сельскую гаспадарку..."

"Творцы истории: Мао Цзэдун, Дэн Сяопин, Цзян Цзэминь. Статьи и выступления". - Мн., 2001. - С. 55-56.

- як змянілася дзяржаўна-палітычная сістэма КНР у гады першай пяцігодкі?

*У гэтай сферы галоўным з'яўляецца ліквідацыя сістэмы ваеннай дыктатуры, скліканне УСНП і прыняцце канстытуцыі 1954 г.*

- ахарактарызуйце найбольш важнейшыя рашэнні, якія былі прыняты на першай сесіі VIII з'езду КПК;

*Падумайце, чаму Мао Цзэдун быў падвергнуты крытыцы на гэтым з'ездзе, які варыянт будаўніцтва сацыялізму быў адобраны*?

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у 1958-1960 гг. Мао Цзэдун ажыццявіў спробу імклівага рыўка да камунізму праз татальнае абагульненне ўласнасці і скачок у развіцці прадукцыйных сіл.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

КНР. Краткий исторический очерк. – М., 1980. - Гл. 4.

*У гэтым выданні правал "вялікага скачка" неабгрунтавана звязваецца толькі з адыходам ад савецкай мадэлі сацыялізму.*

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2.

История Китая. - М., 1998. – Гл. 19.

*Прапанаваныя дзве працы вызначаюцца грунтоўным аналізам як прычын "вялікага скачка", яго зместу, так і вынікаў.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, якімі былі прычыны пераходу КПК да палітыкі "трох чырвоных сцягоў";

*Для гэтага неабходна ўлічыць асаблівасці кітайскай цывілізацыйнай традыцыі, а таксама суб'ектыўныя памкненні Мао Цзэдуна пасля смерці Сталіна.*

- прааналізуйце фрагмент з прамовы Мао Цзэдуна на нарадзе ў Байдайхэ ў жніўні 1958 г. і вызначце характар сацыяльна-эканамічных адносін, якія намячалася ўсталяваць у выніку "вялікага скачка":

"...У 1952 г. мы ўвялі заработную плату. Сцвярджалася, што буржуазныя рангі і буржуазнае права такія выдатныя, а сістэма бясплатнага забеспячэння тлумачылася адсталым метадам, партызанскімі звычкамі, якія адмоўна ўплываюць на актыўнасць. На самай справе мы замянілі сістэму бясплатнага забеспячэння сістэмай буржуазнага права, дапусцілі развіццё буржуазнай ідэалогіі.

Па-мойму, трэба канчаць з гэтымі рэчамі. ... на працягу аднаго-двух гадоў трэба правесці падрыхтоўку да адмены грашовых акладаў. Станаўленне народных камун прывядзе да таго, што мы паступова ліквідуем сістэму грашовых акладаў." (Бурлацкий Ф. Мао Цзэдун и его наследники. - М., 1980. - С.111-112).

*З якой мэтай было склікана нарада ў Бэйдайхэ, якія рашэнні на ёй былі прыняты?*

- ахарактарызуйце мэты "вялікага скачка" і шляхі іх дасягнення;

- выкарыстоўваючы фрагмент з выступлення Мао Цзэдуна на нарадзе ў Чжэнчжоу 27 лютага 1959 г., вызначце адметныя рысы "народных камун": "Стварэнне народных камун пашырыла і ўзняло на вышэйшую прыступку ранейшую калектыўную уласнасць на сродкі вытворчасці ў вёсцы, прычым пачалі з'яўляцца некаторыя элементы агульнанароднай уласнасці. Па сваіх маштабах народныя камуны значна пераўзыходзяць сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы, што дае магчымасць спалучаць прамысловасць,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сельскую гаспадарку, гандаль, асвету і ваенную справу, а таксама земляробства, лесаводства, жывёлагадоўлю, дапаможныя промыслы і рыбную гаспадарку...” (Маоизм без прикрас. – М., 1980. - С.122.)

*Адкажыце, калі пачалося стварэнне “народных камун” у КНР? Калі закончыўся вялікі скачок? Якую палітыку абвясціла КПК пасля гэтага?*

- пакажыце, як палітыка трох чырвоных сцягоў паўплывала на сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча ў КНР;

*Акцэнтуйце ўвагу на нарастанні сацыяльна-эканамічных цяжкасцей і аслабленне пазіцый Мао Цзэдуна ў партыйным кіраўніцтве.*

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** “культурная рэвалюцыя” была спробай Мао Цзэдуна і яго групоўкі захапіць усю паўнату ўлады ў КПК і дзяржаве і пературыць мааізм у манапольную ідэалогію кітайскага грамадства.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

КНР. Краткий исторический очерк. - М., 1980. - Гл.6,7.

*Звярніце ўвагу, што ў прапанаваным выданні храналагічныя рамкі культурнай рэвалюцыі вызначаны 1966-1969 гг. Большасць жа гісторыкаў вызначае іх 1966-1976 гг. У гэтай літаратуры дадзена трактоўка "культурнай рэвалюцыі" як перавароту, які меў на мэце ліквідацыю ўсякай апазіцыі Мао Цзэдуну ў партыі, дзяржаве і грамадстве.*

Новейшая история стран Азии и Африки. XXв. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. - С.144-148.

История Китая. - М., 1998. - Гл.20.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце прычыны і мэты “культурнай рэвалюцыі”. Для гэтага выкарыстайце, у прыватнасці, фрагмент з артыкула Мао Цзэдуна “Вялікія стратэгічныя ўстаноўкі” (верасень 1967 г.): “Трэба звергнуць горстку самых буйных асоб у партыі, якія стаяць ля ўлады і ідуць па капіталістычным шляху, трэба звергнуць іх не толькі арганізацыйна, але і палітычна, ідэалагічна і тэарэтычна. Трэба выклікаць новы ўздым шырокай крытыкі, зрабіць гэта асноўнай задачай, якая дамінуе над усімі іншымі. Трэба спалучаць крытыку жменькі самых буйных асоб у партыі, якія стаяць на чале ўлады і ідуць па капіталістычным шляху, з крытыкай асоб, якія стаяць на чале ўлады на месцах і ў мясцовых арганізацыях і якія ідуць па капіталістычным шляху”. (Маоизм без прикрас. - М., 1980. - С. 186-187.)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- устанавіце рухаючыя сілы “культурнай рэвалюцыі”. Часткова вам у гэтым дапаможа наступны ўрывак з ліста Мао Цзэдуна да Лінь Бяо 23 студзеня 1967 г.: ”Трэба накіраваць НВАК для аказання падтрымкі левым, шырокім народным масам. І ў будучым ва ўсіх тых выпадках, калі сапраўды рэвалюцыйныя групоўкі будуць звяртацца з просьбай аб патрымцы і дапамозе з боку арміі, трэба аказваць ім такую дапамогу”. (Маоизм без прикрас. – С. 206.)

*Звярніце ўвагу, што пытанне аб актыўным удзеле арміі ў “культурнай рэвалюцыі” Мао Цзэдун паставіў у 1967 г. Да гэтага ён рабіў стаўку на хунвэйбінаў і цзаафаняў.*

- прааналізуйце важнейшыя рашэнні IX з'езда КПК як з'езда, які падвёў вынікі першага этапа “культурнай рэвалюцыі”;

*Адкажыце, як змянілася ідэалагічная база КПК і яе арганізацыйная структура?*

- вызначце сутнасць унутранай барацьбы ў КПК пасля IX з'езда;

*Для гэтага прааналізуйце пазіцыі артадаксальных мааістаў і мааістаў-прагматыкаў. У гэтым плане паказальнае сутыкненне іх поглядаў на X з'езд КПК.*

- ахарактарызуйце дзяржаўна-палітычную сістэму, якая ўсталявалася ў КНР у выніку “культурнай рэвалюцыі” і была заканадаўча замацавана ў канстытуцыі 1975 г.

*Падумайце, чаму для вызначэння новай дзяржаўна-палітычнай сістэмы КНР ў гістарыяграфіі ўжываюць тэрмін “ваенна-бюракратычная дыктатура”.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Самакантроль па ВЭ-1.

1 Вызначце, чым характарызаваліся наступныя перыяды ў гісторыі КНР: а) “новая дэмакратыя”; б) “вялікі скачок”; в)“культурная рэвалюцыя”.

2 Падумайце, якія адметныя рысы будаўніцтва сацыялізму ў Кітаі ў гады першай пяцігодкі.

*Звярніце ўвагу на тэмпы пераўтварэнняў, на выбраную мадэль.*

3 Ахарактарызуйце прычыны і перадумовы “вялікага скачка”.

*Частка іх была выклікана спецыфікай кітайскай цывілізацыі, частка – сітуацыяй у КПК і міжнародным камуністычным руху.*

4 Якія вынікі “ вялікага скачка” для эканомікі КНР?

5 Якія фактары забяспечылі перамогу КПК у грамадзянскай вайне 1946-1949 гг.?

*Для гэтага ўспомніце, якую палітыку праводзілі КПК і Гаміньдан у час вайны, пра ўплыў міжнародных фактараў.*

6 Якія мэты меў Мао Цзэдун у час “культурнай рэвалюцыі”?

*Успомніце, як “культурная рэвалюцыя” паўплывала на эканоміку КНР?*

7 Які курс адстойвалі лідэры “прагматыкаў” у першай палове 70-х гг.?

## ВЭ–2. РЭФАРМАВАННЕ САЦЫЯЛІЗМУ Ў КІТАІ З КАНЦА 1970-х ГГ.

***Пасля вывучэння ВЭ–2 студэнт павінен ведаць:***

- асноўныя этапы рэформаў у КНР;
- палітычных дзеячаў Кітая, з дзейнасцю якіх звязана правядзенне рэформаў;
- асноўныя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў рамках рэформаў;
- важнейшыя рашэнні пленумаў і з’ездаў КПК, якія вызначалі ход рэформаў;
- дасягненні і супярэчнасці рэформаў;
- асноўныя кірункі знешняй палітыкі КНР у гады рэформаў;

***умець:***

- вызначыць прычыны пераходу да палітыкі эканамічных рэформаў у КНР;
- характарызаваць сутнасць рэформаў;
- прааналізаваць змест грамадскага крызісу 1989 г.;
- характарызаваць кітайскую эканоміку часоў рэформаў як шматукладную, якая рухаецца да рынкавай;
- вызначыць характэрныя рысы палітычнай сістэмы Кітая ў час рэформаў;
- характарызаваць “сацыялізм з кітайскай спецыфікай”.

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-2***

1 Крызіс тэорыі і практыкі мааізму і неабходнасць рэформаў.

2 Пачатак рэформаў. Фарміраванне шматукладнай эканомікі.

3 Грамадскі крызіс 1989 г.

4 Курс на будаўніцтва “сацыялізму з кітайскай спецыфікай” у 1990-я гг.– пачатку XXI ст.

5 Асноўныя этапы знешняй палітыкі КНР.

### Парадак вывучэння першага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання*****:** крызіс мааісцкага сацыялізму абумовіў пераход КПК да палітыкі рынкавых рэформаў пры захаванні аўтарытарнага палітычнага рэжыму.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. - С. 150-151.

История Китая. – М.,1998 – Гл. 20.

*У гэтых работах дадзена кароткая характарыстыка становішча Кітая пасля смерці Мао Цзэдуна.*

КНР. Краткий исторический очерк. – М., 1980 – С. 162-182.

*Тут дадзены даволі грунтоўны аналіз крызісу мааізму, але звязваецца гэта са стратай КПК ролі "пралетарскай партыі", паказана ўзмацненне пазіцый прыхільнікаў рэформаў у КПК.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- высветліце, што сабою ўяўляла эканамічная і сацыяльна-палітычная сітуацыя ў Кітаі пасля смерці Мао Цзэдуна;

У гэтым вам дапаможа тэкст наступнага дакумента:

З выступлення Хуа Гофэна на 5 сесіі УСНП: "... за перыяд з 1964 па 1976 г. краіна недаатрымала прамысловай прадукцыі агульным коштам прыкладна на 100 млрд. юаней, сталі 28 млн. т., а фінансавых паступленняў – у суме 40 млрд. юаней; уся народная гаспадарка апынулася на мяжы катастрофы". (Бурлацкий Ф. Мао Цзэдун и его наследники. - М., 1980. - С.312).

*Заўважце, што ў выніку "культурнай рэвалюцыі" эканоміка КНР апынулася ў глыбокім крызісе, а ў кіраўніцтве КПК разгарнулася вострая барацьба за ўладу.*

- на аснове засвоенага вамі фактычнага матэрыялу пакажыце, што ў сярэдзіне 70-х гг. мааізм як тэорыя і палітычная практыка перажываў глыбокі крызіс.

*Разабрацца ў тэорыі мааізму вам можа дапамагчы манаграфія Бурлацкага Ф. "Мао Цзэдун и его наследники".- М., 1980.*

- зрабіце вывады аб прычынах і перадумовах рэформаў;

*Улічыце як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя фактары.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у адпаведнасці з рашэннямі пленума ЦК КПК у снежні 1978 г. у Кітаі пачаліся рэформы, якія былі нацэлены на стварэнне рынкавай эканомікі пры захаванні палітычнага панавання КПК.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. - С. 151-152.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У гэтым падручніку вельмі коратка паказана сутнасць рэформаў, не акцэнтаваны іх рынкавы характар.*

История Китая. – М.,1998. – Гл. 20.

Нагорны А., Цыпланов С. КНР. Первое десятилетие политики реформ // Международная жизнь. – 1988. - № 12.

*У дадзеным артыкуле выказаны пункт гледжання, што да 1988 г. эканоміка КНР у цэлым засталася дзяржаўнай.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце, якія змены ў палітыку КПК былі ўнесены на III Пленуме ЦК КПК 11 склікання ў снежні 1978 г.;

*Як змяніліся прыярытэты паміж пытаннямі класавай барацьбы і сацыяльна-эканамічнымі праблемамі?*

- высветліце, якія асноўныя мерапрыемствы былі праведзены ў рамках рэфармавання кітайскай эканомікі ў 1978-1988 гг.;
- вызначце, як змяніўся характар эканомікі КНР ў 1978-1988 гг.;
- з дапамогаю наступнага фрагмента з прамовы Дэн Сяопіна ахарактарызуйце палітычную сістэму КНР на першым этапе рэформаў: ”ЦК лічыць, што для таго, каб ажыццявіць мадэрнізацыю ў гэтых галінах, неабходна цвёрда прытрымлівацца чатырох асноўных прынцыпаў у ідэалагічных і палітычных адносінах...:

1) неабходна адстойваць сацыялістычны шлях;
2) неабходна адстойваць дыктатуру пралетарыяту;
3) неабходна адстойваць кіраўніцтва з боку Кампартыі;
4) неабходна адстойваць марксізм-ленінізм, ідэі Мао Цзэдуна;"

(Творцы истории: Мао Цзэдун, Дэн Сяопин, Цзян Цзэминь. - Мн., 2001. – С. 143.)

- выкарыстоўваючы тэкст наступнага дакумента, адкажыце на пытанне: як КПК паставілася да буржуазнага лібералізму і чаму?

“Мы пакаралі па закону некалькі чалавек. Яны фактычна займаліся буржуазнай лібералізацыяй і парушалі пры гэтым крымінальныя законы... Буржуазная лібералізацыя выкліча смуту ўнутры нашага грамадства, зробіць яго нестабільным, а тады не ўдасцца ніякая стабілізацыя... Правы чалавека ў разуменні заходняга свету і ў нашым разуменні – розныя рэчы.” (Дэн Сяопин. Основные вопросы современного Китая. – М., 1988 г. – С. 143-144.).

## Парадак вывучэння трэцяга пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** лібералізацыя эканомікі ў Кітаі нарадзіла ў часткі насельніцтва імкненне да палітычнай лібералізацыі, што праявілася ў масавых антыўрадавых выступленнях у 1989 г.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

История Китая. - М., 1998.

Зотов В.Е. Китай после политического кризиса // Народы Азии и Африки. - 1990. - №6.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2. - С.153-154.

*У гэтым падручніку пытанне пададзена вельмі коратка, і яго змест не раскрывае ўсёй глыбіні праблемы.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прааналізуйце прычыны і перадумовы грамадска-палітычнага крызісу ў Кітаі ў 1989 г.;

*Звярніце ўвагу на настроі розных сацыяльных груп Кітая ў адносінах да рэформаў. Падумайце, чаму ўзмацніліся настроі супраць захавання палітычнага панавання КПК.*

- высветліце, што сабою ўяўлялі сацыяльныя сілы, якія ўдзельнічалі ў антыўрадавых выступленнях у 1989 г.;

- устанавіце, чаму кіраўніцтва КПК прыняло сілавы варыянт вырашэння крызісу. Для гэтага, абапіраючыся на наступную цытату, прааналізуйце, як КПК вызначыла характар народных выступленняў у 1989 г.: "Іх характар быў зразумелы з самага пачатку. Вылучаліся два асноўныя лозунгі: па-першае, далоў кампартыю, па-другое, далоў сацыялістычны лад. Яны мелі сваёй мэтай стварэнне поўнасцю празаходняй буржуазнай рэспублікі. Натуральна і тое, што наступныя падзеі выліліся ў контррэвалюцыйны мяцеж..." (Цзян Цзэмінь. Выступленне на сустрэчы з вышэйшым камандным складам вайсковых часцей, якія ўдзельнічалі ў забеспячэнні рэжыму ваеннага становішча ў сталіцы. (9 чэрвеня 1989 года). (Творцы истории: Мао Цзэдун, Дэн Сяопин, Цзян Цзэминь. Статьи и выступления. – С. 204-205.)

*Падумайце, ці была сацыяльная база для сілавога варыянту вырашэння крызісу.*

- якія наступствы меў грамадскі крызіс 1989 г.?

*Звярніце ўвагу на перамены ў эканамічнай палітыцы, на ўзмацненне ідэалагічнай працы КПК.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** з пачатку 1990-х гг. Кітай фарсіруе будаўніцтва "сацыялістычнай рынкавай эканомікі" як найважнейшага элемента "сацыялізму з кітайскай спецыфікай" пры захаванні аўтарытарнай палітычнай сістэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

История Китая. – М., 1998. - Гл.20.

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. – М., 2001. – Ч.2.

*У гэтых дзвюх працах дадзены сціснуты агляд ходу кітайскіх рэформаў у 1990-я гг.*

Ли Фэнминь. О специфике реформ в КНР // Новая и новейшая история. - 1996. - №3.

*Гэты артыкул адлюстроўвае афіцыйны погляд КПК на праводзімыя рэформы.*

Титаренко М. Китай в постдэновскую эпоху // Международная жизнь. – 1995. - №8.

*Аўтар адлюстроўвае тэзіс аб пераемнасці рэформаў нягледзячы на "адыход на пакой" Дэн Сяопіна.*

Гольбрас В. Куда идёт Китай // Мировая экономика и международные отношения. – 1998. - №4.

Богомолов О., Кондрашова Л. Китай сбрасывает старую кожу // Международная жизнь. – 1999. – №3.

Кондрашева Л. Точку ставить рано: «начался третий акт» китайской реформы // Азия и Африка сегодня. – 2004. – №3. – С.27-35.

*У гэтых артыкулах дадзены сутнасны аналіз тых рэформаў, якія праводзіліся ў Кітаі ў 1990-я гг.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце прычыны радыкалізацыі эканамічных рэформаў у Кітаі ў 1990-я гг.;
- прааналізуйце стратэгічны кірунак развіцця Кітая, як ён вызначаны рашэннямі14, 15 і 16 з'ездаў КПК;

*Звярніце ўвагу на характарыстыку "сацыялізму з кітайскай спецыфікай", на тое, што рынкавая эканоміка прызнана яго найважнейшым элементам.*

- для разумення сутнасці эканамічнай мадэлі Кітая ў 1990-я гг. звярніцеся да фрагмента з выступлення Цзянь Цзэміня на пленуме ЦК КПК 13 лістапада 1993 г.: "Зараз усім ясна, што рынкавы механізм адыгрывае ўсё больш важную ролю ў эканамічным жыцці нашай краіны, а адставанне рэформы ў асобных галінах адмоўна адбіваецца на ... здаровым развіцці народнай гаспадаркі ... Сістэма сацыялістычнай рынкавай эканомікі мае на ўвазе як дзяржаўнае макрарэгуляванне, так і ўздзеянне рынкавага механізму, які складае яе сутнасць, і абодва гэтыя бакі ўяўляюць сабою адно цэлае, дапаўняюць адзін аднаго і садзейнічаюць адзін аднаму. У мэтах пераўтварэння традыцыйнай планавай эканомікі трэба падкрэсліць неабходнасць выяўлення асноўнай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ролі рынку ў размяшчэнні рэсурсаў ... Разам з тым трэба бачыць і негатыўныя бакі рынку, якія выражаюцца ў сляпой стыхійнасці. Гэтыя слабыя бакі і недахопы трэба кампенсаваць і пераадольваць з дапамогаю макранакіроўваючай і макрарэгулюючай ролі дзяржавы над рынкавымі аперацыямі.” (Творцы истории. Мао Цзэдун. Дэн Сяопин. Цзян Цзэминь. – М., 2002. – С. 246-247).

*Звярніце ўвагу на рост вытворчасці і рост даходаў насельніцтва. Падумайце, чаму захоўваецца даволі вялікі дзяржаўны сектар і ў чым сутнасць палітыкі “дазіраванай лібералізацыі” ў эканоміцы.*

- высветліце дасягненні і праблемы ў сацыяльна-эканамічным жыцці КНР на мяжы ХХ і ХХІ ст. Выкарыстайце дакумент: выступленне Цзян Цзэміня на пленуме ЦК КПК 11 кастрычніка 2000 г. ”Вострыя супярэчнасці і глыбінныя праблемы эканамічнага развіцця нашай краіны хаваюцца ў нерацыянальнасці эканамічнай структуры, якая праяўлялася, галоўным чынам, у наступным: вытворчая структура нерацыянальная, развіццё рэгіёнаў негарманічнае, узровень урбанізацыі нізкі, тэхнічны ўзровень прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці адсталы, сукупныя якасці народнай гаспадаркі невысокія. Калі не фарсіраваць вырашэнне гэтых праблем, акажацца складанным павышэнне якасці эканамічнага росту…Мы павінны з усёй энергіяй узяцца за працу ў наступных сферах: рухаць структуру земляробства і структуру сельскай эканомікі, паскорыць рэарганізацыю і рэканструкцыю прамысловасці, аптымізацыю структуры і павышэнне класнасці вытворчасці, усімі сіламі развіваць сервіс, ажыццяўляць стратэгію маштабнага асваення заходняй часткі краіны, стымуляваць гарманічнае развіццё рэгіёнаў." (Творцы истории: Мао Цзэдун, Дэн Сяопин, Цзян Цзэминь. – Мн., 2001. - С. 307).

*Адзначаючы поспехі рэформаў, звярніце ўвагу на наяўнасць і шэрагу праблем: нераўнамернасць рэгіянальнага развіцця, дэмаграфічная праблема, вялікае беспрацоўе і іншыя.*

- прааналізуйце, як кіраўніцтва КПК на чале з Дэн Сяопінам і Цзян Цзэмінем бачылі працэс палітычных рэформаў у Кітаі, як яны рэалізуюцца ў рашэннях 16 з’езда КПК;

*Асноўны пастулат зводзіцца да таго, што ніякія рэформы не павінны падарваць кіруючую ролю КПК у грамадстве.*

### Парадак вывучэння пятага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** за час існавання КНР яе знешняя палітыка характарызавалася эвалюцыяй ад цеснага саюзу з СССР і канфрантацыі з Захадам да супрацьстаяння “сацыял-імперыялізму і імперыялізму”, а ў гады рэформаў стала грунтавацца на прынцыпах

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

“роўнааддаленасці” і прыярытэту эканамічных інтарэсаў у міждзяржаўных адносінах;

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

КНР. Краткий исторический очерк. – М., 1980.

*Гэтае выданне ўтрымлівае грунтоўны аналіз знешняй палітыкі КНР да канца 1970-х гг. з вызначэннем сутнасці яе кожнага этапа.*

История Китая. – М., 1998.

*У прапанаванай манаграфіі паказана сутнасць мааісцкай знешняй палітыкі і вызначаны прагматычны характар знешняй палітыкі Кітая ў час рэформаў.*

Остроухов О. Внешняя политика Китая в годы реформ и перспективы её развития // Мировая экономика и международные отношения. - 1999. - №9.

*У артыкуле зроблены аналіз знешнепалітычнага курса КНР у час рэформаў і выказваецца пункт гледжання, што яго цэнтральным момантам стала стварэнне спрыяльных знешніх умоў для эканамічных пераўтварэнняў.*

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2.

*Аўтары падручніка разглядаюць асноўныя этапы знешняй палітыкі КНР ва ўзаемасувязі з рознымі перыядамі будаўніцтва сацыялізму, акцэнт робіцца на кітайска-савецкія адносіны.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- дайце характарыстыку знешняй палітыкі КНР у 1949-1957 гг.;

*Зыходзьце з таго, што цэнтральным момантам знешняй палітыкі КНР у гэты час было цеснае супрацоўніцтва з СССР.*

- прааналізуйце ўрывак з выступлення Мао Цзэдуна на 9 з’ездзе КПК і вызначце, хто разглядаўся ў якасці асноўнага знешнепалітычнага праціўніка КНР: “Савецкі рэвізіянізм і амерыканскі імперыялізм, дзейнічаючы ў злачыннай змове, натварылі так шмат гнусных і подлых спраў, што рэвалюцыйныя народы ўсіх краін не даруюць ім ... Пачаўся новы гістарычны перыяд – перыяд барацьбы супраць амерыканскага імперыялізму і савецкага рэвізіянізму”. (Маоизм без прикрас. – М., 1980. – С. 235).

*Зрабіце агульную выснову: чым характарызавалася знешняя палітыка Кітая ў канцы 50-х – 60-я гг.?*

- падумайце, які шлях вырашэння міжнародных праблем прапаноўвалі мааісты, зыходзячы з наступнай цытаты з выступлення Мао Цзэдуна: “Вайна выступае ў якасці сродку класавага сутыкнення. Толькі шляхам вайны можна знішчыць класы ... Без рэвалюцыйнай

вайны немагчыма знішчыць класы. Мы не верым, што да знішчэння класаў можна пакончыць з войнамі”. (Маоизм без прикрас. – С. 246).

*Засяродзьце ўвагу на тым, што знешняя палітыка КНР, як і ўнутраная, у той час вызначалася амаль выключна патрэбамі класавай барацьбы.*

- вызначце, якія перамены адбыліся ў адносінах КНР з развітымі капіталістычнымі дзяржавамі ў 70-я гг.;

*Неабходна адзначыць, што да паляпшэння адносін з “імперыялістамі” КНР падштурхнулі патрэбы эканамічнага развіцця (уплыў прагматыкаў).*

- устанавіце, якая асноўная задача стаіць перад знешняй палітыкай Кітая ў час рэформаў;

*Звярніце пры гэтым увагу на сувязі паміж эканамічнай мадэрнізацыяй і знешнепалітычнымі задачамі.*

- вызначце, у чым сутнасць знешнепалітычнай канцэпцыі “роўнааддаленасці”;

*Для гэтага прааналізуйце адносіны КНР з СССР (Расіяй), краінамі Захаду, краінамі, якія сталі на шлях развіцця.*

- дайце характарыстыку шляхам далучэння Тайваня да Кітая, якія прапануюцца кіраўніцтвам КПК, на аснове аналізу наступнага дакумента: З выступлення Цзян Цзэміня 30 студзеня 1995 г.: “Якім спосабам вырашаць тайваньскую праблему – цалкам і поўнасцю ўнутраная справа Кітая, замежнае ўмяшанне тут абсалютна недапушчальна. Мы працягваем стаяць за мірны спосаб, за мірнае аб’яднанне шляхам перамоў. У той жа час мы не можам абяцаць зусім не прымяняць сілу. Такое абяцанне зробіць мірнае аб’яднанне толькі немагчымым, і ў канчатковым выніку для вырашэння праблемы прыйдзецца ўзяцца за зброю. Пасля аб’яднання будзе ажыццяўляцца асноўны курс “адна краіна – два лады”. Канкрэтна, на асноўнай тэрыторыі краіны застанецца сацыялістычны лад, а на Тайвані – цяперашні рэжым”. (Творцы истории... – С. 274).

*Звярніце ўвагу на сутнасць канцэпцыі “адна краіна – дзве сістэмы”.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Самакантроль па ВЭ-2.**

1 Якія прычыны абумовілі пачатак рэформаў у КНР?

2 Калі і па чыёй ініцыятыве было прынята рашэнне аб правядзенні рэформаў?

3 Як змяніліся эканамічныя адносіны ў КНР у час рэформаў?

4 Ахарактарызуйце палітычную сістэму КНР у час рэформаў.

5 Вызначце прычыны, характар і рухаючыя сілы антыўрадавых выступленняў 1989 г.

6 У чым сутнасць “сацыялізму з кітайскай спецыфікай”?

7 Якія асноўныя этапы прайшла знешняя палітыка КНР у 50-70-я гг. XX ст.?

8. У чым сутнасць знешнепалітычнай канцэпцыі “роўнааддаленасці”?

## ВЭ-3. БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ Ў МАНГОЛІІ, КНДР, В’ЕТНАМЕ, ЛАОСЕ І КАМБОДЖЫ

***Пасля вывучэння ВЭ-3 студэнт павінен ведаць*:**

- асноўныя этапы будаўніцтва сацыялізму ў МНР, КНДР, В’етнаме, Лаосе і Камбоджы;
- прычыны і асноўныя падзеі Карэйскай вайны 1950-1953 гг., войнаў, якія вялі народы Індакітая пасля 1945 г.;
- адметныя рысы рэжыму Пол Пота ў Камбоджы;
- асноўныя этапы і мерапрыемствы ў ходзе рэфармавання сацыялізму ў краінах Азіі;

***умець:***

- выявіць спецыфіку будаўніцтва сацыялізму ў Манголіі, КНДР, краінах Індакітая;
- даць характарыстыку палітычных рэжымаў у названых краінах як таталітарных;
- ахарактарызаваць прычыны крызісу сацыялізму ў КНДР, Манголіі і краінах Індакітая;
- зрабіць параўнальны аналіз рэформаў 80-90-х гг. у сацыялістычных краінах Азіі.

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-3:***

1 Дзяржаўны сацыялізм у МНР: будаўніцтва, крызіс, рэфармаванне.

2 Спецыфіка сацыялістычнага будаўніцтва ў КНДР.

3 Будаўніцтва сацыялізму і адбіццё знешняй агрэсіі В’етнамам (1945-1975 гг.).

4 Крызіс сацыялізму і палітыка рэформаў у В’етнаме і Лаосе.

5 Камбоджа: ад рэжыму “чырвоных кхмераў” да станаўлення палітычнай дэмакратыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** будаўніцтва дзяржаўнага сацыялізму з апорай на дапамогу СССР прывяло да сістэмнага крызісу мангольскага грамадства, вынікам чаго стаў пераход Манголіі праз рэформы да рынкавай эканомікі і шматпартыйнай парламенцкай сістэмы.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2.

*У падручніку ўказаны асноўныя этапы развіцця МНР, але адсутнічае глыбокі аналіз пабудаванага там грамадства і прычын крызісу сацыялізму.*

Соколинский В., Сонинтамир Н. Трансформация восточного общества: опыт Монголии // Мировая экономика и международные отношения. - 2001. - №3.

Щетинин В. Под знаком Чангис-хана // Международная жизнь. - 1996.- №10.

История Монгольской Народной Республики. - М., 1983.

*Прапанаваная манаграфія можа выкарыстоўвацца для азнаямлення з фактычным матэрыялам. Яна ўтрымлівае неаб'ектыўныя і аднабаковыя ацэнкі будаўніцтва сацыялізму ў Манголіі.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прааналізуйце вынікі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця МНР за 1945-1960 гг.;

*Укажыце асаблівасці правядзення індустрыялізацыі, фарміравання таталітарнай палітычнай сістэмы.*

- вызначце супярэчнасці і цяжкасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Манголіі ў 70-80-я гг. і ахарактарызуйце крызіснае становішча мангольскага грамадства ў другой палове 80-х гг.;

*Звярніце ўвагу на экстэнсіўны характар развіцця эканомікі, яе залежнасць ад знешняй дапамогі. Сведчаннем нарастання крызісу сталі і перастаноўкі ў дзяржаўным кіраўніцтве ў сярэдзіне 80-х гг.*

- на аснове наступнага дакумента ўстанавіце, як кіраўніцтва МНР вызначала асноўныя мэты і задачы ў ходзе будаўніцтва сацыялізму: З артыкула першага сакратара ЦК МНРП Ю. Цэдэнбала "Ад феадалізму – да сацыялізму": "Выкарыстоўваючы заваяваную ўладу, мангольскі народ з дапамогай СССР прыступіў да стварэння найважнейшай перадумовы для некапіталістычнага развіцця – да прамысловага будаўніцтва ... Пры гэтым удзельная вага групы "А" у агульным аб'ёме прамысловай прадукцыі павялічылася з 38,5% у 1953 г. да 47,9% у 1963 г. У галіне сельскай гаспадаркі за апошнія гады былі ажыццёўлены буй-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Да 1960 г. было завершана кааператаванне арацкіх гаспадарак”. (Хрестоматия по новейшей истории. 1945-1965. - М., 1966. - С.92).

- ахарактарызуйце спецыфіку рэформаў у Манголіі з пачатку 90-х гг. ХХ ст.;

*Сутнасць рэформаў – пераход да рынкавай эканомікі і шматпартыйнай парламенцкай сістэмы.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля другой сусветнай вайны ў Паўночнай Карэі ажыццяўлялася будаўніцтва дзяржаўна-бюракратычнага сацыялізму на аснове канцэпцыі “апоры на ўласныя сілы”, вынікам чаго стаў глыбокі эканамічны крызіс на мяжы ХХ і ХХІ ст.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

История Кореи. - М., 1982. - Ч.2.

*Прапанавная работа напісана на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі і ўсяляк усхваляе дасягненні сацыялістычнага будаўніцтва ў КНДР, пазбягаючы аналізу цяжкасцей і супярэчнасцей гэтага працэсу. У ёй аднабакова асветлена праблема расколу Карэі.*

История Кореи. - Сеул, 1996.

Ланьков А.Н. Ким Ир Сен: опыт биографического очерка // Восток.- 1993.- №4.

*Артыкул утрымлівае глыбокі аналіз ідэй і палітычнай дзейнасці Кім Ір Сена, вызначае прычыны фарміравання яго культу асобы*

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2. - Гл. 9-10.

*У падручніку неаб’ектыўна віна за раскол Карэі ўскладзена толькі на ЗША, не сказана, што вайна 1950-1953 гг. пачалася ў выніку агрэсіі з боку КНДР. Аўтары глыбока прааналізавалі спецыфіку будаўніцтва карэйскага сацыялізму на аснове дактрыны “чучхе”.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, як і чаму адбыўся падзел Карэі на Паўночную і Паўднёвую;

*Неабходна падкрэсліць, што галоўную ролю ў ажыццяўленні расколу адыгралі знешнія фактары: супрацьстаянне СССР і ЗША. Заўважце, што захаванню адзінства Карэі спрабавала спрыяць ААН, але безвынікова.*

- разгледзьце прычыны ўзнікнення і ход вайны 1950-1953 гг. у Карэі (для больш дэталёвага вывучэння гэтага пытання можна выка-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рыстать манаграфію: А.В. Торкунов. Загадочная война: корейский конфликт 1950-1953 гг.- М., 2000.);

*Зыходзьце з таго, што вайну ў многім правакавала высокая ступень напружання, якая існавала на Карэйскім паўвостраве. Але непасрэдна да вайны прывяла агрэсія з боку рэжыму Кім Ір Сена.*

- прааналізуйце спецыфіку будаўніцтва сацыялізму ў КНДР на аснове дактрыны “чучхе”;

*Звярніце ўвагу на наступныя моманты: апора на ўласныя сілы, экстэнсіўная індустрыялізацыя, крайнія формы культу асобы правадыра, перадача ўлады па спадчыне.*

- ахарактарызуйце спецыфіку развіцця КНДР пасля краху “рэальнага сацыялізму” у СССР і краінах Усходняй Еўропы;

*Тут ключавым момантам з’яўляецца адсутнасць рэформаў, захаванне таталітарнага рэжыму.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у 1945-1975 гг. В’етнам адбіваў французкую і амерыканскую агрэсію і, акрамя таго, быў ахоплены грамадзянскаю вайною, што было вынікам расколу краіны і выбару розных шляхоў развіцця ДРВ і Паўднёвым В’етнамам.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную литаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. - М.,2001. - Ч.2.

*Падручнік дазваляе прасачыць барацьбу В’етнама за незалежнасць, вызначыць прычыны расколу краіны, ахарактарызаваць разыходжанні ў развіцці Паўночнага і Паўднёвага В’етнама. У ім утрымліваецца характарыстыка палітыкі ППВ па будаўніцтву сацыялізму і аб’яднанню краіны і палітыкі паўднёвав’етнамскага рэжыму.*

Новейшая история Вьетнама 1965-1980. - М., 1984.

Глазунов Е.П., Исаев М.П. Страны Индокитая. Путь борьбы и свершений. - М., 1984.

*У час працы з названымі выданнямі трэба ўлічваць, што яны напісаны на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі, і іх аўтары некрытычна падыходзяць да праблем будаўніцтва сацыялізму.*

Мосяков Д.В., Тюрин В.А. История Юго-Восточной Азии. – М., 2004.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прасачыце ход вайны в’етнамскага народу супраць Францыі і прааналізуйце палітыку ўрада Хо Шы Міна ў ходзе яе;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Пры аналізе тых пераўтварэнняў, якія праводзіліся ў ДРВ у час вайны з Францыяй, трэба зыходзіць з іх агульнадэмакратычнага характару, што было звязана з імкненнем урада Хо Шы Міна стварыць шырокі антыфранцузскі фронт.*

- ахарактарызуйце два важнейшыя моманты ў палітыцы Партыі Працоўных В'етнама пасля Жэнеўскіх пагадненняў: будаўніцтва сацыялізму на Поўначы і разгортванне партызанскай вайны на Поўдні;

*Неабходна адзначыць, што перамога над Францыяй дала магчымасць ППВ перайсці ад агульнадэмакратычных мерапрыемстваў да сацыялістычных. Звярніце ўвагу на спецыфіку будаўніцтва сацыялізму ва ўмовах амерыканскай агрэсіі.*

- прасачыце эвалюцыю палітычнага рэжыму ў Паўднёвым В'етнаме, вызначце прычыны яго крызісу і падзення;

*Акцэнтуйце ўвагу на правале спроб забяспечыць дэмакратычнае развіццё Рэспублікі В'етнам і дамінаванне аўтарытарнай тэндэнцыі. У выніку правячы рэжым пазбавіўся падтрымкі дэмакратычных антыкамуністычных сіл.*

- разгледзьце ход вайны ў В'етнаме ў 1960-1975 гг. і зрабіце выснову аб прычынах перамогі Поўначы;

*Засяродзьце ўвагу на такіх пытаннях, як ўзнікненне партызанскага руху на Поўдні, што стала вынікам камуністычнай экспансіі з Поўначы і палітыкі паўднёвав'етнамскага ўрада, якая часта не адпавядала нацыянальным інтарэсам. Рэакцыяй у адказ стала ўмяшанне ЗША, якое перарасло ў вялікую агрэсіўную вайну. Вызначце, у чым сутнасць палітыкі "в'етнамізацыі".*

- на аснове фрагментаў з Парыжскіх пагадненняў 1973 г. устанавіце, які шлях аб'яднання В'етнама яны намячалі:

"Артыкул 9.

б) паўднёвав'етнамскае насельніцтва павінна само вызначыць палітычную будучыню Паўднёвага В'етнама праз правядзенне сапраўды свабодных і дэмакратычных выбараў пад міжнародным наглядам;

в) замежныя дзяржавы не павінны навязваць паўднёвав'етнамскаму народу ніякай палітычнай тэндэнцыі і ніякіх дзеячаў.

Артыкул 15.

Уз'яднанне В'етнама будзе ажыццяўляцца крок за крокам мірнымі сродкамі на аснове абмеркавання і дамоўленасці паміж Паўночным і Паўднёвым В'етнамам без прымусу ці анексіі любога з бакоў і без замежнага ўмяшання..."(Хрестоматия по новейшей истории. 1945-1974. – М., 1976. - С. 112-113).

*Падумайце, хто з бакоў і ў чым парушыў гэтыя артыкулы.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** крызіс сацыялізму ў В'етнаме і Лаосе быў звязаны ў першую чаргу з неэфектыўнасцю каманднаадміністрацыйнай эканомікі. Для яго пераадолення абедзве краіны з другой паловы 80-х гг. пачалі праводзіць аднатыпныя сацыяльнаэканамічныя рэформы, вынікам якіх стаў рух да рынкавай эканомікі;

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001.- Ч.2. - Гл. 16,17.

*У падручніку няма грунтоўнага аналізу прычын і праяў крызісу сацыялізму ў названых краінах, але ён дае магчымасць зразумець сутнасць рэформаў, якія праводзяцца ў В'етнаме і Лаосе.*

Наумкин Л. Лаос: проблемы социально-экономических преобразований // Международная жизнь. – 1982 - №12.

Павлов Е. Социалистическая Республика Вьетнам после VII съезда КПВ // Международная жизнь. - 1987. - №4.

Дао Зуй Тунг. Обновление Вьетнама: первые успехи и опыт // Проблемы Дальнего Востока. - 1990. - №2

Богатова Н., Макарова С. Лаосский вариант обновления // Проблемы Дальнего Востока. - 1990. - №1.

Урицкий И. Снова во Вьетнаме // Международная жизнь.-1998.- №1.

Федотов В. Лаос. Интерес отнюдь не угас // Международная жизнь. - 1997. - №10.

*У гэтых артыкулах паказана неабходнасць рэформаў і першыя крокі па іх правядзенні. Аўтары артыкулаў звяртаюць увагу на асноўныя моманты праводзімых рэформаў і іх першыя вынікі.*

Кобелев Е.В. Вьетнам: внешняя политика как катализатор реформ // Восток.- 1988.- №2.

*Артыкул дае магчымасць вызначыць новыя элементы ў знешняй палітыцы В'етнама ў гады рэформаў.*

Мурашева Г. Ускорение по-вьетнамски // Азия и Африка сегодня. – 2004. - №3. – С.36-37.

*У артыкуле дадзена характарыстыка эканамічнай рэформы ў В'етнаме з пазіцый стварэння ў краіне рынкавай эканомікі.*

Мосяков Д.В., Тюрин В.А. История Юго-Восточной Азии. – М., 2004.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, у чым праявіўся крызіс сацыялістычнай мадэлі ў В'етнаме і Лаосе і прааналізуйце яго прычыны;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Зрабіце акцэнт на адсутнасці аб'ектыўных умоў для індустрыялізацыі, на неэфектыўнасці як прамысловасці, так і сельскай гаспадаркі, што абумовіла нявырашанасць многіх сацыяльных праблем.*

- прааналізуйце рашэнні 6 з'езда КПВ і 4 з'езда НРПЛ і ўстанавіце, якія асноўныя мерапрыемствы па рэфармаванню сацыялізму яны намецілі;

*Звярніце ўвагу, што рэформы датычыліся сацыяльна-эканамічнай сферы, дзе намячаўся пераход да шматукладнай эканомікі, і не закраналі палітычную сістэму.*

- вызначце асноўныя этапы і мерапрыемствы рэформаў і ахарактарызуйце іх вынікі;

*Усвядомце розніцу паміж першым этапам ( другая палова 80-х гг.), калі ў эканоміцы дапускаліся толькі асобныя элементы рынкавых адносін і другім, калі дзве краіны праводзілі глыбокія рынкавыя пераўтварэнні.*

- зрабіце параўнальны аналіз знешнепалітычнага курса В'етнама і Лаоса да пачатку рэформаў і ў ходзе іх;

*Звярніце ўвагу на адносіны з СССР (Расіяй), КНР, дзяржавамі Захаду і Японіяй, краінамі АСЕАН, адзначце, што эканамічныя інтарэсы сталі вызначальнымі ў знешняй палітыцы В'етнама і Лаоса.*

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання*:** з устанаўленнем у Камбоджы рэжыму "чырвоных кхмераў" была зроблена спроба ажыццявіць "вялікі скачок" у камунізм, які закончыўся правалам, і ў 90-я гг. XX ст. краіна ажыццяўляла пераход да рынкавай эканомікі і палітычнага плюралізму.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2.

*Падручнік дае магчымасць прасачыць асноўныя этапы гісторыі незалежнай Камбоджы, утрымлівае аналіз сутнасці розных палітычных рэжымаў, якія існавалі ў краіне.*

Осотов И. Кампучия: курсом национального возрождения // Международная жизнь. - 1987. - №12.

*У артыкуле разгледжаны праблемы пераадолення спадчыны рэжыму "чырвоных кхмераў", але працэсы, якія адбываліся пры гэтым, падаюцца з пункту гледжання поспехаў у будаўніцтве марксісцка-ленінскага сацыялізму.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Масяков Д.В. Социально-политическое развитие Камбоджи в XX в. Деревня и власть. - М., 1999 (Рецензия в журнале “Восток”. - 2000, №1).

*У манаграфіі разгледжанны спецыфіка сацыяльна-палітычнага развіцця Камбоджы, прычыны фарміравання ультракамуністычнай ідэалогіі сярод “чырвоных кхмераў” і яе сутнасць.*

Глазунов Е.П. Исаев М.П. Страны Индокитая: путь борьбы и свершений. – М., 1984.

*Манаграфія багатая фактычным матэрыялам, але пры трактоўцы падзей аўтары зыходзяць выключна з класавых пазіцый.*

История Кампучии: Краткий исторический очерк. - М., 1981.

*Кніга на аснове марксісцкай метадалогіі падае гісторыю Камбоджы, палпотаўскі рэжым характарызуецца як адыход у бок мааізма ад “правільнай” сацыялістычнай мадэлі.*

Мосяков Д.В., Тюрин В.А. История Юго-Восточной Азии. – М., 2004.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце адметныя рысы і асноўныя этапы гістарычнага развіцця Камбоджы ў 1945-1975 гг.

*Прасачыце, як была заваявана незалежнасць Камбоджаю. Звярніце ўвагу на дактрыну “кхмерскага будыйскага сацыялізму” як на спробу спалучэння мясцовай эгалітарна-калектывісцкай традыцыі з патрэбамі мадэрнізацыі краіны.*

- прааналізуйце ідэйна-палітычную дактрыну “чырвоных кхмераў” і ахарактарызуйце шляхі яе рэалізацыі;

*Неабходна пры гэтым указаць на крайнюю варожасць “чырвоных кхмераў” у дачыненні да спажывецкага грамадства і гарадской культуры, на іх уяўленні аб камунізме як аб грамадстве ўсеагульнай фізічнай працы і прымітыўнага размеркавання. Ахарактарызуйце палітыку тэрору “чырвоных кхмераў”, якая стала асноўным інструментам скачка ў камунізм.*

- вызначце характэрныя рысы палітычнай сітуацыі ў Камбоджы пасля падзення рэжыму “чырвоных кхмераў” (1979-1989 гг.).

*Звярніце ўвагу на тое, што “чырвоныя кхмеры” былі звергнуты толькі знешнім умяшаннем. Пасля гэтага краіна была ахоплена грамадзян-скаю вайною, што зрабіла вельмі праблематычным ажыццяўленне мерапрыемстваў у рамках марксісцка-ленінскага сацыялізму.*

- ахарактарызуйце шляхі мірнага ўрэгулявання камбаджыйскага канфлікту, супярэчнасці станаўлення дэмакратычнай палітычнай сістэмы з пачатку 1990-х гг.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Тут трэба адзначыць вяртанне да манархіі на чале з прынцам Н.Сіанукам, як найбольш аўтарытэтным лідэрам. Звярніце ўвагу на кампрамісны характар улады пасля выбараў 1993 г. і супярэчнасці ў правячай кааліцыі, што асабліва праявілася ў час палітычнага крызісу 1997 г.*

## Самакантроль па ВЭ-3.

1 Якія прычыны прывялі да расколу Карэі і вайны 1950-1953 гг.?

*Успомніце пра акупацыю Карэі войскамі ЗША і СССР.*

2 Калі пачалося рэфармаванне сацыялізму ў Манголіі, і па якіх асноўных кірунках яно адбывалася?

*Прыгадайце ролю правячай партыі і дэмакратычнай апазіцыі ў гэтым працэсе, пра перамены ў палітычным жыцці і эканоміцы.*

3 У чым сутнасць дактрыны “чучхе” і спецыфікі будаўніцтва сацыялізму ў КНДР?

4 Чаму в’етнамскія камуністы ў 1945 – пачатку 1950-х гг. устрымліваліся ад сацыялістычных пераўтварэнняў?

*Для гэтага трэба ведаць, якую галоўную задачу вырашала ДРВ у 1945-1954 гг.*

5 Чым было выклікана ўцягненне ЗША ў вайну ў В’етнаме?

*Трэба звязаць палітыку ЗША з палітыкай, якую праводзіла ППВ у 60-я гг.*

6 Якія прычыны прывялі да крызісу і падзення паўднёва-в’етнамскага рэжыму?

7 Якія рысы дазваляюць характарызаваць палітычныя рэжымы сацыялістычных краін Азіі як таталітарныя?

*Перш за ўсё паўтарыце азначэнне таталітарнага рэжыму.*

8 Назавіце прычыны крызісу сацыялізму ў МНР, КНДР, краінах Індакітая;

9 Якім чынам рэжым “чырвоных кхмераў” спрабаваў зрабіць "скачок" у камунізм?

10 Што аб’ядноўвае рэформы, якія з другой паловы 80-х гг. XX ст. пачалі праводзіцца ў В’етнаме і Лаосе з кітайскімі?

*Успомніце папярэдні ВЭ, дзе дадзена характарыстыка кітайскіх рэформаў.*

11 Якім чынам Камбоджа ажыццявіла разрыў з сацыялізмам, і да якой грамадскай мадэлі яна перайшла?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ВЭ-К. ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ ПА МОДУЛЮ

*Перш чым прыступіць да выканання кантрольных заданняў, успомніце, якія мэты ставіліся пры вывучэнні модуля, якая яго вядучая ідэя, якія асноўныя паняцці неабходна было засвоіць. Калі вы не ўпэўнены ў трываласці сваіх ведаў, паўтарыце вучэбны матэрыял па літаратуры, якая была рэкамендавана пры вывучэнні вучэбных элементаў модуля.*

***Кантрольныя заданні.***

1 Асноўнымі прычынамі перамогі КПК у грамадзянскай вайне 1946-1949 гг. сталі ______________________________________..

2 Рэжым, які ўсталяваўся ў Кітаі пасля грамадзянскай вайны, называўся: 1) дыктатура народа; 2) дыктатура пралетарыяту; 3) новая дэмакратыя; 4) сацыялістычная дэмакратыя;

3 Пераход да будаўніцтва сацыялізму ў Кітаі пачаўся ў: 1) 1946 г. 2) 1949 г. 3) 1953 г. 4) 1956 г.

4 8 з’езд КПК (I сесія): 1) падтрымаў курс Мао на “вялікі скачок”; 2) пацвердзіў генеральную лінію 1953 г.; 3) паставіў задачу стварэння шматукладнай эканомікі; 4) пазбавіў кіруючых пасад Мао Цзэдуна;

*Успомніце дату гэтай падзеі.*

5 Палітыка “3-х чырвоных сцягоў” КПК у канцы 1950-х гг. уключала ў сябе: 1)_____________; 2)______________;3)_______________;

6 Галоўным палітычным праціўнікам Мао Цзэдуна ў КПК у першай палове 1960-х гг. з’яўляўся: 1) Пэн Дэхуай; 2) Лю Шаацы; 3) Лінь Бяо; 4) Чжу Дэ;

*У чым заключаліся іх разыходжанні?*

7 Мааісцкая “культурная рэвалюцыя” мела на мэце: 1) ліквідацыю апазіцыі Мао Цзэдуну ў партыйным і дзяржаўным апараце; 2) выкараненне іншадумства сярод інтэлігенцыі; 3) ліквідацыю непісьменнасці; 4) прыярытэтнае развіццё навукі і адукацыі;

*Успомніце, якія падзеі паклалі пачатак “культурнай рэвалюцыі”, а якія яе завяршылі.*

8 Рашэнне аб правядзенні эканамічных рэформаў у Кітаі было зафіксавана: 1) у канстытуцыі 1975 г. 2) у рашэннях 10 з’езда КПК у 1973 г. 3) на пленуме ЦК КПК у снежні 1978 г. 4) у рашэннях 13 з’езда КПК у 1987 г.

9 Характэрнай рысай кітайскіх рэформаў з’яўляецца: 1) пераход да шматпартыйнасці; 2) пераход да рынкавай эканомікі; 3) узмацненне дзяржаўнага рэгулявання ў эканоміцы; 4) адмова КПК ад кіруючай ролі ў грамадстве;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

10 Пералічыце сферы, на рэфармаванне якіх была нацэлена палітыка “чатырох мадэрнізацый”:

1_________; 2_____________; 3________; 4_____________.

*Калі быў прыняты гэты палітычны курс?*

11 Якія рысы характэрны для "сацыялізму з кітайскай спецыфікай"? 1) палітычны плюралізм; 2) палітычнае панаванне кампартыі; 3) каманднa-адміністратыўная эканоміка; 4) рынкавая эканоміка;

12 Суаднясіце даты і падзеі:

| | |
|---|---|
| “Культурная рэвалюцыя” | 1958-1959 |
| Першая пяцігодка | 1953-1957 |
| “Вялікі скачок” | 1949-1952 |
| Перыяд “новая дэмакратыя” | 1966-1976 |

13 Які палітычны рух у КНР у 1980-я гг. атрымаў назву “буржуазны лібералізм”?

*Як да яго аднеслася КПК і чаму?*

14 Параўнайце знешнюю палітыку КНР эпохі Мао Цзэдуна і эпохі рэформаў.

15 Пералічыце прычыны грамадскага крызісу ў Кітаі ў 1989 г.

*Для гэтага трэба ведаць ход рэформаў і тыя супярэчнасці, якія ў ходзе іх узніклі.*

16 “Архітэктарам” кітайскіх рэформаў з’яўляўся: 1) Чжоу Эньлай; 2) Дэн Сяопін; 3) Хуа Гофэн; 4) Чжао Цзыян;

17 Дактрына “чучхе” прадугледжвае: 1) апору на ўласныя сілы; 2) актыўную інтэграцыю з іншымі сацыялістычнымі краінамі; 3) абсалютызацыю ролі правадыра ў будаўніцтве сацыялізму; 4) захаванне элементаў палітычнай дэмакратыі;

18 . Якія фактары спрыялі пераходу Паўночнай Карэі да сацыялізму: унутраныя і знешнія?

19 Пасля краху “рэальнага сацыялізму” ў СССР і Усходняй Еўропе ў КНДР: 1)захаваўся культ асобы правадыра; 2)пачалося рэфармаванне таталітарнага палітычнага рэжыму; 3)Працоўная партыя Карэі адмовілася ад манаполіі на ўладу; 4) адбылася лібералізацыя ў эканамічнай сферы;

20 Карэйская вайна 1950-1953 гг. пачалася з агрэсіі

---

*Успомніце, як адбылося ўмяшанне іншых дзяржаў у Карэйскі канфлікт.*

21 Асноўным фактарам, які забяспечваў эканамічнае развіццё сацыялістычнай Манголіі, з’яўляўся: 1) багатыя прыродныя рэсурсы;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) дапамога СССР; 3) супрацоўніцтва з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі; 4) эфектыўная эканамічная мадэль.

22 У ходзе рэфармавання сацыялізму ў Манголіі: 1) захоўваўся аўтарытарны рэжым; 2) усталёўвалася шматпартыйнасць; 3)стваралася рынкавая эканоміка; 4)будаваўся рынкавы сацыялізм.

*Успомніце, якую ролю ў пачатку рэформаў адыграла правячая НРПМ.*

23 Суаднясіце даты і падзеі:

| | |
|---|---|
| Завяршэнне вайны ДРВ супраць Францыі | 1973 |
| Пачатак “палітыкі абнаўлення” ў В’етнаме | 1975 |
| Парыжскія пагадненні па В’етнаму | 1986 |
| Падзенне Рэспублікі В’етнам | 1954 |

24 У канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. у палітыцы Партыі працоўных В’етнама цэнтральнае месца займалі мерапрыемствы _________ па сваім характары.

*Трэба ўлічваць, што ДРВ вяла ў гэты час антыкаланіяльную вайну з Францыяй.*

25 Жэнеўскія пагадненні па Індакітаю прадугледжвалі: 1) міжнароднае прызнанне незалежнасці В’етнама; 2) міжнароднае прызнанне незалежнасці Лаоса і Камбоджы; 3) падзел В’етнама на паўночную і паўднёвую часткі; 4) увядзенне міратворчых сіл ААН у В’етнам.

*Успомніце, калі яны былі падпісаны і ў сувязі з чым.*

26 Укажыце дзве важнейшыя стратэгічныя лініі ў палітыцы Партыі працоўных В’етнама, якія былі намечаны на мяжы 50 – 60-х гг. XX ст.: 1_________________________; 2______________________.

27 Назавіце найбольш важныя прычыны перамогі камуністаў у Паўднёвым В’етнаме.

*Для гэтага трэба ведаць, як развівалася палітычная сітуацыя ў Паўднёвым В’етнаме.*

28 Якія прычыны крызісу сацыялізму ў В’етнаме і Лаосе?

29 Палітыка рэформаў, якая пачалася пасля 6 з’езду камуністычнай партыі В’етнама, прадугледжвала: 1) пераход да палітычнага плюралізму; 2) стварэнне рынкавай эканомікі; 3) захаванне палітычнага панавання КПВ; 4) інтэграцыю в’етнамскай эканомікі ў сусветную гаспадарку;

30 Як змяніліся знешнепалітычныя арыенціры і прыярытэты знешняй палітыкі В’етнама ў час рэформаў?

31 Шлях рэфармавання сацыялізму якой краіны паўтарае Лаос? 1) КНДР; 2) Камбоджы; 3) В’етнама; 4) Манголіі.

32 Назавіце характэрныя рысы “кхмерскага будыйскага сацыялізму”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

33 Што з пералічанага адносіцца да ідэалогіі “чырвоных кхмераў”? 1) поўнае адмаўленне таварна-грашовых адносін; 2) непрыняцце гарадской культуры; 3) абсалютызацыя вопыту СССР; 4) захаванне парламенцкай сістэмы.

34 Рэжым “чырвоных кхмераў” паў у выніку: 1) унутранага рэфармавання; 2) уварвання в’етнамскіх войскаў; 3) народнага паўстання; 4) ваеннага перавароту.

35 Пасля звяржэння рэжыму “чырвоных кхмераў” у Камбоджы: 1) адбыўся пераход да дэмакратыі; 2) разгарнулася грамадзянская вайна; 3) вялося будаўніцтва сацыялізму па ўзору СССР; 4) пачалася лібе-ралізацыя эканомікі.

36 У выніку ўсеагульных выбараў 1993 г. у Камбоджы: 1) усталявалася канстытуцыйная манархія; 2) захавалася палітычнае панаванне Народнай партыі; 3) усталявалася шматпартыйнасць; 4) спынілася грамадзянская вайна.

37 Суаднясіце палітычнага дзеяча з краінай:

| | |
|---|---|
| Хо Шы Мін | |
| Пол Пот | В’етнам |
| Н.Сіянук | Манголія |
| Цзян Цзэмінь | Лаос |
| П. Ачырбат | Камбоджа |
| Кім Чэн Ір | |
| Ле Зуан | КНР |
| Хун Сен | |
| Ю. Цэдэнбал | КНДР |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# М-3. ЯПОНІЯ І НОВЫЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫЯ КРАІНЫ УСХОДНЯЙ І ПАЎДНЁВА-УСХОДНЯЙ АЗІІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВЭ-0. УВОДЗІНЫ

***Пачынаючы вывучэнне гэтага модуля, неабходна праверыць свае веды па наступных пытаннях:***

1 Ахарактарызуйце палітычную і эканамічную мадэлі, якія склаліся ў Японіі ў 30-я – першай палове 40-х гг. XX ст.

2 Чым скончылася для Японіі другая сусветная вайна?

3 Чым характарызавалася эканамічнае развіццё краін Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі (УПУА) у 1918-1945 гг.?

4 Якім было палітычнае становішча краін УПУА на момант заканчэння другой сусветнай вайны.

*У выпадку неабходнасці паўтарыце папярэдні матэрыял па дапаможніку Васільева Л.С. "История Востока", т 2., і падручніку "Новейшая история стран Азии и Африки. XX век."– М., 2001.-Ч.1.*

***Інфармацыя аб модулі ў цэлым:***

Гэты модуль прысвечаны вывучэнню гісторыі краін УПУА, якія не былі пасля другой сусветнай вайны ўцягнуты ў сацыялістычны эксперымент. У яго аснове ляжыць праблема феномена Японіі, якая паспяхова спалучае мадэрнізацыю з захаваннем уласных традыцый. У другой палове XX ст. японская мадэль была перанята групай краін УПУА, якія праз паскораную мадэрнізацыю ператварыліся ў развітыя індустрыяльныя краіны.

***Месца і значэнне модуля ў сістэме курса:***

Вывучэнне гэтага модуля дазваляе атрымаць веды аб асноўных тэндэнцыях развіцця краін Усходу, якія найбольш паспяхова ў апошнія дзесяцігоддзі ажыццявілі мадэрнізацыю, дзякуючы чаму рэзка выдзеліліся па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця сярод іншых дзяржаў рэгіёну, але захавалі многія элементы традыцыйнага цывілізацыйнага фундаменту.

***Мэта вывучэння модуля:***

- выявіць змены, якія адбыліся ў сацыяльна-эканамічным жыцці Японіі пасля другой сусветнай вайны;
- ведаць спецыфіку мадэрнізацыі Японіі ў другой палове XX ст. як спалучэнне заходніх каштоўнасцей з традыцыямі мясцовай цывілізацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- ахарактарызаваць японскі "эканамічны цуд" у другой палове XX ст.;

- ведаць асаблівасці духоўнага жыцця сучаснай Японіі, у якім спалучаецца еўрапейскасць з нацыянальнымі традыцыямі;

- ведаць сутнасць паняцця "новыя індустрыяльныя краіны" (НІК);

- вызначыць спецыфіку развіцця эканомікі НІК "першай хвалі";

*Да іх ліку адносяцца Рэспубліка Карэя, Тайвань, Сінгапур і Ганконг.*

- ведаць характэрныя рысы іх палітычнага развіцця пасля другой сусветнай вайны;

- ахарактарызаваць асаблівасці эканамічнага развіцця НІК "другой хвалі";

*Да іх ліку адносяцца Малайзія, Тайланд, Філіпіны, Інданезія*

- прасачыць асноўныя этапы і вызначыць найважнейшыя рысы палітычнага развіцця гэтых краін пасля заваявання незалежнасці;

***Гэты модуль уключае ў сябе наступныя вучэбныя элементы:***

ВЭ-0. Уводзіны

ВЭ-1. Японія пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-2. Паўднёвая Карэя, Тайвань, Сінгапур і Ганконг як прадстаўнікі "першай хвалі" НІК.

ВЭ-3. Інданезія пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-4. Малайзія, Тайланд і Філіпіны на шляху ператварэння ў НІК.

ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю.

***Аб змесце модуля.***

***Ключавая праблема:*** феномен паспяховай мадэрнізацыі традыцыйнага ўсходняга грамадства ў шэрагу краі УПУА.

*Пры вывучэнні гэтай праблемы неабходна зыходзіць з таго, што найважнейшай перадумовай паспяховай мадэрнізацыі ў вывучаемых краінах, перш за ўсё Японіі, стаў цывілізацыйны фундамент, які забяспечыў паспяховы сінтэз мясцовых традыцый з дасягненнямі заходняй цывілізацыі.*

***Вядучая ідэя:*** пасля другой сусветнай вайны Японія, а ўслед за ёю цэлая група краін УПУА зрабілі імклівы рывок у сваім сацыяльна-эканамічным развіцці, пераняўшы ў Захаду мадэль рынкавай эканомікі і ў пэўнай ступені, ліберальную дэмакратыю, на развіццё якіх наклала свой адбітак мясцовая цывілізацыйная традыцыя.

***Асноўныя паняцці:*** індустрыялізацыя, новыя індустрыяльныя краіны, мадэрнізацыя, аўтарытарны палітычны рэжым, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, палітычная лібералізацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ

1 Японія ў 1945 – пачатку 1970 – х гг

2 Японія сярэдзіны 70-х гг. XX ст. – пачатку XXI ст.: новы этап эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця

3 Новыя індустрыяльныя краіны Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі

1 ЗША, якія акупіравалі Японію, прыступілі да ажыццяўлення ў гэтай краіне шырокага комплексу рэформаў. У палітычнай сферы галоўная задача рэформаў заключалася ў тым, каб стварыць у Японіі дэмакратычную форму кіравання. Былі забаронены фашысцкія і прафашысцкія арганізацыі, адменены законы, якія ўсталёўвалі таталітарны рэжым. У выніку грамадскае жыццё было вызвалена з-пад кантролю дзяржавы. У краіне аднавіла функцыянаванне шматпартыйная сістэма. Былі ўтвораны Ліберальная, Прагрэсіўна-дэмакратычная, Сацыялістычная (СПЯ) партыі, атрымала магчымасць для легальных дзеянняў Камуністычная партыя Японіі (КПЯ). Прафсаюзы, якія знаходзіліся пад кантролем дзяржавы, былі распушчаны. На іх месцы пачалі ўтварацца незалежныя прафсаюзы. У 1946 г. рэфармісцкія прафсаюзы аб’ядналіся ва Усеяпонскую федэрацыю прафсаюзаў, прафсаюзы, якія стаялі на пракамуністычных пазіцыях, – ва Усеяпонскі кангрэс вытворчых прафсаюзаў.

Важнае месца ў пасляваенных рэформах займала дэмілітарызацыя Японіі. Ваенныя колы з’яўляліся адной з галоўных сіл, на якіх ляжала адказнасць за фашызацыю краіны і за агрэсіўную вайну. Адразу пасля капітуляцыі армія і флот Японіі былі раззброены і расфарміраваны. Для суда над ваеннымі злачынцамі быў створаны Міжнародны ваенны трыбунал для Далёкага Усходу. Вынікам яго працы стала вынясенне сямі смяротных прысудаў, у тым ліку такім вядомым ваеннапалітычным дзеячам, як Тодзіо, Аракі. Ваеншчына Японіі перастала аказваць значны ўплыў на палітычнае жыццё, краіна была пазбаўлена магчымасці распачынаць агрэсію.

Важным крокам на шляху дэмакратызацыі Японіі стала змена статуса імператара. У снежні 1945 г. на аснове дырэктывы акупацыйных уладаў рэлігія сінта была аддзелена ад дзяржавы. У звароце да нацыі імператар публічна адмовіўся ад тэзіса аб сваім боскім паходжанні. Была створана незалежная сістэма правасуддзя. Яна гарантавала правы ўласнасці і асабістыя свабоды ад самавольства дзяржавы. У сацыяльнай сферы японцы атрымалі дастаткова шырокія правы і гарантыі. Вышэй ужо гаварылася аб праве на стварэнне прафсаюзаў. Яны маглі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

заключаць калектыўныя дагаворы з прадпрымальнікамі. Было абвешчана права на правядзенне забастовак. Законы аб працы ўсталёўвалі ў Японіі 8-гадзінны рабочы дзень, тыднёвы аплатны водпуск. Значна ўзрасла заработная плата японскіх рабочых, хоць яна прыкметна ўступала заработнай плаце заходніх рабочых.

У эканамічнай сферы найбольш важнай можна лічыць аграрную рэформу 1946-1949 гг. Быў усталяваны зямельны максімум для аднаго ўласніка ў памеры 3 га на паўднёвых астравах і 12 га на Хакайда, дзе землі менш урадлівыя. Зямля, якая перавышала ўсталяваны максімум, адбіралася ў памешчыкаў за выкуп. Арандатары атрымалі магчымасць набыць зямлю ва ўласнасць. Вынікам аграрнай рэформы стала ліквідацыя памешчыцкага землеўладання. Асноўная маса сялян ператварылася з арандатараў ва ўласнікаў зямлі. Развіццё сельскай гаспадаркі Японіі пасля рэформы пайшло па фермерскім шляху. Адбыўся значны рост прадукцыйных сіл. Уласнікі былі больш зацікаўлены ў павышэнні якасці сваёй зямлі, уводзілі перадавыя агратэхнічныя прыёмы. Многія памешчыкі, якія атрымалі выкуп за зямлю, укладалі грошы ў прамысловасць, ператвараліся ў прадпрымальнікаў. Частка сялян не змагла прыстасавацца да вядзення гаспадаркі ва ўмовах капіталістычных адносін на вёсцы і разаралася. Яны стваралі шматлікую танную рабочую сілу ў гарадах. Аграрная рэформа мела важныя палітычныя наступствы. Японскае сялянства, якое пакутавала ад малазямелля і было ўспрымальнае да мілітарысцкай прапаганды, жыло ілюзіямі, што толькі захоп новых тэрыторый зменіць яго становішча да лепшага. Аграрная рэформа прадэманстравала магчымасць вырашэння зямельнага пытання ў межах Японскіх астравоў. Тым самым была падарвана масавая база японскага мілітарызму.

У прамысловасці акупацыйныя ўлады сканцэнтравалі сваю ўвагу ў першую чаргу на рэарганізацыі “дзайбацу” – буйных манапалістычных аб’яднанняў, як правіла сямейных, якія ў передваенны і ваенны час моцна зросліся з дзяржаўным апаратам. Дзайбацу ў эканоміцы скоўвалі развіццё канкурэнцыі, функцыянаванне рынкавага механізму. Яны з’яўляліся адной з найважнейшых апор таталітарнага рэжыму і японскага мілітарызму. У выніку рэформы замест сямейных дзайбацу ўтварыліся карпарацыі і прамыслова-фінансавыя групы са значным распыленнем акцый сярод інвестараў. Гэта прывяло да дэманапалізацыі японскай эканомікі і стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця рынкавых адносін. Былі падарваны пазіцыі дзяржаўна-бюракратычнага капіталу, што аслабіла пазіцыі антыдэмакратычных сіл. Для фарміравання светапогляду японцаў важнае значэнне мела рэфор-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ма адукацыі. Першыя дзевяць гадоў адукацыі сталі абавязковымі і бясплатнымі. Выкладанне ідэалогіі японізму, міфаў сінта аб боскім паходжанні імператара і яго ўлады было забаронена.

Новая форма грамадска-палітычнага і дзяржаўнага ладу Японіі была замацавана ў канстытуцыі 3 мая 1947 г. Яна пацвердзіла адмену тэзіса аб боскім паходжанні імператара і яго ўлады. Ён пазбаўляўся рэальных уладных паўнамоцтваў. Канстытуцыя абвяшчала прынцып падзелу ўладаў. Заканадаўчая ўлада знаходзілася ў руках двухпалатнага парламента: Палата саветнікаў (выбіралася на 6 гадоў) і палата дэпутатаў (выбіралася на 4 гады). Абедзве палаты выбіраліся на аснове ўсеагульнага, прамога выбарчага права па мажарытарнай сістэме. Рэальная выканаўчая ўлада належала кабінету міністраў, адказнаму перад парламентам. Асабіва вялікая роля ў сістэме выканаўчай улады належала прэм’ер-міністру. Былі абвешчаны дэмакратычныя правы і свабоды грамадзян. Галоўнае значэнне канстытуцыйнай рэформы ў тым, што японцы асэнсавалі: дзяржава існуе для сваіх грамадзян, а не наадварот. Артыкул 9 канстытуцыі 1947 г. абвяшчаў адмову ад вайны, як сродка вырашэння міжнародных праблем. Японія адмовілася мець армію і флот. Была створана заканадаўчая перашкода на шляху адраджэння японскага мілітарызму. Канстытуцыя ўпершыню ў гісторыі Японіі замацавала аўтаномію мясцовага самакіравання. Губернатары, прэфекты, мэры гарадоў, вясковыя старасты выбіраліся на аснове ўсеагульнага выбарчага права. У выніку ажыццяўлення рэформаў было пакончана з таталітарызмам і мілітарызмам у Японіі. Краіна ўпэўнена пайшла па шляху развіцця дэмакратыі і рынкавай эканомікі. Рэформы можна расцэньваць як мірную буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю, настолькі глыбокія змены яны зрабілі ў грамадскім жыцці Японіі.

2. Ужо ў 1951 г. японская эканоміка ва ўсіх галінах дасягнула даваеннага ўзроўню. У 50-я гг. тэмпы росту японскай прамысловасці ў сярэднім за год складалі каля 20%. За 60-я гг. валавы ўнутраны прадукт павялічыўся ў 4,5 разы. Японія выйшла на трэцяе месца ў свеце па ўзроўні прамысловай вытворчасці. Такі імклівы эканамічны рост Японіі быў абумоўлены шэрагам фактараў. Цывілізацыйная традыцыя Японіі спрыяла таму, што ў гэтай краіне сфарміравалася дысцыплінаваная і адносна добра абучаная рабочая сіла. Японцы выхаваны ў духу ўзаемадапамогі. Гэтыя прынцыпы перанесены і на арганізацыю японскіх карпарацый. Японская фірма дзейнічала на рынку як уласнік, вытворца і, у той жа час, уяўляла сабою нешта падобнае на традыцыйныя сацыяльныя карпарацыі, пабудаваныя на прынцыпах



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

патэр-налізму і ўзаемнай падтрымкі ніжэйшых і вышэйшых у імя поспеху агульнай справы – працвітання фірмы. Японскія рабочыя намнога больш схільныя да супрацоўніцтва з фірмай, чым да барацьбы з яе вярхушкай. Са свайго боку, кіраўніцтва кампаніі імкнецца ўсяляк дэ-манстраваць свой клопат аб рабочых, прымяняючы матэрыяльнае і маральнае заахвочванне, пажыццёвы найм.

Японскі ўрад, апарат кіравання, у цэлым, сталі намнога меншымі і таннейшымі. Правы чыноўніцтва ў справе ўмяшання ў эканоміку былі значна абмежаваны. Гэта стварыла прастору для праяўлення прадпрымальніцкай ініцыятывы. Дзяржава сканцэнтравала свае намаганні на падтрымцы эканамічнай дзейнасці кампаній. Тут урад дзейнічаў у рамках тых жа канфуцыянскіх патэрналісцкіх традыцый. Дзяржава, якая цяпер не ўмешвалася непасрэдна ў эканамічнае жыццё, сваёй фінансавай, крэдытнай, інвестыцыйнай, мытнай палітыкай актыўна спрыяла эканамічнаму росту. Яна ж і часткова пераразмяркоўвае ў інтарэсах грамадства тыя вялікія даходы, якія атрымліваюць фірмы. Пасля вайны была створана новая мадэль дзяржаўнага рэгулявання. Асноўнымі яго кірункамі сталі планаванне і доўгатэрміновае прагназаванне эканамічнага развіцця, стымуляванне прыватнага капіталу ў справе ўсямернага выкарыстання найнавейшых дасягненняў НТР, удзел дзяржавы ў мерапрыемствах па павышэнні якасці прадукцыі. Японскае прагнозане планаванне грунтуецца на складанні навукова абгрунтаваных планаў-праектаў, над якімі сумесна працуюць дзяржаўныя органы і арганізацыі прыватнага бізнесу. Гэтыя планы з’яўляліся спробой сумеснымі намаганнямі намеціць найбольш рацыянальныя шляхі вырашэння эканамічных задач, якія стаялі перад краінай. Адным з важных фактараў, які запяспечваў хуткі эканамічны рост Японіі, стала рашучае абнаўленне пасля вайны асноўнага капіталу пры падтрымцы дзяржавы. Важную ролю ў перааснашчэнні вытворчасці адыграла выпрацаваная вякамі традыцыйная здольнасць японцаў актыўна пераймаць усё новае, вопыт другіх краін. Моцны штуршок эканамічнаму развіццю Японіі дала аграрная рэформа. Пасля яе вытворчасць ў сельскай гаспадарцы пачала хутка расці. Рэзка ўзрасла таварнасць сялянскіх гаспадарак, што пашырыла ёмістасць рынку і для прамысловых тавараў. Была вызвалена з сельскай гаспадаркі вялікая колькасць рабочых рук, якія накіраваліся ў прамысловасць і іншыя галіны.

У якасці важнай перадумовы хуткага эканамічнага росту можна назваць і развітасць інфраструктуры. У краіне мелася шырокая сетка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чыгунак, вялікая колькасць добра аснашчаных портаў. Насельніцтва мела адносна высокі адукацыйны ўзровень. У 50-я гг. і пазней адукацыя становіцца адным з важных прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. Станоўча паўплывала на эканамічнае развіццё адсутнасць значных ваенных расходаў ў пасляваенны час. Пэўную ролю ў эканамічных поспехах Японіі на пачатковам этапе адыгралі амерыканская дапамога і ваенныя заказы ў час Карэйскай вайны. Важна зазначыць і традыцыйную сціпласць японцаў у справе спажывання. Яны шмат сродкаў накіравалі на накапленне і інвестыцыі.

Пасля вайны намаганні японскага ўрада ў эканамічнай сферы былі сканцэнтраваны ў двух прыярытэтных кірунках. Першы ўключаў развіццё базавых галін – вытворчасць сталі, энергіі. Другі – галіны лёгкай прамысловасці і суднабудавання, якія арыентаваліся на экспарт. Для паспяховага развіцця названых галін урад прадастаўляў ім ільготныя крэдыты, даваў падатковыя льготы і г.д. Пры кабінеце міністраў быў створаны камітэт эканамічнага планавання, які займаўся вывучэннем ўнутранага і знешняга рынкаў, распаўсюджваннем аператыўнай эканамічнай інфармацыі. Дзяржава стварае многія аб’екты інфраструктуры. Развіццё японскай эканомікі хуткімі тэмпамі забяспечвалася ў многім імклівым ростам экспарту. Калі ўзяць 50 – 60-я гг., то ў японскім экспарце вядучая роля належала тэкстылю, абутку. Вытворчасць іх адбывалася пры адносна нізкай заработнай плаце. Гэта ў многім і забяспечвала пранікненне японскіх тавараў на сусветныя рынкі. Потым на першы план у экспарце выходзіць прадукцыя цяжкай прамысловасці (сярэдзіна 60-х – канец 70-х гг. XX ст.). Такім чынам, японскі эканамічны цуд канца 1940-х – пачатку 1970-х гг. адбыўся ва ўмовах рынкавай эканомікі, якая была ў многім арыентавана на экспарт.

У першыя пасляваенныя гады амерыканская палітыка была накіравана на тое, каб зрабіць немагчымай новую агрэсію з боку Японіі. З разгортваннем «халоднай вайны» яна мяняецца. Новая палітыка атры-мала назву “зваротны курс”. Японія павінна была стаць моцнай дзяр-жавай, каб з дапамагай ЗША стрымліваць СССР на Далёкім Усходзе і каб супрацьстаяць камуністычнай пагрозе ўнутры краіны. Акупацый-ныя ўлады і японскі ўрад пачалі наступленне на левыя арганізацыі, перш за ўсё на прафсаюзы, якія кантраляваліся камуністамі. З другога боку, новая палітыка мела на ўвазе як мага хутчэй дасягнуць эканамічнай стабілізацыі як гаранта сацыяльна-палітычнай стабільнасці. Для гэтай мэты быў рэалізаваны план Доджа. У яго аснове ляжала ідэя барацьбы з інфляцыяй і стварэння

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

ўмоў для хуткага накаплення капіталу. Ваенныя заказы ў час Карэйскай вайны разам з планам Доджа дапамаглі ў 1951 г. аднавіць японскую эканоміку.

Суверэнітэт Японіі аднавіў Сан-Францыскі мірны дагавор, заключаны ў верасні 1951 г. Яго падпісала больш за 40 дзяржаў, але СССР, КНР, КНДР, ДРВ, Індыя і некаторыя іншыя дзяржавы не паставілі свае подпісы. Дагавор спыняў рэжым акупацыі, але дапускаў знаходжанне на тэрыторыі Японіі замежных войскаў, калі аб гэтым будзе заключана двухбаковае пагадненне. Па дагавору Японія адмаўлялася ад усіх правоў на Карэю, Тайвань, Паўднёвы Сахалін, Курылы. Адначасова з мірным дагаворам быў падпісаны японa-амерыканскі Дагавор бяспекі. Ён прадугледжваў размяшчэнне на тэрыторыі Японіі амерыканскіх войскаў. Прычым, згодна з дагаворам яны павінны былі не толькі гарантаваць бяспеку Японіі на выпадак знешняй агрэсіі, але і ўдзельнічаць у падаўленні “буйных унутраных бунтаў і беспарадкаў”.

Першыя парламенцкія выбары пасля аднаўлення суверэнітэту адбыліся ў кастрычніку 1952 г. На іх перамагла правая Ліберальная партыя, і яе лідэр Ёсіда ў чарговы раз сфарміраваў урад. У 1954 г. узнікла Дэмакратычная партыя Японіі. Яна атрымала падтрымку часткі буйной буржуазіі, якая разлічвала, што новая партыя стане кансалідуючым пачаткам для ўсіх кансерватыўных сіл. Буйная буржуазія ў гэты час схіляецца да пункту гледжання, што дасягнуць палітычнай стабільнасці, сфарміраваць трывалы і моцны ўрад можна праз арганізацыю магутнай партыі, якая аб’яднае правыя сілы і будзе мець яўную перавагу над іншымі партыямі. Праведзеныя ў студзені 1955 г. парламенцкія выбары прынеслі буйны поспех Дэмакратычнай партыі. Такім чынам, яе прэтэнзіі на ролю кансалідуючага цэнтра правых сіл набылі рэальную аснову. У кастрычніку 1955 г. было дасягнута пагадненне аб аб’яднанні існаваўшых да гэтага з 1951 г. дзвюх сацыялістычных партый. Новая Сацыялістычная партыя абвясціла сваёй мэтай пераход да сацыялізму, але толькі мірным шляхам. На партыйнай канферэнцыі, што адбылася ў ліпені 1955 г., быў пераадолены раскол у шэрагах КПЯ. Партыя адмовілася ад тактыкі разгортвання партызанскай вайны. Найбольш важныя і далёка ідучыя наступствы для палітычнага развіцця Японіі мела аб’яднанне Ліберальнай і Дэмакратычнай партый 15 лістапада 1955 г. і стварэнне Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Яна адразу заняла дамінуючае становішча ў палітычным жыцці краіны і мела ў палаце дэпутатаў 298 мандатаў з 467, у палаце саветнікаў – 119 з 250. Асаблівасцю партыйна-палітычнай структуры Японіі, якая склалася  ў 1955 г., была наяўнасць пастаян-

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

най парламенцкай большасці ў руках ЛДП. Але пры гэтым апазіцыя кантралявала больш як трэць месцаў у парламенце, што рабіла для ЛДП немагчымым перагляд канстытуцыі.

У 1956 г. японскі ўрад пайшоў на аднаўленне дыпламатычных адносін з СССР. Ён разлічваў тым самым аслабіць залежнасць ад ЗША. 19 кастрычніка 1956 г. у Маскве была падпісана сумесная дэкларацыя, якая абвяшчала спыненне стану вайны і ўсталяванне міру паміж СССР і Японіяй. СССР абавязаўся рэпатрыіраваць у Японію ўсіх грамадзян гэтай краіны, што знаходзіліся на яго тэрыторыі, прызнаў наяўнасць пытання аб прыналежнасці паўднёвакурыльскіх астравоў. З чатырох астравоў, на якія прэтэндавала Японія, СССР пагадзіўся перадаць ёй два – Шыкатан і Хабамаі. Аднак, 27 студзеня 1960 г. японскаму ўра-ду была накіравана савецкая памятная запіска. У ёй было заяўлена, што СССР перадасць Японіі астравы толькі пры ўмове вываду з яе тэ-рыторыі амерыканскіх войскаў і заключэння савецка-японскага мір-нага дагавора.

Прэм'ер-міністр Хатаяма выступаў за перагляд японa-амерыканскага Дагавора бяспекі, лічачы, што ён абмяжоўвае суверэнітэт Японіі. Да гэтага правячыя колы Японіі падштурхоўваў і моцны антываенны рух. ЗША разумелі, што захаванне пазітыўнага стаўлення японскага грамадства да саюзу з імі патрабуе заключэння больш раўнапраўнага дагавора. Вынікам перамоў стала падпісанне 19 студзеня 1960 г. Дагавора аб узаемным супрацоўніцтве і гарантыі бяспекі. Ён прадугледжваў захаванне амерыканскіх ваенных баз у Японіі. Але цяпер ЗША не мелі права бескантрольна нарошчваць свой воінскі кантынгент і ўзбраенні на гэтых базах. У новы дагавор не ўвайшло палажэнне аб удзеле амерыканскіх войскаў у падаўленні ўнутраных беспарадкаў.

У той жа час, калі Японія вяла перамовы аб заключэнні новага дагавору з ЗША, яна пачала стварэнне значных узброеных сіл. У чэрвені 1957 г. быў зацверджаны першы план развіцця і ўмацавання ўзброеных сіл на 1958-1961 гг. З гэтага часу пытанне аб рэмілітарызацыі стала адным з цэнтральных у палітычным жыцці Японіі побач з пытаннямі аб саюзе з ЗША. Барацьба вакол дагавора 1960 г. прывяла да расколу СПЯ. Яе правае крыло было незадаволена тактыкай масавых дзеянняў, што прымянялася партыяй у барацьбе з дагаворам, і ў 1960 г. стварыла Партыю дэмакратычнага сацыялізму (ПДС). Правячая ЛДП у 60-я гг. асноўныя намаганні канцэнтруе на забеспячэнні эканамічнага росту краіны. У 1960 г. быў прыняты план Ікэда, які прадугледжваў падваенне нацыянальнага даходу за дзесяцігоддзе і

штогадовы прырост прамысловай вытворчасці на 9%. Гэтыя тэмпы былі дасягнуты, што стала важным фактарам падтрымання сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў краіне і захавання ўлады ЛДП. У лістападзе 1964 г. на палітычнай арэне Японіі з'явілася яшчэ адна дастаткова моцная партыя – Партыя чыстай палітыкі (КОМЭЙТО). Такім чынам, да сярэдзіны 1960-х гг. на месца фактычна 2-х партыйнай сістэме 50-х гг. ЛДП – СПЯ прыйшла шматпартыйная. Усе ўзнікшыя буйныя партыі склалі левацэнтрысцкую апазіцыю ЛДП. З'яўленне некалькіх апазіцыйных партый было выгадна ЛДП, бо драбіла сілы апазіцыі. ПДС і Партыя чыстай палітыкі абвясцілі сябе партыямі сярэдняга шляху развіцця паміж манапалістычным капіталізмам і сацыялізмам.

У верасні 1965 г. прэм'ер-міністр Сата абвясціў аб роспуску сваёй фракцыі і звярнуўся да іншых фракцыйных лідэраў з прапановай зрабіць тое ж самае. Але фракцыі ўнутры ЛДП ліквідаваць не ўдалося. Справа ў тым, што іх існаванне мела аб'ектыўную аснову. У Японіі буйная буржуазія пайшла на стварэнне адзінай партыі, а фракцыі ўнутры яе адлюстроўвалі разыходжанні паміж рознымі пластамі буржуазіі. Акрамя таго, захаванню фракцый садзейнічала і японская патэрналісцкая традыцыя. ЛДП, нягледзячы на з'яўленне новых партый, у другой палове 60-х гг. упэўнена кантралявала парламент. На выбарах у палату дэпутатаў у 1967 г. яна атрымала 277 месцаў, у 1969 г. – 288. Яўную перавагу сярод апазіцыйных партый мела СПЯ. У 1967 г. на выбарах у палату дэпутатаў яна атрымала 140 месцаў. Але ў канцы 60-х гг. яе пазіцыі аслаблі, і ў 1969 г. яна атрымала на аналагічных выбарах толькі 90 месцаў. Няўдачы СПЯ многія яе лідэры тлумачылі тым, што яна праводзіла празмерна левую палітыку і супрацоўнічала з КПЯ.

У знешняй палітыцы ў 60-я гг. Японія ўсё больш імкнулася да ўмацавання сваіх пазіцый у Азіі. Яна нармалізавала ў 1965 г. адносіны з Паўднёвай Карэяй. У 1966 г. Японія была ў ліку заснавальнікаў Арганізацыі Азіяцка-Ціхаакіянскага пакта, якая мела на ўвазе развіццё перш за ўсё эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі рэгіёна. У 1972 г. урад Танака пайшоў на нармалізацыю адносін з КНР, разлічваючы на пранікненне на велізарны кітайскі рынак. На шляху паспяховага развіцця адносін з СССР стаяла праблема "паўночных тэрыторый".

У цэлым, да пачатку 1970-х гг. Японіяператварылася ў адзін з трох буйнейшых цэнтраў сусветнага капіталізму. У 1970 г. на Японію прыходзілася 10,1% сусветнай капіталістычнай прамысловай вытворчасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і яна заняла 2-е месца сярод капіталістычных краін па гэтым паказчыку. Сацыяльна-палітычнае развіццё Японіі вызначалася высокай ступенню стабільнасці, якая грунтавалася на панаванні ЛДП у палітычным жыцці краіны пры захаванні шматпартыйнасці і палітычнага плюралізму.

2 Сусветны эканамічны крызіс 1973 – 1975 гг., хоць ад яго Японія пацярпела менш, чым іншыя капіталістычныя краіны, паказаў, што слабым месцам прамысловасці Японіі з'яўляецца яе вялікая залежнасць ад пастаўкі прыродных рэсурсаў з-за мяжы. Пакуль цэны на сыравіну былі нізкімі, японская эканоміка развівалася паспяхова. Цяпер дарагая сыравіна магла стаць вялікім тормазам на шляху далейшага росту эканомікі Японіі. Ужо ў першай палове 70-х гг. стала відавочна, што такі фактар, як танная рабочая сіла, больш не можа спрыяць развіццю японскага экспарту. Перыядычна ўспыхвалі гандлёвыя войны з ЗША і ЕЭС. Каб захаваць высокія тэмпы эканамічнага росту, Японія пайшла на структурную перабудову эканомікі. Стаўка была зроблена на развіццё навукаёмістых і высокатэхналагічных галін, на безадходную вытворчасць, якія не патрабавалі вялікіх затрат сыравіны, энергіі, рабочай сілы. Вялікая ўвага надавалася навукова-вытворчым даследаванням, куды ўкладаліся вялікія сродкі. Значна ўзрасла роля сферы паслуг. Перабудова прамысловасці аблягчалася тым, што ў Японіі існавала вялікая колькасць дробных і сярэдніх фірм, здольных лёгка пераключыцца з выпуску аднаго тавару на другі. Буйныя фінансава-прамысловыя групы маюць шматгаліновую структуру, а гэта забяспечвае свабоду манеўра пры структурнай перабудове, пры пераходзе з вытворчасці аднаго віду тавараў на другі. Эканамічны крызіс 1980-1982 гг. даў новы штуршок рэфармаванню японскай эканомікі. Да канца 80-х гг. структурная перабудова японскай эканомікі завяршылася.

Паступальнае развіццё японскай эканомікі было прыпынена ў 1992 г., калі ўвесь капіталістычны свет перажыў цыклічны спад у экано-міцы. У 1991-1993 гг. узровень прамысловай вытворчасці знізіўся на 10,5%. Некаторае ажыўленне японскай эканомікі абазначылася ў 1994 г., аднак яно аказалася нязначным. Перадкрызісны ўзровень вытворчасці не ўдалося аднавіць да канца 1997 г. У гэты час разразіўся ўсходнеазіяцкі фінансавы крызіс, які адмоўна паўплываў на эканоміку Японіі. Цяжкасці ў развіцці японскай эканомікі даюць падставы многім эканамістам гаварыць, што Японіі не ўдалося дасягнуць устойлівага эканамічнага росту з упорам на ўнутраны попыт. Яны бачаць прычыны эканамічных праблем Японіі ў 90-я гг.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

XX ст. у шырокай дзяржаўнай рэгламентацыі. Японская эканоміка працягвала развівацца на неакейнсіянскіх прынцыпах. Нягледзячы на яўныя праблемы ў эканамічным развіцці Японіі ў 80-90-я гг., яна, безумоўна, заставалася адным з буйнейшых эканамічных і фінансавых цэнтраў свету. У сярэдзіне 90-х гг. валютныя рэзервы японскіх банкаў склалі каля 130 млрд. долараў. У 1995 г. доля японскіх крэдытаў у свеце раўнялася 53%. Японія мае велізарныя магчымасці для развіцця найноўшых тэхналогій. Яна выдзяляе на навуковыя распрацоўкі каля 3,5 % ВУП, над імі працуюць каля 350 тыс. вучоных і інжынераў. Японская эканоміка ў вялікай ступені працуе па безадходным цыкле. Рашаючую ролю ў развіцці навейшых тэхналогій адыгрываюць дробныя і сярэднія прадпрыемствы. У канцы 80-х – 90-я гг. адбыліся змены ў знешнеэканамічнай дзейнасці Японіі. ЗША паступова страцілі ролю яе галоўнага эканамічнага партнёра. У 90-я гг. японскі экспарт у Азію перавысіў экспарт у ЗША. Такая ж тэндэнцыя назіраецца і ў імпарце (у 1993 г. складалі Азія – 60 млрд. $, ЗША – 50 млрд. $, ЕС – 24 млрд. $, Кітай – 37,8 млрд. $ у японскім імпарце). Японія, як і раней, пераўзыходзіць іншыя развітыя краіны па інтэнсіўнасці працы. На большасці прадпрыемстваў існуе шасцідзённы рабочы тыдзень. Сярэдняя фактычная працягласць водпуску – 6-7 дзён. Японія – адзін з лідэраў па працягласці жыцця – 76,09 гадоў у мужчын і 82,22 гады ў жанчын. Некаторыя змены зведала ў 80 – 90-я гг. сацыяльная сфера. Японскія фірмы ўжо адыходзяць ад прынцыпу пажыццёвага найму рабочай сілы, ад прынцыпу аплаты па старшынству, калі галоўным крытэрыем пры вызначэнні заработнай платы быў стаж работы, а не колькасць і якасць працы. У сувязі з новымі ўмовамі найму рабочай сілы некалькі актывізаваўся прафсаюзны рух. У 1987 г. узнікла Агульнаяпонская федэрацыя рабочых прыватных кампаній.

Значныя змены назіраліся ў палітычным жыцці краіны. З 1955 г. манаполію на ўладу захоўвала ЛДП. Такая сітуацыя паступова вяла да росту карумпіраванасці і закасцянеласці сярод правячай эліты. Пачынаючы з 70-х гг., Японія перажыла цэлую серыю скандалаў, якія былі звязаны з карупцыяй у радах правячай партыі. Аднак, нягледзячы на гэта, ЛДП змагла да пачатку 90-х гг. утрымацца на чале ўлады. Эканамічны крызіс 1974 – 1975 гг. прывёў да некаторага аслаблення яе пазіцый. Гэта, у прыватнасці, прадэманстравалі выбары 1974 г. у палату саветнікаў, у выніку якіх ЛДП страціла 8 месцаў. У такім становішчы ўрад Мікі, які прыйшоў да ўлады ў 1974 г., абвясціў, што найважнейшая мэта яго палітыкі – гэта аднаўленне страчаных пазіцый

ЛДП праз наданне партыі "новага абліча". Прэм'ер-міністр выказаўся за дыялог з апазіцыяй. ПДС і СПЯ аб'явілі аб гатоўнасці супрацоўнічаць з уладаю, пакуль яна прытрымліваецца палітыкі дыялогу з апазіцыяй. Дэпутаты парламента ад названых партый падтрымалі некаторыя ўрадавыя законапраекты. Аднак ЛДП перапыніла супрацоўніцтва з апазіцыяй восенню 1975 г., калі эканамічны крызіс быў практычна пераадолены і для ЛДП адпала патрэба ў дыялогу з апазіцыяй. У лютым 1978 г. многія вядомыя дзеячы ЛДП былі абвінавачаны ў атрыманні хабару ад амерыканскай авіякампаніі "Локхід". Вынікам скандалу стала тое, што на выбарах у студзені 1978 г. ЛДП страціла абсалютную большасць у палаце дэпутатаў. У ліпені 1978 г. аналагічная сітуацыя склалася пасля выбараў у палату саветнікаў. У такой сітуацыі ЛДП зноў праявіла гатоўнасць да супрацоўніцтва з партыямі цэнтрысцкай апазіцыі, што праявілася ў час мясцовых выбараў 1979 г. У пачатку 80-х гг. гэтае супрацоўніцтва было перапынена. ЛДП атрымала буйную перамогу на выбарах у абедзве палаты парламенту ў жніўні 1980 г. і ўжо не адчувала патрэбы ў супрацоўніцтве з апазіцыяй. Пасля гэтага ПДС, ПЧП, СПЯ заключаюць пагадненне аб намеры адабраць уладу ў ЛДП і ўтварыць кааліцыйны ўрад. Новы моцны ўдар па прэстыжу правячай партыі нанёс эканамічны крызіс, які пачаўся ў 1981 г. У выніку датэрміновых парламенцкіх выбараў ў студзені 1983 г. ЛДП страціла абсалютную большасць у палаце дэпутатаў. Упершыню пасля 1955 г. у Японіі быў сфарміраваны кааліцыйны ўрад (адзін міністэрскі партфель атрымаў прадстаўнік партыі Ліберальны клуб).

Другая палова 80-х гг. азнаменавалася пачаткам істотных перамен у партыйна-палітычнай сістэме Японіі. В 1986 г. СПЯ прыняла дэкларацыю, якая аб'явіла курс на абнаўленне партыі. З праграмных дакументаў СПЯ знікаюць усялякія напаміны аб сацыялістычнай рэвалюцыі. Эвалюцыя партыі ў бок еўрапейскай сацыял-дэмакратыі была пацверджана і яе перайменаваннем у 1991 г. у Сацыял-дэмакратычную партыю Японіі (СДП). Прыкладна ў гэты ж час з крызісам сутыкнулася ЛДП. Палітычнае жыццё Японіі ўзрушыла новая серыя скандалаў, звязаных з карупцыяй буйных палітыкаў з правячай партыі. Летам 1993 г. ЛДП пацярпела адноснае паражэнне на выбарах у палату дэпутатаў і страціла абсалютную большасць у ёй. Акрамя таго, у ЛДП адбыўся чарговы раскол. З яе выйшла група Хата – Адзавы. У выніку гэтых падзей ЛДП упершыню з 1955 г. Страціла ўладу. У жніўні 1993 г. быў сфарміраваны кааліцыйны ўрад, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі 7 апазіцыйных раней партый. Прэм'ерам стаў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Хасакава, якога ў кастрычніку 1994 г. змяніў Хата. У гэты час рэзка змяніла свой палітычны курс СДП. Яна доўгі час выступала ў ролі галоўнага апанента ЛДП, а летам 1994 г. пайшла на зблiжэнне з ёю, і ў кастрычніку 1994 г. быў сфарміраваны кабінет з прадстаўнікоў ЛДП і СДП. Да зблiжэння з ЛДП сацыял-дэмакратаў штурхала страта папулярнасці ў масах. На выбарах 1993 г. яны атрымалі толькі 70 месцаў у палаце дэпутатаў замест ранейшых 134. СДП уступіла ў паласу крызісу і страціла ролю другой партыі краіны. Асноўнай сілай апазіцыі цяпер становіцца Партыя новых рубяжоў (ПНР). У яе ўвайшлі Партыя чыстай палітыкі, Партыя дэмакратычнага сацыялізму і шэраг груповак, якія адкалоліся ад ЛДП. Лідэрам новай партыі стаў Кайфу. Яна адразу мела ў ніжняй палаце парламенту 178 месцаў з 511. Асноўнымі ідэямі яе праграмы былі барацьба з карупцыяй, павышэнне ролі простага чалавека ў кіраванні краінай, актывізацыя Японіі на міжнароднай арэне. Упершыню была створана ліберальная партыя, здольная канкурыраваць з ЛДП. СДП ва ўмовах кааліцыі з ЛДП пра-цягвала страчваць свой уплыў. У яе засталося толькі 15 месцаў у па-лаце дэпутатаў. 1 лютага 1998 г кааліцыя ЛДП – СДП распалася.

25 снежня 1994 г. у Японіі быў прыняты новы выбарчы закон. Ён увёў выбарчую сістэму, якая дае перавагу буйным партыям. У ліпені 1995 г. адбыліся выбары ў палату саветнікаў. Здавалася, апазіцыя ўмацоўвае свае пазіцыі. ПНР павялічыла сваё прадстаўніцтва ў гэтай палаце. Але выбары ў ключавую палату дэпутатаў у кастрычніку 1996 г. прынеслі перамогу ЛДП. Рэйтынг ПНР стаў імкліва падаць. У ёй у верасні 1996 г. адбыўся раскол. Партыю пакінуў адзін з заснавальнікаў Ц.Хата і каля 40 дэпутатаў парламента. Затым ПНР пакінула група М.Хасакавы. Новы лідэр ПНР Адзава ўнёс змены ў яе палітыку і імкнуўся да супрацоўніцтва з ЛДП. Далёка не ўсе ў партыі былі з гэтым згодныя. Вострая ўнутрыпартыйная барацьба і падзенне рэйтынгу ПНР прывялі да таго, што Адзава 27 снежня 1997 г. заявіў аб яе роспуску. ПНР распалася на 6 груповак, буйнейшай з якіх была Ліберальная партыя пад кіраўніцтвам Адзавы. Яна прапаведуе «новы кансерватызм», прынцып «малога ўрада». Заметнай палітычнай сілай у Японіі з'яўлялася ўзнікшая ў 1996 г. Дэмакратычная партыя, пад кіраўцтвам Н.Кона. Яму ўдалося наладзіць супрацоўніцтва з групай невялікіх партый і стварыць апазіцыйную кааліцыю ў ніжняй палаце парламенту з 97 дэпутатаў. У кааліцыю ўвайшла і заснаваная Хата Партыя дэмакратычнай палітыкі. Кааліцыя прапаведавала праграму змяншэння дзяржаўнага рэгулявання эканомікі пры захаванні шырокіх са-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цыяльных гарантый. У красавіку 1998 г. партыі, якія ўваходзілі ў кааліцыю, арганізаваліся ў новую Дэмакратычную партыю (ДПЯ) на чале з Кона. Выбары ў палату саветнікаў 12 ліпеня 1998 г. прынеслі поспех ДПЯ (+ 7 месцаў, усяго – 47). ЛДП страціла 15 месцаў (засталося 103). Пасля гэтай няўдачы лідэр ЛДП Хасімота падаў у адстаўку. Новым прэм’ер–міністрам стаў К.Абуці. Яго ўрад сутыкнуўся з даволі моцнай апазіцыяй у парламенце на чале з ДПЯ. Таму восенню 1998 г. ЛДП пайшла на кааліцыю з Ліберальнай Партыяй Адзавы, якая атрымала адно месца ў кабінеце Абуці. Перад кааліцыяй стаяла задача вывесці краіну з фінансавага крызісу. Гэта аказалася даволі складанай задачай. У краіне нарастала незадавальненне правячай вярхушкай. У выніку да кіраўніцтва ЛДП прыйшло новае пакаленне палітыкаў на чале з Дз.Куідзумі. Вясной 2001 г. ён стаў лідэрам правячай ЛДП і прэм’ер-міністрам краіны. Але і ўрад Куідзумі змог толькі ў 2004 г. дабіцца значнага эканамічнага росту. У гэтым жа годзе адбыліся парламенцкія выбары, на якіх правячая кааліцыя на чале з Ліберальна-дэмакратычнай партыяй заваявала 275 месцаў з 480 у палаце дэпутатаў. Умацавала свае пазіцыі асноўная апазіцыйная Дэмакратычная партыя, якая атрымала177 дэпутацкіх мандатаў замест ранейшых 137 у ніжняй палаце парламенту. Яшчэ ў кастрычніку 2003 г. да Дэмакратычнай партыі далучылася Ліберальная партыя Адзавы.

Імператар у сучаснай Японіі не мае рэальнай улады, але многія японцы з вялікай павагаю адносяцца да гэтага інстытута. У 1989 г. памёр імператар Хірахіта. Трон заняў Акіхіта. У 1977 г. Хірахіта заявіў, што ён пасля вайны не адмаўляўся ад тэзіса аб боскім паходжанні імператара. У 80-я гг. загучалі на самым высокім узроўні заклікі аднавіць імператарскую сістэму.

Адным з цэнтральных момантаў знешняй палітыкі Японіі з сярэдзіны 70-х гг. становіцца наладжванне эканамічнага супрацоўніцтва з суседнімі краінамі Азіі. У рамках гэтага курса ў жніўні 1978 г. на нарадзе кіраўнікоў урадаў краін АСЕАН прэм’ер-міністр Японіі паабяцаў краінам рэгіёна вялікую эканамічную дапамогу. У гэты ж час паспяхова развіваюцца кітайска-японскія адносіны. 12 жніўня 1978 г. Рэспубліка Карэя і Японія падпісалі дагавор аб міры і дружбе. Аднак пры гэтым прэм’ер-міністр Фукуда падкрэсліў, што аснова японскай знешняй палітыкі – саюз з ЗША. У 1981 г. прайшлі перамовы прэм’ер-міністра Судзукі і прэзідэнта Р.Рэйгана ў Вашынгтоне, якія прадэманстравалі супадзенне пазіцый бакоў па найважнейшых міжнародных праблемах. Ва ўмовах жорсткага супрацьстаяння з СССР, Японія ўсяляк падкрэслівала сваю прыналежнасць да заходняга свету.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Яна праводзіла палітыку санкцый у дачыненні да СССР. Але ўжо з 1984 г. яна пачынае аслабляць гэтую палітыку і поўнасцю адмаўляецца ад яе з пачаткам у СССР перабудовы.

У 80 – 90-я гг. ХХ ст. як у Японіі, так і за яе межамі шырока выказвалася думка, што на фоне вялікай эканамічнай магутнасці краіна адыгрывае невялікую ролю ў міжнародных справах і яе трэба прывесці ў адпаведнасць з японскім эканамічным патэнцыялам. Амаль усе вядучыя палітычныя сілы Японіі адвяргаюць шлях ператварэння яе ў ваенную звышдзяржаву. Японскі ўрад імкнецца дасягнуць росту ўплыву ў свеце за кошт выкарыстання палітычных сродкаў, метадаў эканамічнай дыпламатыі. Ператварэнне Японіі ў сусветную дзяржаву звязана з актывізацыяй яе ўдзелу ў вырашэнні міжнародных эканамічных праблем. Вялікую дапамогу Японія аказвае краінам, якія развіваюцца. У рамках ААН Японія імкнецца актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні глабальных праблем. Рэальным інструментам павышэння ролі Японіі ў свеце можа стаць рэформа ААН, у выніку якой Японія хоча атрымаць пастаяннае месца ў Савеце Бяспекі. У час вайны ў Іраку, якая пачалася ў 2003 г., японскія войскі ўпершыню пасля 1945 г. прынялі ўдзел у баявых дзеяннях за межамі Японіі.

3 Да ліку новых індустрыяльных краін Паўднёва-Усходняй і Усходняй Азіі першага эшалона адносяць Паўднёвую Карэю, Тайвань, Сінгапур, Ганконг. Хуткі эканамічны ўздым у гэтых краінах пачаўся ў 1960-я гг. Карэя ў гады другой сусветнай вайны была вызвалена савецкімі і амерыканскімі войскамі з-пад улады Японіі. Падзел Карэі на савецкую і амерыканскую зоны акупацыі паклаў пачатак расколу краіны. СССР адмовіўся супрацоўнічаць з Часовай камісіяй ААН па Карэі, якая павінна была кантраляваць агульнанацыянальныя выбары. На поўдні Карэі ЗША аказвалі ўсялякую дапамогу свайму стаўленіку Лі Сын Мыну. Калі стала бачна, што правядзенне агульнакарэйскіх выбараў з'яўляецца немагчымым, амерыканская акупацыйная ўлада правяла іх у 1948 г. толькі ў Паўднёвай Карэі. Абраны Нацыянальны сход абвясціў стварэнне Рэспублікі Карэя (РК), пасаду прэзідэнта заняў Лі Сын Ман. У жніўні 1948 г. выбары прайшлі на поўначы Карэі, і была створана Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка(КНДР). Раскол краіны замацавала вайна 1950-1953 гг. Яе ўзнікненню спрыяла тая канфрантацыя, якая ўсталявалася ў свеце ва ўмовах "халоднай вайны". Каб аб'яднаць Карэю, урад Кім Ір Сена 25 чэрвеня 1950 г. пачаў вайну супраць РК. Савет Бяспекі ААН прызнаў КНДР агрэсарам і накіраваў супраць яе міжнародныя войскі, у асноўным з амерыканскіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

салдат. На дапамогу КНДР прыйшлі СССР і КНР. Кровапралітная вайна не прынесла перамогі нікому з бакоў.

Пасля вайны 1950-1953 гг. эканоміка Паўднёвай Карэі знаходзілася ў глыбокім крызісе. Уласнасць японскага капіталу была нацыяналізавана, у выніку чаго ўзнік буйны дзяржаўны сектар. У сельскай гаспадарцы пераважала памешчыцкае землеўладанне, а 75% сялян былі арандатарамі. В 1950 г. пачалася аграрная рэформа, меўшая сваёй мэтай надзяленне сялян зямлёй, якая выкупалася ў памешчыкаў. 200 тыс. сялянскіх гаспадарак атрымалі зямлю. Частка сялян у новых умовах гаспадарання разарылася, у выніку чаго павялічылася колькасць свабодных рабочых рук. Другія сяляне сталі фермерамі. Грошы, якія атрымалі памешчыкі пры выкупе зямлі, яны накіравалі на развіццё прамысловасці. Для дасягнення фінансавай стабілізацыі ў 1953 г. была праведзена грашовая рэформа. У 1960 г. улады РК прыйшлі да высновы, што для пераадолення эканамічай адсталасці і беднасці неабходна правесці хуткую індустрыялізацыю краіны. Асноўнай перашкодай для гэтага былі вузкі ўнутраны рынак і недахоп капіталу. Таму стаўка рабілася на развіццё экспарту і замежныя інвестыцыі. Для заваявання сусветных рынкаў РК выкарыстоўвала таннасць сваёй рабочай сілы. Асноўную частку экспарту складалі тавары лёгкай прамысловасці, вытворчасць якіх патрабавала вялікіх затрат фізічнай працы. Па меры развіцця прамысловасці структура экспарту будзе мяняцца. У 1970-я гг. галоўную ролю ў ім адыгрывала прадукцыя цяжкай прамысловасці. У 1960 г. быў прыняты закон "Аб прыцягненні прыватных замежных інвестыцый", а ў 1962 г. – "Аб гарантыях пагашэння даўгоў". У выніку гэтых мер у 1962-1966 гг. замежны капітал склаў 47,7% ад агульнай колькасці інвестыцый у эканоміку РК. Але па меры накаплення ўнутранага капіталу доля замежнага капіталу ў інвестыцыях будзе зніжацца (в 1971-1976 гг. – 20,8%). Найважнейшым кірункам эканамічнай палітыкі стала стварэнне моцных фінансава-прамысловых груп, якія пры падтрымцы дзяржавы наладзілі сучасную вытворчасць і актыўна пранікалі на сусветныя рынкі. Да 80-х гг. РК ператварылася ў сярэднеразвітую індустрыяльную дзяржаву. У 80-я гг. упор пачаў рабіцца на развіццё высокатэхналагічных галін. Краіна выходзіць на перадавыя пазіцыі ў электроніцы, суднабу-даванні, вытворчасці аўтамабіляў пры эканамічным росце 8,5% у год. Праблемы ў эканоміцы пачаліся ў другой палове 1990-х гг. Яны былі звязаны з усходнеазіяцкім фінансавым крызісам 1997 г. РК звярнулася па дапамогу да МВФ і атрымала яе. Нягледзячы на крызіс канца 90-х гг., РК застаецца адным з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сусветных лідэраў у сучаснай вытворчасці і экспарце (аб'ём экспарту ў 1996 г. склаў 130 млрд. долараў).

Палітычнае развіццё РК адбывалася ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму. У 1954 г. Лі Сын Ман дабіўся папраўкі ў канстытуцыю, якая надзяляла прэзідэнта шырокімі паўнамоцтвамі. Былі прыняты законы, якія дазвалялі падаўляць апазіцыю. У такіх умовах адбыліся прэзідэнцкія выбары 1956 г. Была абвешчана перамога Лі Сын Мана, як і на наступных выбарах 1960 г. Тады апазіцыя арганізавала масавыя дэманстрацыі. 27 красавіка 1960 г. Лі Сын Ман падаў у адстаўку. Але дэмакратычнае развіццё РК было непрацяглым. 16 мая 1961 г. адбыўся ваенны пераварот, і ўсталявалася новая дыктатура генерала Пак Чжон Хі. У пачатку 1970-х гг. папулярнасць прэзідэнта падае. Узмацняецца галоўная апазіцыйная сіла – Народна-дэмакратычная партыя на чале з Кім Дэ Чжунам. Тады 17 кастрычніка 1972 г. прэзідэнт увёў ваеннае становішча. 21 лістапада 1972 г. уступіла ў сілу новая канстытуцыя, якая мела антыдэмакратычны характар. 26 кастрычніка 1979 г. Пак Чжон Хі быў забіты людзьмі з уласнага акружэння. Да ўлады прыходзіць генерал Чон Ду Хван.

У сярэдзіне 1980-х гг. Чон Ду Хван пачаў дэмакратызацыю краіны. Змены ў палітычным жыцці былі звязаны ў многім з развіццём эканомікі РК. На пачатковым этапе індустрыялізацыі моцная аўтарытарная ўлада забяспечвала грамадскую стабільнасць, што станоўча адбілася на эканоміцы. У выніку эканамічнага "цуда" быў забяспечаны рост даходаў насельніцтва, і цяпер сацыяльная стабільнасць магла быць дасягнута без рэпрэсій. У 80-я гг. у РК ужо меўся моцны сярэдні клас, для якога дэмакратычныя правы і свабоды мелі вялікую каштоўнасць. Чон Ду Хван лічыў неабходным плаўна рухацца па шляху дэмакратызацыі. Ён заявіў, што дэмакратычныя папраўкі ў канстытуцыю будуць унесены толькі пасля алімпіяды 1988 г., якая пройдзе ў Сеуле. Супраць гэтага выступіла не толькі апазіцыя, але і блізкі паплечнік прэзідэнта генерал у адстаўцы Ро Дэ У, які з'яўляўся кандыдатам у прэзідэнты ад правячай Дэмакратычнай партыі справядлівасці. Па яго ініцыятыве на рэферэндуме 27 кастрычніка 1987 г. была прынята новая канстытуцыя РК. Яна абмежавала тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў пяццю гадамі, звузіла ўладу прэзідэнта. На прэзідэнцкіх выбарах 16 снежня 1987 г. перамог Ро Дэ У. Ён прадоўжыў палітыку дэмакратызацыі ва ўнутранай палітыцы. У знешняй палітыцы былі нармалізаваны адносіны з СССР і іншымі сацыялістычнымі краінамі. Дзякуючы гэтаму РК адначасова з КНДР у верасні 1990 г. была прынята ў ААН.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ро Дэ У змог дабіцца ў студзені 1991 г. стварэння новай правячай Дэмакратычнай ліберальнай партыі. У склад новай партыі ўвайшлі Кім Ен Сам і некаторыя іншыя вядомыя апазіцыйныя раней палітыкі. Менавіта Кім Ен Сам атрымаў перамогу на прэзідэнцкіх выбарах 1993 г. Наступныя выбары, якія прайшлі ў снежні 1997 г., прынеслі перамогу апазіцыі, і пасаду прэзідэнта заняў яе лідэр Кім Дэ Чжун. Ён абвясціў палітыку "сонечнага святла" ў адносінах да КНДР. Яе вынікам стала сустрэча Кім Дэ Чжуна з лідэрам КНДР Кім Чэн Ірам 13 чэрвеня 2000 г. Аднак у далейшым адносіны паміж дзвюма Карэямі зноў значна пагоршыліся.

Рэшткі Гаміньдана, які пацярпеў паражэнне ў грамадзянскай вайне з Камуністычнай партыяй Кітая (КПК), перабраліся на Тайвань. Тут Чан Кайшы пачаў будаваць новую дзяржаву на аснове 3-х народных прынцыпаў Сунь Ятсена і яго ідэі аб пяці галінах улады. Першым буйным эканамічным мерапрыемствам Гаміньдана на Тайвані была аграрная рэформа, якая пачалася ў 1951 г. Яна прывяла да ліквідацыі памешчыцкага землеўладання і стварэння шматлікіх гаспадарак фермераў. Прамысловасць Тайваня да 1958 г. развівалася на аснове імпартазамяшчэння. Гэты шлях паказаў сваю неэфектыўнасць. У канцы 1950-х гг. Тайвань пераходзіць да экспартнай мадэлі эканамічнага развіцця. У паспяховым эканамічным развіцці Тайваня важную ролю іграла эфектыўная палітыка дзяржаўнага рэгулявання. Дзяржаўны сектар у прамысловасці ў 1952 г. складаў 56,6%. Урад Чан Кайшы праводзіў палітыку паступовай дэнацыяналізацыі. Яшчэ ў 1985 г. доля дзяржавы ў прамысловасці складала 16,1%. Для эканомікі Тайваня характэрна планаванне, якое мае прагнозны характар. Дзяржава актыўна рэгулюе прыток замежных інвестыцый, накіроўвае іх у найбольш перадавыя сферы эканомікі. У пачатку 60-х гг. XX ст. асноўным кірункам эканамічнай палітыкі стала стымуляванне экспарту. У 1964-1971 гг. ён узрастае ў сярэднім за год на 24,9%, а ў 1971-1984 гг. – на 22,9%. Тайвань пачаў пранікаць на сусветныя рынкі з экспарту тэкстылю. У 1980-я гг. на першы план у экспарце выходзіць прадукцыя электронікі. Дзякуючы высокім тэмпам развіцця эканомікі Тайвань у сярэдзіне 80-х гг. увайшоў у лік індустрыяльных краін. На долю прамысловасці ў той час прыходзілася 45,4% валавога нацыянальнага прадукта, на долю сельскай гаспадаркі – 7,6%, сферы паслуг – 47%. З сярэдзіны 80-х гг. асноўным прыярытэтам у развіцці эканомікі Тайваня сталі навукаёмістыя галіны. Дзяржава ад 15 да 20% бюджэтных сродкаў стала накіроўваць на развіццё навукі, адукацыі і культуры. У канцы 1980-х - першай палове 1990-х гг. сярэднегадавы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прырост унутранага валавога прадукта перавышаў 7% у год. Валютныя рэзервы краіны склалі 74 млрд. долараў. Усходнеазіяцкі крызіс фінансаў не аказаў істотнага ўплыву на эканоміку Тайваня.

На працягу доўгага часу на Тайвані фактычна існавала аднапартыйная сістэма. Дзве мясцовыя партыі не мелі вялікага ўплыву і не стваралі канкурэнцыі Гаміньдану. Аснавай яго палітыкі быў анткамунізм. У арміі існаваў інтстытут паліткамісараў, насельніцтва было ахоплена сеткаю разнастайных арганізацый, якія знаходзіліся пад кантролем партыі і дзяржавы. У 1975 г. Чан Кайшы памёр. Яго пераемнікам на пасадзе прэзідэнта і лідэра Гаміньдана стаў Цзян Цзынго. Новы прэзідэнт дазволіў дзейнасць ліберальнай апазіцыі. Змена ўлады на Тайвані парадзіла ў КНР надзеі на мірнае аб'яднанне краіны. Быў вылучаны лозунг: “Адна дзяржава - дзве сістэмы”. Але на 12 кангрэсе ў 1981 г. Гаміньдан адхіліў ідэю аб'яднання Тайваня з КНР.

У сярэдзіне 1980-х гг. унутры Гаміньдана ўзмацняецца ўплыў групы маладых дзеячаў на чале з Лі Дэнхуэем, якія выступілі з ідэяй рэфармавання палітычнай сістэмы краіны. У 1987 г. было адменена надзвычайнае становішча, грамадзяне Тайваня атрымалі свабоду выезду за граніцу, была дазволена дзейнасць палітычных партый і адменена цэнзура. Пасля смерці Цзян Цзынго ў 1988 г. кіруючыя пасады ў партыі і дзяржаве заняў Лі Дэнхуэй. Асноўнай апазіцыйнай сілай стала Дэмакратычная прагрэсіўная партыя (ДПП). Яна выступала за стварэнне на востраве незалежнай дзяржавы, у адрозненне ад Гаміньдана, які прэтэндуе на ўладу ва ўсім Кітаі. Важным крокам на шляху Тайваня ад аўтарытарызму да дэмакратыі стала правядзенне ў 1996 г. першых усеагульных прэзідэнцкіх выбараў. Перамог на іх Лі Дэнхуэй. У 1990-я гг. вялікую вастрыню мела пытанне аб'яднання Тайваня з КНР. Перамовы па гэтым пытанні, якія вяліся з 1992 па 1996 г., не далі выніку. Пасля гэтага на Тайвані ўзмацніліся пазіцыі тых, што выступалі за стварэнне на востраве юрыдычна незалежнай дзяржавы. 1 снежня 2001 г. на прэзідэнцкіх выбарах перамагла апазіцыйная ДПП, якая выступіла за абвяшчэнне незалежнасці Тайваня. Пасаду прэзідэнта заняў Чай Шуй Бянь. Тым самым быў пакладзены канец працягламу праўленню Гаміньдана на Тайвані.

Ганконг займае выгаднае геаграфічнае становішча і яшчэ ў XIX ст. вылучыўся як важны гандлёвы цэнтр. Пасля другой сусветнай вайны пачаўся хуткі эканамічны рост Ганконга. Да 80-х гг. ён становіцца буйным фінансавым і прамысловым цэнтрам. Банкаўская сістэма, сфера паслуг, электроніка занялі галоўнае месца ў эканоміцы краіны. У 1982 г. пачаліся перамовы паміж Англіяй і КНР па пытанні далу-

чэння Ганконга да КНР. Улады КНР заявілі аб захаванні ў Ганконгу пасля аб'яднання капіталістычнай эканомікі. У 1984 г. КНР і Англія падпісалі пагадненне, па якім Ганконг 1 ліпеня 1997 г. увайшоў у склад КНР як Асобы адміністрацыйны раён. У апошнія гады свайго праўлення ў Ганконгу Англія правяла шэраг дэмакратычных рэформаў. У 1991 г. былі прыняты законы, якія гарантавалі правы і свабоды грамадзян. У 1995 г. адбыліся дэмакратычныя выбары, у выніку якіх былі сфарміраваны органы самакіравання. Гэтая сістэма захавалася і пасля ўваходжання Ганконга ў склад КНР.

Сінгапур стаў незалежнай дзяржавай 9 жніўня 1965 г. Да гэтага ён з'яўляўся англійскай калоніяй, а з 1963 па 1965 г. уваходзіў у склад Федэрацыі Малайзія. За гады незалежнасці Сінгапур дабіўся выдатных эканамічнх поспехаў. Ён ператварыўся ў найбуйнейшы гандлёвы і фінансавы цэнтр. Па ўзроўню камп'ютэрызацыі ён займаў на мяжы стагоддзяў другое месца ў свеце пасля Японіі. Даход на душу насельніцтва ў 1999 г. склаў 25 тыс. долараў. Усходнеазіяцкі крызіс слаба закрануў Сінгапур. Пераадоленне эканамічных праблем урад Сінгапура звязвае з лібералізацыяй эканомікі. Найбуйнейшай палітычнай сілай Сінгапура з моманту атрымання незалежнасці з'яўляецца Партыя народнага дзеяння. Яе лідэр Лі Куан Ю з 1965 г. да сваёй смерці ў 1991 г. займаў пасаду прэм'ер-міністра. У Сінгапуры сфарміраваўся культ асобы "заснавальніка дзяржавы" Лі Куан Ю. У краіне дзейнічала некалькі апазіцыйных партый, але ні адна з іх не магла скласці канкурэнцыі Партыі народнага дзеяння.

Такім чынам, чацвёрка “азіяцкіх драконаў” дабілася ў апошнія гады выдатных поспехаў у развіцці эканомікі. Але ўсходнеазіяцкі крызіс 1997 г. паставіў пад сумненне тую мадэль развіцця, якую яны выкарыстоўвалі. Для яе характэрна стварэнне “цяплічных” умоў для ўласных вытворцаў. Дробны бізнес часта станавіўся ахвяраю буйнога бізнесу, які меў падтрымку дзяржавы. Пераадоленне гэтых адмоўных з'яў бачыцца кіраўніцтву названых краін на шляху далейшай лібералізацыі эканамічных адносін. Гэта, у прыватнасці, прадугледжвае эканамічная праграма, якую ў лютым 1998 г. пачала ажыццяўляць РК.

Тайланд, Малайзія, Філіпіны і Інданезія адносяцца да ліку краін, якія склалі “другі эшалон” новых індустрыяльных дзяржаў. Больш высокімі тэмпамі развіваюцца Малайзія і Тайланд. 70-80-я гг. XX ст. сталі часам хуткага развіцця працаёмістых галін эканомікі гэтых краін. З сярэдзіны 1980-х гг. сітуацыя мяняецца. Тайланд і Малайзія развіваюць навукаёмістую вытворчасць. У справе структурнай перабудовы эканомікі вырашальная роля адводзіцца дзяржаве. У Малайзіі

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

на дзяржаву прыходзілася 90% выдаткаў на навукова-тэхнічныя даследаванні, у Тайландзе - 80%. У выніку былі створаны радыётэхнічная і іншыя сучасныя галіны вытворчасці. Ужо ў канцы 80-х гг. доля электронікі ў экспарце Малайзіі склала 27,4%. У 1990-1997 гг. гадавы прырост ВУП у Малайзіі склаў больш 8% у год, у Тайландзе выпуск прамысловай прадукцыі ў гэты перыяд вырастаў на 11% у год. Абедзве гэтыя дзяржавы ў першай палове 1990-х гг. праводзілі палітыку лібералізацыі эканомікі. Эканамічнае развіццё Філіпін адбывалася больш плаўна. Сельская гаспадарка заставалася вядучай галіною эканомікі. Захаванне памешчыцкага землеўладання і іншых архаічных элементаў аграрных адносін тармазіла развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці. У прамысловасці да пачатку 90-х гг. XX ст. рашаючую ролю іграла працаёмістая вытворчасць. У 90-я гг. паскорыліся тэмпы эканамічнага росту і індустрыялізацыі Філіпін. У 1992-1996 гг. рост ВУП склаў 5-7% у год. Пры гэтым назіралася тэндэнцыя змяншэння ролі дзяржавы ў эканоміцы. Усходнеазіяцкі крызіс 1997 г. нанёс значны ўдар па эканоміцы Тайланда, Малайзіі і Філіпін. Асабліва пацярпеў прыватны сектар. Спад вытворчасці склаў 10%. Краіны рэгіёна пайшлі на дэвальвацыю нацыянальных валют. Выхад з крызісу Тайланд і Філіпіны шукалі ў партнёрстве з МВФ і ў далейшай лібералізацыі эканомікі. Малайзія, наадварот, адмовілася ад супрацоўніцтва з МВФ і ўзяла курс на ўзмацненне дзяржаўнага кантролю над эканомікай, асабліва за фінансавымі патокамі.

У 1957 г. англійская калонія Малайя атрымала незалежнасць, а ў 1963 г. было аб'яўлена аб стварэнні Федэрацыі Малайзія. Яна аб'яднала 13 штатаў, 9 з якіх з'яўляліся княствамі са спадчыннаю ўладаю султанаў. Султаны са свайго складу выбіраюць кіраўніка краіны. Іслам быў абвешчаны дзяржаўнай рэлігіяй. Малайзійская Федэрацыя сутыкнулася з вострымі нацыянальнымі праблемамі. Супярэчнасці паміж рознымі нацыянальнасцямі краіны прывялі да распаду ў 1969 г. Саюзнай партыі, якая аб'ядноўвала прадстаўнікоў розных этнічных груп і іграла ролю кансалідуючай сілы ў грамадстве. З мэтаю захавання адзінства краіны група палітыкаў на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Абдул Разанам пайшла на абвяшчэнне надзвычайнага становішча. Была распрацавана новая ідэалагічная дактрына будаўніцтва Малайзійскай Федэрацыі. Яна была абнародавана ў 1970 г. і атрымала назву "Асновы дзяржавы". Яна ўключала наступныя прынцыпы: вера ў бога і цярпімасць да другіх рэлігій; патрыятызм і адданасць манархіі; выкананне законаў і маральных норм; павага да канстытуцыі. Падразумявалася таксама вырашэнне пытання фарміравання адзінай малай-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зійскай нацыі без адрозненняў у веры і этнічнай прыналежнасці. Новая ідэалогія выступіла як альтэрнатыва заходняй ліберальнай дэмакратыі, якая не прыжылася ў Малайзіі. Надзвычайнае становішча ў краіне было адменена, і ў 1974 г. прайшлі парламенцкія выбары. Перад выбарамі А.Разан выступіў з ідэяй міжпартыйнага супрацоўніцтва, і шэраг партый стварылі Нацыянальны фронт, які і перамог на выбарах. Пасля гэтага намячаецца яўная тэндэнцыя да кансалідацыі грамадства. Актыўную ўзброеную барацьбу супраць урада працягвалі толькі камуністы і ісламскія фундаменталісты. Палітычнае развіццё Малайзіі пасля крызісу пачатку 70-х гг. адны гісторыкі разглядалі як альтэрнатыву заходняй дэмакратыі, другія бачылі ў ім прыклад паспяховай мадэрнізацыі традыцыйнага грамадства. Палітычныя наступствы, якія выклікаў фінансавы крызіс 1997 г., падарвалі пазіцыі прыхільнікаў празаходняй арыентацыі. Урад на чале з прэм'ер-міністрам Махатры Махамадам лічыў галоўнай прычынай крызісу распаўсюджванне заходніх каштоўнасцей. У Малайзіі пачалі насаджацца антызаходнія настроі, узмацнілася прапаганда традыцыйных каштоўнасцей.

У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі ў палітычным жыцці Тайланда дамінавала аўтарытарная тэндэнцыя. У 1947 г. адбыўся ваенны пераварот, і канстытуцыйнае праўленне было ліквідавана. Пасля гэтага краіна перажыла ваенныя перавароты яшчэ ў 1957 і 1971 гг., і ваенныя доўгі час ігралі вядучую ролю ў палітычным жыцці. Толькі з 1973 г. Тайланд пачынае пераходзіць да праўлення цывільнага ўрада. У 1976 і 1977 гг. армія зноў спрабавала ўзяць уладу. На гэты раз праўленне ваенных было непрацяглым. У канцы 1978 г. была прынята новая канстытуцыя Тайланда, і ён вярнуўся да канстытуцыйнага праўлення. Але ваенныя працягвалі захоўваць моцны палітычны ўплыў. У канцы 70-х – 80-я гг. пасады прэм'ер-міністраў займалі генералы. У 1981, 1985 і 1991 гг. рабіліся спробы вярнуць Тайланд да ваеннага праўлення, але яны скончыліся няўдачай. У пачатку 90-х гг. намячаецца тэндэнцыя да стабілізацыі палітычнай сітуацыі ў краіне ў рамках парламенцкай манархіі. Вялікая заслуга ў гэтым належала каралю Адульядзету.

4 ліпеня 1946 г. Філіпіны афіцыйна атрымалі незалежнасць ад ЗША. У краіне па ўзору ЗША была ўведзена двухпартыйная сістэма: Партыя нацыяналістаў і Ліберальная партыя. Першая з іх стала правячай. Урад М.Рохаса праводзіў жорсткую антыкамуністычную палітыку, пад удар якой часта траплялі і дэмакратычныя арганізацыі, не звязаныя з камуністамі. Толькі пасля прыходу да ўлады ў 1962 г. Ліберальнай партыі палітычны рэжым некалькі змякчыўся. Былі зроблены

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

спробы правесці аграрную рэформу. Прэзідэнцкія выбары 1965 г. прынеслі перамогу кандыдату Партыі нацыяналістаў Ф.Маркасу. Спачатку ён змог заваяваць значную папулярнасць у насельніцтва за кошт правядзення папулісцкай палітыкі. Але ў пачатку 70-х гг. сталі нарастаць крызісныя з'явы ў эканоміцы, што аслабіла ўплыў прэзідэнта. Успыхвалі сялянскія паўстанні, сепаратысцкія мяцяжы мусульман. На поўдні Філіпін працягвала ўзброеную барацьбу Камуністычная партыя Філіпін. Супраць Ф.Маркаса выступіла ліберальная апазіцыя, якая групавалася вакол Партыі лібералаў на чале з Б.Акіна. Каб захаваць уладу, прэзідэнт увёў надзвычайнае становішча, адмяніў канстытуцыю, распусціў парламент і абвясціў на Філіпінах дактрыну "новага грамадства". Сутнасць яе зводзілася да імкнення павесці Філіпіны па шляху, які адрозніваецца ад капіталізму і камунізму. У сваім развіцці краіна павінна была абапірацца на ўласныя традыцыйныя каштоўнасці. Дактрына адхіляла ліберальную дэмакратыю і прыкрывала дыктатуру Маркаса. Аўтарытарны характар яго ўлады не змяніўся і пасля адмены надзвычайнага становішча ў 1981 г. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 1986 г. апазіцыя змагла аб'яднацца вакол кандыдатуры ўдавы забітага Б.Акіна К.Акіна. Маркас пацярпеў паражэнне на выбарах і з'ехаў у ЗША.

Праўленне К.Акіна ўвайшло ў гісторыю Філіпін як “новая дэмакратыя”. Прэзідэнт праводзіла палітыку, накіраваную на дэмакратызацыю грамадскага жыцця краіны. Прававую базу для гэтага стварыла прынятая ў 1987 г. канстытуцыя Філіпін. Пасля яе прыняцця прайшлі прэзідэнцкія і парламенцкія выбары. К.Акіна захавала пасаду прэзідэнта, а яе партыя Улада народу атрымала большасць месцаў у парламенце. У 1988 г. прыхільнікі К.Акіна аб'ядналіся ў рух Барацьба за філіпінскую дэмакратыю. Асноўная праблема, з якой сутыкнулася К.Акіна пры правядзенні сваёй палітыкі, - гэта спалучэнне дэмакратызацыі з захаваннем палітычнай стабільнасці. Працэс дэмакратызацыі сустракаў супраціўленне з боку прыхільнікаў Маркаса ў арміі, якія некалькі разоў рабілі спробы ваеннага перавароту. У 1992 г. прэзідэнтам стаў Ф.Рамас. Ён аб'явіў курс на паскарэнне эканамічнага развіцця. У 1994 г. была прынята праграма мадэрнізацыі Філіпін, якая прадугледжвала выхад краіны ў 2000 г. на ўзровень новых індустрыяльных краін. Але ўсходнеазіяцкі крызіс сарваў яе выкананне. Рамас змог палепшыць палітычную сітуацыю. Армія заставалася ў казармах, была легалізавана кампартыя, што садзейнічала затуханню камуністычнага партызанскага руху. У 1998 г. на прэзідэнцкіх выбарах перамог Д.Эстрада. Характэрнай рысай яго праўлення стаў разгул карупп-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цыі, у тым ліку ў бліжэйшым акружэнні прэзідэнта. Гэта прывяло да яго датэрміновай адстаўкі ў 2001 г. Тое, што яна адбылася канстытуцыйным шляхам, сведчыць пра ўмацаванне дэмакратычных інстытутаў у Філіпінах. Палітычная сітуацыя ў краіне і далей вызначалася нестабільнасцю. Летам 2005 г. узнік канфлікт паміж парламентам і прэзідэнтам Глорыяй Аройі, якую абвінавацілі ў незаконнай перамозе на прэзідэнцкіх выбарах 10 мая 2005 г.

У сярэдзіне жніўня 1945 г. у Інданезіі склалася спецыфічная сітуацыя. Японія ўжо не мела сіл, каб трымаць у падпарадкаванні Інданезію. Галандыя яшчэ не мела сіл, каб аднавіць сваё каланіяльнае панаванне. У такіх умовах нацыянальныя сілы 17 жніўня абвясцілі незалежнасць Інданезіі. Гэтая акцыя была падтрымана японскай акупацыйнай уладай. Пасаду прэзідэнта заняў лідэр нацыянальна-вызваленчага руху А.Сукарна. У верасні 1945 г. у Інданезіі высадзіліся англійскія, а затым і галандскія войскі. Яны пачалі каланіяльную вайну. Нягледзячы на ваенныя дзеянні, паміж рознымі палітычнымі сіламі Інданезійскай рэспублікі ішла вострая палітычная барацьба. Тут дзейнічала моцная камуністычная партыя (КПІ). У верасні 1948 г. урад Сукарна нанёс ўдар па КПІ, абвінаваціўшы яе, і не без падстаў, у спробе сілай захапіць уладу. Тым часам Галандыя вымушана была прызнаць бесперспектыўнасць далейшай вайны. 2 лістапада 1949 г. у Гаазе было падпісана пагадненне аб стварэнні незалежнай дзяржавы Злучаныя Штаты Інданезіі (ЗШІ). Яны ўключалі Рэспубліку Інданезію і яшчэ 6 дзяржаў на тэрыторыі былой Галандскай Індыі. Суверэнітэт ЗШІ абмяжоўваўся тым, што яны ўваходзілі ў склад Галандска-Інданезійскага саюзу. Аднак ужо 17 жніўня 1950 г. ЗШІ былі ператвораны ва унітарную рэспубліку.

Першыя гады незалежнасці вядучую ролю ў кіраўніцтве краінай адыгравала правая партыя Машумі (ісламская партыя). У сваёй палітыцы яна арыентавалася на Захад. У эканоміцы развіваліся рынкавыя адносіны. Паварот у палітыцы адбыўся ў сярэдзіне 1950-х гг. Пачала ажыццяўляцца канцэпцыя нацыянальнага сацыялізму Сукарна. Яна прадугледжвала развіццё эканомікі з упорам на дзяржаўны сектар, забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці і сацыяльнага міру на аснове супрацоўніцтва класаў. Важная роля адводзілася рэлігіі і нацыянальным традыцыям. Адно з цэнтральных месцаў займала барацьба з імперыялізмам. Парламенцкія выбары і выбары ва Устаноўчы сход, якія адбыліся ў 1955 г., прынеслі перамогу леванацыяналістычным сілам. КПІ атрымала 6 мільёнаў галасоў. Праводзімая ўрадам сацыяльна-эканамічная палітыка хутка паказала сваю неэфектыўнасць. Эканамічныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цяжкасці імкліва нарасталі. Прычым перыферыйныя астравы па ўзроўню эканамічнага развіцця значна адставалі ад Явы. Гэта прывяло да росту сепаратысцкіх настрояў. У студзені 1956 г. на Сулавесі і Суматры ўспыхнулі сепаратысцкія мецяжы, якія былі падтрыманы і правымі партыямі. Аднак мецяжы закончыліся правалам. Армія ў цэлым засталася вернай прэзідэнту Сукарна. Разгром сепаратысцкіх мяцяжоў прывёў да змен у расстаноўцы сіл на палітычнай арэне. Узмацніліся пазіцыі КПІ. У якасці самастойнай палітычнай групоўкі вылучаецца армія. У краіне было ўведзена ваеннае становішча, і рэальная ўлада на месцах аказалася ў руках ваенных. Ва ўмовах нарастання палітычнай нестабільнасці ў 1957 г. Сукарна выступіў з канцэпцыяй “накіроўваемай дэмакратыі”. Асноўная ідэя гэтай канцэпцыі заключалася ў тым, што парламенцкая сістэма заходняга ўзору з’яўляецца непрымальнай для Інданезіі. Яе неабходна замяніць сістэмай кансультацый паміж living рознымі палітычнымі партыямі і сацыяльнымі групамі з мэтай дасягнення прымальнага для ўсіх рашэння. Сукарна лічыў, што ўсе цяжкасці Інданезіі ад увядзення чужой ёй парламенцкай дэмакратыі. ”Накіроўваемая дэмакратыя” бачылася Сукарна як палітычная сістэма, здольная пераадолець сацыяльныя супярэчнасці і забяспечыць маналітнае адзінства інданезійскай нацыі. Дасягнуць гэта намячалася праз стварэнне сістэмы функцыянальных груп. Пад функцыянальнай групай у Інданезіі мелася на ўвазе група людзей, звязаных адной сферай дзейнасці незалежна ад іх маёмаснага становішча. Ствараюцца функцыянальныя групы рабочых, сялян, ваенных, інтэлігенцыі і г.д. Яшчэ адзін элемент “накіроўваемай дэмакратыі” – гэта абмежаванне палітычнай дзейнасці. Партыі не забараняліся, але іх дзейнасць абмяжоўвалася рамкамі афіцыйнай ідэалогіі: нацыяналізм, гуманізм, сацыяльная справядлівасць, дэмакратыя, вера ў бога. Сукарна вылучыў канцэпцыю НАСАКОМ, якая азначала права на дзейнасць у краіне партый трох кірункаў – нацыянальных, рэлігійных і камуністычнай, але пры ўмове прызнання афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі. Яшчэ адзін найважнейшы элемент “накіроўваемай дэмакратыі” – усталяванне моцнай аўтарытарнай улады прэзідэнта. Сукарна падкрэсліваў, што інданезійская традыцыя патрабуе канцэнтрацыі ўсёй паўнаты ўлады ў адных руках. Сукарна ідэалізаваў патрыярхальныя адносіны паміж прэзідэнтам і народам (пастыр і паства). Капіталізм разбураў такія адносіны, таму Сукарна супраць яго. Ён быў адначасова кіраўніком дзяржавы, прэзідэнтам, вярхоўным галоўнакамандуючым, пры-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

значаў і адпраўляў у адстаўку міністраў. Прэзідэнт выступаў вярхоўным арбітрам у адносінах паміж функцыянальнымі групамі.

Ажыццяўленне канцэпцыі “накіроўваемай дэмакратыі” на практыцы пачалося з 1959 г. Падзеі 1959-1960 гг. з’яўляліся па сутнасці дзяржаўным пераваротам, які ліквідаваў парламенцкую сістэму і ўсталяваў рэжым асабістай улады Сукарна. Стары парламент быў распушчаны. У 1960 г. сфарміраваўся новы парламент, дэпутатаў якога фактычна прызначыў прэзідэнт. Захоўвалася ваеннае становішча. Сістэма “накіроўваемай дэмакратыі” сустрэла падтрымку з боку партый, што былі ўключаны ў сістэму НАСАКОМ, а таксама з боку арміі. Ва ўмовах ваеннага становішча ёй належала вялікая ўлада. У якасці аднной з функцыянальных груп яна выконвала не толькі функцыі абароны, але і актыўна займалася праблемамі эканамічнымі, палітычнымі, сацыяльнымі. Армія выконвала ролю стабілізуючай сілы ў адносінах паміж функцыянальнамі групамі. Росту ўплыву арміі спрыяла тое, што Інданезія пастаянна шукала сабе знешніх ворагаў. Сукарна лічыў, што супрацьстаянне знешняму ворагу – гэта адзін з лепшых сродкаў згуртаваць нацыю і адцягнуць увагу людзей ад нарастаўшых эканамічных праблем. Ён выступіў з канцэпцыяй стварэння “Вялікай Інданезіі”. Першым крокам на шляху яе рэалізацыі стала далучэнне галандскай часткі Новай Гвінеі (Заходняга Ірыяна) у 1962 г. Сукарна рашуча выступіў супраць планаў стварэння Малайзійскай федэрацыі з былых англійскіх калоній. Аднак перашкодзіць стварэнню Малайзіі не ўдалося і пачалося жорсткае супрацьстаянне з ёю.

“Накіроўваемая дэмакратыя” прадугледжвала стварэнне і “накіроўваемай эканомікі”. Усё эканамічнае жыццё краіны было пастаўлена пад жорсткі кантроль дзяржавы, дакладней – дзяржаўнай бюракратыі. Вынікам стала фарміраванне бюракратычнай буржуазіі. Ва ўмовах ваеннага становішча пасады дырэктараў прадпрыемстваў даставаліся пераважна ваенным. Абмежаванне грамадзянскіх свабод давала амаль поўную свабоду дзеяння новым кіраўнікам. Яны ж, адчуваючы сябе ”халіфамі на гадзіну”, максімальна выкарыстоўвалі гэтую свабоду для асабістага ўзбагачэння. Бескантрольнасць ва ўмовах “накіроўваемай дэмакратыі” параджала абвальную карупцыю ў дзяржаўным апараце. Узбагачаючыся, бюракратычны капітал прыкрываўся рэвалюцыйнай фразай, дэмагагічнымі заявамі аб абароне інтарэсаў народа. Ён назапасіў вялікія багацці, але перад ім стаяла праблема легалізацыі накопленага багацця, увядзення наяўных сродкаў у зварот. У вырашэнні гэтай задачы рэжым Сукарна з яго палітыкай абмежавання прыватнай ініцыятывы быў перашкодай. Сукарна выклікаў незадавальненне бю-

ракратычнай буржуазіі і тым, што дазваляў дзейнасць левых арганізацый. КПІ ў той час настолькі ўзмацнілася, што была пагроза захопу ёю ўлады.

Сам прэзідэнт у сярэдзіне 60-х гг. усё больш страчвае апору ў краіне. Ва ўмовах аслаблення пазіцый Сукарна нарастае барацьба паміж двума магутнымі элементамі сістэмы "накіроўваемай дэмакратыі" – КПІ і арміяй, у якой былі трывалыя сувязі з бюракратычнай буржуазіяй. Кожны з бакоў імкнецца да захопу ўлады, і кожны прыкрывае свае намеры заявамі аб падтрымцы прэзідэнта як вярхоўнага правадыра рэвалюцыі. Сукарна ведаў аб росце антыпрэзідэнцкіх настрояў у арміі і бачыў у КПІ тую сілу, абапіраючыся на якую можна супрацьстаяць арміі. Летам 1965 г. распаўсюджваюцца чуткі аб існаванні ў арміі "савета генералаў", якія рыхтуюць дзяржаўны пераварот. КПІ вырашае разгарнуць непасрэдную барацьбу за ўладу. У якасці падставы для выступлення былі скарыстаны чуткі аб "савеце генералаў". У жніўні 1965 г. кіраўніцтва КПІ прыняло рашэнне падтрымаць групу "прагрэсіўных афіцэраў" і нанесці апераджальны ўдар па "савету генералаў". Гэтае рашэнне ў многім і прадвызначыла падзеі 30 верасня – 1 кастрычніка 1965 г.

У ноч на 1 кастрычніка 1965 г. афіцэры з прэзідэнцкай гвардыі, што былі звязаны з КПІ, ажыццявілі напад на дамы сямі вышэйшых генералаў інданезійскай арміі. Шэсць з іх былі забіты з велізарнай жорсткасцю. Гэтыя ваенныя абвясцілі сябе "рухам 30 верасня", а мэтай руху – прадухіленне рыхтуемага генераламі ваеннага перавароту. Днём 1 кастрычніка ўдзельнікі "Руху 30 верасня" выступілі па радыё і заявілі аб стварэнні Рэвалюцыйнага савету, які надзяляецца "ўсёй уладай у інданезійскай дзяржаве". Сукарна фактычна стаў на бок "Руху 30 верасня". Пераважная большасць арміі не падтрымала выступленне "Руху 30 верасня". Камандаванне сухапутнымі сіламі прыняў на сябе генерал Сухарта. Ён заявіў, што акцыя мяцежнікаў накіравана супраць прэзідэнта і мэта арміі – вярнуць уладу Сукарна. У падрыхтоўцы мецяжу была абвінавачана КПІ. Сухарта спасылаўся на тое, што 2 кастрычніка газета КПІ надрукавала матэрыялы, у якіх заклікала народ падтрымаць "рух 30 верасня". Армія распачала жахлівы тэрор супраць камуністаў ці тых, каго западозрылі ў сімпатыях да КПІ. Афіцыйныя ўлады назвалі лічбу ў 78 тыс. забітых. Заходнія журналісты гаварылі аб 1 млн. загінуўшых. У выніку тэрору КПІ і іншыя левыя арганізацыі былі разгромлены. Пасля гэтых падзей Сукарна фармальна захаваў пасаду прэзідэнта. Але генералы на чале з Сухарта ўсё больш абмяжоўвалі яго рэальную ўладу. Прэзідэнт быў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вымушаны юрыдычна аформіць прызначэнне Сухарта камандуючым сухапутнымі сіламі. Пад ціскам генералаў прэзідэнт 11 сакавіка 1966 г. падпісаў загад, згодна з якім генералу Сухарта прадастаўляліся надзвычайныя паўнамоцтвы для забеспячэння стабільнасці ў краіне. Выкарыстоўваючы свае паўнамоцтвы, Сухарта 19 сакавіка ад імя прэзідэнта абнародаваў дэкрэт аб адхіленні ад улады 16 міністраў, якіх генерал абвінаваціў у сувязях з “рухам 30 верасня”. Змяніўшы склад цэнтральнага ўрада, генералы прыступілі да непасрэднай падрыхтоўкі адхілення прэзідэнта ад улады. 5 мая 1966 г. з’явілася заява вышэйшага камандавання, згодна з якой яно брала на сябе адказнасць за тое, каб прэзідэнт праводзіў палітыку ў інтэрэсах народа. У заяве падкрэслівалася, што вярхоўная ўлада ў Інданезіі належыць Кангрэсу, якому падначальваецца і прэзідэнт. Кангрэс ужо летам 1966 г. скарыстаў заяву ваенных, каб адмяніць палажэнне аб пажыццёвым прэзідэнстве Сукарна. Прэзідэнту забаранялася выдаваць новыя дэкрэты і ўказы. Далей Кангрэс прыняў рашэнне, згодна з якім у выпадку, калі прэзідэнт не зможа выконваць свае абавязкі, іх будзе выконваць генерал Сухарта. Яму было даручана сфарміраваць новы ўрад. У новым урадзе з 24 міністраў 12 былі ваеннымі. Такім чынам, летам 1966 г. армія заняла ключавыя пазіцыі ва ўрадзе і рэзка абмежавала паўнамоцтвы прэзідэнта. Вядучай сілай антысукарнаўскай апазіцыі была ваенная вярхушка, карумпіраваная бюракратыя і звязаныя з ёю буржуазія, землеўладальнікі. У апазіцыю ўваходзіла таксама студэнцтва, многія прадстаўнікі інтэлігенцыі, сярэднія слаі горада і вёскі. Палітыка Сукарна прывяла краіну да эканамічнага краху. Прычыны развалу эканомікі бачыліся ў тым, што на палітыку Сукарна вялікі ўплыў аказвалі левыя арганізацыі з іх утапічнымі ідэямі. Многія непакоіліся, што Сукарна давядзе справу да ўсталявання ў краіне камуністычнага рэжыму. Хаця прэзідэнт ужо летам 1966 г. быў пазбаўлены рэальнай улады, Сухарта не хацеў браць на сябе ініцыятыву па фармальным адхіленні яго ад улады. Ён імкнуўся выглядаць законным пераемнікам Сукарна. Таму генерал намагаўся надаць адстаўцы Сукарна добраахвотны характар, стварыць ураженне, што ён узяў уладу па волі народа. Знаходзячыся ў ізаляцыі, Сукарна 20 лютага 1967 г. падпісаў акт аб перадачы паўнамоцтваў па кіраванню краінай Сухарта, але фармальна захаваў пасаду прэзідэнта да наступнага года.

Гэтыя падзеі паклалі пачатак фарміраванню рэжыму “новага парадку”. Сухарта заявіў, што не можа быць і гаворкі аб абмежаванні паўнамоцтваў прэзідэнта і аб кантролі парламента за выканаўчай уладай.

Такім чынам, “новы парадак” меў на ўвазе захаванне аўтарытарнай прэзідэнцкай улады. Прэзідэнт захоўваў непасрэдны кантроль над арміяй. Армія ж імкнулася зацвердзіць сваё манапольнае права на кіраванне краінай. Ваенныя ўлады пачалі прымаць меры па рэарганізацыі палітычных партый. Да 1969 г. яна зводзілася да змянення складу кіраўніцтва, і партыі вымушаны былі заявіць аб прызнанні "новага парадку" і гатоўнасці супрацоўнічаць з урадам. Правячай партыяй, цалкам падкантрольнай арміі, стаў Аб’яднаны сакратарыят функцыянальных груп (Галкар). Пасля ўнясення змен у партыйную структуру краіны, урад Сухарта і армія палічылі магчымым пасля трохгадовай адтэрміноўкі пайсці на правядзенне ўсеагульных выбараў у Кангрэс у ліпені 1971 г. Яны прынеслі ўпэўненую перамогу праўрадаваму Аб’яднанаму сакратарыяту функцыянальных груп. Аднак выбары ў той жа час прадэманстравалі, што шэраг палітычных партый, перш за ўсё Нацыянальная партыя Інданезіі, імкнуцца праявіць самастойнасць. Гэта падштурхнула ваенны рэжым да карэннай рэарганізацыі партыйна-палітычнай сістэмы. Яна была праведзена ў 1973 г., і ў выніку яе ў краіне засталося 3 партыі: Аб’яднаны сакратарыят функцыянальных груп, Дэмакратычная партыя, Партыя адзінства і развіцця, якія дзейнічалі пад строгім кантролем арміі. Рэарганізацыя партыйнай сістэмы азначала, што ў Інданезіі завяршыўся працэс фарміравання палітычнай сістэмы “новага парадку”. Цэнтральным элементам гэтай сістэмы з’яўлялася армія. Ёй належала рэальная ўлада, і яна кантралявала ўсе іншыя дзяржаўна-палітычныя інстытуты.

Ліквідацыя сістэмы “накіроўваемай дэмакратыі” цягнула за сабою ліквідацыю “накіроўваемай эканомікі”. Быў распрацаваны новы стратэгічны курс эканамічнага развіцця Інданезіі, у аснове якога ляжала прыярытэтнае развіццё прыватнага сектару і шырокае прыцягненне замежнага капіталу ў эканоміку. Каб прыцягнуць прыватныя інвестыцыі, у 1968 г. быў выдадзены закон, які адкрываў для прыватнага прадпрымальніцтва ўсе сферы бізнесу. Інвестары атрымлівалі льготы па падаткаабкладанні. Яны вызваляліся ад абавязку даваць каму б то ні было тлумачэнні адносна паходжання свайго капіталу. Бюракратычная буржуазія пачынае актыўна ўкладаць назапашаныя сродкі ў эканоміку. Ваенныя ўлады адразу пачалі надаваць першаступеннае значэнне развіццю экспарту. У 1967 г. былі прыняты заканадаўчыя акты, якія давалі шмат ільгот экспарцёрам. У тым жа 1967 г. быў выдадзены закон аб замежных капіталаўкладаннях. Замежны капітал атрымліваў доступ у многія, раней закрытыя для яго сферы, хаця засталося

яшчэ і шмат абмежаванняў (энергетыка, транспарт, сувязь, ваенная прамысловасць). За першыя 4 гады дзейнасці закона Інданезія атрымала больш 1,5 млрд. долараў інвестыцый з-за мяжы, а да 1977 г. – 6,6 млрд. У першыя гады пераходу да рынку было відавочна, што нацыя-нальны прыватны капітал слабы і не здольны самастойна забяспечыць эканамічны рост. Замежныя інвестыцыі толькі часткова вырашылі праблему. Таму захоўваецца яшчэ і на пачатак 70-х гг. вялікая роля дзяржаўнага прадпрымальніцтва. Так, план 5-гадовага развіцця на 1969-1974 гг. прадугледжваў, што на долю дзяржавы прыйдзецца больш за 70 % інвестыцый. З 1970 г. рынкавыя рэформы ў эканоміцы актывізаваліся. 16 жніўня 1970 г. у сваёй прамове прэзідэнт Сухарта заявіў аб пераходзе да дэмакратычнай эканомікі, аб адмове ад этатызму, каб адкрыць магчымасць для росту прыватнага сектара. З 1970 г. пачынаецца актыўная прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў. Былі перагледжаны пункты інданезійскай канстытуцыі, якія прадугледжвалі, што жыццёва важныя для дзяржавы і народа галіны не павінны перадавацца ў прыватныя рукі. Новая эканамічная палітыка аказалася даволі эфектыўнай. Эканоміка развівалася высокімі тэмпамі – прырост вытворчасці складаў больш за 13 % у сярэднім за год у 70-я – 80-я гг. Важную ролю ў эканоміцы іграла нафтаздабыча. Дзякуючы прытоку нафтадолараў і замежнага капіталу атрымалі развіццё галіны цяжкай прамысловасці: машынабудаванне, электроніка, судабудаван-не. У першай палове 90-х гг. Інданезія захавала добрыя тэмпы росту ВУП – 5,5-6 % у год. Аднак у 1997 г. яна сутыкнулася з найвастрэйшым эканамічным крызісам. ВУП у 1998 г. Зменшыўся на 13,7 %. Адбыўся фінансавы крах, абвал спажывецкага рынку.

У палітычнай сістэме з сярэдзіны 70-х - да сярэдзіны 90-х гг. істотных змен не адбылося. Краіна жыла ва ўмовах сістэмы "новага парадку", якая сфарміравалася ў пачатку 70-х гг. Захоўваючы знешне дэмакратычны фасад, гэты рэжым заставаўся аўтарытарным, ваенна-бюракратычным. Аднachасова яго можна характарызаваць як рэжым асабістай улады прэзідэнта Сухарта. Ён у 1968, 1972, 1977, 1982, 1987, 1992, 1997 гг. "выбіраўся" на пасаду прэзідэнта. Але зыход выбараў быў прадвызначаны. У гэтыя ж гады адбываліся выбары ў парламент. Асновай палітычнай сістэмы з'яўлялася армія, дзейнасць якой грунтавалася на канцэпцыі двайной функцыі. Адна функцыя – абарона, другая – сацыяльна-палітычнае кіраўніцтва ў краіне. У ідэалагічным плане рэжым "новага парадку" выкарыстоўваў спадчыну, што засталася ад Сукарна – яго пяць прынцыпаў. Але было важнае выключэн-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не. Ідэалогія “новага парадку” прасякнута антыкамунізмам. Марксізм-ленінізм быў юрыдычна забаронены. Цэнтральнае месца ў ідэалагічнай палітыцы “новага парадку” займае прапаганда прынцыпаў нацыянальнай выключнасці і нацыянальнага адзінства Інданезіі, самабытнасці развіцця інданезійскага грамадства. Зыходзячы з самабытнасці Інданезіі, ваенныя ўлады робяць выснову, што тут не можа ўсталявацца ні заходняя ліберальная дэмакратыя, ні калектывізм. Неабходна дасягнуць гармоніі розных сацыяльна-палітычных сіл і прымаць рашэнні на аснове кансенсуса. Галкар у 80-я гг. зрошчваецца з дзяржаўным апаратам і імкнецца стаць масавай. Апазіцыйныя Дэмакратычная партыя і мусульманская Партыя Адзінства і развіцця перажываюць у 80-я гг. вострую ўнутраную барацьбу, крызіс. Пасля парламенцкіх выбараў 1982 г. улады прынялі законы, якія забаранялі партыям выкарыстоўваць любую ідэалогію, акрамя афіцыйнай.

Сітуацыя ў Інданезіі да 1997 г. заставалася стабільнай. У палітычным жыцці пануюць традыцыі патэрналізму з яго імкненнем да сацыяльнай і палітычнай гармоніі на аснове супрацоўніцтва розных грамадска-палітычных сіл пад патранажам урада і арміі. Аднак паспяховае развіццё капіталізму ў Інданезіі ў 70-90-я гг. рабіла неадпаведнымі суадносіны паміж эканамічным базісам, усё больш капіталістычным па сваім характары, і палітычнай надбудовай, якая грунтавалася на прынцыпах традыцыйнага грамадства. Усё большае незадавальненне ў грамадстве выклікала карупцыя ў дзяржаўным апараце, у бліжэйшым акружэнні прэзідэнта. Выбары ў парламент і Кангрэс у 1997 г. зноў, дзякуючы кантролю арміі за іх ходам, прынеслі перамогу Галкар. Новы склад Кангрэсу зноў абраў прэзідэнтам Сухарта. Аднак эканамічны крызіс, які пачаўся ў другой палове 1997 г., прывёў да дэстабілізацыі і сацыяльна-палітычнага жыцця. Ён даў штуршок масавым антыўрадавым выступленням. Асноўным патрабаваннем была адстаўка Сухарта. У якасці галоўнай апазіцыйнай сілы выступіла Партыя Адзінства і развіцця, якая вывела на вуліцы сотні тысяч людзей. У такіх умовах армія не падтрымала Сухарта. 21 мая 1998 г. ён падаў у адстаўку. Гэта паклала пачатак дэмантажу сістэмы ”новага парадку”. На прэзідэнскіх выбарах 1999 г. перамогу атрымаў Абдурахман Вахід, а віцэ-прэзідэнтам стала дачка першага прэзідэнта Інданезіі Сукарнапутры. Аднак выбары не прынеслі стабілізацыі палітычнай сітуацыі. Вясной 2001 г. узнік востры канфлікт паміж прэзідэнтам і парламентам, які закончыўся імпічментам А.Вахіда. Пасаду прэзідэнта заняла Сукарнапутры. У ліпені 2004 г. упершыню ў гісторыі Інда-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

незіі адбыліся ўсенародныя выбары прэзідэнта. Сукарнапутры пацярпела паражэнне, а перамог Сушло Бамбанг Юдхайона.

## ВЭ-1. ЯПОНІЯ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- змест эканамічных і грамадска-палітычных рэформаў у Японіі ў другой палове 1940-х гг.;
- сутнасць і структуру дзяржаўна-палітычнай сістэмы пасляваеннай Японіі;
- найбуйнейшыя палітычныя партыі Японіі, іх ідэйныя платформы, іх эвалюцыю;
- прычыны "японскага эканамічнага цуда" другой паловы ХХ ст.;
- спецыфіку духоўнага жыцця японскага грамадства ва ўмовах паскоранай мадэрнізацыі;
- змены ў расстаноўцы палітычных сіл Японіі ў апошнія дзесяцігоддзі ХХ ст. – пачатку ХХІ ст.;

***умець:***

- ахарактарызаваць палітычную сістэму, якая ўсталявалася ў пасляваеннай Японіі;
- вызначыць храналагічныя рамкі і змест асноўных этапаў эканамічнага і палітычнага развіцця Японіі пасля другой сусветнай вайны;
- ахарактарызаваць этапы і найважнейшыя кірункі знешняй палітыкі Японіі ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ ст.;
- прааналізаваць уплыў сусветных эканамічных крызісаў сярэдзіны 70-х і пачатку 80-х гг. ХХ ст. на эканоміку Японіі і новы этап яе развіцця, які пачаўся пасля іх ;
- ахарактарызаваць сутнасць палітычнага крызісу, з якім сутыкнулася Японія ў канцы 1980-х гг.;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-1:***

1 Акупацыйны рэжым ЗША і рэфармаванне эканамічнай і грамадска-палітычнай сістэмы Японіі.

2 Эканамічнае развіццё Японіі ў 50-я – 60-я гг ХХ ст.: адметныя рысы абранай мадэлі, вынікі, прычыны паскоранага развіцця.

3 Палітычнае развіццё ва ўмовах эканамічнага "цуда" 50-60-х гг. ХХ ст.

4 Эканамічныя крызісы сярэдзіны 70-х і пачатку 80-х гг. ХХ ст. і змены ў сацыяльна-эканамічнай мадэлі Японіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

5 Наспяванне крызісу палітычнай сістэмы, якая склалася ў 50-я гг., і пошук шляхоў яго пераадолення (сярэдзіна 70-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.).

6 Асноўныя этапы і найважнейшыя кірункі знешняй палітыкі пасляваеннай Японіі.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** за час амерыканскай акупацыі ў Японіі былі праведзены глыбокія рэформы, якія ахапілі практычна ўсе бакі грамадскага жыцця і забяспечылі развіццё краіны ў рамках ліберальнай дэмакратыі і рынкавай эканомікі. Па сутнасці яны ўяўлялі сабою мірную буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX в. В 3-х ч. – М., 2001. – Ч.2. - С.94-97.

*У гэтым падручніку падрабязна разгледжана канстытуцыя 1947 г. Астатнім рэформам аўтары ўдзялілі мала ўвагі.*

Кузнецов Ю.Д. и др. История Японии. – М., - 1988. - Глава 19.

История Японии. 1945-1975. – М., 1978. - Раздел 1.

*У манаграфіях падрабязна разгледжаны пасляваенныя рэформы, палітычная барацьба пры іх правядзенні, палітыка ЗША. Аднак, пры ацэнцы рэформаў аўтары кіруюцца класавым падыходам і празмерную ўвагу надаюць дзейнасці левых арганізацый і рабочаму руху.*

***Выканайце наступныя заданні:***

- устанавіце, у чым спецыфіка акупацыйнага рэжыму ў Японіі;

*Улічыце,што ЗША праводзілі ў дачыненні да акупіраванай Японіі палітыку "ўскоснага кіравання", захаваўшы цэнтральны ўрад.*

- прасачыце, як змянілася палітычнае жыццё Японіі ва ўмовах амерыканскай акупацыі;

*Асноўную ўвагу звярніце на ўстанаўленне палітычнага плюралізму і змяненне ролі імператара ў палітычным жыцці.*

- прааналізуйце фрагмент тэксту канстытуцыі 1947 г. і дайце характарыстыку дзяржаўна-палітычнай сістэмы пасляваеннай Японіі;

"Глава 1. Імператар.

Артыкул 1. Імператар з'яўляецца сімвалам дзяржавы і адзінства народа, якому належыць суверэнная ўлада.

Артыкул 3. Усе дзеянні Імператара, якія адносяцца да спраў дзяржавы, могуць быць распачаты не інакш як з парады ці адабрэння Кабінета, і Кабінет нясе за іх адказнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Арыкул 4. Імператар ажыццяўляе толькі такія з дзеянняў, што адносяцца да спраў дзяржавы, якія прадугледжаны гэтай канстытуцыяй, пры гэтым ён не надзелены паўнамоцтвамі, якія звязаны з ажыццяўленнем дзяржаўнай ўлады.

Арыкул 6. Імператар прызначае Прэм'ер-міністра па прадстаўленню Парламенту.

Глава 2. Адмова ад вайны.

Артыкул 9. Шчыра імкнучыся да міжнароднага міру, які заснаваны на справядлівасці і парадку, японскі народ на вечныя часы адмаўляецца ад вайны як сувярэннага права нацыі, а таксама ад пагрозы ці прымянення ўзброенай сілы як сродка вырашэння міжнародных спрэчак.

Для дасягнення мэты, якая ўказана ў папярэднім абзацы, ніколі надалей не будуць ствараюца сухапутныя, марскія і ваенна-паветраныя сілы, роўна як і іншыя сродкі вайны. Права на вядзенне вайны дзяржавай не прызнаецца." (Хрестоматия по истории государства и права зарубежных стран (Новое и новейшее время).- М., 2000.- С.281, 282.)

*Неабходна засяродзіць увагу на сістэме падзелу ўладаў, на функцыі і паўнамоцтвах імператара, парламенту, кабінета міністраў. Падумайце, у чым значэнне арт. 9 для развіцця пасляваеннай Японіі.*

- вызначце, станаўленню якой эканамічнай мадэлі садзейнічалі пасляваенныя рэформы ў Японіі;

*Для выканання гэтага задання разгледзьце дзве найважнейшыя рэформы: аграрную і рэарганізацыю дзайбацу.*

- ахарактарызуйце два этапы ў амерыканскай акупацыйнай палітыцы ў дачыненні да Японіі;

*Падумайце, чаму ў 1949 г. ЗША адмовіліся ад палітыкі аслаблення Японіі і перайшлі да палітыкі "зваротнага курса".*

- назавіце, якія палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі ўзніклі ў Японіі пасля вайны, вызначце іх палітычныя платформы;

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у 50 – 60-я гг. XX ст. Японія зрабіла імклівы рывок у сваім эканамічным развіцці і ператварылася ў адзін з найбуйнейшых эканамічных цэнтраў свету.

***Для вывучэння гэтага пытання звярніцеся да наступнай литаратуры:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX в. В 3 ч. М., 2001. – Ч.2. - С.100-103.

*У падручніку паказаны высокія тэмпы эканамічнага росту Японіі і шэраг прычын, якія яго абумовілі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001 – Т.2 - С.244-245, 499-503.

*На аснове матэрыялу дапаможніка можна вызначыць ролю цывілізацыйнага фундаменту ў забеспячэнні японскага эканамічнага “цуда”.*

История Японии. 1945-1975. – М., 1978.

Кузнецов Ю.Д. и др. История Японии. – М., - 1988. - Глава 20.

*Аўтары, зыходзячы з марксісцка-ленінскай метадалогіі, акцэнтуюць увагу на супярэчнасцях і праблемах сацыяльна-эканамічнага развіцця Японіі, на росце эксплуатацыі рабочых, але прызнаюць і эканамічныя дасягненні краіны.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, якія элементы цывілізацыйнага фундаменту Японіі садзейнічалі паскоранаму эканамічнаму развіццю краіны;

*Звярніце ўвагу на характэрныя для далёкаўсходняй (канфуцыянскай) традыцыі імкненні да самаўдасканалення, да выяўлення патэнцыялу кожнага, на выпрацаваную высокую культуру працы, на перанясенне традыцыйных патэрналісцкіх адносін у сацыяльна-эканамічную сферу.*

- ахарактарызуйце ўплыў НТР, адметных рыс палітычнай сітуацыі, асаблівасцей дзяржаўнага рэгулявання сацыяльна-эканамічных працэсаў на ход развіцця эканомікі Японіі ў 50 – 60-я гг. ХХ ст.;

*Пры выкананні гэтага задання зыходзьце з наступных асноўных пастулатаў: схільнасць японцаў да актыўнага ўкаранення дасягненняў НТР, палітычная стабільнасць, спалучэнне ідэй ліберальнай эканомікі Захаду з нацыянальнай традыцыяй у японскай мадэлі ДМК.*

- прааналізуйце вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Японіі ў 50 – 60-я гг. ХХ ст.

*Заўважце, як мянялася сацыяльная структура японскага грамадства і характар сацыяльных адносін, што сведчыць пра пераўтварэнне Японіі ў адзін з індустрыяльных цэнтраў свету.*

### Парадак выучэння трэцяга пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання****:* у 50-я -60-я гг. канчаткова аформілася шматпартыйная палітычная сістэма, у якой ЛДП мела яўную перавагу над апазіцыяй, што забяспечвала стабільнасць палітычнага развіцця Японіі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ в. В 3 ч. М., 2001. – Ч.2. - С.98-103.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У падручніку добра паказана, што ўяўляла сабою партыйна-палітычная сістэма Японіі ў 50 – 60-я гг.*

История Японии. 1945-1975. – М., 1978. - Разделы 2,3,4 (Глава1).

Кузнецов Ю.Д. и др. История Японии. – М., - 1988. - Глава 20.

*Названыя манаграфіі напісаны на аснове класавага падыходу і празмерна акцэнтуюць увагу на праблемах класавай барацьбы і дзейнасці левых сіл. У той жа час, яны ўтрымліваюць значны па аб'ёму матэрыял, які дазваляе прасачыць працэс партыйна-палітычнага развіцця Японіі ў 50-60-я гг.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце прычыны стварэння ў 1955 г. аб'яднанай кансерватыўнай партыі ў асобе ЛДП, ахарактарызуйце спецыфіку яе арганізацыйнай структуры і палітычнай платформы;

*Стварэнне ЛДП звяжыце з пошукам шляхоў да палітычнай стабільнасці, з перавагай кансерватыўных настрояў у японскім грамадстве, а спецыфіку арганізацыйнай структуры – з існаваннем унутры ЛДП аўтаномных фракцый.*

- ахарактарызуйце асноўныя кірункі ўнутранай палітыкі ЛДП і ўстанавіце прычыны трываласці яе пазіцый як правячай партыі;

*Звярніце ўвагу, што ЛДП канцэнтравала асноўныя намаганні ва ўнутранай палітыцы на забеспячэнні высокіх тэмпаў эканамічнага росту. Паспяховае вырашэнне гэтай задачы разам з перавагай кансерватыўных настрояў у японскім грамадстве і забяспечылі дамінаванне ЛДП у палітычным жыцці Японіі.*

- прааналізуйце дзейнасць апазіцыйных партый Японіі ў 50 – 60-я гг.;

*Пры выкананні задання адзначце, што ўсе апазіцыйныя партыі стаяць лявей за ЛДП і тыя цяжкасці, з якімі сутыкаецца апазіцыя пры спробах стварыць адзіны фронт.*

## Парадак вывучэння чацвёртага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання*:** у сярэдзіне 70-х і пачатку 80-х гг. ХХ ст. Японія сутыкнулася з моцнымі эканамічнымі крызісамі, якія далі штуршок глыбокім структурным пераменам у эканоміцы краіны на аснове стварэння энэрга- і рэсурсазберагаючых вытворчасцей і значнага павышэння ролі ўнутранага рынку.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ в. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. - С.103-104.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У гэтым выданні характарызуюцца эканамічныя крызісы 70-80-х гг. у Японіі з упорам на іх разбуральнае ўздзеянне на эканоміку, не адзначаецца, што яны далі імпульс яе выхаду на новы якасны ўзровень эканамічнага развіцця.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001 – Т.2 - С.455-458, 545-547.

Юрков С. Японская экономика 90-х годов. Уроки антикризисных мер // Мировая экономика и международные отношения. - М., 2000. - №4.

Леонтьева Е. Япония: преодоление кризиса // Мировая экономика и международные отношения. - М., 2000. - №8.

Рамзес В.Е. Япония на путях к великой потребительской державе // Народы Азии и Африки. – 1990. – №3.

Рамзес В. Японская экономика в ожидании перемен // Мировая экономика и международные отношения.– 1998.– №5.

Кузнецов Ю.Д. и др. История Японии. – М., 1987.– Глава 21.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце прычыны і асаблівасці эканамічных крызісаў 1973-1975 і 1980-1982 гг. у Японіі;
- ахарактарызуйце асноўныя кірункі перабудовы японскай эканомікі ў канцы 70-х – 80-я гг. ХХ ст.;

*Неабходна вызначыць два асноўныя моманты гэтага працэсу: 1)укараненне навукаёмістых энерга- і рэсурсазберагаючых тэхналогій; 2) павелічэнне ролі ўнутранага рынку як фактару эканамічнага росту.*

- прааналізуйце працэс сацыяльна-эканамічнага развіцця Японіі ў 90-я гг. ХХ ст. – пачатку ХХІ ст. і вызначце прычыны крызісных з’яў і шляхі іх пераадолення, якія прапаноўваліся ўрадам;

*Звярніце ўвагу на тое, што 90-я гг. сталі часам, калі японская эканоміка сутыкнулася са значнымі праблемамі, у сувязі з чым у парадак дня было пастаўлена пытанне аб унясенні глыбокіх змен у традыцыйную сістэму дзяржаўнага рэгулявання.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** на новым этапе грамадскага развіцця ў 80 – 90-я гг. ХХ ст. уступіла ў паласу крызісу палітычная сістэма Японіі, якая грунтавалася на дамінаванні Ліберальна-дэмакратычнай партыі і выкананні Сацыялістычнай партыяй ролі галоўнай апазіцыйнай сілы, у выніку чаго адбыліся істотныя змены ў партыйна-палітычнай сістэме краіны.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3-х ч. – М., 2001.– Ч.3. – С.101-105.

*Падручнік раскрывае толькі асобныя моманты палітычнага развіцця сучаснай Японіі.*

Кузнецов Ю.Д. и др. История Японии. – М.,1988.– Глава 21.

*У манаграфіі дадзена падрабязная характарыстыка партыйна-палітычнай барацьбы, але яна пададзена з пазіцый класавай барацьбы.*

Николаева О. Проблема политической реформы в Японии // Мировая экономика и международные отношения. – 1993. – №1.

Николаева О. Перегруппировка политических сил в Японии // Мировая экономика и международные отношения.– 1995.–№9.

Николаева О. Японская политика сегодня: и снова коалиция // Мировая экономика и международные отношения. – 1999. – №5.

*У названых артыкулах утрымліваецца глыбокі аналіз палітычных працэсаў, якія адбываліся ў Японіі ў 1990-я гг.: крызіс ранейшай палітычнай сістэмы, перамены ў партыйнай структуры, змены у ЛДП.*

Япония: полвека обновления. Сборник статей. – М., 1995.

*У артыкулах гэтага зборніка дадзена характарыстыка працэсу мадэрнізацыі Японіі пасля другой сусветнай вайны на аснове ўспрыняцця каштоўнасцей заходняй цывілізацыі пры захаванні традыцыйнай духоўнай асновы.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, як на палітычную сітуацыю ў Японіі паўплываў эканамічны крызіс і карупцыйныя скандалы 70-80-х гг.;

*Разглядаючы гэтую праблему, звярніце ўвагу на ваганні рэйтынгу ЛДП у 70 – 80-я гг., на нарастанне крызісных з'яў унутры пра-вячай партыі.*

- устанавіце, якія перамены адбыліся ў дзейнасці апазіцыйных партый у 70 – 80-я гг.;

*Перш за ўсё прааналізуйце перамены, якія адбыліся ў галоўнай апазіцыйнай партыі СПЯ.*

- прасачыце падзеі і выявіце прычыны, якія ў 1993 г. прывялі да адхілення ЛДП ад улады;

*Пры гэтым трэба ўлічваць як працэсы, якія адбываліся ўнутры ЛДП, так і перамены ў сацыяльным жыцці Японіі.*

- вызначце адметныя рысы палітычнага жыцця Японіі ў сярэдзіне 1990-х гг. – пачатку XXI ст.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Звярніце ўвагу на нетрываласць кабінета сямі партый і хуткае вяртанне да ўлады ЛДП, на тое, што не атрымала развіцця тэндэнцыя да фарміравання ў Японіі двухпартыйнай сістэмы і апазіцыя застаецца раздробленай на некалькі невялікіх партый.*

**Парадак вывучэння шостага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля падпісання Сан-Францыскага дагавора Японія зноў стала суб'ектам міжнародных адносін і ў сваёй палітыцы зыходзіла з прыярытэту саюзных адносін з ЗША, а найважнейшымі кірункамі яе знешняй палітыкі стала ўмацаванне пазіцый у Азіі, урэгуляванне адносін з СССР (Расіяй), забеспячэнне ўплыву на міжнародныя справы, які адпавядаў бы эканамічнай магутнасці Японіі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. - Ч.2.

*У гэтым падручніку ўтрымліваецца матэрыял па знешняй палітыцы Японіі ў другой палове XX ст. У ім неабгрунтавана вялікі акцэнт зроблены на падпарадкаванні Японіі ЗША.*

Кузнецов Ю.Д. и др. История Японии. – М., 1988. – Глава 19-21 (пункты, якія прысвечаны знешняй палітыцы).

*У гэтым падручніку падрабязна прасочваюцца найважнейшыя падзеі і кірункі знешняй палітыкі Японіі ў 1945 – сярэдзіне 1980-х гг., але робіцца гэта на аснове класавага падыходу, таму многія ацэнкі неаб'ектыўныя.*

Петров Д.В. Япония в мировой политике. – М., 1973.

История Японии. 1945-1975. – М., 1978.

*Дзве названыя манаграфіі напісаны на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі, таму аўтары пастаянна падкрэсліваюць імперыялістычны, антысавецкі характар знешняй палітыкі Японіі, прадстаўляюць яе як памагатага агрэсіўнай палітыкі ЗША. Але можна выкарыстаць багаты фактычны матэрыял, які ўтрымліваюць выданні.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прааналізуйце ўмовы Сан-Францыскага мірнага дагавору 1951г. і вынікі мірнага ўрэгулявання;

*Звярніце ўвагу, што мірнае ўрэгуляванне з Японіяй было няпоўнае, бо шэраг яе праціўнікаў па вайне, у тым ліку і СССР, Сан-Францыскі дагавор не падпісалі, некаторыя пытанні засталіся неўрэгуляванымі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- ахарактарызуйце япона-амерыканскія адносіны ў другой палове XX ст., у прыватнасці вызначце характар япона-амерыканскага саюза. Для гэтага прааналізуйце змест Ваеннага дагавора паміж ЗША і Японіяй 1960 г.

"Артыкул 5. Дагаворныя бакі прызнаюць, што ўзброены напад супраць любой тэрыторыі, якая знаходзіцца пад упраўленнем Японіі, ставіць пад пагрозу мір і бяспеку кожнага з бакоў, дэкларуюць, што яны прадпрымуць дзеянні для прадухілення агульнай небяспекі ў адпаведнасці з пастановамі і працэдурамі, якія прадугледжваюцца канстытуцыямі бакоў.

Артыкул 6. У інтарэсах садзеяння бяспецы Японіі, а таксама ў інтарэсах падтрымання міжнароднага міру і бяспекі на Далёкім Усходзе сухапутным, ваенна-паветраным і ваенна-марскім сілам Злучаных Штатаў дазваляецца карыстацца на тэрыторыі Японіі абсталяваннем і тэрыторыяй<…>". (Хрестоматия по истории государства и права зарубежных стран (Новое и новейшее время). – М., 2002. - С.295-296.)

*Падумайце, чым япона-амерыканскі Дагавор бяспекі 1960 г. адрозніваўся ад свайго папярэдніка 1951 г. Неабходна адзначыць, што ЗША з'яўляліся галоўным стратэгічным партнёрам Японіі, і адносіны паміж дзвюма краінамі з часам ўсё больш набывалі характар адносін раўнапраўных саюзнікаў. Па меры эканамічнага ўзмацнення Японіі абвастралася праблема япона-амерыканскага гандлю.*

- вызначце асноўныя этапы развіцця япона-савецкіх (расійскіх) адносін і найбольш важныя супярэчнасці ў іх пасля другой сусветнай вайны;

*Звярніце ўвагу на тое, што СССР не падпісаў Сан-Францыскі дагавор, асноўны негатыўны фактар у япона-савецкіх (расійскіх) адносінах – гэта праблема "паўночных тэрыторый".*

- прааналізуйце, якую палітыку ў адносінах да суседніх азіяцкіх краін праводзіла Японія пасля другой сусветнай вайны;

*Заўважце, што Японія імкнулася да эканамічнага пранікнення ў азіяцкія краіны, адмовіўшыся ад ваенна-палітычнай экспансіі. Праз аказанне шырокай эканамічнай дапамогі суседзям Японія імкнулася пераадолець недавер з іх боку, які застаўся з часоў другой сусветнай вайны.*

- вызначце, якія шляхі вырашэння супярэчнасці паміж вялікім эканамічным патэнцыялам Японіі і яе адносна слабым уплывам на вырашэнне міжнародных праблем шукалі правячыя колы краіны ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст.;

*Асноўным тут з'яўляецца тэзіс, згодна з якім Японія адмаўляе курс на ператварэнне ў ваенную звышдзяржаву і звязвае свае спадзя-*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*ванні з актыўнай знешнеэканамічнай дзейнасцю і рэфармаваннем ААН.*

**Самакантроль па ВЭ-1.**

1 Назавіце найважнейшыя рэформы, якія былі праведзены ў Японіі ў час амерыканскай акупацыі.

2 Як змянілася дзяржаўна-палітычная сістэма Японіі ў выніку пасляваенных рэформаў?

3 Вызначце прычыны японскага эканамічнага «цуда».

4 Назавіце найбольш характэрные расы партыйна-палітычнай сістэмы Японіі ў сярэдзіне 50-х – пачатку 80-х гг.

5 Вызначце, чым этап эканамічнага развіцця Японіі ў 50-я-пачатку 70-х гг. адрозніваўся ад наступнага, які пачаўся з сярэдзіны 70-х гг.

6 Якія перамены ў палітычным жыцці Японіі адбыліся ў 90-я гг. XX ст.?

7 У чым асаблівасці мірнага ўрэгулявання з Японіяй пасля другой сусветнай вайны?

8 Прасачыце асноўныя этапы адносін Японіі з СССР (Расіяй) і ЗША.

9 Якія асноўныя мэты ставіць Японія ў сваёй азіяцкай палітыцы пасля другой сусветнай вайны і якія шляхі іх дасягнення?

## ВЭ-2. ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ, ТАЙВАНЬ, СІНГАПУР, ГАНКОНГ ЯК НОВЫЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫЯ КРАІНЫ ПЕРШАЙ ХВАЛІ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- прычыны і перадумовы хуткага эканамічнага росту новых індустрыяльных краін(НІК);
- этапы і тэндэнцыі палітычнага развіцця НІК пасля другой сусветнай вайны;
- падзеі, якія прывялі да ліквідацыі аўтарытарызму ў НІК і вызначылі іх пераход да дэмакратычнай сістэмы;
- найважнейшыя палітычныя партыі і найбуйнейшых палітычных лідэраў НІК;

***умець:***

- ахарактарызаваць эканамічныя мадэлі, якія былі абраны НІК і забяспечылі высокія тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- даць характарыстыку паўднёвакарэйскага і тайваньскага рэжымаў 50 – 80-х гг. як аўтарытарных;

- вызначыць прычыны пераходу НІК у канцы 80-х гг. да палітычнага плюралізму;

- параўнаць этапы эканамічнага развіцця НІК;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-2:***

1 Утварэнне Рэспублікі Карэя. Палітычнае развіццё ў другой палове XX – пачатку XXI ст.

2 Эканамічнае развіццё Паўднёвай Карэі і ператварэнне яе ў сярэднеразвітую індустрыяльную краіну.

3 Палітычнае развіццё Тайваня пасля другой сусветнай вайны.

4 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Тайваня пасля другой сусветнай вайны і ператварэнне яго ў НІК.

5 Асаблівасці развіцця Сінгапура і Ганконга як новых індустрыяльных краін.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у выніку падзелу Карэйскага паўвострава ў яго паўднёвай частцы была ўтворана Рэспубліка Карэя, у якой на доўгія гады ўсталяваўся аўтарытарны палітычны рэжым, і толькі з канца 80-х гг. пачалося станаўленне дэмакратычнай палітычнай сістэмы.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. – С. 107-122.

*Падручнік дае дастаткова падрабязнае апісанне палітычнага развіцця Рэспублікі Карэя(РК). У ім аднабаковая віна за падзел Карэі ўскладаецца на ЗША, не акцэнтуецца ўвага на тым, што вайна ў 1950 г. пачалася ў выніку агрэсіі КНДР.*

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. – Т.2. – С. 458-462.

*У дапаможніку вызначаны асноўныя этапы і тэндэнцыі перш за ўсё сацыяльна-эканамічнага развіцця Паўднёвай Карэі.*

История Кореи. - Сеул, 1995. - Ч.3.

*У выданні матэрыял уяўляе з сябе агульны нарыс грамадскага развіцця РК.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце прычыны расколу Карэі і вызначце як на адносіны паміж Паўднёвай і Паўночнай Карэямі паўплывала вайна 1950-1953 гг.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Для гэтага вызначце, якую палітыку на Карэйскім паўвостраве праводзілі СССР і ЗША, чаму камісія ААН не змагла выканаць ускладзеныя на яе функцыі.*

- дайце характарыстыку рэжыму Лі Сын Мана і вызначце прычыны яго падзення ў 1960 г.

*Звярніце ўвагу, што палітычны рэжым у РК эвалюцыяніраваў у бок аўтарытарызму і ўсталявалася асабістая дыктатура Лі Сын Мана.*

- устанавіце прычыны існавання ў Паўднёвай Карэі ў 60 – 80-я гг. ваеннай дыктатуры, вызначце яе адметныя рысы і прасачыце эвалюцыю;

*Пры гэтым улічыце знешнія фактары, якія спрыялі развіццю аўтарытарызму, звярніце ўвагу на ролю аўтарытарнага рэжыму ў мадэрнізацыі краіны, на слабасць дэмакратычных сіл і яе прычыны.*

- вызначце, якія прычыны прывялі да падзення аўтарытарнага палітычнага рэжыму і спрыялі станаўленню дэмакратыі ў РК з канца 80-х гг. Прасачыце ход гэтага працэсу;

*Прадумайце, наколькі аўтарытарны палітычны рэжым адпавядаў эканамічнай мадэлі, якая склалася ў канцы 80-х гг., як змянілася сацыяльная структура грамадства з пункту гледжання ўзмацнення сацыяльнай базы дэмакратыі. Звярніце ўвагу на мірную эвалюцыю палітычнай сістэмы.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання*:** з пачатку 60-х гг. ХХ ст. РК ўзяла курс на паскораную індустрыялізацыю на аснове адкрытай экспарта-арыентаванай рыначнай эканомікі. Паспяховая яго рэалізацыя дазволіла ёй стварыць сучасную эканоміку і ўвайсці ў лік індустрыяльна развітых краін.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2. – С.1-122.

*Падручнік дазваляе вызначыць некаторыя (але не ўсе прычыны) эканамічных поспехаў РК у апошнія дзесяцігоддзі, у агульным плане ахарактарызаваць этапы яе эканамічнага развіцця.*

История Кореи. - Сеул, 1995. - Ч.3.

*Кніга ўказвае на найважнейшыя дасягненні ў сацыяльна-эканамічным развіцці РК.*

Васильев Л.С. История Востока. - М.,2001. – Т.2. – С.458-461.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Аўтар вызначае прычыны хуткага эканамічнага развіцця РК, звязваючы іх у першую чаргу з цывілізацыйным фундаментам.*

Михеев В. Азиатский финансовый кризис и его последствия // Международная жизнь. - 1999. - №3.

*Па гэтым артыкуле прасачыце ўздзеянне крызісу на Паўднёвую Карэю.*

Федровский А. Экономика Южной Кореи. Трудное время реформ // Мировая экономика и международные отношения. – 1997 - №6.

*У артыкуле прасочаны найважнейшыя этапы і элементы эканамічнай палітыкі ўладаў Паўднёвай Карэі.*

Син Хен Хван. Южная Корея: нелегкий путь к процветанию // Проблемы Дальнего Востока. 1990 - №5.

*Звярніце ўвагу на фінансавую і аграрную рэформы, на якасць карэйскай рабочай сілы, на дзяржаўную сацыяльна-эканамічную палітыку.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце прычыны і перадумовы карэйскага эканамічнага "цуда":
- дайце характарыстыку першага этапа індустрыялізацыі РК (60-я – першая палова 80-х гг.):

*Вы павінны адзначыць экспартаарыентаванасць тагачаснай паўднёвакарэйскай мадэлі, вызначыць характэрныя рысы дзяржаўнага рэгулявання і прыярытэтныя галіны.*

- дакажыце, што ў сярэдзіне 80-х гг. РК ператварылася ў сярэднеразвітую індустрыяльную краіну:

*Для гэтага вызначце ўзровень развіцця розных галін эканомікі і іх удзельную вагу ў ВУП, а таксама месца РК у сістэме сусветнай гаспадаркі.*

- вызначце характэрныя рысы новага этапа сацыяльна-эканамічнага развіцця РК, які пачаўся з сярэдзіны 80-х гг. XX ст.

*Неабходна звярнуць увагу на тое, што прыярытэтам стала развіццё навукаёмістых тэхналогій і адбывалася больш значная лібералізацыя эканамічных адносін, асабліва пасля азіяцкага фінансавага крызісу 1997 г.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання*:** з моманту вызвалення з-пад улады Японіі і да канца 80-х гг. XX ст. на Тайвані існаваў аўтарытарны палітычны рэжым пры палітычным панаванні Гаміньдана. У канцы XX ст. на Тайвані ўсталявалася дэмакратычная палітычная сістэма.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2. - С.160-165.

*У падручніку разгледжаны працэс станаўлення ўлады Гаміньдана на Тайвані, партыйная структура, усталяванне асабістай улады Чан Кайшы. Без належнай глыбіні пададзена праблема дэмакратызацыі на Тайвані. Разглядаецца пытанне аб’яднання вострава з КНР.*

История Китая. – М., 1998. - Гл. 18, § 3. Гл. 19, § 5. Гл.20, § 3.

*У выданні прааналізаваны аўтарытарны характар палітычнага рэжыму на Тайвані ў 50-80-я гг. і паказана, што сацыяльна-эканамічныя перамены сталі асноўнай перадумовай дэмакратызацыі.*

Окиненко А. Модернизация на Тайване // Мировая экономика и международные отношения- 1993.- №2.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце палітычны рэжым, які ўсталяваўся на Тайвані ў час праўлення Чан Кайшы;

*Неабходна адзначыць, што Гаміньдан не меў канкурэнтаў у барацьбе за ўладу на востраве, аформіўся рэжым асабістай улады Чан Кайшы.*

- вызначце, якія перамены адбыліся ў палітычным жыцці Тайваня пасля смерці Чан Кайшы;

*Звярніце ўвагу на тое, што ў час праўлення сына Чан Кайшы Цзян Цзынго былі праведзены на Тайвані першыя дэмакратычныя рэформы, якія прывялі да сапраўднай шматпартыйнасці і страты Гаміньданам манаполіі на ўладу ў выніку прэзідэнцкіх выбараў 2000 г.*

- прааналізуйце міжнародна-палітычнае становішча Тайваня і вызначце перспектывы яго ўз’яднання з КНР;

*Улічыце, што ва ўмовах “халоднай вайны” Тайвань мог падтрымліваць дыпламатычныя адносіны толькі з часткай краін свету. Пры гэтым у яго правячых колах ішла пастаянная барацьба паміж прыхільнікамі самастойнай дзяржавы на востраве і тымі, хто разглядаў урад у Тайбэі як агульнакітайскі.*

**Парадак вывучання чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля атрымання незалежнасці Тайвань, дзякуючы паспяховай палітыцы індустрыялізацыі, да канца XX ст. ператварыўся ў развітую індустрыяльную краіну з сучаснай сацыяльна-эканамічнай структурай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

История Китая.- М., 1998. - Гл.18, § 3. Гл. 19, § 5. Гл 20, § 3.

*Выданне ўтрымлівае аналіз прычын эканамічных поспехаў Тайваня, вызначае сутнасць дзяржаўнай эканамічнай палітыкі і дасягненні краіны ў сацыяльна-эканамічнай сферы.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. - С. 545- 548.

*Аўтарам зроблены глыбокі аналіз ролі цывілізацыйнага фундаменту ў дасягненні Тайванем эканамічнага поспеху.*

Буров В.Г. Модернизация тайваньского общества. – М., 1999. (Манаграфія можа быць выкарыстана ў якасці дадатковай літаратуры).

*У манаграфіі ў комплексе разгледжаны розныя аспекты мадэрнізацыі на Тайвані, вынікам якой стала яго ператварэнне ў НІК.*

Окиненко А. Модернизация на Тайване // Мировая экономика и международные отношения- 1993.- №2.

Максимов А.А. Экономический рост на Тайване // Народы Азии и Африки. – 1989.- №1.

*Аўтары гэтых двух артыкулаў ілюструюць эканамічныя поспехі Тайваня шматлікімі дадзенымі і робяць аналіз іх прычын.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце прычыны і перадумовы хуткага эканамічнага росту на Тайвані ў 50 – 80-я гг. ХХ ст.;

*Звярніце ўвагу на тое, якую эканамічную спадчыну пакінулі японцы на Тайвані, на аграрную рэформу як перадумову эканамічнага ўздыму, адзначце ролю амерыканскай дапамогі.*

- вызначце характэрныя рысы індустрыялізацыі на Тайвані ў 50-я - першай палове 80-х гг. ХХ ст.;

*Неабходна адзначыць няўдачу палітыкі імпартазамяшчэння і поспех экспартаарыентаванай мадэлі, асаблівасці дзяржаўнага рэгулявання, устанавіць ролю замежных інвестыцый.*

- ахарактарызуйце стан эканомікі Тайваня ў сярэдзіне 1980-х гг. як новай індустрыяльнай дзяржавы;

*Тут трэба паказаць, што менавіта індустрыя стала найважнейшай галіной эканомікі.*

- устанавіце адметныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця Тайваня на новым этапе ў канцы ХХ ст.-пачатку ХХІ ст.;

*Неабходна звярнуць увагу на тое, што на гэтым этапе адбываецца прыярытэтнае развіццё навукаёмістай вытворчасці, вядучая роля ў эканоміцы пераходзіць ад індустрыі да сферы паслуг, Тайвань ператвараецца ў адзін з найбуйнейшых фінансавых цэнтраў свету.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** развіццё Сінгапура і Ганконга як новых індустрыяльных краін у апошнія дзесяцігоддзі мела свае спецыфічныя рысы, да ліку якіх адносіцца тое, што гэта фактычна гарады-дзяржавы, якія маюць выгаднае геаграфічнае становішча і зведалі працяглы час уздзеянне англійскага каланіяльнага рэжыму.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2. - С.158-160, 215-218.

*У падручніку дадзена агульная характарыстыка палітычных сістэм Сінгапура і Ганконга і сучасны стан іх эканомік.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. - Т.2. - С.461-462.

*Аўтар характарызуе перадумовы эканамічных поспехаў Сінгапура, яго дасягненні за апошні час.*

Мак Хонг. Сингапур. История успеха // Новая и новейшая история. - 1997. - №4.

*У артыкуле вызначаны асноўныя этапы эканамічнага развіцця Сінгапура, ахарактарызавана дзяржаўная палітыка ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Аўтар некрытычна ставіцца да палітычнай сістэмы краіны, для якой характэрны рысы аўтарытарызму.*

Козлов А. Гонконг накануне возвращения в Китай // Международная жизнь. – 1996. - №4.

*Аўтар характарызуе стан эканомікі і палітычныя рэформы, якія правяла Англія перад тым, як Ганконг быў далучаны да КНР.*

Заказникова Е.П. Юго-Восточная Азия: в поисках лучшего будущего. – М., 1991. - С.8-23.

*Манаграфія ўтрымлівае матэрыял, які дазваляе прасачыць ход эканамічнага развіцця Сінгапура за апошнія дзесяцігоддзі.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце прычыны і перадумовы паскоранага эканамічнага развіцця Сінгапура і Ганконга ў другой палове XX - пачатку XXI ст.;

*Пры выкананні гэтага задання неабходна ўказаць на ролю выгаднага геаграфічнага становішча, асаблівасці цывілізацыйнага фундаменту, ролю англійскага каланіялізму.*

- ахарактарызуйце ход сацыяльна-эканамічнага развіцця Сінгапура і Ганконга ў другой палове XX – пачатку XXI ст.;

*Неабходна звярнуць увагу на характар выбранай эканамічнай мадэлі і дзяржаўнай палітыкі, на выключна вялікае значэнне сферы паслуг, на ролю міжнароднага гандлю, на прыярытэтнае развіццё навукаёмістых галін.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- вызначце асаблівасці палітычнага развіцця Ганконга пасля другой сусветнай вайны спачатку пад уладай Англіі, а затым у складзе КНР;

*Пры выкананні гэтага вучэбнага задання асноўную ўвагу ўдзяліце мерам англійскіх уладаў па дэмакратызацыі палітычнай сістэмы Ганконга ў апошні перыяд праўлення, умовам яго далучэння да КНР і статусу ў яе складзе.*

- прасачыце, як Сінгапур дасягнуў дзяржаўнай незалежнасці і вызначце характэрныя рысы і найважнейшыя падзеі яго палітычнага развіцця ў 60-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.;

*Звярніце ўвагу на тое, што Сінгапур пасля вызвалення з-пад улады Англіі некаторы час уваходзіў у склад Малайзійскай федэрацыі, а затым стаў незалежнай дзяржавай. У краіне ўсталяваўся рэжым панавання Партыі народнага дзеяння пры фармальным існаванні шматпартыйнасці і парламенцкай сістэмы.*

**Самакантроль па ВЭ-2.**

1 Пералічыце стартавыя ўмовы, якія паспрыялі паскоранаму эканамічнаму развіццю ў другой палове XX ст.:

а) Рэспублікі Карэя; б) Тайваня; в) Сінгапура; г) Ганконга.

2 Дайце характарыстыку палітыкі дзяржаўнага рэгулявання ў другой палове XX ст. у Рэспубліцы Карэя (РК), Тайвані, Сінгапуры, Ганконгу.

3 Чаму названыя краіны абралі экспартаарыентаваную мадэль развіцця ?

4 Якую ролю ў індустрыялізацыі РК, Тайваня , Сінгапура і Ганконга адыграў замежны капітал?

5 Выдзеліце этапы сацыяльна-эканамічнага развіцця гэтых краін пасля другой сусветнай вайны і дайце іх характарыстыку.

6 Чым характарызаваўся палітычны рэжым у 50 – 80-я гг. XX ст. РК і Тайваня?

7 Калі пачаўся і як адбываўся пераход РК і Тайваня да дэмакратыі? Чым ён быў выкліканы?

## ВЭ-3. ІНДАНЕЗІЯ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- асноўныя падзеі, якія звязаны з заваяваннем Інданезіяй незалежнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- спецыфіку канцэпцыі "нацыянальнага сацыялізму" Сукарна;
- змест афіцыйнай ідэалогіі палітычнага рэжыму "новага парадку";
- партыйна-палітычную структуру "накіроўваемай дэмакратыі" і "новага парадку";
- асноўныя кірункі знешняй палітыкі Інданезіі пасля 1945 г.;
- калі, як і чаму пала дыктатура Сухарта;

***умець*:**

- вызначыць сутнасць рэжыму "накіроўваемай дэмакратыі";
- даць характарыстыку падзей 1965 г.;
- параўнаць і вызначыць адметныя рысы палітычнай сістэмы і эканамічнай мадэлі Інданезіі да перавароту 1965 г. і пасля яго;
- зрабіць аналіз сацыяльна-эканамічнай мадэлі Інданезіі пасля перавароту 1965 г. і вызначыць прычыны высокіх тэмпаў яе эканамічнага росту ў 70-я - першай палове 90-х гг. XX ст.;
- вызначыць, як цывілізацыйныя традыцыі Інданезіі ўплывалі на ход гістарычнага працэсу ў гэтай краіне пасля заваявання незалежнасці;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-3:***

1 Заваяванне незалежнасці Галандскай Індыяй і ўтварэнне Рэспублікі Інданезія;

2 Канцэпцыя "нацыянальнага сацыялізму" Сукарна і спроба яе ажыццяўлення ў сярэдзіне 1950-х – 1965 гг.

3 Падзеі 30 верасня 1965 г. і станаўленне дыктатуры генерала Сухарта (1965 – 1968 гг.).

4 Палітычная сістэма і афіцыйная ідэалогія рэжыму "новага парадку" у канцы 60-х – сярэдзіне 90-х гг. XX ст.

5 Эканамічная палітыка рэжыму "новага парадку" ;

6 Крызіс рэжыму "новага парадку" і эвалюцыя палітычнай сістэмы Інданезіі ў канцы 1990-х гг. – пачатку XXI ст.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у выніку другой сусветнай вайны ў сувязі з паражэннем Японіі і значным аслабленнем Галандыі склаліся спрыяльныя ўмовы для заваявання незалежнасці Інданезіяй, але іх рэалізацыя ўскладнялася імкненнем Галандыі з дапамогай сілы захаваць сваю калонію і вострай палітычнай барацьбой унутры інданезійскага грамадства.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру*:**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. –С. 206-207.

*У падручніку ўказана толькі частка падзей, у выніку якіх Інданезія заваявала незалежнасць. Ён не раскрывае шэраг палажэнняў вучэбнай праграмы.*

Цыганков В.А. История Индонезии: Учебник для вузов. - М., 1993.

Капица М.С., Малетин Н.П. Сукарно. Политическая биография.- М., 1980. - С.89-119.

Кялиляев Э.Х. Завоевание независимости Индонезией. – М., 1972.

*Манаграфія ўтрымлівае багаты фактычны матэрыял па пытанню, але вывады зроблены на аснове класавых падыходаў, што скажае і палітыку розных палітычных партый і груп.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце ўмовы, у якіх адбылося абвяшчэнне незалежнасці, і дзяржаўна-палітычную сістэму, якую ўстанавіла канстытуцыя 1945 г. у Інданезіі;

*Звярніце ўвагу на тое, што абвяшчэнне незалежнасці адбылося ва ўмовах ваеннага паражэння Японіі і адсутнасці каланіяльнай улады, а асноўная ідэя канстытуцыі 1945 г. заключалася ва ўсталяванні моцнай прэзідэнцкай улады.*

- прасачыце ход каланіяльнай вайны і прааналізуйце яе вынікі;

*Неабходна адзначыць, што каланіяльная вайна суправаджалася пошукам мірнага вырашэння канфлікту, перарывалася пагадненнямі, а дагавор 1949 г. быў у значнай ступені ўвасабленнем кампрамісу.*

- прааналізуйце ход унутрыпалітычнай барацьбы ў Інданезіі ў час антыкаланіяльнай вайны;

*Пры выкананні гэтага задання трэба сканцэнтраваць намаганні на знаёмстве з палітыкай вядучых партый, на Мадыунскіх падзеях, як на спробе камуністычнага перавароту, і на пазіцыі Сукарна ва ўнутрыпалітычнай барацьбе.*

- устанавіце, як адбыўся пераход ад Злучаных Штатаў Інданезіі да унітарнай Рэспублікі Інданезія і ў чым розніца паміж гэтымі дзяржаўнымі ўтварэннямі;

*Звярніце ўвагу на пераход ад канфедэратыўнай дзяржавы да унітарнай і на ліквідацыю Галандска-Інданезійскага саюза.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у перыяд з сярэдзіны 50-х гг. да 1965 г. Інданезія ва ўмовах палітычнага рэжыму “накіроўваемай дэмакратыі” ажыццяўляла будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму, ідэолагам якога выступаў прэзідэнт Сукарна.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. – С. 207-210.

*У падручніку пералічаны не ўсе рысы рэжыму "накіроўваемай дэмакратыі", не раскрыты яе ключавыя моманты: аўтарытарызм і сістэма кансультацый, адсутнічае характарыстыка эканамічнай палітыкі Сукарна.*

Капица М.С., Малетин Н.П. Сукарно. Политическая биография.- М., 1980.

*Аўтары даюць аб'ектыўную трактоўку "накіроўваемай дэмакратыі" як прапанаваную Сукарна альтэрнатыву ліберальнай дэмакратыі і спробу ўстанавіць яго аўтарытарную ўладу. Паказана нарастанне эканамічных цяжкасцей у Інданезіі.*

Цыганков В.А. История Индонезии: Учебник для вузов. - М., 1993.

*У гэтым выданні ўжо пераадолены недахопы марксісцкай гістарыяграфіі з яе класавым падыходам і дадзена дастаткова аб'ектыўная ацэнка тых грамадскіх працэсаў, якія адбываліся ў Інданезіі.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прасачыце ход міжпартыйнай барацьбы ў пачатку і сярэдзіне 1950-х гг.;

*Вы павінны ведаць Нацыянальную партыю, Камуністычную партыю і партыю Машумі і іх палітычныя мэты і праграмы, вынікі ўсеагульных выбараў 1955 г.*

- прааналізуйце ідэалагічную базу "накіроўваемай дэмакратыі" як яе сфармуляваў Сукарна;

*Яе асноўнымі элементамі сталі тэзісы аб сістэме кансультацый, аўтарытарнай уладзе прэзідэнта, непрымальнасці для Інданезіі заходняй дэмакратыі, бо яна супярэчыць нацыянальнай традыцыі.*

- выявіце і ахарактарызуйце найважнейшыя элементы палітычнай сістэмы "накіроўваемай дэмакратыі";

*Да гэтых элементаў адносіцца інстытут прэзідэнства, функцыянальныя групы, партыйная сістэма, Нацыянальны кангрэс і парламент, выявіце ролю арміі.*

- ахарактарызуйце знешнепалітычны курс Інданезіі ў 1950-я – 1965 гг.;

*Звярніце ўвагу на ўдзел Інданезіі ў Руху недалучэння і на імкненне Сукарна пастаянна мець знешняга ворага для інданезійскага народу.*

- вызначце характэрныя рысы эканамічнай палітыкі Сукарна ў 50-я-1965 гг. Для гэтага скарыстайце і тэкст дакумента:

"Закон аб нацыяналізацыі галандскіх прадпрыемстваў 27 снежня 1958 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прэзідэнт Рэспублікі Інданезія, улічваючы,<…>

В) што нацыяналізацыя галандскіх прадпрыемстваў накіравана на забеспячэнне максімальнай карысці для інданезійскага грамадства, на ўмацаванне і абарону дзяржавы,пастанаўляе; <…>

Пункт 1.

Галандскія прадпрыемствы на тэрыторыі Рэспублікі Інданезія … падвяргаюцца нацыяналізацыі і абвяшчаюцца поўнай і свабоднай уласнасцю дзяржавы Рэспублікі Інданезія.

Пункт 2.

Уладальнікам прадпрыемстваў, якія ўказаны ў пункце 1, прадастаўляецца кампенсацыя выдаткаў, размеры якіх вызначаюцца камітэтам асоб, якіх прызначае ўлада.”

(Хрестоматия по новейшей истории. – М., 1976 - С.209)

*Неабходна адзначыць узмацненне ролі дзяржавы ў эканоміцы, выцясненне замежнага капіталу, ролю ваенных у кіраванні эканомікай, фарміраванне бюракратычнай буржуазіі, нарастанне сацыяльна-эканамічных праблем.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** няўдалая спроба блізкіх да КПІ і Сукарна ваенных ажыццявіць дзяржаўны пераварот выклікала шырокамаштабныя рэпрэсіі з боку арміі супраць левых сіл, адхіленне ад улады прэзідэнта Сукарна і ўсталяванне ў краіне ваеннай дыктатуры генерала Сухарта.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. – С. 209-210.

*У дапаможніку прыгадваюцца толькі некаторыя падзеі, звязаныя са зменай палітычнага рэжыму ў Інданезіі і практычна не раскрываецца іх сутнасць.*

Капица М.С., Малетин Н.П. Сукарно. Политическая биография.- М., 1980. – § 8,9,10.

*У манаграфіі даволі аб’ектыўна паказана наспяванне крызісу рэжыму Сукарна ў розных сферах. Аўтары прызналі ўдзел КПІ ў падзеях “30 верасня” і прасачылі, як Сукарна паступова перадаў свае паўнамоцтвы Сухарта.*

Цыганков В.А. История Индонезии: Учебник для вузов. - М., 1993.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, у чым праяўлялася нарастанне эканамічнага і палітычнага крызісу ў Інданезіі ў першай палове 1960-х гг.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Звярніце ўвагу на неэфектыўнасць дзяржаўнай эканомікі, на імкненне Сукарна вырашаць сацыяльна-эканамічныя праблемы палітычнымі метадамі, на рост уплыву, з аднаго боку, бюракратычнай буржуазіі і звязаных з ёю ваенных, а з другога, КПІ.*

- прасачыце ход падзей у кастрычніку 1965 г., вызначце, якія палітычныя сілы стаялі за "падзеямі 30 верасня", якія мэты яны мелі, як змянілася ў выніку іх расстаноўка палітычных сіл;

*Вы павінны адзначыць, што ініцыятарамі падзей стала група ваенных, якія былі звязаны з Сукарна і КПІ, і якія імкнуліся накіраваць палітычнае жыццё ў бок больш радыкальных пераўтварэнняў. Але армія рашуча выступіла супраць удзельнікаў перавароту, у выніку чаго былі цалкам разгромлены КПІ і блізкія да яе арганізацыі.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** да канца 60-х гг. XX ст. у Інданезіі ўсталяваўся рэжым "новага парадку", што ўяўляў сабою аўтарытарную ваенную дыктатуру, пры якой захаваліся падкантрольныя арміі дэкаратыўныя прадстаўнічыя органы, фармальная шматпартыйнасць, і якая абапіралася на традыцыйны патэрналізм інданезійскага грамадства і ідэю аб самабытным шляху яго развіцця.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. – С. 210-211.

*У падручніку больш увагі звернута на эвалюцыю партыйнай сістэмы, але не паказана сутнасць рэжыму "новага парадку" з яго сістэмай функцыянальных груп і кансультацыяй, толькі ў агульным плане сказана пра яго ідэалогію.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001 – Т.2. – С.465-468.

*Дапаможнік вызначае сутнасць працэсаў, якія характэрны для гісторыі незалежнай Інданезіі, але не ўтрымлівае неабходнай колькасці фактычнага матэрыялу.*

Цыганков В.А. История Индонезии: Учебник для вузов. - М., 1993.

Другов А.Ю. Политическая власть и эволюция политической системы в Индонезии. – М., 1989.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце афіцыйную ідэалогію палітычнага рэжыму "новага парадку";

*Вы павінны зыходзіць з таго, што яе найважнейшымі момантамі з'яўляліся распрацаваныя Сукарна ідэі панча сілы, непрымальнасць ліберальнай дэмакратыі, самабытнасць інданезійскага шляху*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*развіцця, патэрналісцкая роля дзяржавы, якія былі дапоўнены забаронай марксісцка-ленінскай ідэалогіі.*

- прааналізуйце перамены ў партыйна-палітычнай структуры Інданезіі ў рамках рэжыму "новага парадку";

*Пры выкананні гэтага задання неабходна адзначыць, што партыі апынуліся пад жорсткім кантролем арміі, маглі дзейнічаць толькі тыя з іх, якія прызнавалі афіцыйную ідэалогію.*

- вызначце найважнейшыя адметныя рысы рэжыму "новага парадку", дайце іх характарыстыку;

*Перш за ўсё звярніце ўвагу на кіруючую ролю арміі ў грамадстве, на аўтарытарную ўладу прэзідэнта, на захаванне квазіпарламентарызму і фармальнай шматпартыйнасці.*

- падумайце, у чым прычына захавання даволі доўгачасовай стабільнасці рэжыму "новага парадку" і асабістай улады Сухарта;

*Пры разглядзе гэтай праблемы, звярніце ўвагу на тое, як ідэалогія і палітыка гэтага рэжыму суадносіліся з цывілізацыйнай традыцыяй Інданезіі, якую ролю ў забеспячэнні стабільнасці адыгрывалі рэпрэсіі, рэгламентацыя палітычнай дзейнасці, поспехі ў эканоміцы.*

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля дзяржаўнага перавароту 1965 г. была ліквідавана "накіроўваемая эканоміка", і Інданезія пачала пераход да адкрытай ліберальнай эканамічнай мадэлі, у рамках якой былі дасягнуты значныя поспехі і ў сярэдзіне 1990-х гг. краіна наблізілася па ўзроўню развіцця да новых індустрыяльных краін.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. –С. 210-211.

*У падручніку паказаны сацыяльна-эканамічныя дасягненні Інданезіі ва ўмовах "новага парадку", але не разгледжаны сутнасць і найважнейшыя элементы эканамічнай палітыкі, адзначана ўздзеянне ўсходнеазіяцкага крызісу на Інданезію.*

Цыганков В.А. История Индонезии: Учебник для вузов. - М., 1993.

Сумский В. Индонезия: феномен динамичной стабильности // Мировая эканомика и международныя отношения. – 1993. - № 6.

Заказникова Е.П. Юго-Восточная Азия: в поисках лучшего будущего. – М., 1991. – С.8-23

*Манаграфія ўтрымлівае значны фактычны матэрыял, які добра ілюструе дынаміку сацыяльна-эканамічнага развіцця Інданезіі ў 70 – 80-я гг. XX ст.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Михеев В. Азиатский финансовый кризис и его последствия // Международная жизнь. - 1999. – № 3.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, якія змены ў сістэму “накіроўваемай эканомікі” ўнёс ваенны рэжым у 1965-1968 гг.

*Адзначце такія новыя моманты ў эканамічнай палітыцы, як легалізацыя капіталаў, стымуляванне ўнутраных і замежных прыватных інвестыцый, аслабленне дзяржаўнай рэгламентацыі і рэгулявання.*

- прааналізуйце, які ўплыў на эканамічнае развіццё Інданезіі аказала палітыка “адчыненых дзвярэй”;

*Пры выкананні гэтага задання неабходна ўказаць на значную ролю замежных інвестыцый у развіцці шэрагу галін эканомікі Інданезіі і ў той жа час адзначыць, што дзейнасць ТНК ішла часам у разрэз з нацыянальнымі інтарэсамі краіны і вяла да мадэрнізацыі толькі вуз-кай групы галін эканомікі.*

- дакажыце, што ў сярэдзіне 90-х гг. XX ст. Інданезія наблізілася па ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця да новых індустрыяльных краін;

*Звярніце ўвагу на павелічэнне долі прамысловасці ў ВУП Інданезіі, на стварэнне ў краіне сучасных галін прамысловасці, на значнае павелічэнне аб’ёмаў вытворчасці за апошнія дзесяцігоддзі.*

**Парадак вывучэння шостага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** ва ўмовах усходнеазіяцкага фінансава-эканамічнага крызісу праявілася “стомленасць” інданезійскага грамадства ад працяглага аўтарытарнага праўлення Сухарта, яго рэжым паў у выніку народных выступленняў, і пачаўся рух Інданезіі ад сістэмы "новага парадку" да дэмакратыі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2. – С. 211.

*У падручніку паказана вастрыня сацыяльна-эканамічнага крызісу 1997-1998 гг. і названы найважнейшыя палітычныя падзеі 1997–2000 гг., зроблены іх аналіз.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001 – Т. 2. – С.467-468.

*Аўтар дае глыбокі аналіз крызісу 1997-1998 гг. і вызначае яго як фактар, які прывёў да адстаўкі Сухарта.*

Юго-Восточная Азия на пороге XXI в.: экономика, политика, геополитика // Восток. - 2000. - №3.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Михеев В. Азиатский финансовый кризис и его последствия // Международная жизнь. 1999. – №.3.

Сумский В. Кризис в Индонезии: Экономика в интерьере межэтнических отношений // Мировая экономика и международные отношения. – 1999. - №7.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- дайце характарыстыку сацыяльна-эканамічнага крызісу, з якім сутыкнулася Інданезія ў 1997 г.;

*Звярніце ўвагу на тое, што разам са значным падзеннем вытворчасці адбылося імклівае абясцэньванне нацыянальнай валюты, крах спажывецкага рынку і, адпаведна, рэзкае падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва.*

- вызначце прычыны, якія прывялі да парушэння палітычнай стабільнасці і падзення рэжыму Сухарта;

*Асноўны ўпор зрабіце на ўплыў, які аказаў на ход палітычных падзей эканамічны крызіс, адзначце, што падзенне рэжыму Сухарта звязана не толькі з масавымі выступленнямі народа, але і са зменай пазіцыі арміі ў дачыненні да прэзідэнта*

- прасачыце, як адбываецца пераход Інданезіі ад ваенна-аўтарытарнага рэжыму "новага парадку" да дэмакратыі, устанавіце асноўныя супярэчнасці гэтага працэсу;

*У гэтым заданні трэба адзначыць, што армія дапускае толькі плаўную эвалюцыю рэжыму "новага парадку", што прадэманстравалі выбары 1999 г., а працэс дэмакратызацыі ўскладняецца рэлігійна-этнічнымі супярэчнасцямі, вострай міжпартыйнай барацьбой і канфліктамі паміж галінамі ўлады.*

## Самакантроль па ВЭ-3.

1 У якіх умовах і калі адбылося абвяшчэнне незалежнай Інданезіі?

2 Як і калі Інданезія дабілася міжнароднага прызнання сваёй незалежнасці?

3 Якую мадэль развіцця і на якой ідэалагічнай аснове прапанаваў для Інданезіі прэзідэнт Сухарта?

4 У чым сутнасць рэжыму "накіроўваемай дэмакратыі"?

5 Якая дзяржаўная і партыйная структуры яму адпавядалі?

6 Ахарактарызуйце мадэль "накіроўваемай эканомікі"?

7 Якія прычыны "падзей 30 верасня" 1965 г.?

8 Якія мэты ставілі ўдзельнікі гэтых падзей, якую пазіцыю заняў Сукарна?

9 Ахарактарызуйце ідэалогію рэжыму "новага парадку".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

10 Што ўяўлялі сабою партыйная і дзяржаўная структуры рэжыму “новага парадку”?

11 Якімі асноўнымі момантамі характарызавалася эканамічная палітыка “новага парадку”?

12 Якія вынікі эканамічнага развіцця Інданезіі ў 1965 - сярэдзіне 1990-х гг.?

13 Якія прычыны падзення рэжыму Сухарта, і калі яно адбылося?

14 Назавіце найважнейшыя падзеі палітычнага жыцця Інданезіі пасля адстаўкі Сухарта.

## ВЭ-4. МАЛАЙЗІЯ, ТАЙЛАНД І ФІЛІПІНЫ НА ШЛЯХУ ПЕРАТВАРЭННЯ Ў НОВЫЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫЯ КРАІНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць;***

- як і калі заваявалі незалежнасць Малайзія і Філіпіны;
- асаблівасці дзяржаўнага будаўніцтва ў Малайзіі;
- сутнасць аўтарытарнага рэжыму Маркаса на Філіпінах;
- асаблівасці пераходу Філіпін да парламенцкай дэмакратыі;
- ролю ваенных у палітычным жыцці Тайланда пасля другой сусветнай вайны;
- сутнасць эвалюцыі палітычнай сістэмы Тайланда з канца 1970-х гг.;
- асноўныя этапы і найважнейшыя кірункі знешняй палітыкі Малайзіі, Тайланда і Філіпін пасля другой сусветнай вайны;

***умець:***

- ахарактарызаваць асноўныя тэндэнцыі і этапы палітычнага развіцця Малайзіі, Тайланда і Філіпін пасля другой сусветнай вайны;
- вызначыць агульнае і адметнае ў эканамічным развіцці трох названых краін у другой палове XX – пачатку XXI ст.;
- вызначыць, наколькі агульнай і ўстойлівай для гэтых краін стала з канца XX ст. тэндэнцыя да дэмакратызацыі палітычнага жыцця;
- ахарактарызаваць сучасны ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця Малайзіі, Тайланда і Філіпін як новых індустрыяльных краін;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-4:***

1 Асноўныя этапы і тэндэнцыі палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця Тайланда пасля другой сусветнай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2 Заваяванне незалежнасці Малайзіяй, будаўніцтва федэратыўнай дзяржавы і паскоранае эканамічнае развіццё;

3 Атрыманне незалежнасці Філіпінамі, характэрныя рысы і асноўныя этапы іх палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у палітычным жыцці Тайланда пасля другой сусветнай вайны вялікую ролю іграла армія, і, пачынаючы з 1947 г., краіна на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў жыла ва ўмовах ваеннай дыктатуры, і толькі з канца 1970-х гг. пачалося паступовае ўмацаванне дэмакратычных інстытутаў у рамках канстытуцыйнай манархіі. У той жа час краіна за кошт высокіх тэмпаў развіцця эканомікі да канца XX ст. увайшла ў лік новых індустрыяльных дзяржаў.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч-2. – С. 191-195.

*У падручніку пералічаны найважнейшыя падзеі палітычнай гісторыі Тайланда, паказана роля ваенных і ўмацаванне дэмакратычнай тэндэнцыі ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. Але не раскрыты сацыяльна-эканамічныя працэсы.*

Васильев Л.С. История Востока. –М., 2001. - Т.2. – С.462-464.

*Аўтар выдзяляе два этапы ў палітычнам жыцці Тайланда: панаванне ваенных да канца 70-х гг. і станаўленне дэмакратычнага праўлення, адзначае поспехі яго эканомікі з канца 70-х гг. і вызначае іх прычыны.*

Заказников Е.П. Юго-Восточная Азия: в поисках лучшего будущего. – М., 1991 –С.8-23.

*У манаграфіі паказаны ход эканамічнага развіцця і сацыяльныя змены ў Тайландзе ў 70-80-я гг. XX ст.*

Михеев В. Азиатский финансовый кризис и его последствия // Международная жизнь. - 1999. - №3.

Доронин И. Причины и последствия кризиса // Мировая эканомика и международныя отношения. - 1999 - №4.

Калашников Н.И. Эволюция политической системы Тайланда. – М., 1987.

*У манаграфіі з марксісцкіх пазіцый прасочаны рух Тайланда ад ваенна-дыктатарскіх рэжымаў да буржуазнай дэмакратыі ў форме канстытуцыйнай манархіі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мосяков Д.В., Тюрин В.А. История Юго-Восточной Азии. – М., 2004.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце прычыны актыўнага ўдзелу ваенных у палітычным жыцці Тайланда;

*Звярніце ўвагу на тое, што гэтыя прычыны былі шматгранныя, і яны звязаны з нявырашанасцю шматлікіх эканамічных і сацыяльных праблем, з адсутнасцю дэмакратычнай традыцыі, з разгортваннем "халоднай вайны" ў свеце.*

- прасачыце асноўныя этапы і кірункі палітыкі ваенных рэжымаў у канцы 1940-х – пачатку 1970-х гг.;

*Заўважце, што ў палітыцы таго ці іншага рэжыму з часам пачынала назірацца тэндэнцыя да некаторай лібералізацыі палітычнага жыцця, але чарговы ваенны пераварот зноў вяртаў краіну да жорсткай дыктатуры.*

- вызначце асноўныя моманты барацьбы аўтарытарнай і дэмакратычнай тэндэнцый у палітычным жыцці Тайланда з сярэдзіны 1970-х гг.;

*Неабходна адзначыць, што працэс дэмакратызацыі ў Тайландзе ў многім звязаны са зменамі ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны, вялікую ролю ў ім адыгрывае інстытут канстытуцыйнай манархіі. Ваенныя імкнуліся захаваць пераважны ўплыў на палітычнае жыццё, але пацярпелі няўдачу.*

- прааналізуйце ход эканамічнага развіцця Тайланда ў апошнія дзесяцігоддзі і дакажыцце, што ён ператварыўся ў новую індустрыяльную краіну;

*Звярніце ўвагу, што Тайланд выбраў ліберальную эканамічную мадэль і, пачаўшы ў 60-я гг. індустрыялізацыю з галін лёгкай прамысловасці, у 80-я гг. зрабіў пераход да эканомікі, у аснове якой сучасныя навукаёмкія галіны.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** шэраг брытанскіх калоній у Паўднёва-Усходняй Азіі ўтварылі федэратыўную дзяржаву Малайзія, якая пасля заваявання незалежнасці абрала капіталістычны шлях развіцця і да канца ХХ ст. ператварылася ў развітую індустрыяльную краіну.

***Для вывучэння гэтага пытання вакарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. - М., 2001. – Ч.2.– С.212-215

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У падручніку знайшлі адлюстраванне пытанні, якія звязаны з заваяваннем незалежнасці і ўтварэннем федэрацыі, акцэнтуецца ўвага на вострых рэлігійна-этнічных супярэчнасцях, названы найважнейшыя дасягненні эканамічнага развіцця.*

Васильев Л.С. История Востока. –М., 2001. - Т.2. – С.464-465.

*Асноўную ўвагу аўтар дапаможніка канцэнтруе на сацыяльна-эканамічных працэсах, якія адбываліся ў Малайзіі ў апошнія дзесяцігоддзі, на палітыку "малайізацыі".*

Заказникова Е.П. Юго-Восточная Азия в поисках лучшего будущего. – М., 1991. - С.8-23.

*Манаграфія дазваляе пазнаёміцца са стратэгіяй эканамічнага развіцця Малайзіі ў 60-80-я гг. XX ст., ацаніць яго тэмпы і вызначыць змены ў сацыяльнай структуры.*

Доронина И. Причины и последствия кризиса // Мировая эканомика и международные отношения- 1999.-№4

*Аўтар аналізуе, якія змены ў сацыяльна-эканамічную палітыку ўнеслі ўлады Малайзіі, падкрэслівае ўзмацненне нацыялістычных тэндэнцый.*

Амиров В. Страны АСЕАН – разные пути выхода из кризиса // Мировая экономика и международные отношения. - 1999. - №5.

Гусев М. Малайзия. Ставка на собственные силы и ресурсы // Азия и Африка сегодня. – 2005. - №4. – С.52-53.

*Артыкулы дазваляюць выявіць той шлях перадолення крызісу 1997 г., які выбрала Малайзія.*

Мосяков Д.В., Тюрин В.А. История Юго-Восточной Азии. – М., 2004.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прааналізуйце працэс станаўлення Федэрацыі Малайзіі як незалежнай дзяржавы і вызначце яго асноўныя этапы і праблемы (да 1965 г.);

*Неабходна адзначыць, што фарміраванне федэрацыі пачалі яшчэ каланіяльныя ўлады, і гэты працэс працягваўся пасля заваявання незалежнасці. Прычым, уплыў на яго аказвалі не толькі ўнутраныя, але і знешнія фактары.*

- вызначце асноўныя тэндэнцыі і супярэчнасці палітычнага развіцця Малайзіі пасля 1965 г. і асаблівасці яе дзяржаўнага ладу;

*Звярніце ўвагу на тое, што палітычная барацьба ў Малайзіі вялася галоўным чынам вакол шляхоў вырашэння нацыянальна-рэлігійных супярэчнасцей, а спецыфіка дзяржаўнага ладу вынікае з асаблівасцей федэратыўнай пабудовы краіны.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- прааналізуйце мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця Малайзіі, вызначце яго асноўныя этапы, тэндэнцыі, дасягненні за час незалежнасці;

*Ключавым палажэннем пры выкананні гэтага задання з'яўляецца тое, што Малайзія з самага пачатку выбрала капіталістычны шлях развіцця, рынкавую эканоміку і ў рамках гэтай мадэлі змагла дасягнуць да канца XX ст. узроўню сярэднеразвітай індустрыяльнай краіны. Але пры гэтым улічвалася і нацыянальная спецыфіка, асабліва ў сувязі з крызісам 1997 г.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля атрымання незалежнасці Філіпіны на працягу другой паловы XX ст. развіваліся ва ўмовах вострай палітычнай барацьбы з праявамі грамадзянскай вайны, што тармазіла сацыяльна-эканамічнае развіццё, і на мяжы XX-XXI стст. яны толькі наблізіліся да ўзроўню новых індустрыяльных краін.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч-2. – С. 201-206.

*У падручніку дэталёва разгледжана партыйна-палітычная барацьба, дадзена характарыстыка дыктатуры Маркаса. Нельга пагадзіцца з тым, што аўтары характарызуюць барацьбу з левааэкстрэмісцкімі групоўкамі як барацьбу з дэмакратычнымі арганізацыямі. Характарыстыка працэсу дэмакратызацыі пасля 1986 г. вельмі сціслая.*

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. - Т.2. – С.468-470.

*У дапаможніку дадзена агульная характарыстыка палітычных падзей пасля адстаўкі Маркаса і эканамічнай мадэлі, па якой развіваліся незалежныя Філіпіны.*

Заказникова Е.П. Юго-Восточная Азия в поисках лучшего будущего. – М., 1991. - С.8-23.

*Манаграфія дазваляе прасачыць ход эканамічнага развіцця Філіпін і сацыяльныя зрухі ў грамадстве ў 70-80-я гг. XX ст.*

Амиров В. Страны АСЕАН: разные пути выхода из кризиса // Мировая экономика и международные отношения. - 1999. - №5.

*Аўтар адзначае, што сутыкнуўшыся з фінансава-эканамічным крызісам, Філіпіны зрабілі стаўку на далейшую лібералізацыю эканомікі.*

Левтонова В.С. Филиппинская модель либеральной демократии в Азии // Восток. – 1998. - №3.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У артыкуле аналізуецца працэс дэмакратызыцыі пасля адстаўкі Маркаса, яго цяжкасці, спецыфіка ў сувязі з асаблівасцямі цывілізацыйнай традыцыі.*

Мосяков Д.В., Тюрин В.А. История Юго-Восточной Азии. – М., 2004.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- праналізуйце ход партыйна-палітычнай барацьбы ў Філіпінах у сярэдзіне 40-х–сярэдзіне 60-х гг. XX ст.;

*Неабходна адзначыць, што ў краіне вострыя сацыяльна-палітычныя супярэчнасці перапляталіся з этнічна-рэлігійнымі. У выніку ў палітычнай барацьбе прасочваюцца праявы грамадзянскай вайны.*

- дайце характарыстыку сацыяльна-палітычнай прыроды дыктатуры Маркаса;

*Звярніце ўвагу на тое, што ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму Маркаса ўсё ж захаваліся некаторыя інстытуты ліберальнай дэмакратыі, а ў аснову дзяржаўнай ідэалогіі былі пакладзены прынцыпы філі-пінскага нацыяналізму.*

- прасачыце працэс дэмакратызацыі на Філіпінах пасля адстаўкі Маркаса, вызначце яго спецыфіку;

*Пры выкананні гэтага задання зыходзьце з таго, што працэс станаўлення ліберальнай дэмакратыі адбываўся ва ўмовах традыцыйнага грамадства, грамадзянскай вайны, імкнення арміі іграць актыўную ролю ў палітыцы.*

- устанавіце асноўныя этапы эканамічнага развіцця незалежных Філіпін, сутнасць і вынікі кожнага з іх;

*Адзначце, што толькі з 80-х гг. эканамічнае развіццё Філіпін паскорылася, і яны сталі набліжацца да ўзроўню новых індустрыяльных краін.*

## Самакантроль па ВЭ-4.

1 Якім шляхам атрымалі незалежнасць Малайзія і Філіпіны?

2 Якія этапы прайшло будаўніцтва Федэрацыі Малайзія?

3 Чым характарызавалася палітычнае жыццё Тайланда ў сярэдзіне 40-х – сярэдзіне 70-х гг.?

4 Якія перамены ў палітычным жыцці Тайланда адбыліся з другой паловы 70-х гг.?

5 Якія асноўныя праблемы і супярэчнасці палітычнага развіцця незалежнай Малайзіі?

6 Дайце характарыстыку рэжыму Маркаса на Філіпінах.

7 У чым спецыфіка пераходу Філіпін да дэмакрактыі пасля адстаўкі Маркаса.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

8 Ахарактарызуйце эканамічныя мадэлі Тайланда, Малайзіі і Філіпін у другой палове XX ст.

9 Вызначыце асноўныя этапы эканамічнага развіцця гэтых краін пасля другой сусветнай вайны.

10 Як на эканамічнае развіццё Тайланда, Малайзіі і Філіпін паўплываў усходнеазіяцкі крызіс?

## ВЭ-К. ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ ПА МОДУЛЮ

*Перш чым прыступаць да выканання кантрольных заданняў, успомніце, якія мэты ставіліся пры вывучэнні модуля, якая яго вядучая ідэя, якія асноўныя паняцці трэба было засвоіць.*

***Кантрольныя заданні***

1 Назавіце важнейшыя рэформы, якія былі праведзены ў Японіі ў час амерыканскай акупацыі.

2 Аграрная рэформа ў пасляваеннай Японіі прадугледжвала:

а) ліквідацыю памешчыцкага землеўладання; б) шырокае развіццё арэнды; в) экспрапрыяцыю памешчыцкіх зямель; г) надзяленне зямлёй сялян; д) выкуп зямлі ў памешчыкаў.

3 У выніку палітычных рэформаў у пасляваеннай Японіі:

а) усталявалася шматпартыйнасць; б) была ліквідавана манархія; в) сінта стала дзяржаўнай рэлігіяй; г) была праведзена дэмілітарызацыя краіны; д) была забаронена дзейнасць кампартыі.

4 Палітыка “зваротнага курса” прадугледжвала:

а) хуткую эканамічную адбудову Японіі; б) ператварэнне Японіі ў моцную ваенную дзяржаву; в) максімальнае аслабленне пераможанай Японіі; г) вывад акупацыйных войскаў.

*Успомніце, калі пачала праводзіцца палітыка “зваротнага курсу”.*

5 Назавіце прычыны японскага эканамічнага “цуда” 50 – 60-х гг. XX ст.

6 З 1955 г. у палітычным жыцці Японіі дамінавала ___________________ партыя, а галоўнай апазіцыйнай сілай з’яўлялася ______________________ партыя.

7 Наступствам эканамічных крызісаў сярэдзіны 1970-х і пачатку 1980-х гг. стала:

а) пераход да экспартаарыентаванай эканомікі; б) пераарыентацыя эканомікі на задавальненне перш за ўсё патрэб унутранага рынку;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

в) пераход да энерга- і рэсурсазберагаючых тэхналогій; г) узмацненне рэгулюючай ролі дзяржавы.

8 Назавіце прычыны і праявы палітычнага крызісу ў Японіі ў канцы 80-х-пачатку 90-х гг.

9 ЛДП упершыню ў сваёй гісторыі страціла ўладу ў:

1) 1988; 2) 1990; 3) 1993; 4) 1995.

10 З 1926 г. па 1988 г. імператарам Японіі з'яўляўся __________.

11 Сан-Францыскі мірны дагавор прадугледжваў:

1) спыненне акупацыі Японіі войскамі ЗША; 2) страту Японіяй Карэі і Тайваня; 3) страту Японіяй Паўднёвага Сахаліна і Курыльскіх астравоў; 4) страту Японіяй в. Акінава і в. Хакайда; 5) падзел Японіі на зоны акупацыі пераможцамі.

12 Дагавор бяспекі 1951 г. паміж ЗША і Японіяй прадугледжваў:

1) поўны вывад амерыканскіх войскаў з Японіі; 2) захаванне амерыканскіх ваенных баз у Японіі; 3) права ЗША выкарыстоўваць свае войскі для падаўлення ўнутраных беспарадкаў у Японіі; 4) аднаўленне адміністрацыйнай улады Японіі на востраве Акінава.

13 Якую палітыку ў дачыненні да суседніх азіяцкіх краін праводзіць пасляваенная Японія?

14 Якім чынам імкнецца павысіць сваю ролю ў міжнародных справах сучасная Японія?

15 Праблема паўночных тэрыторый для Японіі гэта:

1) асваенне вострава Хакайда; 2) вяртанне чатырох паўднёвакурыльскіх астравоў; 3) атрыманне канцэсій на в. Сахалін; 4) прэтэнзіі на савецкае (расійскае) Прымор'е.

16 Назавіце чатыры новыя індустрыяльныя краіны першай хвалі.

17 Назавіце дзяржавы Паўднёва-Усходняй Азіі, якія адносяцца да другой хвалі новых індустрыяльных краін.

18 Аграрная рэформа, якая была праведзена ў Паўднёвай Карэі і на Тайвані ў пачатку 50-х гг. XX ст. прадугледжвала:

1) выкуп памешчыцкай зямлі; 2) экспрапрыяцыю памешчыцкай зямлі; 3) надзяленне зямлёй сялян; 4) нязначнае абмежаванне памешчыцкага землеўладання.

19 Для эканамічнай палітыкі новых індустрыяльных краін у 60 – 70-я гг. XX ст. характэрна:

1) развіццё навукаёмістай вытворчасці; 2) развіццё працаёмістай вытворчасці; 3) арыентацыя на экспарт; 4) закрытасць эканомікі; 5) актыўнае прыцягненне замежных інвестыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

20 Параўнайце этап эканамічнага развіцця новых і найноўшых індустрыяльных краін, які пачаўся ў другой палове 80-х гг. з этапам 60 – 70-х гг. XX ст.

21 Як усходнеазіяцкі фінансавы крызіс 1997 г. паўплываў на эканамічнае становішча і далейшую эканамічную палітыку новых і найноўшых індустрыяльных краін?

22 Што агульнага ў палітычным развіцці Тайваня, Паўднёвай Карэі, Тайланда ў першыя дзесяцігоддзі пасля другой сусветнай вайны?

23 Якія найважнейшыя прычыны абумовілі працэс дэмакратызацыі ў шэрагу новых і найноўшых індустрыяльных краін з другой паловы 80-х гг. XX ст.?

24 Суаднясіце даты і падзеі:

| | |
|---|---|
| Абвяшчэнне незалежнасці Галандскай Індыі | 1949 г. |
| Прызнанне Галандыяй незалежнасці Злучаных Штатаў Інданезіі | 1950 г. |
| Утварэнне унітарнай Рэспублікі Інданезія | 1945 г. |

25 Канцэпцыя "накіроўваемай дэмакратыі" Сукарна прадугледжвала:

1) развіццё парламенцкай сістэмы; 2) стварэнне сістэмы кансультацый; 3) свабоду дзейнасці розных партый; 4) забарону марксізму-ленінізму; 5) аўтарытарную ўладу прэзідэнта.

26 Назавіце пяць найважнейшых палажэнняў ідэалогіі Сукарна.

27 Партыі якіх трох палітычных плыняў маглі дзейнічаць ва ўмовах "накіроўваемай дэмакратыі"?

28 Для палітычнага рэжыму "новага парадку" у Інданезіі характэрна:

1) сістэма кансультацый функцыянальных груп; 2) двайная функцыя арміі; 3) юрыдычная забарона марксізму-ленінізму; 4) свабода для дзейнасці палітычных партый; 5) абмежаванне ўлады прэзідэнта на карысць парламента.

29 Параўнайце эканамічныя мадэлі Інданезіі ў часы "накіроўваемай дэмакратыі" і "новага парадку".

30 Якія прычыны падзення дыктатуры Сухарта?

31 Назавіце важнейшыя падзеі, звязаныя са станаўленнем дэмакратыі ў Інданезіі пасля адстаўкі Сухарта.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ВМ-4. КРАІНЫ ПАЎДНЁВАЙ АЗІІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВЭ-0. УВОДЗІНЫ

***Прыступаючы да вывучэння гэтага модуля, неабходна праверыць свае веды па наступных пытаннях*:**

1 Якой была пазіцыя англійскага ўрада па пытанні аб прадастаўленні незалежнасці Індыі ў гады другой сусветнай вайны?

2 Ахарактарызуйце ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця Брытанскай Індыі ў час другой сусветнай вайны.

3 Якія найбуйнейшыя палітычныя партыі дзейнічалі ў Брытанскай Індыі? Якія шляхі заваявання незалежнасці і будаўніцтва незалежнай дзяржавы яны прапаноўвалі?

*Для вывучэння дадзенага модуля неабходны апорныя веды і ўменні з раней вывучанага матэрыялу. Да іх адносяцца: веданне палітычнай карты рэгіёна; уменне вызначыць спецыфіку дзяржаўна-палітычнай, партыйнай, сацыяльнай і эканамічнай структур Брытанскай Індыі. У выпадку неабходнасці паўтарыце папярэдні матэрыял па дапаможніках: Васильева Л.С. "История Востока", "Новейшая история стран Азии и Африки. XX век." В 3 ч./ Под ред.Родригеса А.М. – М., 2001. - Ч.1.*

***Інфармацыя аб модулі ў цэлым*:**

Гэты модуль прысвечаны вывучэнню гісторыі Індыі, Пакістана і Бангладэш пасля другой сусветнай вайны. Іх звязвае агульнае каланіяльнае мінулае ў рамках Брытанскай Індыі, але пасля атрымання незалежнасці шляхі іх развіцця пачалі істотна разыходзіцца. Тым не менш, для ўсіх названых краін цэнтральнае месца займае праблема пераадолення этнічна-рэлігійных супярэчнасцей і станаўлення і развіцця дэмакратычнай сістэмы.

***Месца і значэнне модуля ў сістэме курса:***

Вывучэнне дадзенага модуля дазваляе атрымаць веды па гісторыі сучаснай Індыі, якая дае вопыт дэмакратычнага развіцця ва ўмовах традыцыйнага ўсходняга грамадства. Таксама ў студэнтаў фарміруецца ўяўленне аб характары і прыродзе нацыяльна-рэлігійных супярэчнасцей на Усходзе і магчымых шляхах іх вырашэння.

***Мэты вывучэння модуля:***

- выявіць, як адбылося ўтварэнне Індыі і Пакістана як незалежных краін;
- ведаць асноўныя этапы сацыяльна-эканамічнага развіцця Індыі і Пакістана;

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

- вызначыць спецыфіку палітычнага развіцця Індыі пасля заваявання незалежнасці ва ўмовах парламенцкай дэмакратыі;

- ахарактарызаваць прыроду і сутнасць этнічна-рэлігійных супярэчнасцей у Індыі і Пакістане і іх уплыў на развіццё гэтых краін;

- ведаць асноўныя кірункі і этапы знешняй палітыкі Індыі і Пакістана;

- ахарактарызаваць барацьбу аўтарытарнай і дэмакратычнай тэндэнцый у палітычным жыцці Пакістана;

- ведаць, як і калі ўтварылася дзяржава Бангладэш, асноўныя этапы і тэндэнцыі яе сучаснага развіцця.

***Гэты модуль уключае ў сябе наступныя вучэбныя элементы:***

ВЭ-0. Уводзіны.

ВЭ-1. Індыя пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-2. Пакістан і Бангладэш пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю.

***Аб змесце модуля.***

***Ключавая праблема модуля:*** трываласць парламенцкай дэмакратыі ў Індыі і перавага аўтарытарнай тэндэнцыі ў Пакістане і Бангладэш як прыклады розных шляхоў палітычнага развіцця краін Усходу.

***Вядучая ідэя:*** пасля другой сусветнай вайны Брытанская Індыя атрымала незалежнасць, і на яе тэрыторыі ўтварыліся Індыя і Пакістан. Абедзве краіны выбралі капіталістычны шлях развіцця з моцнай этатысцкай палітыкай ў эканоміцы, але назіраліся карэнныя адрозненні ў палітычным развіцці Індыі з яе парламенцкай дэмакратыяй і Пакістана (затым і Бангладэш), дзе пастаянна былі моцныя элементы аўтарытарызму.

***Асноўныя паняцці:*** дамініён, “план Маўнбетана”, “кангрэсісцкі сацыялізм”, “курс Нэру”, рэлігійны фундаменталізм, этнічна-рэлігійныя супярэчнасці, ваенная дыктатура, ускоснае ваеннае праўленне, сістэма дамінавання адной партыі.

## УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ

1 Індыя ў 40-я – 70-я гг. ХХ ст.

2 Індыя ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст.

3 Асноўныя этапы і тэндэнцыі развіцця незалежнага Пакістана. Утварэнне Бангладэш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1 У адпаведнасці з планам Маўтбетана Індыя 15 жніўня 1947 г. стала незалежнай дзяржавай. Пры гэтым былая брытанская калонія была падзелена на дзве часткі: Індыйскі Саюз і Пакістан. Раздзел краіны суправаджаўся масавымі сутыкненнямі на рэлігійна–нацыянальнай глебе. Па розных ацэнках пры гэтым загінула ад 500 тыс. да некалькіх мільёнаў чалавек. Каля 15 млн. вымушаны былі пакінуць свае дамы. Так што мірная рэвалюцыя, якая вялася М.Гандзі з мэтай дасягнення незалежнасці, завяршылася велізарнай трагедыяй для народаў Індыі. Ахвярай сутыкненняў стаў і сам Гандзі, забіты індусам-фанатыкам 30 студзеня 1948 г. Раздзел краіны прывёў да вайны 1948 – 1949 гг. паміж Індыяй і Пакістанам. Індыйскім княствам план Маўтбетана даваў права самім выбраць, у склад якой з дзвюх утвараемых дзяржаў увайсці. У многіх княствах правіцелі і асноўная маса насельніцтва на-лежалі да розных рэлігій. Так, у княстве Джаму і Кашмір махараджа быў індусам, а большасць насельніцтва мусульманамі. На тэрыторыю княства ўступілі пакістанскія і індыйскія войскі. У выніку гэтае кня-ства аказалася раздзеленым, што выклікала працяглы канфлікт паміж Індыяй і Пакістанам.

Далейшае станаўленне індыйскай дзяржаўнасці звязана з прыняццем канстытуцыі Індыйскай Рэспублікі. Цэнтральнай праблемай пры яе падрыхтоўцы былі ўзаемаадносіны з Брытанскай садружнасцю нацый. На імперскай канфэрэнцыі ў Лондане ў красавіку 1949 г. была выпрацавана формула, па якой Індыя прызнавала фармальную ўладу англійскай кароны як сімвала Брытанскай садружнасці нацый. Пасля гэтага Установучы сход Індыі прыняў канстытуцыю, якая ўступіла ў сілу 26 студзеня 1950 г. Яна абвяшчала Індыю суверэннай рэспублікай на чале з прэзідэнтам. Ён з’яўляецца галоўнакамандуючым узброенымі сіламі, прызначае прэм'ер-міністра, можа прыпыняць дзеянне канстытуцыі. Прэзідэнт мае права накладаць адтэрміноўваючае вета на законы, прымаемыя парламентам. Рэальная выканаўчая ўлада сканцэнтравана ў руках прэм'ер-міністра, які фактычна і вызначае напрамак унтранай знешняй палітыкі краіны. Пасаду прэм'ер-міністра займае, як правіла, лідэр партыі, якая перамагла на парламенцкіх выбарах. Вышэйшым органам заканадаўчай улады з’яўляецца Цэнтральны парламент, які складаецца з дзвюх палат: народнай палаты і савета штатаў. Яны выбіраюцца на 5 год, народная палата − усеагульным галасаваннем, прадстаўнікоў у савет штатаў выбіраюць заканадаўчыя сходы штатаў. Урад адказны перад Цэнтральным парламентам. Прэзідэнт выбіраецца калегіяй, якую ўтвараюць дэпутаты Цэнтральнай палаты і заканадаўчых сходаў штатаў. Штаты маюць даволі шырокую

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аўтаномію, але, з другога боку, канстытуцыя дазваляе цэнтральным уладам умешвацца ў справы штатаў. Так, прэзідэнт можа распусціць органы ўлады таго ці іншага штата і ўвесці прамое праўленне. Канстытуцыя абвяшчае агульнапрызнаныя дэмакратычныя правы і свабоды. Яна гарантуе абарону прыватнай уласнасці, але ёй прадугледжана магчымасць нацыяналізацыі з выплатай кампенсацыі, калі гэта патрабуюць інтарэсы грамадства.

Пасля прыняцця канстытуцыі разгарнулася падрыхтоўка да першых усеагульных выбараў у Індыі. Індыйскі Нацыянальны Кангрэс (ІНК) меў яўную перавагу па папулярнасці над іншымі палітычнымі партыямі. Фактычна ён выступаў не як палітычная партыя, а як масавы палітычны рух, які імкнуўся гаварыць ад імя ўсяго народа. Справа ў ІНК асноўнымі сапернікамі былі партыі Джан санг (Народны саюз) і Хінду маха сабха (Вялікі саюз індусаў). Яны шукалі падтрымкі ў буйной індускай буржуазіі і шавіністычна настроеных сярэдніх слаёў грамадства. Злева галоўным праціўнікам была Сацыялістычная партыя, якая стаяла на пазіцыях заходняй сацыял-дэмакратыі. Асаблівасць партыйна-палітычнай сістэмы Індыі заключалася ў тым, што многія партыі дзейнічалі ў межах штата ці нават асобных раёнаў унутры штата. Вялікую ролю ў фарміраванні партый адыгрывалі рэлігійны і каставы фактары. ІНК заваяваў 74,3% месцаў у Цэнтральным парламенце і 65,7% у заканадаўчых сходах штатаў. Вынікі выбараў далі ІНК магчымасць сфарміраваць аднапартыйны цэнтральны ўрад і ўрады ўсіх штатаў. Прэм'ер-міністрам застаўся Дж. Нэру. Ён лічыў, што ў аснове сацыяльна-эканамічнай палітыкі ІНК павінны ляжаць меры, накіраваныя на ўдасканаленне сістэмы сацыяльнай справядлівасці шляхам паступовага пераходу да абагульнення і да сістэмы падаткаабкладання, заснаванай на прынцыпе пераразмеркавання. Ужо ў першых праграмных дакументах у галіне эканамічнай палітыкі (Дэкларацыя аб прамысловай палітыцы ІНК 1948 г., Рэзалюцыя аб эканамічнай палітыцы з’езду ІНК у 1950 г.), а таксама ў канстытуцыі 1950 г. падкрэслівалася рашаючая роля дзяржавы ў эканамічным будаўніцтве. Такі падыход да вырашэння эканамічных праблем тлумачыўся індыйскай цывілізацыйнай традыцыяй, якая не спрыяе развіццю прадпрымальніцтва. Да таго ж, кангрэсісты лічылі, што толькі дзяржаўная эканоміка дазволіць Індыі хутка пераадолець эканамічную адсталасць.

Першы 5-гадовы план прадугледжваў прыярытэтнае развіццё дзяржаўнага сектара ў прамысловасці і інфраструктуры, дзяржава брала пад свой кантроль фінансавыя патокі. Такім чынам, будавалася

змешаная шматукладная эканоміка, у якой галоўную ролю іграў дзяржаўны сектар. Таксама ажыццяўлялася імклівая індустрыялізацыі праз фарсіраванае развіццё цяжкай прамысловасці, прымаліся меры па абмежаванні дзейнасці ў краіне замежнага капіталу. У той жа час урад аказваў падтрымку дробнаму нацыянальнаму бізнесу. На гэтых прынцыпах будавалася сацыяльна–эканамічная палітыка, якая ўвайшла ў гісторыю як “курс Нэру”.

Ідэалагічным абгрунтаваннем “курса Нэру” стала канцэпцыя “кангрэсісцкага сацыялізму”, прынятая на з’ездзе ІНК у Авадзі ў 1955 г. Яна з’яўлялася індыйскім варыянтам “дэмакратычнага сацыялізму”. Тэорыя "кангрэсісцкага сацыялізму" спалучала ідэі гандзізму, еўрапейскай сацыял-дэмакратыі і савецкі вопыт аўтарытарнага сацыялізму. "Кангрэсісцкі сацыялізм" меў на ўвазе развіццё краіны ва ўмовах парламенцкай дэмакратыі. У ходзе ажыццяўлення “курса Нэру” найважнейшыя галіны эканомікі сканцэнтраваліся ў руках дзяржавы: чыгункі, авіялініі, ваенная вытворчасць, энергетыка, цяжкая прамысловасць. У 1961-1966 гг. 60% капіталаўкладанняў былі накіраваны ў дзяржаўны сектар. Для дзейнасці замежных фірм ствараліся неспрыяльныя ўмовы. З-за гэтага з 1947 па 1954 г. згарнулі сваю дзейнасць у Індыі 98 замежных кампаній. Але, з другога боку, фарсіраванае стварэнне цяжкай індустрыі патрабавала вялікіх капіталаў. Тых, што меліся ў індыйскіх прадпрымальнікаў і дзяржавы, не хапала. Савецкая дапамога толькі часткова вырашала праблему. Урад Нэру вымушаны быў пайсці на прыцягненне ў краіну заходніх фірм, але пры гэтым было ўстаноўлена, што замежнаму ўласніку не павінна належаць больш за 49% акцый. Індыйскі ўрад ставіў замежных інвестараў у такія ўмовы, каб яны накіроўвалі свае капіталы ў цяжкую прамысловасць. Урад Нэру аказваў падтрымку нацыянальнаму дробнаму і сярэдняму прадпрымальніцтву. Былі ўсталяваны пратэкцыяніцкія тарыфы, ільготнае падаткаабкладанне, створана сетка дзяржаўных і паўдзяржаўных інвестыцыйных інстытутаў, якія займаліся яго крэдытаваннем: Прамыслова-фінансавая карпарацыя, Нацыянальная карпарацыя прамысловага развіцця. Дзяржаўныя органы займаліся кантролем над імпартна-экспартнымі аперацыямі, кантралявалі цэны, рэгламентавалі стварэннне новых кампаній. У сельскай гаспадарцы пачалося стварэнне кааператываў. Ажыццяўленне “курса Нэру” прывяло да стварэння ў Індыі эканомікі з жорсткай дзяржаўнай рэгламентацыяй і рэгуляваннием, вядучую ролю ў якой адыгрываў дзяржаўны сектар. Аб’ём прамысловай вытворчасці за 1948 – 1964 гг. вырас у больш чым у два разы. Была створана цяжкая прамысловасць, і ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сярэдзіне 60-х гг. доля сродкаў вытворчасці ў ВУП перавысіла долю спажывецкіх тавараў. Але многія буйныя прадпрыемствы дзяржаўнага сектару вызначаліся нізкай эфектыўнасцю. Крайне адсталай заставалася сельская гаспадарка.

Цэнтральнай праблемай палітычнага жыцця Індыі, побач з развіццём дэмакратычнай сістэмы, з'яўлялася праблема пераадолення рэлігійна-абшчынных супярэчнасцей і ўмацавання нацыянальнага адзінства. Нэру адзначаў, што індус пазбаўлены цярпімасці і начынены забабонамі. На думку Нэру, ад таго, удасца ці не пераадолець гэтыя адмоўныя рысы ў свядомасці індусаў, у рашаючай ступені залежала магчымасць прагрэсіўнага развіцця Індыі. Нэру гаварыў, што стаўленне індусаў да нацыянальных меншасцей такое, што тыя адчуваюць сябе ў Індыі грамадзянамі іншай краіны. Мусульманскі светапогляд Нэру лічыў яшчэ горшым, але адзначаў, што ён не аказвае істотнага ўплыву на лёс Індыі. Уплыў рэлігійна-абшчынных элементаў сярод насельніцтва і на палітычнае жыццё быў надзвычай вялікі.

Акрамя рэлігійна-абшчынных, у Індыі існавалі і вострыя этнічна-лінгвістычныя супярэчнасці. Згодна канстытуцыі 1950 г. Індыя ўключала 28 штатаў. Гэтае дзяленне адлюстроўвала адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел каланіяльных часоў. Ужо ў пачатку 50-х гг. набірае сілу рух за стварэнне штатаў на этнічна-лінгвістычнай аснове. У такіх абставінах урад пайшоў на прыняцце закону аб новым адміністратыўным ладзе Індыі, які ўступіў у сілу 1 кастрычніка 1956 г. У адпаведнасці з ім Індыя дзялілася на 14 штатаў і 6 тэрыторый, кіруемых цэнтральным урадам. Як правіла, штаты былі аднанацыянальныя. Аднак засталося некалькі штатаў са шматнацыянальным насельніцтвам: Пенджаб, Асам, Бамбей. Бамбей быў раздзелены ў 1960 г. на два нацыянальныя штаты. У Пенджабе нацыянальнае пытанне было непарыўна звязана з рэлігійным: тут два народы – хіндустанцы і пенджабцы, дзве рэлігійныя абшчыны – індусы і сінгхі. Пенджабцы разгарнулі барацьбу за стварэнне самастойнага нацыянальнага штата. У 1964 г. з Пенджаба быў вылучаны штат Харыяна, дзе перавагу мела хіндзімоўнае насельніцтва.

Другім аспектам барацьбы па нацыянальным пытанні была праблема нацыянальнай мовы. Яшчэ ў 1949 г. Канстытуцыйная асамблея пастанавіла, што дзяржаўнай мовай Індыі будзе хіндзі, але да 1965 г. другой дзяржаўнай мовай павінна была заставацца англійская. Паўночная Індыя падтрымала ператварэнне хіндзі ў адзіную дзяржаўную мову. Тут пераважаюць хіндзімоўныя раёны. На поўдні шырокія пласты грамадства выказаліся супраць надання хіндзі статуса адзінай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзяржаўнай мовы. Тут мова хіндзі была слаба распаўсюджана. Жыхары поўдня былі занепакоены, што свабодна валодаўшыя хіндзі жыхары поўначы атрымаюць перавагу пры заняцці адміністрацыйных пасадаў, што наступленне хіндзі нанясе ўдар па іншых мовах, па нацыянальных культурах. У 1965 г. выступленні супраць хіндзі на поўдні перараслі ў масавыя беспарадкі. Пытанне аб дзяржаўнай мове было адкладзена.

Нягледзячы на ўсю складанасць рэлігійна-абшчынных і нацыянальных праблем, развіццё Індыі працягвалася ва ўмовах парламенцкай дэмакратыі. Вясной 1957 г. прайшлі другія ўсеагульныя выбары. Яны пацвердзілі пануючае становішча ІНК у палітычным жыцці краіны. Ён зноў атрымаў абсалютную большасць месцаў як у цэнтральным парламенце, так і ў парламентах амаль усіх штатаў. Выбары прадэманстравалі аслабленне пазіцый рэлігійна-нацыяналістычных партый, такіх, як Джан санг (Народны саюз). У той жа час прыкметна ўмацавала свае пазіцыі Камуністычная партыя Індыі (КПІ). Да гэтага моманту яна ўжо адмовілася ад актыўнай барацьбы з урадам Нэру як з “марыянеткай імперыялізму”. У выніку выбараў 1957 г. камуністы сфарміравалі ўрад штата Карэла. Рэформы, якія праводзілі ўлады штата, сустрэлі моцнае супраціўленне з боку апазіцыйных партый і абшчынна-рэлігійных лідэраў, пачаліся масавыя выступленні пратэсту. Для навядзення парадку ў штаце было ўведзена прэзідэнцкае праўленне, а мясцовы ўрад распушчаны.

Вострая барацьба ішла ўнутры ІНК. Палітыка Нэру больш адлюстроўвала пазіцыі левага крыла кангрэса. Частка правых лідэраў выйшла з ІНК і ў 1959 г. стварыла партыю Сватантра (Незалежная). Новая партыя ў першую чаргу крытыкавала курс Нэру на стварэнне дзяржаўнай эканомікі і ўкараненне калектывісцкіх форм у сельскай гаспадарцы. Выбары 1962 г. прадэманстравалі тэндэнцыю да некаторага зніжэння ўплыву ІНК. Ён страціў 6 млн. галасоў. Адносная няўдача ІНК на выбарах 1962 г. садзейнічала росту супярэчнасцей унутры яго. Супраць палітыкі Нэру ўсё больш актыўна выступае правае крыло на чале з Дэсаі. З другога боку, левыя кангрэсісты дамагаліся больш актыўнага руху па шляху дэмакратычнага сацыялізму. Ва ўмовах вострых рознагалоссяў унутры ІНК і нарастання эканамічных цяжкасцей у краіне 27 мая 1964 г. памёр Нэру. “Курс Нэру” не прывёў да пераадолення сацыяльна-эканамічнай адсталасці Індыі і не вырашыў многія палітычныя праблемы.

У сярэдзіне 60-х гг. Індыя сутыкнулася з нарастаннем эканамічных цяжкасцей. Прамысловы пераварот так і не быў поўнасцю завершаны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У краіне востра не хапала інвестыцыйных капіталаў, крайне вузкім заставаўся ўнутраны рынак. Толькі першыя крокі рабіў капіталізм у сельскай гаспадарцы. Узмацніўся разрыў паміж мадэрнізаваным, адносна невялікім сектарам эканомікі, і традыцыйным, які захаваў пануючае становішча ў эканоміцы. Вялікія дзяржаўныя выдаткі на розныя сацыяльна-эканамічныя праграмы і адміністрацыйны апарат параджалі вялікую інфляцыю. Сітуацыя ўскладнялася тым, што 1964 – 1965 гг. успыхнула чарговая інда-пакістанская вайна з-за Кашміра. Пасля смерці Нэру дыскусіі аб шляхах далейшага развіцця Індыі абвастрыліся. Рознагалоссі ў ІНК зайшлі настолькі далёка, што на пасаду прэм’ер-міністра партыя ўпершыню вылучыла двух кандыдатаў: левае крыло і цэнтр – І. Гандзі, правыя – Дэсаі. Пераможцай выйшла І. Гандзі. Да ўсеагульных выбараў 1967 г. кангрэс падышоў раздзіраемы ўнутранымі супярэчнасцямі. У шэрагу мясцовых арганізацый адбыўся раскол. Вынікам гэтай барацьбы, а таксама правалаў у эканамічнай галіне стала прыкметнае аслабленне пазіцый ІНК у палітычным жыцці Індыі, што прадэманстравалі выбары 1967 г. Цяпер ІНК атрымаў толькі 54% месцаў у Цэнтральным парламенце супраць ранейшых 73% і страціў становішча кіруючай партыі ў 9 штатах з 17.

І.Гандзі палічыла, што аднавіць прэстыж партыі, які зменшыўся, можна праз радыкалізацыю рэформаў у рэчышчы канцэпцыі "кангрэсісцкага сацыялізму", а эканамічныя цяжкасці пераадолець праз далейшае павышэнне ролі дзяржавы ў эканоміцы. Гандзі абнародавала “праграму 10 пунктаў”, якая прадугледжвала далейшае ўмацаванне дзяржаўнага сектару, нацыяналізацыю сістэмы страхавання, усталяванне кантролю над банкамі, над гандлем важнейшымі прадуктамі харчавання, увядзенне манаполіі знешняга гандлю. Рэалізацыя гэтай праграмы пачалася з 1969 г. Гандзі правяла нацыяналізацыю 14 самых буйных банкаў. Пасля гэтага падаў у адстаўку міністр фінансаў, лідэр правага крыла ІНК Дэсаі. Адбыўся новы раскол ІНК. Правае крыло ўтварыла Арганізацыю кангрэса. З 1 чэрвеня 1970 г. уступіў у сілу закон, які ставіў пад кантроль урадавай камісіі ўнутраны гандаль. Дзяржава ўзяла ў свае рукі імпарт найбольш важнейшых тавараў. Доля дзяржаўных інвестыцый у іх агульным аб’ёме ўзрасла да 60%. У сацыяльнай сферы ўрад пайшоў на павышэнне заработнай платы, пачалося ажыццяўленне праграмы па павелічэнні занятасці ў сельскай мясцовасці, былі зніжаны падаткі на дробныя зямельныя ўчасткі.

Гандзі разлічвала, што пасля праведзеных рэформаў аўтарытэт ІНК узрос, і пайшла на правядзеннне ў 1971 г. датэрміновых усеагульных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выбараў. ІНК атрымаў 350 месцаў з 525 у Цэнтральным парламенце. Урад Гандзі, які ўмацаваў свае пазіцыі, працягвае рэформы “праграмы 10 пунктаў”. Быў усталяваны дзяржаўны кантроль над вугальнай і тэкстыльнай прамысловасцю, над страхавымі кампаніямі. Паглыбілася аграрная рэформа. Аднак палітыка на адзяржаўленне эканамічнага жыцця, якая праводзілася ўрадам Гандзі, прывяла да пагаршэння становішча ў эканоміцы. У 1972-1974 гг. Індыя перажывае спад вытворчасці, рост інфляцыі. Адмоўны ўплыў на эканамічнае становішча Індыі аказала вайна з Пакістанам у снежні 1971 г. З дапамогай індыйскіх войскаў Усходні Пакістан заваяваў незалежнасць, і тут утварылася Рэспубліка Бангладэш. Але вайна прынесла Індыі 10 млн. бежанцаў і вялікія выдаткі. Перамога ў вайне на некаторы час узняла аўтарытэт ІНК і ўрада Гандзі. Аднак нарастанне эканамічных праблем спрыяла росту палітычнай напружанасці ў краіне. Правая апазіцыя аб’ядналася ў Народны фронт (1974 г.) на чале з Нараянам і Дэсаі і перайшла да арганізацыі масавых антыўрадавых выступленняў. Падставай для такіх дзеянняў апазіцыі стала абвінавачванне Гандзі ў тым, што яна незаконна атрымала дэпутацкі мандат у час выбараў 1971 г. Росту незадавальнення насельніцтва спрыяла абвінавачванне Гандзі і членаў яе сям'і ў карупцыі. Актыўны пратэст выклікалі прымусовыя меры ўладаў па змяншэнні нараджальнасці.

У такой сітуацыі ўрад Гандзі пайшоў 26 чэрвеня 1975 г. на ўвядзенне надзвычайнага становішча. Апазіцыйныя газеты і партыі былі фактычна забаронены. Нараян, Дэсаі, а разам з імі яшчэ каля 30 тысяч удзельнікаў антыўрадавых выступленняў былі арыштаваны. Адн098часова з рэпрэсіямі Гандзі імкнецца пашырыць сацыяльную базу свайго ўрада праз ажыццяўленне рэформаў. Яна абвясціла "праграму 20-ці пунктаў", якая мела на ўвазе заваяванне сімпатый сацыяльных нізоў. У праграме былі такія пункты, як прыцягненне рабочых да кіраўніцтва прадпрыемствамі, стварэнне дзяржаўнай сістэмы забеспячэння народных мас найважнейшымі прадуктамі харчавання, барацьба са спекуляцыяй. Мелася на ўвазе радыкалізацыя аграрнай рэформы ў інтарэсах бяднейшага сялянства. Была прынята папраўка да канстытуцыі, якая абвясціла Індыю сацыялістычнай рэспублікай. Аднак гэтыя меры не прывялі да ўмацавання пазіцый урада. Можна канстатаваць, што ў 1975 г. у Індыі ўсталяваўся рэжым асабістай дыктатуры І. Гандзі. Яе ўлада абапіралася на вузкае кола бліжэйшага акружэння – родзічаў і сяброў. Гэта было яўна антыканстытуцыйнае праўленне. Да гэтага часу, нягледзячы на ўсе цяжкасці ўнутрыпалітычнага становішча, Індыя развівалася ва ўмовах

парламенцкай дэмакратыі. Цяпер быў падараваны аўтарытэт дэмакратычнай формы кіравання ў Індыі.

Забяспечыць эканамічны рост надзвычайнае становішча і праграма "20-ці пунктаў" не змаглі. Працягвалася падзенне ўзроўню жыцця. Рабочыя былі незадаволены забаронай на правядзенне забастовак. Масавы пратэст выклікала палітыка прымусовай стэрылізацыі. Група дзеячаў ІНК, нязгодных з аўтарытарнай палітыкай І.Гандзі, выйшла з партыі і стварыла Кангрэс за дэмакратыю. Апазіцыйныя сілы на чале з Джаната парты ўзмацнялі свой уплыў. Гандзі прыйшла да высновы, што далей кіраваць аўтарытарнымі метадамі немагчыма, і пасля дзвюх адтэрміновак прызначыла парламенцкія выбары. Яны адбыліся ў сакавіку 1977 г. і прынеслі перамогу апазіцыі. Упершыню за час незалежнасці ІНК прайграў выбары і страціў уладу. Пачаўся новы этап у палітычнай гісторыі Індыі, калі рэальнай стала альтэрнатыва ІНК з боку іншых партый. Індыйцы галасавлі не столькі за Джаната парты і іншыя апазіцыйныя сілы, колькі супраць аўтарытарнай палітыкі ІНК, якая так і не прывяла да вырашэння найбольш вострых праблем жыцця Індыі. Ніякай рэальнай альтэрнатывы палітыцы ІНК блок партый, што перамог на выбарах, прадставіць не змог. Лідэр Джаната парты Дэсаі сфарміраваў кааліцыйны ўрад. Яго палітыка была крайне супярэчлівай, як і склад кааліцыі. Апынуўшыся ў апазіцыі, Гандзі правяла рэарганізацыю ІНК. У 1978 г. яна стварыла партыю ІНК (Індзіра), якая была згуртавана на аснове асабістай адданасці І.Гандзі. Тая частка кангрэсістаў, якія адмовіліся яе падтрымаць, стварыла сваю партыю ІНК (Сацыялістычны). Тым часам няздольнасць Джаната парты вырашыць шматлікія праблемы, што стаялі перад Індыяй, прывяла да расчаравання яе дзейнасцю сярод індыйцаў. Унутры ўрадавай кааліцыі нарасталі супярэчнасці. У такіх умовах новы прэм'ер-міністр Сінгх пайшоў на правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў у студзені 1980 г. Яны прынеслі перамогу ІНК(І).

Складаныя працэсы адбываліся ў камуністычным руху Індыі ў 60 – 70-я гг. Частка дзеячаў КПІ апынулася пад уплывам мааісцкай ідэалогіі. Яны ўзялі курс на звяржэнне “прафашысцкага рэжыму Нэру”. У 1964 г. у КПІ адбыўся раскол і яе мааісцкае крыло ўтварыла КПІ (марксісцкую). У 1967 г. КПІ(м) у прыгранічных з Кітаем раёнах паспрабавала ўзняць узброенае паўстанне, аднак пацярпела няўдачу. Пасля гэтага на з’ездзе КПІ(м) у 1968 г. былі прыняты рашэнні, якія азначалі адмову ад паўстанцкай тактыкі, і была прызнана магчымасць удзелу ў парламенцкай дзейнасці. Тады цвёрдыя прыхільнікі мааісцкай тактыкі ў 1969 г. стварылі яшчэ адну КПІ (марксісцка-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ленінскую). З яе ў 1970 г. вылучыўся Мааісцкі партыйны цэнтр. Камуністычны рух Індыі ў 70-я гг. аказаўся расколатым аж на 4 партыі. КПІ(м-л) і Мааісцкі партыйны цэнтр актыўна выкарыстоўвалі ў 70-я гг. тэрор у палітычнай барацьбе, асабліва ў штаце Заходняя Бенгалія.

2 У пачатку 80-х гг. на дзяржаўны сектар Індыі прыпадала 75% вытворчасці сталі, 100% – нафты, 97% – вугалю, 85% – электраэнергіі. У выніку індустрыялізацыі да пачатку 80-х гг. доля сельскай гаспадаркі ў нацыянальным даходзе знізілася да 33,8% у параўнанні з 54,1% у 1950, а доля прамысловасці ўзрасла з 17,2 да 25,7%. Аднак, нягледзячы на пэўныя эканамічныя поспехі, так і не ўдалося дасягнуць значнага павышэння ўзроўню жыцця асноўнай масы насельніцтва Індыі, і ў цэлым Індыя на пачатак 80-х гг. заставалася адной з найбольш слабаразвітых краін свету. Нацыянальны даход на душу насельніцтва складаў толькі 360 долараў, сярэдняя працягласць жыцця – 56 гадоў. Спажыванне харчавання ў пераліку на душу насельніцтва за 1960 – 1980 гг. нават некалькі зменшылася, востра стаяла жыллёвая праблема.

У выніку датэрміновых парламенцкіх выбараў у студзені 1980 г. І. Гандзі зноў узначаліла ўрад. У цэлым урад Гандзі працягваў ў сацыяльна–эканамічнай сферы палітыку, якая была накіравана на развіццё змешанай эканомікі з перавагай дзяржаўнага сектара і пераадоленне палярнасці ў даходах. Праз бюджэт дзяржава пераразмяркоўвала каля 30% ВУП. 5-гадовы план на 1980 – 1985 гг. меў на ўвазе забяспечыць штогадовы рост прамысловай вытворчасці на 5,2%, а даходу на душу насельніцтва – на 3,3%. Рост вытворчасці харчавання за пяцігодку павінен быў скласці 150 працэнтаў. Менавіта на вырашэнне харчавой праблемы быў зроблены асноўны ўпор у сацыяльна-эканамічнай праграме ўрада. Аднак план не быў выкананы. Беспрацоўе за 1980–1985 гг. вырасла ў 2 разы і дасягнула 25 млн. чалавек. Акрамя таго, дзясяткі мільёнаў людзей былі ахоплены схаваным беспрацоўем. У 80-я гг. замаруджваюцца тэмпы росту сельскай гаспадаркі. Памешчыцкія гаспадаркі вельмі марудна ажыццяўлялі мадэрнізацыю, а ў сялянскіх гаспадарках ішоў працэс пастаяннага драблення. З прычыны гэтага прадукцыйнасць і таварнасць сельскай гаспадаркі зніжалася. Раздробленасць зямельнай уласнасці рабіла вельмі праблематычным выкарыстанне сучаснай тэхнікі і навейшых агратэхнічных прыёмаў. "Зялёная рэвалюцыя" закранула толькі 30% сельскагаспадарчых плошчаў. Новым у эканамічнай палітыцы было тое, што Індыя ў пачатку 80-х гг. пачала асцярожна дапускаць пранікненне ў сваю прамысловасць замежнага капіталу. Перш за ўсё ў аўта-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мабілебудаванне. Тут было створана некалькі сумесных кампаній, але кантрольны пакет акцый заставаўся ў дзяржавы.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Індыі ў 1980 - 1984 гг. адбывалася ва ўмовах вострай унутрыпалітычнай барацьбы. У краіне ўзмацняецца барацьба на рэлігійнай і этнічнай аснове. Асабліва вострая сітуацыя склалася ў штатах Пенджаб, Джаму і Кашмір, Асам. У штаце Пенджаб урад І.Гандзі сутыкнуўся з магутным сепаратысцкім рухам. Сінгхі, якія складаюць большасць насельніцтва штата, разгарнулі рух за прадастаўленне яму большай аўтаноміі. Радыкальная частка сінгхскіх сепаратыстаў выступала за поўнае аддзяленне Пенджаба ад Індыі і стварэнне на яго аснове незалежнай дзяржавы Халістан. У штаце ўсе шырэй разгортвалася кампанія тэрору. Урад Гандзі зрабіў стаўку на сілавое вырашэнне праблемы Пенджаба. Кульмінацыйным момантам ваенных дзеянняў індыйскай арміі супраць сінгхаў стала правядзенне ў чэрвені 1984 г. аперацыі “блакітная зорка”. У ходзе яе індыйскія ўзброеныя сілы авалодалі шэрагам сінгскіх храмаў, у тым ліку і галоўнаю святыняю сінгхаў – Залатым храмам ў Амрытсары, загінулі найбольш відныя прадстаўнікі сінгхскай абшчыны. Урад заявіў, што храмы з’яўляліся апорнымі пунктамі сінгхскіх экстрэмістаў. Аднак ваенныя аперацыі не прывялі да стабілізацыі сітуацыі ў Пенджабе. Складанай была сітуацыя ў штаце Асам. На яго тэрыторыю доўгі час ішла масавая іміграцыя з Усходняга Пакістана, а затым з Бангладэш. У выніку для мясцовага насельніцтва склалася пагроза застацца ў меншасці. Яно разгарнула барацьбу з мэтаю абмежаваць міграцыю і нават выселіць мігрантаў. Урад і тут зрабіў стаўку на сілу. Спробы І.Гандзі вырашыць нацыянальныя праблемы Індыі сілавымі метадамі мелі трагічныя наступствы і для яе асабіста. 31 кастрычніка 1984 г. яна была забіта сінгхскімі экстрэмістамі.

У сярэдзіне 80-х гг. у сувязі з неабходнасцю ажыццяўлення мадэрнізацыі на аснове найноўшых дасягненняў навукі і тэхнікі ўрад Р.Гандзі пачаў мяняць мадэль эканамічнага развіцця. У 1985 г. у Індыі налічвалася 93,3 тыс. стратных прадпрыемстваў. На іх утрыманне траціліся велізарныя сумы. Прычым амаль 70% затрат прыходзілася на 500 буйнейшых прадпрыемстваў дзяржсектару. Тут хутка расла колькасць прадпрыемстваў, якія выкарыстоўвалі свае магутнасці нават менш чым на 50%. У цэлым доля дзяржаўнага сектара ў сярэдзіне 80-х гг. складала 20% у ВУП, у тым ліку ў здабываючай прамысловасці – 90%, у апрацоўчай – 15%. Прычым палова рабочай сілы, занятай у дзяржаўным сектары, працавала ў перапоўненых звыш усякага штату адміністрацыйных канторах. Сістэма жорсткай дзяр-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жаўнай рэгламентацыі пачала ўсё больш прыкметна перашкаджаць інтэнсіфікацыі вытворчасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі НТР. Сістэма ліцэнзій, дазволаў тармазіла ўкараненне ў вытворчасць найноўшых навукова-тэхнічных распрацовак. Цяжкасці з мабілізацыяй рэсурсаў для фінансавання дзяржаўнага сектару рабілі немагчымым захаванне яго манаполіі ў ключавых галінах, якія рэзерваваліся за дзяржсектарам урадавай рэзалюцыі 1956 г.

Такая сітуацыя патрабавала ўнясення значных змен у эканамічную палітыку. Таму пачынаецца яе перабудова на аснове лібералізацыі. Важным крокам на гэтым шляху стаў бюджэт Цэнтральнага ўрада на 1985–1986 фінансавы год. Ён прадугледжваў аслабленне антыманапольнага заканадаўства, прадастаўленне шэрагу льгот па падатках буйным кампаніям. Пачалася адмена сістэмы ліцэнзавання. Быў таксама аслаблены кантроль над экспартна–імпартнымі аперацыямі. Значна знізіліся мытныя зборы на імпарт. Індыя пачала паварочваць сваю эканоміку ў бок адкрытасці. Усё большы прастор для сваёй дзейнасці набываюць індыйскія манаполіі. Урад адмяняе шмат якія абмежаванні на дзейнасць транснацыянальных карпарацый (ТНК) у Індыі. Зніжаецца ўзровень падаткаабкладання для маёмасных слаёў грамадства, каб зацікавіць іх у пашырэнні прадпрымальніцкай дзейнасці. Такім чынам, эканамічная стратэгія ўрада Р.Гандзі была накіравана на абмежаванне рэгулюючых функцый дзяржавы, адкрыццё большай свабоды для рынкавых адносін, для прадпрымальніцтва. Вынікі такой палітыкі аказаліся супярэчлівымі. Яна прывяла да паскарэння эканамічнага росту. Але ён адбываўся за кошт адносна вузкага кола галін, якія працавалі на задавальненне попыту маёмасных слаёў у высакаякасных таварах працяглага карыстання. Гэтыя галіны былі цесна звязаны з замежным капіталам. Дзяржаўная падтрымка забяспечыла хуткі рост яшчэ некаторых навукаёмкіх галін: касмічнай, ваеннай. Большасць традыцыйных галін перажывала стагнацыю. У цяжкім становішчы знаходзілася сельская гаспадарка. Найбольш вострай сацыяльнай праблемай Індыі заставалася беднасць большасці яе насельніцтва, асабліва ў сельскай мясцовасці. У выніку індыйская прамысловасць мела крайне вузкі ўнутраны рынак для развіцця. Індыя пры Р.Гандзі ажыццявіла пераарыентацыю ў сваёй знешнеэканамічнай і знешнепалітычнай дзейнасці ў цэлым. Стала відавочна, што цеснае эканамічнае супрацоўніцтва з СССР не можа адкрыць Індыі доступ да перадавых тэхналогій. Таму прыярытэт пачынае надавацца развіццю эканамічных сувязей з Заходняй Еўропай, ЗША, Японіяй.

У палітычнай сферы адбываецца далейшая эвалюцыя сістэмы, заснаванай на дамінаванні ІНК, да сістэмы, у рамках якой дзейнічае некалькі цэнтраў сілы. Р.Гандзі 31 кастрычніка 1984 г. заняў пасаду прэм'ер-міністра і адразу пайшоў на правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў. ІНК(І) на гэтых выбарах супрацьстаялі два асноўныя праціўнікі: Джаната парты і Бхаратыя джаната парты. Выбары 24-27 снежня 1984 г. прынеслі трыумфальную перамогу ІНК(І) (401 месца з 542). Даследчыкі тлумачаць вялікі поспех ІНК(І) на выбарах 1984 г. двума галоўнымі фактарамі: гібель І. Гандзі падштурхнула многіх індыйцаў галасаваць за ІНК(І); распыленасць апазіцыі. Асаблівасць палітычнай сітуацыі ў Індыі ў сярэдзіне 80-х гг. заключалася ў тым, што ІНК(І), атрымаўшы ўпэўненую перамогу на агульнанацыянальных выбарах, меў намнога больш сціплыя поспехі на мясцовых выбарах. У многіх штатах канкурэнцыю ІНК(І) склалі мясцовыя партыі.

Урад Р. Гандзі, як і яго папярэднікі, вымушаны быў вырашаць шмат якія праблемы ў сферы рэлігійна-абшчынных і нацыянальных адносін. Р. Гандзі спрабуе адмовіцца ад сілавых падыходаў пры вырашэнні гэтых праблем. Пачынаюцца перамовы з сепаратыстамі Пенджаба, Асама. Каб прадэманстраваць сваё імкненне да ўрэгулявання пенджабскай праблемы, Гандзі абвясціў павелічэнне дапамогі штату, правядзенне шэрагу мерапрыемстваў, накіраваных на пераадоленне яго аднабаковага аграрнага развіцця. Былі вызвалены з турмы лідэры сінгхскай партыі Акалі дал. 24 ліпеня 1985 г. урад і Акалі дал падпісалі "Мемарандум аб урэгуляванні сітуацыі ў Пенджабе". Дакумент прадугледжваў абарону правоў і інтарэсаў сінгхаў, садзейнічанне развіццю мовы пенджабі; прызначаліся выбары, каб аднавіць мясцовае самакіраванне ў Пенджабе. Выбары адбыліся 25 верасня 1985 г. і прынеслі ўпэўненую перамогу Аналі дал. Аднак экстрэмісцкае крыло сінгхскіх сепаратыстаў працягвала тэрарыстычную дзейнасць. Паспрабаваў Гандзі знайсці мірнае ўрэгуляванне і асамскай праблемы. Пасля перамоў з мясцовымі лідэрамі тут таксама адбыліся выбары і было адноўлена мясцовае самакіраванне, абмежаваны правы мігрантаў. Аднак і ў гэтым штаце цалкам спыніць насілле не ўдалося. К канцу 80-х гг. этна-рэлігійны канфлікт у Індыі зноў абвастрыўся. З 1987 г. пагоршылася сітуацыя на поўдні краіны. У гэты час індыйскія войскі ўмяшаліся ў этнічны канфлікт у Шры Ланцы, падаўляючы там сепаратысцкі рух тамілаў. Гэты крок урада выклікаў пратэсты тамільскага насельніцтва Паўднёвай Індыі. У 1988 г. індыйская армія і паліцыя зноў перайшлі да шырока-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

маштабнай ваеннай аперацыі ў Пенджабе. Так што справіцца з этна-рэлігійнай праблемай у Індыі не ўдалося і ўраду Р.Гандзі.

У гады прэм'ерства Р.Гандзі ІНК(І) паступова ўсё больш страчвае свае пазіцыі на месцах. Калі ў 1984 г. Гандзі стаў прэм'ер-міністрам, апазіцыя мела свае ўрады толькі ў 4 штатах, то ў 1988 г. – ужо ў 11. Гэта было сведчаннем падзення папулярнасці ўрада і асабіста прэм'ер-мінстра. Яго абвінавачвалі ў тым, што ён імкнецца вырашыць ўсе праблемы сам, недаступны для калег па партыі і ўраду. У 1987 г. з ІНК(І) выйшаў адзін з найбольш аўтарытэтных дзеячаў партыі В.П.Сінгх. У гэты час, калі папулярнасць урада і кіруючай партыі ў краіне падае, ідзе перагрупоўка апазіцыйных сіл, у выніку чаго ствараецца рэальная палітычная альтэрнатыва ІНК(І). 11 кастрычніка 1988 г. адбылася ўстаноўчая канферэнцыя, на якой была ўтворана новая партыя – Джаната дал (Народная партыя). Новая партыя заявіла аб намеры перанесці цэнтр эканамічнай палітыкі з горада ў вёску, змагацца з карупцыяй, забяспечыць правядзенне справядлівых выбараў. Партыя заяўляла, што прадаставіць больш правоў жанчынам, нацыянальным меншасцям. Джаната дал паабяцала вывесці індыйскія войскі са Шры–Ланкі. Але прадуманая рэальная сацыяльна–эканамічная праграма ў партыі па сутнасці адсутнічала.

У студзені 1989 г. ў трох штатах Індыі адбыліся мясцовыя выбары. Яны давалі магчымасць і апазіцыі, і ІНК(І) праверыць настроі выбаршчыкаў перад набліжэннем ўсеагульных выбараў. ІНК(І) выйграў выбары ў малазначных штатах Мізарам і Мағаленд, але пацярпеў цяжкае паражэнне ў вельмі важным штаце Тамілнад, прычым паражэнне было асабліва ўражлівым і ў сувязі з тым, што тут перадвыбарную барацьбу ўзначаліў сам Гандзі. Вынікі выбараў у Тамілнадзе назвалі вердыктам супраць прэм'ер-міністра і пачалі прадказваць паражэнне ІНК(І) і на ўсеагульных выбарах. Сінгх у гэты час актыўна прапагандуе ідэю, што толькі стварэнне апазіцыяй адзінага фронту дазволіць ёй атрымаць перамогу над ІНК(І) на ўсеагульных выбарах. Ён лічыў неабходнасцю ўключыць у гэты фронт і левыя партыі, у тым ліку камуністычныя. Задача дасягнення адзінства апазіцыі была выканана. На парламенцкіх выбарах у лістападзе 1989 г. ў абсалютнай большасці выбарчых акруг апазіцыя дамовілася аб вылучэнні адзінага кандыдата. У выніку выбараў з 525 мандатаў у ніжняй палаце ІНК заваяваў 193, Джаната дал – 141, Бхаратыя джаната парты – 88, КПІ(М) – 32, КПІ – 12. Такім чынам, апазіцыя па сумарнай колькасці галасоў пераўзышла ІНК(І), і Сінг сфарміраваў урад, які абапіраўся на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

шырокую кааліцыю ад рэлігійна–абшчыннай Бхаратыя джаната парты да кампартый.

Шмат якія даследчыкі і палітыкі гавораць аб тым, што за час праўлення ІНК(І) у Індыі назбіраліся такія вялікія праблемы, што краіна ў канцы 80-х гг. сутыкнулася з глыбокім структурным крызісам. Гэты крызіс індыйскага грамадства быў выкліканы наступнымі фактарамі: секулярысцкія асновы індыйскага грамадства былі падарваны самым сур'ёзным чынам, і ўсё большае разбуральнае ўздзеянне на яго аказваў рэлігійны фундаменталізм; беднякі, ніжэйшыя касты, нацыянальныя меншасці ніколі раней не адчувалі сябе настолькі адарванымі ад палітычнай улады; з–за карупцыі сумненню пачала падвяргацца легітымнасць урада. Тым не менш, удалося захаваць дэмакратычную палітычную сістэму, хаця ў 70-я гг. яна перажыла моцны ўдар. Узрасла ў 80-я гг. стабільнасць партый і ўсёй партыйна–палітычнай структуры.

Разнароднасць кааліцыі, якая перамагла на выбарах 1989 г., непазбежна павінна была параджаць супярэчнасці ў яе шэрагах. Ужо пры фарміраванні ўрада яны праявіліся, і Сінгху прыйшлося пераадольваць супраціўленне некалькіх канкурэнтаў, каб заняць пасаду прэм'ер-міністра. Міністрамі сталі толькі прадстаўнікі партыі Джаната дал. Але аб падтрымцы ўрада заявілі Бхаратыя джаната парты і кампартыі. Урад Сінгха пры вырашэнні нацыянальных праблем узяў курс на дэцэнтралізацыю, на прадастаўленне большай аўтаноміі асобным штатам. Але пры гэтым падкрэслівалася неабходнасць захавання моцнай цэнтральнай улады. У эканоміцы Сінгх заявіў аб намеры больш сродкаў накіроўваць на развіццё сельскай гаспадаркі, падкрэсліваючы пры гэтым, што Індыі патрэбна і моцная прамысловасць. Аднак абвешчаныя намеры ўрада ў асноўным так і засталіся намерамі. Унутры кааліцыі пачалася вострая барацьба. З-за яе ўжо ў лістападзе 1990 г. урад Сінгха пайшоў у адстаўку. Быў сфарміраваны ўрад на чале з сацыялістам Ч. Шэкхарам. Гэта быў пераходны ўрад, які трымаўся дзякуючы падтрымцы ІНК(І). Вясною 1991 г. ІНК(І) палічыў, што момант спрыяльны для датэрміновых парламенцкіх выбараў. У час передвыбарнай кампаніі 21 мая 1991 г. тамільскія тэрарысты забілі Р.Гандзі. Яны не даравалі яму ўвядзенне індыйскіх войскаў на тэрыторыю Шры-Ланкі. ІНК(І) атрымаў перамогу на выбарах. Новым прэм'ер-міністрам стаў П. В. Нарасімха Рао.

Цэнтральнай праблемай у жыцці Індыі па-ранейшаму застаецца пераадоленне рэлігійна-абшчыннай варожасці. У 90-я гг. асаблівую актыўнасць пачынаюць праяўляць індускія фундаменталісты. На пазі-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цыі індускага рэлігійнага фундаменталізму цалкам перайшла Бхаратыя джаната парты. У пачатку 90-х гг. вядзецца вострая барацьба вакол пытання аб будаўніцтве індускага храма на месцы мусульманскай мячэці ў горадзе Айёдхі. У 1992 г. фанатыкі–індусы разбурылі мячэць. Наступствам гэтага сталі індуска–мусульманскія сутыкненні ў розных раёнах краіны. У іх загінула каля 3 чыс. чалавек. Эканамічная палітыка Рао была накіравана на далейшую лібералізацыю эканамічных адносін. У ліпені 1991 г. быў прыняты пакет дакументаў, якія рэгулявалі ход эканамічных рэформаў. Роля дзяржавы ў эканоміцы змяншаецца. У 1981 г. доля прыватнага сектара ў ВУП была 41%, у 1990 – 53%, а ў 1996 г. – ужо 75%. Значна скараціўся пералік тавараў, экспарт і імпарт якіх ліцэнзаваўся. У 1996 г. пачалася прыватызацыя 40 дзяржаўных кампаній. Пры гэтым захавалася планаванне. У 1998-2002 гг. выконвалася 9-я пяцігодка. Узрасла самастойнасць дзяржаўных прадпрыемстваў. Індыя ўсё шырэй адкрывае эканоміку для замежнага капіталу. Для яго, як і для нацыянальнага прыватнага капіталу, быў адкрыты доступ у многія закрытыя раней галіны. У першай палове 90-х гг. Індыя дабілася нядрэнных эканамічных паказчыкаў. Многія эканамісты пачалі гаварыць аб індыйскім эканамічным цудзе і адносіць Індыю да новых індустрыяных дзяржаў.

У 90-я гг. назіраецца пераход Індыі да новай партыйна-палітычнай сістэмы. Адбываецца канчатковая трансфармацыя сістэмы аднапартыйнай перавагі, ці сістэмы кангрэсу, у партыйна-палітычную сістэму поліцэнтрычнага тыпу, г. зн. узнікае некалькі партыйна-палітычных цэнтраў сілы. Пэўным рубяжом у гэтым працэсе сталі парламенцкія выбары 1996 г. Іх вынікі дазваляюць гаварыць, што ўзніклі тры асноўныя цэнтры сілы ў партыйна–палітычнай структуры: ІНК, які атрымаў 28,1%, Бхаратыя Джаната парты – 23,5%, Левадэмакратычны фронт (Аб'яднаны фронт) – 20,2%. Асноўнымі вехамі пераходу ад сістэмы перавагі адной партыі да сістэмы поліцэнтрычнага тыпу былі выбары 1977, 1989 і 1996 гг. Працяглая перавага ІНК у палітычным жыцці Індыі трымалася на здольнасці гэтай партыі прадстаўляць розныя, часта канфліктуючыя інтарэсы розных сацыяльных пластоў. У 80 – 90-я гг. ідзе працэс ускладнення сацыяльнай структуры індыйскага грамадства, дыферэнцыяцыі інтарэсаў. Працэсы дэцэнтралізацыі ў сацыяльнай структуры індыйскага грамадства прывялі да дэцэнтралізацыі партыйна–палітычнай сістэмы.

ІНК хоць і атрымаў адносную большасць галасоў у 1996 г., але не сфарміраваў урад, бо прытрымліваўся тактыкі неўступлення ў кааліцыі. Кіруючай партыяй стаў Аб'яднаны фронт, урад якога трымаўся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзякуючы падтрымцы парламенцкай фракцыі ІНК(І). Калі ІНК(І) адмовіў у ёй, урад 27 лістапада 1997 г. падаў у адстаўку. На парламенцкіх выбарах у лютым–сакавіку 1998 г. перамогу атрымала Бхаратыя джаната парты. 19 сакавіка 1998 г. прэзідэнт Р.К.Нараянан прывёў да прысягі ўрад на чале з лідэрам Бхаратыя джаната парты Аталам Біхары Ваджапаі. Нестабільнасць кааліцыйнага ўрада Ваджапаі прывяла да новага ўрадавага крызісу. Парламенцкія выбары 18 верасня і 3 кастрычніка 1999 г. прынеслі перамогу зноў Бхаратыя джаната парты. Ваджапаі захаваў пасаду прэм'ер-міністра. Партыя ішла на выбары пад нацыяналістычнымі лозунгамі. Гучала моцная крытыка заходніх каштоўнасцей, лібералізацыі эканомікі, вылучаўся лозунг "свадэшы". Правячая партыя фактычна заахвочвала індускі экстрэмізм. У канцы лютага – пачатку сакавіка 2002 г. адбыліся крывавыя сутыкненні індусаў і мусульман у г. Ахмабад. Загінула каля 260 чалавек. Рэакцыя ўладаў была яўна запаздалая. Усеагульныя парламенцкія выбары ў па-чатку 2004 г. прынеслі перамогу ІНК, і ён зноў вярнуўся да ўлады. Урад узначаліў Манмахан Сінгх. ІНК перамог на выбарах галоўным чынам дзякуючы падтрымцы сялянства. Індыйскай вёсцы хуткае раз-віццё эканомікі ў апошнія 10-15 гадоў практычна нічога не дало. Была выкарыстана незадаволенасць імклівым ростам разрыву ў даходах. ІНК актыўна прапагандаваў лозунг секулярызацыі грамадска-палі-тычнага жыцця.

У другой палове 90-х гг. Індыя ўваходзіць у лік краін, якія дынамічна развіваюцца. Яна займала трэцяе месца па прыроста ВУП сярод буйных краін – 7% у год. Вядучыя пазіцыі ў эканоміцы ўжо ўпэўнена заняў прыватны сектар. Доля прыватных інвестыцый у эканоміцы складае 70 – 73 %. Тым не менш, дзяржаўнае ўмяшанне застаецца значным. Палітыка ўрада атрымала назву дазіраванага лібералізму і выбарачнага пратэкцыянізму. Даследчыкі гавораць не столькі пра агульнае змяншэнне ролі дзяржавы ў эканоміцы, колькі пра змяненне метадаў і функцый дзяржаўнага рэгулявання. Дзяржава адмаўляецца ад функцый адміністратара, але працягвае аказваць вялікі ўплыў на эканоміку праз фінансавую і падатковую сістэму, мытную палітыку. Гэтыя сферы пад пільным дзяржаўным кантролем і актыўна рэгулююцца дзяржавай. Нягледзячы на лозунгі адкрытасці эканомікі, 94 – 96% прыросту ВУП атрымліваецца за кошт унутранага рынку. Падыход да інтэграцыі ў сусветную гаспадарку даволі асцярожны. Прыток замежных інвестыцый адносна невялікі – за 1991 – 1998 гг. – 27,3 млрд долараў. Тое, што прырост ВУП адбываецца амаль выключна за кошт унутранага рынку, сведчыць пра рост

дабрабыту насельніцтва. Але Індыя па-ранейшаму застаецца адной з бедных краін. Па індэксу развіцця чалавека яна займае 135 месца ў свеце. Афіцыйна беспрацоўных - 37 млн. чалавек. Нацыянальны даход на душу насельніцтва каля 2,5 тыс. долараў у год. Захоўваецца рэзкі разрыў у развіцці горада (мадэрнізаваны) і вёскі (традыцыйная).

3 Пакістан у момант утварэння 14 жніўня 1947 г. уяўляў з сябе краіну, што не мела дзяржаўных традыцый. Правячая Мусульманская ліга і тыя сацыяльныя сілы, якія яна прадстаўляла, перш за ўсё буйныя памешчыкі ў саюзе з буйной буржуазіяй, першапачаткова проста пераняли сістэму кіравання, створаную ў каланіяльныя часы на аснове канстытуцыі Індыі 1935 г. і Закона аб незалежнасці Індыі 1947 г. Фармальна кіраўніком дзяржавы з'яўляўся брытанскі генерал–губернатар. Рэальна ўлада была ў руках урада, які ўзначальваў лідэр Мусульманскай лігі Джына (памёр 11 верасня 1948 г., новы прэм'ер-міністр – Ліякат Алі–хан). Заканадаўчая ўлада была ў руках Устаноўчага сходу, які быў абраны па курыяльнай сістэме.

У склад Пакістана ўвайшлі найбольш адсталыя часткі былой Брытанскай Індыі. На яго тэрыторыі аказалася толькі 9,6 % прамысловых прадпрыемстваў, як правіла, дробных, саматужных, з тых, што меліся на тэрыторыі адзінай Індыі. З атрыманнем незалежнасці эканамічная сістэма, якая існавала ў каланіяльны час, была ў многім дэзарганізавана. Затармазіліся гандлёвыя сувязі паміж рэгіёнамі, з замежжам. Сістэма ДМК метраполіі аказалася разбуранай. Паколькі прыватны нацыянальны капітал на тэрыторыі Пакістана быў вельмі слабы, то на першы план зноў павінен быў выйсці дзяржаўна–манапалістычны капіталізм, але цяпер нацыянальны. Ужо ў першыя гады незалежнасці гэта вяло да стварэння буйнога дзяржаўнага сектару. Галоўным кірункам эканамічнага развіцця кіруючыя колы Пакістана абралі індустрыялізацыю. Яна павінна была, як разлічвалі, забяспечыць хуткае пераадоленне адсталасці. Індустрыялізацыя праводзілася на аснове пераліву сродкаў з аграрнага сектару ў прамысловасць і суправаджалася ажыццяўленнем палітыкі імпартазамяшчэння. Пакістан пачынае адгароджваць свой рынак ад замежнай канкурэнцыі, каб стварыць больш спрыяльныя ўмовы для нацыянальных вытворцаў, заахвочвае вытворчасць тых тавараў, якія раней імпартаваліся. У развіцці інфраструктуры вялікую ролю адыгрываў замежны капітал. Дзякуючы пераважна амерыканскім крэдытам, праводзілася будаўніцтва дарог, портаў, аэрадромаў. Развіццё цяжкай прамысловасці ў 50 – 60-я гг. таксама ў многім адбывалася за кошт замежных інвестыцый. Але вядучай галінай эканомікі Пакістана заставалася

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сельская гаспадарка. На момант заваявання незалежнасці ў Пакістане панавала буйное феадальна–памешчыцкае землеўладанне. Памешчыкі, як правіла, здавалі зямлю сялянам у арэнду за частку ўраджаю, якая даходзіла звычайна да 70%. Арандатары феадальнага тыпу складалі асноўную масу сялянства. Феадальныя зямельныя адносіны былі моцным тормазам на шляху развіцця капіталізму, і аграрная рэформа была неабходнасцю. У 1950 – 1952 гг. былі прыняты першыя законы аб аграрнай рэформе. Яны мала закранаді памешчыцкае землеўладанне, але і яны заставаліся ў асноўным толькі на паперы. Новая аграрная рэформа была пачата ў 1959 г. ужо ваеннымі ўладамі. Яна абмяжоўвала памешчыцкае замлеўладанне: 500 акраў арашальнай і 1000 акраў неарашальнай зямлі. Лішкі выкупляліся дзяржавай і прадаваліся. Ад рэформы выйгралі сярэднія землеўладальнікі, сялянская вярхушка. Большасць сялян засталася беззямельнымі. Сельская гаспадарка не была пераведзена на капіталістычныя рэйкі. Тым не менш, рэформа садзейнічала некатораму паскарэнню эканамічнага развіцця Пакістана ў 60-я гг., але краіна ўсё роўна заставалася ў пачатку 70-х гг. эканамічна крайне адсталай. У развіцці капіталізму ў Пакістане можна вылучыць два перыяды. На першым, 50-я - пачатак 70-х гг., яно ішло вельмі марудна, прычым у горадзе значна хутчэй, чым у вёсцы. Рост індустрыі ў многім ажыццяўляўся за кошт эксплуатацыі Усходняй Бенгаліі, якая ўяўляла своеасаблівую ўнутраную калонію. Такі варыянт развіцця быў пастаўлены пад сумненне "зялёнай рэвалюцыяй" і ўзмацненнем рэвалюцыйнага руху ва Усходняй Бенгаліі ў другой палове 60-х - пачатку 70-х гг. На другім этапе эканамічнага развіцця, які пачаўся ў пачатку 70-х гг. XX ст., краіна, хоць і вельмі павольна, пачынае адкрываць сваю эканоміку і больш актыўна інтэгравацца ў сусветную гаспадарку.

У палітычным жыцці Пакістана з моманту ўтварэння гэтай дзяржавы разгортваецца барацьба паміж дэмакратычнай і аўтарытарнай тэндэнцыямі. Правячая Мусульманская ліга з цягам часу ўсё больш адыходзіць ад дэмакратычных прынцыпаў. Ужо ў першыя гады незалежнасці былі прыняты шматлікія акты аб ахове нацыянальнай бяспекі, абапіраючыся на якія ўрад жорстка падаўляў апазіцыю. Такія меры ўрада выклікалі рост экстрэмізму. 16 кастрычніка 1951 г. тэрарысты забілі прэм'ер-міністра Алі-хана. Калі ва Усходняй правінцыі на мясцовых выбарах перамог блок апазіцыйных партый – Айчынны фронт, то цэнтральны ўрад змясціў сфарміраваны пасля выбараў правінцыйны ўрад. У кастрычніку 1954 г. быў распушчаны Устаноўчы сход Пакістана і ўведзена надзвычайнае становішча.

Доўга не ўдавалася прыняць канстытуцыю краіны з-за пытання аб прадстаўніцтве Усходняга і Заходняга Пакістана ў парламенце. У чэрвені 1955 г. быў сфарміраваны новы Устаноўчы сход, на гэты раз без прамых выбараў, недэмакратычна. Яму ўдалося ў 1956 г. прыняць канстытуцыю. Пасля гэтага ў Пакістане ніяк не ўдавалася стварыць урад, які абапіраўся б на парламенцкую большасць. Прэстыж Мусульманскай лігі імкліва падае, і ў 1955 г. яна становіцца апазіцыйнай партыяй. Улада перайшла ў рукі Рэспубліканскай партыі. Мусульманская ліга, якая знаходзілася ў апазіцыі, сфарміравала для барацьбы з урадам атрады баевікоў. Палітычная барацьба ўсё больш выходзіла за мірныя рамкі.

Скочванне краіны да хаосу дало падставу выступіць ваенным. 27 кастрычніка 1958 г. прэзідэнт Мірза перадаў усю паўнату ўлады галоўнакамандуючаму пакістанскай арміі генералу Айюб–хану. Такім чынам, парламенцкая дэмакратыя не змагла замацавацца ў Пакістане. Вострыя сацыяльныя, эканамічныя, нацыянальныя праблемы нараджалі жорсткую палітычную барацьбу. Ва ўмовах адсутнасці дэмакратычнай парламенцкай традыцыі яна вылівалася ў сілавыя дзеянні і вяла да анархіі. Рэакцыяй на такі ход падзей і стаў ваенны пераварот. У той час не скλаліся яшчэ тыя сацыяльна–палітычныя сілы, сярэдні клас, якія зацікаўлены ў дэмакратычных каштоўнасцях. Адкрытая ваенная дыктатура ў пачатку 60-х г. сутыкнулася з ростам апазіцыі. Таму ваенныя вырашылі, не мяняючы сутнасці рэжыму, надаць яму больш прывабны выгляд. 8 чэрвяня 1962 г. было адменена ваеннае становішча. Але прынятая ў гэтым жа годзе канстытуцыя надзяліла вялізарнымі паўнамоцтвамі прэзідэнта. Гэтую пасаду заняў Айюб-хан. У 1962 г. аднаўляецца дзейнасць палітычных партый. Кіруючай стала Мусульманская Ліга, якую ўзначаліў Аюб-хан.

У дзейнасці ўрада ў 1960-я гг. цэнтральнае месца займае праблема ўзаемадносін паміж Усходнім і Заходнім Пакістанам. Усходні Пакістан па-ранейшаму заставаўся ў нераўнапраўным становішчы. Народная ліга, вядучая партыя гэтай правінцыі, патрабавала для яе шырокай аўтаноміі. У Заходнім Пакістане ўзмацніўся рух за раздзел адзінай правінцыі на 4 па лінгвістычнаму прызнаку. У краіне пачаліся сутычкі на этнічнай глебе, выступленні за дэмакратызацыю краіны. У такіх умовах Айюб-хан перадаў уладу галоўнакамандуючаму арміяй Ях'я-хану. Канстытуцыя была адменена, усе дэмакратычныя інстытуты ліквідаваны. Аднавілася адкрытая ваенная дыктатура. Але ваенны рэжым ва ўмовах палітычнага крызісу пайшоў на саступкі. У снежні 1970 г. адбыліся ўсеагульныя выбары на шматпартыйнай аснове. На

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

іх найбольшага поспеху дабіліся Народная ліга ва Усходнім Пакістане і Партыя пакістанскага народу (ППН) у Заходнім Пакістане. Маючы большасць у парламенце правінцыі, Народная ліга запатрабавала прадаставіць шырокую аўтаномію Усходняму Пакістану. Ваенныя адказалі рэпрэсіямі. Тады ў правінцыі пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне, і ў 1971 г. была абвешчана Рэспубліка Бангладэш. На дапамогу новай дзяржаве прыйшла Індыя. Пачлася чарговая інда-пакітанская вайна, якая закончылася паражэннем Пакістана. Рэспубліка Бангладэш пры падтрымцы індыйскай арміі адстаяла сваю незалежнасць.

Палітычны крызіс 1971 г. меў для Пакістана не меншыя наступствы, чым падзел краіны ў 1947 г. Пакістан, які страціў Усходнюю Бенгалію, панёс вялікія эканамічныя выдаткі. Так, валютная выручка, што прыносіла Усходняя Бенгалія, пакрывала 70% імпартных выдаткаў Заходняга Пакістана. Вялікія былі матэрыяльныя выдаткі ад ваеннага паражэння. У 1971-1972 гг. у прамысловасці назіраўся спад вытворчасці на 5,6 %. Ваеннае паражэнне выклікала і маральны крызіс у грамадстве. Так што ППН прыйшла да ўлады ў складаных умовах. Яе палітыка грунтавалася на трох прынцыпах:

- іслам – наша вера;
- дэмакратыя – наша форма кіравання;
- сацыялізм – наша эканамічная сістэма.

ППН абвясціла сваёй мэтай пабудову справядлівага грамадства ў Пакістане шляхам ажыццяўлення “сацыялістычных пераўтварэнняў”, якія распаўсюджваліся пераважна на сферу эканомікі і прадугледжвалі дзяржаўны кантроль над найважнейшымі сродкамі вытворчасці і нацыяналізацыю найбольш важных галін эканомікі. Намячалася таксама аграрная рэформа. Вялікая роля ў будаўніцтве новага грамадства адводзілася ісламу як ідэалагічнай базе (“ісламскі сацыялізм”).

У рамках палітыкі “ісламскага сацыялізму” ўжо ў студзені 1972 г. урад усталяваў дзяржаўны кантроль над 31 буйным прадпрыемствам цяжкай прамысловасці, многія з якіх былі нацыяналізаваны. Былі нацыяналізаваны і прыватныя банкі, частка страхавых кампаній. З 1972 г. пачаўся новы этап аграрнай рэформы. Максімум зямлі, якая пакідалася памешчыкам, быў значна зніжаны (150 акраў арашальнай і 300 акраў неарашальнай). Лішкі зямлі забіраліся без выкупу і бясплатна перадаваліся сялянам. Урад выдзяляў значныя сродкі на будаўніцтва арашальных сістэм, прадпрыемстваў, што абслугоўваюць сельскую гаспадарку. У 1977 г. аграрная рэформа была яшчэ больш радыкалізавана. Максімум знізілі да ста акраў (40 га) арашальнай зям-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лі. Змянілася падатковая сістэма ў сельскай гаспадарцы на карысць беднага сялянства. Вясной 1972 г. было абвешчана аб серыі сацыяльных рэформаў, мэта якіх заключалася ў пэўным выраўноўванні даходаў.

У 1973 г. была прынята новая канстытуцыя Пакістана. Ён ператвараўся ў парламенцкую рэспубліку. Прэзідэнт выбіраўся дзвюма палатамі парламента. Ён не меў вялікай улады. Рэальная выканаўчая ўлада канцэнтравалася ў руках кабінета міністраў і перш за ўсё прэм’ер-міністра. Адданасць ісламу дэманстравалі тыя артыкулы канстытуцыі, якія абвяшчалі іслам дзяржаўнай рэлігіяй. З часам урад ППН на чале з Бхута, якая прыйшла да ўлады ў 1970 г., ўсё больш адыходзіць ад дэмакратычных нормаў канстытуцыі ў сваёй рэальнай палітыцы. У лютым 1975 г. улады забаранілі буйнейшую апазіцыйную Нацыянальную народную партыю. Перадвыбарная кампанія 1977 г. праходзіла ва ўмовах жорсткай канфрантацыі. Апазіцыя аб’ядналася ў Пакістанскі нацыянальны альянс і актыўна нападала на кіруючую ППН. Яна абвінавачвалася ў парушэнні канстытуцыі 1973 г. З лютага 1977 г. перадвыбарныя маніфестацыі сталі перарастаць ва ўзброеныя сутычкі. У пачатку сакавіка выбары адбыліся і была абвешчана ўпэўненай перамога ППН. Але апазіцыя абвясціла выбары недэмакратычнымі, іх вынікі фальсіфікаванымі. Яна запатрабавала правядзення новых выбараў пад кантролем арміі. Пачаліся масавыя антыўрадавыя выступленні. У такіх умовах 5 ліпеня 1977 г. быў ажыццёўлены дзяржаўны пераварот. Яго ўзначаліў начальнік генеральнага штаба генерал М.Зія-уль-Хак. У кастрычніку 1978 г. ён стаў прэзідэнтам Пакістана. Эксперымент па будаўніцтву “ісламскага сацыялізму” ў Пакістане закончыўся няўдачай.

Ваенны рэжым адразу абвясціў аб намеры правесці дэнацыяналізацыю шэрагу прадпрыемстваў, мерапрыемствы, якія былі накіраваны на заахвочванне буйнога прыватнага нацыянальнага і замежнага капіталу. Здавалася, змена ўлады, якая адбылася ў 1977 г. у выніку ваеннага перавароту, прывядзе да карэнных зменаў у эканамічным развіцці Пакістана. Але першапачаткова ўрад Зія-уль–Хака не спяшаўся рабіць крокі насустрач прыватнаму капіталу. На палітыку генерала паўплывала патрэба ў цэнтралізацыі капіталу, якую ва ўмовах Пакістана можна было забяспечыць перш за ўсё з дапамогай дзяржавы. Дэнацыяналізацыя, змяншэнне ролі дзяржавы ў эканоміцы сустрэлі супраціўленне ў грамадстве з ісламскімі традыцыямі. У выніку, нягледзячы на ўсе заявы ваеннага рэжыму аб адданасці ідэям заахвочвання прыватнай ініцыятывы, у першыя гады пасля перавароту

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не адбылося істотных змен у суадносінах сіл паміж дзяржаўным і прыватным сектарамі эканомікі. У дзяржаўным сектары заставаліся асноўная вытворчыя магутнасці ў цяжкай прамысловасці, камандныя пазіцыі ў сферы крэдыту, марскі транспарт, экспарт бавоўны. Экспартная выручка на 72% паступала ў Пакістан па дзяржаўных каналах. Удзельная вага дзяржаўных інвестыцый на пачатку 80-х гг. складала каля 70%. Адным з аргументаў для захавання вялікага дзяржаўнага сектара была спасылка на традыцыі ісламу, згодна з якімі дзяржава разглядаецца як актыўны агент эканамічных адносін.

У палітычнай сферы ўсталяваўся жорсткі аўтарытарны рэжым. Уся краіна была падзелена на ваенныя зоны, у кожнай з якіх улада належала ваеннаму начальніку. Канстытуцыя 1973 г. была часова адменена, і ў яе пачалі ўносіць шматлікія змены. Была ўзаконена дзейнасць ваенных судоў, забаронена дзейнасць палітычных партый, прадастаўлены надзвычайныя паўнамоцтвы прэзідэнту, абмяжоўвалася дзейнасць прафсаюзаў. Быў прыняты шэраг законаў, якія стваралі прававую базу для ісламізацыі Пакістана. Прадугледжвалася стварэнне ісламскіх судоў, якія ажыццяўлялі правасуддзе на аснове традыцый ісламу, аднаўлялася сістэма выбараў па рэлігійных курыях, адбывалася ісламізацыя сістэмы адукацыі, прапаганды, былі ўрэзаны правы жанчын. 19 снежня 1984 г. у Пакістане быў праведзены рэферэндум, удзельнікі якога павінны былі выказаць свае адносіны да палітыкі ісламізацыі. Зія-уль-Хак заявіў, што станоўчы адказ на пастаўленае пытанне будзе разглядацца і як згода пакістанцаў на тое, каб ён яшчэ пяць гадоў заставаўся на пасадзе прэзідэнта. Ваенныя ўлады заявілі, што Зія-уль-Хак атрымаў падтрымку 97,7% галасаваўшых.

Становішча ў эканоміцы ў час праўлення ваенных стабілізавалася. Тэмпы росту ВУП у 1977/78 – 1984/85 гг. складалі 6 – 7% у сярэднім за год. Пасля пераходу ад прамога ваеннага кіравання да ўскоснага ў 1985 г., цэнтр цяжару ў развіцці эканомікі пачаў яшчэ больш пераносіцца на прыватны сектар. З канца 70-х гг. пачалося ўмацаванне пазіцый замежнага капіталу. Капіталаўкладанні прыватнага замежнага капіталу ў эканоміку Пакістана ацэньваюцца за 1977 – 1985 гг. у 1,5 млрд. долараў. Пранікненне замежнага капіталу адбывалася ў асобныя галіны і надало эканоміцы Пакістана верхавінкавае развіццё. Мадэрнізацыя ахапіла верхнія "паверхі" эканомікі, звязаныя з ТНК. Ніжнія паверхі ўтварае традыцыйны сектар, які складае асноўную частку эканомікі і не закрануты мадэрнізацыяй. Аграрная рэформа пасля ваеннага перавароту была спынена. Цяпер шлях да павышэння прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі бачыўся праз забеспячэнне яе

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

новай тэхнікай, мінеральнымі ўгнаеннямі, выкарыстанне новых агратэхнічных прыёмаў. Гэта дало магчымасць некалькі павысіць ураджайнасць і таварнасць памешчыцкіх гаспадарак. Умацаванне памешчыцкага землеўладання вяло да паўперызацыі сялянства.

Пасля рэферэндуму 19 снежня 1984 г. Зія-уль–Хак пайшоў на змены ў сістэме кіравання краінай. Было вырашана адмовіцца ад адкрытай ваеннай дыктатуры і перайсці да ўскоснага ваеннага кіравання. У лютым – сакавіку 1985 г. ваенныя праводзяць выбары ў парламент. Шэраг апазіцыйных партый заявілі аб адмове ўдзельнічаць у выбарах. Ідучы на правядзенне парламенцкіх выбараў, Зія-уль-Хак прыняў меры па ўмацаванню сваёй асабістай улады. 2 сакавіка 1985 г. у канстытуцыю былі ўнесены папраўкі, якія значна пашыралі паўнамоцтвы прэзідэнта. 8-я папраўка аб'яўляла законамі ўсе яго ўказы. Такім чынам, у 1985 г. ваенны рэжым стаў на шлях паступовай трансфармацыі ў цывільны канстытуцыйны пры максімальным захаванні існуючай структуры ўлады. Фармальна аднавілася дзейнасць парламенцкіх інстытутаў пры практычна поўным захаванні рэальнай улады ў руках генерала-прэзідэнта. Ва ўмовах ускоснага ваеннага праўлення пачалі нарастаць разыходжанні паміж прэзідэнтам і ўрадам. 29 мая 1988 г. Зія-уль-Хак адправіў кабінет у адстаўку і распусціў парламент. У такой сітуацыі 17 жніўня 1988 г. генерал загінуў у авіякатастрофе. Пасля яго гібелі згодна з канстытуцыяй пасаду прэзідэнта заняў старшыня сената Гулам Ісхак-хан. 16 лістапада 1988 г. адбыліся выбары ў нацыянальную асамблею Пакістана на шматпартыйнай аснове. На іх сутыкнуліся дзве асноўныя сілы. Правы блок на чале з Мусульманскай лігай – Ісламскі дэмакратычны альянс (лідэр – Наваз Шарыф) і ППН (на чале – Беназір Бхута). Апошняя і перамагла на выбарах. Сфарміраваны Б.Бхута ўрад быў кааліцыйны. Ужо ў 1989 г. кааліцыя пачала распадацца. У правінцыі Сінд пачаліся этнічна-рэлігійныя сутычкі. У выніку 6 жніўня 1990 г. прэзідэнт адправіў урад Бхута ў адстаўку. Новы ўрад сфарміраваў Н.Шарыф. У 1993 г. узнік востры канфлікт ужо паміж ім і прэзідэнтам. Абодва вышэйшыя дзяржаўныя кіраўнікі Пакістана пайшлі ў адстаўку, і былі прызначаны ўсеагульныя выбары. Перамогу атрымала ППН, і Бхута зноў узначаліла ўрад. Новым прэзідэнтам быў абраны Фарук Легары. Пры ўрадзе Бхута ў 1993 – 1996 гг. нябачныя маштабы набыла карупцыя. Гэта і дало падставу прэзідэнту адправіць урад у адстаўку і даручыць Шарыфу сфарміраваць новы.

Перыяд з канца 80-х да канца 90-х гг. XX ст. характарызуецца паступовым усталяваннем у Пакістане дэмакратычных інстытутаў і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нормаў. Развіццё дэмакратычных працэсаў у гэты час адбывалася ў іншых умовах, чым гэта было ў пачатку незалежнасці. За прайшоўшы час значны крок наперад зрабіла мадэрнізацыя пакістанскага грамадства, умацаваўся сярэдні клас, узрасла палітычная актыўнасць насельніцтва. Змяншэнне ролі дзяржавы ва ўмовах лібералізацыі эканомікі аслабіла сілу бюракратыі. Гэта спрыяла развіццю дэмакратычных працэсаў. Аднак для перыяду пасля 1988 г., калі адбыўся пераход да цывільнага кіравання, характэрна нестабільнасць. Чатыры разы распускаўся парламент, і ні разу ён не працаваў поўнасцю адведзеныя канстытуцыяй 5 гадоў. З 1988 да 1997 г. змянілася 17 урадаў. Такая нестабільнасць органаў дзяржаўнай улады тлумачылася:

1) прыкладнай роўнасцю сіл дзвюх асноўных палітычных партый: Мусульманскай лігі і ППН. Да выбараў 1997 г. кожная з іх атрымоўвала нязначную перавагу ў парламенце і знаходілася на чале ўлады дзякуючы падрымцы іншых палітычных груп;

2) вострыя канфлікты паміж прэзідэнтам і прэм’ер-міністрам. У іх армія звычайна падтрымлівала прэзідэнта, і ён выходзіў пераможцам. Толькі ў 1993 г. у адстаўку вымушаны былі пайсці абодва кіраўнікі.

Усеагульныя парламенцкія выбары 1997 г. унеслі істотныя змены ў расстаноўку палітычных сіл у краіне. Упершыню перамогшая партыя заваявала значную перавагу ў парламенце. Мусульманская ліга мела каля 79% месцаў у ім. Такая сітуацыя магла спрыяць стабілізацыі становішча ў краіне, эфектыўнай працы ўрада. Ён дабіўся адмены 8-й папраўкі канстытуцыі, якая давала вялікія паўнамоцтвы прэзідэнту. Яго пазбавілі права распускаць парламент і ўрад. Да прэм’ер-міністра перайшло права прызначаць начальніка генеральнага штаба. Цяпер рэальная выканаўчая ўлада ўсё больш канцэнтравалася ў руках прэм’ера. Праўда, у пачатку 1997 г. быў утвораны Савет абароны і нацыянальнай бяспекі (САНБ). Гэты орган дае парады прэзідэнту па важнейшых пытаннях. Акрамя ключавых міністраў, у яго ўваходзілі вышэйшыя ваенныя. Стварэнне САНБ азначала афіцыйнае прызнанне захавання вялікай ролі ўзброеных сіл у палітычным жыцці краіны. САНБ уяўляе сабою ў руках прэзідэнта пэўную супрацьвагу росту ўплыву кабінету міністраў. Выбары 1997 г. перапынілі працэс складвання 2-партыйнай сістэмы ў Пакістане. ППН мела толькі каля 10% месцаў у парламенце. Мусульманская ліга стала яўна пануючай партыяй на палітычнай арэне краіны. Пасля падзення рэжыму Зія-уль–Хака, які трымаўся на саюзе ваенных і клерыкалаў, працэс ісламізацыі краіны не быў спынены. У канстытуцыі краіны засталіся ісламісцкія палажэнні. У снежні 1993 г. прадстаўнік урада заявіў, што

правячая ППН не збіраецца выключаць іх з канстытуцыі. На пазіцыях ісламізацыі стаяла і Мусульманская ліга. У 1997 г. прэм'ер-міністр Шарыф абвясціў аб намеры прывесці судовую сістэму ў адпаведнасць з патрабаваннямі ісламу. 21 чэрвеня 1998 г. прэзідэнт Пакістана Рафік Тарар заявіў, што галоўная задача – увядзенне ў Пакістане законаў шарыяту. У 1998 г. у пакістанскім парламенце пачалося абмеркаванне законапраекта аб прыняцці 15-й папраўкі да канстытуцыі, якая ўсталёўвала прыярытэт законаў шарыяту над канстытуцыяй.

Нечакана ў 1998-1999 гг. адбываецца разрыў Шарыфа з ісламістамі. Прычынай гэтага стала імкненне прэм'ер-міністра да ўсталявання аўтарытарнай улады. Тым самым урад аслабіў свае пазіцыі ў супрацьстаянні з арміяй. З пачатку 1999 г. у Карачы адбываюцца масавыя сутыкненні на рэлігійна-этнічнай глебе. Каб іх спыніць, урад фактычна перадаў уладу ў горадзе ваенным. Гэтым урад адкрываў шлях да далейшага ўмацаваня іх пазіцый у палітычным жыцці. Незадаволенасць арміі нарастала ў сувязі з нерашучасцю ўрада ў час інда-пакістанскага канфлікту летам 1999 г. На гэты момант Індыя і Пакістан ужо сталі ядзернымі дзяржавамі, і канфлікт паміж імі ў сувязі з гэтым быў асабліва небяспечным.

12 кастрычніка 1999 г. у Пакістане адбыўся дзяржаўны пераварот. Уладу ўзялі ваенныя на чале з генералам Первезам Мушарафам. У яго склаліся складаныя адносіны з ісламістамі ў сувязі з антытэрарыстычнай аперацыяй ЗША і іх саюзнікаў у Афганістане. Палітыка Мушарафа па яе падтрымцы атрымала супрацьдзеянне значнай часткі грамадства. Канец 2002 г. азнаменаваўся крокамі Мушарафа, якія павінны былі стварыць парламенцкі фасад для яго ваеннага рэжыму. Аднавілі сваю дзейнасць палітычныя партыі і парламент краіны. Генерал быў афіцыйна абраны на пасаду прэзідэнта.

## ВЭ-1. ІНДЫЯ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- як адбылося ўтварэнне незалежнай Індыі;
- сутнасць "курса Нэру" і "кангрэсісцкага сацыялізму";
- партыйную сістэму Індыі;
- вядучых палітычных дзеячаў незалежнай Індыі;
- асноўныя рысы палітыкі ўрадаў І. Гандзі і Р. Гандзі;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- сутнасць палітыкі ўрадаў ІНК і Бхаратыя джаната парты ў 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.;

- асноўныя этапы, кірункі і падзеі знешняй палітыкі незалежнай Індыі;

***умець:***

- ахарактарызаваць вынікі другой сусветнай вайны для Брытанскай Індыі;

- выявіць адметныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця Індыі на розных этапах;

- параўнаць палітычную сістэму Індыі 50-х – 70-х гг. XX ст. і тую, якая склалася ў канцы XX ст.;

- аналізаваць вынікі ўсеагульных выбараў у Індыі;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-1:***

1 Утварэнне Рэспублікі Індыя як незалежнай дзяржавы.

2 Палітыка ІНК у 1950-1964 гг. "Курс Нэру".

3 Працяг "курса Нэру" і палітычная барацьба ў Індыі ў 1967 – 1984 гг.

4. Змены ў сацыяльна-эканамічным развіцці і новыя тэндэнцыі ў палітычным жыцці Індыі з сярэдзіны 1980-х гг.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля заканчэння другой сусветнай вайны Англія пайшла на прадастаўленне незалежнасці Брытанскай Індыі, якая з-за вострых супярэчнасцей паміж індускай і мусульманскай абшчынамі была падзелена на дзве дзяржавы – Індыю і Пакістан. Канстытуцыя 26 студзеня 1950 г. юрыдычна аформіла ўтварэнне Рэспублікі Індыя.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. – С.221-226. Ч. 1. – С.193-201.

У *падручніку падрабязна характарызуецца палітычная сітуацыя ў Індыі пасля заваявання незалежнасці і дэталёва аналізуецца дзяржаўна-палітычны лад па канстытуцыі 1950 г.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т. 2. – С.40-42, 413-414.

*Аўтар дэталёва характарызуе прычыны і перадумовы заваявання незалежнасці Індыяй.*

Антонов К.А. и др. История Индии. – М, 1979.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У манаграфіі шмат увагі надаецца сацыяльна-эканамічным перадумовам заваявання незалежнасці, праблемам класавай барацьбы, рабочага руху ў сувязі з разгортваннем нацыянальна-вызваленчага руху.*

Гопал С. Джавахарлал Нэру. – М., 1989-1990. – Т.1-2.

*Манаграфія дазваляе з пазіцый заходняй гістарыяграфіі прасачыць ролю Дж.Нэру ў заваяванні незалежнасці Індыяй у кантэксце палітычнай барацьбы.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічныя вынікі другой сусветнай вайны для Індыі;

*Звярніце ўвагу на значны рост прамысловасці ў час вайны, на ўмацаванне індыйскага капіталу, што вяло да росту супярэчнасцей паміж патрэбамі развіцця нацыянальнага капіталізму і каланіяльным статусам краіны.*

- прасачыце разгортванне нацыянальна-вызваленчага руху пасля другой сусветнай вайны і вызначце ролю ў ім найбольш буйных палітычных партый Індыі;

*Неабходна адзначыць, што ў нацыянальна-вызваленчым руху зліліся ў адно цэлае паўстанні на флоце, масавыя акцыі пад кіраўніцтвам ІНК, выступленні рабочых, сялянскія хваляванні.*

- прааналізуйце палітыку Англіі ў Індыі ў 1945-1947 гг.;

*Пры выкананні дадзенага задання падумайце, ці імкнулася Англія за любы кошт захаваць сваё панаванне ў Індыі, ці хацела яна захаваць адзінства калоніі, ці спрабавала выкарыстаць у сваіх інтарэсах індуска-мусульманскія супярэчнасці.*

- зрабіце аналіз ходу дзяржаўнага будаўніцтва ў Індыі ў першыя гады незалежнасці і зместу канстытуцыі 1950 г.

*Звярніце ўвагу, што ў 1947 г. Індыя атрымала статус Брытанскага дамініёна і ўрад Нэру вырашаў задачу ўмацавання суверэнітэту краіны. У канстытуцыі 1950 г. зроблена спроба вырашыць вострыя нацыянальныя праблемы, закладзена юрыдычная база для развіцця парламенцкай дэмакратыі і змешанай эканомікі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### Парадак вывучэння другога пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля заваявання Індыяй незалежнасці правячы ІНК стаў ажыццяўляць палітыку, якая ўвайшла ў гісторыю як “курс Нэру” і найважнейшымі элементамі якой з’яўляліся парламенцкая дэмакратыя, змешаная эканоміка, палітыка недалучэння на міжнароднай арэне.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. – С. 226-234.

*У падручніку дадзена характарыстыка партыйнай сістэмы, праанализавана канцэпцыя "кангрэсісцкага сацыялізму", вызначана роля этна-рэлігійных супярэчнасцей у жыцці краіны, але практычна адсутнічае характарыстыка эканамічнай палітыкі "курса Нэру".*

Чичеров А.И. Джавахарлал Нэру и независимая Индия. – М., 1990.

*Аўтар канцэнтруе ўвагу на пытаннях партыйна-палітычнай барацьбы і, нягледзячы на наяўнасць у Індыі надзвычай вострых этна-рэлігійных супярэчнасцей, зводзіць яе ў асноўным да супрацьстаяння класаў.*

Антонов К.А. и др. История Индии. – М., 1979.

*У дадзеным выданні даволі падрабязна характарызуецца сацыяльна-эканамічнае развіццё Індыі часоў "курсу Нэру". Пры гэтым яўна перабольшваецца станоўчая роля дзяржаўнага сектара ў гэтым працэсе.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прачытайце наступны дакумент і вызначце асноўныя рысы сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў рамках "курса Нэру":

"Палітычныя перамены патрэбны, але ў такой жа меры патрэбны і эканамічныя перамены. Гэтыя перамены павінны адбыцца ў кірунку дэмакратычнага плануемага калектывізму. Дэмакратычны калектывізм не абавязкова павінен азначаць адмену прыватнай уласнасці, але ён будзе азначаць прыналежнасць грамадству асноўных і буйных галін прамысловасці. Ён будзе азначаць калектыўны і кааператыўны кантроль над зямельнай уласнасцю. Асабліва ў Індыі неабходна будзе мець, акрамя буйной прамысловасці, дробную і сялянскую прамысловасць, кантралюемую на кааператыўных пачатках. Такая сістэма дэмакратычнага калектывізму запатрабуе бесперапыннага планавання. Мэта павінна заключацца ў тым, каб пашырыць вытворчы патэнцыял народу ўсімі магчымымі шляхамі, уключаючы ... усю рабочую сілу нацыі ў той ці іншы від дзейнасці і прадухіляючы беспрацоўе ... Вынікам усяго гэтага не будзе роўнасць даходаў, але будзе забяспечана больш справядлівае размеркаванне іх і створана тэндэнцыя да паступовага выраўноўвання іх. (Нэру Дж. Открытие Индии. – М., 1965. – С.574.)

*Звярніце ўвагу на прыярытэты ў развіцці эканомікі і імкненне да пераразмеркавальнай дзейнасці дзяржавы ў сацыяльнай сферы.*

- вызначце сутнасць канцэпцыі "кангрэсісцкага сацыялізму";

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Найбольш важна адзначыць, што гэта разнавіднасць дэмакратычнага сацыялізму, які прадугледжвае парламенцкую дэмакратыю і шматукладную эканоміку.*

- прааналізуйце ход сацыяльна-эканамічнага развіцця Індыі ў рамках “курсу Нэру”;

*Неабходна звярнуць увагу на прыярытэтнае развіццё дзяржаўнага сектара і цяжкай прамысловасці, на тое, што важнейшым дасягненнем стала стварэнне значнай цяжкай індустрыі, але нізкая эфектыўнасць эканомікі не дазволіла вырашыць асноўныя сацы-яльныя праблемы.*

- вызначце важнейшыя рысы дзяржаўна-палітычнай сістэмы Індыі і прасачыце ход палітычнай барацьбы ў час “курсу Нэру”;

*Неабходна адзначыць, што Індыя ў той час уяўляла сабой узор развіцця парламенцкай дэмакратыі на Усходзе, а палітычная барацьба вялася галоўным чынам вакол этна-рэлігійных праблем і пытання аб унясенні карэктыў у “курс Нэру”. Прааналізуйце і вынікі выбараў у той перыяд.*

- ахарактарызуйце важнейшыя праблемы і кірункі знешняй палітыкі Індыі ў час “курсу Нэру”.

*Да ліку такіх праблем і кірункаў трэба аднесці канфлікт з Пакістанам, супрацоўніцтва з СССР, адносіны з Захадам, удзел у Руху недалучэння.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля смерці Дж.Нэру разгарнулася барацьба паміж праціўнікамі і прыхільнікамі яго палітыкі, якая закончылася перамогай апошніх і ўрад І.Гандзі да сярэдзіны 80-х гг. праводзіў палітыку, якая ў цэлым з’яўлялася працягам “курсу Нэру”.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. – С. 234-245, 253-260.

*З дапамогай гэтага падручніка можна падрабязна разгледзець ход партыйна-палітычнай барацьбы ў Індыі ў вывучаемы перыяд. Аўтары значна менш увагі звярнулі на сацыяльна-эканамічныя праблемы.*

Антонов К.А. и др. История Индии. – М., 1979.

*У прапанаваным выданні падрабязна разглядаецца сацыяльна-эканамічная палітыка ўрадаў І.Гандзі. Пры гэтым з марксісцка-ленінскіх пазіцый як важнейшае дасягненне падаецца стварэнне вялікага дзяржаўнага сектара і ўзмацненне дзяржаўнага рэгулявання без уліку яго эфектыўнасці.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Корнеев В.Л. Индия в 80-е годы. – М., 1986.

*Работа напісана таксама на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі і мае недахопы, пра якія гаварылася вышэй.*

Юрлов Ф. Индия в мировой политике // Азия и Африка сегодня. – 2005.- №4. – С.25-30.

Юрлов Ф. Индийский национальный конгресс – во власти и оппозиции // Африка и Азия сегодня. – 2004. - №2. – С32-39.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прааналізуйце фрагмент з выступлення І. Гандзі 26 студзеня 1966 г. і вызначце, ці намячала яна працягваць "курс Нэру": "Выдатную ролю ў нашай стратэгіі эканамічнага прагрэсу адыгрывае дзяржаўны сектар, які закліканы забяспечыць хуткае развіццё асноўных галін прамысловасці, а таксама энергетыкі і транспарту. У нашых умовах гэта не толькі пажадана, але і неабходна. Гэта стратэгія накладае на нас абавязацельства ствараць і пашыраць прадпрыемствы дзяржаў-нага сектара, эфектыўна кіраваць імі, атрымліваць дастаткова вялікія прыбыткі для далейшых капіталаўкладанняў. У нашых пяцігадовых планах няма супярэчнасцей паміж дзяржаўным і прыватным сек-тарамі. У рамках змешанай эканомікі прыватныя прадпрыемствы квітнеюць і атрымліваюць дапамогу і падтрымку ад урада. Мы будзем і далей заахвочваць прыватную ініцыятыву і аказваць ёй дапамогу." (Ганди И. Статьи, речи, интервью. – М., 1975. – С. 151.)

*Успомніце адметныя рысы сацыяльна-эканамічнай палітыкі "курсу Нэру" і параўнайце з тым, што прапаноўвае Гандзі.*

- прааналізуйце сацыяльна-эканамічную палітыку ўрада І.Гандзі і ход палітычнай барацьбы ў Індыі ў 1966-1974 гг.;

*Пры выкананні гэтага задання вы павінны адзначыць такія моманты, як узмацненне элементаў этатызму, папулізму ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы І.Гандзі, абвастрэнне палітычнай барацьбы, у тым ліку і ўнутры ІНК, што прывяло да расколу.*

- вызначце прычыны і сутнасць грамадска-палітычнага крызісу 1974-1977 гг.;

*Прычыны крызісу трэба шукаць перш за ўсё ў няўдачах сацыяльна-эканамічнай палітыкі ўрада І.Гандзі. Ён аказаўся няздольным утрымаць уладу ва ўмовах парламенцкай дэмакратыі, і была ўстаноўлена асабістая дыктатура І.Гандзі.*

- вызначце асноўныя моманты палітыкі ўрада правай кааліцыі ў 1977-1980 гг. і прычыны яго хуткага падзення;

*Звярніце ўвагу на наяўнасць вострых супярэчнасцей унутры правай кааліцыі, якія рабілі вельмі складаным правядзенне мэтана-*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*кіраванай цэльнай палітыкі. Так і не з'явілася рэальная альтэрнатыва палітыцы ІНК.*

- прааналізуйце сацыяльна-эканамічную і нацыянальна-рэлігійную палітыку ўрада І.Гандзі ў 1980-1984 гг.;

*Неабходна адзначыць, што ў гэты час у сацыяльна-эканамічнай палітыцы І.Гандзі стала ў некаторай ступені праяўляцца ліберальная тэндэнцыя, а рэлігійна-этнічныя супярэчнасці набылі асаблівую вастрыню.*

- ахарактарызуйце асноўныя кірункі знешняй палітыкі Індыі ў 1966-1984 гг.

*Неабходна адзначыць, што прыярытэты знешняй палітыкі Індыі ў гэты час у параўнанні з папярэднім, не змяніліся: супрацоўніцтва з СССР, Рух недалучэння, адносіны з Пакістанам.*

## Парадак вывучэння чацвёртага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** з сярэдзіны 80-х гг. сацыяльна-эканамічная палітыка Індыі мяняецца ў бок рынку і адкрытасці, што садзейнічала паскарэнню мадэрнізацыі і ўваходжанню яе ў лік новых індустрыяльных краін. У партыйна-палітычнай сферы на замену сістэме дамінавання адной партыі прыйшла сістэма з існаваннем некалькіх палюсоў сілы, а рэлігійна-этнічныя супярэчнасці заставаліся надзвычай вострымі.

***Для вывучэння дадзенага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.2. – С. 245-253.

*У падручніку паказаны змены ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы і расстаноўцы палітычных сіл Індыі з сярэдзіны 80-х гг. XX ст.*

Брагина Е. Постепенность экономических реформ // Мировая экономика и международные отношения. – 1999. – №7.

*Характарызуючы эканамічную палітыку сучаснай Індыі, аўтар акцэнтуе ўвагу на паступовасць палітыкі лібералізацыі. Артыкул дазваляе паглыбіць веды па эканамічным развіцці Індыі ў апошнія дзесяцігоддзі.*

Бакланов А. После ядерных взрывов в Индии и Пакистане // Международная жизнь. – 1998.– №7.

*Аўтар закранае праблему ўздзеяння на знешнепалітычнае становішча Індыі, набыцця ёю статуса ядзернай дзяржавы.*

Полонская Л.Р. Этно-конфессиональные проблемы в политической истории Индии // Восток. – 1992. – №2.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Рябкин В. Индия: защищая национальное единство // Международная жизнь. – 1986. –№11.

*У апошнія дзесяцігоддзі менавіта этна-канфесійныя праблемы займаюць цэнтральнае месца ў палітычным жыцці Індыі, што і вызначае неабходнасць знаёмства з дадзенымі артыкуламі, у якіх характарызуецца палітыка І.Гандзі ў дачыненні да гэтых праблем.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т. 2. - С.416-421.

*Дапаможнік дазваляе сфарміраваць агульнае ўяўленне аб найбольш важных тэндэнцыях развіцця сучаснай Індыі.*

Юрлов Ф. Индия в мировой политике // Азия и Африка сегодня. – 2005.- №4. – С.25-30.

Юрлов Ф. Индийский национальный конгресс – во власти и оппозиции // Африка и Азия сегодня. – 2004. - №2. – С.32-39.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце, якія перамены ў сацыяльна-эканамічную палітыку Індыі былі ўнесены ўрадам Р.Гандзі;

*Асноўную ўвагу звярніце на адыход ад палітыкі этатызму і лібералізацыю сацыяльна-эканамічных адносін.*

- прасачыце ход палітычнай барацьбы ў Індыі ў другой палове 80-х гг.;

*Неабходна адзначыць наступныя асноўныя моманты, якія вызначалі палітычнае жыццё Індыі ў той час: нацыянальна-рэлігійныя канфлікты, аслабленне пазіцый ІНК(І), кансалідацыя апазіцыі і прыход яе да ўлады ў 1989 г.*

- прааналізуйце ход і вынікі сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі Індыі ў 90-я гг. XX – пачатку XXI ст.

*Пры выкананні гэтага задання важна зразумець, што ў разглядаемы перыяд на змену этатысцкай мадэлі прыйшла рынкавая мадэль эканомікі, але пры гэтым улады праводзяць палітыку "дазіраванай лібералізацыі".*

- ахарактарызуйце найважнейшыя моманты палітычнага развіцця Індыі ў 90-я гг. XX – пачатку XXI ст. і змены ў расстаноўцы палітычных сіл.

*Тут важна звярнуць увагу на захаванне вастрыні рэлігійна-этнічных праблем і на тое, што на змену сістэме панавання адной партыі прыходзіць шматполюсная і ўзмацняецца ўплыў правых сіл.*

## Самакантроль па ВЭ-1

1 У чым асаблівасці заваявання Індыяй незалежнасці?

2 Вызначце найбольш важныя, характэрныя рысы канцэпцыі "кангрэсісцкага сацыялізму".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3 У чым сутнасць палітыкі “курсу Нэру”?

4 Вызначце адметныя рысы сацыяльна-эканамічнай палітыкі ўрадаў І.Гандзі ў 1966-1984 гг.

5 Якія змены ў сацыяльна-эканамічным развіцці Індыі адбыліся з сярэдзіны 1980-х гг.?

6 Ахарактарызуйце ролю ў грамадскім жыцці Індыі этналінгвістычных і абшчынна-рэлігійных праблем.

7 Якую эвалюцыю прайшла партыйна-палітычная сістэма Індыі за гады незалежнасці?

## ВЭ-2. ПАКІСТАН І БАНГЛАДЭШ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць*:**

- гістарычныя ўмовы ўзнікнення Пакістана і характэрныя рысы яго дзяржаўнага ладу;
- асноўныя супярэчнасці сацыяльнага, палітычнага і эканамічнага развіцця Пакістана;
- этапы палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця Пакістана;
- партыйную структуру і найбольш значных дзяржаўна-палітычных дзеячаў;
- як і калі ўзнікла дзяржава Бангладэш і асноўныя падзеі і этапы ў яе развіцці;

***умець:***

- ахарактарызаваць асноўныя этапы сацыяльнага, эканамічнага і палітычнага развіцця Пакістана і Бангладэш;
- вызначыць прычыны палітычнай нестабільнасці і вялікай ролі арміі ў грамадска-палітычным жыцці Пакістана;
- ахарактарызаваць палітыку правячых рэжымаў Пакістана і Бангладэш у розны час.

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-2:***

1 Утварэнне Пакістана і барацьба дэмакратычнай і аўтарытарнай тэндэнцый у яго палітычным жыцці (1947-1971 гг.).

2 Спробы будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму і вяртанне да ваеннай дыктатуры (1971-1988 гг.)

3 Працэс дэмакратызацыі ў Пакістане з другой паловы 80-х гг. Ваенны пераварот 1999 г.

4 Утварэнне Бангладэш, асноўныя этапы і тэндэнцыі яго развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у Пакістане парламенцкая дэмакратыя не змагла замацавацца і пачынаючы з 1958 г. краіна перажыла серыю ваенных пераваротаў і дыктатур, якія так і не змаглі забяспечыць дынамічнае развіццё эканомікі і вырашэнне сацыяльных праблем.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001.–Ч.2. – С. 260-268.

*У падручніку дадзена падрабязнае апісанне ходу палітычнай барацьбы, але адсутнічае аналіз прычын палітычнай нестабільнасці і працэсаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.*

Белокрецкий В.Я. Капитализм в Пакистане. – М., 1988.

*Аўтар характарызуе адметныя рысы развіцця капіталізму ў Пакістане на першым этапе, які вызначае 1947-1970 гг.*

Пономарев Ю.А. История Мусульманской лиги Пакистана. – М.,1982.

Агеев В.Ф. Новейшая история Синда. – М.,1986.

*Названыя дзве манаграфіі ўтрымліваюць вялікі матэрыял як па гісторыі палітычнай барацьбы, так і сацыяльна-эканамічнага развіцця, але ён пададзены тэндэнцыйна, з марксісцка-ленінскіх класавых пазіцый.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце асаблівасці дзяржаўнага ладу і прычыны палітычнай нестабільнасці ў Пакістане ў 1947-1958 гг.;

*Неабходна звярнуць увагу на адсутнасць вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і жыцця ва ўмовах палітычнага плюралізму, на асаблівасці федэратыўнага ладу і пабудову партыйнай сістэмы на правінцыйнай аснове.*

- ахарактарызуйце асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі Пакістана ў 1957-1971 гг.;

Для вызначэння кірункаў знешняй палітыкі Пакістана скарыстайце фрагменты з выказванняў палітычных лідэраў краіны ў той час.

Міністр замежных спраў З.А. Бхута ў снежні 1964 г.: "…існавала амаль поўная ізаляцыя Пакістана (у 50-я гг.), звядзенне яго статуса да становішча сатэліта ... Гарызонт знешняй палітыкі быў амаль цалкам абмежаваны рамкамі СЕАТО і СЕНТО..."

Прэзідэнт Айюб-хан: "Малыя краіны, якія жывуць ва ўмовах ізаляцыі, не займаюць адпаведнага месца ў сённяшнім свеце, бяспека

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

афра-азіяцкіх краін – у стварэнні адзінага фронту супраць знешняга свету вялікіх дзяржаў”.

Ён жа: “Адзіны шлях забеспячэння нашай бяспекі заключаецца ў тым, каб мець сяброў магутных, зацікаўленых у нашай бяспецы. Вось чаму мы знаходзімся ў ваенным саюзе са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Мы верым, што яны зацікаўлены ў захаванні нашай бяспекі.” (Москоленко В.Н. Внешняя политика Пакистана. – М., 1984. – С.52, 66, 71).

*Цэнтральнымі момантамі ў гэты перыяд з’яўляюцца: рашаючая роля арміі ў палітычным жыцці; прыход да кіравання краінай пластоў новай буржуазіі і памешчыкаў, якія абуржуазіліся і былі схільныя да правядзення шэрагу рэформаў; больш незалежнай і больш шматнакіраванай стала знешняя палітыка; цэнтральнае месца ў грамадскім жыцці працягвала займаць нацыянальнае пытанне.*

- вызначце характэрныя рысы эканамічнага развіцця Пакістана ў 1947-1971 гг.;

*Патрэбна адзначыць курс на індустрыялізацыю, адсталасць сельскай гаспадаркі, эксплуатацыю ўнутранай калоніі як крыніцы рэсурсаў.*

- устанавіце прычыны і прасачыце ход утварэння дзяржавы Бангладэш.

*Звярніце ўвагу на тое, што насельніцтва Усходняй Бенгаліі спачатку не ішло далей за патрабаванні аўтаноміі, а да барацьбы за поўную не-залежнасць яго падштурхнулі рэпрэсіі ваенных, адзначце ролю Індыі ў гэтых падзеях.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** крызіс ваеннага рэжыму ў 1970-1971 гг. прывёў да пераходу да цывільнага праўлення і Партыя пакістанскага народа, якая прыйшла да ўлады, зрабіла спробу будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму, якая была прыпынена ваенным пераваротам 1977 г., пасля якога дыктатарскі рэжым узяў курс на ісламізацыю краіны і стварэнне рынкавай эканомікі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001.–Ч.2. – С. 268-276.

*Падручнік раскрывае сутнасць палітыкі ППН па будаўніцтве “ісламскага сацыялізму”, асноўныя рысы рэжыму Зія-уль-Хака як аўтарытарнага і ісламісцкага. Слабей раскрыты прычыны ваенна-*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*га перавароту 1977 г. і працэс эвалюцыі ваеннага рэжыму ў сярэдзіне 80-х гг.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Ч.2. - С.421-425.

*Аўтар сфармуляваў агульную канцэпцыю гісторыі Пакістана зыходзячы з яго ісламскага цывілізацыйнага фундаменту.*

Белокрецкий В.Я. Капитализм в Пакистане. – М., 1988.

Пономарев Ю.А. История Мусульманской лиги Пакистана. – М.,1982.

Нестеренко А. Пакистан. Оглядываясь на четверть века назад // Международная жизнь. – 1989. – №7.

*Названыя манаграфіі і артыкул дазваляюць больш глыбока вывучыць эканамічныя і сацыяльна-палітычныя працэсы ў Пакістане ў 70 – 80-я гг. XX ст., хаця для іх характэрна і пэўная аднабаковасць, звязаная з класавым падыходам.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце асноўныя элементы ідэйна-палітычнай платформы Партыі пакістанскага народа;

*Звяжыце выяўленыя вамі элементы ідэйна-палітычнай платформы ППН з яе канцэпцыяй будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму.*

- назавіце найбольш важныя мерапрыемствы, якія ажыццявіў урад З.А. Бхута ў рамках курса на будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму;

*Да ліку такіх мерапрыемстваў трэба аднесці правядзенне аграрнай рэформы, узмацненне ролі дзяржавы ў эканоміцы, прыняцце канстытуцыі 1973 г.*

- вызначце, якія прычыны прывялі да ваеннага перавароту 1977 г. і якія асноўныя кірункі існавалі ва ўнутранай і знешняй палітыцы Зія-уль-Хака ў 1977-1984 гг.;

*Звярніце асноўную ўвагу на сітуацыю палітычнай нестабільнасці, якая склалася ў пачатку 1977 г., на палітыку ісламізацыі, падаўлення ўсялякай апазіцыі, лібералізацыі эканомікі, умяшання ў афганскі канфлікт.*

- ахарактарызуйце рэжым "ускоснага ваеннага праўлення", які існаваў у Пакістане ў 1985-1988 гг..

*Выконваючы гэтае вучэбнае заданне, неабходна адзначыць тыя змены, якія ў канцы 1984 – пачатку 1985 г. былі ўнесены ваенным рэжымам у канстытуцыю і сістэму дзяржаўнай улады. Пасля гэтага дыктатура Зія-уль-Хака хавалася за шырмай канстытуцыйных, прадстаўнічых органаў улады.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля смерці Зія-уль-Хака ў 1988 г. Пакістан ажыццяўляе пераход да парламенцкай дэмакратыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гэты працэс адбываецца ва ўмовах палітычнай нестабільнасці, барацьбы ісламісцкай і свецкай тэндэнцый, што прыводзіць да новага ваеннага перавароту ў 1999 г.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. – М., 2001.–Ч.2. – С. 276-281.

*У падручніку адзначаны найбольш важныя палітычныя падзеі ў 1988-1999 гг., але не ставіцца пытанне аб палітыцы ісламізацыі, аб сацыяльнай базе працэсу дэмакратызацыі, прычынах ваеннага перавароту 1999 г.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. - С.422-425.

*Аўтар вельмі коратка адзначае асноўныя тэндэнцыі палітычнага жыцця Пакістана ў 1988-1999 гг. – ісламізацыя, нестабільнасць.*

***Выканайце наступныя вычэбныя заданні:***

- прасачыце ход палітычнай барацьбы ў Пакістане ў 1988-1996 гг., устанавіце прычыны палітычнай нестабільнасці;

*Пры выкананні гэтага задання неабходна звярнуць увагу на барацьбу паміж урадам і прэзідэнтам па пытанні аб размеркаванні ўладных паўнамоцтваў, на ролю арміі ў ёй, на расстаноўку палітычных сіл.*

- вызначце, якія змены ў расстаноўку палітычных сіл унеслі выбары 1997 г. і дайце характарыстыку палітыкі ўрада Н.Шарыфа;

*Тут неабходна адзначыць упэўненую перамогу на выбарах 1997 г. Мусульманскай лігі і катастрафічнае паражэнне Партыі пакістанскага народа, што азначала спыненне фарміравання двухпартыйнай сістэмы, а да ліку галоўных праблем у палітыцы ўрада Н.Шарыфа трэба аднесці ісламізацыю жыцця краіны і адносіны з Індыяй.*

- устанавіце прычыны і перадумовы ваеннага перавароту 1999 г. і ахарактарызуйце палітычны курс генерала П.Мушарафа;

*Патрэбна звярнуць увагу на тое, што парламенцкая дэмакратыя з'яўляецца чужароднай для традыцыйнага пакістанскага грамадства, на непаслядоўнасць палітыкі Н.Шарыфа ў адносінах да ісламістаў, незадавальненне ваенных яго знешняй палітыкай.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### Парадак вывучэння чацвёртага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** фактычны статус унутранай калоніі Пакістана прывёў да нацыянальна-вызваленчай рэвалюцыі ва Усходняй правінцыі і ўтварэння Рэспублікі Бангладэш, якая ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. развівалася ва ўмовах палітычнай нестабільнасці і нявырашанасці вострых сацыяльных праблем.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001.–Ч.2. – С. 281-296.

*Падручнік утрымлівае дастатковы па аб'ёму матэрыял, каб прасачыць станаўленне і развіццё бангладэшскай дзяржаўнасці, найважнейшыя палітычныя падзеі і тэндэнцыі сацыяльна-палітычнага жыцця Бангладэш.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. - С.422-425.

*На аснове матэрыялу названага дапаможніка сфармулюйце канцэптуальныя падыходы да вывучэння гісторыі Бангладэш.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце прычыны і перадумовы ўтварэння Рэспублікі Бангладэш;

*Выконваючы гэтае заданне, зыходзьце з таго, што Усходняя Бенгалія выконвала ролю ўнутранай калоніі, і з этна-культурнай адасобленасці мясцовага насельніцтва.*

- прасачыце ход станаўлення бангладэшскай дзяржаўнасці і яе юрыдычнае афармленне канстытуцыяй 1975 г.
- ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця і найбольш важныя сацыяльна-эканамічныя праблемы ў жыцці Бангладэш у 1975 г.– пачатку XXI ст.

*Звярніце ўвагу на спробы кіраўніцтва Бангладэш знайсці трэці шлях развіцця паміж капіталізмам і сацыялізмам. У палітычным жыцці найважнейшым фактарам была палітычная нестабільнасць, якая найбольш яскрава праявілася ў шэрагу ваенных пераваротаў і дыктатур.*

### Самакантроль па ВЭ-2.

1 Чым характарызавалася палітычнае жыццё Пакістана ў 1947 – 1958 гг.?

2 Назавіце адметныя рысы развіцця капіталізму ў Пакістане ў 1947 – 1970 гг.

3 Чым было выклікана правядзенне аграрнай рэформы ў Пакістане, якія яе характэрныя рысы і вынікі ў 50 – 60-я гг. XX ст.?

4 Якую палітыку ажыццяўляла правячая Партыя пакістанскага народа ў 1971 – 1977 гг.?

5 Ахарактарызуйце палітычны рэжым і сацыяльна-эканамічную сістэму Пакістана ў 1977 – 1988 гг.

6 З якімі цяжкасцямі сутыкнуўся працэс дэмакратызацыі ў Пакістане ў канцы 80-х – 90-я гг. XX ст.?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7 Якую ролю адыгрываў ісламскі фактар у грамадска-палітычным жыцці Пакістана ў 70-я гг. XX – пачатку XXI ст.

8 Чым быў выкліканы і якія змены ва ўнутраную і знешнюю палітыку Пакістана ўнёс пераварот 1999 г.?

9 Чым было абумоўлена аддзяленне Усходняй Бенгаліі ад Пакістана?

10 У чым сутнасць альтэрнатыўнага (трэцяга) шляху развіцця Бангладэш?

11 Якія прычыны абумовілі нестабільнасць у палітычным жыцці Бангладэш?

12. Якія асноўныя сацыяльна-эканамічныя праблемы характэрныя для Бангладэш у 1970-я гг. – пачатку XXI ст.?

## ВЭ-К. ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ ПА МОДУЛЮ

*Перш чым прыступіць да выканання кантрольных заданняў, успомніце, якія мэты ставіліся пры вывучэнні гэтага модуля, якая яго вядучая ідэя, якія паняцці трэба было засвоіць. Калі вы не ўпэўнены, што пастаўленыя задачы вырашаны, звярніцеся да той літаратуры, якая рэкамендавалася пры вывучэнні ВЭ модуля.*

***Кантрольныя заданні:***

1 У чым сутнасць “плана Маўнтбетана”?

2 Якія праблемы ўзніклі пры падзеле Брытанскай Індыі на два дамініёны?

3 Першая канстытуцыя незалежнай Індыі ўступіла ў дзеянне ў: 1) 1947 г.; 2) 1949 г.; 3)1950 г.; 4) 1952 г.

4 Канцэпцыя “кангрэсісцкага сацыялізму” прадугледжвала: 1) рэжым парламенцкай дэмакратыі; 2) дыктатуру народа; 3) аднапартыйную сістэму; 4) змешаную эканоміку з перавагай дзяржаўнага сектара.

5 У рамках “курсу Нэру” Індыя: 1) стварыла моцную цяжкую прамысловасць; 2) забяспечыла перавагу дзяржаўнага сектара ў эканоміцы; 3) вырашыла праблему беднасці; 4) стварыла адкрытую эканоміку.

6 Першым прэм’ер-міністрам незалежнай Індыі стаў __________.

7 Чаму правае крыло ІНК у сярэдзіне 60-х гг. выступіла супраць працягу “курсу Нэру”?

*Успомніце вынікі “курса Нэру”.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

8 Урад І. Гандзі ў 1966 – 1977 гг.: 1) працягваў “курс Нэру”; 2) умацаваў дзяржаўны сектар у эканоміцы; 3) адмовіўся ад палітыкі недалучэння; 4) надаў прыярытэт прыватнаму сектару.

9 Для палітычнай сістэмы Індыі ў 50-я – 70-я гг. было характэрна: 1) парламенцкая дэмакратыя; 2) аднапартыйная дыктатура; 3) унітарная дзяржава; 4) дамінаванне адной партыі.

10 У 1975-1977 гг. у Індыі: 1) былі пашыраны дэмакратычныя правы і свабоды; 2) усталяваўся аўтарытарны рэжым І. Гандзі; 3) упершыню адбыўся адыход ад пар-ламенцкай дэмакратыі; 4) узрос аўтарытэт ІНК як вядучай партыі.

11 Чым знамянальныя парламенцкія выбары 1977 г.у гісторыі Індыі?

12 Падставай для забойства І. Гандзі стала правядзенне ваеннай аперацыі супраць ________________ у штаце __________________.

13. Урад Р. Гандзі з 1984 г. праводзіў палітыку: 1) этатызму; 2) лібералізацыі эканомікі; 3) збліжэння з вядучымі капіталістычнымі краінамі; 4) забароны дзейнасці апазіцыі.

14 Якія вынікі парламенцкіх выбараў 1989 г. у Індыі?

15 У 1991 – 1996 гг. правячай партыяй у Індыі з’яўлялася __________________.

16 1990-я гг. у палітычным жыцці Індыі характарызаваліся: 1) абвастрэннем рэлігійна-абшчынных супярэчнасцей; 2) мяншэннем індуска-мусульманскага супрацьстаяння; 3) ростам уплыву палітычнага клерыкалізму; 4) стратай ІНК палітычнага дамінавання.

17 У канцы 1990-х гг. вядучай палітычнай партыяй Індыі стала __________________.

18 Правячай партыяй у момант стварэння Пакістана стала ________________________.

19. Якая дата прапушчана ў дадзеным лагічным радзе, які звязаны з падзеямі ў гісторыі Пакістана?

1) 1958; 2) 1969; 3) _____ ; 4) 1999.

*Растлумачце свой выбар*

20 Для развіцця пакістанскага капіталізму да канца 1960-х гг. характэрна: 1) апераджальнае развіццё буржуазных адносін у горадзе; 2) радыкальныя буржуазныя рэформы ў горадзе; 3) эксплуатацыя Усходняй Бенгаліі ў якасці ўнутранай калоніі; 4) упор на паскораную індустрыялізацыю.

21 У рамках будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму ўрад З.А. Бхута: 1) усталяваў аднапартыйную дыктатуру; 2) павёў наступленне на іслам; 3) імкнуўся ператварыць марксізм у пануючую ідэалогію;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4) зрабіў дзяржаўны сектар вядучым у эканоміцы; 5) правёў аграрную рэформу з мэтай ліквідацыі памешчыцкага землеўладання.

22 Зія-уль-Хак у 1977 – 1984 гг. праводзіў палітыку: 1) ісламізацыі Пакістана; 2) прыярытэтнага развіцця прыватнага сектара; 3) развіцця парламентарызму; 4) падтрымкі афганскага супраціўлення.

23 Палітычная сістэма, якая існавала ў Пакістане ў 1985-1988 гг., уяўляла з сябе: 1) парламенцкую дэмакратыю; 2) ускоснае ваеннае праўленне; 3) ваенную дыктатуру, прыкрытую шырмай прадстаўнічых органаў улады; 4) аднапартыйную дыктатуру.

24 Што змяніў і што пакінуў нязменным у палітычнай сістэме Пакістана рэферэндум 1984 г.?

*Успомніце, па якім пытанні ён праводзіўся.*

25 Асноўнымі палітычнымі партыямі Пакістана ў канцы 80-х – 90-я гг. ХХ ст. з'яўляліся __________________ і __________________.

26 Для палітычнага жыцця Пакістана ў 1988-1999 гг. было характэрна: 1) узмацненне ўлады ваенных; 2) станаўленне парламенцкай дэмакратыі; 3) палітычная нестабільнасць; 4) палітыка ісламізацыі.

27 Прычынай ваеннага перавароту 1999 г. у Пакістане былі: 1) разгул карупцыі; 2) палітычная нестабільнасць; 3) незадаволенасць ваенных знешняй палітыкай Н.Шарыфа; 4) рост камуністычнай пагрозы.

28 Дзяржава Бангладэш утварылася ў ________ г.

*У выніку якіх падзей гэта адбылося?*

29 Што прадугледжвала канцэпцыя альтэрнатыўнага шляху развіцця для Бангладэш?

30 У выніку ваеннага перавароту 1975 г. і паправак у канстытуцыю ў 1976-1977 гг. у Бангладэш: 1) пачалося будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму; 2) быў узяты курс на ісламізацыю; 3) быў нададзены прыярытэт развіццю прыватнага сектара; 4) узмацнілася парламенцкая сістэма.

31 У выніку рэферэндуму 1985 г. у Бангладэш: 1) замацавалася парламенцкая дэмакратыя; 2) ваенная дыктатура была замаскіравана дзейнасцю прадстаўнічых органаў; 3) генерал Эршард страціў уладу; 4) адбыўся пераход да шматпартыйнасці.

32 Парламенцкія выбары 1991 г. у Бангладэш: 1) азнаменавалі пераход да парламенцкай дэмакратыі; 2) паклалі пачатак стабілізацыі палітычнай сітуацыі; 3) адкрылі шлях да станаўлення аднапартыйнай сістэмы; 4) далі падставу ваенным для перавароту.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

# ВМ-5. АФГАНІСТАН, ІРАН І ТУРЦЫЯ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВЭ-О. УВОДЗІНЫ

***Прыступаючы да вывучэння гэтага модуля, праверце свае веды па наступных пытаннях:***

*Звярніце ўвагу, што асноўны змест гістарычнага працэсу ў Афганістане ў міжваенны час зводзіўся да спроб мадэрнізацыі грамадства. У яшчэ большай ступені гэты тэзіс датычыца Ірана і асабліва Турцыі.*

1. Якія рэформы былі праведзены младаафганцамі ў Афганістане ў міжваенны час і які іх вынік.

2. У чым сутнасць палітычнага крызісу, які перажыў Іран пасля першай сусветнай вайны?

3. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі палітыкі шаха Рэза Пехлеві ў 1920-я – 1930-я гг.?

4. Якая палітычная сітуацыя склалася ў Іране ў час другой сусветнай вайны?

5. Які характар мела турэцкая рэвалюцыя 1918-1923 гг.? Якія яе вынікі?

*Успомніце, у якім становішчы апынулася Турцыя ў выніку першай сусветнай вайны.*

6. Назавіце найважнейшыя палажэнні ідэалогіі кемалізму.

7. Якую эканамічную палітыку праводзілі кемалісты ў міжваенны час?

*Неабходна вызначыць ролю дзяржавы ў эканамічным жыцці, адносіны да прыватнага, нацыянальнага і замежнага капіталу, на прыярытэтныя галіны эканомікі.*

8. Чым характарызавалася палітычная сістэма Турцыі ў 1923-1945 гг.?

*Тут перш за ўсё звярніце ўвагу на характар партыйнай сістэмы, аўтарытарызм, палітыку кемалістаў па нацыянальным і рабочым пытаннях. Калі вы правільна адказалі на пастаўленыя пытанні, можна пераходзіць да вывучэння модуля. У адваротным выпадку па дапаможніку Л.С. Васільева “История Востока” і падручніку “Новейшая история стран Азии и Африки. XX век.”, ч.1, паўтарыце гісторыю адпаведных краін у першы перыяд найноўшай гісторыі.*

***Інфармацыя аб модулі ў цэлым.***

Гэты модуль прысвечаны вывучэнню гісторыі неарабскіх краін Сярэдняга і Блізкага Усходу пасля другой сусветнай вайны, якія ўжо ў міжваенны час умацавалі свой суверэнітэт і зрабілі першыя крокі ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

працэсе мадэрнізацыі. У яго аснове ляжыць праблема пошуку шляхоў мадэрнізацыі традыцыйнага ісламскага грамадства і супраціўлення ёй традыцыяналісцкіх сіл на сучасным этапе гістарычнага развіцця.

***Месца і значэнне модуля ў сістэме курса:*** вывучэнне дадзенага модуля з'яўляецца важным этапам у набыцці студэнтамі ведаў аб грамадскіх працэсах, якія адбываюцца на сучасным этапе ў рэгіёне ісламскай цывілізацыі, аб барацьбе мадэрнізатарскай і традыцыяналісцкай тэндэнцый у ім.

***Мэты вывучэння модуля:***

- выявіць узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця і характар палітычнай сістэмы Афганістана, Ірана і Турцыі на час заканчэння другой сусветнай вайны;
- даць параўнальную характарыстыку рэформаў, якія праводзіліся ў названых краінах пасля другой сусветнай вайны, накіраваных на мадэрнізацыю традыцыйнага грамадства;
- прааналізаваць дзеянні традыцыяналісцкіх сіл у Афганістане, Іране і Турцыі, накіраваныя на тармажэнне працэсу мадэрнізацыі;
- вызначыць прычыны, характар, рухаючыя сілы, вынікі рэвалюцый 1978 г. у Афганістане і 1978-1979 гг. у Іране;
- устанавіць спецыфіку палітычнай барацьбы ў Турцыі пасля другой сусветнай вайны;

***Гэты модуль уключае наступныя вучэбныя элементы:***

ВЭ-О. Уводзіны.
ВЭ-1. Афганістан пасля другой сусветнай вайны.
ВЭ-2. Іран пасля другой сусветнай вайны.
ВЭ-3. Турцыя пасля другой сусветнай вайны.
ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю.

***Аб змесце модуля.***

***Ключавая паблема:*** мадэрнізацыя традыцыйнага ісламскага грамадства на сучасным этапе гістарычна развіцця Афганістана, Ірана і Турцыі.

> *Вывучаючы гэтую праблему, неабходна зыходзіць з таго, што мадэрнізацыя была прынесена ў гэтыя краіны звонку і не мела тут шырокай сацыяльнай базы, уступала ў супярэчнасць з ісламскай традыцыяй. Гэта і абумовіла верхавінкавы, супярэчлівы, зігзагападобны характар мадэрнізацыі ў Турцыі, Іране, Афганістане.*

***Вядучая ідэя:*** працэс мадэрнізацыі ў названых краінах, які пачаўся задоўга да другой сусветнай вайны, пасля яе завяршэння паскорыўся. Ён адбываўся ў многім пад знешнім уплывам і ў асноўным у форме рэформаў "зверху". Ісламская цывілізацыйная традыцыя ў вывучае-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мых краінах працягвала дэманстраваць высокую ступень устойлівасці, у выніку чаго працэс мадэрнізацыі ў іх не стаў прамалінейнапаступальным. Сведчанем гэтага з'яўляецца ісламская рэвалюцыя ў Іране, рух талібан у Афганістане, высокая актыўнасць ісламскіх сіл у Турцыі.

***Асноўныя паняцці:*** ісламская цывілізацыя, традыцыйнае грамадства, мадэрнізацыя, ісламскі фундаменталізм, "белая рэвалюцыя" у Іране, ісламская рэвалюцыя, этатызм, лаіцызм.

*Вы павінны не толькі ведаць гэтыя паняцці, але і звязаць іх з канкрэтным гістарычным працэсам у вывучаемых краінах.*

## УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ

1. Асноўныя этапы гісторыі Афганістана ў др. пал. XX ст. - пачатку XXI ст.
2. Асноўныя тэндэнцыі развіцця Ірана ў 1945-1978 гг.
3. Ісламская рэвалюцыя 1978-1979 гг. Іран у канцы XX ст. – пачатку XXI ст.
4. Турцыя ў другой палове XX ст.

1. Пасля другой сусветнай вайны Афганістан уяўляў з сябе напаўабсалютную манархію. У эканамічных адносінах гэта была адна з самых адсталых краін свету, тут практычна непадзельна панавалі дакапіталістычныя адносіны. Велізарным уплывам карысталася рода-племянная знаць. У краіне поўнасцю адсутнічала сучасная прамысловасць, не было чыгунак. Правесці рэформы, якія былі накіраваны на пераадоленне сацыяльна-эканамічнай адсталасці краіны, паспрабаваў прыйшоўшы ў 1953 г. да ўлады ўрад на чале з Даудам. Але спроба ажыццявіць рэформу аграрных адносін сустрэла рашучае супрацьдзеянне з боку караля Захір-шаха, духавенства і памешчыкаў. У 1963 г. Дауд атрымаў адстаўку. Адмова ад рэформаў з боку караля прывяла да ўзнікнення ў краіне апазіцыйных арганізацый рознага кірунку: нацыяналістычнага, ліберальнага, маркісцкага. Апошні быў прадстаўлены створанай у 1965 г. Народна-дэмакратычнай партыяй Афганістана (НДПА). Яна абвясціла сваёй мэтай звяржэнне манархіі і правядзенне радыкальных рэформаў. У арміі група афіцэраў рыхтавала антыманархічны пераварот. К пачатку 1970-х гг. Афганістан перажываў востры крызіс – эканамічны, палітычны і нацыянальны. У гэтых умовах узнікла кааліцыя рэвалюцыйных афіцэраў і НДПА. 17 ліпеня 1973 г. яны ажыццявілі дзяржаўны пераварот і звергілі Захір-шаха. Новы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўрад сфарміраваў Дауд. Ён узяў курс на збліжэнне з СССР. За кошт савецкіх пазык стаў ствараецца вялікі дзяржаўны сектар у прамысловасці. Пасля перавароту ў краіне разгарнулася вострая палітычная барацьба. НДПА спрабавала павялічыць свой уплыў, а Дауд узяў курс на ўсталяванне асабістай улады. Ён забараніў дзейнасць партый. Лідэры НДПА былі арыштаваны. Аднак яму так і не ўдалося ўсталяваць кантроль над арміяй. Там былі моцныя пазіцыі рэвалюцыйна настроеных афіцэраў, многія з якіх былі прыхільнікамі НДПА. Менавіта вайсковыя часці пад кіраўніцтвам гэтых афіцэраў і выступілі супраць дыктатуры Дауда. Гэтае выступленне было абумоўлена і ростам пагрозы з боку ісламісцкіх сіл, якой Дауд не змог эфектыўна супрацьстаяць. 27 красавіка 1978 г. Дауд быў звергнуты.

30 красавіка 1978 г. была абвешчана Дэмакратычная Рэспубліка Афганістан (ДРА), улада перайшла ў рукі Рэвалюцыйнага савета на чале з лідэрам НДПА Н.М.Таракі. Новыя ўлады адразу прыступілі да радыкальных пераўтварэнняў. Самае важнейшае месца ў іх шэрагу належала зямельна-воднай рэформе. Пачатак ёй паклаў указ ад 28 лістапада 1978 г. У памешчыкаў адбіралася зямля і перадавалася сялянам. Сялян заахвочвалі ўступаць у кааператывы. Але праводзячы аграрныя пераўтварэнні, новыя ўлады дзейнічалі як дагматыкі, абсалютна не ўлічваючы менталітэт афганскага сялянства. У вёсцы ў многім яшчэ панавалі патрыярхальныя адносіны, і для селяніна памешчык быў часта не столькі эксплуатататарам, колькі ”бацькам”, патронам абшчыны, тым больш, што ўласнасць памешчыкаў на зямлю, яго ўлада на вёсцы падтрымлівалася мульманскім духавенствам. А ісці супраць ісламскіх традыцый, супраць духавенства селянін не мог. Таму сяляне проста адмаўляліся браць зямлю, якую ўлады адбіралі ў памешчыкаў. Зусім незразумелым для сялянства было стварэнне кааператываў, прычым без усялякай падрыхтоўкі. Фактычна аграрная рэформа правалілася. Б.Кармаль прызнаваў на пленуме ЦК НДПА ў верасні 1985 г., што менш за палову беззямельных і малазямельных сялян, якія мелі права на атрыманне зямлі па рэформе, скарысталі гэтае права. Такім чынам, правядзенне аграрнай рэформы не пашырыла сацыяльную базу рэжыму НДПА.

Яшчэ больш адчувальны ўдар па гэтай жа сацыяльнай базе нанеслі мерапрыемствы ўладаў, накіраваныя на абмежаванне ўплыву духавенства. Спроба адцясніць яго на абочыну грамадскага жыцця выклікала пратэст з боку асноўнай масы насельніцтва. Таму і прагрэсіўныя ў прынцыпе пераўтварэнні ў галіне асветы, аховы здароўя выклікалі супраціўленне і разглядаліся насельніцтвам як замах на традыцыйныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

асновы ісламу. У сферы прамысловасці стаўка была зроблена на развіццё дзяржаўнага сектара. Уводзілася планаванне. Дробнатаварны сектар у прамысловасці каапераваўся. Ліхвярская дзейнасць была забаронена.

Аўтарытэт урада падрывала ўнутраная барацьба ў НДПА. У ёй існавалі дзве фракцыі: ”Парчам”, якая арыентавалася ў асноўным на інтэлектуальныя сілы партыі, і ”Хальк”, якая шукала апоры ў шырокіх партыйных масах. Паміж гэтымі фракцыямі ішла пастаянная барацьба. Н.М. Таракі, Х.Амін належалі да ”Хальк”, Б.Кармаль – да ”Парчам”. У 1978-1979 гг. многія прадстаўнікі ”Парчам” страцілі свае пасады. Барацьба ішла і ўнутры перамогшай фракцыі ”Хальк”. У верасні 1979 г. Амін зверг і фізічна знішчыў Таракі. Пры ім стаўка яшчэ ў большай ступені была зроблена на рэпрэсіі пры правядзенні пераўтварэнняў. Амін заявіў, што адмаўляе сілам, звергнутым красавіцкай рэвалюцыяй, ва ўдзеле ў палітычным жыцці. Супраць яго выступала і частка НДПА. Становішча ўрада ў Кабуле аказалася вельмі цяжкім. Рады ўзброенай апазіцыі раслі. Кабул аказаўся практычна блакіраваным. Таракі, а затым Амін, якія былі няздольны ўласнымі сіламі стабілізаваць сваю ўладу, неаднаразова звярталіся да СССР з просьбай увесці ў Афганістан савецкія войскі. 27 снежня 1979 г. яны ўвайшлі ў Афганістан. Паколькі ў савецкага кіраўніцтва існавала падазрэнне, што Амін збіраецца адысці ад арыентацыі на СССР, то разам з увядзеннем войскаў было вырашана адхіліць Аміна ад улады. Савецкі спецназ узяў штурмам палац Аміна, а сам ён загінуў. Новым кіраўніком Афганістана стаў Б.Кармаль. Змена кіраўніцтва практычна нічога не змяніла ў праводзімай палітыцы. Захоўвалася тая ж манаполія НДПА на ўладу, працягваліся спробы ажыццявіць сацыялістычныя пераўтварэнні ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Але ва ўмовах савецкага ўварвання супраць кабульскага ўрада сталі выступаць і тыя сілы, якія раней былі нейтральнымі і нават лаяльна ставіліся да яго. Пераважнай большасцю афганцаў Кармаль пачаў успрымацца як марыянетка СССР. Кармаль у 1985 г. прызнаваў, што ў радах апазіцыі змагаліся не толькі прадстаўнікі эксплуататарскіх класаў, але і рабочыя і сяляне.

У сярэдзіне 80-х гг. стала відавочна, што асноўная маса насельніцтва на баку апазіцыі і шансаў на перамогу чыста ваенным шляхам нават пры падтрымцы СССР у кабульскага рэжыму практычна няма. Маральны дух афганскай урадавай арміі быў нізкі і, як прызнаваў сам Кармаль, нягледзячы на колькасную перавагу над праціўнікам у асабовым складзе і баявой тэхніцы, узброеныя сілы кабульскага ўрада

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аказаліся няздольнымі дабіцца пералому ў вайне на сваю карысць. У такіх ўмовах савецкае кіраўніцтва вымушана было шукаць некія новыя падыходы ў палітыцы ў Афганістане. Тым больш, што пачалася перабудова. У Афганістане адбылася змена кіраўніцтва. Новым лідэрам у 1986 г. стаў Наджыбула. Быў абвешчаны курс на нацыянальнае прымірэнне. Урад аб’явіў аб спыненні з 15 студзеня 1987 г. Наступальных ваенных дзеянняў. Дэкларавалася павага да ісламу, гаварылася аб гатоўнасці НДПА адмовіцца ад манаполіі на ўладу. Апазіцыі былі прапанаваны пасады ў органах улады. Але многія палажэнні ў палітыцы нацыянальнага прымірэння так і засталіся дэкларацыяй. Скажам, дазваленне шматпартыйнасці звялося да дазволу на дзейнасць Рэвалюцыйнай арганізацыі працоўных Афганістана і Арганізацыі працоўных Афганістана, якія знаходзіліся пад кантролем НДПА. У прынятай канстытуцыі падкрэслівалася адмысловая роля НДПА ў жыцці краіны. Яна абвяшчалася ініцыятарам і арганізатарам палітыкі нацыянальнага прымірэння. Нацыянальнае прымірэнне ў многім звялося да прапагандысцкай кампаніі: аб’яўленне зонаў міру, стварэння джыргаў-саветаў з прадстаўнікоў розных слаёў, у тым ліку і лаяльнага духавенства. Непаслядоўнасць пры правядзенні палітыкі прымірэння, а таксма ўпэўненнасць апазіцыі ў сваёй перамозе прывялі да таго, што ”альянс сямі” - аб’яднанне самых буйных апазіцыйных партый, адхіліў прапановы аб міры. Палітыка нацыянальнага прымірэння пацярпела няўдачу. З 4-5 млн. бежанцаў толькі каля 200 тыс. вярнулася ў Афганістан. 15 лютага 1989 г. савецкія войскі пакінулі Афганістан, але СССР працягваў аказваць дапамогу Наджыбуле, перадаючы самую сучасную ваенную тэхніку. Тым не менш, пасля вываду савецкіх войскаў лёс кабульскага ўрада быў прадвырашаны. У 1992 г. маджахеды авалодалі Кабулам. Наджыбула схаваўся ў місіі ААН. Прэзідэнтам стаў адзін з лідэраў апазіцыі Рабані. Але грамадзянская вайна не скончылася. Пачаліся сутычкі паміж прыхільнікамі Рабані і Хекмаціяры – кіраўніка найбольш буйной Ісламскай партыі Афганістана. Хекмаціяр дамогся пасады прэм’ер-міністра. Поўнач краіны кантраляваў генерал Дустум, які не падначальваўся Кабулу.

У 1994 г. з’явілася новая ваенна-палітычная сіла – рух ісламскіх фундаменталістаў талібан. Талібан абапіраўся на вялікую дапамогу з боку ЗША, Пакістана, Англіі. У 1996 г. талібы авалодалі Кабулам. Супраць іх аб’ядналіся Рабані, Хекмаціяр, Шах-Масуд, Дустум. Вайна працягвалася. Талібан абапіраўся ў этнічным плане на пуштунаў, якія складалі большасць насельніцтва краіны. Іх праціўнікі ўтварылі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ваенна-палітычны блок (Паўночны альянс), у які ўваходзілі ў асноўным прадстаўнікі нацыянальных меншасцей Афганістана: таджыкі, узбекі і інш. Рух талібан змог усталяваць свой кантроль прыкладна над 80% тэрыторыі краіны, але поўнасцю зламаць супраціўленне Паўночнага альянсу, які кантраляваў паўночныя раёны краіны і атрымліваў дапамогу ад Расіі, талібы не змаглі. 28 кастрычніка 1997 г. талібы абвясцілі Афганістан эміратам, тым самым усталяваўшы ў краіне тэакратычную манархію. Тытул эміра прыняў духоўны лідэр талібаў Мухамад Умар. Талібы перабудавалі ўсё жыццё Афганістана на аснове традыцый артадаксальнага ісламу. Былі знішчаны сістэмы адукацыі і аховы здароўя. Эканоміка краіны прыйшла ў поўны заняпад. Асноўнай галіной эканомікі стала вытворчасць і экспарт наркотыкаў. На тэрыторыі Афганістана дзейнічалі міжнародныя тэрарыстычныя арганізацыі, якія карысталіся падтрымкай талібаў, у тым ліку і Аль-Кайда на чале з Усамай бен Ладанам. Наяўнасць на тэрыторыі Афганістана міжнародных тэрарыстаў скарысталі ЗША і іх саюзнікі, каб у кастрычніку 2001 г. распачаць ваенную аперацыю супраць талібаў. У саюзе з заходнімі дзяржавамі дзейнічаў і Паўночны альянс. Войскі антытэрарыстычнай кааліцыі да вясны 2002 г. усталявалі кантроль над найважнейшымі раёнамі Афганістана.

Пасля перамогі над талібамі ўзніклі пэўныя праблемы са стварэннем новай сістэмы ўлады ў Афганістане. Паўночны альянс, які ўнёс вялікі ўклад у разгром талібаў, усё ж не мог прэтэндаваць на ўсю паўнату ўлады ў краіне, бо складаўся ў асноўным з прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Улада ў Афганістане не можа быць стабільнай, калі яна не абапіраецца на падтрымку пуштунаў. Таму пры падтрымцы Захаду на чале ўрада Афганістана стаў адзін з пуштунскіх лідэраў Х.Карзай, які затым быў абраны прэзідэнтам краіны.

2. У апошнія гады другой сусветнай вайны і ў першыя гады пасля яе заканчэння ў Іране назіралася ўзмацненне кансерватыўна-традыцыяналісцкіх сіл. Яны арыентаваліся на шыіцкае духавенства і выступалі супраць правядзення любых рэформаў у кірунку еўрапеізацыі і за вяртанне да нормаў ісламу. Сваім галоўным праціўнікам традыцыяналісты лічылі Народную партыю, якая была створана ў 1941 г., і чыёй ідэалогіяй быў марксізм-ленінізм. Яе галоўная база знаходзілася ў Іранскім Азербайджане, дзе яна кантралявала правінцыйны ўрад. Пасля вываду з поўначы Ірана савецкіх войскаў, шахскі ўрад разграміў Народную партыю.

У канцы 1940-х гг. у іранскім грамадстве ўзмацніліся нацыяналістычныя настроі. Гэта было ў многім звязана з тым, што геагра-

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

фічна блізкія да Ірана азіяцкія краіны пачалі атрымліваць незалежнасць. У сакавіку 1951 г. менджліс прыняў закон аб нацыяналізацыі Англа-Іранскай нафтавай кампаніі. Ірану даставалася толькі невялікая частка ад тых даходаў, якія атрымліваліся гэтай кампаніяй. Урад Массадыка, які рыйшоў да ўлады ў красавіку таго ж года, пачаў актыўна праводзіць гэты закон у жыццё. Усе нафтапромыслы і нафтаперапрацоўчыя заводы былі ўзяты пад кантроль дзяржавы. Англійскія спецыялісты АІНК былі выгнаны з краіны. Дайшло нават да разрыву дыпламатычных адносін паміж Іранам і Англіяй. Палітыка Массадыка выклікала незадавальненне вядучых капіталістычных краін - Англіі, ЗША, якія былі пазбаўленны кантролю над іранскай нафтаю. Шмат праціўнікаў меў прэм’ер-міністр і ўнутры Ірана. У ліку іх аказаліся шах і яго акружэнне, якіх палохаў размах руху, што ўзначаліў Массадык, і рост яго асабістай папулярнасці. Праціўнікі Массадыка пры падтрымцы ЗША арганізавалі дзяржаўны пераварот і адхілілі яго ад ўлады ў жніўні 1953 г. Пасля перавароту нафтавая гаспадарка была перададзена пад кантроль міжнароднага кансорцыума, у якім вядучую ролю іграў амерыканскі і англійскі капітал.

У пачатку 60-х гг. па ініцыятыве шаха Рэза Пехлеві ў Іране пачалася серыя глыбокіх рэформаў, якія атрымалі назву ”белая рэвалюцыя”. Сутнасць яе заключалася ў ажыццяўленні зверху радыкальных пераўтварэнняў капіталістычнага тыпу. Ставілася мэта ажыццявіць мадэрнізацыю краіны. Сярод праводзімых рэформаў найбольш важнай была аграрная. Яна пачала праводзіцца ў 1960 г. У ходзе яе зямельная ўласнасць, якая перавышала ўсталяваны максімум, выкуплялася дзяржавай і раздавалася сялянам з умовай аплаты ў растэрміноўку (15 гадоў). Максімум зямельнай уласнасці ўвесь час зніжаўся: 800 га па закону 1960 г., 400 га – 1962 г., і ад 20 да 100 га – 1963 г. Пры правядзені рэформы ў прывілеяванае становішча ставіліся тыя зямельныя ўласнікі, якія прымянялі сучасныя тэхналогіі і наёмную працу, г.з. вялі гаспадарку капіталістычнымі метадамі. Рэформа ахапіла цэлае дзесяцігоддзе. Іран аказаўся не гатовы да такіх радыкальных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы. Сялянства ў большасці было не здольна перайсці на новыя формы гаспадарання. Як вынік – масавая паўперызацыя сельскага насельніцтва. Каля 41% жыхароў вёсак у 60-70-я гг. былі вымушаны пайсці ў горад.

Рэформы ахапілі і іншыя сферы. У прамысловасці ішла прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў. Значныя даходы ад экспарту нафты забяспечвалі хуткае развіццё прамысловасці, з’яўленне яе новых сучасных галін. Ствараліся сучасныя сістэмы адукацыі і аховы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

здароўя. Але краіна не ўспрыняла рэформы, яны аказаліся вельмі імклівымі для Ірана з моцнымі традыцыямі ісламу. Шыіцкае духавенства ўбачыла ў рэформах адступленне ад ісламу і капітуляцыю перад заходнім укладам жыцця. Паколькі духавенства карысталася ў Іране вельмі вялікім уплывам, яму ўдалося прыцягнуць да супрацьдзеяння рэформам ”белай рэвалюцыі” шырокія масы. І ўсё ж, нягледзячы на моцнае супраціўленне, ”белая рэвалюцыя” прынесла многа станоўчых перамен у жыццё Ірана. У краіне з’явілася каля 2 млн. фермераў. Аб’ём прамысловай вытворчасці ў 1963-1973 гг. вырас у 6 разоў, здабыча нафты - ў 4 разы. Нацыянальны даход на душу насельніцтва павялічыўся з 200 да 1000 долараў.

3. Здавалася, Іран зрабіў значны крок на шляху да еўрапейскага капіталізму і сілы, што выступалі за рэканструкцыю краіны атрымалі буйную перамогу над традыцыяналістамі. Аднак шах пры правядзенні рэформаў яўна недааацаніў моц уплыву ў краіне шыіцкага духавенства. Шах у барацьбе з ім зрабіў стаўку выключна на сілу. Ён не ўлічыў асаблівасці шыіцкага Ірана. Улада шаха не была сакральна санкцыянавана. Калі ў суніцкіх краінах правіцель лічыўся не толькі палітычным, але таксама і духоўна-рэлігійным лідэрам краіны і народа, то ў шыітаў духоўна-рэлігійным правадыром лічыўся ”скрыты імам”, а шах быў толькі часовым, да яго з’яўлення, кіраўніком краіны. Такім чынам, фармальна шах не меў права кіраваць прававернымі і гэты тэзіс умела скарыстала духавенства. У сваёй барацьбе з шахам яно знайшло масавую базу. Насельніцтва краіны ў большасці аказалася не гатовым да празаходняй трансфармацыі. Урад жа галоўным інструментам правядзення рэформаў зрабіў прымусова-сілавыя метады. Шах шырока парушаў правы і свабоды іранцаў. Рэпрэсіўныя метады выклікалі незадавальненне інтэлігенцыі і студэнцтва, якія таксама схіляліся да падтрымкі духавенства. Незадавальненне эканамічным становішчам было моцным сярод велізарнай колькасці людзей, якія рэформамі шаха былі выбіты з прывычнай жыццёвай каляіны. Перш за ўсё гэта сяляне, якія былі даведзены да галечы і перасяляліся ў гарады. Яны стварылі тут велізарную армію люмпенаў. Менавіта люмпенізаваныя слаі горада сталі галоўнай ударнай сілай ісламскай рэвалюцыі. Дробнаўласніцкія колы, якія групаваліся вакол традыцыйнага базару, таксама апынуліся пад ударам у выніку еўрапеізацыі. Усе гэтыя сілы лічылі прычынай бедаў курс шаха на еўрапеізацыю жыцця краіны і бачылі выйсце ў вяртанні да традыцый ісламу. Таму агульнапрызнанай кіруючай сілай апазіцыі, а затым і рэвалюцыі стала шыіцкае духавенства.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пачаткам рэвалюцыі лічыцца 9 студзеня 1978 г., калі ў г. Кум адбыліся масавыя дэманстрацыі студэнтаў у падтрымку аяталы Хамейні пасля таго, як аб ім у іранскім праўрадавым друку быў надрукаваны зневажальны матэрыял. Улады звярнуліся да рэпрэсій, але рэвалюцыйны ўздым народа на чале з духавенствам быў вельмі моцным. Рэвалюцыю падтрымалі і левыя сілы – Народная партыя. Частка арміі перайшла на бок рэвалюцыі. 14 студзеня 1979 г. Хамейні ў эміграцыі ў Парыжы стварыў Ісламскі рэвалюцыйны савет і 1 лютага прыбыў у Тэгеран. Тым часам шах 16 студзеня пакінуў краіну. Пачалі ўзнікаць рэвалюцыйныя органы ўлады: Часовы камітэт ісламскай рэвалюцыі, Часовы рэвалюцыйны ўрад на чале з Базарганам і рэўкомы на месцах. Ударнай узброенай сілай рэвалюцыянераў стаў корпус вартавых ісламскай рэвалюцыі. Завяршэннем рэвалюцыі прынята лічыць 9 лютага 1979 г., калі было зломлена супраціўленне шахскай гвардыі. Галоўны змест рэвалюцыі – укараненне ў жыццё Ірана прынцыпаў ісламу. Таму рэвалюцыя характарызуецца перш за ўсё як ісламская, традыцыяналісцкая, а таксама - народная, бо ўдзел у ёй узялі самыя шырокія слаі іранскага грамадства.

Пасля перамогі рэвалюцыі пачалося ўсталяванне новай улады. У краіне быў праведзены рэферэндум, у адпаведнасці з вынікамі якога Іран быў абвешчаны 1 красавіка 1979 г. Ісламскай Рэспублікай. У снежні была прынята новая канстытуцыя, у якой мелася палажэнне аб тым, што вышэйшая ўлада ў краіне належыць духавенству ў асобе аяталы Хамейні. Грамадзянскую ўладу ажыццяўляе прэзідэнт, меджліс і прэм'ер-міністр. Фактычна ў краіне ўсталявалася дыктатура мусульманскага духавенства. Усё жыццё Ірана пачало будавацца на аснове прынцыпаў шарыяту. Краіна заявіла аб адхіленні і капіталізму, і камунізму і супрацьпаставіла ім свой ісламскі шлях развіцця. Перш за ўсё ісламізацыя адбывалася ў культурнай сферы, штодзённым жыцці, палітыцы, значна менш - у эканоміцы. Свабодны рынак не быў поўнасцю адхілены, але ўмовы для яго функцыянавання пагоршыліся. Працягваў існаваць вялікі дзяржаўны сектар, створаны яшчэ пры шаху. Быў вылучаны прынцып мусульманскай эканомікі. Ён меў на ўвазе стымуляванне працоўнай уласнасці, забарону спекуляцый і ліхвярства, у сацыяльных адносінах – салідарнасць і братэрства прававерных. Хамейні вылучыў лозунг: ”Ад кожнага па здольнасцях – кожнаму па набожнасці”.

Ісламскае духавенства, якое прыйшло да ўлады, лічыла, што яго задача заключаецца не толькі ў тым, каб перабудаваць на ісламскі лад жыццё Ірана, але і каб распаўсюдзіць ісламскую рэвалюцыю за межы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

краіны. Хамейні заявіў, што ”пакуль іслам не пераможа ва ўсім свеце, барацьба будзе працягвацца”. У многім з гэтымі памкненнямі была звязана ірана-іракская вайна 1980-1988 гг. Хоць фармальна першым ваенныя дзеянні пачаў Ірак, але іранскае духавенства таксама імкнулася да вайны. Яна давала магчымасць кансалідаваць народ пад новай уладай у барацьбе за распаўсюджванне “вялікіх ідэй ісламскай рэвалюцыі”. Вайна была выкарыстана для разгрому ўсялякай апазіцыі, у тым ліку саюзнай па рэвалюцыі Народнай партыі, і для адкладвання рэформ, якія былі дэкларараваны ў час рэвалюцыі. У гады вайны яскрава абазначылася мэта экспарту рэвалюцыі. Іранскія ўлады стварылі Вышэйшы савет ісламскай рэвалюцыі Ірака, які павінен быў узяць уладу ў Іраку пасля звяржэння С.Хусейна. Вайна так і не прынесла перамогі, але мела катастрафічныя наступствы для эканомікі. З-за недахопу сыравіны спыніліся 8000 прадпрыемстваў. У краіне было 5 млн. беспрацоўных. У 1988 г. Іран пайшоў на спыненне вайны.

У 1989 г. памёр Хамейні. Яго пераемнікам стаў аятала Хаменеі, які раней займаў пасаду прэзідэнта Ірана. Новым прэзідэнтам быў абраны Рафсаджані. Пасля гэтых кадравых перастановак адбыліся пэўныя змены ў палітыцы Ірана. Яна стала больш ураўнаважанай, больш цярпімай. І ўсё ж палітыку краіны па-ранейшаму вызначалі ісламскія фундаменталісты. У знешняй палітыцы дамінуе антызаходні і асабліва антыізраільскі пафас. Іран адкрыта падтрымліваў многія тэрарыстычныя арганізацыі і адмаўляў Ізраілю ў праве на існаванне. Рэакцыя Захаду вылілася ва ўвядзенне санкцый. Надзеі на змены ў Іране парадзіла перамога на прэзідэнцкіх выбарах 23 мая 1997 г. Мухамада Хатамі, які разглядаўся як палітык, схільны да лібералізацыі ўсяго жыцця краіны і змен ў знешняй палітыцы Ірана ў бок прымірэння з Захадам. Прэзідэнт заявіў аб намеры нармалізаваць адносіны з ЗША, ажыццявіў афіцыйны візіт у Італію. Выбары ў парламент у 2000 г. таксама прынеслі перамогу прыхільнікам лібералізацыі грамадскага жыцця, а ў 2001 г. Хатамі быў абраны прэзідэнтам на другі тэрмін. Аднак пазіцыі ісламістаў не былі зламаны. На парламенцкіх выбарах у пачатку 2004 г. яны нанеслі ўдар у адказ. Кандыдаты ў дэпутаты менджліса, вядомыя ліберальнымі поглядамі, былі проста не дапушчаны да ўдзелу ў выбарах. Прыхільнікі рэформаў заклікалі да байкоту выбараў, і па афіцыйных дадзеных на выбарчыя ўчасткі прыйшлі толькі 43% выбаршчыкаў. Прэзідэнцкія выбары 2005 г. прынеслі перамогу Махмуду Ахмадзінеджаду, якога адносяць да ліку прыхільнікаў фунадаменталісцкіх парадкаў у Іране.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4. У першыя гады пасля завяршэння другой сусветнай вайны ў Турцыі ў парадак дня было пастаўлена пытанне аб дэмакратызацыі аўтарытарнага рэжыму, аб пераходзе да шматпартыйнасці. Выступаючы ў парламенце Турцыі ў лістападзе 1945 г., прэзідэнт І.Інёню заявіў пра неабходнасць адмовіцца ад аднапартыйнай сістэмы. У студзені 1946 г. група палітыкаў, якія адкалоліся ад правячай кемалісцкай Народна-рэспубліканскай партыі (НРП), утварыла Дэмакратычную партыю (ДП). Яе лідэрам стаў Д.Баяр. Стварэнне ДП паклала пачатак пераходу Турцыі да шмарпартыйнасці. Новая партыя будавала сваю палітыку ў цэлым на аснове ідэалогіі кемалізму, але лічыла неабходным абмежаваць ролю дзяржавы ў эканоміцы і стварыць больш спрыяльныя ўмовы для дзейнасці прыватнага капіталу, прыцягнуць ў краіну замежны, перш за ўсё амерыканскі, капітал. На парламенцкіх выбарах 1950 г. ДП атрымала перамогу. Парламент абраў Д.Баяра прэзідэнтам Турцыі, а ўрад узначаліў Мендэрас. Яго ўрад заявіў аб правядзенні новай эканамічнай палітыкі, якая прадугледжвала адыход ад этатызму і развіццё прыватнакапіталістычных адносін. Зменам у эканамічнай палітыцы садзейнічаў удзел Турцыі ў "плане Маршала". Важным элементам эканамічнай палітыкі Турцыі стала прыцягненне замежнага капіталу. Такая палітыка на пачатку і ў сярэдзіне 50-х гг. прыносіла станоўчыя вынікі. У гэты час рост прамысловасці складаў 8% у сярэднім за год. Аднак у канцы 50-х гг. эканамічнае становішча краіны пачало пагаршацца. Палітыка лібералізацыі эканомікі не была паслядоўнай. Нягледзячы на пэўны рост прыватнага буйнога капіталу, усё ж у 50-я гг. не прыходзіцца гаварыць аб значным звужэнні дзейнасці дзяржавы ў эканоміцы. Эканамічны рост дасягаўся не столькі за кошт актывізацыі вызваленай з-пад дзяржаўнага ўціску прадпрымальніцкай дзейнасці, колькі за кошт дзяржаўнай падтрымкі буйнога капіталу і атрымання знешніх крэдытаў. У канцы 50-х гг. прыйшоў час разлічвацца па шмат якіх знешніх пазыках. Экспартнай выручкі на гэта не хапала. Пачала набіраць сілу інфляцыя, раслі цэны. Вялікі ўрон эканоміцы наносіла карупцыя. Вялікія сродкі, у тым ліку і замежныя крэдыты, проста раскрадаліся. У 1958 г. Турцыя апынулася ў становішчы банкрута і прыпыніла плацяжы па даўгах.

Унутрапалітычны курс ДП можна ахарактарызаваць як антыдэмакратычны. Урад жорстка праследаваў апазіцыю, парушаў дэмакратычныя правы грамадзян. У гады праўлення ДП абвастрылася барацьба паміж свецкай і ісламісцкай тэндэнцыямі ў палітычным жыцці Турцыі. Працэс мадэрнізацыі турэцкага грамадства ў 1950-я гг. не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

зайшоў яшчэ так далёка, каб зрабіць немагчымым пэўны адкат да традыцыяналізму. У гады праўлення ДП значна ўзрос уплыў духавенства, што знешне праявілася ва ўвядзенні выкладання ісламу ў школе, у чытанні карана па радыё. У гэты ж час з дапамогаю дзяржавы актыўна ішоў працэс будаўніцтва мячэцяў, а мулы пачалі атрымліваць дзяржаўнае ўтрыманне. Пагаршэнне эканамічнага становішча Турцыі і ўзмацненне пазіцый ісламу прывяло да абвастрэння палітычнай барацьбы ў краіне ў канцы 1950-х гг. У вырашэнні палітычных праблем урад Мендэраса робіць асноўную стаўку на сілу. Левыя арганізацыі, рабочы рух падвергліся шырокамаштабным рэпрэсіям па абвінавачванню ў камуністычнай дзейнасці. Праследаванню ўсё больш падвяргалася і НРП. Яна ў канцы 50-х гг. актыўна нападае на ўрад Мендэраса за адыход ад лаіцызму. У барацьбе з урадам НРП актыўна звяртаецца да тактыкі масавых дзеянняў. Гэта дало падставу ўраду абвінаваціць НРП у тайнай падрыўной дзейнасці і стварыць для расследавання гэтай дзейнасці спецыяльную камісію. У грамадстве гэта было ўспрынята як падрыхтоўка да расправы з апазіцыяй і ўсталявання аднапартыйнай дыктатуры. Аднак сацыяльная база ўрада Мендэраса ў канцы 50-х гг. рэзка звузілася. Большасць турэцкай буржуазіі была расчаравана яго эканамічнай палітыкай. Ён так і не здолеў стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця прыватнай ініцыятывы. У прывілеяваным становішчы знаходзіўся толькі вузкі пласт звязанай з уладай буйной буржуазіі. Шырокія масы былі незадаволены падзеннем узроўню жыцця ва ўмовах эканамічнага крызісу. Студэнцтва, інтэлігенцыя пратэставалі супраць імкнення ўстанавіць аўтарытарны рэжым. Стварэнне камісіі па расследаванні дзейнасці НРП дало штуршок масавым студэнцкім выступленням вясной 1960 г. Апазіцыя супраць урада нарастае і ў арміі, у якой заўсёды былі моцныя пазіцыі кемалістаў і якая была незадаволена ростам уплыву ісламу ў краіне. Армія традыцыйна выступае ў Турцыі гарантам свецкага характару дзяржавы. Яшчэ ў 1958 г. у ёй была раскрыта антыўрадавая змова з удзелам многіх афіцэраў. У 1960 г. стала відавочнай пагроза ўсталявання аднапартыйнай дыктатуры ДП і адыходу ад прынцыпаў кемалізму. У такіх умовах 27 мая ваенныя ажыццявілі дзяржаўны пераварот. Улада перайшла ў рукі Камітэта нацыянальнага адзінства на чале з генералам Д.Гюрселем.

Унутры Камітэта нацыянальнага адзінства разгарнулася барацьба па пытанні аб шляхах далейшага развіцця Турцыі. Група маладых афіцэраў патрабавала радыкальных рэформаў з мэтаю пераадолення эканамічнай адсталасці, адыходу ад аднабаковай арыентацыі на Захад у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

знешняй палітыцы. Група генералаў, якія былі звязаны з кіраўніцтвам НРП, была менш схільнай да ажыццяўлення глыбокіх пераўтварэнняў і лічыла першаступеннай задачай скліканне Нацыянальнага сходу і прынясце канстытуцыі. У аснову канстытуцыі 1961 г. былі пакладзены прынцыпы ліберальнай дэмакратыі. Яна прадугледжвала падзел уладаў і абвяшчала шырокія дэмакратычныя правы і свабоды. Выбары ў кастрычніку 1961 г. паказалі, што найбольшым уплывам у краіне карысталіся дзве партыі: НРП і Партыя справядлівасці (ПС), створаная на аснове ДП. Трэцяй па ступені ўплыву з̓яўлялася Партыя новай Турцыі (ПНТ). На выбарах у менджліс у канцы 1961 г. ні адна партыя не атрымала абсалютнай большасці месцаў. Па даручэнню прэзідэнта Гюрселя лідэр НРП І.Інёню сфарміраваў кааліцыйны ўрад з прадстаўнікоў НРП і ПС. Гэта быў першы ў гісторыі Турэцкай Рэспублікі кааліцыйны ўрад. Аднак ПС, якая ўвайшла ў склад урада, фактычна займалася абструкцыяй унутры яго. Гэта пазбаўляла ўрад магчымасці праводзіць эфектыўную палітыку.

Здавалася, новая канстытуцыя адкрывала перспектывы для стабільнага дэмакратычнага развіцця Турцыі, але гэтага не адбылося. Грамадства аказалася няздольным разумна скарыстаць абвешчаныя дэмакратычныя правы і свабоды. Узнікшыя шматлікія партыі і палітычныя групоўкі часта стаялі на экстрэмісцкіх пазіцыях і кіраваліся ў сваёй дзейнасці эгаістычнымі вузкапартыйнымі, а не агульнанацыянальнымі інтэрэсамі. У выніку палітычная стабільнасць у Турцыі разбуралася. У 1961-1963 гг. адбылося некалькі спроб ваеннага перавароту, арганізаваных маладымі афіцэрамі. У 1961-1965 гг. змянілася 4 урады. У кастрычніку 1965 г. адбыліся выбары ў менджліс, і ПС атрымала абсалютную большасць месцаў у ім (240 з 480). Гэта дало ёй магчымасць сфарміраваць аднапартыйны ўрад, які ўзначаліў Дэмірэль. Аднак і гэта не ўнесла стабільнасці ў палітычнае жыццё Турцыі. Жорсткая барацьба па-ранейшаму вялася вакол прынцыпу лаіцызму У турэцкай канстытуцыі 1961 г. дэкларавалася свобода сумлення і яшчэ раз пацвярджалася непахіснасць свецкага характару дзяржаўнай улады. Як парушэнне закону разглядалася любая спроба абысці прынцып лаіцызму, кіравацца ў дзяржаўных справах рэлігійнымі нормамі. Закон аб палітычных партыях забараняў ім выступаць за стварэнне халіфату, абапірацца ў сваёй дзейнасці на рэлігійнае вучэнне ці на рэлігійныя секты, арганізоўваць рэлігійныя ўрачыстасці ці прымаць у іх удзел. Дадзеныя дакументы сведчаць пра імкненне прыхільнікаў свецкай Турцыі стварыць моцныя перашкоды на шляху наступлення ісламу. Але, з другога боку, яны - ускоснае



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пацвярджэнне таго, што пагроза ісламізацыі ў 60-я гг. была даволі адчувальнай. Яна пачала ўзрастаць пасля прыходу да ўлады ў 1965 г. урада Дэмірэля.

У аснову эканамічнай палітыкі ў 60-я гг. быў зноў пакладзены прынцып этатызму. У 1961 г. ва ўрадавым дакуменце "Задачы і стратэгія плану" было дадзена вызначэнне турэцкай эканомікі як змешанай. Заяўлялася, што такая эканоміка прадугледжвае планаванне і ў ёй прадстаўлены дзяржаўны і прыватны сектары, якія развіваюцца паралельна. Прычым прыярытэт надаваўся дзяржаўнаму сектару. За 60–70-я гг. ні адно прадпрыемства не было прыватызавана. Наадварот, некалькі змешаных кампаній сталі дзяржаўнымі. Буйныя дзяржаўныя прадпрыемствы дамінавалі ў пераапрацоўчай прамысловасці. На дзяржаву ў гэты час прыпадала не менш як 51% капіталаўкладанняў у эканоміку. Да канца 60-х гг. у Турцыі меліся нядрэнныя тэмпы эканамічнага росту, але затым краіна сутыкнулася з эканамічным крызісам. Адной з яго прычын было захаванне вялікага і нізкаэфектыўнага дзяржаўнага сектара.

Прычыны эканамічных цяжкасцей трэба шукаць і ў палітычнай нестабільнасці. У краіне дзейнічалі шматлікія групоўкі як рэлігійна-нацыяналістычныя, так і ультралевага кірунку. Унутры Рабочай Партыі Турцыі вылучалася лявацкая групоўка, якая выступала за неадкладнае ажыццяўленне пралетарскай рэвалюцыі. У 1970-1971 гг. крайнія левыя перашлі да актыўнай тэрарыстычнай дзейнасці. Пагаршэнне эканамічнага становішча выклікала масавы стачачны рух. У 1970 г. у стачачнай барацьбе прынялі ўдзел 1 млн. чалавек. Сітуацыя ўскладнялася парламенцкім крызісам. ПС атрымала перамогу на парламенцкіх выбарах 1969 г., але ў ёй адбыўся раскол. Правае крыло ПС утварыла Дэмакратычную партыю. У выніку становішча ўрада Дэмірэля стала няўстойлівым. У такіх умовах зноў выступілі ваенныя. Яны прымусілі ўрад Дэмірэля 12 сакавіка 1971 г пайсці ў адстаўку. Хоць армія на гэты раз не ўзяла непасрэдна ўладу ў свае рукі, менавіта яна вызначыла палітыку краіны ў 1971-1973 гг. Восенню 1973 г. сабраўся новы парламент, які абвясціў шэраг рэформаў, найважнейшай з якіх была аграрная. Яна прадугледжвала выкуп зямлі ў памешчыкаў і размеркаванне яе сярод сялян.

Сітуацыя, якая склалася ў краіне ў 70-я гг., у многім нагадвала тую, што была ў 60-я. Зноў разгарнулася непрымірымая палітычная барацьба. У найбуйнейшай НРП у 1972 г. адбыўся раскол. З партыі выйшла правае крыло. Яно не пагаджалася з рэфармісцкай палітыкай большасці партыі. У 1973 г. Турцыя вяртаецца да канстытуцыйнай



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

формы праўлення. У кастрычніку адбыліся парламенцкія выбары. Цвёрдай большасці ў парламенце не атрымала ні адна партыя. Найбольшыя фракцыі мелі НРП і ПС. На трэцяе месца выйшла Партыя нацыянальнага выратавання (ПНВ), якая стаяла на пазіцыях ісламізацыі краіны. Гэта сведчыла аб жывучасці ісламскага традыцыяналізму сярод шырокіх мас Турцыі. Удалося стварыць кааліцыйны ўрад у складзе НРП і ПНВ. Аднак паміж названымі партыямі існавалі карэнныя рознагалоссі. Калі ПНВ выступала з пазіцый ісламізацыі, то НРП цвёрда адстойвала прынцып лаіцызму. Яе лідэр Эджэвіт заявіў, што прынцыпы нацыяналізму і лаіцызму служаць прадухіленню этнічных рознагалоссяў. Ужо ў верасні 1974 г. кааліцыя НРП і ПНВ распалася. Пасля гэтага ўзнікла кааліцыя правых партый на чале з ПС. Але ўрадавая чахарда працягваецца і стварыць стабільны кабінет не ўдаецца да канца 70-х гг. У краіне дзейнічаюць шматлікія рэлігійна-экстрэмісцкія арганізацыі. Актывізацыя ісламскіх сіл стала асабліва прыкметнай з сярэдзіны 70-х гг. ПНВ на чале з Эрбаканам усё гучней прапагандуе лозунг канструктыўнага супрацоўніцтва ўлады з ісламам. Рост ісламісцкіх настрояў параджаўся нявырашанасцю сацыяльна-эканамічных праблем і расчараваннем многіх грамадзян Турцыі ў заходніх каштоўнасцях. Эканоміка ў гэты час заставалася ў значнай ступені дзяржаўнай і дэманстравала сваю неэфектыўнасць.

Сацыяльна-эканамічны крызіс, які перажыла Турцыя на мяжы 70-80-х гг. зноў выклікаў умяшанне арміі ў палітычнае жыццё. 12 верасня 1980 г. у краіне адбыўся ваенны пераварот. Улада перайшла ў рукі Савета нацыянальная бяспекі на чале з генералам К.Эўрэнам. Была распрацавана і 11 лістапада 1982 г. прынята новая канстытуцыя Турцыі. Яе асноўная ідэя – гэта ўмацаванне ўлады прэзідэнта. Ім быў абраны Эўрэн. Акрамя таго, канстытуцыя прадугледжвала ўмацаванне свецкіх асноў Турцыі. У ёй гаварылася, што Турэцкая Рэспубліка - дэмакратычная, свецкая, прававая дзяржава, верная нацыяналістычным прынцыпам Атацюрка. Якімі б не былі свяшчэннымі рэлігійныя пачуцці, недапушчальнае іх умяшанне ў дзяржаўныя справы і палітыку. У 1983 г. была дазволена дзейнасць палітычных партый. Пасля аднаўлення плюралістычнай сістэмы найбольшым уплывам карысталіся тры партыі:

1. Права-кансерватыўная Партыя Бацькаўшчыны.

2. Права-цэнтрысцкай Партыя сапраўднага шляху, створаная на базе былой Партыі справядлівасці.

3. На аснове былой НРП узніклі народная і сацыял-дэмакратычная партыі, якія аб̓ядналіся ў 1985 г. ў Сацыял-дэмакратычную народную партыю.

На выбарах 1983 г. перамагла Партыя Бацькаўшчыны на чале з Тургутам Азалам. Урад Азала прыступіў да рашучых эканамічных рэформаў. Іх асноўная ідэя заключалася ў пераходзе ад этатысцкай гаспадаркі, якая існавала ў Турцыі, да прыватнакапіталістычнай рынкавай мадэлі. Яшчэ напярэдадні ваеннага перавароту кіруючая эліта Турцыі прыходзіць да высновы, што даганяючае развіццё на базе імпартазамяшчэння і закрытай эканомікі вычарпала сябе. У студзені 1980 г. урад Дэмірэля распрацаваў пакет мер эканамічнай стабілізацыі. Навізна эканамічнай палітыкі Турцыі вызначалася наступнымі афіцыйна замацаванымі ўстаноўкамі: перагляд дзяржаўнага рэгулявання і паступовая адмова дзяржавы ад прамога ўдзелу ў эканамічным жыцці; перавод эканомікі цалкам на рынкавую аснову; усямернае выкарыстанне для мадэрнізацыі знешніх фактараў і рэсурсаў; адкрыццё краіны для свабоднага руху тавараў і капіталаў; пераход да экспартаарыентаванай мадэлі.

Лібералізацыя цэн адбылася ўжо ў 1980 г. Радыкальныя рэформы пачаліся са стварэннем урада Азала. У краіне рашуча пачалі праводзіцца дэнацыяналізацыя і прыватызацыя. Быў прыняты шэраг законаў, якія стваралі спрыяльныя ўмовы для прыватнапрадпрымальніцкай дзейнасці. Адну з найважнейшых задач урад бачыў у зніжэнні тэмпаў інфляцыі да «разумных межаў». Ён актыўна стымуляваў развіццё экспарту, сферы паслуг. Адна з цэнтральных ліній эканамічных рэформаў у Турцыі - гэта прыцягненне замежных інвестыцый. Палітыка Азала прывяла на пачатковым этапе да значнага росту сацыяльнай напружанасці. Колькасць беспрацоўных набліжалася да 4 млн. чалавек (20% эканамічна актыўнага насельніцтва). Але хутка рэформы пачалі прыносіць і станоўчыя вынікі. У 1984 г. прырост прамысловай вытворчасці склаў 10,1%. Затым у 1985-1989 гг. сярэднягадавы рост прамысловай вытворчасці складаў 6,3%. Моцна змянілася структура экспарту. У канцы 80-х гг. доля прамысловасці ў ім склала 80% супраць 35% у 1980 г. Па кошту экспарт вырас за 10-годдзе ў 5 разоў і склаў у канцы 80-х гг. 10 млрд. долараў. Дзякуючы гэтаму палітыка ўрада пачала атрымліваць шырокую сацыяльную падтрымку. Сведчаннем гэтага можна лічыць вынікі парламенцкіх выбараў 1987 г., на якіх Партыя Бацькаўшчыны зноў атрымала перамогу. У 1989 г. “бацька” турэцкіх рэформаў Азал быў абраны прэзідэнтам Турцыі. Ён ужо ў 1986 г. заявіў, што ў Турцыі больш

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

няма змешанай эканомікі, а ёсць свабодная эканоміка. Аднак гэта не азначала, што дзяржава цалкам пакінула эканамічную сферу. Канстытуцыя 1982 г. утрымлівала палажэнні, якія стваралі юрыдычную базу для дзяржаўнага ўмяшання ў эканоміку. Для Турцыі характэрна праграмаванне эканомікі. У гады рэформаў краіна развівалася на аснове пяцігадовых планаў. Дзяржава пры правядзенні мадэрнізацыі ў 80-я гг. заставалася лідэрам у развіцці буйной сучаснай вытворчасці. На пачатку 90-х гг. дзяржаўны сектар захаваў яшчэ моцныя пазіцыі ў многіх галінах.

Нягледзячы на поспехі мадэрнізацыі на мяжы 80-90-х гг. у сацыяльна-эканамічнай сферы меліся і істотныя праблемы. Інфляцыя складала каля 40% у год, беспрацоўе – 15-16% ад эканамічна актыўнага насельніцтва. Трэцяй праблемай у ліку найбольш значных была знешняя запазычанасць. У пачатку 90-х гг. назіраўся цыклічны спад у эканоміцы ўсяго свету, які закрануў і Турцыю. Гэта паўплывала на расстаноўку палітычных сіл у краіне. На парламенцкіх выбарах 1991 г. перамагла Партыя сапраўднага шляху. Прэм’ер-міністрам стаў яе лідэр С.Дэмірэль. У 1993 г. памёр Азал і Дэмірэль быў абраны прэзідэнтам Турцыі. Прэм’ер міністрам стала Т.Чылер – першая ў гісторыі Турцыі жанчына – прэм’ер-міністр. Гэтыя змены ў кіраўніцтве Турцыі не паўплывалі на абраны ёю ў першай палове 80-х гг. напрамак развіцця.

У палітычным жыцці Турцыі яшчэ з сярэдзіны 80-х гг. пачаў назірацца рост уплыву ісламісцскіх сіл. Яны стварылі Партыю дабрабыту. Гэтая партыя ў многім нечакана перамагла на парламенцкіх выбарах у снежні 1995 г. Яна абвясціла сваёй мэтай перабудову жыцця краіны на прынцыпах шарыяту. Праўда, працэс ісламізацыі ішоў даволі вяла. Па-першае, таму, што ў Турцыі ўжо ўмацаваліся заходнія каштоўнасці, па-другое – сфарміраваны пасля выбараў 1995 г. урад не быў урадам толькі Партыі дабрабыту, а з’яўляўся кааліцыйным. Тым не менш, пэўны рух у бок ісламізацыі адбываўся. У якасці найбольш моцнай апазіцыйнай сілы такому курсу зноў выступіла армія. Яна заставалася вернай прынцыпам Атацюрка, якія абвяшчалі будаўніцтва ў Турцыі свецкай дзяржавы. 28 лютага 1997 г. армія выступіла з ультыматумам, у якім запартабавала ад прэм’ера Н.Эрбакана спыніць ісламізацыю. Урад прыняў ультыматум. У чэрвені адбылася адстаўка ўрада Эрбакана. Канстытуцыйны суд Турцыі прыняў рашэнне аб роспуску Партыі дабрабыту, а Н.Эрбакану было забаронена займацца палітычнай дзейнасцю.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

У 1999 г. у Турцыі адбыліся парламенцкія выбары. Яны ўнеслі значныя змены ў расстаноўку партыйна-палітычных сіл. На іх найбольшую колькасць галасоў заваявала Дэмакратычная левая партыя (ДЛП). Яе лідэр Бюлентам Эджэвіт узначаліў кааліцыйны ўрад. Партнёрам ДЛП па кааліцыі стала права-нацыяналістычная Партыя нацыянальнага дзеяння (ПНД). Выбары прадэманстравалі рэзкае аслабленне пазіцый Партыі сапраўднага шляху і Партыі Бацькаўшчыны. Першыя гады XXI ст. характарызаваліся для Турцыі палітычнай нестабільнасцю і працягам перагрупіроўкі партыйна-палітычных сіл. У 2001 г. краіна перажыла эканамічны спад. Ён паспрыяў нарастанню супярэчнасцей унутры правячай кааліцыі. ПНД заклікала да правядзення датэрміновых парламенцкіх выбараў. Летам 2002 г. шэраг дэпутатаў парламенту выйшлі з радоў ДЛП. У выніку ўрад Эджэвіта страціў большасць у парламенце. 3 лістапада 2002 г. адбыліся парламенцкія выбары. Яны, як і наступныя выбары 2004 г., прынеслі перамогу Партыі справядлівасці і развіцця (ПСР). Гэта партыя, якая стаіць на ўмерана-ісламісцкіх пазіцыях. Яе прамога сведчыць пра тое, што ісламісты па-ранейшаму займаюць трывалыя пазіцыі ў палітычным жыцці Турцыі. Пасаду прэм'ер-міністра заняў Рэджэл Эрдаган.

Важнай для Турцыі застаецца курдская праблема. Турэцкія ўлады адмаўляюцца ад якіх-небудзь саступак курдам і кіруюцца ў сваёй палітыцы кемалісцкім прынцыпам адзінства турэцкай нацыі. Турцыя застаецца ўцягнутай у кіпрскі канфлікт. Яе войскі акупіруюць паўночную частку Кіпра, дзе абвешчана не прызнаная міжнароднай супольнасцю Турэцкая Рэспубліка Кіпр. Гэтыя дзве праблемы доўгі час з’яўляюцца асноўнымі перашкодамі на шляху ўступлення Турцыі ў Еўрапейскі Саюз. Толькі ў канцы 2004 г. ЕС прыняў рашэнне аб пачатку перамоў з Турцыяй аб уступленні ў гэтую арганізацыю. Турцыя застаецца адзінай ісламскай краінай, якая ўваходзіць у НАТО. Яна падтрымала ваенную аперацыю ЗША ў Іраку.

Такім чынам, пасля ваенныга перавароту 1980 г. пачаўся новы этап у развіцці Турцыі. Дзякуючы праведзеным эканамічным рэформам, яна адмовілася ад неэфектыўнай дзяржаўнай эканомікі і пайшла па шляху стварэння прыватнакапіталістычнай эканамічнай мадэлі. Таксама былі закладзены асновы дэмакратычнага развіцця, хаця мадэрнізацыя сутыкнулася з даволі моцным супраціўленнем традыцыяналісцкіх ісламісцкіх сіл.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ВЭ-1. АФГАНІСТАН ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- буйнейшых грамадска-палітычных дзеячаў Афганістана перыяду 1945 г. – пачатку XXI ст.;
- якія рэформы зверху праводзіліся ў манархічным Афганістане;
- калі і як у краіне была звергнута манархія;
- сацыяльную прыроду і палітычныя мэты НДПА;
- якія пераўтварэнні былі праведзены пасля Красавіцкай рэвалюцыі ў Афганістане;
- асноўныя этапы вайны ў Афганістане;
- ролю СССР, ЗША, Пакістана і інш. краін у афганскіх падзеях;

***умець:***

- даць характарыстыку ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця і палітычнага ладу Афганістана ў 1945-1978 гг.;
- вызначыць храналагічную паслядоўнасць найважнейшых падзей у гісторыі Афганістана ў 1945 г.– пачатку XXI ст.;
- прааналізаваць прычыны, характар, вынікі рэвалюцыі 1978 г.;
- даць характарыстыку палітыцы і ідэалогіі руху талібан;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-1:***

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё і дзяржаўна-палітычная сістэма Афганістана ва ўмовах манархіі (1945-1973 гг.).
2. Дзяржаўны пераварот 1973 г. Палітыка М.Дауда.
3. Красавіцкая рэвалюцыя і грамадзянская вайна ў Афганістане (1978-1992 гг.).
4. Афганістан пасля падзення рэжыму НДПА.

### Парадак вывучэння першага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання*****:** сацыяльна-эканамічнае развіццё Афганістана вызначалася запаволеннасцю, а дзяржаўна-палітычная сістэма ўяўляла сабой напаўабсалютную манархію, якая аказалася няздольнай правесці наспеўшыя рэформы.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Навейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С.27-33.

*У падручніку дастаткова поўна характарызуюцца сацыяльна-эканамічнае развіццё Афганістана і спробы рэформаў у 50-я – 60-я гг. XX ст.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

История Афганистана. – М., 1982.

*У манаграфіі падрабязна разгледжана сацыяльна-эканамічнае развіццё Афганістана. Але вывады зроблены выключна на аснове фармацыйнага падыходу і канцэпцыі класавай барацьбы.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- дайце характарыстыку сацыяльна-эканамічнаму развіццю Афганістана ў першыя гады пасля другой сусветнай вайны;

*Звярніце ўвагу на крайнюю сацыяльна-эканамічную адсталасць Афганістана, на панаванне традыцыйных сацыяльна-эканамічных адносін.*

- вызначце важнейшыя рысы дзяржаўна-палітычнай сістэмы Афганістана пасля завяршэння другой сусветнай вайны;

*Выконваючы гэтае заданне, вызначце асаблівасці афганскай манархіі як формы дзяржаўнага кіравання, яе сацыяльную прыроду, спецыфіку партыйнай сістэмы, ролю міжэтнічных адносін.*

- прааналізуйце рэформы "зверху", якія праводзіліся ў Афганістане ў 50-я – 60-я гг., вызначце іх сутнасць і вынікі;

*Вы павінны зыходзіць з таго, што частка правячага класу Афганістана асэнсавала неабходнасць крокаў па мадэрнізацыі краіны, але праводзімые рэформы сустрэлі моцнае супраціўленне з боку традыцыяналісцкіх сіл і правалілся.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання*: няздольнасць манархіі ажыццявіць наспеўшыя рэформы выклікала ажыццяўленне шырокай кааліцыяй сацыяльна-палітычных сіл дзяржаўнага перавароту 1973 г., пасля чаго вострая барацьба разгарнулася ўнутры перамогшага блоку, якая завяршылася Красавіцкай рэвалюцыяй 1978 г.;**

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Навейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. – М., 2001. – Ч.3. – С.33-37.

*У падручніку поўна раскрыты прычыны перавароту 1973 г., асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Афганістана ў час праўлення Дауда.*

История Афганистана. – М.,1982.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце прычыны, рухаючыя сілы і змест дзяржаўнага перавароту 1973г.;

*Падумайце, чаму супраць манархіі разам выступілі такія розныя сілы, як НДПА і М.Дауд.*

- прааналізуйце асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічнай палітыкі М.Дауда ў 1973-1978 гг.;

*Звярніце ўвагу на імкненне рэжыму М.Дауда да паскоранай індустрыялізацыі Афганістана, на ролю дзяржавы ў гэтым працэсе.*

- ахарактарызуйце асноўныя палітычныя супярэчнасці і супрацьлеглыя палітычныя сілы ў Афганістане ў 1973-1978 гг.;

*Неабходна акцэнтаваць увагу на нарастанні супрацьстаяння ўрада М.Дауда з ісламскімі сіламі і на рэзкае абвастрэнне адносін з НДПА.*

### Парадак вывучэння трэцяга пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання*:** Захапіўшы ўладу ў выніку ваеннага перавароту, Народна-дэмакратычная партыя Афганістана (НДПА) паспрабавала ажыццявіць сацыялістычныя пераўтварэнні, якія былі рэзка негатыўна ўспрыняты традыцыйным ісламскім грамадствам, вынікам гэтага стала працяглая грамадзянская вайна і падзенне рэжыму НДПА.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С.37-40.

*У падручніку добра раскрыты прычыны грамадзянскай вайны ў Афганістане як вынік палітыкі НДПА. Не разгледжана палітыка "нацыянальнага прымірэння", міжнароднапалітычны аспект афганскай вайны.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. - Т.2. – С. 380-382.

*Аўтар дапаможніка ў агульным плане разглядае найбольш важныя моманты гісторыі Афганістана ў 1978-1992 гг., прапануе сучасны падыход да вывучэння пытання.*

Арунова М. Афганистан на пути борьбы и созидания // Международная жизнь.– 1985.–№4.

Семенов В. Революционный Афганистан восемь лет спустя // Международная жизнь.– 1988.– №7.

*Названыя артыкулы напісаны з пазіцый ідэалізацыі палітыкі НДПА і апраўдання савецкага ўмяшання, але яны ўтрымліваюць значны фактычны матэрыял па гісторыі Афганістана першай паловы і сярэдзіны 1980-х гг.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні*:**

- прачытайце наступны тэкст, які ўтрымлівае праграмныя палажэнні НДПА і вызначце, якія змены ў жыццё Афганістана яна збіралася ўнесці: "Асноўнай прычынай... запавольвання развіцця прадук-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цыйных сіл і бядотнага становішча народу з'яўляецца эканамічнае і палітычнае панаванне феадальнага класа, буйных мясцовых і кампрадорскіх гандляроў, бюракратыі і агентаў міжнародных манаполій, класавыя інтарэсы якіх супярэчаць інтарэсам народных мас Афганістана. НДПА бярэ на сябе задачу вырашэння гэтых супярэчнасцей шляхам стварэння нацыянальна-дэмакратычнага ўрада, які абапіраецца на аб'яднаны нацыянальны фронт усіх прагрэсіўных, дэмакратычных і патрыятычных сіл, г.з. рабочых, сялян, прагрэсіўнай інтэлігецыі, рамеснікаў, дробнай і нацыянальнай буржуазіі, якія змагаюцца за нацыянальную незалежнасць, дэмакратызацыю грамадскага жыцця і давядзенне да канца антыфеадальнай і антыімперыялістычнай барацьбы... Дзяржаўны сектар, які мае антыфеадальны, антыкаланіяльны і антыімперыялістычны характар, стане асновай развіцця эканомікі і сапраўднай дэмакратыі... Выступаючы ў падтрымку канстытуцыі і адкрыта і мірным шляхам змагаючыся на дадзеным этапе за стварэнне нацыянальна-дэмакратычнага ўрада і некапіталістычны шлях развіцця на аснове перадавой ідэалогіі і светапогляду, мы ніколі не забываем аб сваёй адказнасці перад народам і працоўнымі Афганістана і аб нашай канчатковай мэце – пабудове новага сацыялістычнага грамадства". (История Афганистана. – М., 1982. – С.294-295.)

*Падумайце, наколькі НДПА прытрымлівалася гэтай праграмы пасля захопу ўлады?*

- устанавіце, якая сістэма ўлады ўсталявалася ў Афганістане ў выніку Красавіцкай рэвалюцыі;
- прааналізуйце ход унутрыпартыйнай барацьбы ў НДПА і яе ўплыў на сітуацыю ў краіне;
- вызначце, якія пераўтварэнні ў Афганістане правёў рэжым НДПА ў 1978-1979 гг. і як яны былі ўспрыняты насельніцтвам;

*Асаблівую ўвагу звярніце на тое, як праводзімыя мерапрыемствы суадносіліся з традыцыйным ісламскім менталітэтам афганцаў.*

- устанавіце прычыны, рухаючыя сілы, мэты ўзброенай барацьбы супраць рэжыму НДПА;

*Неабходна адзначыць, што ўзнікненню грамадзянскай вайны садзейнічала палітыка НДПА, да росту радоў апазіцыі прывяло ўвядзенне савецкіх войскаў, сярод праціўнікаў рэжыму НДПА дамінавалі ісламскія фундаменталісты.*

- ахарактарызуйце палітыку "нацыянальнага прымірэння", укажыце прычыны яе правалу і падзення рэжыму НДПА;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Звярніце ўвагу на дэкларатыўны характар крокаў НДПА ў рамках палітыкі "нацыянальнага прымірэння", на змены ў палітыцы СССР у другой палове 80-х гг.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** падзенне рэжыму НДПА не спыніла грамадзянскую вайну. У ходзе яе рух талібан змог усталяваць сваю ўладу і фундаменталісцкія парадкі на большай частцы тэрыторыі Афганістана, але затым быў разгромлены ў выніку ўмяшання ў вайну ЗША і іх саюзнікаў.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век.– М., 2001. – Ч.3. – С.40-42.

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. - С.380-383.

*Прапанаваныя падручнікі дазваляюць пазнаёміцца з найважнейшымі момантамі палітычнай барацьбы ў Афганістане пасля 1992 г.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце палітычную сітуацыю ў Афганістане ў 1992-1994 гг.;

*Важна адзначыць, што падзенне ўрада Наджыбулы не спыніла грамадзянскую вайну. Адразу праявіліся асабістыя амбіцыі і этнічныя супярэчнасці сярод перамогшых маджахедаў.*

- вызначце асноўныя моманты ідэалогіі і палітыкі руху талібан і яго сацыянальную базу;

*Зыходзьце з таго, што гэты рух стаяў на пазіцыях ісламскага фундаменталізму ў яго найбольш радыкальных формах.*

- прасачыце агульны ход ваенна-палітычнай барацьбы ў Афганістане пасля 1994 г.;

*Неабходна звярнуць увагу на прычыны ваенных поспехаў талібан у другой палове 1990-х гг., устанавіць склад Паўночнага альянсу, вызначыць ролю іншых дзяржаў у гэтых падзеях.*

**Самакантроль па ВЭ-1.**

1. Якія асаблівасці дзяржаўна-палітычнага ладу Афганістана ў 1945-1973 гг.?

2. Што сведчыць аб крайняй сацыяльна-эканамічнай адсталасці Афганістана пасля другой сусветнай вайны?

*Для адказу на гэтае пытанне вызначце стан розных галін эканомікі, і якія сацыяльна-эканамічныя адносіны панавалі ў той час у Афганістане.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3. Якія прычыны дзяржаўнага перавароту 1973 г. і якія палітычныя сілы яго ажыццявілі?

4. Якія найважнейшыя рысы палітычнага жыцця Афганістана ў час праўлення Дауда?

5. Якія прычыны прывялі да Красавіцкай рэвалюцыі 1978 г.?

*Для адказу на гэтае пытанне ўспомніце перш за ўсё, якія адносіны склаліся ў Дауда з НДПА і як да яго рэжыму аднесліся ісламскія фундаменталісты.*

6. Якія найважнейшыя пераўтварэнні правяла НДПА пасля захопу ўлады?

7. Якія сацыяльна-палітычныя сілы склалі ўзброеную апазіцыю НДПА і чаму?

*Каб адказаць на гэта пытанне, вызначце, як розныя слаі грамадства аднесліся да палітыкі НДПА.*

8. Як паўплываў на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў Афганістане ўвод савецкіх войскаў?

9. У чым сутнасць палітыкі "нацыянальнага прымірэння" і якія яе вынікі?

10. Чаму пасля падзення рэжыму Наджыбулы грамадзянская вайна ў Афганістане не спынілася?

*Каб адказаць на гэтае пытанне ўспомніце, што ўяўляў з сябе блок сіл, які звергнуў уладу НДПА, якія рознагалоссі былі ўнутры яго?*

11. Якія найважнейшыя палажэнні палітычнай праграмы руху талібан?

12. Якія палітычныя сілы аб'ядналіся ў Паўночны альянс?

13. У выніку якіх падзей была ліквідавана ўлада талібан у Афганістане?

## ВЭ-2. ІРАН ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- у чым праявіўся ўздым нацыянальна-дэмакратычнага руху ў Іране ў другой палове 40-х – 50-я гг. XX ст.;
- прычыны перавароту 1953 г. і сілы, якія яго ажыццявілі;
- асноўныя рэформы ў рамках "белай рэвалюцыі" і іх вынікі;
- прычыны, рухаючыя сілы, ход рэвалюцыі 1978-1979 гг.;
- палітычную сістэму Ісламскай Рэспублікі Іран (ІРІ).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- змены ў кіраўніцтве ІРІ ў 1988, 1997, 2005 гг. і іх уплыў на палітыку дзяржавы;

***умець:***

- вызначыць сацыянальна-палітычную сутнасць рэформаў урада Массадыка;
- ахарактарызаваць агульны кірунак пераўтварэнняў у рамках “белай рэвалюцыі”;
- вызначыць характар рэвалюцыі 1978-1979 гг.;
- выявіць характэрныя рысы грамадскага ладу Ісламскай Рэспублікі Іран як тэакратычнай дзяржавы;
- растлумачыць сутнасць палітыкі “экспарту ісламскай рэвалюцыі”;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-2:***

1. Палітычная барацьба ў Іране ў 1945-1950-я гг.
2. “Белая рэвалюцыя шаха і народа”.
3. Рэвалюцыя 1978-1979 гг. і станаўленне ІРІ.
4. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця ІРІ ў 80-я гг. ХХ – пачатку XXI ст.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у 1945-1950-я гг. асноўны змест палітычнага жыцця Ірана складала барацьба паміж сіламі, якія імкнуліся шэрагам рэформаў умацаваць суверэнітэт краіны і паспрыяць развіццю нацыянальнага капіталізму, і тымі, што імкнуліся закансерваваць існаваўшыя грамадскія адносіны.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С. 14-20.

*У падручніку на аснове багатага фактычнага матэрыялу паказаны розныя аспекты палітычнай барацьбы ў Іране ў 40-я –50-я гг. Нельга пагадзіцца з тым, што палітычныя сілы, якія звязаны з СССР характарызуюцца выключна як прагрэсіўныя, а тыя, якія арыентуюцца на Захад, як антыдэмакратычныя, рэакцыйныя.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. – С. 161-163.

*У прапанаваным дапаможніку матэрыял пададзены з сучасных метадалагічных пазіцый, але толькі ў самым агульным плане.*

История Ирана. – М., 1977. - Гл. 25 - 28.

*Марксісцкая метадалогія, на аснове якой напісана манаграфія, ставіць у цэнтр увагі менавіта праблемы класавай барацьбы і не*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*звяртаецца для даследавання гісторыі Ірана да такіх катэгорый як традыцыяналізм, мадэрнізацыя.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце падзеі, якія адбываліся пасля завяршэння другой сусветнай вайны ў Іранскім Курдыстане і Іранскім Азербайджане;

*Неабходна зыходзіць з таго, што ўтварэнне аўтаномных урадаў у гэтых правінцыях успрымалася Тэгеранам як пагроза адзінству краіны. Звярніце ўвагу на палітыку Народнй партыі Ірана і ролю вялікіх дзяржаў у гэтых падзеях.*

- прааналізуйце прычыны ўтварэння, склад і палітычныя мэты Нацыянальнага фронту;

*Звярніце ўвагу на разнастайнасць тых грамадска-палітычных сіл, якія ўвайшлі ў склад Нацыянальнага фронту.*

- вызначце, якія наступствы для Ірана мела нацыяналізацыя АІНК.

*Неабходна адзначыць як эканамічныя наступствы, так і міжнароднапалітычныя ўскладненні, якія далі штуршок абвастрэнню ўнутрыпалітычнай сітуацыі.*

- ахарактарызуйце прычыны, рухаючыя сілы і вынікі дзяржаўнага перавароту 19 жніўня 1953 г.

*Укажыце як унутрыіранскія, так і знешнія сілы, якія выступілі супраць урада Массадыка, тыя змены, якія адбыліся ва ўнутранай і знешняй палітыцы Ірана пасля перавароту.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** “белая рэвалюцыя шаха і народа” ўяўляла з сябе рэформы “зверху”, якія былі накіраваны на мадэрнізацыю Ірана і сустрэлі моцнае супраціўленне з боку традыцыяналісцкіх сіл.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С. 20-22.

*Падручнік указваенай важнейшыя рэформы шаха, іх дасягненні і некаторыя супярэчнасці. Неабходна было больш засяродзіць увагу на нарастаўшым антаганізме паміж курсам шаха на еўрапеізацыю і традыцыйным укладам жыцця іранцаў.*

Васильев Л.С. История Востока.– М., 2001.– Т.2. – С. 163-166.

*Аўтар дапаможніка разгледзеў рэформы “белай рэвалюцыі” праз прызму барацьбы традыцыяналізму і мадэрнізацыі. Такі падыход дазваляе найлепш зразумець сутнасць працэсаў у грамадскім жыцці Ірана ў 60-я – 70-я гг. XX ст.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

История Ирана. – М., 1977. – Гл. 21, 30.

Иран: очерки новейшей истории. – М., 1976. – С. 319-408.

*Названыя дзве манагрфіі змяшчаюць вялікую колькасць фактычнага матэрыялу, які дазваляе падрабязна прасачыць ход рэформаў "белай рэвалюцыі". Але аўтары даследуюць супраціўленне рэформам у рамках канцэпцыі класавай барацьбы і бачаць у выступленнях супраць рэформаў толькі спробы розных сацыяльных груп адстаяць свае матэрыяльныя інтарэсы, а не імкненне захаваць традыцыйны ўклад жыцця.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, якія мэты ставіў шах Ірана пры правядзенні рэформаў "белай рэвалюцыі";

*Неабходна адштурхоўвацца ад тэзісу, што "белая рэвалюцыя" была накіравана на мадэрнізацыю, еўрапеізацыю Ірана.*

- назавіце найважнейшыя мерапрыемствы аграрных рэформаў 60-х – 70-х гг. і ўстанавіце іх эканамічныя, сцыяльныя і палітычныя вынікі;

*Неабходна падкрэсліць, што стратэгічная мэта аграрнай рэформы – капіталізацыя сельскай гаспадаркі Ірана, і рух да яе выклікаў змены ў сацыяльным абліччы як памешчыкаў, так і сялян.*

- вызначце найважнейшыя кірункі палітыкі шаха ў дачыненні да прамысловасці;

*Звярніце ўвагу на імклівыя тэмпы развіцця памысловасці, на важную ролю дзяржаўнага сектара і дзяржаўных інвестыцый.*

- ахарактарызуйце асноўныя мерапрыемствы "белай рэвалюцыі" ў сацыяльнай сферы;

*Засяродзьце ўвагу на двух асноўных аспектах: 1)імкненне шаха стварыць сучасныя сістэмы адукацыі, аховы здароўя; 2)укараненне элементаў "народнага капіталізму" праз удзел рабочых у прыбытках і пературарэнне мільёнаў іранцаў у трымальнікаў акцый.*

- вызначце, якімі метадамі шахскі рэжым ажыццяўляў рэформы, у якім кірунку ажыццяўлялася эвалюцыя палітычнай сістэмы ў гады "белай рэвалюцыі";

*Неабходна зыходзіць з таго, што шах пры правядзенні мадэрнізацыі іранскага грамадства рабіў стаўку на прымус, на сілу і каб мець магчымасць іх прымяняць пастаянна ўмацоўваў сваю асабістую ўладу.*

- прааналізуйце тыя сацыяльна-палітычныя наступствы, якія мелі рэформы "белай рэвалюцыі";

*Вы павінны зыходзіць з таго, што рэформы прывялі да разбурэння традыцыйнага, заснаванага на дагматах ісламу, укладу жыцця мільёнаў іранцаў, што стала асноўнай прычынай фарміравання шырокай апазіцыі шаху на чале з духавенствам.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- ахарактарызуйце найважнейшыя кірункі знешняй палітыкі Ірана ў час “белай рэвалюцыі”;

Для вызначэння пазіцыі шахскага ўрада адносна пагранічнай спрэчкі з Іракам прааналізуйце ірана-іракскае Алжырскае пагадненне ад 6 сакавика 1975.

“Высокія дагаворныя бакі вырашылі:

1. Правесці канчатковую дэмаркацыю сухапутнай граніцы паміж Іранам і Іракам...
2. Правесці дэлімітацыю рачных граніц паміж Іранам і Іракам па лініі тальвега.
3. Яны абавязуюцца ажыццяўляць узмоцнены і эфектыўны кантроль па агульнай граніцы з тым, каб пакласці канец усім пранікненням, якія носяць падрыўны характар...

Бакі вырашылі аднавіць традыцыйныя вузы добрасуседства і дружбы шляхам ліквідацыі адмоўных фактараў у адносінах паміж імі, пастаяннага абмену думкамі па пытаннях, якія маюць узаемны інтарэс, развіцця двухбаковага супрацоўніцтва...” (Ниязматов Ш.А. Ирано-иракский конфликт. Исторический очерк. – М., 1989. – С. 165-166.)

*Зрабіце асноўны ўпор на два моманты: цеснае супрацоўніцтва з ЗША і імкненне ператварыць Іран у рэгіянальнага лідэра.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** негатоўнасць іранскага грамадства ўспрыняць празмерна высокія тэмпы мадэрнізацыі, якія прапанаваў шахскі рэжым, прывяла да таго, што традыцыяналісцкім сілам на чале з духавенствам удалося ажыццявіць ісламскую рэвалюцыю і ўсталяваць у краіне тэакратычны рэжым.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С. 22-25.

*Падручнік раскрывае асноўныя этапы рэвалюцыі і станаўлення тэакратычнага рэжыму ў Іране. Нельга пагадзіцца з тэзісамі аб масавым збядненні народа ў час рэформаў шаха як асноўнай прычыне рэвалюцыі, а таксама аб яе буржуазным характары.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001 .– Т.2.

*У дапаможніку грунтоўна раскрыты прычыны рэвалюцыі 1978-1979 гг., вызначаны яе рухаючыя сілы, але вельмі бегла сказана пра ход рэвалюцыі.*

Жуков Д.А. Имам Хомейни: Очерк политической биографии. – М., 1999.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Названую манаграфію можна выкарыстаць як дадатковую.*

Агаев С.Л. Рухолла Мусави Хомейни // Вопросы истории. – 1989. – №6.

*Аўтар паказвае, што асноўнай прычынай ісламскай рэвалюцыі стала разбурэнне ў час "белай рэвалюцыі" традыцыйнага жыццёвага ўкладу многіх іранцаў і пошук імі ў ісламе альтэрнатывы заходняму пранікненню.*

Кляисторина В.Б. Иран в 60-е – 80-е годы. – М., 1989.

*Прапанаваную манаграфію можна выкарыстаць як дадатковую каб грунтоўна пазнаёміцца з ідэйнымі перадумовамі ісламскай рэвалюцыі.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце рухаючыя сілы іранскай рэвалюцыі 1978-1979 гг.;

*Для выканання гэтага задання ўспомніце сацыяльныя вынікі "белай рэвалюцыі", стаўленне розных груп грамадства да пераўтварэнняў шаха.*

- прасачыце асноўныя падзеі рэвалюцыі 1978-1979 гг.;
- зрабіце высновы адносна характару рэвалюцыі 1978-1979 гг. і абгрунтуйце іх;

*Для гэтага зыходзьце з таго, якія сацыяльна-палітычныя сілы ўдзельнічалі ў рэвалюцыі і кіравалі ёю, да якіх перамен у грамадскім жыцці прывяла рэвалюцыя.*

- прааналізуйце тыя ідэйныя і дзяржаўна-прававыя нормы, на аснове якіх была заснавана Ісламская Рэспубліка Іран;

*Звярніце ўвагу на рашэнні, якія былі прыняты на рэферэндуме 1979 г., на асноўныя палажэнні канстытуцыі 1979 г., на ролю духавенства і дагматаў ісламу ў дзяржаўна-палітычным і штодзённым жыцці.*

## Парадак вывучэння чацвёртага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у выніку рэвалюцыі 1978-1979 гг. у Іране ўсталяваўся тэакратычны рэжым, непахіснасць шэрагу інстытутаў якога была пастаўлена пад сумненне ў 90-я гг. XX ст. у выніку наступлення ісламістаў-прагматыкаў.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С. 25-27.

*Падручнік не ўтрымлівае дастаткова поўнай характарыстыкі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця Ірана ў 80-я гг., але добра паказвае жыццё краіны ў 90-я гг. Нельга пагадзіцца з тэзісам,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*што эканамічныя санкцыі – гэта рэакцыя Захаду на незалежную палітыку Ірана, а не на падтрымку ім экстрэмісцкіх арганізацый.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. – С. 377-379.

*Аўтар паказвае найважнейшыя тэндэнцыі і супярэчнасці развіцця IPI, эвалюцыю палітычнага рэжыму, аналізуе дактрыну "экспарту ісламскай рэвалюцыі" і прычыны ірана-іракскай вайны.*

Ниязматов Ш.А. Ирано-иракский конфликт. Исторический очерк.– М., 1989.

*У манаграфіі паказаны гістарычныя карані ірана-іракскай вайны, палітыка іранскага кіраўніцтва, якая вяла да вайны, яе ход і ўплыў на ўнутрыпалітычнае і эканамічнае становішча Ірана.*

Бади Ш. Противоречия в эшалонах власти Исламской Республики Иран // Народы Азии и Африки. – 1990. – №4.

Агаев Л.С. Иранская революция: воспоминания о будущем // Народы Азии и Африки. – 1989. – №1.

*У двух названых артыкулах аналізуецца спецыфіка сацыяльна-эканамічнага развіцця, барацьба паміж ісламістамі-артадоксамі і ісламістамі-прагматыкамі ў кіраўніцтве краіны.*

Агаев Л.С. Рухолла Мусави Хомейни // Вопросы истории. – 1989. – №6.

*Аўтар паказаў станаўленне "ісламскай рэспублікі" і зрабіў абгрунтаваную выснову аб яе аўтарытарным і рэпрэсіўным характары.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце адметныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця Ірана ў 1980-я гг.;

*Неабходна зыходзіць з канцэпцыі Хамейні, якая адмаўляла як капіталістычную, так і сацыялістычную мадэлі і прапаноўвала сацыяльна-эканамічныя адносіны, у аснове якіх былі традыцыі мусульманскай абшчыны.*

- вызначце адметныя рысы палітычнага рэжыму, які існаваў у Іране ў 80-я гг. XX ст.;

*Звярніце ўвагу на тое, што ў краіне ўсталёўвалася дыктатура шыіцкага духавенства, якое бязлітасна падаўляла ўсялякую апазіцыю і перабудавала ўсё грамадскае жыццё на аснове нормаў шарыяту.*

- прааналізуйце важнейшыя кірункі знешняй палітыкі Ірана ў 1980-я гг.;

*Найважнейшымі момантамі тут з'яўляюцца: курс на экспарт ісламскай рэвалюцыі, канфрантацыя як з Захадам, так і з Усходам, ірана-іракская вайна.*

- вызначце, якія перамены ў сацыяльна-эканамічным развіцці Ірана адбыліся з канца 80-х гг. XX ст.;



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Асноўным момантам у вывучэнні гэтай праблемы з’яўляецца пераход кіраўніцтва Ірана да заахвочвання прыватнага сектару і развіцця рынкавых адносін, вынікам чаго стаў уздым іранскай эканомікі.*

- ахарактарызуйце змены ў палітычным жыцці Ірана ў 90-я гг. XX – пачатку XXI ст.;

*Перш за ўсё звярніце ўвагу на змены ў расстаноўцы сіл у палітычным кіраўніцтве Ірана пасля смерці аяталы Хамейні на карысць мусульманскіх прагматыкаў, на выніку выбараў у парламент 1996 і 2000 г. і прэзідэнскіх 1997 і 2001 г. Пакажыце, што гэта прывяло да паслаблення ісламісцкай дыктатуры. Але парламенцкія выбары 2004 г. і прэзідэнцкія 2005 г. прадэманстравалі, што гэтая тэндэнцыя яшчэ не стала пануючай у палітычным жыцці Ірана.*

- прасачыце, якія новыя моманты з’явіліся ў знешняй палітыцы Ірана з канца 80-х гг. XX ст.;

*Пачніце з высвятлення прычын замірэння з Іракам. Потым засяродзьце ўвагу на такіх момантах, як адмова ад дактрыны экспарту ісламскай рэвалюцыі, супрацоўніцтва з Расіяй, спробы збліжэння з Захадам.*

**Самакантроль па ВЭ-2.**

1.Якія палітычныя партыі пры падтрымцы СССР былі ўтвораны ў Іранскім Азербайджане і Курдыстане і якую палітыку яны праводзілі?

2.Якія прычыны нацыяналізацыі АІНК і якія яе наступствы?

3.Якія палітычныя сілы і чаму ажыццявілі дзяржаўны пераварот 19 жніўня 1953 г.?

4.Якія мэты мела аграрная рэформа “белай рэвалюцыі”?

5.Якія перамены адбыліся ў прамысловасці Ірана за час “белай рэвалюцыі”?

6.Назавіце важнейшыя кірункі палітыкі шаха ў сацыяльнай і ідэалагічнай сферах у 60-я – 70-я гг. XX ст.

7.Якія перамены ў сацыяльнай структуры грамадства выклікала “белая рэвалюцыя”?

8.Якія сацыяльныя сілы ўзначалілі рэвалюцыю 1978-1979 гг. у Іране, а якія склалі яе масавую базу?

9.Якую дзяржаўна-палітычную сістэму ўсталявала ў Іране канстытуцыя 1979 г.?

10.У чым сутнасць канцэпцыі “ісламскай эканомікі”?

11.У чым праявілася палітыка “экспарту ісламскай рэвалюцыі”?

12.Якія прычыны ірана-іракскай вайны 1980-1988 гг.?

13.Як гэтая вайна паўплывала на ўнутрыпалітычнае і эканамічнае жыццё Ірана?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

14.Якая эвалюцыя тэакратычнага рэжыму ў Іране ў 90-я гг XX – пачатку XXI ст.?

## ВЭ-3. ТУРЦЫЯ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- як развівалася шматпартыйная сістэма ў Турцыі пасля 1945 г.;
- чаму і калі адбываліся ваенныя перавароты ў Турцыі ў другой палове XX ст.;
- асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі Турцыі ў 1945 г. – пачатку XXI ст.;
- структуру дзяржаўна-палітычнай сістэмы Турцыі па канстытуцыях 1924, 1961 і 1982 г.;
- прычыны палітычнай нестабільнасці ў Турцыі ў 50-я – 70-я гг. XX ст.;
- сутнасць канцэпцыі "змешанай эканомікі";

***умець:***

- прааналізаваць наступствы другой сусветнай вайны для Турцыі;
- параўнаць мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця Турцыі 40-х – 70-х гг. XX ст. і 1980-х гг. – пачатку XXI ст.;
- вызначыць сутнасць працэсу мадэрнізацыі Турцыі на этапе, які пачаўся з 80-х гг. XX ст.;
- ахарактарызаваць ролю ісламу ў грамадскім жыцці Турцыі пасля 1945 г.;
- даказаць, што к канцу XX ст. Турцыя ператварылася ў новую індустрыяльную краіну.

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-3:***

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё і палітычная барацьба ў Турцыі ў 1945-1960 гг. і ваенны пераварот 1960 г.
2. Спробы руху Турцыі на шляху палітычнага плюралізму і палітычныя крызісы 70-х і пачатку 80-х гг. XX ст.
3. Рэформы ў галіне эканомікі і выхад Турцыі ў лік новых індустрыяльных краін (1980 г – пачатак XXI ст.).
4. Унутрыпалітычнае жыццё і знешняя палітыка Турцыі ў 1980 – пачатку XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля заканчэння другой сусветнай вайны Турцыя пераходзіць да шматпартыйнай сістэмы і правячай у 1950 г. становіцца Дэмакратычная партыя, якая не змагла забяспечыць дынамічнае развіццё эканомікі і стварыла сваёй палітыкай пагрозу свецкаму характару Турэцкай рэспублікі і палітычнаму плюралізму. Гэта падштурхнула армію да дзяржаўнага перавароту.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч. 3. – С.4-6.

*Адлюстроўваючы найважнейшыя моманты гістарычнага развіцця Турцыі ў пасляваенны час, аўтары падручніка ігнаруюць тое, што эканоміка Турцыі ў 50-я гг. заставалася ў цэлым дзяржаўнай і ў гэтым была асноўная прычына яе неэфектыўнасці. Яны мала ўвагі ўдзялілі барацьбе вакол прынцыпу лаіцызму і нарастанню аўтарытарызму ў палітыцы ДП, не раскрылі прычын ваеннага перавароту 1960 г. Практычна нічога не сказана пра знешнюю палітыку Турцыі ў 1945 – 1960 гг.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. – С.149-151.

*Дапаможнік з пазіцый сучаснай гістарыяграфіі паказвае перамены ў сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці Турцыі ў 1945 – 1960 гг., прычыны перавароту 1960 г. Але аўтар не спыняецца падрабязна на ходзе падзей.*

Новейшая история Турции. – М., 1968. – Гл. VI, VII.

*Манаграфія насычана вялікім па аб'ёме фактычным матэрыялам, але напісана на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі. У выніку ўсе працэсы разглядаюцца з пазіцый класавай барацьбы і супрацьстаяння СССР і ЗША. Практычна абмінута праблема супрацьстаяння традыцыяналісцкіх і мадэрнісцкіх сіл, ісламізму і лаіцызму, неэфектыўнасці дзяржаўнай эканомікі.*

Данилов В.И. Турция после второй мировой войны: демократический эксперимент продолжается//Восток.–1998.–№ 4.

*У артыкуле раскрыты прычыны станаўлення шматпартыйнасці ў Турцыі пасля вайны, паказана, чым быў абумоўлены ваенны пераварот 1960 г.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце, чым было выклікана правядзенне пэўных дэмакратычных рэформаў і пераход да шматпартыйнасці ў Турцыі пасля заканчэння другой сусветнай вайны;

*Неабходна зыходзіць з таго, што ў цяжкім становішчы знаходзілася турэцкая эканоміка, расло незадавальненне насельніцтва*

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

*аднапар-тыйным рэжымам Народна-рэспубліканскай партыі (НРП), а прадпрымальніцкіх колаў – палітыкай этатызму. Прыгадайце і тое, што пераходу да шматпартыйнасці патрабавала і ўзмацненне сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства.*

- ахарактарызуйце найважнейшыя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі Дэмакратычнай партыі ў 1950-1960 гг.;

*Звярніце ўвагу на тое, наколькі заявы аб лібералізацыі эканомікі супадалі з рэальнай палітыкай урада Мендэраса, на наступленне ісламісцкіх сіл, у галіне знешняй палітыкі – на правядзенне Турцыяй блокавай палітыкі.*

- вызначце прычыны, рухаючыя сілы і мэты ваеннага перавароту 1960 г.

*Для выканання гэтага задання трэба разумець, што армія ў Турцыі – галоўны аплот прынцыпаў кемалізму, а ўрад Мендэраса сваёй палітыкай парушыў шэраг з іх, акрамя таго, ён прадэманстраваў імкненне да падаўлення апазіцыі. Зыходзячы з гэтага можна зрабіць вывады аб прычынах, рухаючых сілах і мэтах перавароту 1960 г.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у 1961 г. была прынята новая канстытуцыя Турцыі, якая стварала прававую сістэму для развіцця краіны ва ўмовах парламентарызму і палітычнага плюралізму, абвяшчала самыя шырокія правы і свабоды грамадзян. Але турэцкае грамадства аказалася не гатовым да жыцця ва ўмовах дэмакратыі, скацілася да палітычнай анархіі, вынікам чаго сталі палітычныя крызісы 1971 – 1973 і 1980 гг.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч. 3. – С.6-7.

*У падручніку толькі ў самым агульным плане паказаны шэраг тэндэнцый грамадскага жыцця Турцыі ў 60-я – 70-я гг. XX ст. Не раскрыта паняцце "змешаная эканоміка", сутнасць і ход партыйна-палітычнай барацьбы, прычыны нестабільнасці ў грамадстве, нічога не сказана пра палітычны крызіс пачатку 70-х гг.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. – С. 151-152.

*У дапаможніку з пазіцый сучаснай гістарыяграфіі раскрыты найважнейшыя тэндэнцыі развіцця Турцыі ў 60 – 70-я гг. XX ст., але пры гэтым, як і ў папярэднім дапаможніку, яны разгледжаны толькі ў самым агульным плане.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Турецкая Республика в 60-70-е годы. Вопросы общественно-политического развития. – М., 1984.

*Аўтары манаграфіі дэталёва даследуюць працэсы, якія адбываліся ў розных сферах грамадскага жыцця. Але трэба ўлічваць, што манаграфія напісана на аснове марксісцкай метадалогіі і класавага падыходу. Таму, выкарыстоўваючы яе багаты фактычны матэрыял, неабходна абапірацца на метадалогію, якая прапанавана Л.С. Васільевым.*

Данилов В.И. Турция после второй мировой войны: демократический эксперимент продолжается//Восток.–1998.–№ 4.

*У артыкуле паказаны прычыны палітычнай нестабільнасці ў Турцыі ў 60 – 70-я гг., асноўны змест партыйна-палітычнай барацьбы, перадумовы крызісаў пачатку 70-х і 80-х гадоў XX ст.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце найважнейшыя палажэнні канстытуцыі Турцыі 1961 г.;

*Звярніце ўвагу на створаную канстытуцыяй сістэму дзяржаўнай улады, на тое, што яе распрацоўшчыкі зыходзілі з ідэі прадастаўлення максімальнай свабоды як арганізацыям, так і асобным грамадзянам для заняцця палітычнай дзейнасцю.*

- устанавіце найважнейшыя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця Турцыі ў рамках канцэпцыі "змешанай эканомікі";

*Вы павінны зыходзіць з таго, што ў гэты час узмацняюцца манапалізацыя турэцкай эканомікі і яе рэгуляванне з боку дзяржавы. Пры гэтым быў дасягнуты значны прырост выпускаемай прадукцыі, але вытворчасць заставалася нізкаэфектыўнай.*

- прасачыце ход палітычнай барацьбы ў Турцыі ў 60-я гг. і назавіце прычыны грамадска-палітычнага крызісу канца 60-х – пачатку 70-х гг.;

*Вы павінны адштурхоўвацца ад тэзіса, што традыцыяналізм, адсутнасць вопыту жыцця ва ўмовах дэмакратыі перашкодзілі стабільнаму развіццю Турцыі ў рамках ліберальнай парламенцкай сістэмы.*

- укажыце прычыны выступлення ваенных у 1971 г. і мэты, якія яны ставілі;

*Для разумення прычын ваеннага перавароту ўспомніце, да якіх вынікаў вы прыйшлі пры выкананні папярэдняга задання. Заключэнне аб мэтах ваенных можна зрабіць, прааналізаваўшы тыя мерапрыемствы, якія яны ажыццявілі ў 1971 – 1973 гг.*

- ахарактарызуйце палітычную сітуацыю ў Турцыі ў 1973–1980 гг. і вызначце прычыны дзяржаўнага перавароту 1980 г.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Звярніце ўвагу на вострае супрацьстаянне розных партый, адсутнасць стабільнага ўрада, на наступленне ісламісцкіх сіл і рост тэрарызму.*

- прасачыце найважнейшыя тэндэнцыі і кірункі знешняй палітыкі Турцыі ў 60 – 70-я гг. XX ст.;

Для разумення месца СССР у знешняй палітыцы Турцыі і характару турэцка-савецкіх адносін у 70-я гг. прааналізуйце наступны дакумент:

З інтэрв'ю прэм'ер-міністра Турцыі савецкаму тэлебачанню 8 ліпеня 1978 г.: "Візіт, які я ажыццявіў у Савецкі Саюз – суседнюю сяброўскую краіну – з'яўляецца, з майго пункту гледжання, важнай і радаснай падзеяй. Гэты візіт – важны этап на шляху ўмацавання сяброўскіх адносін і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж Савецкім Саюзам і Турэцкай Рэспублікай. За апошнія гады прыкметна ўмацавалася атмасфера даверу паміж нашымі краінамі.

Палітычны дакумент аб прынцыпах добрасуседскага і сяброўскага супрацоўніцтва паміж СССР і Турцыяй, падпісаны ў час візіту, з'яўляецца важным дакументам, які пацвярджае рашучасць абедзвюх краін і далей развіваць добрасуседскія адносіны, узаемны давер і сяброўскае супрацоўніцтва... Устанаўленне даверу паміж нашымі краінамі складае трывалую аснову для далейшага пазітыўнага развіцця двухбаковых адносін. Я быў вельмі рады пачуць ад Л.І. Брэжнева, А.М. Касыгіна, А.А. Грамыка і іншых відных дзеячаў Савецкага Саюза правільную ацэнку пытанняў міжнароднага становішча і пераканаўчую заяву аб тым, якое вялікае значэнне яны надаюць усталяванню сяброўскіх адносін паміж СССР і Турцыяй." (Новая и новейшая история. – 1999. – №2. – С. 94 – 95.)

*Да ліку ключавых праблем трэба аднесці курдскую і кіпрскую, удзел у ваенных блоках, адносіны з ЗША і СССР.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** з пачатку 80-х гг. XX ст. у Турцыі была праведзена глыбокая структурная перабудова эканомікі па шляху лібералізацыі, у выніку чаго яна ўвайшла ў лік новых індустрыяльных краін.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч. 3. – С.7-11.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*У падручніку акрэслена агульная канцэпцыя эканамічных рэформаў у Турцыі і іх вынікі, але па-за ўвагай аўтараў застаўся іх ход, канкрэтныя мерапрыемствы.*

Авлашеват С. Турция: национальная модель либеральной экаономики // Вопросы экономики. – 1992. – №1.

*Аўтар артыкула раскрыў сутнасць эканамічных пераўтварэнняў у Турцыі ў 80-я гг. і ахарактарызаваўнай важнейшыя рэформы.*

Данилов В.И. Турция в 80-е годы. – М., 1991.

*Названая манаграфія паказвае спецыфіку лібералізацыі турэцкай эканомікі ў 80-я гг., утрымлівае характарыстыку эканамічных рэформаў*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце прычыны эканамічных рэформаў у Турцыі і бачанне іх канцэпцыі элітай краіны ў пачатку 80-х гг.;

*Для выканання гэтага задання трэба вызначыць вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Турцыі ў рамках этатысцкай мадэлі. Успомніце, што яшчэ ў пачатку 1980 г. урад Дэмірэле прапанаваў праграму лібералізацыі эканомікі, многія палажэнні якой былі потым пераняты ўрадам Азала.*

- прасачыце ход эканамічных пераўтварэнняў, якія ажыццяўляліся ўрадам Азала ў 80-я гг. ХХ ст. і прааналізуйце іх вынікі;

*Звярніце ўвагу на такія найважнейшыя элементы эканамічнай палітыкі ўрада Азала, як барацьба з інфляцыяй, эканамічная адкрытасць, прыватызацыя, на тое, што дасягнуўшы значных поспехаў у развіцці эканомікі, Турцыя не змагла яшчэ вырашыць многія сацыяльна-эканамічныя праблемы.*

- вызначце найважнейшыя рысы эканамічнага развіцця Турцыі ў 1990-я гг. – пачатку XXI ст.

## Парадак вывучэння чацвёртага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у выніку ваеннага перавароту і прыняцця канстытуцыі 1982 г. у Турцыі, пры захаванні палітычнага плюралізму і парламентарызму, усталяваўся палітычны рэжым, галоўная мэта якога - захаванне стабільнасці ў грамадстве, падаўленне экстрэмізму, недапушчэнне ісламізацыі краіны.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч. 3. – С.7-14.

*У падручніку пераканаўча паказана, што палітычны рэжым, які ўсталяваўся ў Турцыі ў пачатку 80-х гг., можна характарызаваць як*

*“накіроўваемую дэмакратыю”, пералічаны вузлавыя праблемы палітычнага жыцця.*

Данилов В.И. Турция после второй мировой войны: демократический эксперимент продолжается//Восток.–1998.–№4.

*У артыкуле паказана спецыфіка функцыянавання парламенцкай, шматпартыйнай сістэм ў Турцыі ў 80-я гг. XX – пачатку XXI ст., роля ісламскага фактару.*

Киреев Н. Турция: что в багаже у партии власти “умеренного ислама” // Азия и Африка сегодня. – 2004 - №4. – С12-19.

*Артыкул утрымлівае інфармацыю аб палітычнай сітуацыі ў Турцыі ў пачатку XXI ст.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прааналізуйце змест канстытуцыі 1982 г. і характар той дзяржаўна-палітычнай сістэмы, якую яна ўсталявала;

*Неабходна зыходзіць з таго, што канстытуцыя 1982 г. мае на мэце перш за ўсё забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве. У Турцыі ўсталявалася пэўнае абмежаванне для грамадскіх арганізацый на свабоду палітычнай дзейнасці.*

- вызначце найважнейшыя элементы партыйна-палітычнай сістэмы Турцыі і расстаноўку палітычных сіл у краіне ў 1980-я гг.;

*Вы павінны ведаць найбуйнейшыя палітычныя партыі Турцыі 80-х гг., вядучых палітыкаў, вынікі выбараў, якія праводзіліся ў той час.*

- ахарактарызуйце ход палітычнай барацьбы і найважнейшыя ўнутрыпалітычныя праблемы, з якімі сутыкнулася Турцыя ў 90-я гг. XX – пачатку XXI ст.;

*Звярніце ўвагу на змены ў суадносінах сіл паміж найбуйнейшымі палітычнымі партыямі, на ролю ісламскага фактару, курдскай праблемы.*

- устанавіце найважнейшыя рысы знешняй палітыкі Турцыі ў 80-я гг. XX – пачатку XXI ст.

*Неабходна ўлічваць, што Турцыя - адзіная мусульманская краіна, якая ўваходзіць у НАТО і імкнецца да членства ў Еўрасаюзе. Звярніце ўвагу на тыя праблемы, якія ўскладняюць адносіны Турцыі з Захадам, на тое, як на знешнюю палітыку Турцыі паўплываў распад СССР.*

**Самакантроль па ВЭ-3.**

1. Якія прычыны і перадумовы вызначылі пераход Турцыі да шматпартыйнасці?

*Успомніце пра змены ў сацыяльнай структуры грамадства, пра знешні ўплыў.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2. Назавіце найважнейшыя кірункі ўнутранай палітыкі Дэмакратычнай партыі ў 1950 – 1960 гг.

3. Чым быў выкліканы ваенны пераварот 1960 г.?

4. Якія найбуйнейшыя палітычныя партыі дзейнічалі ў Турцыі ў 60-я – 70-я гг. XX ст.?

5. Якімі адметнымі рысамі характарызавалася палітычная сітуацыя ў Турцыі ў 60-я – 70-я гг. XX ст.?

6. Чаму адбыліся ваенныя перавароты 1971 і 1980 гг.?

7. Якія найважнейшыя рысы характэрны для турэцкай "змешанай эканомікі" 60 – 70-х гг. XX ст.?

8. Якія змены ў дзяржаўна-палітычную сістэму Турцыі ўнесла канстытуцыя 1982 г.?

*Параўнайце канстытуцыю 1982 г. з канстытуцыяй 1961 г.*

9. Які стратэгічны кірунак мелі эканамічныя рэформы ў Турцыі ў 80-я гг. XX – пачатку XXI ст.?

10. Як змянялася расстаноўка палітычных сіл у Турцыі ў 1980-я гг.– пачатку XXI ст.?

*Успомніце вынікі выбараў 1980-х гг. – пачатку XXI ст. для розных партый.*

11. Якія найважнейшыя праблемы палітычнага жыцця Турцыі канца XX – пачатку XXI ст.?

12. Якія асноўныя кірункі і тэндэнцыі знешняй палітыкі Турцыі ў 80-я гг. XX – пачатку XXI ст.?

## ВЭ–К. ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ ПА МОДУЛЮ

*Перш чым прыступіць да выканання кантрольных заданняў, успомніце, якія мэты ставіліся пры вывучэнні модуля, якая яго вядучая ідэя, якія асноўныя паняцці неабходна было засвоіць. Калі вы не ўпэўнены ў трываласці сваіх ведаў, паўтарыце вучэбны матэрыял па літаратуры, якая была рэкамендавана пры вывучэнні вучэбных элементаў.*

***Кантрольныя заданні:***

1.Якая з названых краін дасягнула пасля другой сусветнай вайны найбольшых поспехаў у мадэрнізацыі традыцыйнага грамадства: 1).Афганістан; 2).Іран; 3).Турцыя;

2.Асноўныя прычыны няўдачы рэформаў у Афганістане ў 50-60-я гг. XX ст. заключаліся ў: 1).Умяшанні ЗША ва ўнутраныя справы краіны; 2).Рэзкім супрацьдзеянні традыцыяналісцкіх сіл; 3).Нежаданні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

афганскай буржуазіі рабіць саступкі рабочым; 4).Адсутнасці дапамогі з боку СССР;

3.Манархія ў Афганістане была звергнута ў: 1).1956; 2).1967; 3).1973; 4).1978.

4.Ідэалогію НДПА склаў: 1).Мааізм; 2).Марксізм-ленінізм; 3).Іслам; 4).Нацыяналізм;

5.У выніку Красавіцкай рэвалюцыі ў Афганістане: 1).Пачалося будаўніцтва сацыялізму; 2).Узмацніліся пазіцыі ісламістаў; 3).Быў узяты курс на еўрапеізацыю краіны; 4).У знешняй палітыцы ўсталявалася арыентацыя на ЗША;

6.Аграрная рэформа 1978 - пачатку 80-х гг. у Афганістане пацярпела правал з-за:

1).Нежадання ўрада праводзіць яе ў жыццё; 2).Супраціўлення памешчыкаў; 3).Нежадання сялян браць адабраную ў памешчыкаў зямлю; 4).Інтэрвенцыі Пакістана;

7.Сацыяльную базу ўзброенай апазіцыі рэжыму НДПА склалі: 1).Сяляне; 2).Памешчыкі; 3).Духавенства; 4).Дробнабуржуазныя колы горада;

8.У рамках палітыкі “нацыянальнага прэмірэння” урад Наджыбулы: 1).Дазволіў палітычны плюралізм; 2).Увёў шматпартыйнасць; 3).Падзяліўся ўладай з апазіцыяй; 4).Абвясціў асобныя правінцыі “зонамі міру”;

*Успомніце, калі праводзілася гэтая палітыка.*

9.Улада НДПА ў Афганістане пала ў: 1).1987; 2).1989; 3).1992; 4).1995;

10.На новым этапе грамадзянскай вайны ў Афганістане ў 1995-2002 гг. асноўнымі праціўнікамі выступілі: 1)_______________

2)____________________.

11.Рух талібан на занятай тэрыторыі ўсталяваў рэжым: 1).Сацыялістычны; 2).Праамерыканскі; 3).Парламенцкі; 4).Тэакратычны;

12.На момант заканчэння другой сусветнай вайны асноўнай апазіцыйнай сілай у Іране была _________________________________.

13.Найважнейшай рэформай урада Нацыянальнага фронту ў Іране ў 50-я гг. стала: 1).Аграрная рэформа; 2).Нацыяналізацыя нафтавай прамысловасці; 3).Нацыяналізацыя банкаў; 4).Увядзенне ўсеагульнага выбарчага права;

14.Урад Нацыянальнага фронту ў Іране паў у ______ г. у выніку ____________________.

15.Рэформы, якія праводзіліся ў Іране ў 60-70-я гг. і былі накіраваны на мадэрнізацыю краіны, атрымалі назву ______________ .

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

16.Найбольш актыўна супраць рэформаў 60-70-х гг. у Іране выступала: 1).Сялянства; 2).Рабочыя; 3).Духавенства; 4).Памешчыкі;

17.У выніку рэформаў 60-70-х гг. у Іране: 1).Узнікла значная колькасць фермерскіх гаспадарак; 2).Адбылася люмпенізацыя значнай часткі сялянства; 3).Быў створаны шэраг галін сучаснай прамысловаці; 4).Узмацніўся ўплыў сацыялістычных ідэй;

18.Масавую найбольш актыўную базу ісламскай рэвалюцыі ў Іране склалі: 1).Рабочыя; 2).Сяляне; 3).Люмпенізаваныя слаі горада; 4).Сярэдні клас;

19.Ісламская рэвалюцыя ў Іране адбылася ў: 1).1969; 2).1975-1976; 3).1978-1979; 4).1981-1982;

20.Рэжым, які ўсталяваўся ў Іране ў выніку ісламскай рэвалюцыі, з'яўляўся: 1).Сацыялістычным; 2).Празаходнім; 3).Тэакратычным; 4).Прасавецкім;

21.У Ісламскай Рэспубліцы Іран вышэйшая ўлада належыць ______________________________.

22.Пасля ісламскай рэвалюцыі ў Іране: 1).Былі праведзены рынкавыя рэформы; 2).Прававая сістэма і побыт былі перабудаваны па аснове прынцыпаў шарыяту; 3).Замацаваўся ідэйна-палітычны плюралізм; 4).Пачаў ажыццяўляцца "экспарт" ісламскай рэвалюцыі;

23.Ірана-іракская вайна адбывалася ў: 1).1979-1984; 2).1980-1988; 3).1982-1986; 4).1981-1989;

24.Прычынамі ірана-іракскай вайны былі: 1).Тэрытарыяльная спрэчка; 2).Імкненне да "экспарту" ісламскай рэвалюцыі; 3).Спроба дапамагчы нацыянальнаму вызваленню курдаў; 4).Рэакцыя на агрэсіўную палітыку Ізраіля;

25.Пэўны адыход Ірана ад прынцыпаў ісламскага фундаменталізму ва ўнутранай і знешняй палітыцы пачаўся пасля абрання прэзідэнтам краіны ў ____г. ____________________ .

26.Прычынамі пераходу Турцыі да шматпартыйнасці пасля 1945 г. сталі: 1).Ускладненне сацыяльнай структуры грамадства; 2).Звяржэнне ўлады НРП; 3).Ціск з боку СССР; 4).Нарастанне дэмакратычнай тэндэнцыі ў свеце;

27.З 1950 па 1960 г. правячай партыяй ў Турцыі з'яўлялася ____________________.

28.Урад Мендэраса ў сваёй палітыцы адышоў ад двух прынцыпаў кемалізму: 1).________________, 2).______________.

29.Прычынамі ваеннага перавароту 1960 г. былі: 1).Пагроза ісламізацыі краіны; 2).Камуністычная пагроза; 3).Супрацьдзеянне імкненню ДП да падаўлення апазіцыі; 4).Эканамічны крызіс;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

30.”Змешаная эканоміка” ў Турцыі 60-70-х гг. прадугледжвала: 1).Дамінаванне рынкавых адносін; 2).Перавагу дзяржаўнага сектара; 3).Прыярытэт у развіцці прыватнага сектара; 4).Актыўную інтэграцыю ў сусветную эканоміку;

31.Вядучымі палітычнымі партыямі Турцыі ў 60-70-я гг. з’яўляліся: 1).______________;2.________________________.

32.Адметнымі рысамі палітычнай сітуацыі ў Турцыі ў 60-70-я гг. з’яўляліся: 1).Нестабільнасць; 2).Адыход ад шматпартыйнасці; 3).Рост экстрэмізму; 4).Знікненне з палітычнай арэны ісламісцкіх арганізацый;

33.Найважнейшымі элементамі эканамічных рэформаў у Турцыі ў 80-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст. сталі: 1).Барацьба з інфляцыяй; 2).Пратэкцыянізм і абмежаванне дзейнасці замежнага капіталу; 3).Згортванне этатызму; 4).Згортванне рынкавых адносін;

34.Правядзенне рэформаў у 1980 гг. у Турцыі звязана з праўленнем партыі _________ і дзейнасцю прэм’ер-міністра ________________.

35.Парламенцкія выбары 1995 г. у Турцыі прынеслі найбольшы поспех партыі _____________________.

36.Умяшанне арміі ў палітычнае жыццё Турцыі ў 1997 г. мела на мэце: 1).Аднаўленне шматпартыйнасці; 2).Супрацьдзеянне палітыцы ісламізацыі; 3).Ліквідацыю камуністычнай пагрозы; 4).Канцэнтрацыю ўсёй улады ў руках ваеных;

37.Турцыя ўступіла ў ваенныя блокі: у 1952 г. у ________________, у 1955 г.у ____________.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ВМ-6. АРАБСКІ СВЕТ І КРАІНЫ ТРАПІЧНАЙ І ПАЎДНЁВАЙ АФРЫКІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВЭ-0. УВОДЗІНЫ

***Прыступаючы да вывучэння гэтага модуля, праверце свае веды па наступных пытаннях:***

1.Прасачыце па карце тэрытарыяльны падзел Афрыкі і Блізкага Усходу на час заканчэння другой сусветнай вайны.

*Звярніце ўвагу на тое, якія каланіяльныя ўладанні належалі найбуйнейшым індустрыяльным дзяржавам, успомніце, што з сябе ўяўляла мандатная сістэма.*

2.Якія арабскія краіны змаглі дабіцца незалежнасці ў 1918-1945 гг.?

*Падумайце, наколькі поўнай была гэтая незалежнасць.*

3.Чым характарызавалася грамадска-палітычная сітуацыя ў Палесціне ў першы перыяд найноўшага часу?

4.Якія адметныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Блізкага Усходу і Афрыкі ў 1918-1945 гг.?

*Перш за ўсё выявіце супярэчнасці, якія ўзнікалі і абвастраліся ў гэтых краінах ва ўмовах іх каланіяльнага і залежнага становішча. Калі вы правільна адказалі на пастаўленыя пытанні, можаце прыступаць да вывучэння модуля. У адваротным выпадку па дапаможніку Л.С. Васільева “История Востока” і падручніку “Новейшая история стран Азии и Африки. XX век” паўтарыце гісторыю адпаведных краін у першы перыяд найноўшай гісторыі. Звярніце ўвагу на тое, якія каланіяльныя ўладанні належалі найбуйнейшым індустрыяльным дзяржавам, успомніце, што з сябе ўяўляла мандатная сістэма.*

***Інфармацыя аб модулі ў цэлым***

Гэты модуль прысвечаны вывучэнню гісторыі краін, пераважная большасць з якіх толькі пасля другой сусветнай вайны атрымала незалежнасць, а іншыя дасягнулі рэальнага суверэнітэту. У яго аснове ляжыць праблема пераадолення краінамі рэгіёна сацыяльна-эканамічнай адсталасці і пошуку шляхоў для дасягнення гэтай мэты.

***Месца і значэнне модуля ў сістэме курса:***

Вывучэнне гэтага модуля дазваляе атрымаць веды аб спецыфіцы развіцця краін Блізкага Усходу і Афрыкі на фоне астатняга “трэцяга свету”, якая абумовіла прыналежнасць да гэтага рэгіёна як большасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

самых бедных краін свету, так і шэрагу тых, якіх маюць вельмі высокі даход на душу насельніцтва.

***Мэты вывучэння модуля:***

− выявіць уздзеянне, якое другая сусветная вайна аказала на краіны Блізкага Усходу і Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі і прычыны ўздыму ў іх нацыянальна-вызваленчага руху;

− ахарактарызаваць шляхі дасягнення незалежнасці краінамі Блізкага Усходу, Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі;

− выявіць разнастайнасць шляхоў развіцця краін указанага рэгіёна пасля другой сусветнай вайны і ўстанавіць іх спецыфіку;

- выявіць прычыны эканамічнай адсталасці большасці краін арабскага Усходу, Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі і крайне павольнага фарміравання ў іх сучасных сацыяльна-палітычных структур;

− засвоіць найважнейшыя падзеі і тэндэнцыі развіцця буйнейшых краін рэгіёна пасля другой сусветнай вайны.

***Гэты модуль уключае наступныя вучэбныя элементы:***

В0-0. Уводзіны.

ВЭ-1. Сацыялістычны эксперымент у шэрагу арабскіх краін і яго вынікі.

ВЭ-2. Саудаўская Аравія і Марока пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-3. Характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі пасля заваявання незалежнасці.

ВЭ-4. Эфіопія і Нігерыя як прыклады “сацыялістычнай арыентацыі” і капіталістычнага развіцця ў Трапічнай Афрыцы;

ВЭ-5. Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка пасля другой сусветнай вайны.

ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю.

***Аб змесце модуля.***

***Ключавая праблема:*** пошук шляхоў пераадолення сацыяльна-эканамічнай адсталасці краінамі арабскага Усходу, Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі пасля другой сусветнай вайны.

> *Неабходна зыходзіць з таго, што на вырашэнне краінамі рэгіёна гэтай задачы ўплывалі шматлікія як унутраныя, так і знешнія фактары: каланіяльнае мінулае, цывілізацыйны фундамент, вектар геапалітычнага прыцягнення.*

***Вядучая ідэя*: панаванне каланіялізму не змагло разбурыць традыцыйны цывілізацыйны фундамент грамадстваў арабскага Усходу і Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі, шматлікія элементы якога перашкаджалі ажыццяўленню мадэрнізацыі і паспяховаму пераадоленню

сацыяльна-эканамічнай адсталасці большасці краін рэгіёна. Розная ідэйная і знешнепалітычная арыентацыя іх лідэраў абумовіла разнастайнасць шляхоў развіцця гэтых краін пасля другой сусветнай вайны.

***Асноўныя паняцці:*** *н*ацыянальна-вызваленчы рух, нацыянальны сацыялізм, тэакратычная манархія, сіянізм, ісламскі фундаменталізм, баасісцкі сацыялізм, “сацыялістычная арыентацыя”, трабалызм, “даганяючае развіццё”, структурны крызіс, апартэід (апартхэід), сепаратызм.

*Вы павінны ведаць значэнне гэтых паняццяў і ўмець звязаць іх з канкрэтным гістарычным працэсам у вывучаемых краінах.*

## УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ

1. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця арабскіх краін.
2. Араба-ізраільскі канфлікт.
3. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі.
4. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі.
5. Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка.

1. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця дазваляюць раздзяліць арабскія краіны на некалькі груп. Па-першае, гэта багатыя краіны Аравійскага паўвострава, аснову эканомікі якіх складае нафтаздабыча. Затым, група краін, дзе роля нафтаздабычы таксама вялікая, але яна не забяспечвае такога высокага ўзроўню жыцця, як у раёне Персідскага заліва. Гэта Алжыр, Лівія, Ірак, Туніс. Ёсць краіны, якія будуюць сваю эканоміку зусім або амаль без прытоку нафтадолараў: Егіпет, Сірыя, Ліван, Марока. Можна яшчэ асобна вылучыць найбольш эканамічна адсталыя арабскія краіны - Маўрытанія, Судан, Йемен.

Дзяржавы Аравійскага паўвострава працяглы час заставаліся найбольш эканамічна слабаразвітымі ў арабскім свеце. Прыродныя ўмовы тут вельмі неспрыяльныя для гаспадарчай дзейнасці чалавека. Асноўным заняткам насельніцтва на працягу стагоддзяў была качавая жывёлагадоўля. Сітуацыя стала хутка мяняцца пасля пачатку актыўнай распрацоўкі нафты ў рэгіёне, асабліва з сярэдзіны 70-х гг., калі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэзка выраслі цэны на нафту. Атрыманыя грошы былі ўкладзены ў развіццё сучасных галін вытворчасці. Тым не менш, арабскія краіны Аравіі большасць сваіх патрэб у разнастайных таварах пакрываюць за кошт імпарту. Вялікія даходы ад экспарту нафты прывялі да з'яўлення многіх міліярдаў долараў свабодных капіталаў, якія ўкладаюцца за граніцай. Нафтадолары дазволілі вырашаць і многія сацыяльныя праблемы. Вялікія сродкі накіроўваюцца на развіццё адукацыі і сістэмы аховы здароўя, якія для жыхароў гэтых краін бесплатныя. Наяўнасць у дзяржавы вялікіх сродкаў дазваляе стварыць развітую сістэму сацыяльнай дапамогі. Краіны Персідскага заліва па ўзроўню нацыянальнага даходу на душу насельніцтва ўваходзяць у лік сусветных лідэраў (больш за 20 тысяч долараў у год).

Імклівая ў апошні час трансфармацыя сацыяльна-эканамічнай структуры краін Аравійскага паўвострава за кошт нафтадолараў добра бачная на прыкладзе Саудаўскай Аравіі. З 1973 г. пачаўся імклівы рост даходаў краіны ад продажу нафты. За 1976-1980 гг. яны склалі 300 млрд. долараў. За іх кошт краіна пачала ажыццяўляць шырокамаштабную праграму індустрыялізацыі. Калі на рэалізацыю першага пяцігадовага плана развіцця в 1971 - 1975 гг. было выдзелена 9 млрд. долараў, то трэцяга ў 1981 - 1985 гг. - ужо 211 млрд. Гэтыя сродкі накіроўваліся на стварэнне прамысловых прадпрыемстваў, у першую чаргу нафтаперапрацоўчай, хімічнай, металургічнай галін. Таксама хутка будаваліся порты, дарогі, аэрапорты. Індустрыялізацыя Саудаўскай Аравіі была немагчымай без замежнай тэхнічнай дамогі. Яе аказвалі перш за ўсё ЗША, якія пастаўлялі неабходнае абсталяванне, тэхналогіі, чые спецыялісты працавалі на шматлікіх аб'ектах. У 80-я гг. цэны на нафту знізіліся. У выніку тэмпы індустрыялізацыі Саудаўскай Аравіі запаволіліся. У пачатку 90-х гг. на становішчы эканомікі адмоўна адбілася вайна з Іракам, якая каштавала Саудаўскай Аравіі 70 млрд. долараў. Урад пайшоў на скарачэнне бюджэтных затрат, на прыватызацыю шэрагу прадпрыемстваў. У другой палове 90-х гг. эканоміка краіны зноў набыла высокія тэмпы развіцця.

Вялікія даходы ад экспарту нафты мелі Лівія і Ірак. Але гэтыя краіны не дасягнулі такога высокага ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця, як дзяржавы Аравійскага паўвострава. Гэта ў першую чаргу звязана з асаблівасцю іх палітычнага развіцця. Разнастайныя валюнтарысцкія эксперыменты над эканомікай і сацыяльнай сферай каштавалі вельмі дарага. Акрамя таго, вялікія сродкі ішлі на мілітарызацыю. Ірак і Лівія ўтрымлівалі магутныя ўзброеныя сілы. Ірак вёў працяглую вайну з Іранам, Лівія ўдзельнічала ў падзеях ва Угандзе,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Чадзе. Хаця нафтадолары не ператварылі Лівію і Ірак у квітнеючыя краіны, яны ўсё ж далі магчымасць вырашаць многія эканамічныя і сацыяльныя праблемы. Дзякуючы імпарту, лівійскае насельніцтва не мае праблем з забеспячэннем прадуктамі харчавання і асноўнымі таварамі. Лівія актыўна прыцягвала замежную рабочую сілу. Гэта было асабліва характэрна для 70-х гг., калі колькасць замежных рабочых складала каля 500 тысяч. Потым сітуацыя пачала мяняцца. Выраслі нацыянальныя кадры і колькасць замежных спецыялістаў пачала скарачацца. Па аб'ёму ВУП на душу насельніцтва Лівія ў пачатку XXI ст. з'яўлялася адным з лідэраў у арабскім свеце. Эканамічнае становішча Ірака значна пагоршылася ў сувязі з увядзеннем з пачатку 90-х гг. міжнародных санкцый. Краіна амаль цалкам страціла асноўную крыніцу даходаў - ад экспарту нафты. Вайна, якая пачалася ў 2003 г., моцна разбурыла эканоміку Ірака. Пэўную ролю нафтаздабыча адыгрывае ў эканоміцы Алжыра і Туніса. Але ў названых краінах дадзеная галіна не з'яўляецца галоўнай у эканоміцы. Тут нафтадолары толькі дапамагаюць падтрымліваць развіццё іншых галін эканомікі.

Шэраг краін арабскага свету не маюць істотных запасаў нафты. Але яны пры гэтым значна адрозніваюцца адна ад другой па ўзроўню эканамічнага развіцця. Краінай, эканоміка якой развіваецца хуткімі тэмпамі, з'яўляецца Егіпет. Пасля смерці прэзідэнта А.Насэра тут было скончана са спробамі пабудовы сацыялізму, з эканамічнай мадэллю, у якой галоўная роля належыць дзяржаўнаму сектару. Радыкальныя рэформы павярнулі краіну ў бок рынкавай эканомікі. Праводзілася палітыка адчыненых дзвярэй. Рэформы аказаліся ў цэлым паспяховымі, хаця і суправаджаліся падзеннем узроўню жыцця часткі насельніцтва, ростам разрыву ў даходах. Даход на душу насельніцтва ў канцы XX ст. перавысіў 700 долараў. Блізка да Егіпту як па эканамічнай мадэлі, так і па развіццю эканомікі стаіць Марока. Гэтая краіна паспяхова выкарыстоўвае ў інтарэсах свайго эканамічнага развіцця багатыя запасы мінеральных рэсурсаў. Сірыйская эканоміка пацярпела ад спроб усеагульнай нацыяналізацыі. Але дзякуючы велізарнай дапамозе з боку СССР у свой час і пастаяннай падтрымцы з боку багатых арабскіх краін, Сірыя дасягнула пэўных поспехаў у развіцці эканомікі. Больш адсталая эканоміка Іарданіі і Йемена, нягледзячы на вялікую дапамогу ад нафтаздабываючых арабскіх краін. Самы нізкі ўзровень эканамічнага развіцця ў арабскім свеце маюць Судан і Маўрытанія. Для апошняй гэта ў першую чаргу звязана з неспрыяльнымі прыроднымі ўмовамі. Даход на душу насельніцтва ў канцы XX ст. не дасягаў і 400 долараў на год. Прыкладна такі ж

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

узровень жыцця і ў Судане. У гэтай краіне асноўная прычына эканамічнай адсталасці ў палітычнай нестабільнасці і міжэтнічных канфліктах. У цэлым, аснова эканомікі арабскага свету - гэта здабыча і экспарт нафты. Нафта забяспечвае працвітанне краін Аравійскага паўвострава, яна спрыяе вырашэнню эканамічных і сацыяльных праблем іншых арабскіх краін.

Па кірунках палітычнага развіцця паміж арабскімі краінамі ёсць вялікія адрозненні. Краіны Аравійскага паўвострава, за выключэннем Йемена, з'яўляюцца манархіямі. Улада аравійскіх манархаў практычна абсалютная. Яна яшчэ і сакральна асвечана. Кароль Саудаўскай Аравіі ці эмір Кувейта з'яўляецца не толькі палітычным кіраўніком дзяржавы, але і духоўна-рэлігійным лідэрам краіны. Парламенцка-плюралістычная сістэма ў гэтых краінах не атрымала развіцця. У адпаведнасці з духам часу і тут узніклі органы прадстаўнічай улады. Так, у Кувейце дзейнічаў Нацыянальны сход, але ён быў малаўплывовым. У 1976 - 1981 і 1986 - 1992 гг. эмір увогуле абыходзіўся без парламента. Кансультацыйна-прадстаўнічы орган узнік і пры саудаўскім каралю. У Аб'яднаных Арабскіх Эміратах (ААЭ) дзейнічае федэральны нацыянальны савет, які мае дарадчы голас. ААЭ ўяўляе з сябе федэрацыю сямі эміратаў, а вышэйшым органам улады з'яўляецца савет сямі эміраў, якія са сваіх радоў выбіраюць прэзідэнта тэрмінам на 5 гадоў, і кожны з іх па чарзе займае гэтую пасаду. Неабходна адзначыць рост ісламскага экстрэмізму ў краінах Аравійскага п-ва. Саудаўская Аравія традыцыйна з’яўляецца цэнтрам вахабізму. Вахабіцкія улемы выступілі на чале традыцыяналісцкіх сіл і запатрабавалі спынення вестэрнізацыі краіны. У гэтай барацьбе ісламісты ў 1995 і 1996 г. звярнуліся да тэрарыстычных актаў.

Манархічная форма праўлення існуе ў арабскім свеце і за межамі Аравіі. У Іарданіі ўлада караля значна меншая. Тут функцыянуе недэкаратыўны парламент і шматпартыйная сістэма. Для гэтай краіны доўгія гады была вострай палесцінская праблема. У 1950 г. у склад Трансіарданіі ўвайшлі палесцінскія землі на заходнім беразе ракі Іардан і краіна стала называцца Іарданіяй. Пасля вайны 1967 г. у Іарданіі засталіся шматлікія ўзброеныя атрады палесцінцаў. Будучы рэвалюцыйна настроенымі, яны стварылі пагрозу для каралеўскай улады. Таму кароль Хусейн у 1971 г. дабіўся вываду палесцінскіх атрадаў з Іарданіі. Войны з Ізраілем нанеслі значны ўрон эканоміцы краіны, але з другога боку прыфрантавое становішча Іарданіі дало ёй магчымасць атрымліваць вялікую грашовую дапамогу ад багатых краін Аравіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Падобную палітычную сістэму мае і Марока. Тут кароль МухамедVI (з 1999 г.) дзеліць уладу з парламентам, які выбіраецца на аснове шматпартыйнай сістэмы. Марока ў наш час выдзяляецца ўнутрыпалітычнай стабільнасцю. Адмоўна, у першую чаргу на эканамічнае становішча Марока, уплывае вайна ў Заходняй Сахары. У 1975 г. Іспанія перадала свае "правы" на гэтую калонію Марока і Маўрытаніі. Апошняя хутка адмовілася ад сваіх "правоў", а ўрад Марока заявіў аб анексіі заходнесахарскіх тэрыторый. Супраць Марока ваенныя дзеянні пачаў фронт ПОЛІСАРЫО, які абапіраўся на падтрымку Алжыра.

Вялікая група арабскіх краін у пасляваенны час спрабавала рухацца па шляху сацыялістычнай арыентацыі. Адным з першых на гэты шлях уступіў Егіпет. У 1952 г. у краіне ў выніку перавароту была звергнута манархія. Улада перайшла ў рукі арабскіх нацыяналістаў левай арыентацыі на чале з А.Насэрам, які стаў прэзідэнтам Егіпта. У 1956 г. быў нацыяналізаваны Суэцкі канал. У 1961 - 1964 гг. у краіне прайшла шырокамаштабная нацыяналізацыя. У выніку дзяржаўны сектар у 1965 г. даваў 85% прамысловай прадукцыі. У рукі дзяржавы поўнасцю перайшлі транспарт, фінансы, знешні гандаль. Праўда, прызнавалася неабходнасць захавання неэксплуататарскага прыватнага сектара ў эканоміцы. Была праведзена аграрная рэформа, якая падарвала памешчыцкае землеўладанне. У палітычнай сферы ў краіне ўсталявалася аднапартыйная дыктатура партыі Арабскі сацыялістычны союз. Вялікую дапамогу ў індустрыялізацыі Егіпта аказваў СССР. За час сацыялістычнага будаўніцтва была створана энергетычная прамысловасць, металургія. Сімвалам індустрыялізацыі Егіпта стала Асуанская ГЭС, якая была пабудавана з дапамогаю СССР. Адным з элементаў палітыкі Насэра было імкненне да лідэрства ў арабскім свеце, да згуртавання арабскіх краін. Калі ў 1958 г. Сірыя звярнулася да Егіпта з прапановай аб дзяржаўным аб'яднанні, Насэр прыняў гэтую прапанову. Была ўтворана Аб'яднаная Арабская Рэспубліка (ААР). Аднак ужо ў 1961 г. ААР распалася. Ваенныя, якія ўзялі ўладу ў Сірыі ў выніку перавароту 28 верасня 1961 г., аб'явілі аб разрыве саюзу з Егіптам.

Эксперымент з будаўніцтвам сацыялізму завяршыўся ў пачатку 70-х гг. Гэтаму спрыяла нескалькі фактараў. Па-першае, стала відавочнай неэфектыўнасць дзяржаўнай эканомікі. Па-другое, аказалася, што, ідучы па шляху сацыялізму, Егіпет, нягледзячы на велізарную дапамогу СССР, церпіць адно за другім паражэнні ў войнах з Ізраілем. Закрыццё Суэцкага канала ў выніку гэтых паражэнняў яшчэ больш пагоршыла эканамічнае становішча Егіпта. Паўплываў на адказ ад



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сацыялістычнай арыентацыі і суб'ектыўны фактар. У 1970 г. памёр Насэр, новым прэзідэнтам стаў Анвар Садат. Ён пайшоў на змену курса. Ва ўнутранай палітыцы з 1974 г. быў узяты курс на адкрыццё эканомікі, на заахвочванне прыватнага сектара. Але сістэма надзвычайных законаў у эканоміцы, бюракратычны кантроль над ёю не былі поўнасцю ліквідаваны. Дзяржаўны сектар даваў да 70% прамысловай прадукцыі. У выніку ў буйной буржуазіі меліся істотныя сумненні адносна таго, наколькі Садат гатовы цвёрда і паслядоўна ажыццяўляць пераход да рынкавай эканомікі, а гэта зніжала прадпрымальніцкую актыўнасць і прыток інвестыцый. У адносінах да замежнага капіталу была аб'яўлена палітыка “адчыненых дзвярэй”, але яна ў многім выглядала як чарговая палітычная кампанія. Новая эканамічная палітыка прывяла да пэўнага ажыўлення эканомікі. У той жа час яе вынікам у 70-я гг. стала прыкметнае зніжэнне ўзроўню сацыяльнай абароненасці насельніцтва. Шырокія маштабы набыў працэс паўперызацыі, што стварала спрыяльную базу для дзейнасці разнастайных ісламскіх экстрэмісцкіх груповак. У 1976 г. была праведзена рэарганізацыя партыйнай структуры краіны і адбыўся пераход да шматпартыйнасці. На месцы Арабскага сацыялістычнага саюза ўзніклі тры партыі: Ліберальна-сацыялістычная (ЛСП), Нацыянальна-прагрэсіўная (НПП) і Арабская сацыялістычная (АСП). Апошняя з’яўлялася праўрадавай і перамагла на парламенцкіх выбарах 1976 г. ЛСП выступала за прадастаўленне максімальнай свабоды прыватнаму прадпрымальніцтву, але крытыкавала ўрад за прадастаўленне празмерных прывілеяў замежнаму капіталу за кошт нацыянальнага. НПП выступала за працяг курса Насэра. У канцы 70-х гг. рэзка ўзмацнілася апазіцыя рэжыму Садата, у якой вядучую ролю ігралі ісламісты. Іх арганізацыі налічвалі каля 5 мільёнаў чалавек. Змяніўся і знешнепалітычны курс Егіпта. Садат адмовіўся ад цеснага супрацоўніцтва з СССР і пачаў арыентавацца на ЗША. Ён палічыў бесперспектыўным ваеннае супрацьстаянне з Ізраілем. Паміж дзвюма краінамі пачаліся мірныя перамовы, якія прывялі ў 1979 г. да падпісання мірнага дагавору. Па ім Егіпту быў вернуты Сінайскі паўвостраў.

Мір з Ізраілем і ўсталяванне ў Егіпце заходняга ўплыву былі варожа сустрэты ісламскімі фундаменталістамі. Росту ісламскага экстрэмізму спрыялі і цяжкія сацыяльныя наступствы палітыкі “адчыненых дзвярэй”. У кастрычніку 1981 г. ісламісты арганізавалі забойства Садата. Новым прэзідэнтам Егіпта стаў Хосні Мубарак. Ён змог наладзіць дыялог з памяркоўнай апазіцыяй. Апорай прэзідэнта і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

правячай партыяй становіцца Нацыянальна-дэмакратычная партыя (НДП), створаная ў 1978 г. Х.Мубарак разгарнуў актыўную барацьбу з ісламскім экстрэмізмам, але поўнасцю перамагчы яго не змог. У сацыяльна-эканамічнай палітыцы ў першы перыяд свайго праўлення ён пастараўся змякчыць крайнасці імклівай лібералізацыі. Х.Мубарак змог пераадолець ізаляцыю Егіпта ў арабскім свеце. Пасля падпісання мірнага дагавора з Ізраілем, арабскія краіны разарвалі дыпламатычныя адносіны з Егіптам. У 1984 г. іх аднавіла Іарданія, а ў 1987 г. Ліга арабскіх краін дазволіла дзяржавам, якія ў яе ўваходзяць, падтрымліваць дыпламатычныя адносіны з Егіптам. У 90-я гг. эканамічная палітыка Х.Мубарака характарызавалася паскораным развіццём рынкавых адносін, правядзеннем раздзяржаўлівання. Дзяржаўны сектар быў пазбаўлены дзяржаўнай падтрымкі і вымушаны быў на роўных канкурыраваць з прыватным. Такая эканамічная палітыка аказалася ў цэлым паспяховай і забяспечыла ўздым егіпецкай эканомікі ў канцы XX ст. Дадатковыя сацыяльныя праблемы для Егіпта стварае дэмаграфічны выбух. Колькасць насельніцтва дасягнула 62 мільёны чалавек, павялічылася за XX ст. у 10 разоў.

Нягледзячы на фармальнае існаванне ў Егіпце шматпартыйнасці і парламентарызму, у палітычным жыцці краіны захоўваюцца шмат-лікія элементы аўтарытарызму. Улада прэзідэнта вельмі вялікая. Цяжка назваць дэмакратычнай сістэму, пры якой прэзідэнцкія паўнамоцтвы Х.Мубарака падаўжаюцца не праз перамогу на свабодных альтэрнатыўных выбарах, а шляхам правядзення рэферэндуму аб даверу прэзідэнту. Такі рэферэндум адбыўся 26 верасня 1999 г., і па яго выніках прэзідэнцкія паўнамоцтвы Х.Мубарака былі падоўжаны яшчэ на 6 год. У 2005 г. адбыліся прэзідэнскія выбары, якія праводзіліся на альтэрнатыўнай аснове. Перамогу на іх атрымаў Х.Мубарак. Выбары нельга было прызнаць адпавядаючымі міжнародным дэмакратычным стандартам, але Захад прымае аўтарытарны рэжым Х.Мубарак, бо рэальнай альтэрнатывай яму можа стаць ісламскі фундаменталізм.

На больш доўгі час эксперымент з сацыялістычнай арыентацыяй зацягнуўся ў Сірыі. Ён пачаўся пасля перавароту 1963 г. Прыйшоўшая да ўлады Партыя арабскага сацыялістычнага адраджэння (БААС) праводзіла такія ж рэформы, што і Насэр у Егіпце. Праўда, паступова сацыялістычны акцэнт у пераўтварэннях пачаў слабець, але пераварот 1966 г. даў новы штуршок будаўніцтву сацыялізму. Канстытуцыя 1973 г. да пастулату аб планавасці эканомікі дадала тэзіс аб ліквідацыі ўсіх форм эксплуатацыі. Быў створаны дзяржаўны сектар, на які прыпадала 80% прамысловай вытворчасці. У прыватных руках

засталіся толькі дробныя прадпрыемствы. У 1971 г. прэзідэнтам Сірыі стаў Х.Асад. Новы ўрад аб'явіў аб будаўніцтве "арабскага сацыялістычнага грамадства".

Сірыя аказалася ўцягнутай у грамадзяскую вайну ў суседнім Ліване. Яе прычыны ў першую чаргу трэба шукаць у асаблівасці этнарэлігійнай структуры Лівана. У гэтай краіне жывуць і хрысціяне і мусульмане. Гістарычна склалася, што хрысцяне займалі дамінуючае становішча ў палітычным жыцці. Знаходжанне сірыйскіх войскаў у Ліване прывяло да новых сутыкненняў з ізраільскай арміяй. У самой Сірыі ў канцы 70-х гг. актывізавалася дзейнасць ісламскай экстрэмісцкай арганізацыі "браты-мусульмане". Але Асад змог яе разграміць. Неэфектыўнасць дзяржаўнага сектара прымусіла ўрад Асада прадаставіць большую свабоду прыватнаму сектару. Ён стаў вядучым у сельскай гаспадарцы, рознічным гандлі, лёгкай прамысловасці, транспартных перавозках. Але, нягледзячы на пэўную лібералізацыю ў эканоміцы, дзяржаўны сектар і ў 90-я гг. даваў 50% нацыянальнага даходу і 75% прамысловай прадукцыі. У палітычнай сферы ў Сірыі існаваў рэжым асабістай улады Х.Асада. У лютым 1999 г. праз рэферэндум ён быў 5 раз абраны прэзідэнтам Сірыі на 7-гадовы тэрмін. Пасля смерці Х.Асада 9 чэрвеня 2000 г. улада перайшла да яго сына Башара Асада.

Паварот Ірака ў бок будаўніцтва сацыялізму адбыўся пасля антыманархічнай рэвалюцыі 1958 г. і ваеннага перавароту 1968 г. У выніку апошняга ўлада апынулася ў руках Партыі арабскага сацыялістычнага адраджэння (БААС). У 1971 г. вышэйшы орган улады Савет рэвалюцыйнага камандавання абнародаваў Хартыю нацыянальных дзеянняў. У рамках гэтай праграмы была нацыяналізавана нафтавая прамысловасць, а затым прадпрыемствы і ў іншых галінах. Яшчэ ў 1970 г. пачалася аграрная рэформа, якая прадугледжвала канфіскацыю памешчыцкіх зямель і перадачу іх ва ўласнасць ці гарантаваную арэнду сялянам. Значныя даходы ад экспарту нафты дазволілі Іраку даволі паспяхова ў 70-я гг. праводзіць індустрыялізацыю. Гэты працэс быў спынены з пачаткам ірана-іракскай вайны, а затым - вайною ў Персідскім заліве. Названыя падзеі прывялі да ўвядзення міжнародных санкцый супраць Ірака, якія вельмі адмоўна адбіліся на яго эканоміцы. У канцы 70-х гг. адбыліся змены ў кіраўніцтве Ірака, якія мелі далёка ідучыя наступствы. У 1979 г. Садам Хусейн адхіліў ад улады правіўшага Іракам з 1968 г. свайго стрыечнага дзядзьку Хасана Аль-Бакра і стаў неабмежаваным дыктатарам краіны. Ён фізічна знішчыў сваіх як рэальных, так і патэнцыяльных палітычных пра-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ціўнікаў. У эканамічнай галіне спыніліся размовы пра будаўніцтва сацыялізму. Хусейн прадаставіў даволі значную свабоду для прыватнага прадпрымальніцтва. Цэнтральным пунктам яго палітыкі стала гульня на нацыянальных пачуццях, ідэя яднання нацыі для барацьбы з ворагам. Першым такім ворагам стаў Іран, вайна з якім была пачата ў 1980 г. Але акрамя велізарных матэрыяльных страт і людскіх ахвяр (300 тысяч загінуўшых) вайна больш нічога Іраку не дала. У 1988 г. ваенныя дзеянні былі спынены.

С.Хусейн, які меў велізарную армію, вырашыў паправіць матэрыяльнае становішча сваёй краіны за кошт багатага суседа - Кувейта. 2 жніўня 1990 г. іракскія войскі акупіравалі Кувейт, а 8 жніўня Хусейн абвясціў аб далучэнні Кувейта да Іраку. Савет Бяспекі ААН палічыў дзеянні Ірака агрэсіяй, запатрабаваў вываду іракскіх войскаў да 15 студзеня 1991 г. і ўвёў эканамічныя санкцыі. Склалася шырокая міжнародная кааліцыя з удзелам ЗША, іншых краін НАТО, а таксама шэрагу арабскіх краін. Была створана 600-тысячная групоўка міжнацыянальных сіл на чале з генералам Шварцкопфам. Касцяк яе (425 тысяч) склалі амерыканскія войскі, 100 тысяч салдат выставіла Турцыя, 67,5 - Саудаўская Аравія, Англія - 35 тысяч, Францыя - 17 тысяч. Ірак не выканаў ультыматума Савета Бяспекі ААН, і 17 студзеня 1991 г. шматнацыянальныя сілы пачалі аперацыю “Бура ў пустыні”. На першым этапе авіяцыя саюзнікаў ажыццявіла магутнае паветранае наступленне, вынікам якога стаў поўны разгром іракскай авіяцыі і сістэмы супрацьпаветранай абароны, былі нанесены вялікія страты наземным войскам. 24 лютага пачалося наступленне сухапутных сіл саюзнікаў. Менш чым за тыдзень яны нанеслі поўнае паражэнне іракскай арміі, вызвалілі Кувейт і выйшлі да Басры.

Пасля паражэння Хусейн сутыкнуўся з паўстаннямі сваіх праціўнікаў як на поўдні (шыіты), так і на поўначы (курды) краіны. Але яму ўдалося захаваць уладу. Міжнародныя санкцыі супраць Ірака працягвалі дзейнічаць і пасля вызвалення Кувейта. Гэта было звязана з патрабаваннямі міжнароднай супольнасці аб ліквідацыі зброі масавага знішчэння. Санкцыі, сярод якіх найбольш цяжкая - гэта забарона экспарту іракскай нафты, нанеслі вельмі моцны ўдар па эканоміцы краіны, выклікалі спад вытворчасці, інфляцыю, рост цэн, праблемы з забеспячэннем насельніцтва харчаваннем. Канфлікт вакол Ірака працягваў тлець. Краіна яшчэ некалькі разоў падвяргалася меншым па сваім маштабе ўдарам міжнародных сіл. Нарэшце, 20 сакавіка 2003 г. антыіракская кааліцыя, у якой вядучую ролю адыгрывалі ЗША, пачала шырокамаштабную вайну супраць рэжыму С.Хусейна. Пад-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ставай для гэтага сталі абвінавачванні Ірака ў падтрымцы міжнароднага тэрарызму і распрацоўцы зброі масавага знішчэння (гэтае абвінавачванне не знайшло пацверджання). Ужо 9 красавіка саюзнікі авалодалі Багдадам і дыктатура Хусейна рухнула. Але пасля гэтага кааліцыя сутыкнулася са значнай па сваіх маштабах партызанскай вайной, шматлікімі тэрарыстычнымі актамі. Галоўную ролю ў гэтай барацьбе іграюць міжнародныя экстрэмісцкія ісламісцкія арганізацыі. Амерыканскае ўварванне ў Ірак спрыяла далейшай актывізацыі ісламскага экстрэмізму ў арабскіх краінах.

У Лівіі будаўніцтва арабскага нацыянальнага сацыялізму пачалося пасля ажыццёўленага ў 1969 г. групай маладых афіцэраў на чале з М.Кадафі дзяржаўнага перавароту. Гэты курс быў зафіксаваны ў часовай канстытуцыі 11 студзеня 1969 г. У ёй падкрэслівалася значэне ісламу і арабскай традыцыі для будаўніцтва сацыялізму. Пануючае становішча ў эканоміцы пераходзіць да дзяржаўнага сектара. Асаблівасцю Лівіі было тое, што Кадафі знішчыў звыклыя формы дзяржаўнай улады, і з 1977 г. Лівія стала Джамахерыяй, гэта значыць, агульнанароднай самакіруемай дзяржавай. У ёй былі створаны ў якасці органаў улады народныя сходы. Вышэйшым прадстаўнічым органам улады стаў Усеагульны народны кангрэс (УНК), які замяніў сабою парламент. Кіруюць дзейнасцю сходаў рэвалюцыйныя камітэты. Кадафі заняў пасаду генеральнага сакратара УНК. Урад пачаў называцца вышэйшым народным саветам, а міністэрствы – сакратарыятамі. З 1986 г. Кадафі вымушаны быў пайсці на некаторыя саступкі прыватнаму сектару ў эканоміцы, абвясціў "ісламскую перабудову". Асаблівы акцэнт быў зроблены на выключную ролю ісламу ў жыцці лівійскага грамадства. Яго жыццё павінна было будавацца перш за ўсё на традыцыйных каштоўнасцях ісламу. Лівія ў канцы XX ст. выйшла на адно з першых месцаў у арабскім свеце па ўзроўню валавога ўнутранага прадукту на душу насельніцтва. Перамены ў эканоміцы не закранулі дыктатарскай сутнасці палітычнага рэжыму. Абвінавачванні ў падтрымцы міжнароднага тэрарызму спрыялі росту міжнароднай ізаляцыі Лівіі і напружаннасці ў яе адносінах з Захадам. У 1986 г. справа дайшла да авіяцыйных удараў па Трыпалі з боку ЗША. У пачатку XXI ст. Лівія пайшла на супрацоўніцтва з міжнароднай супольнасцю ў справе барацьбы з тэрарызмам, прызнала сваю адказнасць за шэраг тэрарыстычных актаў і выказала гатоўнасць выплаціць кампенсацыю. Вынікам гэтага стала паступовае зняцце міжнародных санкцый і наладжванне адносін з некаторымі краінамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Захаду, перш за ўсё з Італіяй. У 2004 г. адбыўся візіт у Лівію італьянскага прэм'ер-міністра С.Берлусконі.

У Алжыры пасля аб’яўлення незалежнасці ў 1962 г. устанавіўся аднапартыйны рэжым. Прынятая ў 1976 г. канстытуцыя абвясціла курс на пабудову спецыфічнага нацыянальнага сацыялізму. Спецыфіка заключалася ў тым, што ўлады спрабавалі сумяшчаць некаторыя палажэнні марксізму з традыцыямі ісламу. У сацыяльна-эканамічнай сферы была праведзена нацыяналізацыя буйной прамысловасці і прыродных рэсурсаў, але поўнасцю прыватны сектар не быў ліквідаваны. Пачалася паскораная індустрыялізацыя шляхам будаўніцтва прамысловых гігантаў у асноўным за кошт нафтадолараў. Эканамічнае становішча краіны пачало пагаршацца з сярэдзіны 80-х гг., калі даходы ад экспарту нафты пачалі імкліва скарачацца. На будаўніцтва многіх прамысловых аб’ектаў не хапала сродкаў. Узніклі складанасці з харчаваннем. Алжыр пакрываў свае патрэбы ў ім за кошт уласнай вытворчасці толькі на 30%. У 1988 г. у краіне адбыліся масавыя беспарадкі, у ходзе якіх загінула каля 1 тысячы чалавек. Пад націскам масавага незадавальнення ў 1989 г. была прынята новая канстытуцыя. Фронт нацыянальнага вызвалення (ФНВ) вымушаны быў адмовіцца ад манаполіі на ўладу і згадзіцца на шматпартыйнасць. Прэзідэнт Бенджадзід аб’явіў курс на лібералізацыю эканомікі. Але рэформы ўжо не змаглі выратаваць дэскрыдытаваўшы сябе рэжым. На першых жа свабодных выбарах у органы мясцовага кіравання ФНВ пацярпеў паражэнне (толькі 32% галасоў). Перамогу атрымаў створаны ў 1990 г. ісламскімі фундаменталістамі Ісламскі фронт выратавання (ІФВ) (55%). У снежні 1991 г. прайшоў першы тур парламенцкіх выбараў. ІФВ ужо ў першым туры атрымаў 188 месцаў са 430 (пасля другога тура чакалася 2/3). Перад рэальнай пагрозай паражэння на выбарах прэзідэнт Бенджадзід у пачатку 1992 г. ажыццявіў дзяржаўны пераварот. Вынікі выбараў былі адменены, і ўсталявалася дыктатура з апораю на армію. ІФВ быў распушчаны. Сам прэзідэнт таксама пайшоў у адстаўку. Улада перайшла ў рукі Вышэйшага дзяржаўнага савету на чале з М.Буджафам. У адказ ІФВ разгарнуў тэрарыстычную вайну супраць улады. У 1992 г. быў забіты тэрарыстамі Буджаф. На чале краіны стаў Алі Кафі - непрымірымы праціўнік ісламістаў. Вайна разбурыла эканоміку. Гэта прымусіла ўлады шукаць кампраміс з ісламістамі. У 1993 г. Алжыр узначаліў Ліамін Зеруаль, які пайшоў на перамовы з памяркоўнымі дзеячамі ісламісцкага руху. У 1995 г. былі праведзены прэзідэнцкія выбары, на якіх перамог Зеруаль, а ў 1996 г. была прынята канстытуцыя, якая аб’явіла іслам дзяржаўнай рэлігіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Але гэтыя меры не спынілі вайну. Не прызналі ісламскія фундаменталісты і вынікі прэзідэнцкіх выбараў 1999 г., на якіх перамог Абдэль Азіс Буцэфліка. Ён аб’явіў курс на нацыянальнае прымірэнне, каб спыніць хвалю тэрору, але гэтая палітыка не сутрэла разумення з боку ісламістаў.

2. У лістападзе 1947 г. ААН прыняла рэзалюцыю аб стварэнні на тэрыторыі Палесціны, якая знаходзілася пад упраўленнем Англіі, дзвюх дзяржаў – яўрэйскай (Ізраіль) і арабскай (Палесціна). Арабы не пагадзіліся з гэтай рэзалюцыяй, а яўрэяў яна задаволіла. У маі 1948 г. Ізраіль быў абвешчаны, але арабскія краіны не прызналі за ім права на існаванне. Росту напружанасці ў адносінах паміж арабскімі дзяржавамі і Ізраілем садзейнічала дзейнасць міжнародный сіянісцкіх арганізацый. Узнікненню араба-ізраільскага канфлікту паспрыяла і палітыка вялікіх дзяржаў, якія імкнуліся выкарыстаць яго ў барацьбе за ўплыў у рэгіёне. У 1948 – 1949 гг. адбылася першая араба-ізраільская вайна. Ізраіль выйшаў з яе пераможцам. Яго армія заняла большую частку тэрыторыі, якая прызначалася для стварэння арабскай Палесцінскай дзяржавы, у тым ліку і заходнюю частку Іерусаліма. Другая араба-ізраільская вайна адбылася ў 1956 г., калі Ізраіль далучыўся да англа-французскай агрэсіі супраць Егіпта пасля таго, як прэзідэнт Насэр нацыяналізаваў Суэцкі канал. Ізраільскія войскі акупіравалі Сінайскі п-аў, але затым былі выведзены з яго. На Сінаі размясціліся міратворчыя сілы ААН. Новая вайна паміж Ізраілем і арабскімі краінамі ўспыхнула ў 1967 г. Кароль Іарданіі Хусейн і прэзідэнт Егіпта Насэр абвінавацілі Ізраіль у падрыхтоўцы нападу на Сірыю і выступілі з пагрозай "скінуць яго ў мора". Насэр увёў на Сінай 100-тысячную армію і дабіўся вываду адтуль міратворцаў ААН. У такіх умовах Ізраіль 5 чэрвеня 1967 г. нанёс удар па Егіпту і Сірыі, а затым і па Іарданіі. Егіпецкія войскі на Сінаі былі разгромлены, і праз пяць дзён ізраільцяне дасягнулі Суэцкага канала. Таксама Ізраіль акупіраваў сірыйскія Галанскія вышыні і знаходзіўшыся пад уладай Іарданіі заходні бераг ракі Іардан, уключаючы ўсходнюю частку Іерусаліма. Арабы страцілі 40 тыс. салдат, 900 танкаў, 400 самалётаў. Людскія страты Ізраіля склалі ўсяго 800 чалавек. Толькі разрыў СССР дыпламатычных адносін з Ізраілем і пагроза накіраваць на дапамогу арабам "добраахвотнікаў" прымусілі ізраільскую армію спыніць наступленне. Да таго ж, яна ўжо дасягнула асноўнай мэты вайны – разграміла ўзброеныя сілы суседніх арбскіх краін. Спроба Егіпта і Сірыі ў кастрычніку 1973 г. узяць рэванш за папярэднія паражэнні скончылася няўдачай. Пасля першых поспехаў егіпецкія і сірыйскія войскі

былі адкінуты ізраільцянамі. Яны фарсіравалі Суэцкі канал, стварылі пагрозу захопу Каіра, а на сірыйскім фронце – Дамаска. Тады арабскія краіны ўвялі нафтавае эмбарга ў адносінах да заходніх краін, каб тыя прымусілі Ізраіль спыніць наступленне.

Пераканаўшыся ў бесперспектыўнасці вайны з Ізраілем, прэзідэнт Егіпта А.Садат вырашыў пайсці па шляху мірных перамоў. Пры пасрэдніцтве ЗША ў 1979 г. Егіпет і Ізраіль падпісалі мірны дагавор. Такая палітыка Егіпта была ўспрынята ў арабскім свеце як здрада агульнаарабскім інтарэсам, перш за ўсё інтарэсам арабаў-палесцінцаў. Увогуле, палесцінскае пытанне – цэнтральнае і найбольш складаннае пытанне блізкаўсходняй праблемы. Яшчэ пасля вайны 1948–1949 гг. каля 900 тыс. палесцінцаў пакінулі свае землі і апынуліся ў становішчы бежанцаў. У 1964 г. была створана Арганізацыя вызвалення Палесціны (АВП), якая мела на мэце знішчэнне дзяржавы Ізраіль і стварэнне ў Палесціне толькі арабскай дзяржавы. АВП мела шматлікія ўзброеныя атрады, якія змагаліся супраць Ізраіля, выкарыстоўваючы і тэрарыстычныя метады. Спачатку галоўныя базы АВП размяшчаліся ў Іарданіі. Пасля таго, як у 1971 г. кароль Хусейн дамогся вываду палесцінскіх атрадаў, яны зрабілі сваёй асноўнай базай Ліван. Палесцінскія атрады прынялі актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне, якая ўспыхнула ў гэтай краіне ў 1975 г. Яны таксама рабілі напады на паўночныя раёны Ізраіля. У адказ у 1982 г. ізраільская армія ўварвалася ў Ліван і дайшла да Бейрута. У канфлікт умяшалася Сірыя. У выніку пятай араба-ізраільскай вайны АВП вымушана была вывесці свае атрады з Лівана, а Ізраіль больш чым на 20 гадоў акупіраваў паўднёвыя раёны Лівана, стварыўшы там "зону бяспекі".

Блізкаўсходні канфлікт ускладняўся ўмяшаннем у яго звышдзяржаў. Калі ў другой палове 80-х гг. XX ст. адносіны паміж імі палепшыліся, гэта стварыла пэўныя спрыяльныя перадумовы для ўрэгулявання араба-ізраільскага канфлікту. Найбольш складанай на шляху да ўрэгулявання застаецца палесцінская праблема. У лістападзе 1988 г. палесцінскі парламент у выгнанні абвясціў стварэнне дзяржавы Палесціна. Адначасова АВП заявіла, што яна прызнае рэзалюцыю ААН 1947 г., а гэта значыць - права Ізраіля на існаванне. Ізраільскія правячыя колы вылучылі формулу мірнага ўрэгулявання "мір у абмен на тэрыторыю". Здавалася, адкрываецца шлях да мірнага ўрэгулявання. Але ў 1990 г. сітуацыя істотна змянілася. С.Хусейн, захапіўшы Кувейт, заявіў, што яго галоўная мэта – знішчэнне Ізраіля. Лідэр АВП Я.Арафат горача падтрымаў іракскага дыктатара. Толькі пасля

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разгрому С.Хусейна ў пачатку 1991 г. палесцінцы выказалі гатоўнасць да перамоў з Ізраілем. Апошні са свайго боку доўга не хацеў ісці на перамовы з АВП, бо лічыў яе чыста тэрарыстычнай арганізацыяй. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, у кастрычніку 1991 г. пад патранажам звышдзяржаў адкрылася Мадрыдская міжнародная канферэнцыя па блізкаўсходнім ўрэгуляванні. У 1993 г. былі дасягнуты першыя пагадненні. АВП і Ізраіль узаемна прызналі адзін аднаго і дамовіліся аб стварэнні палесцінскага мясцовага самакіравання ў шэрагу раёнаў на Заходнім беразе ракі Іардан і ў сектары Газа. У маі 1994 г. ізраільскія войскі пакінулі гэтыя раёны і кіраванне імі было перададзена ў рукі палесцінцаў. Актыўна развіваўся ізраільска-іарданскі перагаворны працэс. 25 ліпеня 1994 г. дзве краіны падпісалі Вашынгтонскую дэкларацыю (Хусейна-Рабіна), у якой заявілі аб імкненні да справядлівага міру на Блізкім Усходзе. Жорсткую пазіцыю ў адносінах да Ізраіля захавала Сірыя. У якасці перадумовы перамоў з Ізраілем яна вылучыла вяртанне Галанскіх вышынь, на што Ізраіль не пагаджаўся.

У Ізраілі на выбарах у кнесет у 1996 г. перамог правы блок Лікуд, а прэм'ер-міністрам краіны стаў Б.Натаньяху. Ён заняў жорсткую пазіцыю ў дачыненні да палесцінцаў, абвінавацію АВП у актыўнай тэрарыстычнай дзейнасці. Для гэтага былі падставы, бо з сярэдзіны 90-х гг. па Ізраілю пракацілася хваля тэрарыстычных актаў. Абстаноўка стала асабліва напружанай, калі ізраільскі ўрад у пачатку 1997 г. аб'явіў аб намеры пабудаваць яўрэйскі квартал у арабскай частцы Іерусаліма. Новы ўрад Ізраіля на чале з Баракам пайшоў у ходзе перамоў на значныя саступкі АВП. Але і такая тактыка не прывяла да міру. Кабінет А.Шарона зноў вярнуўся да жорсткай палітыкі ў дачыненні да палесцінцаў. На правядзенне Ізраілем шэрагу ваенных аперацый супраць АВП, у тым ліку і з мэтай фізічнага знішчэння яе лідэраў, палесцінцы адказалі хваляй тэрору, якая з канца 90-х гг. XX ст. літаральна захліснула Ізраіль. У такой сітуацыі Шарон вылучыў план вываду яўрэйскіх пасяленняў з сектара Газа. У канцы 2004 г. памёр Я.Арафат. Змены ў палесцінскім кіраўніцтве на карысць больш памяркоўных палітыкаў парадзілі надзеі на паспяховы ход мірнага працэсу на палесцінскіх землях. Але хутка высвеьлілася, што найбольш уплывовай палесцінскай арганізацыяй з’яўляецца Хамаз, якая премагла на парламенцкіх выбарах у палесцінскай аўтаноміі ў 2005 г. Тады ж урад А.Шарона эвакуіраваў усе еўрэйскія пасяленні з сектара Газы.

3. У краінах Паўднёвай і Трапічнай Афрыкі пасля заваявання незалежнасці найбольш распаўсюджанай была канцэпцыя самастойнага,

самабытнага сацыяльна-эканамічнага развіцця з апорай на дзяржаву як на асноўны суб’ект эканамічных адносін. Дзяржава павінна была адыгрываць галоўную ролю ў ажыццяўленні індустрыялізацыі, урбанізацыі, разгортванні сістэм адукацыі і аховы здароўя, стварэнні сучаснай інфраструктуры. Менавіта правядзенне фарсіраванай індустрыялізацыі разглядалася як асноўны сродак ліквідацыі адсталасці ад развітых краін. Гэтыя палажэнні склалі аснову канцэпцыі “даганяючага развіцця”, якое павінна было забяспечыць выхад афрыканскіх краін на ўзровень развітых індустрыяльных краін. Ідэалогія гэтага кірунку характарызавалася стракатасцю ідэалагічных плыняў: антыімперыялізм, нацыяналізм, марксізм і нацыянальны сацыялізм.

У першыя 1,5 дзесяцігоддзі незалежнасці пры наяўнасці значных рэсурсаў, якія былі атрыманы дзякуючы спрыяльнай для афрыканскіх краін кан’юнктуры на сусветных рынках і вялікаму аб’ёму знешніх крэдытаў, на хвалі нацыянальнага ўздыму ў рэгіёне былі дасягнуты эканамічныя поспехі. Гэта, праўда, адносіцца да тых краін, дзе палітычная нестабільнасць не перарастала ў ваенныя канфлікты. ВУП у рэгіёне вырас у некальлі разоў. Знізілася да 1980 г. удзельная вага сельскай гаспадаркі ў ВУП з 41 да 20 % пры росце долі прамысловасці з 20 да 38 %, сферы паслуг - з 23 да 40%. Аднак не адбылося якасных змен у эканоміцы. Замест інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі назіралася яе дэградацыя і разбурэнне традыцыйных экасацыяльных сістэм, якія не замяняліся капіталістычнымі. У асноўным адбывалася экстэнсіўнае нарошчванне сыравіннага сельскагаспадарчага і прамысловага патэнцыялу, што сведчыла аб узмацненні сыравіннай арыентацыі афрыканскіх краін. У гэтых умовах крызісныя з’явы ў сусветнай эканоміцы ў сярэдзіне 70-х гг., пераход вядучых краін свету на рэсурсазберагаючыя тэхналогіі прывялі да падзення попыту на сыравіну. Негатыўна адбілася на эканоміцы афрыканскіх краін і вялікая знешняя запазычанасць. У сярэдзіне 70-х гг. сумарная запазычанасць краін “чорнай” Афрыкі склала 31,6 млрд. долараў, а ў сярэдзіне 80-х гг. яна дасягнула 150 млрд. Абслугоўванне такой вялікай знешняй запазычанасці лягло цяжкім грузам на эканоміку краін рэгіёна. Адмоўна на ход эканамічнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі паўплывала неспрыяльная кан’юнктура сусветнага рынку. Цана на сыравіну на ім у 70-я гг. зніжалася. Калі ў 1960 г. тона кавы па кошту раўнялася 30 тонам мінеральных угнаенняў, то у 1980 г. – толькі 16 т. У 1972 г., каб купіць грузавік, Танзанія павінна была прадаць 7 т. бавоўны, а ў 1980 – 28 т. Афрыканскія краіны так і засталіся аграрна-сыравіннымі прыдаткамі развітых краін. Доля ж апрацоўчай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

прамысловасці “чорнай” Афрыкі ў сусветнай вытворчасці зніжалася (1960 г. - 1%, 1980 г. – 0,97 %).

Запавольванне тэмпаў эканамічнага развіцця ў 70-я гг. стала прадвеснікам глыбокага структурнага крызісу, з якім сутыкнулася Трапічная і Паўднёвая Афрыка ў 80-я гг. Ён ахапіў перш за ўсё сельскую гаспадарку, якая заставалася асноўнай галіной у эканоміцы рэгіёна. Тут было занята каля 70 % насельніцтва. Сельская гаспадарка характарызавалася крайняй адсталасцю. Толькі 27 % гаспадарак з’яўляліся таварнымі. Прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў той час была ў 20-25 разоў ніжэй, чым у развітых краінах. Яна вызначалася монакультурнасцю. Як правіла, гэта былі тэхнічныя культуры, якія часта насаджалі ТНК насуперак нацыянальным інтарэсам афрыканскіх краін. Гэта адмоўна ўплывала на іх забяспечанасць харчаваннем. У 60-я гг. “чорная” Афрыка на 98% свае патрэбы у харчаванні задавальняла за кошт уласнай вытворчасці, а у 80-я гг. – толькі на 86%. Рост цяжкасцей з харчаваннем звязаны і з тым, што прырост сельскагаспадарчай вытворчасці прыкметна адставаў ад росту насельніцтва ( адпаведна 1,9% у сярэднім за год і 2,8 % ). 80-я гг. выдаліся засушлівымі, наступалі пустыні. У выніку сотні мільёнаў афрыканцаў сутыкнуліся з пагрозай голаду. Крызіс у сельскай гаспадарцы яшчэ больш пагаршаў становішча ў прамысловасці. Яе развіццё ў рэгіёне немагчыма без імпарту сродкаў вытворчасці. Сродкі на яго ажыццяўленне афрыканскія краіны могуць атрымаць толькі ад экспарту сыравіны. Але даходы ад гэтага экспарту ў 80-я гг. зніжаліся. У 1980 г. яны склалі 94 млрд. долараў, а ў 1984 – 61 млрд. Краіны Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі валодаюць велізарнымі сыравіннымі рэсурсамі, але з-за нераўнапраўнага становішча ў сусветнай сістэме гандлю гэта не стала важкім фактарам эканамічнага развіцця.

Цяжкае эканамічнае становішча Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі прымусіла ААН абвясціць 80-я гг. дзесяцігоддзем прамысловага развіцця Афрыкі і распрацаваць адпаведную праграму. Яна намячала ўзняць долю рэгіёна ў вытворчасці сусветнай апрацоўчай прамысловасці да 1,4%, але праграма была правалена. Свае праекты аздараўлення эканомікі прапанавалі афрыканскім краінам МВФ, Сусветны банк. Па іх рэкамендацыях палітыку “структурнага ўрэгулявання” ажыццяўлялі каля 30 краін. У адпаведнасці з імі праводзілася рэзкае скарачэнне выдаткаў на адукацыю, ахову здароўя, дзяржава адмовілася ад датацый на тавары першай неабходнасці і субсідый нацыянальным прадпрыемствам. Такая палітыка магла даць станоўчыя вынікі толькі праз пэўны час, а першапачаткова вяла да імклівага росту

цэн, скарачэння рэальных даходаў асноўнай масы насельніцтва, рэзкага росту беспрацоўя. Паколькі ўзровень жыцця насельніцтва ў гэтых краінах быў вельмі нізкі, запасу сацыяльнай трываласці для праўядзення рэформаў не было. Пачаліся масавыя выступленні пратэсту, і ўлады згарнулі палітыку “структурнага ўрэгулявання”. У цэлым, у 80-я гг. валавы прадукт краін “чорнай” Афрыкі зніжаўся на 1 % у год.

Падзенне вытворчасці пагаршала становішча ў сацыяльнай сферы. У 22 краінах Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ўзровень жыцця насельніцтва ў 80-я гг. быў ніжэйшы, чым у 60-я. У 1989 г. сярод 40 найбольш бедных краін свету, паводле ацэнкі ААН, 31 належала да “чорнай” Афрыкі. Нацыянальны даход на душу насельніцтва складаў у Эфіопіі 110 долараў, у Малі – 130, у Чадзе –90. На агульным фоне крызісу 80-х гг. вылучалася група дзяржаў, якія выглядалі больш паспяхова ў развіцці эканомікі. Да іх ліку можна аднесці Гану, якая мела сярэднегадавыя тэмпы прыросту ВУП 5% і ў якой назіраўся рэальны рост даходаў насельніцтва. У цэлым прагрэсіравала эканоміка Зімбабве, асабліва ў канцы 80-х гг. Тут поспех быў забяспечаны галоўным чынам наяўнасцю ў сельскай гаспадарцы фермерскіх гаспадарак еўрапейскіх перасяленцаў. Нядрэнных вынікаў за кошт экспарту нафты дабіліся Нігерыя, Габон, Конга. У той час вылучылася група дзяржаў, у якіх эканамічнае становішча было асабліва цяжкім: Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка, Заір, Чад, Ангола, Уганда, Мадагаскар, Эфіопія. Даследчыкі выдзяляюць цэлы комплекс прычын, якія абумовілі крызіс у 80-я гг. У гэтым рэгіёне не завяршыўся працэс фарміравання сялянства як класа дробных вытворцаў, адсутнічала ў неабходнай колькасці кваліфікаваная рабочая сіла, якая прывучана да працяглай прадукцыйнай мэтанакіраванай працы. Адмоўна ўплывалі на эканамічнае развіццё палітычныя фактары: аўтарытарызм, які вядзе да прыняцця некампетэнтных рашэнняў, мілітарызм, шматлікія войны. Эканоміку “чорнай” Афрыкі падрывала яе нераўнапраўнае становішча ў сістэме міжнароднага гандлю. У выніку гэтага яна страчвала ў 80-я гг. каля 6 млрд. долараў штогод. Крызіс 80-х гг. XX ст. азначаў канец канцэпцыі “даганяючага развіцця” з апорай на дзяржаву. Выхад з крызісу ляжаў на шляхах рэалізацыі праграм фінансавай стабілізацыі і структурнай перабудовы эканомікі. Гэтыя праграмы абавязвалі праводзіць курс на развіццё рынкавых адносін праз лібералізацыю эканомікі, стымуляванне экспартнай вытворчасці і адмову ад імпартазамяшчэння. Гэта новы падыход да мадэрнізацыі афрыканскага грамадства, які зыходзіць з глабалізацыі сусветных эканамічных працэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У 1991 г. ААН прыняла чарговую праграму эканамічнага развіцця Афрыкі. Яна была канкрэтызавана ў Каірскай праграме дзеянняў, якая была прынята Арганізацыяй Афрыканскага Аздінства ў 1995 г. Рашаючая роля ў выкананні гэтай праграмы адводзілася МВФ і Міжнароднаму Банку рэканструкцыі і развіцця. Структурная перабудова эканомікі прадугледжвала звядзенне да мінімуму ўмяшання дзяржавы ў эканоміку, змяншэнне бюджэтных выдаткаў і субсідый на сацыяльныя патрэбы, ажыццяўленне прыватызацыі, здымаліся абмежаванні на рух капіталаў. У цэлым быў узяты курс на адмову дзяржавы ад актыўнага ўдзелу ў эканамічным жыцці і зроблены ўпор на развіццё рынкавых адносін. Першапачаткова неаліберальныя рэформы прывялі да падзення ўзроўню жыцця, да згортвання вытворчасці ў шэрагу галін, якія не вытрымлівалі канкурэнцыі з экспартнымі таварамі ў выніку адкрыцця ўнутраных рынкаў. Зняцце абмежаванняў на перамяшчэнне капіталаў дазволіла ТНК вывозіць з краін рэгіёна дадатковыя прыбыткі. У 1996 г. у Гане, Заіры, Замбіі, Руандзе, Чадзе, Сенегале, Ліберыі узровень даходу на душу насельніцтва быў ніжэйшы, чым у 1960 г. І толькі ў другой палове 90-х гг. у эканоміцы пачаў назірацца прыкметны эканамічны рост. У 1997 г. у 15 краінах прырост ВУП склаў больш як 5%. Засталося толькі 3 краіны, якія мелі адмоўную дынаміку развіцця эканомікі.

4. Учарашнія калоніі, якія атрымалі незалежнасць, не мелі ніякага палітычнага вопыту. Адзінай традыцыйнай асновай грамадскіх сувязей былі абшчынна-кланавыя. Яны адыгралі вялікую ролю ў станаўленні афрыканскіх дзяржаў, але ўплыў гэты быў пераважна негатыўны. Апеляцыя да традыцый не столькі згуртоўвала жыхароў дзяржаў, колькі іх раз’ядноўвала. У гэтых краінах практычна поўнасцю адсутнічала аснова для парламенцкай дэмакратыі. Такой асновай з’яўляліся рынкава-прыватнаўласніцкія адносіны, грамадзянская супольнасць, прававая дзяржава, чаго не было ў Афрыцы. У палітычнай сістэме Афрыкі пануюць кланава-патранажныя ячэйкі. Калі палітык становіцца міністрам, то тут жа ўсе пасады ў гэтым міністэрстве займаюць яго родзічы, члены яго клана. Менавіта кланавасць прывяла да таго, што ў Афрыцы амаль няма манархій. Тут манарх прадстаўляе які-небудзь клан. Стаўшы на чале дзяржавы, ён адразу выклікаў бы выступленні супраць сябе іншых кланаў. Намнога больш прымальная фігура змяняемага прэзідэнта. Ён не столькі сімвалізуе дзяржаву, колькі фіксуе баланс палітычных сіл у пэўны момант. Калі баланс сіл мяняецца – мяняецца і кіраўнік.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Здавалася б, наяўнасць шматлікіх кланаў павінна весці да шматпартыйнай сістэмы. Але гэтага не назіраецца. Узнікалі, як правіла, партыі па этнічным прынцыпе, якія ператвараліся ў ваенна-палітычныя групоўкі і прэтэндавалі на ўсю паўнату ўлады. Гэта выклікала палітычную нестабільнасць у дзяржаве і, як правіла, завяршалася ваенным пераваротам і забаронай на партыйную дзейнасць. Практычна ва ўсіх афрыканскіх краінах побач з прэзідэнцкай уладай існуюць і парламенты. Але змест парламента тут зусім іншы, чым у Еўропе. У Афрыцы людзі звыкла ідуць за сваім этнасам і галасуюць за “сваіх”. Таму дэмакратычны плюралізм часта вёў да дэзінтэграцыі краіны па этнічнай прыкмеце. Гэта выклікала адмову ад шматпартыйнасці. Звычайна ўсталёўвалася аднапартыйная сістэма. Адзіная ў краіне кіруючая партыя абапіраецца пераважна на свой этнас. Іншай сацыяльнай апоры ў яе проста няма ў сувязі з адсталасцю сацыяльнай структуры. Апазіцыя, якая не мела магчымасці для легальнай дзейнасці, станавілася на шлях узброенай барацьбы, у якой абапіралася на свае плямёны. Як паказвае вопыт Афрыкі, крызіс аднапартыйнай улады праз большы або меншы час непазбежны. Тады апазіцыя прыходзіць да ўлады і ўстанаўліваецца шматпартыйная сістэма. Але ва ўмовах афрыканскіх краін яна не здольна на працяглае існаванне і часта завяршаецца ваенным пераваротам. Праўда, ёсць краіны, якія не зведалі ваенных пераваротаў: Кенія, Батствана. Бываюць выпадкі, калі ва ўладзе знаходзіцца аўтарытарны дзеяч, які здолее злучыць інтарэсы розных колаў насельніцтва краіны. Тады рэжым трымаецца працяглы час. Напрыклад, у Заіры з 1965 г. да 1997 г. на чале дзяржавы стаяў прэзідэнт Мабуту Сесе Секо. У афрыканскіх краінах практычна адзіны дзяржаўны інстытут, які будуецца не па этнічнай прыкмеце — гэта армія. Частыя крызісы ўлады прыводзяць да таго, што армія перыядычна выступае на пярэдні план і даволі лёгка бярэ ўладу ў свае рукі. Ваенныя перавароты маюць пэўнае пазітыўнае значэнне, таму што спрыяюць стабілізацыі ўлады пасля крызісу. Ваенныя, як правіла, праз некаторы час або прызначаюць выбары, на якіх, скінуўшы форму, балатуюцца, або перадаюць уладу цывільным.

Агульныя для афрыканскіх краін праявы нестабільнасці палітычнага жыцця знайшлі адлюстраванне і ў гісторыі самай вялікай па колькасці насельніцтва краіны “чорнай” Афрыкі Нігерыі. Адразу пасля заваявання незалежнасці краіна сутыкнулася з вострымі этнічнымі канфліктамі. У выніку сацыяльна-палітычнай нестабільнасці краіна ў сярэдзіне 1960-х гг. перажыла серыю ваенных пераваротаў. Яна ж прывяла і да пачатку сепаратысцкага мецяжу ў найбольш развітай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

правінцыі Біяфры, які прывёў да грамадзянскай вайны 1967 – 1970 гг. Пасля капітуляцыі мяцежнікаў да канца 70-х гг. XX ст. вядучую ролю ў палітычным жыцці Нігерыі адыгрывала армія. За гэты час змянілася некалькі ваенных дыктатараў. У 1983 г. улада была перададзена цывільнаму ўраду на чале з лідэрам перамогшай на выбарах Нацыянальнай партыі Ш.Шахары. Цывільнае праўленне азнаменавалася страшэнным разгулам карупцыі, што нараджала ўсеагульнае незадавальненне ў грамадстве. Тады на палітычную арэну зноў выйшла армія. З 1983 г. краіна зноў перажыла серыю ваенных пераваротаў. Толькі з 1998 г., калі прэзідэнтам стаў О.Абасаджо, пачалося ўсталяванне ў Нігерыі дэмакратычных парадкаў. Руху па шляху дэмакратыі па-ранейшаму істотна перашкаджаюць міжэтнічныя канфлікты. Вясной 2000 г. у шэрагу гарадоў Нігерыі адбыліся сутыкненні на гэтай глебе.

Пасля заваявання незалежнасці ў палітычным жыцці Афрыкі былі прадстаўлены вельмі разнастайныя па сваёй ідэалогіі палітычныя сілы. Яшчэ ў 30-я гг. XX ст. зарадзілася ідэалогія негрыцюда. Яе прыхільнікі лічылі, што заходні капіталізм непрымальны для Афрыкі, бо ён не сумяшчальны з традыцыямі афрыканскіх народаў. Прыхільнікі гэтай дактрыны ўказваюць, што ўнутры афрыканскага грамадства няма супярэчнасцей. Асноўнай супярэчнасцю эпохі з’яўляецца супярэчнасць паміж багатай Поўначу і бедным Поўднем. Каб супрацьстаяць Поўначы, трэба адзінства ўсіх негрыцянскіх народаў, якія павінны дамагчыся ліквідацыі няроўнасці ў сусветных эканамічных адносінах. У негрыцюдзе ёсць і элементы чорнага расізму. Ён падкрэслівае перавагу чорнай расы над іншымі, перш за ўсё над белай. З ідэі аб непрымальнасці для Афрыкі заходняга капіталізму лагічна вынікае ідэя аб самабытным афрыканскім сацыялізме. Яна атрымала распаўсюджанне ў “чорнай” Афрыцы ў канцы 50-х-пачатку 60-х гг. XX ст. Такія распрацоўшчыкі гэтай дактрыны, як Сенгор вызначалі наступныя рысы афрыканскага нацыянальнага сацыялізму: 1).Змешаная эканоміка з роўнымі ўмовамі для разнастайных форм уласнасці, планавасць вядзення гаспадаркі; 2).Спалучэнне каштоўнасцей індустрыяльнага грамадства з традыцыйнымі афрыканскімі каштоўнасцямі: родавая дэмакратыя, калектывізм, абшчына. 3).Захаванне традыцыйных вераванняў 4).Адмаўленне антаганізмаў і класавай барацьбы ў афрыканскім грамадстве. 5).Мірны рух да сацыялізму. Такая мадэль развіцця была абрана многімі краінамі Афрыкі. Лідэр Сенегала Сенгор абвясціў пабудову “мірнага” сацыялізму. У Замбіі пад кіраўніцтвам Кенеты Каунды будаваўся “гуманны” сацыялізм.



РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Свой нацыянальны сацыялізм будавалі таксама Гана, Гвінея, Танзанія і іншыя краіны.

У "чорнай" Афрыцы ўзніклі і партыі, ідэалогіяй якіх стаў марксізм-ленінізм. Яны заявілі аб намеры мінуючы капіталізм пабудаваць сацыялістычнае грамадства. Адным з найбольш яскравых прыкладаў будаўніцтва марксісцка-ленінскага сацыялізму ў рэгіёне з'яўляецца Эфіопія. Тут 12 верасня 1974 г. адбыўся дзяржаўны пераварот, у выніку якога ад улады быў адхілены імператар Хайле Селасіе. Вышэйшым органам улады стаў Часовы Ваенны Адміністрацыйны Савет (ЧВАС), які складаўся з рэвалюцыйна настроеных ваенных. У кастрычніку ЧВАС абнародаваў праграмны дакумент "Эфіопія перш за ўсё". У ім быў абвешчаны курс на будаўніцтва сацыялізму, а краіна стала называцца Сацыялістычнай Эфіопіяй. Часовы ўрад прыступіў да нацыяналізацыі асноўных сродкаў вытворчасці. Пачалося правядзенне радыкальнай аграрнай рэформы. Памешчыцкая зямля была канфіскавана без выкупу, але ў адпаведнасці з законам 1975 г. сяляне маглі атрымаць яе толькі пры ўмове ўступлення ў кааператыў. Да 1975 г. у кааператывы было аб'яднана каля 5 млн. сялян. У 1978-1979 гг. былі прыняты новыя дэкрэты аб арганізацыі сельскагаспадарчых кааператываў. 20 красавіка 1976 г. была прынята праграма нацыянальна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Яна прадугледжвала: 1).Стварэнне марксісцка-ленінскай партыі рабочага класа; 2).Каапераванне сельскай гаспадаркі. 3).Замацаванне за дзяржаўным сектарам пануючай ролі ў эканоміцы. 4).Бясплатную адукацыю і медыцыну. 5).Вырашэнне нацыянальнага пытання на аснове рэгіянальнай аўтаноміі. 6).Супрацоўніцтва з сацыялістычнымі краінамі і нацыянальна-вызваленчым рухам. Найважнейшым інструментам у пабудове сацыялізму павінна была стаць марксісцка-ленінская партыя. Работа па яе стварэнню завяршылася ў 1984 г., калі адбыўся 1-ы з'езд Партыі Працы Эфіопіі. Яе праграмныя дакументы прадугледжвалі пабудову сацыялізму ў Эфіопіі.

Эканамічная палітыка ўрада Менгісту Хайлі Марыяма аказалася неэфектыўнай. Прымусовае каапераванне, нізкія закупачныя цэны разам з неспрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі прывялі да глыбокага крызісу ў сельскай гаспадарцы. У прамысловасці палітыка нацыяналізацыі вяла да выцяснення дробнай вытворчасці, а пабудаваныя з дапамогаю сацыялістычных краін буйныя прадпрыемствы як правіла працавалі неэфектыўна. Вельмі вострай у Эфіопіі была нацыянальная праблема. Канстытуцыя 1987 г. намячала яе вырашэнне праз стварэнне на тэрыторыі Эфіопіі 30 правінцый па этнічным прынцыпе. Але

на практыцы цэнтральны ўрад трымаў курс на побудову унітарнай дзяржавы. Рэальная роўнасць этнічных груп не была дасягнута. Гэта парадзіла моцны сепаратысцкі рух у шэрагу правінцый: Эрытрэі, Тыграй, Агадэн. Эфіопію ахапіла грамадзянская вайна. 50-60% бюджэтных сродкаў урад накіроўваў на ваенныя выдаткі. У канцы 80-х гг. спынілася дапамога з боку СССР. У выніку рэжым Менгісту Хайле Марыяма быў пастаўлены ў крытычнае становішча. Апазіцыя ў 1989 г. аб'яднался ў Рэвалюцыйна-дэмакратычны фронт эфіопскіх народаў. У 1991 г. ён зверг Менгісту Хайле Марыяма. На гэтым завяршыўся сацыялістычны эксперымент у Эфіопіі. Ён прывёў краіну да грамадзянскай вайны, краху эканомікі, дэзінтэграцыі. Канстытуцыя 1991 г. дала права правінцыям на аддзяленне ад Эфіопіі. Ім у 1998 г. скарысталася Эрытрэя і стала незалежнай дзяржавай.

Па шляху сацыялізму ў розны час ішлі таксама Народна-Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Бенін, Ангола, Мазамбік, Мадагаскар, Самалі. Нават такія адыёзныя рэжымы, як Бакасо ў Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы і Аміна ва Угандзе, абвяшчалі аб будаўніцтве сацыялізму. Чаму гэтая сістэма аказалася такой прывабнай для афрыканскіх краін? Напэўна, перш за ўсё з-за спакусы хуткага вырашэння эканамічных праблем палітычнымі метадамі. Сацыялістычная мадэль аказалася блізкай афрыканскім краінам і таму, што яна ў многім аднаўляла ў некалькі мадыфікаваным выглядзе традыцыйныя структуры афрыканскага грамадства: неэканамічны прымус, запрыгоньванне асноўнага вытворцы - селяніна, татальны кантроль дзяржавы над размеркаваннем, абсалютызм дзяржавы. Адыграла сваю ролю надзея атрымаць вялікую дапамогу ад СССР. Аб'явіўшы аб будаўніцтве сацыялізму, гэтыя рэжымы не змаглі забяспечыць стварэнне эфектыўнай эканомікі. Яны трымаліся ў многім дзякуючы савецкай дапамозе. З сярэдзіны 80-х гг. яна пачала рэзка змяншацца. Менавіта неэфектыўная эканоміка ў першую чаргу прывяла да краху рэжымаў сацыялістычнай арыентацыі. У некаторых краінах гэта адбылося ў выніку ваенных пераваротаў, у другіх – у выніку кампрамісаў з палітычнымі праціўнікамі, у трэціх – праз паступовыя рэформы, у чацвёртых – у выніку змены знешнепалітычнай сітуацыі. У Афрыцы існуюць краіны, якія, па крайняй меры на словах, не адмаўляліся ад сацыялізму, але ў той жа час заахвочвалі прыватны сектар. Напрыклад, Зімбабве, у якой адзін з самых высокіх узроўняў жыцця ў "чорнай" Афрыцы. Прыкладна такую ж палітыку праводзяць улады Замбіі. Тыя краіны, якія не абвяшчалі сваёй мэтай сацыялізм, тым не менш часта лічылі для сябе непрымальнай заходнюю дэмакратыю. Яны будавалі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сваю палітычную сістэму на аснове афрыканскіх традыцыйных каштоўнасцей. Прыкладам такой краіны служыў Заір у час праўлення Мабуту Сесе Секо. Ён паклаў у аснову сваёй палітыкі “заірскі нацыяналізм”. У краіне праводзіліся мерапрыемствы пад лозунгам ”Заір – адна краіна, у Заіры – адна партыя, у партыі – адзін правадыр”. Мэце захавання традыцыйных заірскіх каштоўнасцей павінна была служыць палітыка па абмежаванні дзейнасці хрысціянскай царквы.

У 90-я гг. XX ст. пачаўся новы этап у палітычным развіцці краін “чорнай” Афрыкі. Асноўным яго зместам становіцца рух ад аўтарытарызму да дэмакратыі. Менавіта ў 90-я гг. дэмакратыя ператвараецца тут з тэорыі ў практыку. Такія дэмакратычныя працэдуры, як выбары на шматпартыйнай аснове, канстытуцыйная працэдура перадачы ўлады становяцца рэальнасцю. У 90-я гг. XX ст. шматпартыйнасць існавала ў 36 краінах Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі, аднапартыйнасць – у 7, а беспартыйная палітычная сістэма – у 3. Аднак дэмакратычная тэндэнцыя прабівае сабе шлях з вялікімі цяжкасцямі. У 90-я гг. зафіксавана 15 спроб сілавымі метадамі змяніць уладу. Для палітычнага жыцця афрыканскіх краін па-ранейшаму характэрны грамадзянскія войны і канфлікты. У 1989 г. пачалася грамадзянская вайна ў традыцыйна стабільнай Ліберыі. Яна цягнулася да 1993 г. і закончылася толькі дзякуючы актыўнаму ўмяшанню ААН і ўводу міжнародных сіл. У пачатку 90-х гг. адбылася поўная дзяржаўная дэзарганізацыя Самалі. Спробы ААН у 1992-1995 гг. з дапамогай міжнародных войскаў стабілізаваць сітуацыю закончыліся правалам. Сярэдзіна 90-х гг. азнаменавалася міжэтнічнай вайной паміж народнасцямі тутсі і хуту ў Бурундзі, ахвярамі якой сталі каля 1 млн. чалавек. Грамадзянская вайна, якая разгарнулася ў Заіры ў 1997 г., прывяла да звяржэння прэзідэнта Мобуту Сесе Секо пасля яго больш чым 30-гадовага праўлення. Новым прэзідэнтам стаў Кабіла, а краіна стала называцца Дэмакратычная Рэспубліка Конга. У тым жа годзе грамадзянская вайна разгарнулася у суседняй Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга. Тут законна абраны прэзідэнт Сасунгеса быў звергнуты Лесобай. Гэтая грамадзянская вайна канчаткова спыніла рух гэтай краіны па шляху сацыялізму. У 2000 г. нечакана была парушана стабільнасць у адной з найбольш эканамічна развітых краін рэгіёна – Зімбабве. Тут пры фактычнай згодзе ўрада пачаліся напады негрыцянскага насельніцтва на гаспадаркі белых фермераў. Такім чынам улады імкнуліся адцягнуць увагу насельніцтва ад нарастаўшых эканамічных цяжкасцей. У 2002 г. быў прыняты закон аб канфіскацыі зямель белых фермераў. У краіне ўста-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ляваўся аўтарытарны рэжым. Не знікла з палітычнага жыцця і такая з'ява як, ваенныя перавароты. Толькі Сьера-Леоне перажыла ў 90-я гг. іх некалькі. Прыведзеныя факты сведчаць, што тэндэнцыя да дэмакратызацыі яшчэ не стала дамінуючай у "чорнай" Афрыцы.

5. Асобнае месца сярод краін Паўднёвай і Трапічнай Афрыкі займае Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (ПАР). Гэта высокаразвітая капіталістычная краіна. Яе палітычнае развіццё доўгі час адбывалася ва ўмовах сістэмы апартэіду (апартхэіду), якая прадугледжвала абасобленае развіццё рас. Пры гэтым паміж імі ўсталёўвалася строгая іерархія. На пачатку 80-х гг. XX ст. у ПАР пражывала 5 млн. "белых", 4 млн. "каляровых" і 27 млн. "чорных". Усе правы і прывілеі былі ў руках "белых". Ім належала ўся паўната ўлады, усе эканамічныя рэсурсы. "Чорнае" насельніцтва было поўнасцю бяспраўным і сутыкалася са шматлікімі абмежаваннямі як у сацыяльна-эканамічным і палітычным, так і ў штодзённым жыцці. Праўда, узровень жыцця негрыцянскага насельніцтва ПАР быў значна больш высокі, чым у суседніх краінах. Афрыканскае насельніцтва актыўна выступала супраць рэжыму апартэіду. Гэтую барацьбу ўзначаліў Афрыканскі Нацыянальны Кангрэс (АНК) на чале з Н.Мандэлай. Да пачатку 90-х гг. XX ст. АНК, які абапіраўся на падтрымку суседніх афрыканскіх краін і вёў узброеную барацьбу супраць урада ПАР, але істотных поспехаў не дабіўся.

Палітычная сітуацыя ў ПАР пачала мяняцца з 1989 г., калі прэзідэнтам краіны быў абраны Ф. дэ Клерк. Ён узяў курс на пошук кампрамісу з афрыканцамі і паступовую ліквідацыю сістэмы апартэіду. Ужо ў 1990 г. былі зняты многія забароны для афрыканцаў у сферы штодзённага жыцця. Затым урад адмяніў Акт аб зямлі, які забараняў афрыканцам валодаць зямлёй на праве прыватнай уласнасці, і законы, у адпаведнасці з якімі ўсталёўвалася рассяленне па расавых групах. Тады ж была знята забарона на дзейнасць шэрагу палітычных партый, у тым ліку і АНК, прайшла палітычная амністыя. Пасля гэтага прэзідэнт дэ Клерк у 1991 г. пайшоў на правядзенне рэферэндуму, на якім большасць "белага" насельніцтва ПАР выказалася за прыняцце новай канстытуцыі, якая гарантавала б роўныя правы прадстаўнікам усіх расаў. Услед за рэферэндумам у Іаханесбургу адбыўся кангрэс прадстаўнікоў асноўных палітычных сіл ПАР, на якім быў намечаны шлях да поўнай ліквідацыі сістэмы апартэіду. У выніку перамоў паміж рознымі палітычнымі партыямі і групамі была выпрацавана новая дэмакратычная канстытуцыя ПАР. Яна ўступіла ў сілу 1 студзеня 1994 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Працэс ліквідацыі апартэіду працякаў у цэлым у мірным рэчышчы, але гэта не азначала, што ён быў лёгкі і беспраблемны. У апазіцыі да палітыкі дэ Клерка і ўзначальваемай ім Нацыяналістычнай партыі знаходзіліся ўплывовыя сярод “белага” насельніцтва Кансерватыўная партыя і Афрыканскі рух супраціўлення. Сярод афрыканцаў адбываліся крывавыя сутычкі паміж прыхільнікамі АНК і зулускай партыі “Інката”. Тым не менш, 27 красавіка 1994 г. у ПАР адбыліся першыя ў яе гісторыі ўсеагульныя нярасавыя дэмакратычныя выбары. На парламенцкіх выбарах перамогу атрымаў АНК, за які прагаласавала 62,65% выбаршчыкаў. Другое месца заняла Нацыяналістычная партыя (20,39%). Прэзідэнтам краіны быў абраны лідэр АНК Н.Мандэла. Новы прэзідэнт цэнтральным элементам сваёй палітыкі зрабіў усталяванне расавага міру і захаванне нацыянальнага адзінства. Пасля выбараў ён сфарміраваў урад нацыянальнай згоды, у які побач з прадстаўнікамі АНК увайшлі прадстаўнікі найбольш уплывовай сярод “белага” насельніцтва Нацыяналістычнай партыі. Н.Мандэла пакінуў за “белымі” не толькі шэраг міністэрскіх партфеляў, але і камандныя пасады ва ўзброеных сілах, паліцыі, кіраўніцтва Рэзервовым банкам.

Н.Мандэла абвясціў перад выбарамі шырокую сацыяльную праграму. Найважнейшай задачай дзяржавы была абвешчана абарона маламаёмных слаёў афрыканцаў. Пачала ажыццяўляцца шырокая праграма перакваліфікацыі і прафісійнай перападрыхтоўкі афрыканцаў. Была ўведзена 10-гадовая бясплатная адукацыя, бясплатная медыцынская дапамога для дзяцей ва ўзросце да 5 гадоў. Раней гэтымі сацыяльнымі дабротамі карысталіся толькі “белыя”. У эканамічнай сферы новыя ўлады вялікую ўвагу надавалі ўмацаванню дзяржаўнага сектару. Тым самым яны разлічвалі зменшыць узровень беспрацоўя сярод афрыканцаў. Нягледзячы на гэта, вядучую ролю ў эканоміцы працягваў адыгрываць прыватнакапіталістычны сектар. У новых умовах дзяржава актыўна стымулявала развіццё дробнага прадпрымальніцтва, разлічваючы ўцягнуць у гэты сектар вялікую колькасць афрыканцаў і часткова вырашыць праблемы занятасці і беднасці. Новыя элементы ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы дзяржавы выклікалі занепакоенасць і пэўны недавер з боку прадпрымальніцкіх колаў. Гэта прывяло да некаторага тармажэння ў развіцці эканомікі ў першай палове 90-х гг. ХХ ст.

Змены ў ПАР станоўча паўплывалі і на міжнародную сітуацыю на поўдні Афрыканскага кантыненту. Скончыўся шматгадовы канфлікт па-між ПАР і суседнімі, г.з. прыфрантавымі дзяржавамі. На іх граніцах адбываліся пастаянныя ўзброеныя сутычкі, варагаваўшыя бакі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падтрымлівалі ўзброеную апазіцыю на тэрыторыі суседзяў. Была ўрэгулявана намібійская праблема. У 1990 г. Намібія атрымала незалежнасць. З Анголы былі выведзены кубінскія войскі.

У пачатку 1999 г. у ПАР адбыліся другія ўсеагульныя выбары. Яны замацавалі курс краіны на пабудову дэмакратычнай дзяржаўна-палітычнай сістэмы. На парламенцкіх выбарах перамогу зноў атрымаў АНК, а прэзідэнтам быў абраны кандыдат ад гэтай партыі Тоба Мбека.

## ВЭ-1. САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ У ШЭРАГУ АРАБСКІХ КРАІН І ЯГО ВЫНІКІ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

− што да ліку краін сацыялістычнай арыентацыі ў арабскім свеце ў свой час адносіліся Егіпет, Сірыя, Ірак, Лівія, Алжыр, НДРЙ;

− спецыфіку арабскага нацыянальнага сацыялізму ў названых краінах;

− калі і як адбыўся пераход шэрагу арабскіх краін да сацыялістычнай мадэлі;

− найважнейшыя мерапрыемствы ў сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сферах у рамках будаўніцтва сацыялізму;

− калі тая ці іншая арабская краіна адмовілася ад сацыялістычнага выбару і да якіх перамен у жыцці грамадства гэта прывяло;

***умець:***

− параўнаць сацыялістычныя мадэлі ў розных арабскіх краінах;

− раскрыць прычыны крызісу і краху сацыялістычнага выбару ў арабскіх краінах;

− выявіць ролю арабскіх краін “сацыялістычнай арыентацыі” ў араба-ізраільскім канфлікце;

− ахарактарызаваць вынікі сацыялістычнага будаўніцтва ў арабскіх краінах;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-1:***

1.Ваенны пераварот 1952 г. і будаўніцтва нацыянальнага сацыялізму ў Егіпце.

2.Унутраная і знешняя палітыка Егіпта ў 1970 г. - пачатку XXI ст.

3.Баасісцкі сацыялізм у Сірыі і яго рэфармаванне з канца XX ст.

4.Ірак часоў сацыялістычнай арыентацыі і рэжыму С.Хусейна.

5.Асаблівасці сацыялізму ў Лівіі і Алжыры.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля ваеннага перавароту 1952 г. у Егіпце пачалося будаўніцтва спецыфічнага арабскага сацыялізму, але гэты шлях развіцця не забяспечыў вырашэнне сацыяльна-эканамічных праблем краіны і дасягненне перамогі ў войнах з Ізраілем.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.3. - С.161-171.

*У падручніку раскрыты прычыны ваеннага перавароту 1952 г., паказаны найважнейшыя мерапрыемствы, якія ажыццяўляліся ў рамках будаўніцтва "арабскага сацыялізму", іх адмоўныя вынікі для эканомікі, але недастаткова раскрыта яго спецыфіка і дыктарскі характар рэжыму А.Насэра.*

Кошелев В.С. Египет: уроки истории. - Мн., 1984. - С.127-155.

*Манаграфія ўтрымлівае важны матэрыял па ўзаемаадносінах "Свабодных афіцэраў" з рознымі палітычнымі сіламі, па "суэцкім крызісе". Аўтар выдзяляе 2 перыяды ў егіпецкай рэвалюцыі (1952-1960, 1960-1970 гг.).*

Новейшая история арабских стран Африки. 1917-1987. - М., 1990.

*У дадзенай абагульняючай працы дастаткова глыбока даследаваны прычыны перавароту 1952 г., асноўныя мерапрыемствы ўрада Г.А.Насэра ў рамках будаўніцтва сацыялізму, удзел Егіпта ў войнах з Ізраілем.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

− ахарактарызуйце прычыны і перадумовы ваеннага перавароту 1952 г.;

*Неабходна звярнуць увагу на дзейнасць арганізацыі "Свабодныя афіцэры", на наспяванне агульнанацыянальнага крызісу ў 1951-1952 гг.*

− прааналізуйце важнейшыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Егіпце ў 1952-1970 гг.;

*Да ліку найважнейшых пераўтварэнняў трэба аднесці аграрную рэформу, нацыяналізацыю галоўных галін эканомікі, кааперыраванне дробнай вытворчасці.*

− ахарактарызуйце асноўныя перамены ў дзяржаўна-палітычнай сістэме Егіпта ў час будаўніцтва сацыялізму;

*Выконваючы гэтае заданне, пачніце з усталявання рэспублікі, потым ахарактарызуйце змены ў партыйнай структуры, асноўныя палажэнні канстытуцыі 1964 г. і рэжым Г.А.Насэра як аўтарытарны.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Вы павінны зрабіць высновы адносна спецыфікі арабскага нацыянальнага сацыялізму ў Егіпце.*

− вызначце асноўныя кірункі знешняй палітыкі Егіпта ў гады праўлення Г.А.Насэра;

*Трэба зыходзіць з таго, што цэнтральнымі момантамі знешняй палітыкі Г.А.Насэра былі антыімперыялізм і імкненне знішчыць Ізраіль. Акцэнтуйце ўвагу на такіх падзеях, як нацыяналізацыя Суэцкага канала, удзел у Руху недалучэння, дружба з СССР, імкненне да аб'яднання арабскіх краін пад кіраўніцтвам Егіпта.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** нарастанне сацыяльна-эканамічных праблем і паражэнні ў войнах з Ізраілем прывялі пасля смерці Г.А.Насэра да карэнных змен ва ўнутранай і знешняй палітыцы Егіпта ў бок ліберальнай адкрытай эканомікі і арыентацыі на Захад пры захаванні ў цэлым аўтарытарнага палітычнага рэжыму.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.З. - С.170-174.

*У падручніку адзначаны як сацыяльна-эканамічныя, так і знешнепалітычныя прычыны адыходу Егіпта ад сацыялістычнага выбару, паказаны асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі прэзідэнтаў А.Садата і Х.Мубарака, рост ісламскага экстрэмізму, аўтарытарны характар палітычнага рэжыму.*

Кошелев В.С. Египет: уроки истории. - Мн., 1984. - С.156-184.

*Аўтар паказвае змены, якія ўнёс ва ўнутраную і знешнюю палітыку Егіпта А.Садат.*

Князев А.Г. Египет после Насэра. 1970-1981. - М., 1986.

*Названая манаграфія напісана на аснове тых жа метадалагічных падыходаў, што і папярэдняя. У ёй утрымліваецца багаты фактычны матэрыял па праблемах адыходу ад сацыялістычнага курса, стварэння сістэмы "накіроўваемай дэмакратыі", лібералізацыі эканомікі, замірэння з Ізраілем, росту ісламскага экстрэмізму.*

Новейшая история арабских стран Африки. - 1917-1988. - М., 1990.

*Манаграфія ў цэлым яшчэ напісана на аснове марксісцкай метадалогіі. Яна ўтрымлівае багаты фактычны матэрыял па егіпецкай гісторыі 70-80-х гг. XX ст.*

Шеин А. Рубежи ближневосточного урегулирования // Международная жизнь.-1996.-№1.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гусаров В.И. Ближневосточное урегулирование: проблемы и перспективы // Восток-1998.-№1.

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. - Т.2. – С.348-350.

*Гэты дапаможнік бедны на фактычны матэрыялам, але ў ім закладзена сучасная метадалагічная база для вывучэння дадзенай праблемы.*

Антонов А. Египет. Борьба с фундаментализмом продолжается // Азия и Африка сегодня. – 2004. - №10. – С.27-35.

Ислам, исламизм и экстремизм // Азия и Африка сегодня. – 2003. - №6. – С13-41 (подборка статей).

*Гэтыя артыкулы трэба выкарыстаць пры вывучэнні праблемы росту ўплыву ісламскага фундаменталізму ў Егіпце ў апошнія дзесяцігоддзі.*

Политическая система арабских стран: между авторитаризмом и демократией // Азия и Африка сегодня. – 2005. - №7. – С.15-21.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

− устанавіце прычыны, якія абумовілі адыход Егіпта ад сацыялістычнага курсу ў пачатку 70-х гг.;

*Звярніце ўвагу на нарастанне крызісных з'яў у сацыяльна-эканамічнай сферы, на тое, што велізарная дапамога СССР так і не прывяла да перамогі над Ізраілем.*

− прааналізуйце асноўныя палажэнні праграмы Арабскай сацыялістычнай арганізацыі Егіпта, якая складзена на аснове асабістых указанняў прэзідэнта А.Садата, і вызначце асноўныя кірункі яго ўнутранай палітыкі ў першы перыяд праўлення (да 1978г.):

"1.Захаванне прынцыпаў ліпеньскай рэвалюцыі і "аздараўленчай рэвалюцыі" 1971г.

2.Захаванне заваёў рабочых і сялян, найважнейшым з якіх з'яўляецца 50-працэнтнае прадстаўніцтва.

3.Развіццё дзяржаўнага сектару ў рамках стратэгічных галін прамысловасці.

4.Вернасць прынцыпу абмежавання зямельнай уласнасці.

5.Дзеянні ў імя аздараўлення рэвалюцыі 23 ліпеня 1952 г.

6.Захаванне асабістых свабод і дэмакратычных правоў кожнага грамадзяніна, калі ён прытрымліваецца мэтаў грамадства.

7.Супрацьдзеянне асабістай дыктатуры, цэнтрам сіл і ідэалагічнаму тэрору.

8.Палітычны "інфітах" у адносінах абодвух лагераў без якой-небудзь дыскрымінацыі.

9.Адпаведнасць эканамічнага "энфітаха" сацыялістычнай лініі.

10.Вернасць шарыяту.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

11.Вернасць арабізму.

12.Прыватны капітал мае права інвестыцый ва ўсіх галінах.

13.Правесці ў жыццё прынцып попыту і прапановы для рэгулявання ўзроўню цэн.

14.Арганізацыя сельскай гаспадаркі на аснове прыватнай уласнаці на зямлю і прыватных капіталаўкладанняў." (Князеў А.Г. Египет после Насэра. 1970-1981. - М., 1986. - С.109-110).

− вызначце, якія перамены ва ўнутранай палітыцы А.Садата адбыліся ў другі перыяд яго праўлення (1978-1981 гг.);

*Асноўным момантам тут з'яўляецца пераход ад сістэмы накіроўваемай дэмакратыі да адкрыта аўтарытарнай дыктатуры.*

− назавіце змены, якія ўнёс у сацыяльна-эканамічную палітыку Х.Мубарак;

*Падумайце, чаму сацыяльна-эканамічны курс Х.Мубарака характарызуюць у гістарыяграфіі як памяркоўны ў параўнанні з палітыкай А.Садата.*

− ахарактарызуйце палітычнае развіццё Егіпта ў час прэзідэнтства Х.Мубарака;

*Звярніце ўвагу на аўтарытарны характар палітычнага рэжыму і на нарастанне супрацьстаяння з ісламскім экстрэмізмам.*

- вызначце найважнейшыя кірункі знешняй палітыкі Егіпта ў 1970 г.-пачатку XXI ст.;

*Неабходна ўлічваць, што за гэты час знешняя палітыка Егіпта зведала істотныя перамены і ў ёй можна выдзеліць некалькі этапаў. Звярніце асноўную ўвагу на адносіны Егіпта з СССР, ЗША, Ізраілем, арабскім светам.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля серыі ваенных пераваротаў у 1960-я гг. у Сірыі замацавалася ва ўладзе партыя БААС, якая ажыццяўляла будаўніцтва арабскага сацыялізму, аднак у 90-я гг. пачаўся паступовы адыход ад сацыялістычнага шляху.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.3.

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. - Т.2. - С.355-356.

*Названыя дапаможнікі даюць магчымасць сфарміраваць уяўленне аб арабскім сацыялізме ў Сірыі як аўтарытарным з пануваннем дзяржаўнага сектару ў эканоміцы.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Гусаров В.И. Ближневосточное урегулирование: проблемы и перспективы // Восток. - 1998. - №2.

*Артыкул дазваляе зразумець пазіцыю Сірыі ў блізкаўсходнім канфлікце на сучасным этапе.*

Новейшая история арабских стран Азии. 1917-1986. - М.,1988.

*Прапанаваная манаграфія ўтрымлівае багаты фактычны матэрыял, але вывады і ацэнкі, якія яна змяшчае, грунтуюцца на класавым падыходзе і патрабуюць крытычнай ацэнкі.*

Политическая система арабских стран: между авторитаризмом и демократией // Азия и Африка сегодня. – 2005. - №7. – С.15-21.

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

− ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця Сірыі ад заканчэння другой сусветнай вайны да пачатку 60-х гг.;

*Звярніце ўвагу на барацьбу дэмакратычнай і аўтарытарнай тэндэнцый у палітычным жыцці Сірыі, на рэгулярнае ўмяшанне арміі ў палітыку.*

− вызначце асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі партыі БААС у пачатку 60 - пачатку 70-х гг.;

*Пачніце выкананне гэтага задання з вызначэння прычын прыходу да ўлады БААС і праграмных мэтаў гэтай партыі. Заўважце, што курс на будаўніцтва арабскага сацыялізму стаў адназначна дамінуючым толькі пасля ваеннага перавароту 1966 г.*

− ахарактарызуйце палітычны курс прэзідэнта Х.Асада ў пачатку 70 - сярэдзіне 80-х гг.;

*Зыходзьце з таго, што цэнтральным момантам гэтага курса было будаўніцтва арабскага сацыялізму. Зыходзячы з гэтага, характарызуйце эканамічную мадэль, палітычную сістэму. Не абыдзіце ўвагай і пытанні знешняй палітыкі: супрацоўніцтва з СССР, супрацьстаянне з Ізраілем.*

− прааналізуйце змены,якія адбыліся ва ўнутранай і знешняй палітыцы Сірыі ў канцы 80-х гг. ХХ ст.-пачатку ХХІ ст.

*Асноўныя праблемы, на якія трэба звярнуць увагу, - перагляд курсу на будаўніцтва арабскага сацыялізму, роля Сірыі ў блізкаўсходнім урэгуляванні.*

## Парадак вывучэння чацвертага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у выніку серыі ваенных пераваротаў канца 50-60-х гг. Ірак узяў курс на будаўніцтва арабскага сацыялізму. Але з прыходам да ўлады С.Хусейна ў аснову палітыкі Ірака былі пакладзены прынцыпы арабскага нацыяналізму, у краіне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўсталяваўся таталітарны рэжым, які развязаў шэраг войнаў, трапіў у міжнародную ізаляцыю і быў звергнуты кааліцыяй на чале з ЗША ў 2003г.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Сафрончик А. Дипломатическая история “бури в пустыне” // Международная жизнь. - 1996. - №10.

*У артыкуле аўтар пераканаўча даказвае, што менавіта нежаданне Ірака выканаць патрабаванні ААН прывяло да вайны ў Заліве. Дэталёва разгледжана дыпламатычная дзейнасць ЗША, СССР, Ірака і іншых краін у час канфлікту.*

Мишанин А. Ирано-иракская война // Международная жизнь. – 1987. - №3,6,9.

Ниязматов Ш.А. Ирано-иракский конфликт. - М., 1989.

*Дадзеныя артыкул і манаграфія даюць магчымасць дэталёва разгледзець прычыны ірана-іракскай вайны, яе ход, уплыў на сітуацыю ў свеце і ўнутры Ірака.*

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.3. - С.50-66.

*У падручніку дастаткова дэталёва раскрыты ход палітычнай барацьбы ў Іраку пасля 1945 г., але акцэнт робіцца выключна на яе сацыяльна-палітычныя прычыны і выключаны асабісты фактар. Ахарактарызавана палітыка БААС, сутнасць рэжыму С.Хусейна. Не абгрунтавана сцвярджэнне, што ён, пасля прыходу да ўлады, разарваў адносіны з СССР.*

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. - Т.2. - С.357-359.

*Аўтар дапаможніка грунтоўна прааналізаваў сутнасць “баасісцкага сацыялізму”, змены ў жыцці краіны з устанаўленнем дыктатуры С.Хусейна. Але дапаможнік утрымлівае недастаткова фактычнага матэрыялу.*

**Выканайце наступныя вучэбныя заданні:**

− устанавіце прычыны, характар і вынікі рэвалюцыі 14 ліпеня 1958 г. у Іраку;

*Перш за ўсё высветліце сутнасць палітыкі іракскага ўрада напярэдадні рэвалюцыі. Гэта дапаможа больш глыбока і абгрунтавана даць яе характарыстыку.*

− вызначце, чым была абумоўлена серыя ваенных пераваротаў у Іраку ў 60-я гг. ХХ ст., якія палітычныя сілы ў выніку іх замацаваліся на чале ўлады;

*Звярніце ўвагу на тое, што на ход палітычнай барацьбы моцна ўплываў асабовы фактар, тое, што яна ішла ўнутры адной партыі;*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

− ахарактарызуйце палітыку партыі БААС у 1968-1979 гг.;

*Зыходзьце з таго, што палітыка БААС была накіравана на пабудову ў Іраку арабскага нацыянальнага сацыялізму. У адпаведнасці з гэтым вызначаліся найбольш важныя мерапрыем-ствы ўнутранай і знешняй палітыкі.*

− вызначце, якія перамены ва ўнутрапалітычнае і эканамічнае развіццё Ірака ўнёс С.Хусейн;

*Найважнейшым момантам, на які трэба звярнуць увагу, з'яўляецца тое, што адбываецца адыход ад сацыялістычных лозунгаў, і на першы план выходзяць ідэі арабскага нацыяналізму, а дзяржаўна-палітычная сістэма імкліва эвалюцыяніруе ў бок таталітарызму.*

− вызначце прычыны і прасачыце ход ірана-іракскай вайны;

*Пры вызначэнні прычын вайны вы павінны зрабіць акцэнт на ролю іракскага кіраўніцтва ў яе развязванні;*

- ахарактарызуйце яе ўплыў на ўнутранае становішча Ірака;

− устанавіце, чым была выклікана вайна ў Персідскім заліве ў 1990-1991 гг. і якія наступствы яна мела для Ірака;

*Вы павінны вызначыць, што падштурхнула С.Хусейна да акупацыі Кувейта, як рэагавала на гэта міжнародная супольнасць. Падумайце, чаму ва ўмовах ваеннага паражэння С.Хусейн змог захаваць уладу.*

На падставе прыведзенага дакумента ахарактарызуйце пазіцыю іракскага кіраўніцтва ў час кувейцкага крызісу.

З заявы віцэпрэм'ер-міністра Ірака Т.Азіса ў час перамоў у Маскве 5 верасня 1990 г.:

"−Усе ў Іраку лічылі і лічаць Кувейт складовай часткай іракскай тэрыторыі, а ад гэтага факту нікуды не адысці...;

−акцыя супраць Кувейта была ажыццёўлена таму, што ЗША і некаторыя арабскія краіны зрабілі сур'ёзную стаўку на крушэнне Ірака;

−ні кіраўніцтва, ні народ Ірака не баяцца канфрантацыі з ЗША... Калі яны адважацца на нешта падобнае (на вайну - М.Мязга), то ў выніку атрымаюць доўгі і вельмі горкі для сябе канфлікт, які можа перавярнуць усё з ног на галаву ў гэтым раёне зямнога шара;<…>

−мы засмучаны тым, як савецкае кіраўніцтва рэагавала на падзеі ў зоне Персідскага заліва...

Іракскія пазіцыі ўмацаваліся б, калі б СССР падтрымаў ініцыятыву Садама Хусейна ад 12 жніўня (фактычна - анексію Іракам Кувейта - М.Мязга)." (Белоногов А. МИД. Кремль. Кувейтский кризис. - М., 2001. - С.126-127).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Гэтая пазіцыя Ірака засталася нязменнай да ваеннага паражэння.*

− ахарактарызуйце асноўныя кірункі знешняй і ўнутранай палітыкі С.Хусейна пасля 1991 г., вызначце, як, калі і чаму адбылося падзенне яго рэжыму;

*Звярніце ўвагу, што створаная С.Хусейнам таталітарная сістэма аказалася даволі трывалай, нягледзячы на міжнародныя санкцыі і ізаляцыю. Толькі знешняе ўмяшанне прывяло да звяржэння С.Хусейна.*

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** Алжыр і Лівія з 60-х гг. XX ст. ажыццяўлялі будаўніцтва арабскага нацыянальнага сацыялізму. У сярэдзіне 80-х гг. выявілася тупіковасць гэтай канцэпцыі развіцця, у выніку чаго Алжыр сутыкнуўся з глыбокім грамадска-палітычным крызісам, які не пераадолены да нашых дзён, а лідэр Лівіі М.Кадафі вымушаны быў пачаць "зялёную перабудову".

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.3. -С.187-208.

*У падручніку дэталёва разгледжаны асноўныя аспекты гісторыі Алжыра і Лівіі, але аўтары не змаглі пераадолець стэрэатыпы савецкай гістарыяграфіі адносна дэмакратычнасці любога рэжыму "сацыялістычнай арыентацыі".*

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. - Т.2. - С.341-343, 345-347.

*Аўтар дае найбольш адпаведныя сучаснаму стану гісторыяграфіі ацэнкі палітычных рэжымаў, тэндэнцый развіцця Лівіі і Алжыра.*

Новейшая история арабских стран Африки. 1917-1987. - М., 1990.

*Работа багатая на фактычны матэрыял, але ацэнкі ў ёй яшчэ заснаваны на марксісцкім класавым падыходзе.*

Малашенко А.В. О Ливии и не только о ней // Народы Азии и Африки. – 1990 - №3.

*Аўтар характарызуе асаблівасць палітычнага курса Лівіі на аснове спалучэння ісламу, сацыялізму, прамой дэмакратыі і аўтарытарызму Кадафі.*

Малышева Д. Алжирский конфликт // Мировая экономика и международные отношения. - 1996. - №10.

Буджерда Р. Фронт ненависти//Азия и Африка сегодня. - 1995.-№1.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*На падставе гэтых двух артыкулаў сфарміруйце ўяўленне аб становішчы Алжыра ва ўмовах фактычнай грамадзянскай вайны.*

История Алжира в новое и новейшее время. - М., 1992.

*У гэтым выданні ўжо пераадолены марксісцка-ленінскі падыход, што дазволіла дастаткова шматбакова даследаваць найважнейшыя праблемы гісторыі Алжыра пасля другой сусветнай вайны.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

− прасачыце, як адбывалася фарміраванне прычын і перадумоў Лівійскай рэвалюцыі 1969 г.;

*Для гэтага прааналізуйце палітыку манархіі і асноўныя праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця Лівіі пасля заваявання незалежнасці.*

− прааналізуйце асноўныя палажэнні “Трэцяй сусветнай тэорыі” Кадафі і ход будаўніцтва “грамадства народных мас” у 70-я-80-я гг. XX ст.;

*Звярніце ўвагу на дзяржаўны характар эканомікі, сістэму джамахірыі, падтрымку экстрэмізму, на спалучэнне ісламу і ідэй сацыялізму.*

− вызначце новыя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Лівіі ў 90-я гг. XX - пачатку XXI ст.;

*Зыходзьце з таго, што Кадафі вымушаны быў пачаць пэўную лібералізацыю ў эканоміцы і пайсці на супрацоўніцтва з міжнароднай супольнасцю ў супрацьдзеянні тэрарызму.*

− ахарактарызуйце асаблівасці заваявання незалежнасці Алжырам;

*Вы павінны паказаць спецыфіку гэтай французскай калоніі, у якой было шмат белых пасяленцаў.*

− абапіраючыся на тэкст наступнага дакумента, вызначце, які курс развіцця выбраў Алжыр пасля заваявання незалежнасці;

Канстытуцыя Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі. 10 верасня 1963 г.

“<…>Артыкул 10.

Асноўнымі мэтамі Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі з’яўляюцца:

забеспячэнне нацыянальнай незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці і нацыянальнага адзінства;

ажыццяўленне ўлады народам, авангардам якога з’яўляюцца феласі, працоўная і рэвалюцыйная інтэлігенцыя;

пабудова сацыялістычнай дэмакратыі, барацьба супраць эксплуатацыі чалавека ў любой форме;

гарантыя права на працу і бясплатную адукацыю;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ліквідацыя ўсякіх рэшткаў каланіялізму;<…>

мір ва ўсім свеце;

абарона свабоды і павага да годнасці чалавечай асобы...” (Хрестоматия по новейшей истории.1945-1974. - М., 1976 - Ч.2. - С.219-220.)

− ахарактарызуйце палітычную сістэму і найважнейшыя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Алжыра ў сярэдзіне 60-х - сярэдзіне 80-х гг.;

*Заўважце, што палітычная сістэма краіны ў гэты час пастаянна змянялася, але Алжыр заставаўся ў рамках сацыялістычнага выбару і аднапартыйнай аўтарытарнай сістэмы. Гэта абумоўлівала і спецыфіку сацыяльна-эканамічнага развіцця.*

− вызначце прычыны і формы праяўлення грамадскага крызісу ў Алжыры ў канцы 80-х - пачатку 90-х гг. XX ст.;

*Вы павінны разгледзець цэлы комплекс як унутраных, так і знешніх прычын, якія прывялі да крызісу сацыялістычнай арыентацыі ў Алжыры. Яе альтэрнатывай стала ісламізацыя краіны, супраць чаго выступіла армія.*

− прасачыце ход барацьбы з ісламскім фундаменталізмам і рынкавых рэформаў у Алжыры ў 1992 г.-пачатку XXI ст.;

*Зыходзьце з таго, што пасля перавароту 1992 г. у Алжыры фактычна пачалася грамадзянская вайна з ісламскімі фундаменталістамі, а выйсце з эканамічнага крызісу ўлады бачылі ў правядзенні рынкавых рэформаў.*

**Самакантроль па ВЭ-1.**

1.Назавіце арабскія дзяржавы, якія на пэўных этапах свайго развіцця належалі да ліку краін “сацыялістычнай арыентацыі”;

2.Якія мэты мелі ўдзельнікі ліпеньскай рэвалюцыі 1952 г. у Егіпце?

3.У чым сутнасць канцэпцыі арабскага нацыянальнага сацыялізму Г.А.Насэра?

4.Чым характарызавалася палітычная сістэма Егіпта ў час прэзідэнтства Г.А.Насэра?

*Звярніце ўвагу на партыйную сістэму, паўнамоцтвы прэзідэнта.*

5.Якія найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы былі праведзены рэжымам Насэра?

6.Якія змены ва ўнутраную і знешнюю палітыку Егіпта ўнёс прэзідэнт А.Садат?

*Падумайце і над прычынамі гэтых перамен.*

7.Назавіце найважнейшыя этапы і моманты развіцця палітычнай сістэмы Егіпта ў 1970-1981 гг.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

8.Якія найважнейшыя рысы характэрны для ўнутранай і знешняй палітыкі прэзідэнта Х.Мубарака?

9.У выніку якіх падзей Сірыя стала на шлях будаўніцтва арабскага нацыянальнага сацыялізму?

10.Назавіце адметныя рысы палітычнага рэжыму Сірыі ў канцы 60-х гг. XX ст.-пачатку XXI ст.

11.Якімі найважнейшымі рысамі характарызавалася сацыяльна-эканамічнае развіццё Сірыі ў 60-я-80-я гг. XX ст.?

*Помніце, што Сірыя будавала ў тоў час арабскі сацыялізм.*

12.Якія змены ў сацыяльна-эканамічную палітыку Сірыі былі ўнесены ў канцы 80-х гг. XX ст.-пачатку XXI ст.?

13.Які характар мела іракская рэвалюцыя 1958 г.?

14.Назавіце асноўныя моманты ўнутранай і знешняй палітыкі Ірака ў 60-я-70-я гг. XX ст.

15.Якія найважнейшыя прынцыпы ўнутранай і знешняй палітыкі рэжыму С.Хусейна?

16.Якія вынікі для Ірака мела ірана-іракская вайна 1980 - 1988 гг.?

*Маюцца на ўвазе як чыста ваенныя вынікі, так і эканамічныя, унутры- і міжнароднапалітычныя.*

17.Чым была выклікана вайна ў Заліве 1990-1991 гг. і якія наступствы яна мела для Ірака?

*Звярніце ўвагу, што ўнутры краіны апазіцыя так і не здолела ператварыцца ў моцную палітычную сілу.*

18.У чым сутнасць канцэпцыі “народнай рэвалюцыі” М.Кадафі;

19.Што ўяўляе з сябе палітычная сістэма Джамахірыі?

20.Якія змены ў палітычным і эканамічным жыцці Лівіі адбыліся ў 90-я гг. XX ст.-пачатку XXI ст.?

21.Чым была абумоўлена працягласць і жорсткасць вайны Алжыра за незалежнасць?

22.Які шлях развіцця абраў Алжыр пасля заваявання незалежнасці, якія найважнейшыя пераўтварэнні былі праведзены ў яго рамках?

23.Чым быў абумоўлены грамадска-палітычны крызіс, які ахапіў Алжыр у канцы 80-х гг. XX ст.?

24.Чым характарызавалася палітычнае жыццё Алжыра ў 90-я гг. XX ст.-пачатку XXI ст.?

25.Якія змены ў эканамічнай палітыцы Алжыра адбыліся ў гэты ж час?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ВЭ-2. САУДАЎСКАЯ АРАВІЯ І МАРОКА ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- сутнасць тэакратычнай манархіі ў Саудаўскай Аравіі і канстытуцыйнай манархіі ў Марока;
- характар палітычных крызісаў у Саўдаўскай Аравіі ў першай палове 60-х і сярэдзіне 70-х гг. XX ст.;
- змест рэформаў, якія пачаліся ў Саудаўская Аравіі ў канцы 1970-х гг.;
- адметныя рысы эканамічнага развіцця Саудаўскай Аравіі;
- калі і як Марока атрымала незалежнасць;
- характар палітычных крызісаў пачатку 60-х і пачатку 70-х гг. у Марока;
- змест рэформаў 70-х гг. у Марока;
- эвалюцыю дзяржаўна-палітычнай сістэмы Марока;
- асноўныя праблемы эканамічнага і сацыяльнага развіцця Марока;
- найважнейшыя кірунκі знешняй палітыкі Марока і Саудаўскай Аравіі;

***умець:***

- даць параўнальную характарыстыку манархічным рэжымам Саудаўскай Аравіі і Марока;
- вызначыць найважнейшыя этапы ў гісторыі Саудаўскай Аравіі і Марока пасля другой сусветнай вайны;
- паказаць спецыфіку мадэрнізацыі ў Саудаўскай Аравіі і Марока;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-2:***

1.Феадальна-тэакратычны рэжым і запаволеннасць сацыяльна-эканамічнага развіцця Саудаўскай Аравіі ў 1945-1975 гг.

2.Мадэрнізацыя Саудаўскай Аравіі ў канцы 70-х гг. XX ст. – пачатку XXI ст.

3.Заваяванне незалежнасці і станаўленне мараканскай дзяржаўнасці (да сярэдзіны 70-х гг. XX ст.).

4.Стабілізацыя палітычнай сітуацыі і сацыяльна-эканамічнае развіццё Марока ў сярэдзіне 1970-х гг. – пачатку XXI ст.

## Парадак вывучэння першага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** да сярэдзіны 70-х гг. у Саудаўскай Аравіі захоўваўся тэакратычны рэжым, які садзейнічаў кансервацыі сацыяльна-эканамічных адносін і прывёў краіну да двух



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

глыбокіх грамадска-палітычных крызісаў у пачатку 60-х і сярэдзіне 70-х гг.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.3. - С. 89-103.

*У гэтым дапаможніку паказана вострая ўнутрыпалітычная барацьба ў Саудаўскай Аравіі, якая падаецца як барацьба ўнутры каралеўскага дому, адзначана крайняя сацыяльна-эканамічная адсталасць краіны ў 40-я – 60-я гг. Але аўтары не акцэнтавалі ўвагу на саудаўскай манархіі як тэакратычнай, на крызісах пачатку 60-х і сярэдзіне 70-х гг.*

Новейшая история арабских стран Азии. 1917-1985. - М., 1988.

*Манаграфія ўтрымлівае багаты фактычны матэрыял, але аналіз яго зроблены на аснове класавага падыходу, што не дазваляе раскрыць заканамернасці развіцця Саудаўскай Аравіі.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця Саудаўскай Аравіі ў другой палове 40-х – пачатку 70-х гг.;

*Неабходна зыходзіць з тэзісу аб захаванні ў Саудаўскай Аравіі практычна не закранутага мадэрнізацыяй традыцыйнага грамадства са шматлікімі элементамі рода-племянных адносін. Нафтавая галіна з'яўлялася ў многім чужародным элементам у рамках аграрнай саудаўскай эканомікі.*

- прааналізуйце сутнасць унутрыпалітычнага крызісу пачатку 1960-х гг. і ўстанавіце яго наступствы;

*Звярніце ўвагу на палітыку правячай дынастыі і на разыходжанні ўнутры яе. У выніку крызісу доступ да ўлады атрымалі прыхільнікі мадэрнізацыі краіны, што і абумовіла правядзенне шэрагу рэформаў.*

- ахарактарызуйце палітычны крызіс сярэдзіны 1970-х гг.;

*Пры выкананні гэтага задання ў цэнтры вывучэння павіна быць барацьба прыхільнікаў мадэрнізацыі і цвёрдых традыцыяналістаў, якая і выклікала крызіс сярэдзіны 1970-х гг.*

- вызначце адметныя рысы саудаўскай манархіі як тэакратычнай;

*Для гэтага ўстанавіце сувязь паміж свецкай і духоўнай уладай у Саудаўскай Аравіі, ролю духавенства (улемаў) у палітычным жыцці краіны.*

### Парадак вывучэння другога пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля палітычнага крызісу 1975 г. у Саудаўскай Аравіі пачаліся абмежаваныя рэформы, якія закранулі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

галоўным чынам эканамічную сферу. Матэрыяльнай базай для іх стаў прыток у краіну нафтадолараў, а вынікам – стварэнне сучаснай вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы і забеспячэнне высокага ўзроўню жыцця насельніцтва.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С. 94-103.

*У падручніку паказаны працэс мадэрнізацыі Саудаўскай Аравіі з сярэдзіны 1970-х гг. і палітычная барацьба па гэтай праблеме.*

Егошкин А. Томарин Л. Саудовская Аравия // Международная жизнь. – 1985. - №12.

*Артыкул утрымлівае агульныя звесткі аб эканамічным развіцці і дзяржаўна-палітычнай сістэме Саудаўскай Аравіі.*

Яковлева А. Аравийские монархии на пороге эпохи глобализации // Мировая экономика и международные отношения. – 2002. - №5.

Яковлева А. Саудовская Аравия: достижения и противоречия реформ // Там же. – 2001. - №1.

*Аўтар артыкулаў зрабіла аналіз вынікаў мадэрнізацыі аравійскай манархіі да пачатку XXI ст., паказала нарастаючае супрацiўленне ёй з боку традыцыяналісцкіх сіл, якія выступаюць пад сцягам артадаксальнага ісламу.*

Васильев Л.С. История Востока. – М., 2001. - Т.2. - С.362-363.

*У дапаможніку названы найважнейшыя дасягненні мадэрнізацыі Саудаўскай Аравіі і адзначаны супярэчлівы характар гэтага працэсу.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прасачыце, якія перамены ў нафтаздабываючай галіне Саудаўскай Аравіі адбыліся ў 70-я – 80-я гг. XX ст.;

*Вы павінны адзначыць наступныя моманты: рост цэн на нафту і павелічэнне нафтаздабычы; усталяванне дзяржаўнага кантролю над нафтавай галіной.*

- ахарактарызуйце развіццё іншых галін эканомікі Саудаўскай Аравіі ў канцы 70-х гг. XX ст. – пачатку XXI ст.;

*Звярніце ўвагу на тое, што рэзкае павелічэнне даходаў ад продажу нафты дало магчымасць Саудаўскай Аравіі стварыць сучасныя галіны прамысловасці, транспарту, шэраг высокаэфектыўных прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы.*

- вызначце, якія вынікі мела мадэрнізацыя ў сацыяльнай сферы;

*Неабходна адзначыць супярэчлівасць вынікаў мадэрнізацыі ў сацыяльнай сферы. З аднаго боку - дасягненне высокага ўзроўню*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*жыцця, стварэнне сучасных сістэм адукацыі, аховы здароўя, а з другога – вельмі павольныя змены ў сацыяльнай структуры грамадства, захаванне большасцю насельніцтва традыцыйнага ладу жыцця.*

- прааналізуйце ход палітычнай барацьбы ў Саудаўскай Аравіі ў рамках працэсу мадэрнізацыі ў другой палове 1970-х гг.–пачатку XXI ст.;

*Вы павінны зыходзіць з таго, што працэс мадэрнізацыі адбываўся ў грамадстве, у якім пануюць традыцыяналісцкія настроі, надзвычай моцныя пазіцыі ісламу, улада калежыць тэакратычнай манархіі.*

**Парадак вывучэння трэцяга пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** другая сусветная вайна паскорыла фарміраванне перадумоў уздыму нацыянальна-вызваленчага руху і заваявання незалежнасці Марока, але пасля гэтага краіна перажывала працяглы працэс станаўлення сваёй дзяржаўнасці, які суправаджаўся вострымі палітычнымі крызісамі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.3. - С.215-219.

*У падручніку дастаткова дэталёва прасочаны працэс заваявання Марока незалежнасці, але толькі бегла абазначаны многія праблемы палітычнага жыцця, у прыватнасці, крызіс пачатку 1970-х гг., палітычная нестабільнасць.*

Новейшая история арабских стран Африки. 1917-1987. - М., 1990.

*Манаграфія ўтрымлівае багаты фактычны матэрыял, але напісана яшчэ ў цэлым на марксісцкай метадалогіі, што прывяло да аднабаковага аналізу падзей і аднабаковых вывадаў, у аснове якіх класавы падыход.*

***Вызначце наступныя вучэбныя заданні:***

− вызначце прычыны і перадумовы нацыянальнай рэвалюцыі ў Марока;

*Улічыце пры гэтым, як другая сусветная вайна паўплывала на становішча Францыі ў свеце, на свядомасць каланіяльнага насельніцтва, якія выклікала перамены ў сацыяльна-эканамічнай сферы.*

− прасачыце працэс заваявання незалежнасці Марока;

*Звярніце ўвагу на тое, што незалежнасць была заваявана пераважна мірнымі сродкамі, і важную ролю ў гэтым адыграла наяўнасць, хай сабе і фармальнай, улады султана Марока.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

− ахарактарызуйце палітычнае развіццё Марока ў 1956-пачатку 1970-х гг.;

*У якасці найважнейшых элементаў палітычнага жыцця адзначце крокі па ўмацаванні суверэнітэту краіны, імкненне караля да пашырэння прэрагатываў сваёй улады, палітычную нестабільнасць.*

− вызначце найважнейшыя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця Марока ў 1956-пачатку 1970-х гг.;

*Звярніце ўвагу, што пры вызначэнні эканамічнай палітыкі ўрад Марока вагаўся перад неабходнасцю прыцягнуць замежны капітал у эканоміку краіны і імкненнем умацаваць яе эканамічную самастойнасць.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** з сярэдзіны 1970-х гг. палітычная сітуацыя ў Марока стабілізавалася ў рамках канстытуцыйнай манархіі і шматпартыйнасці, што станоўча паўплывала і на эканамічнае развіццё краіны.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. - М., 2001. - Ч.2. - С.219-220.

*Падручнік дазваляе пазнаёміцца з асноўнымі кірункамі ўнутранай і знешняй палітыкі Марока ў 70-я гг. XX ст.-пачатку XXI ст., але слаба раскрыты ход палітычнай барацьбы, вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця.*

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. – Т.2. - С.343-344.

*У дапаможніку адзначаны такія найважнейшыя моманты гісторыі Марока, як развіццё сістэмы парламенцкай манархіі, адметныя рысы эканамічнай мадэлі. У той жа час не паказана сутнасць рэформаў 70-х-80-х гг.*

Новейшая история Арабских стран Африки. 1917-1987. – М., 1990.

*Гэтае выданне багатае на фактычны матэрыял, асабліва дэталёва ў ім раскрыты пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця Марока. Але аўтары яшчэ не вызваліліся поўнасцю з-пад уплыву класавага падыходу, што робіць шэраг вывадаў і ацэнак аднабокімі.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце асноўныя палажэнні канстытуцыі Марока, якая была прынята ў 1972 г.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Перш за ўсё трэба вызначыць ролю канстытуцыі 1972 г. у справе ўмацавання парламенцкай манархіі і развіцця шматпартыйнасці.*

- вызначце найважнейшыя рысы палітычнага развіцця Марока ў 1972 г. – пачатку XXI ст.;

*Пры выкананні гэтага задання звярніце ўвагу на ўзаемаадносіны караля і парламента, на функцыянаванне шматпартыйнай сістэмы, на тое, што ісламскі фундаменталізм у Марока так і не ператварыўся ва ўплывовую палітычную сілу і ў краіне захоўвалася палітычная стабільнасць.*

- прааналізуйце сацыяльна-эканамічную палітыку Марока ў час праўлення Хасана II і Мухамеда VI;

*Неабходна адзначыць імкненне ўладаў Марока спалучаць палітыку "мараканізацыі" з прыцягненнем замежнага капіталу і прыярытэтам рынкавых адносін, вызначце найважнейшыя галіны эканомікі Марока, яе дасягненні і праблемы.*

- назавіце найважнейшыя рысы і кірункі знешняй палітыкі Марока пасля завяявання незалежнасці;

*Выконваць гэтае заданне пачніце з вывучэння крокаў Марока па ўмацаванню суверэнітэту ў 60-я гг. Затым звярніце ўвагу на дамінаванне празаходняй арыентацыі, на адносіны з арабскімі і афрыканскімі краінамі, з ЕС і ЗША.*

**Самакантроль па ВЭ-2.**

1. У чым сутнасць тэакратычнага палітычнага рэжыму ў Саудаўскай Аравіі?
2. Чым былі абумоўлены палітычныя крызісы ў Саудаўскай Аравіі ў першай палове 60-х і сярэдзіне 70-х гг. XX ст.?
3. Якія перамены адбыліся ў нафтавай прамысловасці Саудаўскай Аравіі з сярэдзіны 1970-х гг.?
4. Як гэтыя перамены паўплывалі на развіццё астатніх галін прамысловасці?
5. Як змянілася сацыяльная сістэма Саудаўскай Аравіі ў 70-я гг. XX ст.-пачатку XXI ст.?
6. У чым спецыфіка мадэрнізацыі грамадства Саудаўскай Аравіі ў апошнія дзесяцігоддзі?
7. Якім быў шлях Марока да незалежнасці?
8. Якія найважнейшыя рысы ўнутранай палітыкі Марока ў канцы 50-х - 60-я гг. XX ст.?
9. Чым быў выкліканы грамадска-палітычны крызіс пачатку 70-х гг. XX ст. у Марока?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

10. У чым сутнасць рэформаў, якія пачаліся ў Марока ў сярэдзіне 70-х гг.?

11. Якія асаблівасці эканамічнага развіцця Марока ў другой палове ХХ-пачатку ХХІ ст.?

12. Якія найважнейшыя прыярытэты знешняй палітыкі Марока пасля заваявання незалежнасці?

## ВЭ-3. ХАРАКТЭРНЫЯ РЫСЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА І ПАЛІТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІН ТРАПІЧНАЙ І ПАЎДНЁВАЙ АФРЫКІ ПАСЛЯ ЗАВАЯВАННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

***Пасля вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- калі завяршыўся распад каланіяльных імперый заходніх дзяржаў у Трапічнай і Паўднёвай Афрыцы;
- у чым сутнасць мадэлі “даганяючага развіцця” новых незалежных краін;
- краіны рэгіёна, якія выбралі ў якасці шляху развіцця нацыянальны сацыялізм, марксісцка-ленінскі сацыялізм, капіталізм;
- адметныя рысы кожнага з названых вышэй шляхоў развіцця;
- у чым праявіўся структурны крызіс у Паўднёвай і Трапічнай Афрыцы ў 1980-я гг.;
- агульныя рысы палітычнага развіцця краін рэгіёна;

***умець:***

- вызначыць этапы развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі пасля заваявання незалежнасці;
- ажыццявіць параўнальны аналіз шляхоў развіцця краін рэгіёна;
- арыентавацца ў палітычнай карце Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі;

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-3:***

1.Асноўныя этапы распаду каланіяльнай сістэмы ў Трапічнай і Паўднёвай Афрыцы.

2.Мадэль “даганяючага развіцця” краін Паўднёвай і Трапічнай Афрыкі ў 60-я-70-я гг. ХХ ст. Палітычная нестабільнасць у рэгіёне.

3.Краіны “сацыялістычнай арыентацыі” ў Трапічнай і Паўднёвай Афрыцы.

4.Структурны крызіс 1980-х гг. у краінах Паўднёвай і Трапічнай Афрыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

5.Новы этап сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця афрыканскіх краін у 90-я гг. XX ст.-пачатку XXI ст.

**Парадак вывучэння першага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля другой сусветнай вайны склаліся як міжнародныя, так і ўнутраныя ўмовы для заваявання незалежнасці краінамі Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі. Гэты працэс пачаўся ў канцы 1950-х гг., а завяршыўся ў пачатку 1990-х.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С.225-240.

*У дапаможніку паказаны асноўныя прычыны распаду каланіяльнай сістэмы ў Трапічнай і Паўнёвай Афрыцы, асаблівасці і асноўныя этапы гэтага працэсу. У той жа час аўтары аднабакова характарызуюць палітыку метраполій як служыўшую выключна інтарэсам буржуазіі і накіраваную толькі на аграбленне калоній.*

Васильев Л. С. История Востока. – М., 2001. – Т.2. - С.281-325.

*На аснове матэрыялу дапаможніка можна прасачыць ход распаду каланіяльнай сістэмы ў рэгіёне.*

История Тропической и Южной Африки. 1918-1988. – М., 1989.

*Дадзенае выданне ўтрымлівае багаты фактычны матэрыял, але пры яго выкарыстанні неабходна адысці ад аднабаковых марксісцка-ленінскіх ацэнак каланіяльнай палітыкі, разных плыняў нацыянальна-вызваленчага руху.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце асаблівасці складвання прычын і перадумоў распаду каланіяльнай сістэмы ў Трапічнай і Паўднёвай Афрыцы;

*Перш за ўсё неабходна высветліць уплыў другой сусветнай вайны на развіццё нацыянальна-вызваленчага руху ў рэгіёне і крайнюю адсталасць вывучаемых краін як вызначальны момант у фарміраванні перадумоў і прычын нацыянальных рэвалюцый.*

- прасачыце працэс распаду французскай, англійскай і бельгійскай каланіяльных імперый;
- прасачыце працэс распаду каланіяльнай сістэмы ў Паўднёвай і Трапічнай Афрыцы на яго завяршальным этапе ў 70-я - пачатку 90-х гг. XX ст.

*Устанавіце, з якіх краін гэты працэс пачаўся, ахарактарызуйце шляхі заваявання незалежнасці і тыя сацыяльна-палітычныя сілы, якія яго ўзначалілі. Пры выкананні гэтых заданняў неабходна актыўна выкарыстоўваць карту.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля атрымання незалежнасці краіны Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі пайшлі па шляху “даганяючага развіцця”, з дапамогай якога разлічвалі ў кароткі тэрмін пераадолець адставанне ад развітых краін Захаду, а яго асноўнымі элементамі з’яўлялася фарсіраванае развіццё індустрыі і актыўная палітыка этатызму.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3 – С.240-248.

*У дапаможніку ахарактарызаваны стан эканомікі афрыканскіх краін на момант заваявання незалежнасці, найважнейшыя параметры эканамічнага і палітычнага развіцця, але выключна негатыўна характарызуецца палітыка краін Захаду і вынікі ўдзелу Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў сусветнай гаспадарцы.*

Васильев Л. С. История Востока. – М., 2001. - Ч.2. - С.281-325.

*Дапаможнік дазваляе на матэрыяле па гісторыі асобных краін прасачыць агульныя заканамернасці развіцця рэгіёна.*

История Тропической и Южной Африки. 1918-1988 – М., 1989.

*Пры вывучэнні эканамічных праблем аўтары заведама станоўча ацэньваюць эканамічнае развіццё ў рамках этатысцкай мадэлі, а палітычныя працэсы – на аснове канцэпцыі класавай барацьбы, што непрымальна для грамадства, дзе класаўтварэнне не завяршылася.*

Потёмкин Ю.В. Социальный кризис в Африке: безысходность или переходность // Восток. – 1999. - №4.

*Артыкул утрымлівае характарыстыку найважнейшых момантаў эканамічнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў канцы XX ст.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце эканамічнае становішча краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі на момант заваявання незалежнасці;

*Звярніце ўвагу на ролю замежнага капіталу, на монакультурнасць, вызначце, якія галіны займалі дамінуючае становішча ў эканоміцы краін рэгіёна.*

- вызначце сутнасць мадэлі “даганяючага развіцця”;

*Неабходна ўказаць, што яе прыняцце было вызначана імкненнем маладых незалежных краін як мага хутчэй пераадолець адсталасць і іх верай у тое, што дабіцца гэтага можна толькі праз паскораную індустрыялізацыю пры рашаючай ралі дзяржавы.*

- устанавіце асноўныя вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў 60-я – 70-я гг.;

*Вы павінны зыходзіць з таго, што гэтыя вынікі былі неадназначныя. Меліся пэўныя поспехі, але пераадолець эканамічную адсталасць і вырашыць шматлікія вострыя сацыяльныя праблемы ў рамках мадэлі "даганяючага развіцця" не ўдалося.*

- ахарактарызуйце найважнейшыя асаблівасці палітычнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў 60-я – 70-я гг.;

*Звярніце ўвагу на такія адметныя рысы палітычнага развіцця краін рэгіёна, як палітычная нестабільнасць, аўтарытарызм, сепаратызм, вызначце ролю ваенных у палітычным жыцці і прычыны таго, чаму тут з вялікімі цяжкасцямі прыжываліся палітычны плюралізм і парламентарызм.*

### Парадак вывучэння трэцяга пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля заваявання незалежнасці цэлая група краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ажыццявіла эксперымент па будаўніцтве сацыялізму, вынікам чаго стаў глыбокі эканамічны і сацыяльна-палітычны крызіс у іх.

***Для вывучэння гэтага задання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3ч. – М., 2001. – Ч.3. – С.240-254.

*У падручніку толькі ў агульных рысах указана спецыфіка развіцця сацыялізму ў Афрыцы і прычыны сацыялістычнага выбару краін рэгіёна.*

Африка: страны социалистической ориентации – М., 1984.

Из истории социалистических идей в Африке – М.,1990.

История Тропической и Южной Африки.1918-1988. – М., 1989.

*Гэтыя тры выданні напісаны яшчэ на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі. У сувязі з гэтым усхваляецца сацыялістычны выбар і акцэнтуецца ўвага толькі на дасягненнях у яго рамках. У той жа час гэтыя работы насычаны багатым фактычным матэрыялам, які дазваляе вызначыць характэрныя рысы будаўніцтва сацыялізму ў краінах рэгіёна.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- прааналізуйце тэкст прыведзеннага дакумента і вызначце характэрныя рысы афрыканскага нацыянальнага сацыялізму:

З кнігі прэзідэнта Ганы Кваме Нкрума: "Вытворчасць дзеля прыватнай нажывы пазбаўляе значную частку насельніцтва вырабляемых тавараў і паслуг. Таму, калі мы хочам выканаць свой абавязак перад народам ..., то сацыялізм для нас – адзіны шлях. Сацыялізм мае на ўвазе грамадскую ўласнасць на сродкі вытворчасці, зямлю, багацці яе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нетраў і накіраванне гэтых сродкаў на задавальненне патрэбаў народу... Наша мэта - пабудаваць грамадства, у якім сацыяльная справядлівасць будзе найвышэйшым прынцыпам. Але да сацыялізму вядзе шмат шляхоў, і ва ўмовах нашай сённяшняй адсталасці мы павінны выкарыстоўваць усе наяўныя ў нашым распараджэнні сілы ў той час, калі будзем ствараць новыя сілы, якія паскораць наш рух да мэты.

Эканоміку Ганы можна падзяліць на пяць сектараў:

1) дзяржаўныя прадпрыемствы;
2) прадпрыемствы, якія належаць замежнаму капіталу;
3) прадпрыемствы, якія належаць сумесна дзяржаве і замежнаму прыватнаму капіталу;
4) кааператывы;
5) дробныя прыватныя прадпрыемствы.

Урад прызнае дзейнасць гэтых пяці сектараў, але прыняў рашэнне не дапускаць ні ў адным з іх манапалізацыі вытворчасці і гандлю якім-небудзь відам тавараў у руках якога-небудзь асобнага прадпрыемства. Ганцам дазваляецца мець дробныя асабістыя прадпрыемствы ў мэтах заахвочвання і выкарыстання прыватнай ініцыятывы і майстэрства нашых суайчыннікаў. ” (Хрестоматия по новейшей истории. 1945-1965. - М., 1966. – С.125-126.)

- устанавіце, якія краіны Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі развіваліся па шляху сацыялізму і знайдзіце іх на карце;

*Улічыце, што існавалі розныя варыянты сацыялізму ў Афрыцы, і тое, што мелася некалькі хваляў сацыялістычнай арыентацыі, і адны краіны зыходзілі з сацыялістычнага шляху развіцця, другія ж у гэты момант станавіліся на яго.*

- вызначце найважнейшыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія ажыццяўляліся ў афрыканскіх краінах “сацыялістычнай арыентацыі”;

*Звярніце ўвагу, што меліся краіны, якія будавалі нацыянальны сацыялізм і якія будавалі яго марксісцка-ленінскую мадэль. Паміж імі існавалі як агульныя рысы, так і істотныя адрозненні ў эканамічным і сацыяльна-палітычным развіцці.*

- назавіце найважнейшыя адметныя рысы палітычных сістэм краін “сацыялістычнай арыентацыі” Афрыкі;

*Вам неабходна ўказаць на асаблівасці партыйных сістэм, дзяржаўнага кіравання, ідэалогіі, на ролю палітычных лідэраў і арміі. Важнае значэнне краіны “сацыялістычнай арыентацыі” надавалі гэтак званай “антыімперыялістычнай” знешняй палітыцы.*

- устанавіце, якія вынікі развіцця краін Афрыкі па сацыялістычным шляху;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Звярніце ўвагу, што гэтыя краіны пастаянна знаходзіліся ў ліку найбольш бедных краін Афрыкі (выключэнне Бенін і Народна-Дэмакратычная Рэспубліка Конга). Высветліце, як хранічны сацыяльна-эканамічны крызіс у іх звязаны з сацыялістычным выбарам.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** мадэль даганяючага развіцця не дазволіла краінам Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі вырашыць сацыяльна-эканамічныя праблемы, якія па шэрагу прычын асабліва абвастрыліся ў 80-я гг. XX ст. і краіны рэгіёна апынуліся ў надзвычай глыбокім крызісе, які ахапіў усе сферы грамадскага жыцця.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001 – Ч.2. – С.333-338.

Васильев Л.С. История Востока - М., 2001. - Т.2. - С.333-338.

*У гэтых дапаможніках ўсебакова раскрыты прычыны крызісу 1980-х гг. у Афрыцы, формы яго праяўлення і пошукі шляхоў яго пераадолення. Адзначана найважнейшая спецыфіка крызісу – ён ахапіў усе сферы грамадскага жыцця.*

История Тропической и Южной Африки. 1918-1988. – М.,1989.

*Гэтае выданне звязвае крызіс выключна з капіталістычным шляхам развіцця і залежнасцю ад замежнага капіталу.*

Громыко Ан. Африка: континент у грани // Международная жизнь. – 1989. - №8.

*У артыкуле паказаны глабальны характар крызісу, які перажывала Афрыка ў 1980-я гг. Але ў ацэнках і вывадах адчуваецца яшчэ класавы падыход.*

Давидсон А.Б. Тропическая и Южная Африка в XX в. // Новая и новейшая история. – 2000 - №5.

*Аўтар дае агульную характарыстыку найважнейшых этапаў і тэндэнцый развіцця афрыканскіх краін, у тым ліку характарызуе 80-я гг. XX ст. як час глабальнага крызісу.*

Филиппова Е.И. Тропическая Африка: социальное измерение экономических реформ // Восток. – 1993. - №1.

*У артыкуле асноўная ўвага канцэнтруецца на цяжкіх сацыяльных наступствах ліберальных эканамічных рэформаў, якія пачаліся ў афрыканскіх краінах у канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- устанавіце прычыны, якія прывялі да крызісу развіцця ў краінах Паўднёвай і Трапічнай Афрыкі;

*Неабходна зыходзіць з таго, што гэтыя прычыны мелі комплексны характар. Нельга зводзіць усё да каланіяльнай спадчыны і неакаланіялізму. Улічыце фактары традыцыі, ментальнасць.*

- вызначце, як праяўляўся крызіс развіцця 1980-х гг. у краінах Паўднёвай і Трапічнай Афрыкі;

*Звярніце ўвагу на сістэмны характар крызісу, які ахапіў усе сферы грамадскага жыцця. Вызначце праяўленні крызісу ў эканоміцы, сацыяльнай сферы, палітыцы.*

- прасачыце меры, якія прымаліся для пераадолення крызісу і прааналізуйце іх вынікі;

*Прааналізуйце перш за ўсё эканамічныя рэформы, якія праводзіліся ў краінах Афрыкі ў 1980-я гг. Яны мелі на ўвазе лібералізацыю эканомікі, але з-за спецыфічных умоў Афрыкі цяжка было дасягнуць іх поспеху. Адзначце ўплыў палітычнай нестабільнасці на развіццё крызісу.*

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** з пачатку 1990-х гг. намеціліся некаторыя новыя тэндэнцыі ў развіцці краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі, у аснове якіх паступовае паляпшэнне эканамічнага становішча за кошт лібералізацыі эканомікі і ўмацаванне пазіцый парламентарызму і плюралізму ў палітычным жыцці.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001 – Ч.3. – С.250-256.

*У дапаможніку дадзена аднабаковая негатыўная адзнака ліберальных эканамічных рэформаў пачатку 90-х гг., хаця далей і прызнаецца іх пэўны станоўчы вынік. Мала закранута праблема палітычных пераўтварэнняў.*

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. - Т.2. - С.309-339.

*Аўтар раскрыў з пазіцый сучаснай гістарыяграфіі найважнейшыя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краін Афрыкі, але слаба прадстаўлены фактычны матэрыял.*

Лебедева Э, Эльянов А. Тропическая Африка: вечный маргинал // Мировая экономика и международные отношения. – 2001. - №6.

Лебедева Э. Тропическая Африка на пороге XXI века // Там же. – 1999. - №9.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Потёмкин Ю.В. Социальный кризис в Африке: безысходность или переходность // Восток – 1999. - №4.

Лопатов В. Африка в период структурной перестройки экономики // Мировая экономика и международные отношения – 1997. - №7.

*У артыкулах дадзена агульная характарыстыка развіцця краін Афрыкі пасля заваявання незалежнасці і зроблена выснова аб хранічным характары сацыяльна-эканамічнага крызісу.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- высветліце сутнасць эканамічных рэформаў, якія пачаліся ў краінах Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі на мяжы 80-90-х гг. XX ст.;

*Вы павінны зыходзіць з таго, што асноўны змест рэформаў заключаўся ў лібералізацыі эканомікі, адзначце ролю міжнародных арганізацый у іх правядзенні.*

- ахарактарызуйце вынікі эканамічных рэформаў і дынаміку эканамічнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў канцы 90-х гг. XX – пачатку XXI ст.;

*Неабходна адзначыць тыя цяжкасці, з якімі сутыкнуліся краіны рэгіёна пры правядзенні рэформаў. Вызначаючы іх вынікі, улічыце як станоўчыя, так і адмоўныя моманты. У цэлым у разглядаемы час намецілася пэўная станоўчая тэндэнцыя ў сацыяльна-эканамічным развіцці Афрыкі.*

- вызначце новыя рысы палітычнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў 90-я гг. XX – пачатку XXI ст.;

*Звярніце ўвагу на нарастанне дэмакратычнай тэндэнцыі ў палітычным жыцці, на ўзмацненне дзяржаўнай кансалідацыі поліэтнічных краін Афрыкі.*

## Самаканторль па ВЭ-3.

1. З якіх краін і калі пачаўся распад каланіяльнай сістэмы ў Паўднёвай і Трапічнай Афрыцы?

*Падумайце, чаму?*

2. Назавіце асноўныя этапы распаду каланіяльнай сістэмы ў Трапічнай і Паўднёвай Афрыцы.
3. З заваяваннем незалежнасці якімі краінамі і калі завяршылася дэкаланізацыя Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі?
4. У чым сутнасць мадэлі “даганяючага развіцця”?
5. Чаму менавіта на гэтую мадэль арыентаваліся маладыя афрыканскія краіны?
6. Якія вынікі мадэрнізацыі афрыканскіх краін у рамках “даганяючага развіцця”?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7. Якія найбольш адметныя рысы палітычнага развіцця афрыканскіх краін у 60-70-я гг. XX ст.?

8. Як на палітычную сітуацыю ў афрыканскіх краінах уплываюць трабалызм, сепаратызм, ваенныя?

9. Назавіце краіны Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі, якія ў свой час ішлі па шляху "сацыялістычнай арыентацыі".

10. Чым быў абумоўлены сацыялістычны выбар многіх афрыканскіх краін?

11. Якія найважнейшыя пераўтварэнні праводзіліся ў краінах "сацыялістычнай арыентацыі"?

*Звярніце ўвагу на розніцу паміж краінамі нацыянальнага сацыялізму і марксісцка-ленінскага сацыялізму.*

12. Ахарактарызуйце найважнейшыя ідэалагічныя плыні, характэрныя для афрыканскіх краін.

13. Якія прычыны крызісу развіцця афрыканскіх краін у 1980-я гг.? У чым ён праяўляўся?

14. Якія меры па пераадоленню крызісу развіцця прымаліся афрыканскімі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі?

15. У чым сутнасць эканамічных рэформаў, якія пачаліся ў краінах Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі на мяжы 80-90-х гг. XX ст.?

16. У чым супярэчлівасць эканамічнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў другой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст.?

17. Якія новыя рысы і тэндэнцыі з'явіліся ў палітычным развіцці краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.?

## ВЭ – 4. ЭФІОПІЯ, НІГЕРЫЯ І ПАЎДНЁВА-АФРЫКАНСКАЯ РЭСПУБЛІКА ЯК ПРЫКЛАДЫ РОЗНЫХ ШЛЯХОЎ ГРАМАДСКАГА РАЗВІЦЦЯ

***У выніку вывучэння гэтага вучэбнага элемента студэнт павінен ведаць:***

- чым характарызавалася палітычнае жыццё і стратэгія эканамічнага развіцця Нігерыі ў 70-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.;
- асноўныя супярэчнасці ў развіцці Эфіопіі пасля 1945 г., якія прывялі да дзяржаўнага перавароту 1974 г.;
- найважнейшыя падзеі і праблемы ў гісторыі Эфіопіі ў час сацыялістычнага эксперыменту, прычыны і наступствы яго краху;
- як і калі ў ПАР усталяваўся рэжым апартэіду;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

- асноўныя палітычныя сілы, якія вялі барацьбу супраць рэжыму апартэіду, формы, этапы гэтай барацьбы;

- ход працэсу ліквідацыі рэжыму апартэіду ў першай палове 90-х гг. XX ст.;

- чым вызначалася сацыяльна-палітычнае і эканамічнае жыццё ПАР пасля падзення рэжыму апартэіду;

***умець:***

- вызначыць прычыны і перадумовы заваявання незалежнасці Нігерыяй;

- выявіць асноўныя этапы і характэрныя рысы гістарычнага развіцця Нігерыі ў 70-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.;

- вызначыць рысы, якія характарызуюць шлях развіцця Эфіопіі сярэдзіны 70-х – пачатку 90-х гг. XX ст. як сацыялістычны;

- даць характарыстыку рэжыму апартэіду ў ПАР;

- вызначыць прычыны краху рэжыму апартэіду ў ПАР;

- параўнаць мадэлі грамадска-гістарычнага развіцця Нігерыі, Эфіопіі і ПАР пасля другой сусветнай вйны.

***Асноўныя пытанні для вывучэння ВЭ-4:***

1.Заваяванне незалежнасці Нігерыяй. Супярэчнасці грамадскага развіцця і грамадзянская вайна 1967-1970 гг.

2.Стратэгія эканамічнага развіцця і перманентны палітычны крызіс ў Нігерыі ў 70-я гг. XX ст. –пачатку XXI ст.

3.Супярэчнасці грамадскага развіцця Эфіопіі пасля другой сусветнай вайны і дзяржаўны пераварот 1974 г.

4.Сацыялістычны эксперымент у Эфіопіі, яго крах і наступствы.

5.Рэжым апартэіду ў ПАР пасля другой сусветнай вайны.

6.Крах рэжыму апартэіду. ПАР у сярэдзіне 90-х гг. XX ст. – пачатку XXI ст.

## Парадак вывучэння першага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** заваяваўшы незалежнасць, Нігерыя сутыкнулася з вострымі эканамічнымі, палітычнамі, этнічнымі праблемамі, якія прывялі да грамадзянскай вайны 1967-1970 гг., якая ўяўляла з сябе перш за ўсё міжэтнічны канфлікт.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока - М., 2001. - Т.2. - С.290-292.

*Гэты дапаможнік утрымлівае толькі асобныя, найбольш важныя факты з гісторыі Нігерыі, але ўзбройвае сучаснай метадалогіяй яе вывучэння.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

История Нигерии в новое и новейшее время. – М., 1981.

История Тропической и Южной Африки 1918-1988. – М., 1989.

*У абедзвюх навуковых працах сабраны багаты фактычны матэрыял, але пры яго інтэрпрэтацыі неабходна выкарыстоўваць сучасную метадалогію, якую ўтрымлівае дапаможнік Л.С. Васільева.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- вызначце прычыны і перадумовы заваявання незалежнасці Нігерыяй і прасачыце найважнейшыя падзеі звязаныя з яе дасягненнем;

*Звярніце ўвагу на асаблівасці нацыянальна-вызваленчага руху, якія звязаныя са шматэтнічнасцю краіны, на характар палітычных сіл, якія ўзначалілі нацыянальна-вызваленчы рух, палітыку англічан.*

- ахарактарызуйце эканамічнае і сацыяльна-палітычнае развіццё Нігерыі ў 1960-1967 гг.;

*Неабходна ўсвядоміць, што з моманту заваявання незалежнасці Нігерыя абрала капіталістычны шлях развіцця. Але парламентарызм ва ўмовах вострых сацыяльна-эканамічных і этнічных праблем прывёў да глыбокага палітычнага крызісу, які выліўся ў грамадзянскую вайну.*

- вызначце прычыны і прасачыце ход грамадзянскай вайны 1967-1970 гг.;

*Звярніце ўвагу на тое, што гэтая вайна ўяўляла з сябе перш за ўсё міжэтнічны канфлікт, стварыла пагрозу адзінству краіны і прывяла да гуманітарнай катастрофы.*

**Парадак вывучэння другога пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля грамадзянскай вайны 1967-1970 гг. Нігерыя перажывала перманентны палітычны крызіс, які найбольш яскрава праявіўся ў шматлікіх дзяржаўных пераваротах, у той жа час былі дасягнуты пэўныя поспехі ў эканамічным развіцці, перш за ўсё на аснове здабычы і экспарту нафты.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Васильев Л.С. История Востока. - М., 2001. - Т.2. - С.290-292.

*Дапаможнік утрымлівае толькі асобныя, найбольш важныя факты з гісторыі Нігерыі ў апошнія дзесяцігоддзі, але яго станоўчым момантам з'яўляецца тое, што матэрыял выкладзены на аснове сучаснай метадалогіі.*

История Тропической и Южной Африки 1918-1988. – М., 1989.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Для аналізу вялікага па аб'ёму фактычнага матэрыялу, які ўтрымлівае гэта выданне, трэба прымяняць сучасную метадалогію, на аснове якой напісаны дапаможнік Л.С. Васільева.*

Лебедева Э, Эльянов А. Тропическая Африка: вечный маргинал // Мировая экономика и международные отношения . – 2001. - №6.

Лебедева Э. Тропическая Африка на пороге XXI века // Там же. – 1999. - №9.

Гусаров В. И. Проблемы общественной консолидации в Африке: противоречия и перспективы // Восток. - 1999 - №4.

Винокуров Ю. Африканские страны на пути к демократии: достижения и проблемы // Восток. – 1998. - №6.

Бельский В. Африка: Континент конфликтов // Международная жизнь. – 1997. - №8.

Лопатов В. Африка в тисках структурной перестройки экономики // Мировая экономика и международные отношения . – 1997. - №7.

*Аўтары пералічаных артыкулаў, разглядаючы агульныя тэндэнцыі развіцця Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі, звяртаюцца і да асобных фактаў і тэндэнцый з сучаснай гісторыі Нігерыі, якія трэба засвоіць пры вывучэнні гэтага пытання. Гэтыя артыкулы могуць быць выкарыстаны ў якасці дадатковай літаратуры.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце эканамічную палітыку, якая праводзілася ў Нігерыі ў 70-я-80-я гады XXст.;

*Асноўнымі момантамі, якія неабходна адзначыць, з'яўляецца "нігерызацыя" маёмасці і рост дзяржаўнага сектару, праяўленне крызісу развіцця 1980-х гг. у Нігерыі.*

- прасачыце асноўныя тэндэнцыі і падзеі палітычнага развіцця Нігерыі ў 70-я – 80-я гг. XX ст.;

*Неабходна звярнуць увагу на такія вызначальныя фактары палітычнага развіцця Нігерыі ў той час, як перманентная нестабільнасць, пастаянныя ваенныя перавароты.*

- вызначце новыя рысы сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця Нігерыі ў 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.;

*Пры выкананні гэтага задання неабходна адзначыць тэндэнцыю да ўмацавання шматпартыйнасці і парламентарызму ў палітычным жыцці, якая намячалася ва ўказаны час, ў эканоміцы вызначыць сутнасць рэформаў, якія пачаліся ў 1990-я гг.*

### Парадак вывучэння трэцяга пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** няздольнасць эфіопскай манархіі вырашыць карэнныя праблемы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

развіцця краіны прывяла да захопу ўлады ў выніку ваеннага пераварота левaрадыкальнымі палітычнымі сіламі.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. – М.,2001. – Ч.3. – С.257-259.

*Найбольш выразна ў дапаможніку адлюстравана сацыяльна-эканамічная адсталасць Эфіопіі. Недастаткова ўвагі нададзена пытанням сацыяльна-палітычнага жыцця.*

История Тропической и Южной Африки. – М., 1989.

*Выкарыстоўваючы багаты фактычны матэрыял гэтага выдання, трэба адкінуць класавы падыход і даваць ацэнкі і рабіць высновы, кіруючыся прынцыпам навуковай аб'ектыўнасці.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце эканамічнае становішча Эфіопіі ў 1945-1974 гг.;

*Асноўнымі момантамі, на якіх трэба звярнуць увагу, з'яўляюцца: крайняя эканамічная адсталасць Эфіопіі, спробы мадэрнізацыі эканомікі і іх няўдача.*

- прасачыце ход сацыяльна-палітычнага развіцця Эфіопіі ад заканчэння другой сусветнай вайны да пачатку 70-х гг. ХХ ст.;

*Звярніце ўвагу на курс імператара на захаванне абсалютысцкага рэжыму, на вастрыню нацыянальных праблем і палітычную нестабільнасць.*

- вызначце прычыны і перадумовы дзяржаўнага перавароту 1974 г.;

*Неабходна адзначыць нарастанне вострых супярэчнасцей у розных сферах грамадскага жыцця Эфіопіі і няздольнасць манархіі справіцца з імі. У выніку ў якасці альтэрнатывы з'явіўся левaрадыкальны варыянт мадэрнізацыі эфіопскага грамадства.*

**Парадак вывучэння чацвёртага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля дзяржаўнага перавароту 1974 г. у Эфіопіі была зроблена спроба пабудовы сацыялістычнага грамадства на аснове марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Гэты эксперымент выклікаў глыбокі эканамічны і сацыяльна-палітычны крызіс, уцягнуў краіну ў грамадзянскую вайну.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. ХХ век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С.240-254.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Аўтары дапаможніка неабгрунтавана характарызуюць пераўтварэнні пасля перавароту 1974 г. як дэмакратычныя. Няпоўна паказаны мерапрыемствы сацыялістычнага будаўніцтва і іх цяжкія вынікі.*

Васильев Л.С. История Востока - М., 2001. - Т.1. - С.290-292.

*Л.С. Васільеў не спыняецца дэталёва на працэсе сацыялістычнага будаўніцтва ў Эфіопіі, аб'ектыўна паказвае трагічныя вынікі сацыялістычнага эксперыменту для гэтай краіны.*

История Тропической и Южной Африки 1918-1988. – М., 1989.

История Эфиопии в новое и новейшее время. – М., 1989.

*Гэтыя выдані ідэалізуюць сацыялістычнае будаўніцтва ў Эфіопіі. Пры інтэрпрэтацыі прыведзеных у іх фактаў трэба кіравацца падыходамі, якія сфармуляваны ў працах Л.С. Васільева.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце дзяржаўна-палітычную сістэму, якая склалася ў Эфіопіі пасля перавароту 1974 г.;

*Заўважце, што ў выніку перавароту кіруючую ролю ў грамадска-палітычным жыцці захапіла армія. Была ўсталявана ваенная дыктатура і рэжым асабістай улады М. Хайле Марыяма. У сярэдзіне 80-х гг. была зроблена спроба стварыць марксісцка-ленінскую партыю.*

- прааналізуйце асноўныя сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы рэжыму М. Хайле Марыяма і іх вынікі;

*Гэтыя мерапрыемствы былі класічнымі для курсу на будаўніцтва сацыялізму.*

- вызначце працэсы, якія адбываліся ў сферы міжэтнічных адносін;

*Неабходна адзначыць палітыку жорсткай цэнтралізацыі, якую праводзіў урад М.Хайле Марыяма. Рэакцыяй на яе стаў сепаратысцкі рух у многіх правінцыях, які пераплятаўся з антысацыялістычным рухам.*

- устанавіце прычыны падзення рэжыму "сацыялістычнай арыентацыі" і наступствы сацыялістычнага эксперыменту для Эфіопіі;

*Прычыны трэба шукаць у комплексе тых праблем і канфліктаў, якія абвастрыліся ў розных сферах грамадскага жыцця.*

**Парадак вывучэння пятага пытання.**

***Зразумейце сутнасць пытання:*** пасля другой сусветнай вайны ў ПАР усталяваўся расісцкі рэжым апартэіду, у аснове якога ляжала канцэпцыя раздзельнага развіцця рас і іерархічнай пабудовы грамадства па расаваму прынцыпу, што забяспечвала панаванне "белай" меншасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С.263-267.

*Дапаможнік утрымлівае матэрыял, які дазваляе сфарміраваць дастаткова поўнае ўяўленне аб сістэме апартэіду, палітыцы Нацыяналістычнай партыі, і барацьбе афрыканскага насельніцтва ПАР супраць расізму.*

История Тропической и Южной Африки 1918-1988. – М., 1989.

*Аўтары выдання разглядаюць найважнейшыя рысы рэжыму апартэіду як сістэмы расавага панавання, але вялікі акцэнт робяць і на тое, што гэта была сістэма класавага панавання і не зусім абгрунтавана разглядаюць барацьбу супраць апартэіду перш за ўсё як класавую барацьбу, перабольшваюць ролю камуністычнай партыі ПАР у ёй .*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае развіццё ПАР пасля заканчэння другой сусветнай вайны;

*Вы павінны адзначыць уздым эканомікі краіны ў ваенныя і пасляваенныя гады, узмацненне афрыканерскага капіталу, які цесна супрацоўнічаў з англійскім і амерыканскім, а таксама рост колькасці афрыканскіх рабочых, вызначце асаблівасці сістэмы дзяржаўна-манапалістычнага рэгулявання.*

- вызначце найважнейшыя рысы, якія характарызуюць сістэму апартэіду і прасачыце працэс яе развіцця ў 40-я – 70-я гг. XX ст.;

*Неабходна звярнуць увагу на палітычную праграму Нацыяналістычнай партыі, прааналізаваць законы, якія былі прыняты ў ПАР у 50 – 60-я гг. XX ст. і былі накіраваны на ўсталяванне сістэмы апартэіду, прасачыце канкрэтныя мерапрыемствы, якія ажыццяўляліся ў рамках палітыкі апартэіду.*

- вызначце асноўныя этапы барацьбы “каляровага” насельніцтва ПАР супраць апартэіду, яе рухаючыя сілы, метады і формы;

*Трэба зыходзіць з таго, што гэта была перш за ўсё барацьба за расавае раўнапраўе, якая перапляталася з класавай барацьбой. Удзельнікам гэтай барацьбы цяжка было дасягнуць адзінства, бо яны належалі не толькі да розных сацыяльных пластоў, але і да розных этнічных і расавых груп.*

## Парадак вывучэння шостага пытання.

***Зразумейце сутнасць пытання:*** у канцы 80-х - пачатку 90-х гг. XX ст. ва ўмовах крызісу рэжыму апартэіду ўрад Ф. дэ Клерка пайшоў на правядзенне карэнных сацыяльна-палітычных рэформаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вынікам якіх стаў дэмантаж апартэіду і пераход да плюралістычнай парламенцкай сістэмы.

***Для вывучэння гэтага пытання выкарыстайце наступную літаратуру:***

Новейшая история стран Азии и Африки. XX век. В 3 ч. – М., 2001. – Ч.3. – С.267-268.

*У дапаможніку прасочаны асноўныя падзеі, звязаныя з ліквідацыяй сістэмы апартэіду. У той жа час мала ўвагі нададзена пытанню аб прычынах яго крызісу і наступствах ліквідацыі для эканамічнага развіцця.*

Сафонов Л. От апартеида к демократии // Международная жизнь. 1994. - №11;

Сафонов Л., Гогитидзе А. Южная Африка. Знак доброй надежды // Международная жизнь. 1996. - №1;

Корочанцев В. Южная Африка". Путь к свободе бесконечен" // Народы Азии и Африки. – 1994. - №11.

*Названыя артыкулы дазваляюць дастаткова падрабязна прасачыць ход ліквідацыі сістэмы апартэіду і першыя вынікі пераходу ПАР да дэмакратыі.*

Васильев Л. С. История Востока - М., 2001. - Т.2. - С.307-308.

*Аўтар толькі ў самым агульным плане характарызуе працэс ліквідацыі апартэіду і тыя працэсы, якія адбываліся ў ПАР пасля гэтага.*

***Выканайце наступныя вучэбныя заданні:***

- устанавіце прычыны, якія прывялі да ліквідацыі сістэмы апартэіду;

*Пры выкананні гэтага задання ўлічыце як унутраныя прычыны (нарастанне барацьбы афрыканскага насельніцтва), так і міжнародны фактар.*

- прасачыце працэс дэмантажу сістэмы апартэіду;

*Неабходна звярнуць увагу на пазіцыю розных расавых груп, на супярэчнасці сярод партый, якія прадстаўлялі "каляровую" большасць і "белую" меншасць, на тое, што пераход да дэмакратыі адбыўся ў цэлым у мірных рамках.*

- вызначце асноўныя тэндэнцыі ў развіцці ПАР пасля ліквідацыі сістэмы апартэіду;

*Патрэбна ўказаць на палітыку Н.Мандэлы як на палітыку расавага міру і кампрамісу, на перамены ў сацыяльна-эканамічным развіцці ПАР.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**Самакантроль па ВЭ-4.**

1. Назавіце найважнейшыя рысы сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця Нігерыі ў 1960-я гг.

2. Вызначце прычыны, якія прывялі да грамадзянскай вайны ў Нігерыі ў 1967-1970 гг.

3. Ахарактарызуйце стратэгію эканамічнага развіцця Нігерыі ў 70-я гг. ХХ ст. – пачатку ХХІ ст.

4. Чым характарызавалася палітычнае жыццё Нігерыі ў 70-я гг. ХХ ст. – пачатку ХХІ ст.?

5. Якія прычыны і перадумовы дзяржаўнага перавароту 1974 г.у Эфіопіі?

6. Якія асноўныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні былі праведзены ў Эфіопіі пасля перавароту 1974 г.?

7. Чым была выклікана грамадзянская вайна канца 70-х – пачатку 90-х гг. у Эфіопіі і які яе вынік?

8. Якія наступствы мела для Эфіопіі ажыццяўленне сацыялістычнага эксперыменту?

9. Як і калі ў ПАР усталяваўся рэжым апартэіду?

10. У чым сутнасць сістэмы апартэіду?

11. Якія сацыяльна-палітычныя сілы і якімі сродкамі вялі барацьбу з апартэідам?

12. Ахарактарызуйце важнейшыя рэформы Ф. дэ Клерка, накіраваныя на ліквідацыю сістэмы апартэіду.

13. Які вынік першых нерасавых выбараў 1994 г. у ПАР?

14. Якія найважнейшыя рысы сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця ПАР у 1994 г. – пачатку ХХІ ст?

## ВЭ – К. ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ ПА МОДУЛЮ

*Перш чым прыступіць да выканання кантрольных заданняў, успомніце, якія мэты ставіліся пры вывучэнні модуля, якая яго вядучая ідэя, якія асноўныя паняцці трэба было засвоіць. Пры неабходнасці звярніцеся да рэкамендаванай літаратуры і паўтарыце вучэбны матэрыял.*

***Кантрольныя заданні:***

1. Назавіце прычыны, якія прывялі да ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху ў арабскім свеце і краінах Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі пасля другой сусветнай вайны.

*Звярніце ўвагу на ўплыў вынікаў другой сусветнай вайны.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2. Першай краінай Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі якая заваявала незалежнасць пасля другой сусветнай вайны, была: 1).Гана; 2).Гвінея; 3).Конга; 4).Кенія;

*Чыя гэта была калонія?*

3. Краіна, якая апошняй сярод французскіх калоній у арабскім свеце заваявала незалежнасць у выніку працяглай нацыянальна-вызваленчай вайны, была: 1).Сірыя; 2).Марока; 3).Алжыр; 4).Туніс;

*Чым была выклікана гэтая вайна?*

4. Апошняй каланіяльнай імперыяй у Афрыцы, якая распалася ў сярэдзіне 70-х гг., была: 1).Французская; 2).Партугальская; 3).Бельгійская; 4).Англійская.

5. Завяршэнне дэкаланізацыі Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі звязана з заваяваннем незалежнасці: 1).Анголай; 2).Зімбабве; 3).Эфіопіяй; 4).Намібіяй;

6. Мадэль "даганяючага развіцця" афрыканскіх краін мела на ўвазе: 1).Актыўнае развіццё рынкавых адносін; 2).Фарсіраваную індустрыялізацыю; 3).Прыярытэтнае развіццё сельскай гаспадаркі; 4).Адмову ад этатызму;

7. У 80-я гг. XX ст. эканоміка афрыканскіх краін перажывала: 1).Актыўны ўздым; 2).Карэнную тэхналагічную перабудову; 3).Структурны крызіс; 4).Карэнныя ліберальныя рэформы;

8. У 90-я гг. краіны Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі ў эканамічнай сферы: 1).Праводзяць рынкавыя рэформы; 2).Адмаўляюцца ад супрацоўніцтва з МВФ і іншымі міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі; 3).Узмацняюць палітыку этатызму; 4).Надаюць прыярытэт развіццю сельскай гаспадаркі.

9. Формай дзяржаўнага кіравання, якая ўсталявалася ў пераважнай большасці незалежных афрыканскіх краін, з'яўляецца _____________.

10. Для палітычнага жыцця афрыканскіх краін да пачатку 90-х гг. XX ст. характэрна: 1).Палітычны плюралізм; 2).Трывалы парламентарызм; 3).Аўтарытарызм; 4). Шматпартыйнасць.

11. У 90-я гг. XX ст. у палітычным жыцці краін Трапічнай і Паўднёвай Афрыкі: 1).Узмацняецца тэндэнцыя да ўмацавання шматпартыйнасці; 2).Узрастае роля арміі ў палітычным жыцці; 3).Многія краіны пераходзяць да парламенцкіх рэжымаў; 4).Знікаюць грамадзянскія войны і канфлікты.

12. У 60-я – 70-я гг. XX ст. партыі ў афрыканскіх краінах будуюцца пераважна на аснове: 1).Адданасці лідэру клана; 2).Пэўнай ідэалогіі; 3).Пэўнай палітычнай праграмы; 4).Этнічнай прыналежнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

13. Грамадзянская вайна ў Эфіопіі ў 70-я – 80-я гг. XX ст. была выклікана: 1).Курсам на будаўніцтва сацыялізму; 2).Пранікненнем ў Эфіопію заходняга капіталу; 3).Міжэтнічнымі канфліктамі; 4).Барацьбой у кіраўніцтве Партыі працоўных Эфіопіі.

14. Якая краіна лішняя ў гэтым лагічным радзе? 1).Ангола; 2).Мазамбік; 3).Кенія; 4).Эфіопія.

15. Асноўнай прычынай грамадзянскай вайны канца 60-х гг. XX ст. у Нігерыі сталі _________________________супярэчнасці.

16. Сістэма апартэіду мела ў якасці асноўных элементаў: 1).Строгую сацыяльную іерархію па расавай прыкмеце; 2).Раздзельнае жыццё рас; 3).Усталяванне аднапартыйнай дыктатуры; 4).Падзел краіны на аўтаномныя адзінкі.

17. Ліквідацыя сістэмы апартэіду звязана з прэзідэнцтвам _______.

18. Першыя нерасавыя выбары ў ПАР адбыліся ў: 1).1991; 2).1982; 3).1994; 4).1995.

19. Перамогу на іх атрымала партыя _________________________, а прэзідэнтам быў абраны _________________________.

20. Сярод арабскіх краін “сацыялістычную арыентацыю” абралі: 1).Сірыя; 2).Іарданія; 3).Алжыр; 4).Марока.

21. Спецыфічнымі рысамі “арабскага нацыянальнага сацыялізму” з’яўляюцца: 1).Прызнанне ісламу ў якасці ідэалагічнай асновы грамадства; 2).Устанаўленне аднапартыйнай сістэмы; 3).Прызнанне права на існаванне за дробнымі прыватнымі прадпрыемствамі; 4).Абвяшчэнне дыктатуры пралетарыяту.

22. У аснову палітыкі С.Хусейна былі пакладзены ідэі арабскага ____________________.

23. Першая араба-ізраільская вайна была выклікана: 1).Агрэсіяй Ізраіля супраць арабскіх краін; 2).Імкненнем арабскіх краін знішчыць Ізраіль; 3).Непрызнаннем арабскімі краінамі рэзалюцыі ААН 1947 г. аб падзеле Палесціны 4).Паўстаннем арабаў-палесцінцаў.

24. Першая арабская краіна, якая заключыла мір з Ізраілем – гэта ______________________________.

25. Будаўніцтва сацыялізму ў Алжыры ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. завяршылася: 1).Усталяваннем парламенцкага плюралістычнага рэжыму; 2).Грамадзянскай вайной; 3).Пагрозай прыходу да ўлады ісламістаў; 4).Узмацненнем палітыкі этатызму.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ЗМЕСТ

**Уступ........................................................................................**
**ВМ-1. Заваяванне незалежнасці афра-азіяцкімі краінамі і асноўныя тэндэнцыі развіцця ўсходніх цывілізацый пасля другой сусветнай вайны...................**
ВЭ-0. Уводзіны ў модуль......................................................
Уводная лекцыя.......................................................................
ВЭ-1. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху пасля другой сусветнай вайны....................................
ВЭ-2. Характэрныя рысы палітычнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны..................................
ВЭ-3. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Усходу пасля другой сусветнай вайны..........
ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю....................................
**ВМ-2.Сацыялістычныя краіны Азіі пасля другой сусветнай вайны................................................................**
ВЭ-О. Уводзіны.......................................................................
Уводная лекцыя.......................................................................
ВЭ-1. Сацыялістычны эксперымент у Кітаі (1949-1970-я гг.)..........................................................
ВЭ–2. Рэфармаванне сацыялізму ў Кітаі з канца 1970-х гг. XX ст.......................................................................
ВЭ-3. Будаўніцтва сацыялізму ў Манголіі, КНДР, В’етнаме, Лаосе і Камбоджы......................................
**ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю...................................**
**ВМ-3. Японія і новыя індустрыяльныя краіны Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі пасля другой сусветнай вайны.................................……………………**
ВЭ-0. Уводзіны.......................................................................
Уводная лекцыя.......................................................................
ВЭ-1. Японія пасля другой сусветнай вайны.........................
ВЭ-2. Паўднёвая Карэя, Тайвань ,Сінгапур і Ганконг як новыя індустрыяльныя краіны першай хвалі.....................
ВЭ-3. Інданезія пасля другой сусветнай вайны......................
ВЭ-4. Малайзія, Тайланд і Філіпіны на шляху ператварэння ў новыя індустрыяльныя краіны.......................
ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю....................................

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**ВМ-4. Краіны Паўднёвай Азіі пасля**
**другой сусветнай вайны.......................................................**
ВЭ-0. Уводзіны...................................................................
ВЭ-1. Індыя пасля другой сусветнай вайны......................
ВЭ-2. Пакістан і Бангладэш пасля
другой сусветнай вайны....................................................
ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю................................
Уводная лекцыя..................................................................
ВЭ-1. Афганістан пасля другой
сусветнай вайны.................................................................
ВЭ-2. Іран пасля другой сусветнай вайны.........................
ВЭ-3. Турцыя пасля другой сусветнай вайны...................
ВЭ–К. Выніковы кантроль па модулю...............................
**ВМ-6. Арабскі свет і краіны Трапічнай і**
**Паўднёвай Афрыкі пасля**
**другой сусветнай вайны.................................................**
ВЭ-0. Уводзіны...................................................................
Уводная лекцыя..................................................................
ВЭ-1. Сацыялістычны эксперымент у шэрагу
арабскіх краін і яго вынікі..................................................
ВЭ-2. Саудаўская Аравія і Марока пасля
другой сусветнай вайны....................................................
ВЭ-3. Характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага
і палітычнага развіцця краін Трапічнай і Паўднёвай
Афрыкі пасля заваявання незалежнасці.............................
ВЭ-4. Эфіопія, Нігерыя і Паўднёва-Афрыканская
Рэспубліка як прыклады розных
шляхоў грамадскага развіцця............................................
ВЭ-К. Выніковы кантроль па модулю................................

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Вучэбнае выданне**

**Мязга** Мікалай Мікалаевіч

# ГІСТОРЫЯ КРАІН АЗІІ І АФРЫКІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

***Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі***

Рэдактар В.І. Шкрэдава
Карэктар В.Н. Калугіна

Ліцэнзія № 02330/0133208 ад 30. 04.04.
Падпісана ў друк ________. Фармат 60x84 1/16. Папера пісчая № 1. Гарнітура "Таймс".
Умоўна-друк. арк. _________ . Ул.-выд. арк. _________ . Тыраж _________ экз. Заказ № ____.

Аддрукавана з арыгенал-макета на рызографе
ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны"
Ліцэнзія № 02330/0056611 ад 16. 02. 04.
246019, г. Гомель, вул. Савецкая,104

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ